Алесь Савіцкі



# ЛІТАСЦІ НЕ ЧАКАЙ

Алесь
Савіцкі

# ЛІТАСЦІ НЕ ЧАКАЙ



# Алесь Савіцкі

# АДПАСЦІ НЕ ЧАКАЙ

РАМАН

Мінск
«Мастацкая літаратура»
1982

Бел 2
С 13

*Рэцэнзент А. Кучар*

С $\frac{4702120200-058}{М 302(05)-82}$ 20—82

© Выдавецтва «Мастацкая літаратура», 1982.

## 1

Крокі глушыў мяккі пошум лазнякоў, і Захару ўвесь час здавалася, што па ўсім беразе Дзвіны — і ў заглушы тонкіх дубцоў, спавітых ажынаю, і далей, па ўзвалу, куды ён выбіўся, і ніжэй па сцежцы, якая ў перадранішнім сутонні нечакана ярка зажаўцела перад ім,— паслана нейкая мяккая коўдра, і ў ёй бясследна знікае тупат ботаў. Захар нават нахіліўся, зірнуў пад ногі, каб разгледзець тую посцілку, і ў той жа міг як хто садануў яму пад левае калена — не прыкмеціў тоўсты корань і зачапіўся нагою,— і ён потырч паляцеў на халодныя мокрыя дубцы; лазнякі прагнуліся, і ён завіс на іх, бы на ўтульнай гушкалцы. Нейкі час паляжаў гэтак, узіраючыся ў шэра-белую палосу ракі і слухаючы мяккі пошум лазнякоў — адпачываў пасля хуткае хады,— і яму падалося, што рака нерухомая, а гэта ён сам імкліва рухаецца, валіцца ў шэра-белую прорву, адкуль накатваецца гэты мяккі і бясконцы пошум.

«Навошта я тады адпусціў Кандрата? Памылка, мабыць, гэта...»

Зноў, як ужо мноства разоў, калі, пасля той купелі ў ледзяной вадзе, Захар амаль два тыдні качаўся па нарах зямлянкі хворы, падціснула сэрца сумненне, ён забедаваў, скрыгатнуў зубамі ад злосці на самога сябе. І не проста ж ён Кандрата пашкадаваў — паверыў! Паверыў паліцэйскаму, які недзе, мабыць, цяпер рагоча ад радасці, што гэтак лоўка абдурыў нейкага ёлупа. Добра, аднак, табе, Захар, разважаць ды бедаваць. А каб не кінуў тады Кандрат шыняля і не выцягнуў цябе з праломкі? Дзе б ты цяпер, разумнік, бедаваў?..

Знаёмую горкую развагу нечакана заглушыла злосць, і ён ускочыў з лазнякоў імклівым рыўком. Хопіць! Хопіць рваць сабе душу рознай непатрэбшчынай. Адпусціў і адпусціў, і няма чаго тут бедаваць! Лепей прыгадай, як шчэ Ціхан хацеў ключык да гэтага старога Роўды падабраць. І не падабраў жа! А ты, зусім нечакана і неспадзявана, знайшоў той ключык: Кандрат зробіць тое, што паабяцаў. Хаця... Ля смерці стоячы, не дужа-ткі будзеш скупіцца на абяцанні. Не, смерці Кандрат не збаяўся, ён жа нічыра

зрыхтаваўся памерці, прасіў, каб у садзе застрэліў яго Захар... І пра сына свайго бедаваў стары шчыра — некуды знік Багдан. Магчыма, сапраўды дзе-небудзь напароўся на кулю. А можа, да атрада якога прыбіўся, ваюе дзе, а стары пра тое нічога не ведае?.. Знайшоў ён, Захар, з чаго галаву ламаць! І, галоўнае, дзе і калі? Зноў жа, як у тую ноч крыгалому, кінуў атрад і, нікому нічога не сказаўшы, наляцеў сюды, на бераг Дзвіны. Нават камісара не папярэдзіў, што ля Дзвіны пасядзець хоча. І дзе апынуўся? Над самым горадам амаль. Ведаў жа, як з зямлянкі выходзіў, што сон гэта сасніўся — саснілася, што кліча яго сынок; Ігарок малы, сядзіць над лазнякамі на беразе і кліча,— разумеў жа, што слабы пасля хваробы, што сніліся яму яшчэ больш пакутныя сны, і веры ім не даваў, а вось у гэты паверыў. І каб жа сядзеў на беразе! Дык не ж, намалу ўсё ехаў і ехаў ля Дзвіны... Неразумна зрабіў, неабачліва... І сам цяпер бачыць гэта. Кепскі, адным словам, з яго камандзір атрымліваецца. Свая яму толькі бяда сэрца рэжа, аб ёй толькі і клопат... Так што, браце, пакуль не позна, садзіся на каня і гані назад, у атрад!..

Крыху прайшоўшы па левым схіле ручая, Захар пачуў, як венькаюць цуглі. На пачатку быў напалохаўся, згледзеўшы, што конь неяк дзіўна тупае, потым зразумеў: лазнякі гэта хістаюцца, ногі каню затулілі. Ён адвязаў повад ад старога карча, паправіў папругу. Рука слізганула з халоднай сырамяці на цёплую поўсць, і ён правёў даланёю ад сядла да конскай грывы. Конь цягнуўся да яго пысаю, шумна дыхаў, быццам радасна вітаўся.

Захар ласкава патрапаў каня па хрыбціне, потым ля вушэй, якія былі рухавыя і дужа цёплыя, і гэтая цеплыня жывой істоты дзіўна ўзрадавала, напоўніла Захарава сэрца замілаванасцю. Адчуў ён яшчэ, як тарганулiся над пальцам конскія вейкі, калючыя і вялікія, і з узрушэннем прыхінуўся шчакою да конскай шыі. Пад халаднаватай і гладкай поўсцю бруілася жывая цеплыня, ад якой радасцю напаўнялася сэрца, і Захар цёрся шчакою аб конскую поўсць, ласкава пагладжваў грыву, нібыта галубіў добрага і роднага чалавека, з якім даўно не бачыўся і вось выпадкова стрэўся. Засумаваў, канёчак, стоячы на адзіноце ў чаканні. Нічога, галубок. Цяпер ужо дамоў, у лагер, станеш ты над шаты старых яліц, запусціш храпу ў духмяную і сакавітую канюшыну. І авёс цябе чакае...

Ён ціха размаўляў з канём, і гэтая гаворка дзіўосна супакойвала, надавала ўпэўненасць і сілу, неяк адразу

аддзяляла Захара ад непрыемных сумненняў і шкадавання. У шэраватым сутонні ўжо добра акрэсліліся лазнякі на супрацьлеглым беразе, і неяк раптоўна насвятлела далеч, і наперадзе шырокай стромай купаю зачарнелі старыя дрэвы на вясковым могільніку. Адтуль, ад могільніка, не даязджаючы Падкасцельцаў, трэба будзе павярнуць улева і нізінаю выбіцца на селавую дарогу да лесу — па ёй уночы ён і гнаў каня.

Захар крануў повад і тады раптам пачуў глухую, але не вельмі далёкую страляніну — два хуткія адзіночныя стрэлы і доўгую аўтаматную чаргу. Старанна ўслухаўся, як бы не верачы ў тое, што пачуў, і ажно напацеў: не, не памыляецца ён, страляюць у лесе, якраз у тым напрамку, куды ён павярнуў каня, вывеўшы яго з лагчыны на дарогу.

«У лагеры гэта страляніна? Няўжо там? Але ж чаго яна там можа пачацца?..»

Пра бяду ён яшчэ не думаў. Прыўзнімаючыся ў сядле, Захар усім тулавам пацягнуўся наперад, прагна ўзіраўся ў лясную сінечу. Нічога не відаць там падазронага, і дарога наперадзе пустая. Толькі нейкі як бы гуд матора за ракой. Але дужа далёкі...

Захар павярнуў галаву ўлева і тут жа рэзка плюхнуўся ў сядло — над галавой віскатнулі кулі. Ён пачуў гэта адначасова — дзвыганне куль і сухую раскацістую чаргу кулямёта на супрацьлеглым беразе Дзвіны. Ярасна тузануў повад і абцасамі міжвольна моцна паддаў каню пад рэбры; конь захроп, ірвануў і панёс.

Кароткія кулямётныя чэргі грымелі за спіною, яны як бы наблізіліся цяпер, і кулі віскатліва рвалі і дзёрлі паветра то злева, то справа, і ён, ратуючыся ад іх, кідаў каня то ў адзін, то ў другі бок. Адзіная мэта цяпер была ў яго — могільнік, да якога было метраў сто. Там пачынаецца нізіна, і ён тады будзе схаваны ад прыцэльнага агню! І вунь жа, гэтая выратавальная нізіна! Каб толькі ў яго не пацэлілі, каб толькі даскочыць хоць да таго алешнічку, што клінам выходзіць на дарогу. Алешнік затуліць яго, а там жа і нізіна пачнецца... І дзіўна — адкуль гэты кулямётчык узяўся на тым беразе? Ды там жа масток! Масток на гравійцы, відаць, ля яго і была засада. Цяпер, убачыўшы верхавога, вырашылі секануць. Дзень амаль, відаць жа ўсё добра ім адтуль...

Ён зноў павярнуў галаву, але павярнуў цяпер управа, каб зірнуць на масток па той бок Дзвіны, і ў гэты момант

конь дзіўна тузануўся, захроп, пярэднія ногі ў яго падламіліся. Захар кулем вылецеў з сядла. Маладыя вольхі над ім затрашчалі — пратараніў вольхавы парасnік і шмякнуўся на зямлю.

Разам з болем, які пранізаў левы бок, левы локаць і плячо, вочы запарушыла нейкая імгла. Боль у плячы неяк адразу аціхаў, быццам расплываўся, а боль у шыі мацнеў, быццам каўпер скурапкі рэзаў цела. Захар абмацаў шыю, і пальцы адразу наткнуліся на нешта цёплае і вязкае. Ён цярнуў далапёю па твары, каб сагнаць з вачэй шумавінне, што ўсё яшчэ трымцела на вейках і замінала глядзець. Калі зірнуў на руку, цёмную ад крыві, не зжахнуўся, а з тужлівым адчаем падумаў пра тое, што парапены, што гэтыя кулямётныя чэргі ад гравійкі па правы бок Дзвіны і густая страляніна ў лесе — адзіны ланцуг бяды.

Захар яшчэ раз правёў рукою па твары, і шумавінне як звалілася з вачэй. Ён убачыў, што конь, галава якога ляжала ў парасніку маладых алешын, канвульсійна трэпае задняй нагою, быццам спрабуе зачапіцца капытом за дол, каб глыбей зашыцца ў алешнік. Потым конь знерухомеў, і Захар скалануўся ад думкі, якая нарадзілася раптоўна і аглушыла: пакуль ён імчаў на кані, бяда здавалася далёкай, яна не павінна закрануць яго. Цяпер бяда была побач. Вось ён, забіты конь... А гэта ж мог і ты сам ляжаць на зямлі — па табе ж мецілі! Кулямётная чарга магла ж дастацца табе!.. А каму дастаюцца чэргі, што грукочаць у лесе?.. Каму, ты шчэ пытаешся?.. Гэта ж твой атрад калашмацяць фашысты. Наляцелі ўранку, нечакана, а тут, за ракой, кулямёты наставілі, каб рэзануць, калі хто ўдумае з лесу выскачыць...

Ён не ведаў дакладна, што і як там адбываецца ў лесе, але дужа яскрава ўявіў сабе бой у лагеры, і зноў скалануўся ад усведамлення бяды, у якую паверыў канчаткова. І не толькі паверыў, але і ва ўсім абвінаваціў сябе. Гэта ён, Захар, ва ўсім вінаваты. Узвод Пажогі пайшоў рэйдам пад Лепель. Група Санько — за чыгунку, у раён Глыбокага. Аддзяленне Файзуло — над Баравуху, на старыя доты, каб пашукаць патронаў. Хто ж там у лагеры застаўся? Дзесяткі два людзей — не больш. І сярод іх шмат без зброі! Артур, Марыля, Часлава... Не, Артур з маці пайшоў пад Загацце — Марыля хоча пажыць на хутары ў сястры... Часлава хацела туды Толічка адправіць, але перадумала, сказала, што будзе з малым у лагеры, пачакае, пакуль не вернецца Артур і не раскажа, як там на хутары, што далей

рабіць — потым вырашыць... Няма, няма там, у лагеры, каму біцца! Але ж грыміць бой! Грыміць!.. А ён, камандзір, тут адлежваецца!..

Захар з тугою паглядзеў на сіні зубчык лесу, які адсюль, з алешніку, здаваўся далёкім і недасягальным, на нерухомага каня, над якім тырчэла сядло з бліштчастай металёвай дужкаю, на поле, зацягнутае туманам, туманам бляклым, але рухавым, які тонкім пластом плыў над зямлёй, як бы набліжаючы грабеньчык лесу, і ўскочыў, і пабег у нізіну, адарваўшыся ад утульнага лежава ў хмызняку.

У лесе цяпер грымелі і выбухі — біў мінамёт,— і Захар, услухоўваючыся ў гукі бою, бег шалёна, нізка схіліўшыся, трымаючы напагатове парабелум, які перакідваў час ад часу з адной рукі ў другую. Выбухі і стрэлы, якія па-ранейшаму гучалі ўсё ў адным і тым жа напрамку, дзе і ўсчаліся, як бы штурхалі яго наперад, і ён усё бег і бег, высільваючыся, шалёна выкідваючы ногі, не зважаючы на боль у плячы і шыі. У роце перасохла, нейкая горыч драла горла, сэрца моцна бухала пад рэбрамі, і Захару здавалася, што яно не вытрывае і зараз вырвецца з грудзей і пакоціцца перад ім па зямлі.

Палёгка — нечаканая і дзіўная — прыйшла па ўзлеску, калі ён, убачыўшы на маладых лапках яліны россып бліштчастых вадзяных кропляў, схапіў іх ротам. Маладое шыгалле абрасіла губы, і ён аблізнуў іх, і горыч у роце знікла, і Захар нават спалохаўся, адчуўшы, што бегчы зрабілася лёгка і зручна; ногі нібыта самі неслі цела наперад, і ў целе ўжо не было болю, і толькі пагана смылела рана на шыі.

Выбухі ў лесе былі сухія, траскотныя, а рэха іх, здавалася, коціцца насустрач па лясной дарозе, зусім неўезджанай, як незнаёмай. На роўным чыстым шыгаллі ён нечакана згледзеў сляды конскіх капытоў і здагадаўся, што выбіўся дакладна, выбіўся якраз на тую дарогу, па якой імчаў учора ўвечары з лагера. Да лагера, значыцца, недалёка, кіламетры з чатыры, не больш. Дарога тут робіць калена вакол балаціны, і трэба, мабыць, рвануць наўпрост — на гукі бою. Тут бліжэй, тут ён хутчэй будзе ў лагеры...

Захар кінуў позірк на правы бок дарогі, як бы накрэсліваючы свой шлях па лесе, і тут жа ўгледзеў, што за дрэвамі мільганулі чалавечыя постаці, і спалохана шуснуў назад, саскочыў з лясной сцягі і распластаўся над мала-

дой кусцістай ялінкаю, якая ўпчылыную прыціснулася да тоўстай асіны.

Бой раптоўна аціх, рэха стрэлаў адкатвалася, заміраючы, і Захар выразна пачуў трэск галля, потым сіпатае хаканне — людзі беглі, зусім не клапоцячыся пра асцярожнасць.

Цяпер, калі залёг за асінай, дзіўная слабасць зноў апанавала Захара, і ён адчуваў, што гэтак жа, як на ўзлеску, яму ўжо не скрануцца з месца, што будзе ляжаць доўга, не зважаючы на небяспеку. Цела было як паралізаванае, але думкі снавалі чотка, вельмі хутка і абвострана: яго тут ніхто не заўважыць, пакуль не папорацца. Але гранату трэба падрыхтаваць, парабелум — на баявы ўзвод...

Захар ляжаў, углядаючыся ў той бок, дзе час ад часу чуўся трэск галля і нейкага бязладнага, наспешлівага руху. Відаць, гэта не фашысты. Тыя б страчылі з аўтаматаў, галёкалі... А гэтыя супуцца стоена, хоць і бязладна, стомлена хакаюць. Уцякаюць ад некага, гэта ж ясна...

Ён прыўзняўся, пасунуўся ўправа ад камля асіны, і тады як нейкая знаёмае шумавінне-імгла наплыла на вочы. Гайдаш жа гэта! Справа ад яе нехта ў даўгім карычневым пінжаку, які моцна перацягнуты шырокім чорным рамянём, і нямецкі аўтамат у яго на шыі. Дык гэта ж Артур! Гайдаш спынілася, і ён спыніўся. Але глядзіць не ў яго, Захараў, бок, а зусім у супрацьлеглы — у глыб лесу. Як некага чакаюць... Э-э, там жа яшчэ ідуць! Часлава ідзе... Побач з ёю Ромель, нешта нясе перад сабою на руках. Малога нясе! Толічка ён нясе. І справа ад Ромеля супуцца два ў вайсковым адзенні. І нехта ў паліцэйскім фрэнчы...

Захар прыўзняўся на калена; галінка гучна трэснула ў яго пад нагой, і ўся група адразу рассыпалася і залегла.

— Гэта я, Гайдаш! — гучна гукнуў Захар, чамусьці звярнуўшыся менавіта да яе, і тут жа стуліўся за камлём асіны — збаяўся, што па ім, не разабраўшыся, могуць стрэліць.— Крупня гэта! Я гэта тут!..

Зашастаў хвойнік — Гайдаш кінулася на голас,— і Захар не паспеў апамятацца, як рукі Гайдаш ляглі яму на плячо.

— Во-ой, вы ж увесь у крыві! Трэба ж хутчэй перавязку!

Гайдаш бухнулася на калені, адкрыла сумку, якую паставіла перад сабою на зямлі, напырскала на кавалачак бінта нечым з бутэлечкі і ўзялася абціраць Захараў твар.

Захар адчуў пах спірту, накруціў носам, потым скрывіўся — зашчымела рана на шыі.

— Баліць? — паспачувала Гайдаш.— Зараз рану перавяжу. Гэта ж каб на нейкае каліва ўправа — артэрыю зачапіла б. Пашчасціла вам, таварыш камандзір!

— Што ў лагеры?

— Не варушыцеся, не варушыцеся. Мне гэта замінае!

— Я пытаюся, што ў лагеры? — Захар зазлаваў на самога сябе за тое, што не адразу, а толькі цяпер распытвае Гайдаш.— Паспеецца гэтае бінтаванне.

Гайдаш, падразаючы нажніцамі бінт, пакрыўдзілася:

— Хочаце заражэнне крыві атрымаць? Тады ніякі лагер не спатрэбіцца. Што я тады зраблю?

Яе вочы, поўныя трывогі, дрыготкія губы, якія крывіліся ад хвалявання, не толькі здзівілі яго, але і збянтэжылі. Захар зноў, як і звычайна ў зямлянцы, калі яму, хвораму, прыносіла лекі Гайдаш, убачыў у яе абліччы дзіўную ўвагу і клопат, якія аніяк не мог патлумачыць і якія цяпер прымусілі яго быць стрыманым і не паказваць свае разгубленасці.

— Але ж хоць хто-небудзь з вас можа толкам расказаць? Што адбылося? Куды вы імчыцё?

— Фашысты там,— як пра нешта зусім другараднае, адказала Гайдаш.— Лагер пачалі абкружаць...

— Як гэта? — ён адрывіста адвёў руку Гайдаш і ўскочыў на ногі. Бліжэй да яго быў цяпер Артур, і ён спытаўся, узіраючыся ў Артураў твар: — А пасты? А вартавыя што? Спалі?

— Я ж не быў у лагеры. Я вяртаўся ў лагер...

— Гэта ж што, усе, бы тыя зайцы, разбегліся? Як жа гэта?..

— Мы самі нічога не ведаем,— сказала Чэся, якая цяпер наблізілася і стала побач з Гайдаш.— Чую — страляніна. Паніка адразу, бо спалі. Я выскачыла з зямлянкі, а вакол — кулі свішчуць. Гранаты — бух, бух... Ці з мінамёта білі. Каб не Ромель, дык я б і Толічка свайго згубіла. Ён малога і ўратаваў,— і працягнула рукі да сына.— Ідзі сюды, маленькі. Ідзі сюды, харошанькі...

І гэтая паваротка ў гаворцы Чаславы, нечаканая дужа, вельмі будзённая, узбунтавала Захара, і ён гнеўна павярнуўся да Артура.

— Як гэта ты вяртаўся ў лагер? А Санько дзе? Група яго дзе падзелася?

— Ім жа было загадана — яны за чыгунку пайшлі.

Я іх чакаў. А ўвечары яны на хутар заявіліся,— Артур паказаў рукою на людзей у вайсковым адзенні.— Рыма параненая, і Траян,— слаба кіўнуў галавой у бок Багдана.— І ён вось, сусед наш... Я пакінуў запіску Санько — маці яе перадасць яму... Каб не Рыміна рука, дык мы б Санько там і чакалі...

Захар толькі цяпер згледзеў, што адзін з вайскоўцаў — дзяўчына, і яна параненая, і нават не падумаў, што гэта дачка Лавягіна: увагу яго цалкам прыцягнуў твар чалавека ў паліцэйскім фрэнчы. Сапраўды, гэта ж Багдан Роўда! Гэта ж сынок Кандратаў адшукаўся!

— Добры дзень, Захар Елісеевіч. Я — Багдан. Памятаеце? — і, заўважыўшы, што Захар глядзіць на яго з нянавісцю, паспешліва дадаў: — А фрэнч гэта бацькаў. Я ў атрад да вас ішоў. І карабін прыхапіў, і фрэнч, каб не з пустым. І Траяна з Рымаю ўратаваў...

— Двойчы нават,— пацвердзіў Траян.— Другі раз вось толькі што, ля лагера. Кулямётчык там па пагарбе ў засадзе сядзеў. А фрэнч Багданаў яго з панталыку збіў — мы першымі стрэлілі. А каб не гэта — у лагеры б спалі сабе...

Захару было непрыемна гэта чуць: ён чуў у кожным слове папрок і сабе, камандзіру, які быў далёка, калі гэткая бяда напаткала атрад. Спагнаў злосць на бінтах, якія развязаліся і зваліліся на каўнер скуранкі.

— Ды завяжы ты гэтыя матузы! — крыкнуў ён Гайдаш.— Каб хоць не боўталіся...

— Трэба і кроў сцерці. Нядобра гэта...

— Хутчэй толькі. Мігам... Мацней закруці,— папрасіў цяпер крыху мякчэй.

— Я ж і хацела ўсё адразу...

Рукі Гайдаш мякка кранալі скуру, ад іх бруіўся дзівосны спакой, і здзіўляючая лёгкасць ішла ад дотыку пальцаў, якія ацiралі закарэлую кроў з ілба і скроняў. Ён быў удзячны ёй за гэтыя імгненні, бо ў яго цяпер быў час нешта ўзважыць, адшукаць нейкі пэўны кірунак таго, што трэба рабіць. Ён разумеў, што ад яго цяпер чакаюць нейкіх рашэнняў, што менавіта ён, а не хто-небудзь іншы павінен зараз сказаць патрэбныя словы, загадаць нешта рабіць, і загадаць правільна, адшукаць адзінае разумнае выйсце, якое б уратоўвала ўсіх і кожнага паасобку.

А ў яго такога рашэння пакуль што не было. Там, на полі, калі ён бег да ўзлеску, і тут, у лесе, адна была мэта — лагер. Як мага хутчэй апынуцца ў лагеры — у гэтым

бачыўся яму паратунак. Але цяпер нешта замінала прыняць яму гэтае рашэнне, і ён адчайна сіліўся адкінуць гэтае нешта, разумеючы, што губляе дарагі час беззваротна і злачынна.

Болей ад усяго Захара прыцягвала Багданава постаць. Але рукі Гайдаш увесь час мільгалі перад вачыма, і Багданаў твар то знікаў, то выплываў зноў, і Захару здавалася, што кожны раз ён бачыць зусім іншага чалавека, не таго, які быў перад гэтым. Рыма і Траян меней цікавілі Захара. А вось Багдан... Чаго ён ішоў на лагер? Адкуль ведаў дарогу? Адкуль ведаў, што Захараў атрад размешчаны менавіта тут?.. Хаця, Артур жа быў з імі. Артур жа ведаў! Але чаго Артур не дачакаўся групы Санько, з якою павінен быў вярнуцца ў лагер? Рыма была параненая? Але ж чаму яе нельга было перавязаць там, на хутары? Дзеля чаго было адразу бегчы сюды, у лагер?.. Відаць, яны ва ўсім слухаліся Багдана...

Захар углядаўся ў Багданаў твар — Гайдаш скончыла бінтаваць шыю, і рукі яе не мільгацелі перад вачыма,— бачыў насцярожаны, недаверлівы і разам з тым нейкі ліслівы і разгублены позірк, і ў тым ланцугу бяды, які склаўся ў яго думках на беразе Дзвіны, калі ён імчаў на кані і вакол пагана ціўкалі кулі, цяпер выразна акрэслілася галоўнае звяно, якое складалася з горкага Чэсінага прызнання: з Багданавай хаты, маўляў, выпаўзла здрада. Гэтак жа яна выгукнула, калі ўбачыла Захара напрадвесні ў разбураным лагеры, старым лагеры, які далёка адсюль. Тады Багдана не было. Цяпер ён побач, вось ён стаіць, у паліцэйскім фрэнчы, зыркае з-пад ілба, неяк сагнуўся ўвесь, напружыўся, як звер, гатовы мітнуцца на ахвяру, якую ўжо выгледзеў і падпільнаваў. І ўзброены як! На левым плячы — карабін. На правым — нямецкі аўтамат — тырчыць вунь прамавугольнік з патронамі. І за халявамі тырчаць гэткія ж прамавугольнікі — па адным за кожнай. І Чэся побач з ім стаіць! Стаіць, быццам нічога не здарылася. Спакойна папраўляе падраныя чаравікі на Толікавых ножках — гэтым толькі і заклапочана!..

— Аўтамат! — патрабаваў Захар рэзка і працягнуў руку да Багдана.— Дай сюды! Аўтамат дай!..

Багдан таропка сагнуўся, выцягнуў з-за левай халявы запасную касету з патронамі, спачатку аддаў яе, а потым сцягнуў з пляча аўтамат.

— Гэтыя поўныя. А ў гэтым,— ён выцягнуў з-за правай халявы чорны прамавугольнік і, прыжмурыўшы вока,

пацісиуў пальцам верхні патрон.— Чатыры патроны толькі ў гэтым...

— Прыдадуцца і яны. Давай...

Захар сунуў і другі прамавугольнік за халяву правага бота, пакратаў рукою забінтаваную шыю — пад бінтом, калі ён сагнуўся, узнік востры і колкі боль — і, нечакана для самога сябе нават, загадаў рэзка і адрывіста:

— У лагер! Усе — за мной!

Гайдаш стала перад ім, як бы закрываючы сабою лясную сцягу, на якую ступіў Захар, узняла руку.

— Нельга! Куды ж у лагер? Там — фашысты. Да іх у лапы і трапім!..

І гэты шчыры яе парыў, і знаёма адкрыты ад здзіўлення рот, і скрыўленыя болем і хваляваннем губы, і асабліва рука Гайдаш, узнятая неяк трагічна і адчайна, не толькі прысаромілі яго, але і астудзілі, прымусілі разважаць цвяроза, лагічна, скасавалі зацятасць, якая ўвесь час замінала яму. Сапраўды, куды ж ён гэтак шалёна рвецца? У лагер? Дык ён жа не ведае, што там зараз робіцца. У бойку? А каго ён павядзе ў тую бойку? Артура? Дык ён і не чуе твой загад, схіліўся над Рымай, дапамагае ёй перабінтаваць руку. Траяна? Дык той жа, быццам нежывы, асунуўся ля камля асіны на дол, зарыўся тварам у зялёны чарнічнік, бы нешта смокча з-пад маладых зялёных сцяблін... Багдана? Яго ж ты сёння ноччу меў намер пакараць смерцю. Ромеля? Гэта ж чужынец, твой закляты вораг!.. Ці гэтых жанчын, у адной з якіх малое дзіця на руках, ты збіраешся павесці ў бой?

Захар перакінуў аўтамат з левай рукі ў правую, сказаў хмурна, незадаволены тым, што даводзіцца адмяняць свой ранейшы загад:

— Жанчыны застаюцца. Астатнія — на лагер! За мной! — Ён сустрэў незнаёмы дагэтуль умольны позірк Ромеля і, сам дзівячыся з таго, што гаворыць, дадаў, торкнуўшы ў яго бок аўтаматам: — І гэты таксама са мною ідзе. Наперадзе я іду,— і, крыху павагаўшыся, спыніў свой выбар на Багдану: — І ён са мною... Але не гуртам пойдзем. Ланцужком. І на дыстанцыі.

Гайдаш, якая па-ранейшаму стаяла на ляснoй дарозе, быццам загараджвала дарогу Захару, прамовіла ўпарта:

— Я таксама іду. Я — з вамі...

— Добра,— пагадзіўся Захар, зразумеўшы, што яна не лічыцца з яго загадам і ўсё роўна не застанецца тут.— Толькі захоўваем дыстанцыю,— ён агледзеў усіх, убачыў

аўтамат, які ляжаў ля галавы Рымы, загадаў Багдану: — Карабін Ромелю аддасі. А сам аўтамат бяры!

— Я ж вам аддаў свой!

— Рымін бяры. Як ёй страляць,— загадаў яшчэ, адчуўшы, што голас яго набыў ранейшую ўладарнасць: — І не страляць без маёй каманды...

Захар бег па левы бок лясной сцягі і ўвесь час бакавым зрокам бачыў Багдана, чуў ззаду мяккі тупат ног і намагаўся глядзець толькі наперад. Бінты мулялі шыю, Захар час ад часу папраўляў іх рукою, замаруджваў рух. Багдан адразу вырваўся наперад, пабег імкліва, і яго шырокая спіна ў чорным фрэнчы закрыла сцяжыну, і Захар — у сэрцы хваляй ускіпала злосць — ужо нічога не бачыў наперадзе, а толькі Багданавы плечы, што размерана пакалыхваліся. Яму падалося — Багдан першы зразумеў, што прынята няправільнае рашэнне, і цяпер спяшаецца тое давесці ўсім, паказаць, які паганы з яго, Захара, камандзір. І сапраўды, трэба было, мабыць, счакаць. Трэба было на адвячорку недзе — не будуць жа фашысты поўны дзень у лесе гойсаць! — правесці разведку, адшукаць каго-небудзь яшчэ з атрада... Не ўсе ж загінулі ў лагеры! Бой доўга ішоў, паспелі адступіць, выйсці з-пад агню...

Ён пераканаў сябе, што пароў гарачку з самае той хвіліны, калі пачуў стрэлы ў лесе, адчуваў, што гэта ведаюць усе, хто бяжыць зараз па лясной дарозе, і з таго ўсё мацней прыціскала яго непамыснасць, і злосць усё мацнела, вярэдзіла сэрца. Захар злаваў на самога сябе, злаваў разам на ўсіх, злаваў на кожнага паасобку, і гэтая злосць усё не праходзіла, клалася на душу невыносным цяжарам. З кім ён, камандзір атрада, імчыць зараз у бой? З сынам паліцэйскага! І за спіной у яго, камандзіра атрада, тупае чужынец, Ромель гэты. І гэта ж яму, чужынцу, які летась адкрыта ў вочы смяяўся Захару, ён, Захар, цяпер даў карабін, паставіў побач з сабою! Што, не ў памяці, як ён, гэты Ромель, смяяўся? Кіндэр шпіль! Дзіцячая, маўляў, гульня, гэтая ваша спроба супрацьстаяць бранiраваным нямецкім калонам! Відаць, ён і цяпер пасмейваецца! Дзіўна як павярнуўся лёс! Дзеля чаго ты пакінуў гэтага чужынца жывым? Дзеля таго, каб праз год паказаць яму вось гэткі ганебны канец свайго атрада? Ты ж летась крычаў Ромелю, што ён на свае вочы пабачыць, хто і ад каго будзе ўцякаць! Паказа-аў, няма чаго сказаць! Атрада няма. Атрад разагнаны, разбіты. Вось ён, увесь твой атрад,— на гэтай лясной сцежцы...

Зноў, як гэта ўжо было з ім неаднойчы, ад хвалявання і першовага напружання пачало торгацца левае брыво, і ён са злосцю націснуў над вокам далонёю. Торганне брыва супынілася. Але бачыў ён цяпер блага і міжвольна запаволіў крок, а потым і спыніўся.

Следам за ім спыніліся і ўсе.

— Што здарылася? — спытаў, наблізіўшыся, Траян.— Чаго спыніліся?

Ромель нешта ціха прамовіў, потым залапатаў таропка, паўтараючы адны і тыя ж словы:

— Трэба цурук!.. Трэба цурук!

Траян грэбліва махнуў на Ромеля рукой:

— Заткніся ты сваім «цурукам». Наперад трэба!

— Пачакай ты,— сказаў Захар і, павярнуўшыся да Ромеля і прыгадаўшы, як будзе па-нямецку «навошта», запытаўся, чаго той патрабуе павярнуць назад. Потым угледзеў насмешліва выгнутыя губы Багдана і дадаў памяркоўна, як бы знарок павольна: — Патлумач нам гэта... Патлумач...

Ромель разгублена азірнуўся, як бы шукаў у кожнага падтрымкі, потым хутка прысеў на кукішкі, абапіраючыся на Багданаў карабін, рамень якога быў заматаны ў яго на руцэ. І гэта нечакана абудзіла ў душы Захара нейкае спагадлівае і ўхвальнае пачуццё да Ромеля. Іш, ты! Калі і паваліцца дзе, за корань зачапіўшыся, дык стрэльбы з рукі не выпусціць.

— Слухаю. Я слухаю,— падахвоціў Захар Ромеля, сам дзівячыся з прыхільнасці да гэтага чужынца. Увесь жа час з нянавісцю ставіўся да Ромеля, а вось цяпер як адтаяла нешта ў душы.

Ромель заціснуў у правай руцэ сасновую галінку, хутка накрэсліў ёю на сцежцы некалькі вугольнічкаў, падобных на дзіцячы малюнак хат, паторкаў у іх галінкаю, бы пералічваў, паўтараючы словы «лагер, лагер». Потым прыціснуў растапыраныя пальцы да тых вугольнічкаў, заплямкаў губамі: «пуф-пуф-пуф!»

— От жа паразіт! — засмяяўся Траян.— Бачыце? Памятае, які ў лагеры быў — «пуф». Можа, сам і сігналіў.

— Ды пачакай ты,— зноў перапыніў яго Захар, спрабуючы зразумець, што сіліцца патлумачыць Ромель.— Стралялі фашысты па лагеры — гэта ясна. А далей? Далей што? Дзе тут твой «цурук»? Гэта патлумач!

Сагнутай далонёю Ромель правёў над прамавугольніч-

камі, якія былі намаляваны на сцежцы, змёў іх, зноў залапатаў таропка і незразумела цяпер зусім:

— Інс офэне! Інс офэне! Алес інс офэне!

Захар зірнуў на Артура, нібыта той павінен быў усё патлумачыць, спытаў са спагадлівым смяшком:

— Ты што-небудзь цяміш?

— Нешта ён пра чыстае месца гаворыць. Поле, ці што... Усе, маўляў, у поле...

— Вось-вось,— сказаў Траян.— У поле нас, паразіт, заманьвае...

Дзіўная здагадка мільганула ў Захара — толькі здагадка, не больш! — што Ромель хоча папярэдзіць яго, падказаць разумнае і добрае выйсце.

— У поле,— разважліва прамовіў Захар, азіраючыся на маладыя яліны, якія сціснулі сцяжыну з абодвух бакоў; над ялінамі ўзвышаліся цёмныя, як ссівелыя асіны, далей стаялі бярозы і сосны, і ўсё гэта ўтварала нейкі вузкі калідор, змрочны і пагрозлівы.— А можа, гэта і правільна,— і дадаў паспешліва, загадна: — Рухаемся назад! Парадак — ранейшы. І — дыстанцыя...

Захар ішоў таропка, не азіраючыся. Здагадка, якая мільганула ў яго галаве, цяпер выстрайвалася ў грунтоўны і чоткі доказ, адкрывала сэнс таго, пра што хацеў давесці Ромель. Фашысты падковаю — гэтак трэба разумець рух Ромелевай рукі, выгнутай сярпом,— абкружылі лагер і цяпер гэтак жа, падковаю, ідуць лесам у бок поля, бы цягнуць невад, каб выгнаць партызан на чыстае месца, на бераг Дзвіны, прыціснуць іх да ракі, пад тыя кулямёты, што пастаўлены на той бок, на гравійцы. І самае дзіўнае, што гэтая думка ўжо ў Захара ўзнікала, яна ж была ў яго яшчэ тады, калі ён ляжаў ля забітага каня ў алешнічку, калі бег да лесу. А вось жа вылецела з галавы! І ён кінуўся на самае вастрыё бяды! І людзей шчэ вядзе. На верную пагібель вядзе! Ды адзін аўтаматчык, стуліўшыся дзе-небудзь пад ялінаю ля гэтай сцяжыны, пакладзе іх усіх аднои чаргою!

Пад маладой ялінаю Захар згледзеў снегавы лапік і, не спыняючыся, сагнуўся, зачэрпнуў жменю рассыпчатага снегу, падобнага на белыя крупы, укінуў у рот. Снег раставаў, астуджваў паднябенне, і Захар глытаў гэтае халоднае месіва, задаволена адчуваючы, што адразу нібыта дужэе. Потым ён зноў зачэрпнуў жменю, але снег быў брудны, у нейкіх чорных крапках, і ён змахнуў верхні пласт, і зачэрпнуў чыстага, белага, зноў падобнага на добра ўва-

раныя крупы, і прагна злізнуў іх з далоні. Смак снегу, прапахлага хвояй і прэлым лісцем асіны і крыху гаркавага, нагадаў яму, як зусім нядаўна, лежачы ў засадзе ля старых дотаў, ён сачыў за набліжэннем фашысцкай калоны і ад хваляваппя злізваў вясновы снег з бруствера старога акопа. Нейкі месяц мінуў пасля таго бою! І вось ён, той бліскучы пераможца, як ліпялы заяц, круціцца па лесе, спуджана азіраецца наўкола, адусюль чакае бяды!.. Як жа гэта магло здарыцца?.. Як патлумачыць, што на працягу няпоўных двух месяцаў ён двойчы губляе свой лагер?.. Тады, ля Дуброўкі, загінулі хлопцы Жданко... А колькі цяпер палегла ў лагеры гэтым ранкам?..

Захар зірнуў на тры сагнутыя постаці, што рухаліся за ім следам па лясной сцежцы, і ціха замычэў ад болю; разанула сэрца горыч бяды, увайшла туды і асела, разраслася, і ён пакутаваў ад яе, і яшчэ болей пакутаваў ад думкі, што, магчыма, робіць зусім не тое, што трэба. Ён ліхаманкава думаў цяпер і над прычынаю бяды, і над тым, што Ромель, відаць, падказаў яму разумнае выйсце. Падказаў ці знарок збіў з добрага тропу, гэты Ромель?.. Ромель, Ромель... А можа, з таго, што ты гэтак бестурботна паставіўся да клятага чужынца, пачаў давяраць яму, густа гэтак і навалілася на цябе розная пошасць?.. Не, Ромель тут ні пры чым. Наадварот, тады, як фашысты ішлі на зімовы лагер, ён, Ромель, дапамог адправіць у глыб лесу параненых, а Чагіна дык на сваёй хрыбціне валок. І зараз вось Чэся кажа, што Толіка ўратаваў Ромель... Не, яму можна давяраць... А каму тады нельга? Пасля таго бою ля дотаў Яштокін кожнага ў атрадзе праверыў... А вось бесклапотнасць, пядбайнасць яшчэ больш развяліся. І гэта можна патлумачыць! Як жа, ушчэнт размалацілі гэткую калону! Ніхто да іх у лес цяпер не сунецца, бо — сіла тут! Вось і спалі, аднаго вартавога пакінуўшы. Ды і той, можа, кулаком па вуха пад сасной ціснуў!.. Знайшоў, значыцца, вінаватага! Сам жа болей ад усіх вінаваты! Вось, скажам, учора ўранку сказалі б табе, што пехта з камандзіраў узвода кінуў свой узвод, нікому нічога не сказаў, памчаў, свой асабісты клопат у галаву паклаўшы... Ты што б з гэткім камандзірам зрабіў?..

Ад такіх думак у Захара яшчэ больш узмакрэла патыліца, пясцерпна засмылела рана на шыі. Ён адчайна сіліўся суняць боль, перакінуць думкі не на тое, што было, а на тое, што ёсць, на тое, да чаго ён павінен імкнуцца. Добра, павярнуў назад, не папёр у нерат, які, напэўна ж, ужо

раскінуты. А далей што? На поле выбівацца?.. Не, неразумна гэта, бо на чыстым месцы з гэткай сілаю, якую выдзеш, што ты зробіш?.. Нельга ім на чыстае месца выбівацца, бо там, на полі, іх адразу заўважаць з-за ракі. А там, за ракой, кулямётчыкі сядзяць, ты пад іх агнём папоўзаў. Не выключана, што і мінамёты там стаяць, свайго часу чакаюць... Так што пра поле думаць няма чаго. Зірнуць, праўда, што там і як — не пашкодзіць. Але вытыркацца — нельга! Узлескам трэба! Трэба па ўзлеску выбрацца з гэтага кола, выдрацца з невядомасці, апынуцца не перад ланцугом фашыстаў, а ў іх за спіною. У гэтым — паратунак!

Яшчэ здаля, убачыўшы Чэсю і Рыму на лясной сцяжыне, ён замахаў рукою, загадваючы, каб яны рухаліся наперад. Але яны не скрануліся з месца, стаялі, узіраючыся ў глыб лесу.

— Ну, чаго вы? — спытаў Захар, параўняўшыся з Чэсяй.— Наперад трэба! Гайда, гайда!..

— Там нешта трашчала,— ціха праказала Чэся, паказваючы рукою на асіну, ля якой нядаўна, угледзеўшы мільгаценне постацей за дрэвамі, Захар распластаўся на зямлі.— У тым напрамку нейкі трэск пачуўся... Ці пагалосак... Як рэха нейкае...

— Калі?

— Ды толькі што. Мы на сцежку тады сышлі... Бачым — вы бежыцё. Але трэск у тым баку. Гэта — точна...

Захар, стаіўшы дыханне, прыслухаўся. Але нічога не пачуў, супакоіў Чэсю таропкім пошапкам:

— Ліха з ім. Рухаемся наперад.

— А можа, якраз там, наперадзе, і бяда?

— Дзеля гэтага ж і рухаемся. Трэба ж неяк даведацца. Але ў гэтым баку іх няма,— запэўніў ён Чэсю, угледзеўшы на яе твары разгубленасць, якая не праходзіла.— Я ж з гэтага боку бег. Перад тым як вас стрэць, бег. Чыста тут...

Ён абмінуў Чэсю, пабег даганяць Траяна, які ўжо апярэдзіў усіх. Параўняўшыся з ім, азірнуўся і заўважыў, што цяпер у ланцужку, без аніякага загаду, адбылася перагрупоўка: Багдан бег трэцім, за ім — Чэся, потым была Рыма, якую падтрымліваў Артур, і ў канцы, як бы замыкаючы ўсю калону, маячыла высокая постаць Ромеля. Ён бег не пасярэдзіне сцежкі, а прыціскаўся да самых хвоек, трымаючы напагатове карабін.

«Муштраваны, аднак, салдат...»

Захапленне было міжвольнае і кароткае, як міг бліскавіцы, яно тут жа саступіла месца іншай думцы, якая завітала зусім нечакана і прымусіла Захара зжахнуцца. А што, як ён, чужынец гэты, возьме ды і грымне з карабіна па табе. Гэтым і завершыцца тваё камандзірскае жыццё!..

Час ад часу Захар, не спыняючыся і не сцішаючы хады, зыркаў назад, і штораз яго позірк натыкаўся на высокую постаць Ромеля, які бег прыгінаючыся, усё гэтак жа захоўваючы ранейшую дыстанцыю, хілячыся бліжэй да ялінак. Пазіраў жа ён чамусьці толькі ў адзін бок — налева ад сцяжыны. Як нешта там прыкмеціў і цяпер цікуе.

Сцяжына павярнула ўправа, потым неўзабаве разгалінавалася на дзве, і Захар вырашыў рухацца па правай, якая была шырэйшая і якая, як яму падалося, не выводзіла на поле.

Крыху прайшоўшы па новай сцяжыне, падобнай ужо на дарогу, ён перакапаўся, што не памыліўся: па ёй ён імчаў па той, што павярнула ўлева. Паабапал сцяжыны цяпер стаяў сасняк, не вельмі густы, з рэдкім куп'ём ядлоўцу, вакол якога ляжаў чысты і белаваты, месцамі ажно сіні, нізкі і густы, бы шчотка, мох. Захар паспакайнеў. У гэткім лесе бачна далёка, і па табе знянацку ніхто не стрэліць — гэта не тое што на сцяжыне, аблепленай з абодвух бакоў шчыльным ельнікам. Цяпер толькі сачы ўважна вакол, каб першым заўважыць небяспеку. А яе, здаецца, нідзе паблізу не прыкметна і не чутно. Злева, праўда, лес зусім ужо рэдзенькі, поле там, відаць.

— Робім прыпынак,— загадаў Захар, адчуўшы, што і сам выбіўся з сілы і людзі стаміліся.— Трэба разведаць, што тут вакол нас. Там вунь, мабыць, поле блізка. Хто са мною? — і тут жа вырашыў сам: — Траян пойдзе. Астатнім — залегчы. Быць гатовым да абароны!

Па тым, як усе паспешліва і ахвотна кінуліся на зямлю, Захар здагадаўся, што правільна зрабіў, загадаўшы зрабіць гэты прыпынак. Колькі ж можна гэтак бегчы! І сам ты ўжо амаль з сілы выбіўся, ледзьве ногі цягнеш. А на Чэсю зірні! Ёй жа з малым бегчы! І яшчэ добра, што малы разумны: маўчыць, бы рыбіна!

Закінуўшы аўтамат за плячо, Захар памалу падыбаў у напрамку нізкага ядлоўцу, за якім лес здаваўся радзейшы. Крыху спагадзя ён перакапаўся, што выбраў верны напрамак: поле было якраз у тым баку. Яно адкрылася нечакана, як толькі Захар спусціўся з пагарка, густа парослага ядлоўцам. І яшчэ больш нечаканым было тое, што Захар

убачыў на гэтым полі, якое паката апускалася ад узлеску ў бок Дзвіны. Ён нават не паверыў сваім вачам.

«Фашысты?! Так, яны!..»

Брыво зноў таргапулася, і ён інстынктыўна пахіснуўся назад, прысеў за разгалісты, як чаромхавы, куст ядлоўцу, зыркнуў на Траяна, каб папярэдзіць яго. Але Траян, які крочыў увесь час не ўпобачкі, а крыху злева ад Захара, таксама прысеў, моўчкі, вачыма толькі, паказаў у бок поля.

Захар амаль на карачках праціснуўся паміж разгалістым ядлоўцавым кустом і ядлоўцам тонкім, як верацяно, але шчыльным і зялёным, і зноў, цяпер ужо ўважна, агледзеў поле.

— У-у-у, колькі груганоў павысыпала,— пошапкам працягнуў Траян, які надпоўз бліжэй і стуліўся на той бок тонкага ядлоўцу.— Гэты ваш немец правільна іх разгадаў. Ву-унь, які нерат цягнулі яны па лесе. Ускочылі б у самую сярэдзінку, каб на лагер пёрлі...

Два ланцугі салдат, выгнутыя вялізнай падковаю, аддаляліся ад лесу, быццам спаўзалі па лугавіне ў бок шырокай палосы прырэчных лазнякоў. Захар з Траянам апынуліся на правым баку падковы, канец якой, пад вуглом, сунуўся полем на астравок могільніку, але сунуўся марудней, чым левы бок, які ўжо выходзіў на жаўтлявую стужку дарогі; гэты, левы бок падковы як бы ўсё яшчэ чапляўся за ўзлесак і, хоць і рухаўся, аддаляўся ад яго амаль неўпрыкмет.

Захар наважыўся параіцца з Траянам, што рабіць, павярнуўся да яго і тут жа згледзеў краем вока нейкі рух злева. Ён павярнуў галаву, і ў яго па спіне буйнымі кроплямі пакаціўся халодны пот: з-за маладых прысадзістых сасопак, што як бы выскачылі з лесу і спыніліся на полі, выйшлі два салдаты, у расшпіленых фрэнчах, з аўтаматамі на грудзях. Адзін салдат, аберуч трымаючы, нёс пілотку, і ў пілотцы той нешта было пакладзена. У другога пілотка была заціснута пад дзягу, якраз пасярэдзіне жывата, дзе сыходзіліся барты фрэнча; пілотка матлялася, то адкрываючы, то закрываючы белую шырокую спражку. Салдаты, як бы нешта шукаючы на зямлі, варушылі ботамі белы леташні быльнёг ля сасопак.

«Да сасонак крокаў пяць...»

Рэакцыя на небяспеку была ў Захара маланкавая.

— Я — гэтых,— прасіпеў ён. Кароткая думка пра тое, што, калі яны з Траянам кінуцца ў глыб лесу, салдаты апя-

рэдзяць іх і кулі дагоняць, мільганула і знікла, скасаваўшы жах і разгубленасць.— Ты на тых, што на полі...

Ён ускінуў, адначасова рвануўшы затвор, аўтамат; гэты рух і слабае чаканне затвора салдаты ля сасонак пачулі, яны, як па камандзе, павярнулі галовы. Але Захар ужо націснуў, амаль не цэлячыся, на спуск і ўбачыў, як салдаты выгнуліся грудзямі наперад, як узляцела ўверх пілотка і з яе насыпаліся чорныя камякі.

«Гэта ж грыбы ў пілотцы былі! Смаржкоў у лесеназбіралі...»

Ён падумаў гэта са здзіўленнем, без злосці, але ў тое ж імгненне злосць вярнулася, і Захар, толькі на міг зняўшы палец са спуска, павёў аўтаматам управа і даў доўгую — на ўвесь патроннік — чаргу па чорных постацях, якія рассыпаліся па полі. Стрэлаў Траяна ён не чуў, толькі бачыў, як яго левая рука, на якой ляжаў аўтамат, уздрыгвае на ядлоўцавай галіне, трымціць і калоціцца, быццам сасмыргвае з яе светла-зялёнае тонкае шыгалле.

## 2

Захар стаў на ўскрайку братняй магілы, зняў з галавы фуражку, пакруціў яе ў руцэ; зыркі водсвет — промні сонца, якое садзілася за ракой, як бы вырываліся з-пад галін чаромхі — зляцеў з чырвонай эмалі зоркі і ўдарыў яго па вачах, і навекі таргануліся, як хвастанула іх хваёвая галінка, і ён зміргаў і разгубіўся, быццам быў выстаўлены спецыяльна на агляд партызан, якія месціліся па той бок магілы, і забітых, якія ляжалі перад ім на зямлі. Ён разумеў, што стаіць тут, перад рэшткамі свайго атрада, каб сказаць развітальную прамову, і ўсё-ткі гэтая думка прыгнятала яго, і ён адчуваў, што патрэбных для развітання слоў у яго няма, што ён не ведае, як пачаць свой зварот і да мёртвых і да жывых.

Ён павольна ўзняў руку, крануў казырком фуражкі навекі, быццам прымушаў іх не торгацца, і тады зноў зірнуў на забітых, што ляжалі ў два рады побач з доўгім пагуркам рудой, як бы саржавелай, жарствы, якую толькі што рыдлёўкі выкінулі з глыбі на паверхню зямлі; жарства была вільготная, як пасля нядаўняга дажджу. Позірк спыніўся на твары таго, хто ляжаў першым у радзе, ляжаў неяк не зусім роўна, быццам патрохі сам сунуўся да магільнай ямы, і нешта знаёмае згледзелася Захару ў бя-

лявай чупрыне, што закрывала амаль увесь лоб забітага і звальвалася на вушы, у якіх сиякласа і закарэла кроў. Сонечныя промні, вырываючыся з-пад галін чаромхі, асвятлялі забітых няроўнымі на яркасці палосамі, і краёк самай светлай палосы ляжаў якраз на гэтай бялявай чупрыне.

«Загурскі... Як жа ён на Загурскага падобны...»

Успамін пра Загурскага быў нечаканы і балючы. Нічога, аказваецца, не сцёрлася з памяці. Але Загурскі пахаваны даўно і далёка адсюль, ля Дуброўкі. Там пахаваны, дзе пахаваны хлопцы Жданко, якія загінулі, абараняючы вёску — твой загад выконваючы, загінулі! — вось у гэткі ж сонечны дзень... Не, тады быў дзень хмарны, сонца выбілася над лесам толькі ўвечары, на гадзінку, перад самым заходам... І жарства гэтак жа блішчала... І магіла была вось гэткая ж доўгая, і гэткай жа гурбою ляжалі рудыя, як саржавелыя, глыжы і дзірваны... Блытаеш ты, Захар. Загурскага хавалі разам з Хвастовым і Кулiновічам, утрох іх пахавалі ў адной магіле. І тады не было аніякага сонца ні ўдзень, ні ўвечары — дуйка круціла. Памятаеш, па якім снезе пасля пахавання ехаў да старога Загурскага?.. Гэта ж у лістападзе было. А хлопцы Жданко загінулі напрадвесні ўжо, зусім нядаўна. Тады Чагін казаў, што ён, Захар, знайшоў дужа добрыя і прачулыя словы ў памяць загінуўшых... Чаго ж цяпер ты маўчыш? Няма слоў? І Чагіна таксама няма. І яму твае словы ўжо зусім непатрэбны. Ляжыць вось ён на халодным доле, маўклівы і нерухомы. Якія хочаш словы кажы — не пачуе... І гэты бялявы хлопец, які побач з ім ляжыць, таксама не пачуе. І словы твае, хай сабе нават самыя добрыя, самыя ласкавыя і прачулыя, не сагрэюць хлопцаў, не вернуць, не ўзнімуць на ногі — ім, забітым, ужо ўсё роўна, якія словы скажаш, якія словы будзе казаць яшчэ хто-небудзь... Іх не ўсцешыць і тое, што загадаў ты вырыць магілу вось тут, на самым прыгожым пагорку, дзе чуваць пошум сосваў у бары, адкуль відаць Дзвіна, жаўтлявыя шаты лазнякоў над ёю, відаць схіл ручая ў чаромхавых гушчарах, дзе заспяваюць вясною салоўкі... Неўзабаве і заспяваюць — ву-унь як закучаравілася зялёным дымам чаромха... А хлопцаў ужо няма, спеваў тых ім не пачуць болей... Не, словы патрэбны! І гэткія патрэбны словы, якія б потым нідзе не прапалі, якія б засталіся жыць у людскіх сэрцах, якія б жылі, як добрая памяць, вечная, неўміручая...

Але слоў гэткіх у Захара не было.

Ён ужо разумеў, што маўчанне зацягнулася празмерна, што сказаць нешта яму ўсё роўна давядзецца.

— Бывайце,— глуха прамовіў Захар.— Мы адпомсцім за вас...

Перасохлае паднябенне як скарэла, бы лопалася ад гэтай сухасці, і боль адтуль, з паднябення, асеў у горле. Захар адчуў, што не зможа сказаць болей аніводнага слова, і моўчкі адступіў на два крокі ад магілы.

Забітых на адным клалі на трафейную плашч-палатку і апускалі ў дол. І ўсё гэта рабілася ў маўчанні, толькі ціха час ад часу рыпала пад ботамі жарства, і гэтае рыпенне бы нажом кроіла Захару сэрца.

— Салют трэба было б...— ціха прамовіў Яштокін, які стаяў цяпер побач. Перад пачаткам пахавання, калі капалі дол, ён быў на тоії бок магілы ўвесь час, а цяпер наблізіўся неяк незаўважна і ціха.

— Ім? — Захар спытаў, злёгку кіўнуўшы галавою ў бок магілы і не разумеючы, з чаго пачаў зноў гэтую гаворку Яштокін. Дамовіліся ж, што ніякага салюту не рабіць, а вось ён зноў пачынае гэтую гаворку, быццам хоча перад кімсьці апраўдацца.— Ім ён не патрэбен. У іншым месцы салютнём...

Яштокін нічога не адказаў, нібыта палічыў, што быў абавязаны прапанаваць гэта Захару, і прапанаваў, і хай усё будзе так, як ён, Захар, лічыць. Як неахайна, аднак, засцілаюць палаткамі — палатак знайшлося толькі дзве — забітых: закрылі толькі галовы і грудзі, а ногі тырчаць, і глядзець туды, у дол, жахліва. Захар перасіліў у сабе гэтае пачуццё жаху і паглядзеў, потым сагнуўся, зачэрпнуў жменю жарствы і сыпануў яе ў магілу. Следам за ім зрабіў гэта Яштокін, і потым неяк усе, хто быў ля магілы, зрабілі тое ж, і жарства суха забарабаніла па настылым і калянным брызенце.

Суха зашорхалі рыдлёўкі, засыпаючы магілу.

Магіла была на пагорку. Адным краем ён прыціскаўся да густога бору, а з другога боку быў акаймаваны чаромхавым парасні кам, што клінам выпаўз на ўзгоркавае поле і спыніўся, як збаяўшыся старых соснаў, якія выкінулі яму насустрач доўгае колкае голле і быццам спіхвалі яго назад, у глыбокую ручаіну; ручай каціўся ў Дзвіну, якая была непадалёк і праглядвалася адсюль, з пагорка,— рудыя глiністыя берагі, з кучомкамі жоўта-белых вербалозаў, падзеленых гладкай і зыркай, бы з белага халоднага шкла, стужкай. Сонца віссла за левым берагам, нізка, як зачапі-

лася за гліністы ўзвал, вялікае, але не агнявае, а нейкае бляклае, бы загорнутае ў маліпавую тканіну; злева, як бы ўваткнуўшыся ў тое маліпавае кола і зламаўшыся, завісла тонкая і вузкая, як лязо нажа, свінцовага колеру аблачынка.

Захар узіраўся ў гэтую аблачынку, узіраўся ўпарта, бы сіліўся нешта разгледзець за ёю, баючыся апусціць вочы і зірнуць яшчэ раз у дол. Ён прыкмеціў гэтую аблачынку раней, калі Яштокін завёў гаворку пра развітальны салют, і цяпер здзіўлена заўважыў, што тое вузкае лязо нажа і сама рака ўжо змянілі свой колер. Ён бачыў цяпер не свінцовае і цьмянае лязо, а нейкае чырвонае з аднаго боку, бачыў маліпавую стужку вады, сцямнелы гліністы ўзвал, які за паваротаю ракі быў акаймаваны пышнымі кучомкамі жаўтлявых вербалозаў — берагі там як бы падскоквалі ўгару! — бачыў цёмна-зялёны дым, які ўхутаў чаромхавы параснік, і быў разгублены, змяты, спустошаны думкаю пра сваю асабістую віну ва ўсім тым, што адбываецца на гэтым пагорку. Перад пахаваннем Захар — асабліва пасля гаворак з Яштокіным, які, здаецца, добра зразумеў яго і ўсяляк падтрымліваў і бадзёрыў! — ужо крыху супакоіўся, не гэтак моцна сябе вінаваціў, як рабіў тое ўранні і ўдзень. Але тут, на пагорку, калі ён зірнуў на партызана, які ляжаў побач з забітым Чагіным і быў падобны на маладога Загурскага, які ў баі ўратаваў яму жыццё, адчуванне свае ўласнай віны ў стратах атрада зноў выбухнула з новай сілаю, і скроні прабіў востры боль, ніколі раней не ўведаны, і ён зрабіў колькі крокаў ад магілы, як адасобіўся ад усіх, і пачаў глядзець у бок Дзвіны, за якой садзілася вечаровае сонца.

«Загурскі ўратаваў мяне ў баі. Дзе гэта было? А на дарозе, калі зрабілі засаду ля дарогі і машыны спалілі...»

Ён прыгадаў гэта раптоўна, і яму зрабілася ніякавата, што цяпер вось захапіўся прыгажосцю краявіду; яшчэ больш памацнела разуменне таго, што толькі ён адзін вінаваты ў разгроме атрада. Яму зрабілася сорамна і брыдка і з таго, што цяпер, вось у гэткі горкі для ўсіх час, можа захапляцца ззяннем вады ў рацэ, зялёным дымам чаромхавых параснікаў, агняна-маліпавай аблачынкаю, што нацэлілася цяпер у жаўтлявы гліністы касагор над Дзвіною. Гэта ж жахліва тое, што з ім, Захарам, зараз адбываецца. Побач вось, перад ім, у гліністым доле жвір усё глыбей засыпае забітых сяброў, а ён шнырыць вачыма па наваколлі і захапляецца ім. Ён разумеў, што робіць брыдка,

але нічога не мог парабіць з сабою і дыхаў пахкім паветрам, якое гнала ад ракі сюды, у бок лесу, і якое мякка пашчыла твар; ён адчуваў яшчэ, што недзе глыбока ў душы выспявае — выспела ўжо! — адчуванне таго, што смерць Чагіна і гэтага маладога партызана, падобнага на Янку Загурскага, і смерць другіх партызан яго атрада — гэта ўжо даўняе, тое, што было і ніколі не вернецца, што яго, Захара, аддзяляе ад Чагіна не толькі гэты пласт зямлі, які таўсцее з кожнай хвілінаю, а нешта непараўнальна большае, мацнейшае, больш значнае. Зарыюць магілу, наставяць слупок з драўлянай зоркаю ўверсе, пафарбаванай журавінамі ў бледна-ружовы колер, і ўсе пойдуць адсюль, і тут застануцца толькі маўклівы пагорак, сіняе неба над ім, малінавы бляск Дзвіны... А потым сцямнее неба, наваліцца ноч, але і яна пройдзе, і зноў запалае барвамі далягляд, толькі ўжо з другога боку, за лесам, і ўзыдзе сонца, а потым зноў вернецца сюды, дзе зараз, завісне над прырэчнымі лазнякамі, у малінавы колер нафарбуе ваду і берагі...

Захар нечакана ўгледзеў, што вузкая аблачынка, што ўпіралася ў сонца, цяпер ужо вісіць вышэй, а сонечнае кола краёчкам села на жаўтлявыя шаты лазнякоў, зрабілася крыху пляскатае, і на малінавай плыні Дзвіны з'явілася яго адбітак, аднолькавы па колеры і памерах; дзве агністыя палосы пацягнуліся ад гэтага сонечнага кола, што ляжала на вадзе, бліжэйшая, над гэты бераг, была зыркая і бліскучая, а тая, што прыціскалася да гліністага абрыву, увачавідкі цямнела, расплывалася па вадзе, бы сіняя фарба.

Ён прымусіў сябе павярнуцца тварам да магілы. Жоўта-белы пагорачак жарствы змізарнеў, чорнае зеўрала магілы, куды ляцелі з рыдлёвак бела-жоўтыя глыжы, змялела і было ўжо зусім неглыбокае; дзвынькалі каменьчыкі па жалезных далонях рыдлёвак, і цяпер гэтае дзвынькание ўжо меней калола вушы, яно як бы прасейвалася праз нейкае сіта. Але галасы партызан, якія падграбалі рыдлёўкамі жвір, зрабіліся гучнейшыя, нават ажываліся, і сярод іх неяк вылучаўся Багданаў голас.

— Чакай, Голуб! Падраўнаваць гэты краёк трэба,— папрасіў Багдан, пастукаўшы рыдлёўкаю па краіку магілы.— Сыпані сюды зямліцы... Ага... Добра... Цяпер — сюды!..

Голуб, з карабінам за плячыма, павернутым ствалом уніз, увішна сыпаў жарству на рыдлёўку, якую Багдан

трымаў плазам. Вялікі камень гучна бомкнуў на жалезе, і Багдан нахіліўся, рукамі выбраў камень з жарствы, адкінуў. Старая, выпаленая на сонцы палатняная кепка сядзела на круглай Багданавай галаве вельмі пязграбна, бы трымалася толькі на даўно нястрыжанай чупрыне, і здавалася, што яна вось-вось, варта толькі яму крутнуць галавою, зляціць на дол і пакоціцца, бы кола. Але Багдан і нахіляўся, і паварачваўся, а кепка сядзела, бы прыклееная.

Рыдлёўкі мякка забухалі, запокалі, калі ўзяліся падраўноўваць магільны пагорак, і гэтае мяккае покание адгукалася болем у Захаравых скронях: у грудзях раптоўна зрабілася горача, дужа захацелася піць. Смага пачала душыць Захара, і ён, правёўшы языком па губах, адчуў іх шархоткую гарачыню.

— Пайду... вады глытну,— з цяжкасцю выціснуў з сябе Захар і, не чакаючы, што скажа яму Яштокін, марудна паваloкся да ручая.

Густы, саладжавы пах чаромхі, якая ніччэ не цвіла, але дружна зазелянела на гэтым, паўднёвым, схіле ручая, ачмурыў, і Захар, нахіліўшыся да вады, ледзь не зваліўся ўглыб — паспеў у апошні міг учапіцца ў старую, нядаўна ссечаную вольху. Ля самага берага, у залітых па самыя макавінкі тонкіх атожылках маладой чаромхі, вада была не жаўтлявая, як пасярэдзіне ручая, а чыстая, амаль празрыстая; ён зачэрпнуў як не поўную фуражку і пачаў піць ваду, што моцна патыхала чаромхай, потым выліў рэшту на рукі, памыў твар і памалу паваloкся ў бок Дзвіны.

Нейкае незнаёмае пачуццё гнала Захара наперад і наперад, і ён, рызыкуючы зваліцца ў ваду, прадзіраўся праз хмыз па слізкім ад глею беразе, іншоў няспынна, пакуль не выбіўся на месца амаль чыстае і роўнае. Нешта вельмі знаёмай здалася яму гэтая мясцінка, дзе бераг ручая нагадваў тэраску на дзве прыступкі. Як хто рыдлёўкаю некалі раўнаваў тут бераг, потым трава зацягнула зрэз, вада зашліфавала. Здаўся знаёмым і смалісты корч, адгаблява-ны з аднаго боку сякераю: з гэткага вось карча насек смалякоў ён, Захар, леташняй вясною, калі гасцяваў у бацькавай хаце Ягор і яны паехалі рыбаліць... Падобна, што і ручай гэта той, і корч той, і тэраса тая... Недзе ніжэй, дзе зараз вада, палілі яны тады вогнішча, варылі юшку, наставіўшы шнуры на ноч. Ранкам з тых шнуроў — о-ох і бедаваў потым Пахом, калі дазнаўся пра рыбацкую ўдачу! — яны знялі чатырох ладных самоў. А юшку варылі

з акупёў, якіх пасмаргалі на вуды, і шчупачка, які схапіў блешню, што цягнулася за чоўнам, як ехалі...

Захар наблізіўся да карча, пачаў разглядаць пласт шумавіння, якое паначаплялася на тоўстае карэнне. Не, не той гэта корч — яны тады на правым беразе рыбалілі, а тут жа — левы! — зусім не той. Ля зямлі і з бакоў карані абкручаны, як вяроўкамі, пасохлай травой і асакою, і цёмная гнуткая ажына паўзе па каранях. Бы седала нейкае тут хто паставіў! Сапраўды, як крэсла якое, спінка нават ёсць, вузкае, адсечанае наўскасяк.

У каранях карча нешта цьмяна бліснула, быццам запалілася і адразу ж згасла таемная светлая плямка. Захар, нагнуўшыся, пакратаў рукою мяккі пласт паводкавага шумавіння: пальцы натыкнуліся на халодны і вільготны метал.

«Схованка нейкая?.. Не, кавалак дошкі... І ручка на ёй дзвярная...»

Ён выцягнуў з-пад шумавіння кавалак дошкі, пакруціў у руках, разглядаючы. Шуганула ў скроні гарачыня: якая знаёмая ручка! Гэткая ж — белая, з нікеляваным сардэчнікам — была ў дзвярах сянец бацькавай хаты! Няўжо адтуль яна? Адтуль, напэўна ж! Шрубчыкі ж вось!.. Няроўна завінчаныя, з адламанымі краёчкамі галовак...

У перадваенным красавіку Захар дапамагаў бацьку рамантаваць сенцы, стаўляў новыя ручкі, якія сам і прывёз з Віцебска. Адвёртка была вялікая, моцная, а шрубчыкі дужа слабенькія, і ён пааблямваў ім краёчкі, і потым пазаганяў малатком, як цвікі. Бацька праз тое пасварыўся, але потым супакоіўся, патузаўшы ручкі: сядзелі моцна, як прываранымя. Надзейна тады Захар зашрубіў ручкі: замок выдраны, дошка зламалася, а ручкі трымаюцца, не адарваліся, не адваліліся. Але зламалася дошка дзіўна нейк. Ці не кулямі пасечаная?.. Сапраўды, кулямі... А фарба не аблупілася амаль... Бацьку не па душы, помніцца, спачатку быў колер фарбы, якую купіў Пахом. А маці адразу ўпадабала, казала, што вішнёвы колер нямаркі і вока ласкаць. І Захар падтрымаў брата, ухваліў фарбу, і маці гэтым вельмі ўзрадаваў. А тады і бацька пагадзіўся...

Захар нечакана пачуў галасы, якія набліжаліся. Павярнуўшы галаву, убачыў Багдана і Голуба — яны ішлі па схіле ручая да вады. Голуб цягнуў дзве рыдлёўкі па зямлі, і яны пазвоньвалі; Багдан жа заціснуў рыдлёўкі пад пахі і звёў канцы ручак на грудзях, бы звязаў іх.

Не дайшоўшы да карча, на карані якога сядзеў Захар, Багдан і Голуб спыніліся.

— У-ух ты, затока якая,— сказаў Багдан, прысвіснуўшы.— Сюды б гранатку запурыць. Во-о, юшачка была б!

— Асцярожней, ледзь мяне не спіхнуў,— папракнуў Голуб.— У самую глыб. Была б нам тады юшачка. Шчупачкі б сёрбалі!

— Вады, халера, поўна. Пад самы ж лес Дзвіна разлілася. І нічэ ж не ўвесь снег з лясоў сагнала.

— Вада разліваецца — жыта прыбаўляецца,— Голуб пачаў моцна шараваць рыдлёўку аб лазнякі.— Помніцца, Ціхан Елісеевіч гэта любіў паўтараць, калі паводку глядзеў. Калі вады ў Дзвіне вясною многа — год ураджайны...

Багдан змрочна адгукнуўся:

— На магілы ўраджайны. Дзе тое лета, а мы ўжо вось якое жніво маем. Свінцовае гэта жніво не разбірае, многа вады ці мала. Стары ці малы... Пад адзін грабень валіць...

Голуб шумна ўздыхнуў:

— Што праўда — то праўда, браце: пад адзін грабень, праклятае, чысціць. І на ўсё жыццё — знак. Гэтае ж, ведаеш, сёння мне ноччу зноў саснілася, як малых на машыне летась па Віцебск пёр. Звычайна, як сасніцца, потам аблію́ся, ускочу, і да раніцы сну няма. Гэтак і сёння... Ляжу, ведаеш, а перад вачыма ўсё тое ж: бярэзіна па дарозе, кавалачак дзіцячай кашулькі на ёй матляецца і легкавушка коламі дагары. І — у агні. А мог жа я не пабегчы з машыны, каб бярэзіну тую з дарогі скінуць, ці на палову мінуткі ля машыны пастаяць болей. І — капут, не гамаціў бы я зараз з табою... І што дзіўнае! Сон гэты, лічы, мяне і ўратаваў. І не толькі мяне... Каб я боты не надзеў, ды з зямлянкі не выйшаў, ды, стрэл пачуўшы, туды не кінуўся з аўтаматам... Што было б, скажы?

— А каб мы на таго кулямётчыка не наскочылі? Так што тут адно ведай: якая табе зорка свеціць — пад тую і станавіся.

— А ты што, сваю заўсёды ведаеш, зорку гэтую?

— Мне пакуль што добрая свеціць. Я ж казаў табе, па якіх цвіках скакаць даводзілася — жывы ж, бачыш... Хаця, тут мне камбату нашаму дзякаваць трэба. Харошы наш камбат быў. Гэта — камандзір з галавой. З ім ваяваць можна было.

— А з нашым, значыцца, нельга?

— Я гэтага не кажу. У Ягора Крупні Акадэмія за плячыма была. І вопыт.

— Нейкі недавер у цябе да нашага камандзіра, як мне падалося.

— Але ж і ён жа гэтак да мяне, не верыць — я гэта адразу адчуў! — што ў нас з бацькам дарогі розныя, неаднолькавыя. Праўда, калі разабрацца, дык і стары мой — не з імі. Гэта я точна ведаю. У мяне шчырая гаворка з ім была. Фашыстаў бацька мой ненавідзіць.

— А чаго ж тады шчыруе на іх?

— Не дужа ён, калі разабрацца, і шчыруе. Заблытаўся. А цяпер — баіцца, што заявіцца сюды, а яго — да сасны...

— Ты ж вось не збаяўся.

— З другога цеста я зроблены. Мне, кадраваму салдату, ганьбу сваю — палон — крывёю змываць трэба. Ды каб і не гэта, усё роўна мне з чужынцамі не жыць у згодзе ніколі.

— Чаго ж гэта?

— Я ж табе кажу: з другога цеста я... Яны — чужынцы. А я — нарадзіўся тут... О-о, чорт! Ледзь рыдлёўка ўглыб не шуснула.

— Глядзі! Давід за яе сем шкур злупіць. У яго, ведаеш, кожная сякерка і рыдлёўка — на ўліку. Армейскі парадак!

— Ха! Знайшоў, што ўлічваць!

— Давід — галава. Пальцам зямлянку не зробіш, як ён гаворыць.

— А цяпер што, зямлянкі будзем рабіць?

— А як жа! І папацець давядзецца. Новае месца абжыць не лёгка. Я быў думаў, як гэты лагер ставілі надоўга. А вось бачыш — зноў пярэбары!

— Навошта тыя зямлянкі, калі лета наперадзе? Пад яліну прысеў — табе і дом гатовы.

— А параненых куды? А жанчыны? А хлеб спячы, есці зварыць? Не-е, на вайне без жытла не абысціся. Так што шаруй, шаруй рыдлёвачку, каб лягчэй потым зямельку грабла.

— Толькі хай грабе не гэткую, як сёння...

Нейкі час гаворкі не было, толькі цвінькалі, пазвоньвалі рыдлёўкі і плёхала, цмокала вада. Потым прагучаў ціхі, са шчырым болем, голас Голуба:

— Шкада хлопцаў...

— Захар, я прыкмеціў, дык ажно ўчарнеў.

— У яго адно гора на другое села. Думаеш, лёгка не-

ражыць. А ён, між іншым, заціснуў сэрца... Мужны чалавек. І камандзір мудры...

— О! У цябе цэленькі пачак. Дай адну.

— Ты спачатку рыдлёўкі бяры, а потым — цыгарэціну. І — хада.

— Слыш, а мо аджалкуем гранатку? Тут шчупакоў — рыдлёўкаю грэбці будзем.

— Ты што? Нават салют не рабілі — патронаў шкада. А ты — гранату!

— Ды не сваю ж, нямецкую кінем.

— Пайшлі, пайшлі... Работка чакае...

Забрэнькалі рыдлёўкі, зашурхалі чаромхавыя кусты, і галасы пачалі аддаляцца. Захар павёў галавою ўправа, згледзеў у прагалах галля дзве чалавечыя постаці, і тут жа яны зніклі, закрытыя шчыльнай сцяною маладой чаромхі. Але Захар усё сядзеў нерухома, баючыся, што Багдан і Голуб, якія былі ўжо далёка, могуць яго заўважыць.

Міжвольна падслуханая гаворка нечакана ўзрадавала. Захар не памыліўся, аказваецца, што адпусціў Кандрата. Багдан кажа, што бацька не служыць фашыстам і ненавідзіць іх. Але што ж тады піхнула старога чалавека ў паліцыю? Памыліўся, Багдан кажа, і цяпер баіцца. Магчыма, гэтак яно і ёсць. Але толькі словам верыць нельга. Нельга? А чаму ж ты тады паверыў словам Кандрата? Не, трэба і словам верыць, калі за гэтымі словамі — праўда. Багдан і Голуб гаварылі паміж сабою шчыра. Яго, Захара, значыцца, ніхто не абвінавачвае ў тым, што здарылася. Наадварот, яго прызнаюць за камандзіра разумнага, за чалавека мужнага... Як гэта Голуб казаў? «У яго адно гора на другое села...» І з гэтым горам яму цяпер жыць.

Захар пацёр пальцам кавалак дошкі, якую па-ранейшаму сціскаў у руцэ, тоўсты пласт ссохлага глею скрышыўся і адваліўся. Сапраўды: сіні колер! Значыцца, памроілася табе, дружа, усё: ніколі да гэтага дня не бачыў ты гэтых белых ручак на невядомых табе дзвярах... І нехта, зусім табе невядомы, завінчваў гэтыя шрубчыкі... Чаму ж, аднак, памроілася гэтак яскрава?.. А-а, ручкі падобныя! Але ж ад ручак тых, ад дзвярэй тых, у вішнёвы колер фарбаваных, ад хаты ўвогуле толькі попел і вугалле засталіся...

Боль, што Захар з дня ў дзень гасіў у сваім сэрцы і які апошнім часам пайшоў на спад і як выветрыўся зусім, калі ён слухаў гаворку Багдана з Голубам, цяпер ажыў зноў, перацісну́ў горла; шырокі каляны абруч абціснуў

скроні; за вушы, у глыб патыліцы, папаўзло дзіўнае бомканне, падобнае на бязладнае вясновае галёканне гракоў ля гнёздаў; Захару падалося нават, што гракі мітаюцца над ім, садзяцца на плечы, дзяўбуць у шыю, і ён, баронячыся ад іх, узмахнуў рукою.

Як бы ад гэтага яго руху зашастала непадалёк чаромха, і Захар стаіўся, зірнуў у той бок, куды пайшлі толькі што Багдан і Голуб — у тым баку зашамацеў хмызняк. Няўжо вяртаюцца? Гранатку, відаць, усё-ткі вырашылі кінуць у ручай!.. Ну, схопяць яны на юшку! Але крокі лёгкія, асцярожныя — падобна, што бяжыць нехта. І — голас. Яго, Захара, кліча нехта! Ды гэта ж Чэсін голас!

Ён, не ўзнімаючыся са зручнага седала, абазваўся.

— А-а, вось ты дзе,— Чэся выйшла з-за чаромхавага куста, пакульгваючы, убачыла ў Захаравых руках кавалак дошкі: — Знаходка?.. Ты глядзі: ру-учка! — і дадала з развагаю, узяўшы ў яго абломак дошкі: — Нечыя дзверы былі... Нехта адчыняў іх, выходзіў на вуліцу і радаваўся новаму дню...

— Што-небудзь табе гэтая ручка нагадвае?..

Чэся паціснула плячыма.

— А мне падалося: з бацькавай хаты,— Захар абмацваў пальцамі вострыя краі дошкі.— А потым прыгледзеўся — незнаёмая. Бачыш, як кулі дошку пасеклі? — ён пакруціў дошку ў руках.— З кулямёта, відаць. Разрыўнымі лупілі...

Захар, нечакана для самога сябе, пачаў расказваць пра тое, што прыгадалася яму, калі ён узяў у рукі кавалак дошкі з дзвярной ручкаю: як насварыўся бацька на яго за тыя садраныя галоўкі шрубчыкаў, як Ігарку даручылі фарбаваць філёнкі, і ён ганарыўся гэтым даверам, але змудрыўся нават і нос фарбаю перапэцкаць...

Чэся хуценька, тоячыся ад Захара, схавала кавалак дошкі і, калі Захар угледзеў гэта, прыкрыла схованку локцем, як незнарок руку павярнула, сказала бесцырымонна, быццам злавала на тое, што ён за ёй падгледзеў:

— Ты не павінен пра сваіх болей думаць! Гэтак жа, як я не думаю пра свайго Мсціслава.

— Тут — дзеці.

— А там — бацька Толічка. І ўвогуле, мы павінны сябе заўсёды настройваць на самае горшае. Замест нас з табою маглі сядзець тут зараз тыя, што ляжаць там...

Чэся хітнула галавою ў бок лесу, і Захар зразумеў, што яна мае на ўвазе хлопцаў, пядаўна пахаваных у брацкай

магіле. Гэтая Чэсіна думка — не супакоівала Чэся, не суцяшала, а вось сказала проста і бязлітасна пра розны лёс! — нечакана дужа ўразіла Захара. Цікава, пра што б — сапраўды, магло ж здарыцца і гэткае! — тады, сеўшы вось на каралі гэтага саснoвага карча, гаварыў бы Чагін? І хто мог апынуцца на месцы Чэсі? Маўджуда ці Гайдаш? Не, Маўджуда пайшла з узводам Фаізуло. Гайдаш, значыцца, апынулася б тут, на месцы Чэсі?.. Не, глупства ты думаеш, дружа! Нельга гэтак думаць пра жывых. Рыхтаваць сябе да горшага — гэта зразумела. А пра жывых трэба думаць толькі добрае, благога ім зычыць нельга. Чэся тут правільна гаворыць. Яна нейкая мудрая зрабілася...

— Чаго ты шукала мяне? — незадаволена спытаў Захар.— І адкуль ведала, што тут сяджу?

— Яштокін падказаў.

— Па мяне паслаў?

— Не, проста хацелася на Дзвіну паглядзець. Я гэткай сёлета яе не бачыла. Разліла-а-ася... О-ой! Бачыш? Крыга яшчэ не растала. Сюды плыве! Не з Дзвіны плыве, а — у Дзвіну!..

Пасярэдзіне ручая марудна сунулася рудая крыга, на краёчках яе ляжаў белы, ажно сіні, лёд, паколаты на вузкія макароніны, і з іх паціху сцякала вада, і слабая пара, як белы дым, узнімалася пасярэдзіне крыгі; крыга сунулася павольна, прыціскала макавінкі вербалозаў і чаромхі, і яны знікалі ў вадзе, і потым зноў узнімалі ўверх свае тонкія пікі, і гайдаліся, і як бы мілагучнае бомканне ішло ад іх.

Захар сачыў за рухам крыгі, слухаў гэтае мілагучнае бомканне вады, лазнякоў і падталага лёду і быў вельмі ўдзячны за гаворку, па якую выбілася Чэся. Яна, гэтая гаворка, не вымагала ні спрэчак, ні доказаў, глушыла трывогу і прыводзіла Захара да радаснай думкі: жыццё вакол, і ён — у гэтым жыцці, і яшчэ не ўсё страчана. Усё будзе для яго страчана толькі тады, калі ў ім самім, Захару, гэтае жыццё абарвецца.

Асцярожлівая ўвішнасць, з якой Чэся хавала пад корч кавалак дошкі — «падалей ад маіх вачэй, каб не нагадвала мне пра гора і бяду»,— адкрыла Захару тое, чаго ён не разумеў раней у паводзінах Чагіна, Яштокіна, Гайдаш... Напачатку ён сердаваў, заўважаючы празмерную іх клапатлівасць, потым прызвычаіўся, перастаў зважаць на яе. Цяпер жа ён як бы нанава адкрываў у паводзінах Чэсі зусім натуральную шчырасць і быў удзячны і Чэсі, і кож-

наму, хто гэтую шчырасць праяўляў. Аднак, удзячны Чэсі, ён па-ранейшаму не хацеў прымаць яе клопат, жаданне надалей адвесці яго, Захара, ад бяды, што нядаўна надкасіла яго. Ён, Захар, заціснуў свой боль сам! Сам? Не-е, дружа! Сам-насам ты б ніколі не адолеў сваю бяду. Гэта ж табе толькі здаецца, што чужая клапатлівасць вярэдзіць сэрца! Яна вярэдзіць, але ж яна і гоіць, не дае табе права на адчай, разбурае, нішчыць горыч адзіноты...

Думаючы пра гэта, Захар нечакана адчуў, што ўспамін пра сваю бяду не прыносіць ранейшай горычы. Не, горыч ёсць, яна жыве. Але стары боль здаецца дужа звыклым, быццам ён, Захар, з гэтым болем нарадзіўся на свет і жыве ўвесь час. І звыклай здаецца трывога, што існуе побач з гэтым болем, шчырая трывога за лёс чалавека, які прыняў твой боль, як уласны.

Захар спытаў памяркоўна, з даверам:

— З кім жа малога свайго пакінула? З Артурам?

— Уга! Артур з Рымы вочы не зводзіць. І ходзяць упобачкі, і сядзяць упобачкі — гавораць, гавораць, гавораць... Не, відаць, нездарма Лавягін усё перад вайною цвярдзіў: зяцёк, маўляў, зяцёк! Памятаеш?

— Ты як знарок гаворку ў бок вядзеш. Я пытаюся: малы з кім застаўся?

— Гайдаш з ім забаўляецца,— Чэся, згадаўшы нешта дужа смешнае, засмяялася, але неяк стоена, як сабе тое прыгадала: — Я была спачатку малога ля Ромеля пакінула — Толічак да яго ўсё цягнецца, цягнецца ручанятамі. А Багдан, згледзеўшы гэта, вызверыўся, малога ў яго з рук выхапіў! Маўляў, не чапай, гад, малога сваімі крывавымі рукамі...

Злавіўшы ноткі цеплыні ў Чэсіным голасе, Захар кінуў з выклікам:

— Неяк дужа ж хутка ты Багдану ўсё даравала!

— Я ўжо і сама не ведаю, хто каму павінен дараваць.

— Ого! Ну-ну...

— Я, можа, болей перад ім вінаватая. Навошта, калі не любіла, пайшла за яго?

Захар спытаў больш рэзка, чым казаў да гэтага:

— А што ты мела на ўвазе, крычала, што з ягонай, маўляў, хаты выпаўзла здрада? Гэта што, здагадка толькі? Нешта ты мне тады неяк неперакапаўча ўсё тлумачыла.

— Вы ж Ванду паслалі ў горад. Вось ад яе, думаю, нешта даведаемся больш пэўнае.

— Значыцца, толькі здагадка...

— У мяне, Захарка, няма доказаў. Праўда, сэрца ўсё роўна тое ж самае мне гаворыць: без Багдана тут не абышлося. Праверыць яго трэба!

Гаворка пра Багдана на нейкі міг аддаліла Захара ад таго галоўнага, што вярэдзіла сэрца — ад сваёй уласнай віны ў бядзе, якая спасцігла атрад. Цяпер ён разумеў, што тлумачэнні — верыў у гэта цвёрда! — патрэбны ў першую чаргу не яму асабіста, а Чэсі, патрэбны ўсім тым людзям, якія яму падначалены і якія вераць яму, разумеў, што гэтыя тлумачэнні даць людзям давядзецца не каму-небудзь, а менавіта яму, што ён не можа, не мае права не разгледзець з імі прычыны горкіх страт. А да чаго гэта прывядзе? Ён змушаны будзе прызнаць сваю віну, сказаць шчыра, што паддаўся клічу ўласнага сэрца, яго нясцерпнаму болю.

— Праверым,— цвёрда паабяцаў Захар, зноў вяртаючыся ў думках да Багдана.— Думаю, што цяпер і Ванду на Кандрата вывесці можна. Калі Ванда скажа яму, што Багдан у атрадзе — ён ёй будзе цалкам давяраць. І ён жа мне пакляўся, што знойдзе таго, хто прадаў Балаша... Цяпер разумею, што даўно Ванду трэба было ў горад паслаць... Можа, тады было б усё інакш.

— Не бядуй.

— Ты толькі — прашу вельмі цябе — мяне не суцяшай.

— Я не суцяшаю. Я пра тое кажу, што цёплыя дні надыходзяць: кожны кусцік, як гаворыцца, начаваць пусціць...

— Слухай, што сказаць хачу. А што, калі малога табе адправіць да Марылі. Там, на хутары, яму добра будзе. Малачко пад рукою...

— Ні-ні! Я Толічка са сваіх рук не выпушчу.

— Думаў, што гэтак лепей...

Ён прыўзняў галаву, зірнуў на Чэсю і знерухомеў ад яе ўмольнага і горкага позірку. Водсвет вады, падзелены галінамі чаромхі, клаўся на яе твар няроўнымі кароткімі палосамі рознага колеру, і палосы гэтыя нават ад слабага руху галавы соўгаліся, і здавалася, што шчокі і губы нібы калоцяцца знутры. Устойлівымі былі толькі цёмныя правалы вачніц, у якіх вялікімі светлымі кроплямі блішчалі вочы. Захару падалося, што гэта не вочы, а сапраўды кроплі нейкага дзіўнага шкла, якое толькі што плавілася, а цяпер пачало цвярдзець і струменіць гарачы бляск.

Ён прыязна і цёпла ўсміхнуўся, але глядзеў на яе ўважна, і гэты позірк Чэсю збянтэжыў.

— Ты чаго гэтак глядзіш?

Чэсіна ўстрывожанасць яшчэ больш яго расчуліла.

— Сястрыца любая! Сястрыца дарагая! Прымі прывет, я шлю табе паклон,— ён на момант змоўк, прыгадваючы наступныя радкі.— Згадаліся ж вось вершы... А далей?.. А-а... У нас вясна цяпер, вятры шумяць над гаем... А позна ўвечары красу цярушыць клён...

— Як гэта? «Вясна цяпер» і «красу цярушыць клён»... Вясною клён красу не цярушыць. Нешта ты наблытаў.

— Відаць. Нават не магу прыгадаць, адкуль гэтыя радкі.

— О-ох і гаротнічак!..— сказала Чэся і пагладзіла яго рукі, якія ён трымаў сціснутымі на каленях.

Захар апусціў галаву. Ад ласкавага дотыку Чэсіных рук як нешта адразу і гучна зламалася ў ім, і ён сядзеў, прыгорбіўшыся, размяклы ад пяшчоты Чэсіных рук, і яны былі блізенька ў яго перад вачыма, і ён адчуваў іх мяккасць і ласкавасць, і адчуваў яшчэ, як хіліцца ўсё ніжэй і ніжэй яго галава, хіліцца да гэтых пальцаў; як бы дрогкае мроіва наплывала на вочы, і ў ім, тым мроіве, у той мігатлівай смузе, быццам у вадзе, зыбаліся, варушыліся тонкія белыя пальцы з роўнымі, акуратна абстрыжанымі пазногцямі. Чэсіны рукі раптам зніклі, і ён тут жа адчуў, што яны ляглі яму на галаву, і пачуў мяккі дотык пальцаў у валасах, і пачуў ціхі, знаёмы і ўсхваляваны, поўны адчаю і здзіўлення шэпт:

— Сівенькі... Зусім беленькі брацік родны мой зрабіўся... І хто ж цяпер цябе прыгалубіць, папесціць...

Захар асцярожна злавіў руку сястры, угледзеўся, быццам бачыў яе зараз упершыню, прамовіў ціха і ласкава:

— У цябе рукі гэткія ж, як у мамы... І гэткія ж пяшчотныя, мяккія... І нават гэткія ж рэпінкі...

Ён прыціснуўся лбом да мяккай і цёплай далоні, і каляныя халодныя абручы, што ціснулі скроні, сплылі, і галава, раптоўна раскаваная, здалася яму як не свая, быццам падмененая, і ў ёй, спустошанай і лёгкай, гулка пульсавалі, бомкалі звонкія штуршкі. Ён услухоўваўся ў гэтыя гулкія такты, і яму на нейкі міг падалося, што гэта не рукі сястры галубяць яго, а рукі маці, што гэта маці, як у маленстве, галубіць яго. Ад дотыку мілых і добрых рук чэзнуў, ціха сплываў з душы стары боль; ласкавае цяпло далоняў, маленькіх і мяккіх, саграваала ўсю яго істоту, і ад

гэтага цяпла ўсё ў ёй іначылася, папава перараблялася, і Захара ўпарта, настойліва, уладарна і неадольна, як вір, зацягваў новы свет, дзе няма тугі, дзе расплываецца горыч, якая дагэтуль увесь час пякла яму розум і сэрца.

## 3

Сцяўшы зубы, Кандрат адпіхваў рукамі шархоткае смярдзючае месіва, што пёрла на яго з глыбіні багны, і яно раптам з грукатам адвалілася, вакол зрабілася светла, і грудзі хапянулі чыстае салодкае паветра.

«Сон... Гэта ж мне ўсё сасцілася...»

Кандрат, сеўшы на ложку і ўсё яшчэ хапаючы ротам выратавальнае паветра, немігатлівым позіркам агледзеў пакой. Ляжыць на падлозе карабін з патранташам на чорным рамяні з белай спражкаю, побач паваленае крэсла, якое зачапілася спінкаю за прасціну; паверх коўдры горбіцца скамечаны чорны фрэнч з белаватай палосаю на рукаве. Дзіўна. Кладучыся на золаку спаць, ён стаўляў крэсла побач ложка, карабін з патранташам ляжаў на крэсле, і фрэнч вісеў на спінцы. Мабыць, зачапіў крэсла ў сне, яно і павалілася яму на твар — пад уласным фрэнчам траха не задыхнуўся. Якая лухта, аднак, можа сасніцца чалавеку! Нібыта ўяве ўсё было: і як гарэў самалёт, на якім яны былі з сынам, і як зваліліся ў багну, і як Кандрат, адпіхваючы смярдзючую твань, усё гнуў, ламаў бярозку, каб Багдан дацягнуўся рукамі да яе вецця.

«Відаць, нейкая бяда прыключылася з Багданам...»

Кандрат наспешліва апрануўся, падперазаў фрэнч рамянём з патранташам і, з карабінам у руцэ, выбег на ганак.

Зыркае сонца на міг асляпіла, і ён, разгублены, спыніўся, знямоглана апусціўся на шырокую прыступку. Куды ён сарваўся? Куды імчыць? Пасля начнога патрулявання ля вакзала ў яго вольны дзень. Прыбяжыць, скажам, ён зараз ва ўчастак — адразу цікавасць: чаго прыцягнуўся раней тэрміну, па якой патрэбе?.. Сына, маўляў, сасніў блага... Во ўжо будзе смеху! Што, маўляў, карабінчык і фрэнч прынёс, сынок?.. Трапашка ж тады, як Кандрат тлумачыў начальству, што Багдан праваліўся пад лёд і ён упусціў у ваду карабін і фрэнч, спрабуючы ўратаваць сына,— усё пацвельваўся: на беражку пасядзі, пачакай, пакуль выплыве фрэнчык... Толькі паспрабуй скажы цяпер гэтаму злыдню пра сон!..

Кандрат сядзеў на ганку, дыхаў пахам яблыневай квецені і пахам зямлі, угрэтай на сонцы, і пакрысе супакойваўся. Адступала благое, і лагодныя думкі прыходзілі ў галаў: па зялёным вецці крочыў Багдан — гэта на добрае прыкмета. Вясною благога ў Кандратавай хаце нічога і ніколі не здаралася. Вясна — гэта радасць чалавеку. Ёй анішто не замінае: яе час — яна і заявілася. І як хораша цвітуць яблыні! А летась здавалася, што ўвесь сад пабіў мароз, ажно не, выжыў сліўнік ля плота і маладыя яблынькі ля хлява. Гэтыя яблыні пазалетась дужа добра цвілі, але потым уся квецень асыпалася, аніводнай завязі нават не засталося. Сёлета ж яны зноў у квецені, густой, дружнай — вецце як абсыпана ружавата-белай ватай. А тыя, што летась увосень прыгроб да свае мяжы, стаяць чорныя, мабыць, і не адыдуць — прыхапіла іх у студзені марозам, відаць...

Па шырокіх лехах, дзе пасаджана пад рыдлёўку бульба, увішна сноўдаліся два маладыя шпакі, нешта вышуквалі ў неглыбокіх разорах. Дабеглі да пянька старой яблыні, якую Кандрат спілаваў на мінулым тыдні, і спыніліся, бы разглядалі ўдзюбнутую ў яго сякеру. Шпак ускочыў на пянёк, пакруціўся, пераскочыў на тапарышча, заспяваў, потым дзюбнуў у шыю другога, які паважыўся быў падсесці да яго, і сціхнуў. Але і сам не ўтрымаўся, паехаў па тапарышчы ўніз, трасучы крыламі, і ад самага пянька пырхнуў на разгалістую, засохлую з аднаго боку вішню, дзе чарнела старая шпакоўня. Даўно, яшчэ перад тым, як пайсці ў армію, Багдан амаль палову дня, помніцца, майстраваў разам з Данікам шпакоўню: старанна габляваў кожную дошчачку, зрабіў адмысловы спічачны дах, прымацаваў ля яго кляновую галінку — сядзець каб было дзе шпакам. Шпакі ў той жа дзень пасяліліся ў шпакоўні. Праўда, кляновую тую галінку быццам і не заўважалі — аніводнага разу не садзіліся. А цяпер вось — сядзяць. І нешта ж вельмі тое седала ўпадабалі: на спічастым даху ніколі шпака не ўбачыш, усё там, на гэтай галінцы, сядзяць, спяваюць — ад першага дня, як сёлета прыляцелі.

«Сынкі вось толькі не прыляцяць...»

Зноў някепьна заныла сэрца, заныла ад тугі, ад скрухі, ад невядомасці, ад таго, што зусім па-дурному пакруцілася Кандратава жыццё. Навошта ён паабяцаў Захару адшукаць таго, хто прадаў фашыстам Балаша і Зінаіду з дзецьмі? Ратаваў сваё жыццё? Так, спалохаўся смерці,

ад яе, ад смерці, ён уцякаў, каб жыццё зберагчы. А навошта яно, гэткае, як ёсць, жыццё яму, Кандрату? Жыць і чакаць кулі? А куля яму ўжо гатовая, бо атрымаецца так, што надмануў ён Захара: нічога ён не дазнаўся і наўрад ці дазнаецца. Як тут дазнаешся пра нешта, калі вось ужо другі месяц б'ецца, каб хоць што-небудзь уведаць пра Багдана. І ўсё — упустую: як вадою разліўся чалавек. І ён, Кандрат, тут ва ўсім вінаваты. Як жа гэта ён не мог спыніць, калі Багдан лістоўку чытаў, што нешта цюкнула сыну ў галаву. Ды ж хіба толькі ў гэтым вінаваты! А ранец, перад вайною, навошта яму было пасылаць свайго меншанькага, Данічка, у Смаленск? Ды яшчэ і жонку пагнаў. Не, сама жонка туды пёрлася: сястрыца, маўляў, дапаможа Даніку з вучобаю, сястрыца... І ён, Кандрат, калі ўжо гаварыць як ёсць, вельмі на гэтую дапамогу разлічваў. Ленаваты хлопец быў, дый не вельмі шчэ яму і шчасціла — хварэў, па два гады ў чацвёртым і шостым класах вучыўся. Адно любіў хлопец — дрэвы. Ды і дужа ж тады абнадзеілі сваякі з гэтым тэхнікумам — у момант жонка ў Смаленск сабралася. А выйшла, што пад бомбы збіралася. А мог жа запярэчыць! Мог жа не пусціць! Дык не ж: бабы паслухаўся! А каб не рынулася кабета ў Смаленск, каб сядзела ў хаце — усё і было б добра. Добра? Вось нікуды ты не рынуўся, выращыў за брата Пецьку адпомсціць, за парог аберуч трымаўся, фрэнч паліцэйскі надзеў... А што добрага прыдбаў? Чаго радаснага дамогся?.. Захар табе ледзь кулю не ўсадзіў. І ўсадзіў бы, напэўна ўсадзіў, каб ты яго з-пад крыгі не выцягнуў... Дзіўна, аднак, усё ў гэтай ваеннай калатнечы. Той, хто судзіў твайго Пецьку, бомбай разарваны, а Пецька недзе, мабыць, і жывы. Зламаў ён, Кандрат, сваё жыццё праз тую дурную помсту, а сынава жыццё тым, Багданава, уратаваў. Хто б яго, сыночка, з той загарадкі выцерабіў? Там жа тысячы гінулі, крапчэйшыя... Так што невядома, якая і куды крыга каго заўтра панясе. Можа, адгрыміць гэтая віхура, і прыб'юцца, прыляцяць, як шпачкі гэтыя, і Багданка, і Данічак, і жонка...

Кандрат, растрывожаны, марудна ўзняўся, мінуў хлявок, ля якога ляжала непрыбранае і пасечанае ўчора сучча пасохлай яблыні. Ён клыпаў па сцежцы, звесіўшы галаву, цёгся марудна, бы хворы, не зважаючы на тое, што сохнуць недакапаныя пад цыбулю грады, што там-сям шарэюць выдраныя варонамі бульбіны. Трэба было б, выкарыстаўшы вольны ад службы час, парабіць усю работу

ў садзе. Але ж няма ахвоты, не цягнецца душа да гаспадарчага клопату. І ці мае, увогуле, нейкі сэнс тоїі клопат? Дзяруць вароны і гракі бульбу? Няхай дзяруць. Навошта яму ўвогуле тая бульба нейкая, што вырасце толькі ўлетку? І ці вырасце! Недакапаныя грады? Воўк іх рэж, тыя грады! Каб на іх апошнія сілы дабіваць? Не-е, няхай стаяць, акалеўшы. Каму тая цыбуля прыдасца, калі ён яе пасадзіць і яна вырасце? Каму ўвогуле патрэбна тое, што ёсць у гэтым садку? Магчыма, каму і патрэбна. А яму навошта гэтыя слівы, гэтыя яблыні, гэты вось плот, які ён летась паставіў, прырэзаўшы да свайго гародчыка лапіну зямлі?.. Ой, праўду тады казала Часлава! «Зямлі вам мала? Рана, ой, рана дзяльбу пачалі...» Разумна тады казала пявестачка! Якая пявестачка? Чужы гэта табе чалавек. І плот гэты — чужы. Хоць і стаіць на тваім гародзе, а — чужы. Чужое не прыносіць багацця — гэта праўду людзі кажуць. Вось ён паставіў плот, прыгроб да сябе пяць урадлівых і цудоўных яблынь, з якіх звычайна збіралі пудамі чырванабокія «цыганы». А што збярэ ён?.. Мароз пабіў яблыні, ён спаліць іх на дровы. Вунь яны ляжаць, карычневыя і цвёрдыя, як косць, паленцы... Ну, спаліць ён іх у печы, крыху пагрэецца ля агню. Агонь потым атухне, вецер выдзьме цяпло з печы, і яму, Кандрату, застанецца толькі жменька белага попелу ды дробнае чорнае вугалле. А потым і ад яго, Кандрата, застанецца прыблізна тое ж... А можа, нават і гэтага не застанецца. Можа, вось гэтак жа, як шухнуў тады пад лёд Захар, дзенебудзь праваліцца ён, Кандрат, у які-небудзь вір, і побач не будзе анікога, і ніхто не пачуе яго голасу, не працягне рукі, не кіне, як ён Захару, шыняля... Ці вось гэтак, як пядаўна расспілася, гукне багна пад галавою, і асака толькі зашуміць, і ніхто і ніколі не даведаецца, куды знік стары Кандрат...

Дайшоўшы да плота ў канцы саду, ён спыніўся, упёрся рукамі ў шархоткія, цёплыя ад сонца аполкі, стаяў, нібыта ўпершыню ўбачыў плот, што замінаў яму рухацца далей. Нейкі жудасна чужы, як зусім незнаёмы, гэты плот. А ён жа, Кандрат, яго ставіў, кожную дошку рукамі абмацваў, у кожную цвікі заганяў. Ставіў, помніцца, новыя жардзіны, белыя, а яны ўжо і ўчарнелі, нават пылу ладны пласт зверху. І цвікі абыржавелі. Ён збіраўся тады пазагінаць з гэтага боку, а потым пакінуў, вырашыўшы, што калі давядзецца мяняць якую дошку, дык лягчэй будзе выдзіраць цвікі... Думалася тады: будуе надоўга, на-

дзейна. А Часлава папракала: «Як сто гадоў наперадзе...» Тады ён насварыўся на нявестку... Нявестка?.. Стары ёлуп ён! Сляпая доўбня! На вялікае прыцэліўся, зямлю сабе гроб, а таго, што пад самым носам рабілася, не бачыў. Як насланнё нейкае было: тое, маўляў, што плотам абгароджана, табе належыць. А чаго ён варты, гэты плот!..

Кандрат патузаў рукамі аполак, потым з усяе моцы ўлупіў па ім ботам; аполак не паддаўся, і ён улупіў па ім яшчэ раз, і аполак зламаўся. Кандрат зазірнуў у праломку. Задымленыя правалы акон будынка спаленага дзіцячага сада пагрозліва, маўкліва чарнелі; высокі, пасярэдзіне белы комін, з уздзетым кавалкам бляхі, бы вялікі крыж, узвышаўся над задымленым франтонам. Вецер гайдануў бляху; яна зарыпела нудна, працізліва, як усё роўна там, у тым пустым будынку, хтось жаласліва застагнаў.

«Вось і я, бы гэты будынак: сцены ёсць, а ўсярэдзіне — пуста, спустошана ўсё да рэшты».

Кандрат уздыхнуў і паціху пасунуўся назад да хаты. Над сцежкаю, пад вострым вуглом, нахілілася ўваткнутая ў разору рыдлёўка,— ён, відаць, не заўважыўшы, зачапіў яе, калі ішоў у канец саду. Кандрат выдраў рыдлёўку з зямлі, з сілаю ўвагнаў у падатную глебу. Халаднаватая гладкасць цаўя, якую адчула далонь, вабіла, цягнула, і Кандрат, прыгінаючыся, капануў зямлю яшчэ раз, убачыў тлусты бляск глыжоў, учуў пах зямлі і як ашалеў ад яго. Кепку — далоў! Да д'ябла гэты карабін — хай павісіць на яблыні! І патранташ з рамянём — таксама туды!

Вецер забіваўся пад расшпілены фрэнч, астуджваў цела. Водар вясновай зямлі ўладарна муціў галаву, і Кандрат ужо ведаў, што не спыніцца, пакуль не дагоніць усю граду да канца, і разумеў, што робіць тое, да чаго хінецца сэрца, і лаяў сябе, і зноў злаваў, як злаваў толькі што ля плота, і ярасна ўсаджваў рыдлёўку ў тлусты чарназём, браў на поўны штых і, крэкчучы, пераварочваў рыдлёўку, і зямля падзейна засыпала сухую леташнюю траву. Э-эх, каб можна было вось гэтак жа, як мінулагоднюю траву, заваліць у глыбокіх і свежых разорах бяду, засыпаць, пахаваць пад цяжкімі чорнымі пластамі!..

Ані не перадыхнуўшы, Кандрат дакапаў граду да канца, забаранаваў яе граблямі, выраўнаваў і пачысціў рыдлёўкаю неглыбокую баразёнку. Потым згроб суччо і трэскі ля пянька старой яблыні і, адкаціўшы яшчэ нераспілаваны кароткі кругляк да сцежкі, распаліў ля яго вогнішча. Суччо гарэла добра, гучна патрэсквала ў агні; дым, разма-

тапы ветрам, то ўзлятаў уверх, то слаўся па свежых разорах сіне-белым лёгкім шлейфам.

Гаркавасць гэтага дыму асядала на губах, нагадвала Кандрату — праца яго супакоіла, настроіла паблажліва — шчасныя даваенныя дні. Тады вось гэтак, вясною, ён абразаў суччо на дрэвах, капаў-перакопваў грады, а сыны, дурэючы, амаль і не дапамагалі яму, і ён рабіў усю работу сам, і слухаў, як яны лётаюць па садзе, потым прасіў іх распальваць вогнішча, і яны з ахвотаю збіралі пазразапае з яблынь сухое голле, зносілі ў адно месца і запальвалі, а потым прыносілі картоплю і чакалі, пакуль яна спячэцца ў прысаку. Прыгадалася ўсё гэта выразна — ён нават адчуў на губах знаёмы смак надгарэлага на агні шалупіння,— і нясцерпна захацелася паесці спечанай у прысаку бульбы зараз жа!

Ён прыцёг з хаты акраец хлеба, скрылік сала і чатыры буйныя бульбіны. Хлеб і сала паклаў на кепку, бульбіну ўціснуў пад агонь, потым прысыпаў попелам і павярнуў зверху суччо. Цяпер, каб не дужа цягнулася чаканне, можна адпесці яблыневы кругляк на дрывотню. Але гэта шчэ паспеецца. Лепей падкаціць кругляк бліжэй да вогнішча і пасядзець, пакуль спячэцца бульба, на сонейку адпачыць, падыхаць добрым паветрам. Спячэцца бульба, і ён будзе есці яе з салам, якое падсмажыць па ражончыку, падстаўляючы скібку хлеба пад гарачы тук — гэта ж на дзіва смачны тады атрымліваецца хлеб.

Кандрат сядзеў, абапіраючыся рукамі на тонкую крывульку — макавінку, якую сякераю адсек ад ствала, і ўтаропіўся на агонь, быццам падспешваў яго. Зараз бульба спячэцца, і ён смачна і добра паесць, потым гадзіны са дзве пасніць перад начным патруляваннем ля станцыі. Цяпер цяжкая заўсёды начная змена. Пасля таго як на майскае свята савецкія самалёты па сігналах з зямлі ўшчэнт размалацілі два вайсковыя эшалоны, што стаялі ў тупіку, патруляванне ўсцяж чыгуначнага вузла ідзе ў два ланцугі: першы, асноўны ланцуг — фашысцкія салдаты, другі — паліцэйскія. І той, другі ланцуг, фашысты ўночы шмат разоў правяраюць — не заснеш, як раней было, на тым патруляванні.

Але да ночы яшчэ далёка. Сядзі, адпачывай, думай пра жыццё. Як добра, між іншым, гарыць гэтае яблыневае суччо, быццам бярозавае: і агню шмат, і вуголле добрае, і дыму мала. Была яблынька — няма яблынькі. І дзіўна: побач жа раслі дрэвы, але адно ўцалела, вунь у

квецень убралася, а другое — змерзла. У дрэва, мабыць, як і ў чалавека, свой лёс ёсць. Мог жа ён, Кандрат, тады на Дзвіне на тую крохкую крыгу першым стаць! А ён нейкі міг прамарудзіў — Захар па яе ўскочыў. Значыцца, табе, Кандраце, лёс іншае накрэсліў у тую ноч: ратаваць ад смерці чалавека, які кулю табе ў сэрца намысліў паслаць...

Трашчала сухое яблыневае голле ў агні, а Кандрату здавалася, што недзе паблізу, як за спіною, з шоргатам і звонам крышыцца на каранях лазнякоў лёд і зямля пад нагамі зыбаецца, бы пагойдваецца. Твар гарэў ад вогнішча, а спіну, узмакрэлую ад працы, студзіў вецер, выбіваў у плячах халодную дрыготку, якая была дзіўная, але знаёмая — у дзве паласы: адна паласа прападала недзе пад лапаткамі, а другая спаўзала да паясніцы і абкручвала цела, як рамень. Зноў вярэдзіла сэрца, стаяла перад вачыма тая ноч на Дзвіне. Чаму Захар адпусціў яго, Кандрата, чаму не застрэліў? Паверыў, што ён, Кандрат, знойдзе здрадніка?.. Не, тут нешта іншае. Захар жа ішоў, рызыкуючы сваім жыццём. Што вяло яго тады? Дык гэта ж і малому зразумела: ён ішоў забіць Кандрата, забіць, як ворага. І вось жа не забіў! Нават карабін Кандрату вярнуў. Навошта? Чаму? Паверыў словам? Не, не толькі словы ж былі ў тую ноч — ты ж яго ад смерці ўратаваў. Але ж ён мог застрэліць цябе і раней, каля хаты, скажам, альбо ў хаце. Дык не, амаль праз увесь горад гнаў! Як прадбачыў, што на рацэ яго, Кандратава, дапамога яму спатрэбіцца...

Халодная дрыготка — як у тую ноч на Дзвіне! — зноў прабіла плечы, і Кандрат імкліва азірнуўся. Якое ж гэта паганае адчуванне, што нехта стаіць за тваёй спіною, сочыць... І тады, на рацэ, было такое ж адчуванне. Не, гэткае адчуванне прыйшло пазней, калі ён перабег раку і ступіў на цвёрдую зямлю. Разуменне таго, што Захар далёка, што аніякі стрэл у спіну яму, Кандрату, не пагражае, не прынесла радасці. Ён успрыняў усё, як належнае, заканамернае і дужа простае: гэтак было суджана, гэтак і здарылася. Ракеты больш не кроілі туманны полаг над ракой. Але зрабілася — сплылі хмары — даволі светла, былі добра бачны царкоўныя муры і цёмныя абрысы спаленых будынкаў управа ад замчышча. І неяк усё аціхла вакол, нават аціх шоргат ільдзін — як усё роўна спыніўся крыгалом.

...Кандрат, аказваецца, памятае і гэта! Так, памятае! Ён стаяў тады, слухаў цішыню, потым зрабіў крок, і лёд

звонка захрабусцоў над ботам. У той жа міг ён заўважыў чалавечую постаць — яна зачарнела ля старога вяза, які рос ля дарогі, што ішла па краі ўзвала і апаясвала замчышча.

«Захар! Захар зноў вярнуўся...»

Кандрат нікуды не кінуўся, нават не схапіўся за карабін. Нейкімі калянымі, як нежывымі, парабіліся рукі, ён з вялікім намаганнем сагнуў іх, паднёс да твару, і толькі тады, як далоні дакрануліся да шчок, адчуў, што пальцы непрыемна калоцяцца і трасуцца.

— Гэта ты, Роўда? — запытанне прагучала спакойна, без здзіўлення.

Кандрат пазнаў Трапашку, паліцэйскага, з якім часцяком быў у пары на патруляванні вуліц уночы, буркатнуў:

— Бачыць, а шчэ і пытаецца!

— Ды не пытаюся. Дзіўлюся! Па дзеўках, значыцца, стары грахаводнік, шастаеш. А чаго ж мяне, сябрука вернага, не прыхапіў?

Нейкая вясёлая зларадпасць была ў гэтым запытанні, і Кандрат адчуў, што Трапашка апынуўся зусім не выпадкова тут, на беразе Дзвіны, у гэты перадранішні час, што ён як бы здзіўлены і ўзрадаваны нечаканаю сустрэчаю.

— Не люблю сведак.

— Гэ, сведкі! Ды з імі, непатрэбнымі, можна проста: галавою чурх пад крыгу — і цішыня.

— Ты, відаць, гэтай навукаю добра валодаеш. Чурх пад крыгу... Лоўка! А калі цябе гэтак?

— А я прыёмчык ведаю — мяне за галаву аніколі не ўхопіш. Хочаш — навучу?

— Другім разам як-небудзь пакажаш гэтую навуку.

— Другім дык другім,— адразу ж пагадзіўся Трапашка.

Кандрат чакаў, устрывожаны і разгублены, новых пытанняў. Як патлумачыць тое, што ў гэткі час ён валачэцца з таго берага ракі? А мо Трапашка не заўважыў гэтага? Заўважыў! Заўважыў і дурнем прыкідваецца. А можа, ён бачыў, як Захар вёў Кандрата? Не, нічога ён, відаць, не бачыў. Каб бачыў — спакойна б не глядзеў, запытаў... А што, як віжаваў ад самае хаты? І тут, на беразе стоячы, бачыў, як Захар шуснуў пад лёд?.. Але ж нічога, здаецца, не відаць пад тым берагам! Цёмныя шаты лазнякоў, цёмная палоса берага. А калі ракеты свяцілі? Не, святло іх дужа дрыготкае, туман густы, не мог угледзець Трапашка нічога з таго, што адбылося там, пад лазнякамі на супраць-

леглым беразе. І гарэліцай ад Трапашкі патыхае моцна. Баляваў, значыцца, недзе...

— Сябруком мяне лічыш. А жлуктаў пітво салодкае без мяне,— сказаў Кандрат, насмялеўшы.— Мог жа кроплю якую і прыхапіць.

— У Паўлюка прыхопіш — растапырвай ручкі.

— Шнапс пілі?

— Каб жа ж! Сівуху нейкую з буракоў — з ног валіць. Да вяза я даклыпаў, сеў пакурыць. Бачу — людзі на рацэ. Ракеты гэтыя зыбаюцца, у вачах мільгаціць — як матылі, людзі: з крыгі на крыгу. Вернуцца ж, думаю, нідзе не дзенуцца. І — прыдрамаў. Цяпер вось вочы прадраў — ты нагі валачэш. Значыцца, не саспілася...

— Цяперся на зямлі спаць? Здурнеў ты, ці што? Скруціць у абаранак!

— Праўду кажаш. Я ж толькі вочы звёў — і закалеў. Згасла, халера. Запалкі ё?

— На, прыкуры...

Хісткае полымя запальнічкі асвяціла худыя Трапашкавы шчокі. Кандрат не паспеў убачыць яго вочы — полымя згасла, задзьмутае ветрам. І нечакана, як мігатлівы спалах агню запальнічкі, мільганула думка, што адразу супакоіла Кандрата: Трапашка спаў тут, пад вязам. Так што трэба на гэтым і стаяць да апошняга: спаў ты, даражэнькі. Па-другое, калі бярэш першачок на поўную губу, дык шчэ і не гэткае можа сасніцца і змроіцца ўночы — і чэрці і анёлы пачнуць з крыгі на крыгу скакаць. А патрэцяе, пасля сну на ледзяной вясновай зямлі толькі гарэлка ад хваробы ўратуе.

І гарэлкі, завёўшы Трапашку к сабе дамоў, Кандрат не пашкадаваў. Трапашка хутка сп'янеў, зрабіўся дужа гаваркі і шумлівы. Спачатку ён нахвальваў Кандрата, потым нахвальваў Багдана: «Разумны ў цябе Багдан, о-ой, разумны!» Затым пачаў прасіць даравацъ дурныя жарты, якія некалі былі: «Веру, дружа, што на рачным дне карабін ляжыць. Ды я, скажам, роднага чалавека ратуючы,— палову свету аддам!» Потым лаяў свайго дружбака Паўлюка, затым пачаў папракаць Кандрата, але рабіў гэта ўскосна, быццам раіў: «Глядзець на сяброў з недаверам нельга, Кандраток! Сябрам трэба сэрца сваё — нараспрыст!» Пра Дзвіну, пра тое, што ён бачыў уночы людзей на крыгах, Трапашка не сказаў аніводнага слова. Але на ложку, куды ён заваліўся, не распранаючыся, нечакана, голасам зусім цвярозым, паабяцаў:

— Заўтра — па Дзвіну пром! Трэба мне па тваіх дзевак зірнуць. Ёсць і ў мяне дзеўкі, не думай! А чаму табе гэта кажу? З табой, дзед, кашу можна варыць!..

Ранкам Трапашка адмовіўся ад пахмелкі, выпіў паўлітровы слоік расолу і, схрумстаўшы салёны агурок, папярэдзіў асіплым, але цвёрдым голасам:

— Ноччу ты нідзе не быў. І я — нідзе не быў. Ад самага вечара — у тваёй хаце спалі. Спасціг мудрасць?

— Гэтак жа яно і ў сапраўднасці было!

Трапашка зарагатаў, падміргнуў, моцна пляснуў Кандрата па плячы:

— З табою, дзед, кашу можна варыць!..

...Полымя пачало прыпякаць, Кандрат адсунуўся далей ад вогнішча і здрыгануўся. Побач, за спіною недзе, Трапашка рагоча! Мроіцца табе, Кандраце, ці што? Не, не мроіцца! Сапраўды, яго ж гэта голас!.. І вясніцы, адкінутыя моцным штуршком з вуліцы, бразнулі па слупку ў плоце, аж затрашчалі!

Нейкі міг Кандрат усё яшчэ сіліўся аддзяліць рэальны Трапашкаў голас ад таго, які перад гэтым гучаў у яго вушах. Яму ўсё яшчэ здавалася, што недзе за спіною шархаціць вясновы лёд і крыгі, разломваючыся на карэнні лазнякоў, глуха пазвоньваюць. Не, ніякі гэта не лёд! Трашчыць у полымі, якое раздзімае вецер, яблыневае суччо, і нічога яму, Кандрату, не мроіцца. Трапашка тупае падворкам. І не адзін! Нейкая ж маладзіца побач. Мо бяда якая? Не, твар маладзіцы вясёлы. І Трапашка рагоча!..

— Гэ-эй, гаспадар! Гаспадыню табе вяду! — весела выгукнуў Трапашка.— Не будзем болей румзаць: не памыць, маўляў, не прыбраць! Не будзеш стагнаць болей, што жаноцкага духу няма ў хаце! Цяпер з цябе самога — дух вон! Прымай і частуй мяне спачатку, бо я пра цябе вялікі клопат меў і гаспадыню апароў,— ён стаў ля вогнішча, засмяяўся: — Не ля таго ты агню грудзі пячэш, сябрук мой! Вось я табе агонь прывёў — гэта агонь! Пацалуеш — самлееш ці — дымам пойдзеш! — Ён убачыў сала на кепцы і акраец хлеба, задаволена пацёр рукі.— Калі ты і бульбіны паклаў у прысак — сто гадоў табе жыць.

— Пячэцца бульбачка,— прызнаўся Кандрат.

— Жывеш, значыцца, сто гадоў. Калі ж яшчэ і зелля якога пашукаеш — усе дзвесце.

— Пашукаю. Павінна недзе стаяць... Калі мышы не выжлукцілі!

— Дзед! Я цябе расцалую! Бачыш, Вандачка, да яко-

га гаспадара ты трапіла. Залатога! Каралеўнаю будзеш жыць!

Кандрат набычыўся:

— Досыць балбатаць. Не люблю.

— Мяне любіць не трэба. Яе — любі,— Трапашка падміргнуў, і перад Кандратам на нейкі міг ажыла тая крыгаломная ноч на беразе Дзвіны.— А дзела тут гэткае... Чалавеку ў бядзе памагчы трэба? Трэба. А Вандачка без прытулку, бяда над ёю. Хата, дзе яна жыла, у чыстую зону трапляе — высяляюць усіх ад станцыі, ты ж ведаеш. Вось я і вяду яе ў тваю хату. Зайшоў у краму, парадак навёў, а потым — Вандачку за белу ручку...

— Па гаспадарцы я памагу,— сказала Ванда, прыглядваючыся да Кандрата, і ён адвёў вочы ўбок.— І плаціць... Як дамовімся — гэтак і будзе.

— А з чаго гэта там, у краме, парадку не было? — спытаў Кандрат, аніяк не адрэагаваўшы на тое, што сказала Ванда; уважны позірк гэтай маладой жанчыны яго насцярожыў.

Трапашка моўчкі ўтаропіўся на Ванду, як усё роўна загадваў ёй гаварыць. Ванда сказала, зноў з ранейшай увагаю перавёўшы позірк на Кандрата:

— Падбухторшчык нейкі сёння зноў заявіўся: хлеб, маўляў, сабе яна, мярзотніца, прыхавала. Уварваліся людзі ў краму, пачалі трэсці. Я крычу, што дзесяць боханчыкаў усяго і далі. Дык дзе ж паслухаюць! Жанчыны галодныя, з дзецьмі галоднымі — аж трасешся ўся...

Трапашка перапыніў яе:

— Шкада, не заспеў я таго падбухторшчыка. Які ён з твару? Прыкметы?

— Ды не заўважыла я нічога. Ён тут жа вадою разліўся — нават добра і не разгледзела...

— Другім разам не разліецца,— паабяцаў Трапашка.— Я ўжо калі зірну, дык паспакайнее адразу... Чакай,— ён паўзіраўся ў Кандратаў твар, знаёма рагатнуў:— Падобна, што не даспадобы табе гаспадынька? Дык сабе забяру! З маіх рук ты ўжо не вырвеш потым...

— Гэта ўжо точна: твае рукі ўчэпістыя.

— Разумна мысліш. Таму і раю: за мае рукі трымайся. Добра ўчэпішся — у старшыя вылезеш. Пры ўмове, калі не схлусіў,— Трапашка сагнуўся, разгроб трэскаю прысак.— Не схлусіў: пячэцца бульбачка! Ну, дзед, шчасціць: і пры маладзіцы жыць, і ў начальстве хадзіць! Абяцаў жа нешта знайсці. Пашукай і цягні яе сюды, гадаўку,

бо часу ў абрэз,— Трапашка фасоніста выгнуў руку, фарсіста зірнуў на чорны прамавугольнічак нямецкага гадзінніка, пачэпленага на шырокі карычневы раменьчык.— Роўна а першай мне машыну забіраць.

— Як пасля чаркі паедзеш?

— Роўненька паеду, па лінеечцы. Імчы!

Кандрат прыцёг з сенцаў цёмную паўлітэрку і тры гранёныя келіхі, падобныя на маленькія шклянкі. Наліў самагонку неаднолькава: Трапашку і Вандзе — поўныя, сабе — толькі на донцы. Трапашка хуценька чокнуўся з усімі, выпіў і, чапляючы на ражончык скрылік сала, кінуў Кандрату запознены папрок:

— Здароўе беражэш?

— Жывот. Другі дзень рэжа і смаліць, як вугольле туды ўсыпалі. Баюся, што язва...

— Можа быць. Бо прафілактыку нерэгулярна праводзіў. Пуза трэба рэгулярна гэтым зеллем прапаласкваць.

— Спрабаваў. Але, ведаеш, яшчэ горай.

— Каб і з намі гэткага не здарылася — ліні. Паўней, паўней,— і, заўважыўшы недапіты Вандаю келіх, пастукаў па ім донцам свайго келіха.— Дзеля прафілактыкі, гаспадынька. Здароўе нам трэба берагчы!

Трапашка зноў не чакаў, пакуль Ванда возьме келіх, выпіў і, нюхаючы скарынку хлеба, аглядзеў сад. Хітнуў галавою ў бок плота, дзе святлела праломка:

— Хто ж гэта табе палову плота высадзіў?

— Весніцы другія зрабіў.

— А навошта яны табе?

— Калі што, дык на два канцы ўцякаць спрытней.

— Го-го-го! — зарагатаў Трапашка, потым прамовіў напеўна, узмахваючы трэскаю ў такт складам: — Ма-лай-чы-на! — і, як раптоўна прыгадаўшы: — Каб жа не спаліць нам картопельку! Гатовая, думаю...

Трапашка выграб з прысаку дзве бульбіны, пакачаў па траве, збіваючы попел; адну бульбіну моўчкі паклаў перад Вандаю, другую разламаў і, хукаючы, пачаў есці. Еў гэтак жа таропка, як і піў, быццам яго падспешвалі; на губах адразуналіпла шалупінне, чорныя пісягі пакрэслілі скуру пад носам і падбародак, і твар ад гэтага зрабіўся як старэча і хваравіта зморшчаны. Нечакана, быццам засаромеўшыся свае неахайнасці, Трапашка выхапіў з кішэні сінюю з ружовымі кветкамі насоўку, абцёр губы і спытаў з сур'ёзнай развагаю:

— На два канцы, значыцца, замысліў уцякаць? — з

дакорам паківаў галавою: — Дарэмна, дарэмна... Сёлета гаспадары нашы не ўцякаюць, а наступаюць. Так што ўсё застаецца на ранейшых месцах.

Кандрат таксама паківаў галавою, быццам перадражніваў Трапашку:

— І табе пра тое афіцыйна паведамілі!

— Пра наступ? Ды трубяць жа па ўсю Еўропу. А што трэба рабіць, каб ведаць тое, пра што не трубяць? Вочы — на бакі, а вушы? — І заспяваў, задаволены: — «Ставьте ушки на макушки, слушайте внимательно...— пабарабаніў пальцам па спражцы рамяня,— будет занимательно...» Гэтак я і раблю! І табе раю.

— Старыя вушы, на макаўку іх не закруціш ужо.

— Галоўнае, каб не дзіравыя былі. Значыцца, што маем? На поўдні фюрэр імчыць, бы вецер,— новы дранг! А тут, пад бокам? Партызанчыкам па левы бок Дзвіны — капцы. Пад корань разанулі. У камендатуры што робяць? Новыя печы ўзяліся класці. А што адсюль выводзім? — Трапашка глядзеў запытальна то на Ванду, то на Кандрата, схіліўшы галаву, хітравата жмурачы вочы.— А тое выводзім, што зімаваць тут нашы гаспадары будуць — у іх зімовачка прадугледжана і разлічана. Каб немец што-небудзь на вецер рабіў? Не-е, народзец гэты гаспадарлівы. Мяне зусім іншае зацікавіла...

— З якое цэглы печы кладуць? — засмяялася Ванда.

— Не цэгла, а той, хто яе кладзе. Зірнуў на муляра — як цвік у галаву: знаёмыя вочы. Круціцца, круціцца ў галаве... А прыгадаць — не магу,— і скасавурыўся, паглядзеў на Ванду з усмехам.

Нешта няўлоўнае, але знаёмае было ў гэтым Трапашкавым паглядзе, вёрткім і насмешлівым і, разам з тым, уважлівым, і нейкая насцярожанасць была ва ўсім абліччы Трапашкі, нібыта чалавек гаварыў усё знарок, гаварыў толькі на тое, каб убачыць, як хто адгукнецца на яго словы.

— Трэба ж было папытаць,— папракнуў Кандрат.— Хто? І адкуль?

— На вецер гэтыя запытанні. Я з другога боку зайшоў: правер, кажу, дымаход у маёй хаце. А ён — чатырыста марак гані! Ды за чатырыста марак я табе і сам праз той дымаход пралезу.

— А наша крамка і ўвогуле без печкі. Была, кажуць, галандка, з кажухамі бляшанымі. Летась увосень нехта тыя кажухі павыдзіраў. А як зіма падыдзе — што рабіць?

— Зіма? Пра летачка думаць трэба? — выгукнуў Трапашка і засмяяўся.— Зімою бярлогу зноўдзем! — зноў зірнуў на гадзіннік.— У-у, пазнюся. Калі з машынаю ў парадку — убачымся ўвечары,— яшчэ раз фасоніста выкінуў руку з гадзіннікам пад самыя вочы, потым гэтай жа рукою махнуў на праломку ў плоце.— У новыя твае веснiцы, дзед, праскочу. Бліжэй жа намнога.

— Добра, што папярэдзіў. Я цвікі паабломваю, каб у цямноце табе штанамі не зачапіцца.

— З табою, дзед, кашу можна варыць!..

Знаёмы Трапашкаў жарт па-сапраўднаму ўстрывожыў Кандрата. Нешта гэты хітрун хоча дазнацца, нешта ведае, але павесці гаворку ў адкрытую баіцца. А можа, гэта толькі твая падазронасць, Кандрат? Не, не падазронасць. Але што хаваецца за гэтым насмешлівым і ўчэпістым позіркам, за гэтым жартоўным і, разам з тым, як бы ўстрывожаным голасам, за гэтым прагным жаданнем прыгадаць, дзе і калі ён бачыў таго муляра, за гэтым хітрым роздумам услых?..

Цёмная постаць мільганула ў праломцы і знікла, і тады ўсё тое, што Кандрат заўважыў у паводзінах Трапашкі падазроным, раптоўна звязалася з начной сустрэчай на беразе Дзвіны ў час крыгалому і, звязаўшыся, перарабіла ранейшую падазронасць у цвёрдую перакананасць: за ім, Кандратам, сочаць! І сочыць не хто-небудзь, а — Трапашка! І, відаць, менавіта тут ляжыць ключык да таго, з чым звязаны арышт Балаша... І, відаць, менавіта тут ляжыць ключык да тае паблажлівасці, з якой начальства паставілася да Кандратавых тлумачэнняў таго, дзе і як ён згубіў свой карабін, той самы карабін, які знік з хаты разам з Багданам... Добра яшчэ, што ад самага пачатку Кандрат не давяраў Трапашку, не давяраў яго жартам, учынкам, гатоўнасці дапамагчы... І гэтай маладзіцы ягонай таксама нельга давяраць. Неяк дзіўна яна сябе паводзіць, нечага пайшла следам за Трапашкам, зазірнула ў праломку ў плоце, быццам хацела даведацца, куды той пабег... Цяпер вяртаецца да вогнішча. І твар у яе схмурнелы, нечым заклапочаны.

— У мяне для вас добрыя весткі,— голас Ванды гучаў так, нібыта яна нікуды не адыходзілася і не перапыняла свае ранейшае гаворкі. Хуткім рухам выцягнула з-пад рубчыка на левым рукаве кофтачкі тонкую, скручаную цыгаркаю, паперку.— Багдан ваш — партызан атрада «Смерць фашызму». Вакое добра і вось піша вам...

Кандрат спалохана паглядзеў на вузкую палоску паперы, якая амаль і не развінулася і была ў скрутачку, узняў перад сабою рукі, быццам бараніўся ад якое навалы, потым заціснуў правай далапёю рот; скура шчок ля кончыкаў пальцаў зрабілася белай.

Ванда паспяшалася супакоіць старога.

— Жывы і здаровы Багдан. Іваюе добра. І вось піша,— і, расправіўшы скручаную паперку, прачытала: — «У мяне, татка, поўны парадак. Чалавеку, які аддасць табе гэта, давярай, як мне. І ўсё, што ён скажа ці папросіць — зрабі неадкладна, нічога не шкадуючы. Твой Багдан».

— А-адкуль гэта? — хрыпата выціснуў Кандрат.

— Не адтуль жа! — Ванда ўзняла вочы ў неба.— Вы як не верыце. Паглядзіце ж почырк. Багданаў?

Кандрат нічога не бачыў на паперы, хоць амаль уваткнуўся носам у яе — словы зыбаліся, расплываліся, і толькі крыху спагадзя здолеў пазнаць знаёмы сынаў почырк. Не падробка — Багдан пісаў! Працягнуў запіску Вандзе — хацеў пачуць радасную навіну яшчэ раз, з яе вуснаў.

Ванда, цяпер ужо хуценька, перачытала запіску і кінула яе ў агонь; белая папяровая стужка скурчылася, задыміла і ўспыхнула. Кандрат бухнуўся на калені, як не ў самае вогнішча залез галавой і выхапіў з полымя трапяткі агеньчык. Заціснуты далонямі агонь адразу ж згас, але ад вузкай папяровай стужачкі застаўся толькі маленечкі абгарэлы трохкутнічак, на якім рудзелі, як выпаленыя цвіком на дрэве, толькі два словы «...ой Багдан».

Кандрат, трасучы на далоні кавалачак паперы, мычэў:

— Ш-што нарабіла?.. Ш-што нарабі-і-іла!..

— Ціха,— як малому, загадала Ванда і паўтарыла па складах: — Ці-ха! — і дадала, азірнуўшыся на весніцы: — Прачытаць і знішчыць — гэтак было загадана.

Кандрат асцярожна паклаў на агонь абгарэлы шматочак паперы, глядзеў, як ён успыхнуў і ператварыўся ў чорны попел, прамовіў ціха, быццам размаўляў з вогнішчам:

— Небачка! Якое шчасце мне... Ажно і не верыцца.

— Трэба верыць. І глупства не нарабіць...

Ванда спакойна пачапіла на пруток два скрылікі сала, узялася падсмажваць іх. Рабіла яна ўсё спрактыкавана: дужа ў агонь ражончык не совала, трымала над вуголлем, час ад часу strэсвала тук на акраец хлеба.

— Глупства не параблю,— цвёрда паабяцаў Кандрат.— Трэба, дачушка, па радасці і наліць...

— Не хачу! — Ванда рашуча выплехнула самагонку з свайго келіха на агонь і засмяялася, убачыўшы, што Кандрат налівае сабе поўны келіх.— А як жа ваша язва?

— Напрыдумляў я, каб з ім, віжуном гэтым, не піць. З ім, трапашкай гэтай, трэба во-стра трымаць.

— Тым больш не трэба вам піць,— прамовіла Ванда і азірнулася.— Ніхто не павінен заўважыць, што радасць у вас...

— Нават і магіла ў мяне ніводнага слоўца не выдзярэ! Але за Багданку, каб усё добра ішло, мушу кроплю ўзяць...

Кандрат марудна і ўрачыста апаражніў келіх, абтрос яго ў паветры, надзеў на гарляк бутэлькі. Ён сядзеў нерухома, услухоўваючыся, як расплываецца ўсярэдзіне цяпло і як магутна, заціскаючы гэтае цяпло, выбіваецца з сэрца буйная радасць. Жывы Багданка! Нездарма ж, значыцца, снілася, што па зялёным вецці ішоў сынок: зялёнае вецце — на добрае прыкмета!..

Нейкімі тоўстымі і гарачымі зрабіліся краёчкі броваў, і Кандрат адчуў, што зараз заплача ад вялікага ўзрушэння, ад вялікай удзячнасці Вандзе, гэтай дзівосна прыгожай маладой жанчыне, і, каб схаваць сваё ўзрушэнне, аніяк не выдаць яго — моцна, да болю ў сківіцах, сціснуў зубы і ўзняўся. Ніхто не павінен ведаць пра яго радасць? Ніхто і не ўведае! Ані слоўца! Толькі ён і вогнішча чулі ад Ванды гэтую радасць. Вогнішча будзе маўчаць, яно зараз атухне, і само неба ўжо не зможа вярнуць тое полымя. І гэтак жа надзейна і маўкліва, як полымя, будзе хаваць радасць Кандратава сэрца...

— Я пайду,— прамовіла Ванда.— Вярнуся, відаць, праз гадзіну. Мы, значыцца, дамовіліся?

— Чаго? — не сцяміў Кандрат.

— А што кватарую ў вас.

— А пебачка! Дак уся хата — ваша! Уся пачыста!

— Мне пакойчык. Маленечкі пакойчык.

— Вы ўжо зрабіце ласку старому чалавеку... Хаце гэтай — вы гаспадыня.

— Вярнуся, дык вы і пакажаце пакойчык...

Кандрат не запытаў, куды пойдзе Ванда, моўчкі ўзняўся, моўчкі глядзеў, як яна ідзе па сцежцы да вясніц, як асцярожна зачыняе іх за сабою і трасе развітальна рукой. Але ад гэтага прыветнага ўзмаху жаночай рукі ўсё рап-

тоўна зыпачылася ў яго душы, усё наўкола як бы зрушылася, змяніла колеры і фарбы.

Павярнуўшыся, Кандрат зачапіў каленам тапарышча, сагнуўся і рыўком выдраў сякеру з яблыневага кругляка. Сціскаючы яго ў руцэ, рушыў па сцежцы. Патрэбы некуды ісці не было, ён проста рухаўся, як узняты дзіўнай віхураю, не разумеючы, што ідзе. Спыніўся ля праломкі ў плоце, зноў згледзеў задымленыя сцены спаленага будынка дзіцячага сада; варухнуўся кавалак бляхі, уздзеты па коміп — затрос бляху вецер. Але Кандрату падалося, што адтуль, з-за коміна, з сіняй нябеснай далечы, акрэслілася аблічча яго жонкі, з'явілася па міг і тут жа знікла, растала, як і не акрэслівалася ўвогуле.

«Памроілася... Ведама ж, памроілася. На жаночы твар падобны краёк аблачынкі, якую разразае надвая гэты комін...»

Ведаў гэта і ўсё ж хіснуўся наперад, каб разгледзець тую аблачынку лепей, зняпацку ўдарыўся грудзямі аб жардзіну і адчуў рэзкі кароткі боль у левым плячы. От праява — цвік! Гэта ж на кончык цвіка ён напароўся!..

Кандрат, зазлаваўшы, ударыў сякераю па цвіку,— абух лёгка сагнуў цвік і слізгануў з жардзіны на край дошкі: дошка зламалася, і вострая доўгая трэска да крыві разадрала скуру ля правага запясця. Кандрат злізнуў кароткую чырвоную нітачку, што запаўзла пад абшлаг рукава.

«Гэтак жа вось Багданка аднойчы на рыбалцы руку сваю падрапаў...» — згадалася дужа даўняе.

Разам з ім, гэтым кароткім успамінам, нарадзілася думка — дзіўная дужа думка! — пра тое, што вось зараз жонка ўбачыла яго, Кандрата, у чорным паліцэйскім фрэнчы і, спалохаўшыся, адразу ўцякла. Ён разумеў, што ўсё да гэта глупства, што жонкі не можна быць тут, што яна далёка адсюль— ведама, калі Траяніха не збрахала і яна з малым Данікам уцалела ў тым эшалоне! — але смешная і наіўная думка, прамільгнуўшы, пакінула звонкае бомканне ў скронях, падкрэсліла да жахлівай выразнасці рэальнасць таго, што бачылі вочы, рэальнасць таго, што ён сам летась збудаваў сваімі рукамі.

«Плот збудаваў новы. Чужое зямелькі захацелася...»

Ён глядзеў на цвікі, дзівячыся з таго, што гэтак хутка кончыкі іх абыржавелі, кратаў рудыя крапінкі на жалезе пальцамі, і крапкі гэтыя не сціраліся, сядзелі трывала. Ён са здзіўленнем адчуваў, як усю яго істоту поўніць змрочная злосць да гэтых цвікоў, якія ён некалі старанна раў-

наваў і забіваў у аполкі, да гэтых аполкаў, якія ён старанна абчэсваў сякераю, падганяючы адну дошчачку да другой!

«Работкі сабе лепшае не знайшоў, акрамя гэтага плота!»

Кандрат размахнуўся і з усяе моцы ўлупіў абухом па роўна і прыгожа абчасаным аполку...

4

*Блакнот Ромеля. Старонка першая.*

«Жыццё — страты. Страты тыя, што вакол мяне — чужыя страты: яны мне не належаць. Асабістыя страты — ува мне, гэта страты душы. Тое, што страціла душа — горкі роздум гадзін, дзён, гадоў,— адразаецца ад нашага жыцця беззваротна. І з кожнай籁 стратай — жыццё кароціцца.

Балюча адчуў гэта сёння — спрабаваў аднавіць тыя вершы, што пісаў у сінім блакноціку. Марная спроба. І горкі лёс: летась у штабной машыне згарэлі лісты Луізы — дзве весткі, што прыляцелі з дому пасля таго, як мы прайшлі Беласток. Сёлета згарэў роздум сумных маіх дзён і дзён радасці. А мо не згарэў? Мо нехта ўзяў блакнот у зямлянцы, паклаў у сваю кішэню? Няўжо мой боль перажыве агонь і бяду і застанецца? Але ж ніхто не будзе ведаць, што гэта боль маёй душы — аніводнага прозвішча ў блакноце не было.

Не хочацца, значыцца, знікнуць з зямлі, не пакінуўшы следу? Так, не хочацца. Быў бы шчаслівы ведаць, што ў маім Нойбрандэнбурзе хто-небудзь калі-небудзь прачытае мае мары пад небам Расіі. Не, не хто-небудзь — дачка!

Не прыкмячаю, аднак, гэткіх жаданняў — пакінуць пасля сябе след — у людзей, што побач са мною вось ужо другі год. Іх гіне шмат, амаль штодня — пахаванне. Няўжо яны зусім не клапоцяцца пра тое, што застанецца пасля іх? Не, напэўна ж клапоцяцца. Але я — не разумею гэтага...

Чужую зямлю, чужую душу — чужому чалавеку не спасцігнуць аніколі. Трагедыя — у гэтым».

5

— Ты хоць разумееш, што пішаш? — зноў перапытаў Ціхан, кідаючы Захараву дакладную на стол.— Разумееш?

У Ціханавым голасе было шчырае недаўменне, і яно

насцярожыла, насцярожваў і здзіўляў выраз твару Ціхана, схудцелага, з чорнымі паўкружжамі ў вачніцах. Але наранейшаму Захар быў настроены міралюбна.

— Кароткую дакладную,— спакойна патлумачыў ён.— І пішу ў ёй пра тое, што патрэбна зараз атраду вось гэтак,— ён правёў пальцам па горле.— Зброя, патроны...

— А болей ты нічога не хочаш?

Захар пачуў металічныя ноткі ў голасе Ціхана, убачыў, як нядобра і злосна нават звузіліся яго вочы, і ўпершыню за гэты вечар пашкадаваў, што ён прыехаў са сваёй бядою да брата. Праўду, мабыць, казалі яму і Яштокін, і Важнік, калі раілі пакуль што не паказвацца ў штабе брыгады. Трэба, маўляў, спачатку выправіць становішча сваімі сіламі, сабраць рэшткі атрада, здабыць зброю, правесці дзветры добрыя баявыя аперацыі на чыгунцы ці на гравійках, а тады ўжо і ехаць. Каб не з пустым. Каб слёзы не ліць.

Была ў гэтых парадах рацыя, пэўны сэнс і разлік. Але Захар зразумеў гэта толькі тут, калі ў чаканні Ціхана палову дня правёў у гаворках з Гусаравым і Рымаю. Пад Харкавам — цяжкія баі. Спробы наступаць каля Вязьмы і Ржэва праваліліся. Вельмі трывожныя весткі з Крымскага фронту, дзе нашы войскі ледзь стрымліваюць наступ варожых танкавых армій. У дадатак да ўсяго — пад вялікім сакрэтам паведаміла Рыма — на тэлеграму штаба брыгады за лінію фронту, якую яна перадавала тройчы, дагэтуль няма адказаў. А ў той тэлеграме — пад яшчэ большым сакрэтам паведаміла Рыма — Ціхан прасіў аказаць тэрміновую дапамогу зброяй, прасіў прыслаць самалёт, каб вывезці цяжкараненых. Так што не пра адзін Захараў атрад у Ціхана клопат, і гэтая яго, Захарава, дакладная зусім не да месца. Але ж не адступаць, калі пачаў гаворку! І Ціхан жа не хто-небудзь Захару! Павінен брата і зразумець, і адгукнуцца.

— Больш нічога,— прамовіў Захар памяркоўна. Але тут жа заўважыў пагарду і насмешлівасць у Ціханавым вачах і дадаў рэзка, зацята: — Толькі гэта! Толькі тое, пра што я напісаў у сваёй дакладной...

Да гэтага Ціхан пахаджваў ад дзвярэй да нараў, скрыжаваўшы рукі на грудзях, быццам намагаўся сагрэцца, хоць у зямлянцы было нават душна. Цяпер жа крута нахіліўся над сталом, зробленым з сасновых плашак, схапіў дакладную, падзёр яе, з размаху сунуў у рукі Захару:

— Трымай! Спатрэбіцца, калі за сасну захочаш завярнуць!

Захар разумеў, што перабраў меру, але спыніцца ўжо не мог, сказаў з націскам, выразна вымаўляючы кожнае слова:

— Гэта не толькі маё... Просіць усё камандаванне атрада!

Ціхан схапіўся рукамі за тоўстую бэльку — яна падпірала столь, і да яе мацаваліся нары,— нахіліўся да Захара.

— Кама-а-ндаванне,— губы яго скрывіла пагардлівая грымаса.— Ды гэтае камандаванне і цябе разам з ім — ведаеш, куды трэба? — І адказаў гнеўна, быццам тое, пра што ён казаў, зараз жа і зробіцца: — Пад трыбунал! І — расстраляць, у адпаведнасці з майскім загадам Вярхоўнага! Што вочы паказеліў? І цябе — таксама. Ды яшчэ і ў першую чаргу! — Ціхан трымаў цяпер рукі пад галавой, упіраўся імі ў столь зямлянкі, быццам збіраўся зламаць тонкае бярвенне, у пазах якога вісеў цёмны паклычаны мох.— Атрад хто кінуў? Ты! У тым, што гэтулькі страт у атрадзе, хто вінаваты болей ад усіх? Ты! Ды як і не быць стратам, калі дысцыпліна ў вас і не начавала? Вартавыя — з дзецьмі забаўляюцца. Камандзіры ўзводаў — з жонкамі ў абдымках. І радавыя ўжо, на іх гледзячы, пачынаюць любошчы...

Захар хмурна перапыніў яго:

— Гэта перабольшанне.

— Што, не гуляў у шышачкі вартавы з Чэсіным Толікам?

— Між іншым, гэта ж твой пляменнічак.

Як не пачуў кпіну, як не заўважыў Ціхан з'едлівай усмешкі на Захаравым твары, зноў сесануў:

— Што, не спаў у абдымках Ванды твой Файзуло?

— Не ведаю пра абдымкі, бо не прысутнічаў. Але тое, што Файзуло цяпер адзін — факт. Ванда ў горадзе. Побач са смерцю спіць. Амаль у абдымках...

— А Багдан? Не ён, сынок паліцэйскага, па пацеху ўсім сваю «галубку» па ручках насіць?

Пагардлівы з'едлівы тон, якім кідаў абвінавачванні Ціхан, цяпер пакрыўдзіў, і Захар прамовіў з дакорам:

— Ты, аднак, усе плёткі ведаеш.

— Факты гэта! Факты!

І зноў ударыла па сэрцу крыўда, і Захар сказаў рэзка, адчуваючы, што будзе спрачацца з Ціханам, будзе, хай нават усё павернецца для яго, Захара, блага.

— Да іх ты можаш шчэ дадаць, што гэты «сынок паліцэйскі», як ты кажаш, сваяк наш законны.

Ціхан хітнуў галавою назад, а рукі пераставіў на бэльку побач, і цяпер галава была як бы адгароджана гэтымі рукамі, і твар, захілены ад святла газнічкі, прымацаванай да слупа, выдаваў чорным, і яшчэ чарнейшымі, як зямля, былі глыбокія правалы ў вачніцах, у якіх, здавалася, зусім не было вачэй.

— Няма — зарубі гэта сабе па носе! — у мяне зараз сваякоў! — Ціхан рынуўся да Захара, і Захар адхіснуўся, заплюшчыў на міг вочы: яму падалося, што Ціхан зараз ударыць яго.— Ёсць толькі салдаты! Толькі салдаты, і ў кожнага — святы салдацкі абавязак! Чуеш?

Калі Захар адплюшчыў вочы, Ціхан сядзеў побач на доўгіх нарах, засцеленых сухім імхом, сядзеў, звесіўшы ногі, сагнуўшыся, быццам нешта ўважна разглядваў у доле, пад сваімі ботамі. Яго патыліцу, якая зарасла доўгімі, даўно не стрыжанымі валасамі, падпіраў брудны, скамечаны і замусолены падкаўнерык вайсковага крою фрэнча. Гэтае адкрыццё — замусолены, брудны падкаўнерык, які звычайна ў Ціхана быў бялюткі,— абудзіла ў Захара помслівую злараднасць. Бач ты, акураціст! Як прыціснула, дык і на каўнерык перастаў зважаць. Крычаць толькі здатны! А ты ідзі туды, на бераг Дзвіны, там пакрычы! Яму б, Захару, у гэтыя лясы — ён бы і горачка не ведаў. І каб ён, Ціхан, прыйшоў да яго, Захара, то Захар гэтак на яго не напусціўся б. Можа, ведама, і пакрычаў бы, але ж трыбуналам не пагражаў, расстрэлам не страшыў. І дапамог бы...

— Дзіўлюся я з цябе, Ціхан,— сарвалася ў Захара. Але гэта было шчырае прызнанне ў тым, пра што ён думаў.— Жорсткі ты!

Ціхан уздыхнуў, і Захару падалося, што ён пакутуе з таго, што быў гэткі рэзкі. Але ў голасе Ціхана ласкавейшых нотак не з'явілася.

— Ведаю. І што самае дзіўнае? Нічога не магу парабіць з сабою. Як нехта сядзіць ува мне...

— Вайна вакол.

— Не-е, спачатку не вакол. Вайна ідзе спачатку ўнутры нас, у нашай душы. Мы яшчэ не змяніліся так, як гэтага патрабуе час... Разумееш?

У голасе Ціхана пачуліся цяпер цяплейшыя ноткі, нейкі як бы роздум і давер, і Захар прамовіў з усмешкай:

— Пакуль што разумею толькі адно: замест патронаў і

зброі дамоў павязу вось гэта,— ён патрос на далоні кавалачкі сваёй дакладной.— А як ваяваць?

— Хочаш паслухаць пісьмовы адказ на сваё запытанне? Пісалі, ведама ж, мне, а я табе адрасую. Якраз да месца будзе. Вельмі прыдасца!..

Ціхан узяў са стала планшэт — Захараў падарунак з трафеяў, што былі ўзяты летась, калі атрад разграміў фашысцкі штаб ля брукаванкі на Віцебск. Позна ўвосень, сустрэўшыся з Ціханам, Захар падараваў яму планшэт, і гэтым падарункам, помніцца, Ціхан быў задаволены.

— Служыць шчэ планшэтка абкому? — падкалоў Захар.

— А што ёй! — з развагаю прамовіў Ціхан. — Галаву не ламаць. Куды пакладуць — там і ляжы сабе.

— Я слухаю,— нагадаў Захар, з цяжкасцю стрымаўшы сябе ад таго, каб не пусціць новую шпільку: было б, маўляў, добра, каб твае падначаленыя гэткія былі, як гэтая планшэтка.

— Дык вось,— сказаў Ціхан, разгортваючы аркуш паперы, які быў складзены ўдвая. Чытаць ён пачаў ціха, але без затрымкі, добра ведаючы напісанае.— «Калі вы сваю баявую дзейнасць будзеце звязваць з боепрыпасам, які спадзяецеся атрымліваць з Цэнтра, вы будзеце нанасіць ворагу «булавочные уколы» і сядзець. Вы павінны боезапас адшукаць па месцы, за кошт ворага, як гэта было ва ўсіх партызанскіх войнах і што з'яўляецца, уласна кажучы, прынцыпам у партызанскай вайне. Мне не хацелася б вас павучаць з гэтае нагоды. Калі вы, аднак, правільна засвоіце гэтую думку, дык дзе і як дзейнічаць, вы лепей убачыце самі і, безумоўна, здабудзеце патрэбнае. Вы кідаеце эшалоны пад адхон, дык яны ж заўсёды ідуць з розным вайсковым рыштункам і боепрыпасамі. Чаму вы не арганізуеце буйныя аперацыі з поўным разгромам эшалонаў? У кожным эшалоне ёсць тое, што вам, напэўна ж, спатрэбіцца. Варожая армія забяспечваецца боезапасам з Германіі. Усе яны ідуць ля вас па тонкіх нітачках-магістралях, ахову якіх вы можаце прабіць у любым месцы, калі толькі знойдзеце гэта неабходным. Дык чаго вы без патронаў, чаму вы без толу?

Вы запярэчыце: у вас, маўляў, айчыннае ўзбраенне, а боезапасы нямецкія. Добра. Па-першае, не ўсё ўзбраенне айчыннае, а па-другое, і з гэтага становішча трэба адшукаць выйсце. Калі ласка, перазараджайце, не раскідайце пустыя гільзы, выкарыстоўвайце нямецкія капсулі, порах

і вашу гільзу. Вось вам і патроны. Выплаўляйце і даставайце іншым якім спосабам тол з нямецкіх снарадаў, разраджайце нямецкія бомбы. Вось вам узрыўчатка. Акрамя таго, вораг, напэўна ж, мае недзе паблізу ад вас склады. Чаму не патрывожыць іх?

Збіранне, пошук зброі, боезапасаў, захоп яго ў ворага, узбройванне ім атрадаў і партызанскіх рэзерваў мае зараз асноўнае і рашаючае значэнне...»

Ціхан, дачытаўшы, схаваў паперу ў планшэт і кінуў яго на стол. Ад гэтага руху загайдалася і згасла газнічка.

— Як табе пісана, праўда? — Ціхан папытаў з'едліва.— Задаволены ты пісьмовым адказам? — і тут жа сам дадаў яшчэ: — А ў мяне, брацс, не пытаюцца, ці задаволены я. Мне вось проста шлюць цыркуляр на мае дакладныя. Зразумеў?

— Дык хай той, хто пісаў яго, сюды і прыязджае! Хай пакажа, як у часе бою збіраць страляныя гільзы, а з нямецкіх — капсулі выбіваць і ў нашы — устаўляць. Хацелася б мне зірнуць, як гэта будзе ў яго атрымлівацца!

— Тол жа ты са снарадаў плавіш?!

— Тол — гэта зусім іншае.

— А склады? А эшалоны? Хіба не справядлівы папрок нам усім? Думаю, справядлівы...

— «Гладко писано в бумаге. Да забыли про овраги. А по ним — ходить». Ведаеш, адкуль гэта?

— Да Суворава табе далёка. А мо і ты, калі драпака даваў з лесу, крычаў: «Заманивай, ребята!»

— Злосны ты, Ціхан, зрабіўся.

— Не я. Час!

Зашархацелі запалкі ў карабку, пырхнула хісткае святло. Самаробны чорны кнот блага браў агонь, і Ціхан чыркаў па ім запалкаю, пакуль газнічка не пачала гарэць роўна.

У зямлянку, папытаўшы дазволу, увайшла Рыма, працягнула Ціхану два вузкія аркушы паперы.

— Усё прыняла?.. Дзякую. Ідзі, адпачывай,— сказаў Ціхан і пашамацеў папераю — трос аркушочкі ў руцэ.— Чым зводка радуе?

— Кепска. Зусім кепска.

Рыма амаль нячутна зачыніла за сабой дзверы. Ціхан пачаў чытаць прагна, не адрываючыся. Раптам ён ціха, як ад моцнага болю, застагнаў, і Захар, зірнуўшы на яго, спачатку быў падумаў, што побач сядзіць зусім незнаёмы яму

чалавек: нос Ціхана завастрыўся, шчокі запалі, плечы згорбіліся і абвялі.

— Адказалі, значыцца, на першамайскі загад Вярхоўнага ўдасканальваць вайсковае майстэрства і біць ворага, каб напэўна ўжо было,— і Ціхан ціха павагаў аркушы паперы, трымаючы іх за кончыкі.— Новае шыкоўнае адступленне.

— Дзе? Пад Масквой? — вырвалася ў Захара.

— На Поўдні. На, чытай...

Захар чытаў, і яму здавалася, што агонь запальнічкі пашырыўся, вырас у моцнае полымя і смаліць яму ў патыліцу. Што ж гэта? Новы сорак першы? Адкінуць ворага на сотні кіламетраў, выстаяць зіму, умацаваць свае пазіцыі на ўсіх франтах і зноў пакаціцца назад? І шчэ ж як пакаціцца! Вораг нанёс галоўны ўдар усцяж узбярэжжа Феадасійскага заліва, прарваў слабую абарону сорак чацвёртай арміі і прымусіў нашы войскі адкатвацца на Усход. Рашэннем Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандуючага Крымскі фронт расфарміраваны.

Паўднёва-Каўказскі напрамак ператвораны ў Паўночна-Каўказскі фронт...

Захар, адчуўшы жахлівую стому, змружыў вочы і нечакана горка ўсміхнуўся сам сабе.

«Крымскага фронту, значыцца, няма, не існуе. Танкі ворага, значыцца, вырваліся на аператыўную прастору, у стэпавую частку Украіны».

Памяць вярнула яму падзеі мінулага года, калі ён глядзеў з узлеску на танкавыя калоны, што рухаліся няспынна, фарсіраваўшы Дзвіну пад Віцебскам... А там жа, у стэпах, дарогі скрозь, дарогі сухія, роўныя, шырокія... Феадосія... Небачка! Гэта ж — Чорнае мора ля варожых ног усё.

У гэта не хацелася верыць. Але думкі самі скіроўваліся туды, на поўдзень, і Захар прыгадаў, як летась, вясною, ён абяцаў дзецям паехаць у адпачынак на Чорнае мора. Ігарок скакаў ад радасці, Леначка пляскала ў далонькі, Зінаіда марна спрабавала ўтаймаваць іх, са смехам казала, што зараз абернецца хата, давядзецца рамантаваць яе, і мора ім тады ніколі не пабачыць. Як сурочыла ўсё жонка... І ёй, і дзеткам ужо не ўбачыць мора... А Ціханава сям'я там, ля мора, ён жа яе якраз напярэдадні вайны наслаў туды на адпачынак. Ды не, калі ж тое было! А Ціхан жа, здаецца, нічога пра сваіх і дагэтуль не ведае. А можа, апошнім часам што-небудзь даведаўся? Гэта, відаць, ле-

пей, калі не ведаеш: можна спадзявацца, можна жыць надзеяй...

— Пайшлі,— нечакана сказаў Ціхан.— Няма чым тут дыхаць... Смярдзіць газнічка, чорт бы яе драў.— І зноў паўтарыў настойліва: — Пайшлі... Падыхаем. І салаўёў паслухаем.

Захару падалося, што ён не дачуў.

— Якіх яшчэ салаўёў? Іншага занятку ў нас няма?

— Хадзем, хадзем!..

Ён прапусціў Захара да дзвярэй, адчыніў іх, потым махнуў рукою на газнічку, і яе жаўтлявы агеньчык затрымцеў і згас.

— Чарадзей,— іранічна прамовіў Захар.— Рукою матнуў — твая воля і робіцца.

— Гэ-э, каб чарадзеем зрабіцца! Я ўжо б абедзве рукі не пашкадаваў — матаў бы імі да змогі, каб набрадзь гэтая пакацілася ў сваё логва.

— Ты цішэй, за табою не ўгнацца. Вочы можна выпараць.

— Прыглядай, прыглядай сабе дарожку. А-ах, як хвоя маладая водар копіць... Дурныя мы некалі былі, адпачынак бяром — у цягнік душны. А тут — гэткае дзіва...

Зусім інакш гучаў цяпер Ціханаў голас — даверлівасць, спагада і цеплыня былі ў ім,— і Захар губляўся ў здагадках. З чаго? З чаго гэтыя змены ў настроі Ціхана? Толькі што лаяўся на Захара, пагражаў трыбуналам. Потым з гэткім болем успрыняў паведамленне аб нашых няўдачах на Поўдні. А цяпер, як нічога і не здарылася благога, жартуе, прыдумаў ісці слухаць салаўёў! Нешта яшчэ, нешта важнае і сур'ёзнае крыецца за тым, што прапанаваў Ціхан. Не, хутчэй за ўсё — стаміўся чалавек. І гэта — Ціхан? Не, не верыцца! Ціхан чалавек загартаваны. Тое, у што ён верыць, даражэй яму за жыццё. Цікава, аднак, чаму Ціхан не распытваў пра тое, што ён, Захар, даведаўся ў горадзе? А ён жа ведае, што Захар быў там... Не, нешта важнае змянілася ў ім, змянілася моцна, і ён, Ціхан, змены тыя, мабыць, не заўважае...

Думкі гэтыя трывожылі, Захар увесь час збіваўся з размеранае хады — сцежка пакручастая, у карэнях, дрэвы стаялі цесна вакол,— двойчы ледзь не паваліўся. Узнікла жаданне папрасіць Ціхана ісці цішэй, але ён перасіліў сябе, пёр следам, толькі па кроках і слабым мігаценні наперадзе ўгадваючы, куды трэба вярнуць. Але вельмі хутка вочы прызвычаіліся да ляснОй цемры, і Захар пачаў заў-

важаць, што ўверсе над старымі ялінамі ўжо слаба рдзее неба. З кожным крокам рабілася лягчэй, бо сцяга цяпер была хоць і вузенькая, але дужа роўная, моцна зацярушаная шыгаллем, значна святлейшая за густы чарнічнік пад шатамі ялін, і здавалася, што ён крочыць па чыстай пясчанай паласе, а паабапал стыне чорная, як у віры, вада. Постаць Ціхана, які ўпэўнена крочыў наперадзе, цяпер выразна акрэслівалася, і Захар бачыў, што Ціхан часта праводзіць рукою па валасах, быццам стрэсвае з іх штосьці.

Раптоўна моцна пасвятлела і наперадзе, і наўкола, і старыя яліны як бы адскочылі назад, саступіўшы месца маладому і дужа густому бярэзніку. У ім, калі яны прайшлі крокаў дзесяць, зрабілася зусім светла: вершалінкі дрэў акрэсліваліся выразна, і злева над імі добра пунсавела неба.

Ціхан спыніўся. Спыніўся адразу ж і Захар, але Ціхан не павярнуўся да яго, паківаў узнятай рукою — клікаў падысці бліжэй.

— О! Чуеш? — спытаў Ціхан.

Захар адмоўна матнуў галавой. Але тут жа ўчуў наперадзе, якраз у тым баку, куды вяла сцежка, салаўіны спеў. Сказаць пра гэта Ціхану не паспеў — вакол зноў запанавала цішыня.

— Зараз, зараз на ручай выб'емся. Пачуеш тады,— паабяцаў Ціхан і зноў хутка пакрочыў па сцежцы.

Маладыя гнуткія галіны бяроз амаль спляліся над сцежкаю, даводзілася адсоўваць іх плячом, і Захару здавалася, што Ціхан ідзе нячутна, а з гэткім сухім і моцным шоргатам галіны сцёбаюць толькі яго, Захараву, скурапку. Час ад часу вецце хлабыстала па твары, і Захар плюшчыў вочы і, калі адкрываў іх, бачыў наперадзе шырокую Ціханаву спіну, якая неяк хутка аддалялася, быццам заплывала ў бярэзнік, і паскараў хаду. Былі кароткія імгненні — у перапынках паміж ударамі галля па шыі і плечах,— калі Захару здавалася, што ён чуе знаёмае чоканне, але тут жа зноў усё глушыла калянае шапаценне лістоты.

Бярэзнік скончыўся, адкрылася нейкая лугавіна, акаймаваная чорнай звілістай стужкай дрэў; там, дзе стужка пад вострым вуглом вярнула ўправа, над зямлёй вісела рэдкае попельнае покрыва туману. З сярэдзіны гэтага покрыва вастраверхім астраўком узвышаліся шаты дрэў, але не цёмныя, з якіх складалася звілістая стужка, а значна святлейшыя, амаль белыя.

Ціхан спачатку кіраваў на гэты белаваты астравок, які цяпер загусцеў і сцямнеў, потым павярнуў улева, да цёмнай стужкі, якая выгнулася клінам, і Захар добра разгледзеў, што клін гэты — маладыя вольхі над маленькім ручаём. Неўзабаве ён убачыў пакаты бераг і выбіты коламі фурманак брод, заўважыў светлыя каляіны дарогі, якая па гэты бок ручая ціснулася да вольх, а на тым беразе строма паўзла на пагорак, цяпер добра акрэслены.

Улева ад броду, ля самай вады, горбілася лазіна, якая рэзка выдзялялася сярод вольхаў сваёй светлай лістотаю. Непадалёк ад лазіны, высокім паўкругам, шарэлі валуны, і Ціхан сеў на крайні, пляскаты і шырокі, бліжэйшы да вады, паляпаў па суседнім рукою — запрашаў Захара садзіцца. Захар сеў і здзіўлена, нават спалохана азірнуўся на Ціхана: ля ручая, як не за плячыма Ціхана, недзе ў галлі гарбатай лазіны засняваў салавей, потым змоўк, але яму тут жа адгукнуўся другі, улева ад Захара і не дужа блізка.

Ціхан моўчкі паглядзеў на Захара, паківаў галавою, як быццам папярэджваў, каб той сядзеў ціха і толькі слухаў, потым марудна споўз з граніту, як паехаў з яго, і ляжаў на траве, прыткнуўшыся патыліцаю да каменя. Захар зрабіў гэтак жа, асцярожна споўз на зямлю і расцягнуўся на сухой, зусім без расы пожні, потым павярнуўся на правы бок, падклаў пад галаву сагнутую ў локці руку.

Барвы па небе гусцелі, потым збляклі, як разрэзаныя агністым святлом, і неба засінела ўверсе, увачавідкі паглыбела — за лесам узыходзіла сонца. Нібы вітаючы новы дзень, салавей на гарбатай лазіне густа чокаў, высвістваў, аж заліваўся, а потым зноў выбіваўся на чыстыя галасістыя каленцы. І яго ўзнёслы, урачысты і радасны спеў шырока плыў над лугавінай у бок таго светлага астраўка, які нядаўна белай кучомкаю вісеў над шэра-попельным полагам туману, а цяпер акрэсліўся ў шырокае і кудлатае чаромхавае дрэва, што ўжо дацвітала і здавалася не белым, а ружаватым; нібыта ўдарыўшыся ў заглуш чаромхавага галля, салаўіны спеў знікаў. Крыху спагадзя ўсчынаўся зноў, але цяпер па новай, задзірлівай ноце, і кожнае каленца канчалася не хрумсткім «ур-ур-ур-р-р-р», а галасіста-звонкім і гучным: «дзюў-ра, дзюў-ра...» Салавей на гарбатай лазіне маўчаў, цяпер спяваў толькі той, другі, у чаромхавым галлі.

Моцны водар маладога чабору гнала з-за граніту, і Захар, глыбока ўдыхнуўшы яго, як не захліпнуўся густым і знаёмым пахам. П'янкая хваля бяздумнай лёгкасці гушка-

ла, несла, цягнула ў салодкую прорву сну, і Захар ужо не бараніўся ад гэтай хвалі, а проста радаваўся, што яна ёсць, і ўслухоўваўся ў салаўіныя перагуды з дзіўным хлапечым адчуваннем свае перавагі ў нейкай незразумелай спрэчцы. Салаўя, які спяваў па чаромсе, ён палічыў сваім, а гэтага, па гарбатай лазіне, аддаў Ціхану і, поўны захаплення — той, дальні, спявае больш галасіста, званчэй! — цішком як бы падахвочваў таго, што спяваў па чаромсе; выводзіць мудрагелістыя каленцы.

Потым пачуўся яшчэ нейкі гук, як спеў, з глухімі сіпатымі пералівамі, якія ішлі аднекуль з-пад камянёў, і Захар, з цяжкасцю разадраўшы ліпучую хвалю, што закалыхвала і некуды несла яго, ускінуў галаву і прыўзняўся на локці.

«Ціхану блага... Ён жа хрыпіць, задыхаецца...»

Ад хвалявання Захар ажно ўспацеў, нахіліўся над братам і тут жа заняў ранейшую паставу, цяжка аддыхаўся. От жа дзівак! Спіць Ціхан! І шчэ як спіць! Салодка пахропвае на ўсе застаўкі, як самы шчаслівы чалавек на зямлі, якога нішто не хвалюе і не турбуе!

За кароткі час салодкага самазабыцця, у якое на міг праваліўся Захар, усё навокал рэзка змянілася — чыстая сонечная раніца набрала ўжо сілу. Цяпер добра праглядвалася ўся лугавіна ля ручая. Ручай быў маленькі, за бярэзнікам ён крута вярнуў управа і знікаў у лесе, суцэльная сцяна якога змрочна сінела наўкола. Пасярэдзіне лугавіны, якраз ад таго астраўка чаромхі, густа зеляпеў жытнёвы клін, абгароджаны нізкім жардзяннікам; жытнёвая палоса, як бы пераскочыўшы ручай, легла на пагорку і знікала за ім, але там, на вышыні, яна ўжо нічым не была абгароджана, быццам злівалася з блізкім зусім даляглядам. Салавей з гарбатай лазіны пераляцеў на чаромху, і цяпер толькі адтуль чуўся несціханы — у два галасы — залівісты ўрачысты спеў.

Ціхан ляжаў на левым баку, павярнуўшыся да валуна спіною, і Захар, гледзячы на ўспацелую патыліцу брата, на яго плечы, якія ціха і рытмічна то ападалі, то ўзнімаліся ад дыхання, нечакана адчуў — адчуў са сполахам і збянтэжанасцю! — нейкае пядобрае пачуццё да Ціхана. Сярод зялёнай маладой травы, побач з магутнымі гранітамі, якія, відаць, выкацілі з жытнёвага поля, а потым і з лугавіны, каб яны не заміналі, сярод хараства новага пагоднага дня постаць брата выдавала дужа мізэрнай, бездапаможнай і кволай. І менавіта гэта — мізэрнасць і

кволасць чалавека, у сілу і моц якога ён верыў усё сваё жыццё,— і абудзіла нядобрае пачуццё, і спарадзіла жаданне некуды пайсці, каб не ляжаць тут, не бачыць гэтай слабай і бездапаможнай постаці, якая скурчылася на маладой траве.

Захар зрабіў колькі крокаў і спыніўся, уражаны прыгажосцю лугавіны. Якая густая трава скрозь! І столькі шчаўя каля каменя! Разок скубнеш — поўная жменя!

Прыемная кісліна асвяжыла рот. Захар з асалодаю жаваў тонкія крохкія лісцінкі і глядзеў у канец лугавіны, дзе ўжо зусім растаў попельны туман, слухаў зладжаны спеў салаўёў, якія цяпер ужо не фатыгавалі адзін перад адным, а вялі стройны, суладны спеў. Згадаўся той далёкі цяпер дзень, калі Захар прыехаў з лекцыяй у калгас і старшыня арцелі пахваляўся сваімі лугамі, якія цалкам абсеяў цімафееўкай і суданкай. Небачка! Як цэлая вечнасць мінула пасля таго! І на гэткай вось лугавіне, сярод густой травы, пакутаваў ад ран Балаш. Як ён прасіў тады, каб вынеслі яго на поле, каб пабачыць сонца, пачуць пах жыта. А Захар тады шчэ пасварыўся на Гайдаш. Балаш, помніцца, ляжаў на ўзмежку, у густым рамонкавым россыпе. А тут вось рамонку зусім не відно. Не, ёсць ён, але не цвіце... Дзіўна, Балаш быццам прадбачыў сваю смерць. «Мой лёс — паміраць». І памёр, хай сабе крыху пазней, але ж смерць яго знайшла... Відаць, Балаш адчуў набліжэнне яе яшчэ там, на мяжы ля жытнёвага кліна...

Захар зірнуў на лапіну жыта, што пачыналася ад чаромхі і ішла за ручай пад самы далягляд, пакасіўся ўлева, і яму памроілася, што тут, ля валуноў, не спіць, а канае, у пакутах памірае Ціхан; даўкая кісліна забіла яму рот, ён папярхнуўся, кашлянуў.

Імкліва, як падкінуты пружынаю, Ціхан узняўся і сеў, навёў галавой у бок Захара, зірнуў на ручай. Пазяхаючы, ён нейкі час глядзеў на гарбатую лазіну, потым развёў рукі ў бакі, затым з хрустам звёў іх над сабою.

— Вось даў храпавецкага,— прамовіў Ціхан радасна, новым і насвяжэлым голасам.— Даўняя звычка мяне ўратоўвае. Даўней было: прыкурну ў машыне дзесятак мінут — і поўны дзень на нагах. І як тое цяпер прыдалася! Чалавеку — я ўжо даскапала гэта вывучыў — дастаткова дваццаць мінут сну. Але вось менавіта гэткага, каб вочы змружыў і адразу — бы камень на дно. Э-э, ды ты ўжо снедаеш. А зарадачку, зарадачку хто будзе за цябе рабіць? Гайда да вады!..

Ціхан пабег за рагатую лазіну, потым выйшаў з-за яе, на хаду скідаючы фрэнч. Лёг на зямлю, абапіраючыся на шырока расстаўленыя рукі. Разоў дванцаць апусціўся і падняўся на руках, спружыніста адпіхнуўся ад зямлі, стаў на ногі. З левай кішэні фрэнча выцягнуў кавалачак мыла, загорнуты ў насоўку.

— Не ўлічылі мы да вайны сур'ёзна мыла і соль,— сказаў ён, разглядваючы падкаўнерык фрэнча.— А што аказалася? Без іх, як і без патронаў, кепска.

Ціхан адарваў падкаўнерык і, намыліўшы яго, адклаў убок, пачаў мыць твар. Шаруючы падкаўнерык, кіўнуў на кавалачак мыла, які ляжаў на камяні:

— Расходуй ашчадна. Разок цярнуў — досыць.

Захар памыўся з асалодаю. Кавалачак мыла ён паклаў на альховы лісцік, і Ціхан разам з ім загарнуў мыла ў насоўку. Потым Ціхан павесіў падкаўнерык на галінку лазіны, сеў на той жа граніт, дзе сядзеў на досвітку, паклікаў Захара.

— Сядай, пагамонім,— жуючы шчаўе, счакаў, пакуль Захар сядзе, дадаў тонам памяркоўным: — У зямлянцы я быў знерваваны, раздражнёны, і ты на гэта не звяртай увагі. А цяпер — пра галоўнае,— ён на момант змоўк, рваў шчаўе і высцілаў лісцінкамі трохкутнік; у цэнтры трохкутніка ўваткнуў сухую галінку, якая трапіла пад руку.— Гэта, уяві сабе, твой атрад. Разумееш сітуацыю? Гэта,— ён павёў рукою па адной лініі лісцінак,— Дзвіна. Насупраць — чыгунка. Бачыш, як гэтыя лініі ўпіраюцца ў горад? А трэцяя лінія — таксама чыгунка, але яна — далёка. Так што вось гэта,— ён павёў рукою наўкола лісцінак,— твой тыл. Адным словам, ты — наш тыл. Мы — твой тыл. У трохкутніку — толькі адзін атрад. Падзеліш яго на роты, паставіш на трох кутках.

— Тут і ў адзін куток няма чаго ставіць.

— Расці трэба! Павялічвай атрад! Трохкутнік ты павінен трымаць у сваіх руках!

Гаворка пра трохкутнік, у якім дзейнічаў атрад, была не новая, як не была новай і задача, якая ставілася перад Захарам — яшчэ летась, на нарадзе партыйнага актыву на млыне ў Райнекі, Ціхан казаў прыблізна тое ж. Але цяпер, выслухаўшы Ціхана, Захар сумеўся. Ціхан сваёй гаворкаю апярэдзіў яго, бо ён, Захар, калі раіўся з Яштокіным і Важнікам, прыйшоў да думкі, што заставацца ў вузкім і цесным трохкутніку атраду небяспечна. Яны дамовіліся тады, на той нарадзе трох: калі зброі і патронаў ат-

раду не выдзеляць — а менавіта гэтак яно і здарылася! — прасіць дазволу перакінуць атрад за чыгунку, бліжэй да Галубіцкай пушчы, дзе можна манеўраваць і не адчуваць сябе заціснутымі ў абцугі, дзе можна разлічваць і на дапамогу суседняга атрада. Здаецца, аднак, што гаворка зараз пра тое — марны занятак: тое ж самае адбудзецца, што з дакладной пядаўна.

— Якім чынам трымаць? — спытаў Захар з прытоеным усміхам.

— Рый акопы. Садзіся ў акопы. Бі фашыстаў з акопаў.

— З акопаў, значыцца?

— Але, з акопаў.

— Гэта нешта зусім новае ў партызанскай вайне. Што, усё адтуль, з той рэляцыі, якую ты мне чытаў?

— Гэта жыццё,— сказаў Ціхан жорстка.— Я быў на нарадзе камандзіраў, якую праводзіў прадстаўнік Цэнтральнага Штаба. І начальнікам яго прызначаны Панамарэнка. Той, што быў сакратаром Цэнтральнага Камітэта да вайны. Знаёмае табе прозвішча?

— Ведама. Штаб ёсць — ужо і весялей.

— Вось і дзейнічай!

— Садзіцца ў акопы? З чым? Мне ж трэба набрацца сілы. Знайсці зброю!

— Пашукаеш, як хлеба шукаюць,— і знойдзеш,— перапыніў яго Ціхан.— Але спачатку — Прысяга Беларускага Партызана. Тэкст зацверджаны Цэнтральным Камітэтам.

— У мяне ж яе няма!

— Атрымаеш сёння. І калі якую зброю Штаб прышле нам, у першую чаргу табе выдзелім...

Ціхан прамовіў гэта з усмешкай, але з усмешкай не даверу, а спачування, і ва ўсім тым, што казаў далей Ціхан пра задачы, якія стаялі перад захараўскім атрадам, ва ўсіх нарадах — асаблівая ўвага на выхаваўчую работу сярод партызан і на палітыка-масавую работу сярод насельніцтва! — Захар не злавіў потак прыязнасці і цеплыні: Ціханаў голас гучаў роўна, упэўнена. І менавіта яна, гэтая халоднасць, увесь час стрымлівала Захара, прымушала не пярэчыць, слухаць, са згодаю час ад часу ківаць галавою. У душы, аднак, ён шмат з чым, пра што казаў Ціхан, не пагаджаўся, аспрэчваў. Увесь час у яго розуме круцілася пязгода з тым новым у партызанскім жыцці, пра што давялося пачуць,— з акопамі. Гэта ж смешна! Адкатвацца

фронт на Поўдні, адступаюць рэгулярныя арміі... А ён, Захар, возьме жменьку сваіх партызан, сядзе ў акопы!

На нейкае імгненне перад яго вачыма паўстала поле, выгнутыя падковаю ланцугі фашысцкіх салдат, якіх ён тады з Траянам убачыў з-за кустоў ядлоўцу. Паспрабаваў уявіць сябе не ў тым шалёным бегу, калі яны, расстраляўшы ўсе набоі, кінуліся з Траянам уцякаць, а на полі, у цесным акопчыку, і ў сэрца залез непрыемны халадок. Нечакана падалося — Ціхан, зняўшы з галіны гарбатай лазіны белы падкаўнерык, склаў яго і моцна тузануў за канцы раз, другі, трэці, і белая стужка слаба хлопала,— што ён чуе, як густа покаюць разрыўныя кулі ў голлі маладых соснаў, пад якімі, нізка прыгінаючыся да попельнага, аж сіняга месцамі мху, яны з Траянам пласталі шалёным галопам, беглі, высільваючыся, аж горыч залівала рот...

Зноў у Захаравай душы мацнела пядобрае пачуццё да Ціхана. Прагнуў жа гэтай стрэчы, употай спадзяваўся,— быў часамі і пераканапы! — што яна будзе гэткай жа, якой была летась, увосень, калі яны, разагрэтыя шчодрым пачастункам млынара, задаволеныя ўдала праведзеным актывам, ішлі ўсцяж поля, на якім зелянела густая дружная рунь. Чамусьці цяпер побач з добрым выразна прыгадалася, як Ціхан папракаў Захара за тое, што той робіць рызыкоўныя прагнозы, абяцаючы хлебаробам весці жніво камбайнам, на вольным калгасным полі: пасеялі, маўляў, па-калгаснаму, дык і ўбіраць будзем калгасам — фашыстаў да вясны выганім з нашай зямлі. Ціхан, аказваецца, бачыў далей за яго, прадбачыў сёлетнія няўдачы на фронце, рабіў правільны аналіз, а ён, Захар, са сваімі абяцаннямі выглядае сёння наіўным хлапчуком. Вунь якое крывавае жніво ідзе на Поўдні. На самым, лічы, хлебным полі краіны...

— А цепер слухай радасную навіну,— нечакана прапанаваў Ціхан.— Акадэмік жа наш жывы! Ягорка наш жывы! І — дывізіяй камандуе. Як навіна?

— Проста не верыцца! Файзуло ж казаў, што сам бачыў: камбата снарадам накрыла.

— Зямлёй накрыла. Упяцёх яны пасля таго бою засталіся жывыя. Прабіліся за фронт. Браткоўскі быў цяжка паранены. Ягор — на яго месцы цяпер...

— Слухай, Ціхан, а можа... А што, як і Пахом жывы?

Ціхан пакруціў галавой, узяўся наматваць падкаўнерык на ўказальны палец, сказаў ціха і сумна:

— Артур, я чуў, хоча ўбачыць бацькаву магілу. Ты яго не затрымлівай. Выдзелі людзей, хай сходзяць...

— Я сам збіраюся туды пайсці. Разам і выправімся.

— Зноў атрад кінеш?

Нядобрае пачуццё, што было заглухла ад радаснай навіны, зноў вярэдзіла, шкрабло душу. Але цяпер да яго далалася і раздражнёнасць: Ціхану, аказваецца, кожны Захараў крок вядомы!

— Не магу ўжо і на магілу брата пайсці? — Захар спытаў з выклікам, як не згаджаючыся з тым, што яго самастойнасць заціскаюць, і адразу адчуў, што сказаў глупства, што мог там, на месцы, усё вырашыць сам, і пакутаваў ад таго, што гэтую дробную крыўду Ціхан, безумоўна, зразумеў.

Ціхан доўга і ўважна глядзеў на Захара, потым прамовіў, прытоена ўздыхнуўшы:

— Калі ты...— вытрымаў нейкі міг, быццам чакаў пярэчанняў, потым выказаў сваю думку хутка і безапеляцыйна: — Калі ты будзеш і далей гэтак разважаць, камандаваць атрадам, думаю, не зможаш!

— Я не вельмі за тое камандаванне і трымаюся, каб ты ведаў гэта.

— Тым горш! Патыхае здрадай ад гэткай абыякавасці!

Ціхан астудзіў яго, сказаўшы стрымана:

— Не ламай галавы, дарагі мой, не шукай слоў. Час не той. Што ты вачмі пабліскваеш? Я табе праўду сказаў. Ты хто? Камандзір атрада, і ў тваіх руках — жыццё людзей. Сёння ты скажаш, што не трымаешся за камандаванне. Заўтра — другі, потым яшчэ знойдуцца гэткія... А хто павядзе людзей наперад? Хто? Табе даручылі? Вядзі. Мне нават дзіўна, што я павінен гэта тлумачыць. З вопытам жа чалавек, загартаваны, зіму гэткую перажыў...— Ціхан раскруціў падкаўнерык, патрос ім у паветры.— А ён ужо і сухі, падкаўнерык мой, і адпрасаваны. На пальцы, калі высахне, дык і адпрасаваны. Зараз мы яго на месца пасадзім...

Ціхан сеў на граніт, адагнаў борцік фрэнча, на якім была зашпілена іголка, абмотаная белай ніткаю. Хутка і лоўка падшыў падкаўнерык, закалоў іголку на старое месца, заматаў нітку, і гэты братаў занятак вярнуў Захару раўнавагу. Дакладней, не сам занятак, а тое, што Ціхан нечакана прызнаў за ім, камандзірам атрада, якога зусім нядаўна ганіў, пэўны вопыт, загартоўку, не скінуў з рахунку і горкую зіму.

— А ты мне можаш патлумачыць, чаму на Поўдні нас зноў гоняць? — спытаў Захар памяркоўна, як бы даючы гэтым зразумець, што ён не крыўдуе на Ціхана.

Ціхан адгукнуўся адразу ж:

— Па тых самых прычынах, па якіх пагналі, бы зайцоў, і тваіх ваякаў ля Дзвіны. Зможаш сабе гэта патлумачыць — зразумееш усё. А не зможаш — цябе пагоняць зноў. Толькі тады мы ўжо з табою будзем не гэтак гаманіць... І апошняе. Адказным арганізатарам абкома ў вашым трохкутніку прызначаны Гусараў. Ён табе і цар і бог, як кажуць. Зразумела?

— Калі што і не сцяміў — дарогаю дадумаю.

— Памятаю, як бацька пра цябе казаў: Захарка ў нас, маўляў, з галавой. А я б шчэ дадаў: і няўдзячны. Салаўіны канцэрт яму закаціў — каб табе слоўца падзякі.

Ціхан, узнімаючыся, казаў гэта тонам паблажлівым, без павучанняў, але Захару не зрабілася ўсцешна. Блізкасць і разуменне выпарыліся, зноў іх падзяляе няўлоўная мяжа, якая лягла ў часе гаворкі ў зямлянцы. Белы падкаўнерык неяк асабліва падкрэсліў рудаватасць Ціханавага твару, загарэлага, у густой шчэці барады, нейкага суровага, замкнёнага, і аб гэтую суровасць імгненна разбілася цеплыня, якая ажыла была ў Захаравым сэрцы. Захар моўчкі пайшоў следам за Ціханам, які праставаў лугавінай да сцежкі, што была цяпер, пры святле дня, добра прыкметная ў маладым бярэзніку.

Нечакана ззаду, ля ручая, гулка і паспешна залапатала сарока. Захар азірнуўся і ажно заплюшчыў вочы ад яркіх промняў сонца, агністы краёк якога вылез, прабіўся праз макавінкі старых ялін. Макавінкі былі амаль чорныя, і здавалася, што сонца сапраўды не ўзыходзіць над лесам, а дзярэцца праз колкае і куртатае голле.

## 6

Багдан адразу, як толькі выбіўся на бярозавы ўзлесак,— ноч была светлая,— убачыў адчыненыя дзверы знаёмай старой пуні, ператворанай у атрадны шпіталь. Але Маўджуду, якая, згорбіўшыся, сядзела за скасабочанай брамаю, не прыкмеціў нават тады, калі, наблізіўшыся да пуні, узяўся рукою за старую струхлелую шулу, цёплую, яшчэ не паспеўшую астыць. Наважыўся быў ціха свіснуць, і злева, амаль з-пад рукі, якая прытрымлівала ра-

мень карабіна, павернутага па плячы прыкладам уверх, пачуў здзіўлены і радасны шэпт:

— Багданка?!. Я тут...

Маўджуда бязгучна пацалавала яго, спытала шэптам, баючыся, каб іх не пачулі:

— Чаго ж так позна?

— Бульба клятая. Саджалі — мучаліся. А цяпер паспрабуй абагнаць яе,— таксама шэптам сказаў ён і прагна пацалаваў Маўджуду. Наважыўся прыгарнуць яе, але яна сціснула яго руку, хіснулася за браму, і ён стаў побач, прыхінуўся спіною да сцяны.

— А як жа ў цямрэчы працаваць? Нічога ж не відно.

— Тое, што трэба — мы бачым. І ў цемені бачым...

Яна зноў адвяла яго рукі ад свае шыі, і Багдан зазлаваў, палез у кішэню па цыгарэты. От жа натура! Як пачнеш развітвацца — на шыі вісне, не адпусціць. А сустрэнеш — натапырыцца, як бы абмацвае вачыма, вывучае. І яшчэ: праўду ёй кажаш — не верыць. Пачнеш жартаваць — злуе. Заўсёды патрабуе ад яго нейкай невядомай яснасці.

— Нібыта ўдзень тую працу нельга парабіць. Дзіва!

— Коней мала. Разумееш? — спытаў ён гучней.— А Захар як апантаны: дзве нормы давай — хоць кладзіся.

— Ды цішэй жа ты!

— Ды не магу я цішэй. Пойдзем туды,— ён пацягнуў яе за руку, і яна пакорліва пайшла за ім да ўзлеску.— Пасядзім, пагамонім па-людску...

— Цішэй жа! Не крычы! Парапеныя заснулі. Я іх усяляк супакойвала, каб яны заснулі. Сон ім — галоўнае.

— Галоўнае — ногі крэпкія. Каб ад кулі цябе выносілі, ад бяды якой іншай...

Багдан азірнуўся на расплывістыя абрысы пуні, шчоўкнуў трафейнай запальнічкаю. Бляклае полымя як прыліпла да цыгарэціны, потым загайдалася, і Багдан знарок не гасіў яго, свяціў на твар Маўджуды. Яна адрывіста дзьмухнула на хісткае полымя, і запальнічка згасла.

— Гайдаш убачыць, шчэ трывогу ўзніме!

Ён не злавіў вясёлых нотак у яе голасе, буркнуў:

— Што ты мяне ўсім палохаеш? Дзе Гайдаш?

— Там, ля парапеных. Але я дазволіла ёй паспаць.

— Вось і хай сабе спіць!

Яна, не зважаючы на яго рэзкасць, папрасіла ласкава:

— Не злуй. Лепей садзіся вось тут...

Маўджуда спынілася ля бярвенняў, якія, відаць, яшчэ

перад вайною былі падвезены для рамонту пуці і пакінуты на ўзлеску. Садзіцца ён адмовіўся, хітнуў галавой у глыб бярэзніку.

— Хадзем далей,— і дадаў яшчэ цішэй: — Хадзем туды!

— Не магу я далёка адыходзіцца. Раптам хто-небудзь з параненых пакліча.

— Усё часцей і часцей мяне гэтае «не магу» страчае.

— А ты ўсё часцей і часцей злуеш. І вочы нядобрыя.

— Нават у цемры яна бачыць!

— Нешта цябе гняце. Чуе сэрца, і ты яго не падманеш...

Ён не пярэчыў, чакаў, спадзеючыся, што Маўджуда нешта скажа яшчэ, выкажа нейкую здагадку, за якую можна будзе ўчапіцца, разагнаць падазронасць. Але яна маўчала, і гэтае маўчанне трывожыла. «Як нейкага чакае прызнання, тлумачэнняў...» Дзіўная слабасць скавала Багдана, зноў ажыло адчуванне, што ён ідзе па лязу нейкага вострага і бясконцага нажа, і гэтае адчуванне спарадзіла слабасць, падпаўзлі да сэрца жах і злосць. Вось гэтак цяпер заўжды ў іх з Маўджудою, з таго самага дня, як яны зноў сустрэліся: амаль беспамылкова, амаль заўсёды дакладна яна вызначае, што робіцца ў яго душы.

— Нейкі жах,— прамовіла яна задумліва, і гэта было нечаканым, як удар.— І як бы злосць у тваім сэрцы...

Намаганнем волі Багдан прыглушыў у сабе злосць і жах. Ён услухоўваўся ў чоткае, але як зглухлае тоўханне сэрца, і разуменне таго, што ён ідзе па вастрыю ляза, усё мацнела. А побач з тым лязом, па якім ён сунуўся, таксама былі вострыя нажы, і ён скурай адчуваў іх халодную вастрыню. Ад гэтага жах да канца не праходзіў, жыў, абмяжоўваў волю дзіўным колам, з якога не было выйсця, не было паратунку, як толькі ўпарты рух наперад; рух ствараў ілюзію, што кола рвецца, што можна знайсці нейкую надзею на лепшае. Але варта яму зрабіць адзін нярэўны крок, зрабіць не той, які трэба, рух, сказаць адно неасцярожлівае слова — і ўсё назаўжды абарвецца. Абарвецца і тады, калі ён паспрабуе хоць на нейкі міг замарудзіць гэты рух, змяніць яго... Не, не ўсё абарвецца! Абарвецца толькі яго ўласнае жыццё... Але што яму смерць? Ён ужо гэтулькі разоў глядзеў ёй у твар, глядзеў без жаху, і яна адступала, і ён святкаваў перамогу. А цяпер смерць як недзе зусім побач, стаілася, чакае, і як бы насміхаецца з усіх яго намаганняў быць чалавекам чыс-

тым, вартым увагі... Добра загінуць у баі, загінуць, ведаючы, адкуль прыляцела смерць... А загінуць ад удару ў спіну, ад кулі ў патыліцу? А гэта ж можа здарыцца! Трапашка тады са сваім сябруком Паўлюком пілі ў бацькавай хаце. Паўлюк, напэўна ж, паказаў запіску Трапашку. Не, відаць, не паказваў. І Захар пра нешта здагадваецца, ужо двойчы распытваў Багдана пра Трапашку, пра людзей, якія гасцююць у бацькавай хаце, каго ён ведае з іх... Дзеля чаго? А дзеля чаго Чэся з гэткай паблажлівасцю і прыязнасцю размаўляе з ім? Як падмянілі яе. Тады, у бацькавай хаце, зверам глядзела, а цяпер і ўсміхнецца прывітна, і загаворыць. А Маўджуду гэта дужа злуе. Як толькі даведаецца, што ён, Багдан, быў у другой роце, дзе Чэся, дык адразу вожыкам, як цяпер, і робіцца. Не, яна не вожык! Яна ласкавая, яе пяшчота як вір круціць...

Яе пальцы ціха перабіралі Багданавы валасы, мезенец пяшчотна шкрабаў вуха, і ад гэтага мяккага шурхання галава быццам таўсцела, усё наўкола глухла, як адсоўвалася некуды ўдалячынь.

— Жах ёсць,— з робленым сумам прызнаўся Багдан.— І злосці поўна,— ён учуў, як пальцы яе спыніліся ў валасах, счакаў, наспешліва потым патлумачыў: — Жах, што памілавацца з табою не паспею. А злосць — на ноч клятую, што куляй ляціць!..

Ён падхапіў яе на рукі, лёгкую, падатную, і яна моцна прыціснулася да яго, цалавала вушы, бровы, расшпільвала гузікі фрэнча на ім. Кола няпэўнасці, па якім хадзіла яго злосць, парвалася, выпарылася, ён ужо страціў здольнасць разважаць пра нешта іншае. Маўджуда! Яна ўся, як з агню, і пяшчотная і адданая. І хай гарам ідзе ўсё на свеце. Нічога ўвогуле няма на свеце, апрача яе рук, яе вуснаў, яе цвёрдых, як сетка, валасоў.

Пад нагамі зашурхала маладая папараць. Багдан спыніўся, асцярожна апусціў Маўджуду на зямлю, здзёр з пляча карабін, адным рыўком скінуў фрэнч, кінуў на папараць і бухнуўся на яго разам з Маўджудой, бы шуснуў у гарачы і тлумны вір...

...Уверсе, у вузкім прагале між голля, зырка зіхацела зорка, і Багдан глядзеў на яе, мружыў шчасліва вочы, і зорка скакала па веях. Ён ляжаў на спіне, стомлены, адкінуўшы левую руку, на якой сцішылася, прыціскаючыся да яго пляча, Маўджуда. Яна перабірала пальцамі Багданавы валасы, ласкава адкідвала іх з узмакрэлага ад поту

лба, і пальцы яе — ласкавыя, але каляныя — улагоджвалі, закалыхвалі, цягнулі ў сон.

— Спі,— санліва папрасіла яна.— Я пакаравулю.

Але сну не было. Багдан паварушыў правай рукой, зламаў каліва папараці, пашараваў халаднаватай мяцёлкаю Маўджуду па твары.

— Камароў адганяю. Каб уся ты — мне толькі.

— Хай бы расла. Навошта зламаў? У нас, у гарах, без патрэбы ніхто нічога не зломіць!

Багдан употай пасмяяўся з гэтага яе павучання, але ў сэрцы асела непамыснасць. Клятыя горы! І кроку Маўджуда не ступіць, каб на іх не спаслацца. Дзіўны, між іншым, чалавек: за гэтыя горы можна яе ўзненавідзець, калі штодня піліць пачне. І не толькі гэта дзіўна: зноў ён з ёю на бярозавым узлеску ля старой пуні, зноў слаба крывавіць неба агонь далёкага пажару, зноў Багдан поўны трывогі і сумнення. Не, цяпер зусім іншае. Тады, у далёкім тым сорак першым годзе, ён быў разгублены, не ведаў, што адбываецца вакол, не ведаў, што чакае іх наперадзе. Цяпер жа ён добра ведае, што робіцца наўкола, ведае, што гэтая віхура скончыцца перамогаю. Адно толькі схавана па-ранейшаму ад яго: уласная будучыня, тое, што чакае наперадзе. Ён — толькі часцінка гэтае віхуры. І Маўджуда — часцінка, але ўжо не такая, як была раней. Тады, у тым далёкім цяпер сорак першым, ля рэдзенькага бярозавага ўзлеску — цікава, ці адшукаў бы ён тую пуню зараз? Трэба будзе адшукаць, як адгрыміць гэтая завіруха, адшукаць разам з Маўджудою, пасядзець у той праломцы ў сцяне, усё прыгадаць! — Маўджуда была зусім чужая яму жанчына. Цяпер яна кахае яго! Праз бяду, праз нягоды ён, бы стомлены і збіты хвалямі плывец, урэшце прыбіўся да цвёрдага берага, дзе можна адпачыць, набрацца сілы і плыць далей. І ён бы плыў далей спакойна, ён бы адолеў усе віхуры, усе нягоды, каб не давіла на сэрца тая клятая запіска. Навошта ён напісаў яе? Каб не тая дурнота, каб не тая дурная рэўнасць, ён бы зараз быў тут, у атрадзе, і побач была б Чэся... Чэся?.. Чаму ён думае пра яе цяпер? Думае тут, абдымаючы Маўджуду? Каб яна, гаранка гэтая, зараз даведалася пра яго думкі! Схапіла б пісталю — гэтак жа, як тады ў той пуні! — і жарнула б. І рука б не здрыганулася!.. А Чэся мякчэйшая за яе ва ўсім. Чэся больш чулая, сардэчная. А ў гэтай душа сухая, цвёрдая. Гаранка, адным словам. Яна бы камень у тых яе гарах!..

— Ведаеш, што думаю? — спытаў, намерваючыся напракнуць, што, маўляў, замнога яна пра свае горы дудзіць, і перадумаў, баючыся свары.— Старая пупя прыгадалася... Памятаеш, як гразілася мяне застрэліць?

Яна адказала не адразу, і ў голасе яе прагучаў сум:

— Нешта іншае меўся сказаць. Нешта ўвесь час цябе мучыць. Але што? Не магу даўмецца.

— Гэта ты праўду кажаш. Мяне часцяком мучыць адзін дзень. Дурны той дзень...

— Які дзень? Які? — яна аж прыўзнялася, рукі яе знямелі ў яго ля горла.

— Э-э, цяжка дыхаць. Задушыш жа!

— Які гэта дзень? Скажы, скажы!

— Калі ты засталася адна пад яліпаю... Усё ў нас іначай бы склалася, каб тады разам мы пайшлі на хутар.

— Ніхто гэтага не ведае. Крок, які ты не зрабіў, як уведаеш?

— Адзін, усяго толькі адзін крок не той, які трэба, і ўсё ў жыцці чалавека — пад адхон!

— Ты не павінен думаць больш пра тое. Думай толькі пра добрае.

— Я думаю толькі пра цябе. І нішто мяне не турбуе. І хораша тады мне...

Ён сказаў ёй няпраўду, і гэта яго не ўстрывожыла. Ён думаў і пра Маўджуду, і думаў пра Чэсю, і думаў пра тое, як жыў у бацькі пасля палону, і быў занепакоены тым, што думкі пра Чэсю і пра ўсё тое, што было з ёю звязана, як бы адсоўвалі думкі пра Маўджуду на другі план. Горкая развага над тым згубным крокам, які ён зрабіў, зненавідзеўшы чалавека, якога кахала Чэся, засела ў ім, і ён не ведаў, як выкурыць яе з душы, выгнаць з сэрца, сцерці з памяці. Яна, тая горкая развага, не проста жыла, яна прарастала, як прарастае моцнае і добрае насенне ў пульхнай і тлустай глебе, і ён адчуваў, што гэтае карэнне аблытвае яго сэрца, сціскае, што яму як бы ўжо не хапае паветра, што яшчэ крыху — і тое моцнае карэнне раздзярэ грудзі, і ён не зможа трываць боль, зараве на ўвесь голас. Няўжо сапраўды ён бег да Маўджуды толькі дзеля таго, каб суняць гэты боль, каб пачуць яе ласкавыя словы і сагрэць душу пяшчотаю дзівоснай гэтай гаранкі, спапяліць сваю тугу і сумненні?.. Не, не! Ён бег сюды, каб проста ўбачыць жанчыну, якую кахае і якая кахае яго, бег, каб пачуць любы голас, адчуць дотык рук, якія могуць гэтак ласкава песціць і галубіць...

— І мяне апішто не турбуе, калі ты побач,— сказала Маўджуда, і рукі яе зноў пачалі перабіраць Багданавы валасы за вухам.— Адгрымiць гэтая віхура, і мы паедзем з табою... Ведаеш, куды паедзем? Глядзець мае горы. І застанемся там. І будзем там жыць...

— А раптам яны не будуць мне па душы?

— Горы? Варта толькі аднойчы зірнуць на іх! Усё жыццё тады будуць сніцца.

— Я і не бачыў, а яны ўсё роўна сасніліся. Тады, пад яліпаю.

— А мне яліна тая часта сніцца. Не, не цяпер, а тады снілася, калі я не ведала, дзе ты.

— А мне — дарога ад хутара. Звязаны ляжу на фурманцы. І пуга, бы серп, галаву кроіць...

— Гаротнічак ты мой любы. Гэта ж на ўсё жыццё гэтая мецiна на лобе...

Яна абцалавала яму лоб і скроні, і ад дотыку губ да даўняга рубца па лбе цёплая дрыготка пракацілася ў яго па хрыбціне.

— З гэтай мецінай жыць можна. Калі горшых не будзе — жыць прыпяваючы можна будзе.

— Хачу дажыць. Хоць адным вокам, краёчкам убачыць, як пасля вайны жыць будуць...

— Не кожнаму гэта суджана.

— Так, не кожнаму...

Ласкавыя і мяккія яе пальцы зноў варушылі Багданавы валасы, потым паўзлі ад вуха да падбародка, і кончыкі іх былі халодныя і калянныя. Ён зноў чуў, як шурхацяць валасы, і гэтае шурханне з кожным рухам яе рукі ўсё мацнела, расло, знаёмым гарачым тлумным бомканнем біла ў скроні. Ён схапіў яе рукі, пацалаваў, потым прыпаў тварам да мяккіх далоняў, і яна моцным і рэзкім рухам прыціснула яго галаву да сваіх грудзей. Ён учуў глухое тоўханне яе сэрца і адчуў, як ён увесь, цалкам, зліваецца з яе гарачым падатлівым целам і як з храбусценнем ламаецца ў яго пад каленямі маладая папараць...

Змораны яе пяшчотаю, Багдан нейкі час ляжаў нерухома, дыхаючы моцным, крыху саладжавым водарам святаяннiку, распаранага ў гарачай вадзе. Святаяннікам пахлі грудзі Маўджуды, рукі і асабліва кофтачка, сагнаная ў складкі на жываце, і гэты водар не тлуміў яму галаву, Багдан быццам плыў на хвалях гэтага саладжавага туману.

— Ты пахнеш святаяннікам,— прамовіў Багдан.—

Заўсёды гэты водар. У дзяцінстве мяне маці святаяннікам лячыла ад усяго...

— А я спалохалася. Непрыемна яму, падумала.

— Ды не. Я і сам, як і мама, толькі гэтыя лекі і прызнаваў. Пах яго прыемны.

— А я ўжо і не адчуваю пах лекаў. Пакуль яго заварыш, пакуль бінты намыеш.

— І бінты ў ім мыеце?

— Мыем. Бінты тады не трэба прасаваць. Увогуле — дзівосная гэта расліна. Ніякі рыванол са святаяннікам не параўнаеш. А ў гарах, праўда, ён не расце.

Смеючыся, ён накратаў пальцамі яе густыя бровы; веі казыталі яму далонь, быццам мурашы па скуры споўдаліся, і ён засмяяўся.

— Урэшце! Знайшлося-ткі тое, чаго ў тваіх гарах няма.

— О, неба! Калі ж я іх убачу, свае горы!

— Сёлета не спадзявайся. Сёлета, па ўсяму відаць, не давядзецца туды ехаць.

— Я цярплівая. І яны мяне дачакаюцца, я ведаю.

— Ты і цярплівая. І добрая.

— Надзень фрэнч. Камары заядуць.

— А хай яны падавяцца,— ён затрымаў яе руку, якая папраўляла фрэнч.— Памятаю, як летась ты на зямлі заснула. Сама на краёчку, а мне — усю плашч-палатку накінула. Гэтая дабрыня мяне тады дужа ўразіла.

— Нешта ты толькі тое і робіш, што наша мінулае прыгадваеш.

— Добрае яно, таму і прыгадваю.

— Маўчыць усё наўкола. У гарах гэтак жа: перад світаннем — аніводная птушачка не абзавецца.

Багдан перапыніў яе, учуўшы далёкую канананаду:

— Дзе ж маўчыць? Чуеш? Таўкуцца недзе жалезныя камарыкі. Гэта за Дзвіною ўсё грыміць, недзе ў бок Асвеі. Мы ўчора зноў на доты ездзілі. У іх залезеш — до-обра чуваць: боў-боў-боў... Як недзе побач зусім.

— Ты асцярожней, глядзі, у тых дотах. Там, напэўна, міны.

— Даўно ўсё размініравана. Нашым жа толам яны доты і ўзрывалі. Але доты гэткія моцныя, што іх выбух не ўзяў. Уваход, праўда, завалены, пакуль гэта ўсё расцярэбіш. А інакш туды не запаўзеш...

Яна зноў напрасіла, прыціскаючыся галавой да яго пляча і ласкава пагладжваючы бровы:

— Ты асцярожнеї, глядзі, у тых дотах. Каб вас там не заваліла.

— Там і кавалак бетону не скранеш, бо арматура вось — у два пальцы таўшчыня. Не разумею, чаму мы іх ля гэтых дотаў не затрымалі летась? Доты тыя аніякі снарад не ўзяў бы. На сцяне ад снарадаў толькі маленькая мецінка, як на цэгле ад кулі.

— Яны проста абышлі іх.

— Доты ж скрозь. Усцяж усёй граніцы! І дагэтуль не разумею, як гэта яны іх праскочылі?

— Уга! Праскочылі. Ты ж бачыў, што ля Фарынаўскага, скажам, дота? Усё поле ў бярозавых крыжах. Там іх памалацілі.

— А ля гэтых, што за Дзвіною, адкуль мы зараз патроны цягаем, аніводнага крыжыка...

— Доўга вы там будзеце поркацца шчэ?

Ранейшы клопат і трывога былі яму па душы, а гэтае пытанне, зробленае голасам будзённым, неяк дужа паспешліва, абудзіла непамыснасць, і ён сказаў суха:

— Пакуль усё не выцягаем. Крупня загадаў: аніводнага патрона не пакінуць. Нават пагнутыя браць, усе — пад качалку.

— Ён учора сюды прыязджаў. З раненымі гутарыў. Я здзівілася — ён змяніўся дужа: голас рэзкі, патрабавальны, у пагалядзе — жорсткасць. Хаця, як не зменішся, калі гэткае на душы. Штодня пра дзетак думае...

— Не ў аднаго яго бяда гэткая.

— Нам лёгка казаць.

— Я не разумею яго. Навошта было драбіць атрад. І без таго — жменька. А ён яе — па трох кутках. Трэба ў кулак усіх, каб разам трымацца.

— Загад Штаба.

— А гэтыя акопы. Хто ў іх сядзе? Дурні яны, што палезуць на тыя нашы акопы? Шусь ціхенька ўбок і нам — у спіну!

— У акопе ўсё ж надзейна.

— Ты ў мяне — стратэг вялікі.

— Хай сабе. Толькі асцярожней ты ў тых дотах. Абяцаеш?

Ён паабяцаў, і сваё абяцанне замацаваў пацалункам, і ляжаў, услухоўваючыся ў грукат далёкіх і глухіх выбухаў. Дзіўная канапада сёння нейкая, то разрастаецца, то цішэе, як прападае зусім, то зноў грукаціць, як каменне, што трасуць у драўлянай бочцы. Багдан, размаўляючы з

Маўджудой, увесь час намагаўся закрэсліць тоўханне далёкіх выбухаў, жыць цеплынёю яе клопатаў аб ім, пахамі святаянніку, гайдацца на гэтых пахах, бы на мяккіх хвалях. Але глыбіннае далёкае буханне ўвесь час перашкаджала яму, нараджала трывогу, ад якой зноў прарастала ў грудзіне тое незразумелае, дзікае і ўчэпістае карэнне, ціснула сэрца, і ён, не ведаючы, як убараніцца ад свае трывогі, апусціў галаву на грудзі Маўджуды.

Вуха адразу злавіла тоўханне яе сэрца, і ён услухоўваўся, расслаблены, прыміраны са сваёй трывогаю; трывога, якая толькі што прыціскала яго і ад якой ён пакутаваў, была ўжо недзе далёка, па-за межамі рэальнасці, і розум яе не ўспрымаў.

— Ты як не слухаеш мяне,— нечакана сказала Маўджуда пакрыўджана.

— Чаму гэта не слухаю. Слухаю...

Яна зноў папракнула, але без крыўды:

— Слухаеш... Але нешта іншае. Не мае словы слухаеш...

— Ты — варажбітка! Сапраўды, не твае словы слухаю.

— А што?

— Тваё сэрца. Прыхінуўся вось да грудзей і выразна чую, як яно жыве.

— За гэта я цябе пацалую...

Нешта круглае і цвёрдае, як з жалеза, ціснула яму на скронь, і ён падумаў, што гэта гузік, і пакруціў галавою, як бы адсоўваючы той гузік убок.

— Муляе і муляе гэты гузік. Жалезны?

— Дзе? А-а, гэта. Гэта патрон.

— А навошта ты яго ў кішэньцы цягаеш?

— Ды так, на ўсякі выпадак...

Яна прамовіла гэта ціха, з роздумам, быццам слухала свой уласны голас, і ён здагадаўся, што тоіцца пад гэтым «па ўсякі выпадак». Не, не па «ўсякі» гэта выпадак: на самы апошні, і куля з гэтага патрона будзе скіравана не па ворага — сабе ў сэрца. І хто можа сказаць — надарыцца той выпадак ці не, а калі і надарыцца, дык у які час? Праз дзень? Праз два?.. Праз месяц? А можа, сёння ўжо, праз некалькі гадзін. Магчыма, вельмі магчыма... А ў Багдана, між іншым, гэтага патрона няма. А яго трэба мець пад рукою. Выбраць самы лепшы, самы надзейны. Ён гэта зробіць сёння ж! Ён сёння пакладзе гэткі патрон сабе ў кішэню. І калі лёс падвядзе яго, Багдана, да той мяжы, ён возьме гэты патрон без страху...

Гэтыя думкі яшчэ больш расслабілі, перапоўнілі пяшчотаю да жанчыны, якую ён кахаў і якая — ён мог прысягнуць у гэтым! — кахала яго болей за жыццё.

— У нас будзе дзіця. І мы паедзем дамоў утраіх,— сказала Маўджуда з дзіўнай лагоднасцю ў голасе і абшчапярыла рукамі Багданаву галаву, гарачым пошапкам апякла вуха.— Хлопчык будзе ў нас...

Ён сеў, як падкінуты:

— Калі?!

— Не сёння і не заўтра,— яна засмяялася ціха і шчасліва.— Я проста хачу, каб ён у нас быў. І каб на цябе падобны. І каб паехалі да нас вясною, калі цвіце міндаль. Ты калі-небудзь бачыў, як цвіце міндаль?.. Ой, ты зноў як і не чуеш! Я пытаюся, ці бачыў ты, як цвіце міндаль?

— Бачыў!

Яна падхапілася і таксама села.

— Бачыў? Калі і дзе ты бачыў?

— У сне. Калі сасніў твайго бацьку... Там цвілі дрэвы, на вішні падобныя, бледна-ружовыя. Ты казала тады, што гэтак цвіце міндаль...

— Гэта табе за сны,— яна мякка і пяшчотна пацалавала яго.— За тое, што табе сняцца мае горы... Заўтра ты прыйдзеш?

— У сэнсе — сёння?.. Не, відаць. Два доты апаролі мы пад самай чыгункаю. Гэта — на два дні, раней не ўправіцца.

— Я папрашу Крупню, каб ён пусціў мяне з вамі. Гайдаш тут пяцяжка. Толькі перавязкі рабіць...

Ён адгукнуўся адразу ж і не вельмі прыязна, пагардліва:

— Яшчэ што прыдумаеш! Пажога, ведаеш, на мяне ўжо касавурыцца. Як ноч — адпрошваюся. А ён жа цяпер, як камроты стаў, дысцыпліну патрабуе.

— Прыдумалі на нашу галаву гэтыя роты,— і раптам засмяялася, узбухмаціла яму валасы.— Не дужа ён нас прыструніць, твой ротны!

— Пажога чалавек талковы. І чулы. Але ж загад Крупені ясны: аніякай сямейнасці ў атрадзе!

— Загад — загадам. А я ўсё роўна буду цябе кахаць. І ніхто не забароніць!..

Гэтыя апошнія яе словы прараслі ў Багданавай душы імкліва, як полымя, што падабралася да сухога смолкага голля. Ён адчуваў сябе чалавекам, які шчасліва і нечакана выскачыў з бяды, з якое выбрацца ўжо не спадзя-

ваўся. Перажытае ім нейк дзіўна зціскалася ў адну кароткую стужку, і ён бачыў і гэтую стужку і сябе на ёй. Чамусьці ярчэй ад усяго бачылася і згадвалася яму ноч, калі Маўджуда накінула яму амаль усю трафейную плашч-палатку, а сама прымасцілася на краёчку. Колькі пакуты ён зведаў пазней, колькі чорнай бяды па ім пракацілася, ірвала сэрца... А вось жа аддалілася тое, прытупілася, быццам і не было ўвогуле...

Ён падсунуўся бліжэй да Маўджуды і сеў, сагнуўшы ногі ў каленках, потым асцярожна, быццам рука Маўджуды была з тонюткага шкла, прыклаў да вуснаў, перацалаваў адзін за адным усе пальцы і гэтак сядзеў, не выпускаючы яе рукі са сваіх далоняў; у чорных прагалах яе вачніц споўдаліся адбіткі зорнага неба, і гэтыя адбіткі нагадвалі водбліскі агню на прыціхлай уночы рацэ; ён углядаўся ў цёмныя зрэнкі яе вачэй, і тлумны пах святаянніку зноў гайдаў і некуды нёс яго, і ён не супраціўляўся гэтаму руху і разумеў, што больш шчаслівага імгнення, чым гэтае, яму, відаць, не давядзецца ніколі ў жыцці перажыць зноў.

7

— Падпішаш усё і прыязджай да Загурскага,— папрасіў Захар, саскочыўшы з фурманкі.— Буду там цябе чакаць. Ву-унь ён там завіхаецца. Хачу са старым сустрэцца...

Юрша перасунуўся бліжэй на перадок фурманкі, дзе да гэтага сядзеў Захар, са згодаю кіўнуў галавою:

— Я доўга бавіцца не буду. А вы, тым часам, старога пра лекі распытайце. Гайдаш казала, што ў яго на агародзе той травы поўна.

— Во добра, што нагадаў...

Юрша крануў лейцы, фурманка пакацілася далей па дарозе ля ручая, а Захар рушыў да былой сядзібы Загурскага нацянькі па лугавіне, зразаючы ладны кавалак дарогі. У канцы лугавіны ён прыпыніўся, зірнуў у той бок, куды пакаціла фурманка, і згледзеў руку Юршы, узнятую на развітанне. І тое, што Юрша глядзеў у яго бок і салютнуў рукою, і тое, што нагадаў пра лекавыя травы, аб якіх казала Гайдаш, абудзіла ў душы добрае пачуццё да гэтага сціплага і шчырага чалавека. Юрша не толькі замяніў

Чагіна на пасадзе: толькі яму, як і Чагіну, Захар адкрываў сваю душу, мог гаварыць з ім пра тое, аб чым не гаманіў ані з кім. Прызначэннем Юршы на пасаду камісара атрада Ціхан быў не вельмі задаволены — яму болей па душы быў Яштокін. Але Захар вельмі лёгка давёў Ціхану, што на гэтай пасадзе патрэбен менавіта гэткі чалавек, як Юрша, у якога нават і звычкі былі аднолькавыя з Чагіным. У атрадзе Юршу любілі болей за Яштокіна, хоць яго вайсковы вопыт паважалі, і мянушка «стыліст» пакрысе саступала месца паважанаму і ёмкаму — начштаба.

Захар патрос рукою ў адказ, каўнер скуранкі выгнуўся, зачапіў струпы на шыі, якія былі зусім загаіліся і нечакана пачалі гнаіцца пасля таго, як, вяртаючыся ў атрад ад Ціхана, ён уночы перад «жалезкай» бухнуўся, калі ўзляцела ракета, на высечаны хмызняк і садраў засохлую корку. Гайдаш нацёрла гаючкі, прыклала да раны, паглядзела рану і сёння — быццам падсыхаюць струпы зноў. Ён асцярожна пакратаў цяпер скуру вакол закарэлых струпоў, прыгадаў, як ласкава і пяшчотна краналі скуру пальцы Гайдаш. Як яна спалохалася тады ў лесе, калі ўбачыла кроў у яго на твары і перавязвала рану на шыі! А як глядзела сёння! Казала пра гаючку, якую трэба ўзяць у Загурскага, а пальцамі, у якіх быў заціснуты згонтур бінту, пяшчотна абціскала струпы, жартавала і абнадзейвала: сто гадоў, маўляў, будзеце жыць, таварыш камандзір.

У вачах яе ён прыкмеціў нешта новае — нейкія, падалося, новыя словы збіралася яна сказаць,— і нечага засаромеўся, адразу гукнуў Юршу, каб той разварочваў фурманку. Прыгадаў цяпер сваю паспешлівасць і зноў адчуў тую ж ніякаватасць, якую перажыў нядаўна, размаўляючы з Гайдаш. У той жартоўнай размове была як бы здрада памяці жонцы: бач ты, ён ужо з Гайдаш жартаваць пачаў!..

З куртатага, пяроўна закапцелага коміна печы, што сіратліва ўзвышалася над шэрым папялішчам, паціху струменіў сіне-белы дымок, зіваўся ў роўныя колцы, трымцеў. Захар перад гэтым нейкі час цікаваў, як Загурскі высякае абгарэлы ў часе пажару бэз, раз-пораз ускідваючы над галавой доўгае белае тапарышча, і таму цяпер здзівіўся: стары ў печы паліць, не прыкмячае, мабыць, што верхняя частка коміна абвалілася, як гарэла хата.

Ён абышоў папялішча, каб зірнуць на печ з другога боку, і спыніўся, яшчэ больш уражаны: у печы бляклым

жаўтлявым полымем гарэлі дровы, і на прыпечку быў добра відзён невялікі закопчаны чыгунок, накрыты патэльняю. Бульбу, відаць, стары варыць на абед. І рупіцца на былой сядзібе, падобна, штодня: цэгла з той часткі комін, якая абвалілася, акуратна складзена ў штабялёк, грады ў садочку ўскапаныя, баразёнкі прароблены роўныя, як па шнурочку; галіны яблынь, што былі бліжэй да агню і абсмылелі, ён паспілаваў, склаў грудком на сцежцы ля весніц. Цяпер бэз гэты высякае...

Загурскі адгукнуўся на Захарава вітанне і тут жа, як не зважаючы на чужога чалавека, паклаў побач з рыдлёўкай сякеру, прысеў на карачкі і рукамі згроб трэскі і старое лісце ад маладзенькага бэзавага парасніку. Параснік — з дзесятак тонкіх верацёнцаў — выбіўся з зямлі неяк зусім нядаўна і, затулены ад агню старымі камлямі і снегам, ацалеў, не папёкся і цяпер зазеляпеў: почкі, праўда, раскрыліся не ўсе і дзе-нідзе на вострапькіх лісцінках яшчэ трымаліся, не апаўшы, светла-карычневыя, амаль празрыстыя лушпайкі.

— Жыве бэз, гляджу!

Пачаўшы гаворку бадзёра, Захар раптам сумеўся. Гэткія ж вочы ў старога, як у той хмарпы дзень, калі Захар прыехаў да яго і той загадаў расказваць пра смерць свайго сына. Гэтак жа і цяпер сябе паводзіць, набычыўся, не ўзнімае галавы, быццам увесь час нешта шукае ў доле.

— А чаго яму не жыць. Караннё ў зямлі моцнае. А караннё ацалела — дрэва жыве...

Захар узрадаваўся — падобна, што пацяплеў голас старога! — і зазначыў паспешліва:

— І ябынькі ж вось ацалелі. Квецень жа на некаторых галінах была...

Загурскі ўзняўся, патупаў да печы, сыпануў трэскі ў агонь, тады вярнуўся, узняў сякеру і рыдлёўку і толькі пасля гэтага пагадзіўся:

— Была квецень. Але адразу і пасохла, бо камель прыпякло з аднаго боку. Соку было ў галінах — вось і рвецца да сонца.

— А караннё ацалела ж,— сказаў Захар, пераняўшы вымаўленне старога, якое яму спадабалася.

— З карання, спадзяюся, і праб'ецца. Тады прышчэпы зраблю. Яблыня — не бэз. З ёю клопат і клопат...

— Добры гатунак быў?

— Ранэтка. У-ух, якая плодная. Помніцца, у той год, як Янка мой на трактар сеў, абсыпана дрэўца было, апі-

воднай лісцінкі не ўбачыш — бы з адных яблычкаў дрэўца зляплена. І гэтая,— ён торкнуў тапарышчам у бок яблыні, што стаяла па правы бок ад былой хаты і на якой слаба зеляніліся толькі дзве галіны.— І гэтая таксама — ранэтка. Ён трактар спыніў, поўную кепку палупіў, тады сеў на трактар і пакаціў. Напраўвы кліп унь там быў,— Загурскі паказаў тапарышчам у бок лугавіны, праз якую пядаўна ішоў Захар.

Голас старога памякчэў, і Захар, злавіўшы гэтую змену, быў здзіўлены не ёю, а тым, што яго, Захара, па-ранейшаму прыгнятае адчуванне свае віны. І якія дзіўныя вочы ў старога... Тая змярцвелая сінеча зрэнкаў, дакладней рэзкая перамена ад вясёлай летуценнасці да змярцвелай шкляной сінечы, якая тым змрочным днём моцна ўразіла Захара, і цяпер не знікла, засталася; ён зноў згледзеў яе ў цёмных зрэнках старога — змярцвелая шкляная сінеча яшчэ больш выразна акрэсліла агульны выраз тугі і скрухі на твары,— і адчуванне свае віны перад гэтым чалавекам намацнела.

Захар моўчкі ўзяўся дапамагаць старому перацягваць высечанае кустоўе бэзу ў канец сцежкі, на затравелую пляцоўку ля студні, потым цягаў цэглу ў канец саду, да паграбка, які стары прыстасаваў сабе пад жытло. Загурскі прымаў паслугу моўчкі, быццам Захар абавязаны быў рабіць гэта, толькі ў яго абліччы пачала цвярдзець знаёмая Захару зацятасць, як бы злосць па тое, што яму дапамагаюць у працы: не зломак ён які-небудзь, усё зробіць сам, без чыёй-небудзь дапамогі!

Зацятае маўчанне старога раздражняла, але Захар цярпліва чакаў, да чаго гэта прывядзе. Відаць, абурыцца ж раней ці пазней. І навошта яму спатрэбілася перацягваць цэглу менавіта туды, у канец саду? Нешта ж маргеліць, відаць. У яміне квасіцца гліна, побач сохне горбік жоўтага жвіру. Відаць, грубку вырашыў збудаваць у сутарэнні.

— Ручнога вырабу цэгла,— зазначыў Захар, не сцярпеўшы; маўчанне яму ўжо абрыдла.

— Ручнога.

— Не магу толькі сцяміць, як яна тут апынулася? Гэткую ж толькі ў Боркавічах рабілі — гладкую, як паліраваную.

— А гэтая — з Фарынава. На станцыі як новую вадакачку муравалі, дык старую — на распыл. Самому, праўда, прыходзілася разбіваць і чысціць. Цагліны бы склееныя былі.

— Ручнога вырабу цэгла стагоддзі стаіць.

— Але... Вось другі раз рукамі перабіраю, і каб табе шчылінка на ёй. І чорная ўся, як знутры, з сярэдзіны ўдымленая. У сутарэнні грубку скласці замысліў.

— У сутарэнні, значыцца, зімаваць?

— Вы ж таксама на тое нацэліліся,— з выклікам прамовіў Загурскі, і слабае падабенства ўсмешкі крапула яго губы.— Сваю грубку я на чатыры калены пушчу. І цяга будзе добрая, і цяпло на вецер не пойдзе: два паленцы кіну — да другога дня цёпла. Так што, калі ў лесе змерзнеце, да мяне грабіцеся.

Стары гаварыў з падкавыркаю, але кожнае яго слова паляпшала Захараў настрой. Вось каго трэба ў лагер цягнуць! І як жа раней, калі яны з Яштокіным гамапілі пра будаўніцтва, прозвішча Загурскага не ўсплыло ў тваёй памяці? Толькі ж ці возьмецца шчэ стары? І не грубачку, а добрую печ паставіць!

Захар пачаў казаць Загурскаму пра тое, што яны будуюць пякарню, што ён хоча прасіць яго, Загурскага, скласці добрую печ і не адважваецца. Не кожны муляр валодае навукай класці добрую печ вялікіх памераў.

Стары адгукнуўся на гэта з лёгкасцю, якая і здзівіла і ўзрадавала Захара.

— Немудроная тая навука,— прамовіў Загурскі, і Захар здагадаўся, што ён закрануў патрэбную струнку.— Тры-чатыры дні — і хлеб пячы. Ведама, калі маеш з чаго пячы.

Захар быў задаволены. Неяк незвычайна сіпее сёння неба, зеляняцца кудлатыя вольхі ля ручая і далей за імі, як амаль чорны, стаіць стары бор. І нейкая рухавасць і бадзёрасць ва ўсім целе ад гэтае працы са старым, ад таго, што дапамог яму, і неяк хораша на душы ад гаворкі. Вісела на ім, Захару, гэтая пякарня — яго была гэтая ідэя. Аказваецца, ніякай цяжкасці няма.

— Мы дамо вам памагатых. Колькі захочаце,— паабяцаў ён.

Загурскі хмыкнуў:

— Колькі скажаце! Ваш Давід мне ўжо сказаў: выдзелім аднаго памагатага.

Ён гэтак лоўка перадражніў голас Тарлера, што Захар уголас і шчыра засмяяўся:

— А калі ж вы дамаўляліся?

— Сёння. Уранні.

— І што вы яму паабяцалі?

— Паслязаўтра. Трэба ж садок да ладу давесці, грубку ў сутарэнні дабіць. Тады — у атрад.

— Мы вас царом павязем! На мяккай рысорцы пакоцім да самай зямлянкі!

— Царом я не быў, дык і ездзіць мне па-царску няма чаго. Пеша прыдыбаю. Па-царску, вунь, камісар твой раскатвае...

Насупраць абгарэлых вясніц спынілася фурманка, з яе саскочыў Юрша і, заматаўшы лейцы за перадок, рушыў на сядзібу, пры хадзе выцягваючы з кішэні гімнасцёркі аркуш паперы; левая кішэня, з якой Юрша выцягнуў паперу, па-ранейшаму адтапырвалася і абвісла, быццам было туды пакладзена нешта дужа важкае. І гімнасцёрка, расшпіленая на ўсе гузікі, перакасілася, ствараючы ўражанне, што Юрша нахіліўся, ідзе не роўна, а сунецца неяк бокам, выстаўляючы левае плячо наперад.

Захар, прыплюшчыўшы вочы, зірнуў на Загурскага са шчырым захапленнем. Вось табе і стары! Ён, Захар, радаваўся, што добрага муляра адшукаў! Знайшоў, як кажуць, сякеру пад лаўкай. Муляр гэты паслязаўтра прыходзіць у атрад! І ведае, куды прыходзіць! І ведае, што замест Чагіна камісар ужо Юрша!

— Дазвольце далажыць, таварыш камандзір. Акт складзены — сорак пяць подпісаў,— тонам рапарту прамовіў Юрша і павярнуўся да Загурскага.— Калі ласка, свой подпіс стаўце, Раман Сямёнавіч,— і Юрша пайшоў да попелішча, паклаў паперу на рыдлёўку, якая ляжала на краёчку падмурка, патлумачыў старому, які ўжо стаяў побач з ім.— Гэта Акт аб зверствах і злачынствах фашыстаў у вашай вёсцы. Пералічаны спаленыя хаты, расстраляныя сем'і і ўсе тыя, каго звезлі ў Нямеччыну...

Загурскі ваўкавата зыркнуў на аркуш паперы:

— Тае карысці. Паперка.

— Дакумент! — і Юрша недаўменна зірнуў на Загурскага.— Абвінаваўчы дакумент!

— Во ўжо сагразіцё!

Юрша, нахіліўшыся і па-ранейшаму прыціскаючы папяровы аркуш пальцам да рыдлёўкі, пачаў стрымана, і з кожным словам голас яго стражэў:

— Наш урад паслаў ужо ў Берлін мемарандум аб зверствах фашысцкіх малойчыкаў на нашай зямлі. Яны паляць вёскі, маёмасць нашу раскрадаюць, рабуюць, на катаргу нашых людзей вязуць — і ўсё, думаеце, ім беспакарана пройдзе? Не-е! Хай ведае Сусвет пра ўсё! Гнеў і

абурэнне ўсяго свету — з гэтым фашыстам лічыцца давядзецца!

— Палічацца... Гэтак жа, як з нашым дагаворам палічыліся.

— Затое давядзецца разлічвацца. І пры разліку кожная кропля нашай крыві, кожная хата, якую яны спалілі, павінны быць улічаны. Каб не толькі ў памяці. Але — і дакумент!

— Памяць мая яшчэ мацней паперы. Кожная драбніца там... Дзе аловак твой?

— Трэба чарнiламі, аловак ненадзейна, сцерціся можа — дарога ў гэтага дакумента до-оўгая,— Юрша выцягнуў з адвіслай кішэні гімнасцёркі белую вучнёўскую ручку і чарніліцу, патукаў ручку ў чарніла, асцярожна працягнуў Загурскаму.— Калі ласка. Вышэй усіх распісвацца вам...

— А чаго мне наперадзе ўсіх? Людзі раней мяне распісваліся. Я — пасля іх.

— Не, не,— Юрша ўпёр палец у верхні куточак аркуша.— Ваша прозвішча напісана першым. Стаўце цяпер уласнаручны подпіс.

— А-а! Гэтак...

Узяўшы ручку, Загурскі апусціўся на калені і ўзлакаціўся на падмурак. Белы папяровы аркуш амаль цалкам закрыў рыдлёўку, і на чорным попелішчы паперы, спісаная фіялетавым чарнілам, здавалася незвычайна белай плямай. А вакол ужо вызначаўся кволенькі зеленаваты водсвет. Захар аж нахіліўся, углядаючыся, і раптам адчуў у грудзях пустэчу, дзіўнае, знаёмае бомканне чухнула ў скроні. Траўка? Гэта ж рэдзенькая травіца ўзялася на попелішчы. І расце! Колькі часу мінула пасля таго агню, а ўжо трава расце, зяляnее.

«І там, відаць, дзе мае згарэлі, таксама траву на попелішчы гоніць...»

Ён імкнуўся закрэсліць жахлівую думку, адкінуць, сіліўся зрабіць гэта з такой сілаю, што аж цёмна зрабілася ўваччу; пацёр лоб рукою і зноў убачыў попелішча, і стаяў, як струна напяты, да рэзі ў вачах углядаўся ў рэдзенькія, кволенькія парастачкі, што прабіліся з попелу і ўпарта цягнуліся да сонца. Падобна на дзяцельнік... Ці лебяда?.. Не, не пазнаеш, і колер травінак нейкі дзівосны: ля самага долу белаваты, а потым слаба ружовы, а ўверсе зеленаваты... І адкуль? Як апынулася тут насенне? А можа, ста-

ры што-небудзь пасеяў? Не, наўрад. Ветрам, хутчэй ад усяго, прынесла, бо плямкамі травіца ідзе...

Захар, адарваўшы позірк ад папелішча, зірнуў у бок ручая — там, недалёка за аселіцай, пудзіўся турок, бы клікаў. Як прыгожа дрыжыць сіняе мроіва над полем за ручаём. На тым полі, казаў стары, араў папар яго Янка... Як нейкая чорная кропка мігатнула ў тым сінім мроіве. І яшчэ вось адна... І яшчэ... Не, гэта проста дугаюцца, трымцяць ад напружання веі. З таго і скачуць у тым мроіве чорныя матылі...

— Мы можам ехаць,— ціха прапанаваў Юрша.

— Ехаць? — учуў толькі апошняе слова Захар і сцяўся — яго знутры трасло ўсяго як у ліхаманцы ўсё роўна.— Але... Трэба ехаць. Паедзем,— і, паціскаючы на развітанне руку Загурскага, прамовіў, нагнаўшы ў свой голас упэўненасці і цвёрдасці: — Да хуткай сустрэчы, Раман Сямёнавіч... Тарлера я ўсё-ткі да вас падашлю. Не дужа ж і блізка.

— Старому сем вёрст не круг, як гаворыцца. Управілюся — сам прытупаю...

Развітаўся са старым і Юрша. Калі ён патузаў лейцамі, якія лоўка і хутка адвязаў ад перадка, Захар, азірнуўшыся на пустынную затравелую вуліцу, заклапочана спытаў:

— А дзе Падрэз? Вы што, не стрэліся ў вёсцы?

— Стрэліся. А як скончылі работу з подпісамі, ён на млын павярнуў. Ты хіба яго не пасылаў?

— Во памяць! Ведама ж, пасылаў,— і ў робленай разгубленасці развёў рукамі.— Старасць не радасць, як гаворыцца. Чацвёртую ж дзесяціну размяняў сёлета. Ха!.. У адным жа месяцы з табою і разменьвалі!

Юрша засмяяўся, пашлёгаў ляйчынаю.

— Ты не бядуй. За гэткімі старымі, як мы з табою, шчэ не кожны малады ўгоніцца,— і раптам спытаў даверліва, са шчырай заклапочанасцю і ахвотаю памагчы: — Нейкі, Захар, клопат цябе гняце... Які?

— Ды ўсё той жа! Усё тое ж,— Захар паважыўся быў расказаць пра траву на папелішчы і раптам заціснуў сваю шчырасць, загадаў сабе не жаліцца Юршу на сваё ўласнае гора, не вярэдзіць сабе сэрца.— Гэтая гаворка са старым. Як нейкая віна перад Загурскім... І ведаеш вось, што на вайне людзі паміраюць, што і сам ад кулі не застрахаваны... А вось глядзець у вочы старому цяжка...

— Разумны закон вывеў «стыліст»,— Юрша ўздых-

нуў.— А мы яго рэдка прыгадваем, яшчэ радзей суадносім сваё ўласнае з народным. Гора зямлі, гора народа... Што ў параўнанні з ім наша жыццё і наша смерць?..

У словах Юршы пачуўся папрок, і Захар яго ўлавіў. У кожнага з нас, мабыць, сваё гора ёсць. Але ж трэба думаць пра гора і бяду зямлі, усяго народа, пра боль мільёнаў... Усё гэта было справядлівым, але ад усведамлення гэтага Захару не рабілася лягчэй, і ён з той жа рашучасцю, з якой нядаўна вырашыў не гаварыць Юршу пра траву на папялішчы, перавёў гаворку на іншае.

— Падрэз сказаў, куды з млына паедзе? На поле ці ў атрад?

— Не сказаў. Я не папытаў у яго...

— Цвіком сядзіць у галаве гэты млын. Як гэта наш Файзуло гаворыць? Камень, які патрэбны, цяжкім, маўляў, не бывае. А вось жа і вельмі патрэбен той камень — а ціспе.

— Нічога ён мне, думаецца, не ціспе. І есці не просіць. Наадварот, нас з табою шчэ корміць хлебам.

— І фрыцаў таксама.

— Хочаш спаліць яго? Спалім. А далей? На ручных жорнах атрад не пракорміш. Перахопліваць кожную машыну з млівам? Дык фрыцы ж не пагодзяцца, каб млын толькі на партызан працаваў. Наскочаць і самі спаляць.

— Бурыць млын пачакаем. Будзем працягваць супрацоўніцтва.

— А што Ціхан кажа?

— Гэты раз я проста забыўся з ім пра млын пагаманіць. А летась памятаеш, што ён казаў?

— Вось і крок паспешлівы нам няма патрэбы рабіць. Пачакаем.

— Пачакаем,— пагадзіўся Захар, задаволены, што пасапраўднаму ўцягнуў Юршу ў гаворку, якая ўзнікла зусім выпадкова і не адпавядала яго настрою.— Пачакаем, можа, як любіў паўтараць мой Ягор, лепшага прычакаем.

Юрша сказаў узбуджана, са шчырай радасцю, знайшоўшы раптоўна магчымасць хоць крыху развеяць сумны Захараў настрой:

— Які, часам, лёс вядзе чалавека па вайне. Файзуло, калі дачуўся пра свайго жывога камбата — заплакаў ажно.

— А я дык быў і не паверыў напачатку. І што дзіўнае. Неяк перад вайною, калі сабраліся мы ўсе ў бацькавай хаце, яму гэта прадказвалі,— успаміны не сунялі боль

у скронях, яны яшчэ больш развярэдзілі сэрца. Гаварыць жа трэба было ўжо да канца, і Захар адчуў, што прыгадваць мінулае яму хоць і балюча, але прыемна.— Ягор, помніцца, напусціўся на Пахома: няўжо, маўляў, маладзейшага каго нельга было на партработу ў армію паслаць, каб жвавенькі быў. А Пахом — шпільку яму: ты хочаш, відаць, каб толькі зялёныя палітрукі ў тваёй дывізіі былі? Ну і я масла падліў: хто, маўляў, яму дывізію даручыць? А Пахом мяне абсек: у Ягора нашага на твары напісана — камдзіў! І вось як той жарт павярнуўся. Свайго лёсу толькі Пахом не адгадаў... І мы свой — не ведаем.

— Чаго захацеў — свой лёс ведаць! — Юрша развёў рукамі, лейцы таргануліся, конь пабег шпарчэй, і колы фурманкі затархацелі па сухой глеістай дарозе.— Бацька, помніцца, прывёў мяне на ліцейна-механічны завод і сказаў: быў я кавалём, і табе гэта наканавана. А кавалём я пабыў няпоўныя два гады. Атрымаў завод пераходны сцяг, мне на радыё даручылі выступіць і на вучобу прапанавалі ехаць. Потым — партком завода. Потым — выканком. Потым — разведку партызанскую вёў. Цяпер — камісар атрада. Скажы мне гэта хто-небудзь у трыццаць першым — не паверыў бы нізавошта!

— А каб табе, на пасяджанні твайго выканкома, хто-небудзь ляпнуў, што фашысты на Ялце будуць шпацыраваць і ў Чорным моры купацца...

— Ты лепей маўчы пра гэта. Не вярэдзь душу!

— Вярэдзь ці не вярэдзь — лепей не будзе. І гаварыць пра тое трэба. І людзям усё тлумачыць!

— Людзі па вёсках, між іншым, болей нас разумеюць. Учора... Не, што гэта я — сёння, на тым канцы вёскі, адна кабета Падрэза прыціснула: колькі ж, маўляў, акупант нас жэрці будзе? Падрэз ёй гаворыць, грунтоўна тлумачыць... А дзядок адзін з усміхам, але галасна, каб усе чулі: будзе жэрці, пакуль пуза не лопнець. Падрэз, праўда, яму секануў: трэба, маўляў, не глядзець на тое пуза, а віламі пароць — тады хутчэй лопнець...

— А дзядок на танкавую калону здаў што-небудзь?

— Гэта Мялешка. Я потым даведаўся. Ён і аблігацыі здаў. І грошы... Між іншым, калі сродкі будзем адпраўляць у абком?

— Дачакаемся Гусарава. Ён скажа.

— Ціхан чамусьці не вельмі любіць Гусарава. Я гэта яшчэ летась заўважыў. Як партыйны актыў на млыне Ціхан праводзіў.

Бомканне ў скронях супялося, і Захар, нечакана для сябе самога, павесялеў.

— Кола, камісар, і мы па ім з табою ходзім. З чаго гаворку пачалі? З млына! Цяпер зноў — на млын узбіліся.

— У гэтым коле толькі Райнекі цяпер не хапае. Ён жа зноў у атрад просіцца.

— Боязна яму там сядзець? Хай сядзіць!

— Ён і слухаць не хоча. Яму кажаш: млын для вас — баявое і адказнае заданне. А ён — за сваё: хачу, маўляў, па ворагу страляць. Карабін, маўляў, без работы пачаў іржавець.

— Няхай часцей маслам змазвае. А пастраляць паспее. Настраляецца шчэ, што ўвушшу звінець будзе...

Праехалі малады бярэзнік, над якім, як свечкі, тырчалі макавіны ялін, і на тых, што былі непадалёк ад дарогі, віселі залаціста-жоўтыя гронкі шышак. Адкрыўся затым жытнёвы кліп, і за ім, на пагорку, роўным ланцужком зачарнелі хаты Ліцвінава.

— Добрае жыта будзе ў ліцвінаўцаў,— прамовіў у шчырым замілаванні Юрша.— Бачыш, якая гушчыня? Ажно сінеча на ім. А з таго, што па даваенным папары сеялі. І зіма снежная была, амаль без адлігі адстаяла...

Захар слухаў гаворку Юршы без захаплення — гэта было якраз тое поле, дзе летась Захар абяцаў ліцвінаўцам, што будуць яны праводзіць жніво ў калгасным гурце і камбайнамі. Хопіць яму таго, што Ціхан за тыя абяцанні наківаў. Мог Юрша солі і не падсыпаць.

— Нам трэба хутчэй развязвацца з бульбай,— сказаў Захар, павярнуўшыся ў супрацьлеглы бок, дзе была пасаджана бульба.— Жвірбля мне скардзіўся, што коней заганялі ўшчэнт. Гармату, кажа, ужо не павалакуць.

— А мне — на Жвірблю скарга за скаргаю. Пачаў нос дзерці, што ўжо і пікаю не дастанеш. Мы, маўляў, артылерысты, а не гаспадарнікі.

Мажлівасць не пагадзіцца з Юршам была па душы Захару, і ён тут жа запярэчыў:

— Хай дзярэ. Абы справа не дралася. А яна ў яго — на вышыні. Ён жа гэтую сваю гарматку гатовы на руках насіць: адно і ведае, што чысціць ды галубіць. А якое прыстасаванне на фурманцы прыдумаў! Не куляецца ж цяпер на паваротах гарматка. Што ні кажы, а рукі ў гэтага піцерца залатыя.

— А я думаю ў наступным нумары насценкі па ягонай

фанабэрыі празмернай шкрабануць. Жаўрук абяцаў сатыру нават грымнуць. Вершаваную. Каб людзі пасмяяліся ды павесяліліся.

— Нешта замнога мы пачалі весяліцца,— сказаў Захар памяркоўна, як бы разважаючы сам-насам.— А баявых спраў малавата.

Юрша запярэчыў, запярэчыў упарта, быццам яго абвінавачвалі ў чымсьці такім, з чым ён апіяк не мог пагадзіцца і што палічыў за абразу:

— Не разарвацца ж! І зямлю ўрабі і ваюй! Без нашай дапамогі хіба ж абсеяліся б вяскоўцы? А партызанскія сем'і...

— Усё верна, камісар, усё правільна. Але Гусараў, ведаеш, што нам скажа, калі прыедзе? Заседзеліся на печах. Тлушчам залівацца пачалі...

Захар вельмі дакладна падрабіў голас Гусарава, і гэта выклікала ў Юршы ўсмешку.

— Хай сабе. Я прыкмеціў, між іншым, што дужа ён нерваваўся, калі ад нас выпраўляўся пад Дзісенку.

— Мне тое ж у вочы кінулася.

Юрша не папытаў, што падалося Захару дзіўным у паводзінах Гусарава, і Захар вырашыў нічога не ўдакладняць, сядзеў, моўчкі ўслухоўваючыся ў вясёлае парыпванне колаў. Ведама, патрэбы няма ў гэтым удакладненні, але зразумець прычыну тых паводзін не пашкодзіла б. А што, уласна кажучы, табе здалося дзіўным? Што грунтоўна не патлумачыў, чаго ідзе пад Дзісенку? Не абавязаны ён быў рабіць перад табою справаздачу. І пяць разведчыкаў, якіх ён павёў з сабою, ты проста сам павінен быў выдзеліць для аховы. Яго патрабаванні, каб кожны ў атрадзе назубок ведаў Майскі загад Вярхоўнага? Але ж ты і сам штодня паўтараеш сваім людзям, каб вучыліся вайсковай справе, вучыліся настойліва, вывучалі даскапала сваю зброю, каб зрабіліся майстрамі сваёй справы і навучыліся біць ворага гэтак, каб напэўна ўжо было. З'едлівасць папрокаў, што, маўляў, марудна расце атрад? Дык гэта ж справядліва. Патрабаванні рашуча ўзняць баявую актыўнасць узводаў? Тут таксама, бадай што, нічога не запярэчыш. Марудна складаюцца спісы па мабілізацыю? І гэты папрок справядлівы: марудна. І маруднасць гэтая тлумачыцца тым, што тут нешта не прадумана як след. Гусараў патрабаваў уводзіць у спісы кожнага, хто можа насіць зброю, каб потым гэтых людзей адправіць за лінію фронту. Зрабілі, скажам, спісы і адправілі. А як тады

расці атраду? Сёння ў Захара няма патрэбнай колькасці зброі. Але ж заўтра яна можа ў яго паявіцца! Хто тады яе возьме ў рукі?.. Можа, гэтыя пярэчанні і ўзарвалі Гусарава? Відаць... А яшчэ, мабыць, болей тое, што ён, Захар, абсмяяў патрабаванне Гусарава весці непрыцэльнае абстрэльванне варожых гарнізонаў. Як гэта ён казаў? Вы, маўляў, стрэліце дзесятак разоў, хай упустую стрэліце, а яны затое з гэтае нагоды ноч спаць не будуць, тысячы куль у паветра пусцяць, і гэта шкода ворагу двайная: знерваваны вораг будзе, патроны растраціць, менеи на фронце будзе страляць. Смешна ўсё гэта здалося Захару. Яны сабе патронаў падвязуць. А вось ён, Захар, дзе тоїі лішні дзесятак патронаў возьме? Ды ў яго кожны патрон на ўліку. За кожным патронам разведчыкі і падрыўнікі па дотах шныраць, лезуць у развалiны, жыццём рызыкуючы. Ды потым шчэ тоїї амаль кожны патрон параўнаваць трэба. Гэта ж толькі ў вінтоўку яго і загоніш, а ў кулямётны дыск не наставіш. Не, калі ўжо страляць, дык не ў белы свет, як гаворыцца...

Палявая дарога разгаліноўвалася, управа — у лес, улева — да былой калгаснай агароды, за якой ляжаў стракаты бульбяны палетак, сціснуты свежымі чорнымі разорамі. Захар убачыў каня на полі, ля разораў справа, і дзве чалавечыя постаці — конь і людзі,— здавалася, стаялі на месцы. Захар неспадзеўкі для самога сябе вырашыў пайсці туды і перахапіў лейцы, якія Юрша трымаў адной рукою.

— Ты ў лагер габлюй, а я — на поле. Прыводзь свае паперы ў парадак — гэтым хоць Гусарава супакоім. І паглядзі, каб ужо сёння насценка вісела. Людзі з поля вернуцца — пачытаюць.

— На сёння і запланавана. Я ж табе казаў!

Захар, пацвельваючыся, пляснуў сябе далонёю па лбе, засмяяўся:

— Угрэўся на гарачым сонцы кацялок. Таму і варыць блага. Ну, габлюй адзін...

Закінуўшы аўтамат за плечы, ён падыбаў наўпрост праз поле, кіруючыся на вугал старой агароды, якая цяпер, з гэтага боку, здавалася жаўтлявай на сонцы, як зробленая з новага смалістага бярвення; над вільчыкам, якраз пасярэдзіне, тырчалі дзве вострыя макавінкі грушы-дзічкі. Захар, прыгледзеўшыся, пазнаў людзей, якія працавалі на полі: з таго канца поля да агароды, трымаючы каня за аброць, грэбся Шлык, як увесь час сагнуты над разораю і

прыпадаючы на левую нагу; всў саху Бялоў, всў прыгожа, фасоніста выпіраючы грудзі; ён быў без кашулі, у сіняй майцы, з шырокай цёмнай плямаю на грудзях, у брудных чорных штанах, адна калашына якіх была запраўлена ў бот, а другая выбілася з халявы, завісла, як падраная.

Абора была ўжо блізка, і за ёю грымнуў дружны рогат. Захар вызначыў у ім знаёмае звонкае Санькова — «гу-гу-гу». Перасмыкнуўся: дзе Санько — заўжды рогат. А праца — стаіць. Бялоў ды Шлык толькі рупяцца.

Убачыўшы Захара, усе сумеліся.

— Прывітанне, курортнікі,— з'едліва сказаў Захар, па чарзе агледзеўшы Санько, Клубіча і Харэўскага; спыніў позірк на Артуру, які напаўляжаў на фурманцы, загнанай у цень пад ігрушу-дзічку. Потым павярнуўся зноў да Санько, які сядзеў на траве побач з сахой, спытаў як быццам толькі ў яго: — Вы што, баразёнкі лічыце, што Бялоў са Шлыкам кладуць?

— Конь прытаміўся. Змакрэў, толькі што на траву пусцілі,— сказаў Клубіч і ўзняўся.

Белы конь скуб траву ля сцяны аборы, цягнучы за сабою на доўгіх лейцах ворчык. Захар глядзеў на каня, але крайком вока бачыў, што Санько і Харэўскі ўзняліся. Саскочыў на зямлю з фурманкі і Артур.

Конь быў не мокры, і Захар гэта добра бачыў, і таму спытаў незадаволена:

— Калі ж мы з гэткай працаю абгонім бульбу? Калі поле зусім перасохне?

Санько адгукнуўся весела:

— Лепей позна, чым ніколі, як сказаў Давід, паклаўшы тол пад рэйку, калі цягнік схаваўся за павароткаю.

Загучаў смех, але стрыманы, і ён не пакрыўдзіў Захара. Пакрыўдзіў вясёлы Артураў твар, і гэтая ўсмешка Санько, пакрыўдзіў увесь іх выгляд, поўны абыякавасці і бесклапотнасці. Зноў, мабыць, з пустым вярнуліся Санько і Артур, бо на фурманцы, здаецца, нічога не відно, сена толькі горбіцца. Тыдзень, лічы, марна гойсаюць яны па лесе, шукаючы схованку са зброяй. Няма, відаць, ніякай схованкі. І невядома, ці была ўвогуле...

Згледзеўшы, што штаны і пінжак на Артуру мокрыя, як нядаўна з вады, Захар спытаў строга:

— У адзежы ты купаўся, ці што?

— Пад дождж трапілі. Тут суха, а ля Дзвіны перапяў сляпы дожджык.

— А чаго ж Сапько сухі?

— А я, таварыш камандзір, паміж кроплямі рвануў. І — вывернуўся,— і Сапько пакруціў рукою ў паветры.

Усё было паэлектрызавана смехам, і ён выбухнуў, варта было Сапько пакруціць у паветры гнуткай, бы з гумы, рукою.

Артур першы, здаецца, заўважыў, што Захар незадаволены, прамовіў, стрымліваючы ўзбуджанасць:

—Мы знайшлі, дзядзька Захар,— і тут жа дадаў, папраўляючы сябе: — Знайшлі зброю, таварыш камандзір.

— Праўда?!

— Ну! Дзядуля правільна ўсё казаў. Поўненькая скрыня, усё, як ён і казаў.

— І складзік са снарадамі апаролі,— сказаў Сапько.— Выпадкова, непадалёк ад палігона. Гаўбічныя. Пяць штучак мы прыхапілі на спробу. А там іх, у ровіках, і не злічыш. Мо ўся тысяча. Толу цяпер у нас — пад завязку...

Сапько рыўком ссунуў сена ўбок, і Захар убачыў доўгую, але нізкую скрыню, абкладзеную з бакоў тупарылымі чорнымі снарадамі з чырвонымі галоўкамі.

— Дваццаць вінтовачак,— і Артур ганарліва прыўзняў вечка скрыні.— І два «дзегцяры». Амаль не паржавелі. Яшчэ пятнаццаць гранат і шэсць цыпкаў...

— Залаты ў Артура дзядуля быў,— сказаў Сапько і дадаў з усмешкай: — Каб яшчэ нам адну гэткую схованку — на Берлін можна было б рушыць...

Даўкая спазма, што сціснула Захару горла адразу ж, як толькі ён пачуў пра знаходку, цяпер памацнела, і яму цяжка было што-небудзь сказаць. Ён кашлянуў, як бы здзіраючы сухасць у горле, абапёрся рукою аб краёк скрыні, цёплай, угрэтай сонцам; шляпкі ж цвікоў былі ўвогуле гарачыя і нібыта прапальвалі далонь. Ён нечакана прыгадаў, як летась Ягор уручаў пляменнікам маскоўскія падарункі, як бацька ўшчуваў яго за гэтае «купецтва», і адчуў, што вочы туманіць дрыготкая імгла. Варухнуў рукою, каб паправіць аўтамат, што поўз з пляча, і тады сам здзівіўся ад думкі, якая ўзнікла. «Аддам аўтамат яму. І ў падрыўнікі хай ідзе. Двойчы ж маліў-прасіў, каб з Сапько разам!»

— Бяры. Гэта — табе, як узнагарода,— і сарваў з пляча свой аўтамат.— Валодай! І лічы сябе ў групе падрыўнікоў!

— Ён, таварыш камандзір, падрыўнік прыроджаны. Мы яго і без аўтамата бяром у сваю групу.

Голуб перапыніў Сапько, ляпнуў яго па плячы:

— З аўтаматам бяром! З аўтаматам!

Яны зноў рагаталі шчыра, бесклапотна, і Захар паддаўся гэтай плыні і рагатаў разам з усімі. Потым ён зноў адсунуў вечка нізкай драўлянай скрыні, памацаў рукою халодны прыклад кулямёта, які ляжаў зверху. Добры ж ты, татка, зрабіў падарунак атраду. У гэтым ты жывы! З гэтае зброі яшчэ грымне не адзін баявы залп, грымне развітальным салютам табе...

Зноў балюча заныла сэрца, як нейкая доўгая стрэмка прайшла праз яго, і нейк мройна завагалася ў вачах празрыстая сетка, быццам кроплі вады затрымцелі на веях, і ён, каб не паказаць перад усімі свайго хвалявання і захаваць камандзірскую строгасць, спытаў у Сапько:

— Стаміліся?.. У лагер, у лагер усім. І — адпачынак. А што я Жаўрука не бачу? Ён жа з вамі быў?

— Ён — верха. Паляцеў з радаснай весткаю.

— І вы рухайцеся. Хай начштаба на свае вочы пабачыць. І адразу ж — у чыстку зброю...

Сапько тузаў лейцамі, фурманка марудна выпаўзала з-пад грушы-дзічкі. Голуб усё мацаў з Артурам аўтамат, і Захар шчыра радаваўся нядаўняму свайму парыванню. Было крыху і шкада аўтамата — як што раптоўна згубіў! — але шкадаванне было кволае і ўжо крэслілася добрым пачуццём. Хацелася зрабіць нешта яшчэ, зрабіць добрае, шчырае, патрэбнае людзям. Вока як зачапілася за вострыя іклы сахі, зыркія на сонцы, вышараваныя зямлёю да бляску.

— Харэўскі! Анатоль! — гукнуў ён, і радасны гэты яго шал быў яму па душы.— Вярні сюды свайго белага. І саху чапляй. Мы зараз з Бяловым паспаборнічаем!

Бялоў, які стаяў у канцы разоры і выціраў кепкаю спацелы твар, сказаў з уздыхам:

— Мы ўжо з Велізарам пасохаліся. Пакурыць трэба.

— Пакуры, пакуры, стаханавец! Пакуль ты цыгарку сасмаліш, я дзесятачак баразёначак табе і шахпу!

— Не на гэткім кані той дзесятачак рабіць,— сказаў Бялоў і накіраваў да грушы-дзічкі. Ён шмякнуўся на армейскі ватнік, узяўся круціць цыгарку.— Гэта даўней, на маіх эмтээсаўскіх — пястомных сталёвых! — конях гэтае поле б узняў, пакуль цыгарку скурыш. Велізар! Хай скубе травіцы, не чапай яго. Шнуруй сюды!..

— Паспяваійце толькі лічыць! — усё ў тым жа запале

выгукнуў Захар, скідаючы скурапку.— Падлічвайце, каб усё дакладна было. І загарайце, тым часам...

— Мы і загарэць паспеем. І пакурыць. А ты ўгрэйся ў гэтай лазні, камандзір, угрэйся!

Нешта няўлоўнае і скептычнае мільганула ў Шлыкавых вачах. Але Захар тут жа і забыў гэтую ўсмешку, забыў адразу ж, як толькі адчуў далонямі цёплыя гладкія дзержакі сахі. Ён задаволена расправіў плечы, крутнуў галавою, адсоўваючы фуражку падалей на патыліцу, потым злаўчыўся, надзеў яе казырком назад. І яшчэ больш зарадаваўся: ёсць, аказваецца, спрыт! І сіла ў руках ёсць! І не прапала, жыве твая, татка, навука — роўна ідзе саха, не зарываецца, роўную глыбіню гоніць, і парасткі бульбы зямля не зломвае. Лісце, праўда, засыпае. Але гэта не страшна: узнімецца бульбачка. І Анатоль малайчына, роўна вядзе каня, дакладна па баразёнцы. І якім жа вострым водарам патыхае ўзнятая ралля! З якім звонкім храбусценнем рэжа саха ўтравелую ўжо глебу, як патрэскваюць разарваныя карані. Саху, аднак, не дужа-ткі і лёгка весці! Праўда Шлыкава — як у лазні ўгрэўся. Ён жа, Захар, толькі другую вядзе, а плечы ўжо змакрэлі. І Шлык, відаць, гэта разумее і бачыць. Вунь як з Бяловым углядаюцца, быццам чакаюць, што ён іх зараз на дапамогу пакліча. Дарэмна чакаеце, даражэнькія! Захар не паддасца, выканае тое, што абяцаў — дзесяць баразёнак прагоніць. Ведама ж, яму, Шлыку, гэтая работка не ў навіну. А калі ён, Захар, хадзіў з гэткай старасвецкай прыладаю? Ды летась і хадзіў, на бацькавым гародзе бульбу абганяў сахою. Праўда, саха ў бацькі была меншая, зграбная, лёгкая. Дзіўная, між іншым, прылада, аніводны гаспадар саху гэтую па распыл не пусціў — абганяць ёю бульбу дужа зручна!

Захар перасунуў рукі па самыя канцы дзержакоў, якія былі халаднаватыя, і адразу адчуў палёгку. Нібыта і зямля тут пайшла мякчэйшая. Э-э, вунь якая праява: глеба больш пясчаная. Там, унізе, бліжэй да аборы, глеба гліністая, а тут хоць і аднолькавая па колеры, але сыпкая, каменьчыкаў болей трапляецца. Як мякка пазвоньваюць яны! А цяпер блішчастыя скібкі кладуцца, як маслам змазаныя. На гэтым полі бульбы нарасце!..

Дзесятую баразёнку Захар вёў мокры ад поту, патыліца была як узмыленая.

— Твая праўда,— прызнаўся ён Бялову, аддаючы яму саху.— На эмтээсаўскіх конях спарней праца ішла. Але

вам тут мала што і засталося. Пяць баразёнак прагоніце — і скончылася работка.

— Каб жа! Яшчэ ў Вепцавое ехаць, як тут скончым. Там у пяць разоў поле большае. Вось як яго даб'ём — тады канец,— і параіў шчыра і сардэчна: — У цяньку не кладзіцеся. На сонейку лепей абсохнуць. Пад дзічкаю слаўна: і цяньку ёсць і сонейка. Я нават і на вуха паспеў націснуць...

Захар пайшоў да грушы-дзічкі, цягнучы за сабою скуранку. Кінуўшы яе побач з армейскім ватнікам Бялова, ён шмякнуўся на самым крайку ценю ад тоўстых галін і задаволена раскінуў рукі. Над галавой у яго звісала густое куртатае голле, і ён ляжаў нерухома, як раптоўна сп'янелы. Востры пах свежаўзаранай зямлі змешваўся з водарам чабору; маладая цімафееўка, што густа дралася праз пласт леташняга быльнягу, прыемна астуджвала натруджаныя сахой далоні, і Захар як бы плыў некуды, загушканы роўным, падобным на далёкі гул самалётаў зуганнем пчол. Ён раптам згледзеў гэтых пчол — спаўдаліся па маленькіх і дробных суквеццях. Дзіўна! Гэтак позна цвіце дзічка? Э-э, квецень жа толькі на гэтай адной галіне, што звернута ў бок аборы: цень ёй тут ад сцяны, зямля не адразу прагрэлася... І завісла неяк, як зламаная. Куля па ёй чырканула, ці што? Падобна... Вось з чаго гэтак позна ўбралася галінка ў вясновае белле. На ўсім дрэве ўжо завязь — і поўна яе, і буйная скрозь! — а тут толькі шчэ трымціць гэтае рэдзенькае бела-ружовае полымя.

Ён знайшоў сухую рагульку, падняў галінку, і яна сышлася на зломе, і ён шчыра зарадаваўся. Зрасцецца галінка, і дзічкі нагадуюцца, наліюцца. Потым нападаюць у траву, прыхопіць іх марозам. Э-эх, смаката будзе! А якая ж густая і блізкая выдае сінеча неба! Быццам зачапілася сіняя хваля за вершаліну дрэва і коціцца-разматваецца па галінах, ападаючы да зямлі.

Захар змружыў вочы, і гэтая сіняя хваля нібыта сапраўды загушкала і панесла яго стомленае працай цела.

Захар услухаўся ў вясёлую гаману Бялова са Шлыкам, якая то набліжалася, то аддалялася, чуў залівістатрапяткое трымценне жаўранка, які, здавалася, цяпер вісеў увысі як не над самай страхой аборы, і яму дыхалася ўсё лягчэй. Ён цалкам паддаўся цяпер ласкавай плыні, што лашчыла слых, песціла ўсю яго істоту.

Захар паварушыў рукою, пальцы намацалі маладую

траву, і ён нечакана прыгадаў, што зёлак у Загурскага не папрасіў. Гайдаш, напэўна ж, накрыўдзіцца. Папытае і пачне сварыцца, што ніхто ў атрадзе не клапоціцца пра медыцыну. У першай роце, маўляў, дык усё ёсць, а пра другую роту ніхто і не думае. Дзіўна, але гэтая думка пра тое, што Гайдаш пачне сварыцца, была чамусьці прыемная, і ён зноў як бы загайдаўся на пяшчотнай і мяккай хвалі. Даўно ён не адчуваў гэткай вось асалоды! Ляжы сабе, падставіўшы твар мяккім ласкавым промням, ляжы і лаві ледзь улоўны подых ветру на веях і губах, цеплыню — бы на печы ляжыш! — угрэтай сонцам зямлі, ціхае храбусценне сухіх леташніх сцяблін і казатлівы дотык маладых узорыстых лісцінак шніткі. Звычайна ля бацькавай хаты, пад клёнамі, рана-ранень-ка, ледзь толькі ўгрэецца гліністы касагор, выбіваліся з зямлі густыя лапінкі шніткі, шырэлі амаль увачавідкі, паўзлі над самы плот, і ў той травіцы, як заблытаўшыся ў нейкіх петлях, сядзеў аднойчы малады грак, якога злавіў Ігарок. Не, грак сядзеў, здаецца, на бульбе, у баразёнцы...

Захар яшчэ шчыльней сціснуў веі, баючыся, каб не знікла тое, што гэтак выразна памроілася,— сцяжынка ў садзе, Ігарок з чорна-шэрай птушкаю ў руках... Ён угля-даўся ў гэтае раптоўнае мроіва, жывое, выразнае, і не толькі бачыў усё добра — і тварык, і ручкі, і радасны бляск у дзіцячых вачанятках,— але і чуў, як слаба ціў-кае малое грачанё, і як адчайна крычаць старыя гракі, і як тупаюць па сцежцы сынавы ножкі ў жоўтых новых сандаліках...

У імклівых шалёных тактах пачало калаціцца сэрца. Сцежка, па якой бег Ігарок, набліжалася, як бы ляцела Захару ў вочы, і нечакана як выбухнула белым полымем. Захар імкліва крутнуўся і сеў. Ноч! Чорнае ўсё перад ім наўкола!.. Не, растае чарнота, сплывае... Па-ранейшаму сінее неба, зырка зіхацяць на сонцы свежыя барозны, якія сціскаюць зусім вузенькую лапіну шэрага палетка, пакраплёнага цёмна-фіялетавымі каліўцамі новай бульбы.

Ён зноў расцягнуўся на скуранцы, зноў сачыў за пчоламі, што ўвішна аглядалі кожную кветачку на ніжняй галінцы. Адчуванне балючай гаркоты, што сціснула душу, не праходзіла. Як з небыцця выдраўся. Стома, здаецца, прайшла, сіла ў руках і плячах адчуваецца. Але сэрца па-ранейшаму грукатліва калоціцца, нейкая тлум-

пасць у галаве. І ўдалечыні, дзе паваротка ручая, як бы вагаецца мядзяна-чырвоная палоса. Няўжо зноў нешта мроіцца яму? Не, гэта ж вербы на ўзвалс ля Дзвіны. І як бы слабая, паўскасяк адсечаная, дуга вясёлкі над тым вербняком...

Канец дугі нібыта падпіраў казырок фуражкі, і Захар пасунуў яе па зямлі і раптам страціў цікавасць да вясёлкі — узяўся разглядаць фуражку. Другі год яна служыць яму: і дажджоў пабачыла, і пылу, і поту... Нават выбух гранаты, якую гітлераўцы кінулі напрадвесні ў зямлянку, перажыла, ацалела. Уся ў плямах, трошкі надпаленая ля вогнішча, з карычневым ад поту аколышам, яна неяк дужа мілая яго сэрцу. Ці не ў Віроўлі ён яе купіў? Так, у Віроўлі, у вясковай краме, калі прыехаў да цесця па госці, купіў, каб ўратаваць галаву ад спякотнага сонца. Яны тады з Зінаідаю пайшлі ў краму, і яна ўхваліла яго намер, нават на сваю галаву прымервала, і была ў гэтай фуражцы зграбная такая, прыгожая, ішла ў ёй па вуліцы і толькі перад хатай, спахапіўшыся, засмяялася, націснула яе Захару на галаву...

«А яно, жыццё наша, до-оўгае...»

Чужая думка здалася яму сваёй уласнай высноваю, у якой ён нечакана знайшоў новы і вялікі, нязнаны дагэтуль сэнс: рэальнае жыццё — гэта заўсёды ўспаміны, а тое, што наперадзе, гэта не жыццё, а час, які невядома яшчэ што можа чалавеку падараваць.

## 8

У мігатлівым жаўтлява-бляклым святле ракеты, што зноў узляцела са станцыі, тоўстае бярвенне нізкай сцяны маслазавода здавалася блішчастым, быццам шкляное. У будынку ўвесь час нешта то цяжка гупала, то браздзжэла тонка і жаласліва, то глуха грукацела — Санько і Калечыц пешнямі крушылі сепаратары.

— Доўга яны шчэ там? — нецярпліва спытаў Яштокін Захара, які стаяў ля фурманкі, на якую былі нагружаны скрыні са сметанкавым маслам.

Захар адгукнуўся весела:

— Даюць, бачыш, стаханаўскую выпрацоўку. І каб надзейна ўжо было. Хай памалоцяць, хай адвядуць душу хлопцы.

— Ды згарыць яно к чортавай матары і без іхняй малацьбы. Час толькі марна трацім!

— Не яешню пячом — не перапаліцца,— пажартаваў Захар.— А калі што — масліца дадамо, каб не падгарала.

Яштокін зноў узгарэўся:

— Як у цешчы гасцюем. Можам і самі па патэльню трапіць,— і загадаў Бялову, які цягнуў з падваконня новую скрыню з маслам.— Хутчэй варушыцеся! Колькі шчэ там застаецца?

Бялоў, перагнуўшыся цераз падваконне, перадаў гэтае запытанне ў будынак, прыслухаўся і тут жа далажыў Яштокіну:

— Чатыры застаецца? Як лёду,— і, як бы падахвочваючы хлопцаў, што варушыліся ў будынку, сказаў, ужыўшы два словы па-нямецку: — Хутчэй робім рыхтык, дык будзе па масле фрыштык. Чуеце, хлопцы?

У будынку маслазавода зноў нешта тонка і жаласліва зазвінела, і Яштокін, заўважыўшы, што яго словы не далі належнага зруху, зноў пачаў лаяцца:

— Хопіць! Хопіць ужо па гэтую! Я сказаў, што хопіць сюды грузіць! На другую фурманку нясіце! Каб на ўсіх роўна было! Хто на гэтай ездавы?

— Голуб.

— А дзе ён?

— Паветку аглядае. Калечыц паслаў. Нейкія скрыні там.

— Тара ж гэта! Пустыя скрыні яму спатрэбіліся нешта? Голуб, мігам сюды! — і тут жа Яштокін перамяніў сваё рашэнне.— Сам бяры лейцы ў рукі. Чуеш, Бялоў? Бо Голуба мы не дачакаемся. Выводзь каня з-пад абстрэлу!

— Які тут абстрэл, таварыш начштаба? Сядзяць яны па сваіх бункерах, як мышы пад венікам. Не зварухнуцца.

— Я што загадаў? — зазлаваў Яштокін.— Выконваць! І хуценька!

Бялоў, задаволены і працаю і тым, што ўсё складваецца добра, забурчэў:

— Навошта ж нам спяшацца, калі можна і не спяшацца. Не чужое грузім. Сваё.

— Ну і філо-о-осафы! Слыш, камандзір? — Яштокін павярнуўся да Захара.— Гэта ж адны філосафы на заданне пайшлі. Аніводнага ў лесе ты не пакінуў,— і зноў напусціўся на Бялова: — Гані! Гані каня! Бо зараз яны

табе такога веніка могуць наказаць, што не паспееш адмахвацца.

— Дзве шчэ застаецца скрыначкі. Не пакідаць жа іх!

— Як? Ты ж чатыры ўжо клаў!

— Шчэ дзве знайшлося.

— Грузі і адразу — гані!

Захара здзівіла гэтая гарачнасць Яштокіна, заўсёды спакойнага і ўраўнаважанага. Залішне ён мітусіцца без патрэбы. Маслазавода — таго самага, на ахову якога напаролася на тым тыдні група Драгуна,— ужо, уласна кажучы, не існуе. Скрыні з маслам, падрыхтаваныя да адпраўкі, пагружаны на фурманкі і паедуць у партызанскі лес. Хлопцы дамалачваюць цяпер абсталяванне завода, і Калечыца не варта спыняць — ён помсціць за Драгуна, які пазаўчора скапаў ад ран. Калечыц як апантаны зрабіўся пасля смерці сябра. Аднак аперацыю гэтую падрыхтаваў з развяжлівым і дакладным разлікам. Маслазавод навідавоку ў фашыстаў — станцыя побач. Але Калечыц дзёрзка пайшоў на рызыку: па адвячорку, калі яшчэ было светла, яго разведчыкі па траве дапаўзлі як не да самага ганка маслазавода і ўсё вызналі як след, нават месца, дзе становіцца вартавы. Потым, з цёмным ужо, асноўная група на конях дала добрага кругаля, зайшла з боку станцыі і, пакінуўшы заслон, рушыла на завод. Ахова завода — пяць фашыстаў і чатыры паліцэйскіх — была знішчана без адзінага стрэлу. Але вартавога на тым месцы, дзе яго бачыла разведка ў прыцемках, не было. Не прагучала нідзе паблізу і стрэлу, толькі крыху пагадзя, адна за адной, пачалі ўзлятаць са станцыі ракеты — відаць, набег туды вартавы і ўзняў трывогу. А станцыя вунь, побач зусім, якіх дзесяць хвілін пешкі — не болей.

Непакой не перадаўся Захару, і ён, узяўшы Яштокіна пад руку, адвёў убок, сказаў, спрабуючы ўтаймаваць і супакоіць яго:

— Не мітусіся. Усё ідзе добра. Галоўнае, не ў пусты завод ускочылі. А заўтра каб прыехалі — пусценька магло быць. Правільна ўсё хлопцы спланавалі. Калечыц малайчына!

— Ракеты планавалі? — Яштокін хітнуў галавою ў бок станцыі, над якой узляцела новая ракета.— Вартавога праваронiць планавалі?

— Дык жа ж і масла гэтулькі не планавалі хапянуць. На масле цяпер у нас жыццё лясное пакоціць,— і,

каб крыху развесяліць Яштокіна, пажартаваў яшчэ: — А ім глотку будзе драць сухая скарынка. Праўда ж? А я дык о-оёй люблю хлебец з маслам. А табе па душы маслінца свежанькае?

Яштокін зноў нахіліўся над падваконнем, ніяк не адрэагаваўшы на Захарава запытанне.

— Бялоў! Калі вы скончыце поркацца?

— Усё, таварыш начальнік штаба. Апошняя скрыня!

— Санько дзе? Чаго я Санько не бачу?

— У канторскую прыбудовачку шмыгнулі з Калечыцам. Мэблю шукаюць.

— Якая шчэ мэбля? — узарваўся Яштокін.— Конча падурнелі!

— Санько абяцаў гаспадарнікам крэсла мяккае прывезці. У пякарню, ці што. Не ведаю дакладна...

— Ты чуў? — зларадна папытаў Яштокін у Захара.— Мэблю яны шукаюць. Ха-ха! Канец свету!

— Усё. Адыходзім,— сказаў Захар як мага спакайней. Убачыў Голуба, які вынырнуў з-за сцяны будынка, запыніў яго.— Дабяжы да Зімніцкага. Хай здыме заслон і адыходзіць. Але не следам за намі, пацяньні хай кроіць да скрыжавання...

У левых вокнах будынка маслазавода, адчыненых нахлашч, бліснула і імгненна набрала сілу жаўтлявае полымя. У святле яго постаць Санько — ён выбег на падворак з прыбудовачкі — здавалася дзіўна пачварнай: галава квадратовая, з чатырма тоўстымі рагамі.

Яштокін з вясёлым надрывам у голасе прасіпеў:

— Цы-ырк! Сапраўды, канец свету!

Крэсла, якое Санько цягнуў на галаве, абярнуўшы ножкамі дагары, замінала яму глядзець па баках, і ён круціў галавой, гукаў Бялова:

— Ч-чорт бялы, каня куды пагнаў? Прасіў жа... маржовы...— Санько мудрагеліста і брудна вылаяўся.— Зараз на гарбе сваім павалачэш...

Бялоў свіснуў. Санько пачуў, спыніўся на момант і зноў прыпусціў, наўскасяк рэжучы заводскі падворак.

— Ты што цягнеш, Санько? — строга кінуў яму Яштокін.

— Крэсліца. І дужа ж хвацкае,— у захапленні адказаў Санько.— Давід проста марыць пра такое.

— Марыць, значыцца? — нечакана з вясёлымі ноткамі ў голасе запытаўся Яштокін і тут жа хмурна і пагрозліва паабяцаў: — Давіда заўтра пешкі сюды пры-

шлю. І цябе разам. Пры дні на густу зноїдзеце сабе крэсліца.

— Гэта якраз тое, што трэба,— Санько паставіў крэсла і стаяў, сагнуўшыся, абапіраючыся аб высокую спінку.— І кідаць жа не хочацца.

— Калі ёсць сіла, дык нясі на гарбе,— і зноў строга і каротка: — Дзе Калечыц?

— Па тэлефоне размаўляе.

— Што-о-о?

— Мы ўжо з канторы беглі, а ён — д-дзынь... Калечыц — за трубку, алёкае. Са станцыі, мабыць. Ён там нешта бубніць...

— Ты толькі зірні на гэтае воінства, камандзір,— у ярасна-вясёлай роспачы выгукнуў Яштокін.— Адзін — у мяккае крэсла ўчапіўся. Другі — з тэлефонам забаўляецца...

Ракета, што вісела нізка, высвятляючы шаты дрэў, раптоўна згасла, як пацягнулі яе да зямлі, і тады адразу з таго месца, куды яна звалілася, загрукацелі кулямётныя чэргі і каротка затуркалі аўтаматы. Доўгія ленты трасераў як упёрліся ў вершаліны таполяў, што стаялі ўсцяж дарогі за будынкам маслазавода; у нізкіх хмызняках на пагорку за дарогай запокалі разрыўныя кулі, і следам зноў пыхнула, усё асвятляючы вакол дрогкім святлом, ракета.

Ленты трасераў і лопат разрыўных куль былі гэткімі блізкімі, што Санько рэзка крутнуўся і, не ўтрымаўшыся, разам з крэслам зваліўся на зямлю.

Яштокін рагатнуў:

— Што ж, дарагі, не сядзіцца ў мякенькім крэсле?

— Ножка, халера, зламалася,— сказаў Санько, поўзаючы вакол крэсла.— Не, цэлая, каб ёй добра жылося...

Захар ледзь стрымаўся, каб уголас не зарагатаць. Кулі свішчуць, невядома, як шчэ ўдасца адысці адсюль, а гэты ножку крэсла мацае, бядуе, што магла зламацца. І не кідае ж! Пацягнуў да фурманкі!

На падворак з прыбудовачкі выбег Калечыц. У адной руцэ ён трымаў аўтамат, а ў другой невялікую чорную скрыначку; ад святла ракеты скрыначка зырка пабліскваля.

— Э-эх, не паспеў,— Калечыц лаяўся.— Не паспеў аб усім дамовіцца па тэлефончыку,— і, падбегшы да Санько, які ладкаваў крэсла на фурманцы, зарадаваўся.— Гэ! Ухапіў жа! Ну, парадачак у нашых часцях!

— Ножку ледзь не зламаў ёй.
— А я тэлефончык прыхапіў!
— Тады трэба ж было і дроту прыхапіць!
— Гэта драбяза — знойдзем,— раптам шчыра забедаваў: — Цяжка адыходзіць Сярожку... З боем, бачыш, адыходзяць,— і раптам вірлівыя ноткі зноў прабіліся і загучалі ў яго голасе: — От жа чорт, не далі размову скончыць. Чысты, чысты галасочак. Жаночы! Я ёй крычу: шнуруй сюды, галубка!
— Гэта ж яна і бяжыць! На стажыроўку да цябе. Ажно вецер кулямі ля вушэй свішча. А ты — драла!..
Яны жартавалі ўзбуджана і бесклапотна, як забыліся пра тое, што варожы гарнізон побач. І гэтая вясёлая гамана зноў узарвала Яштокіна:
— Спыніць размовы! Калечыц!
— Слухаю,— і Калечыц падскочыў да Яштокіна.— Я думаю, таварыш начштаба, да Зімніцкага.
— Я Голуба наслаў.
— А не пашкодзіць і мне там быць.
— Давай. Мы чакаем вас у лесе. Ля самалёта.
— Дазвольце, каб і Санько са мною.
— Санько ж крэсла пільнуе,— падкалоў Яштокін.
— Тады толькі тэлефон пакладу...
Калечыц дабег да фурманкі, паклаў тэлефон, нешта ціха сказаў Санько і выбег на ўзбочыну; постаць яго адразу растала ў чорным хмызняку, што падступаў амаль ушчыльную да гравійкі.
— Смела яны тут жылі,— сказаў Яштокін.— Нават кусты не павысякалі.
— Цяпер павысякаюць. Цяпер ім ужо тут работкі будзе.
Захар двойчы азірнуўся на кустоўе і цяпер ледзь паспяваў за фурманкаю — конь трухаў роўнай спорнай рыссю. Зрэдку звінелі падковы, з густым рыпеннем трушчыўся жвір пад абадамі, і гук гэты не глушыла страляніна ззаду, якая, праўда, была ўжо не суцэльная, а быццам складзеная з грукатлівых кавалкаў.
— Сядайце, таварыш камандзір,— прапанаваў Захару Санько, які ішоў з лейцамі ў руках.— Конь адпачыў, цягне добра.
— А чаго сам пеша лупіш?
— Я не стаміўся.
— Няўжо? — падкалупнуў Яштокін і з роблепым,

але падкрэсленым захапленнем дадаў: — Гэткае крэсла цягнучы ўсю сілу можна было пакласці.

Санько адфутболіў кніну — жартаваў, як з роўным сабе:

— На мяккім крэсле пасядзіш — адразу сілы прыбавіцца,— у голасе яго чулася задаволенасць гаворкаю з Яштокіным.— Вялікая стратэгія, між іншым, складалася вось у гэткіх крэслах, мя-якапечкіх. На цвёрдых і думка цвёрдая. Зусім нягнуткая.

— Ух ты! — павесялеўшы, выгукнуў Яштокін.— Сваёй галавою дапяў?

— Не, з Давідавай выскачыла галоўкі!

— Тады давай сюды лейцы, калі сваёй галавою не жывеш. Завязеш нас абы-куды,— і Яштокін забраў лейцы ў Санько.— Імчы, даганяй першую фурманку. Скажаш, каб на скрыжаванні ўсе спыніліся. І каб захоўвалі дыстанцыю, гуртам не стаялі,— і зноў падкалупнуў Санько: — Крэсла мы з камандзірам напільнуем.

— А чаго яго пільнаваць? Хто стаміўся — хай сядае,— дабрадушна параіў Санько.— Яно сярод скрыпак стаіць трывала. Не зваліцца. І — вышыня. Назіральны пункт, адным словам...

Захар ледзь не зарагатаў, але спахапіўся і стрымаўся. Крыху пагадзя, углядаючыся наперад, дзе бег Санько — ад святла ракет аўтамат яго кідаў у цемру кароткія цьмяныя бліскаўкі,— сказаў Яштокіну, як бы запрашаючы падзяліць яго добрую думку пра хлопца:

— Вясёлы народ у Зімніцкага. З імі неяк і на душы лягчэй. А гэты Санько — чмур несусветны. Думаеш, што сапраўды Давіду крэсла прыцягнулі? Не-е, гэта яны самі прыдумалі, зноў нейкі канцэрт наладзяць.

— А мы глядзім, як ён іхнія штукарствы церпіць. І разам з імі рагоча.

— А хіба гэта блага?

— А што добрага? Я лічу, што трэба з нагулянкамі і забаўкамі канчаць. Гэты — крэсла цягне. Той — з тэлефонам забаўляецца. Калечыц жа начальнік разведкі. Ён штохвілінна павінен ведаць, што робіцца наўкола.

— Пачакай, не гарачыся. Ты ж сам сабе пярэчыш і мудрае бурыш.

— Што гэта я буру?

— Свой уласны закон ачышчэння чалавечай душы. «І чалавек, бы акумулятар, зараджаецца зноў». Твой, між іншым, закон. І мудры.

— Памятаеш, значыцца.

— Нечаканае заўсёды нечакана і ўсплывае ў памяці.

Яштокін сказаў неспадзявана хмурна:

— Разважаеш, бы на мяккім крэсле сядзіш.

— А мо варта і пасядзець? Сапраўды, мяккае...

Захар, смеючыся, ускараскаўся на крэсла, што стаяла на задку фурманкі, і наважыўся быў пажартаваць, што, маўляў, ехаць не ісці, і тут жа як нейкі ўнутраны голас спыніў яго. У сваёй вясёлай упэўненасці, з якой ён гаварыў з Яштокіным, пачулася яму прысутнасць нейкай трывогі. Была гэтая трывога і ў мітуслівасці Яштокіна, у той напорыстасці, з якой ён адказваў Захару, даводзячы сваё. Як нечым моцна раззлаваны чалавек. Але ёсць, відаць, рацыя ў Яштокіна, што непакоіцца. Станцыя побач, гравійка адтуль прастрэльваецца, а яны спакойна едуць і разважаюць пра нейкія другарадныя справы. Каб фашысты ведалі, што едуць зараз партызаны непавіта вось тут, дык накрылі б з мінамётаў як ніць даць. Што ім абыходзіць дзесятак мін кінуць, ды яшчэ калі гравійка загадзя прыстраляна? А вось жа не кідаюць мін. І, відаць, не кінуць. Яшчэ б крыху праехаць, а там — пагорак, пераваліўся за яго — свішчы тады!

Захар яшчэ там, па дарозе да маслазавода, і пазней, на падворку, пачуўшы вясёлую гаворку Санько з Калечыцам, раптоўна і цвёрда паверыў у тое, што ўсё абыдзецца добра. І Яштокін дарэмна злаваў, падганяючы Санько, усяляк падспешваючы і яго і астатніх: сёння — ноч удачы! І ўдача павінна спадарожнічаць і Юршу, які павёў другую роту ў Экімань, пад самы горад. Ванда паведаміла, што ў кароўніку былога саўгаса стаіць каля шасці дзесяткаў кароў — фашысты нарабавалі іх у вёсках Асвейшчыны. Побач — сепаратарны пункт, масла з якога штодня адпраўляюць у горад. Будынак, у якім размешчаны сепаратары, гэтак жа як і кароўнікі, слаба ахоўваецца. Але зусім непадалёк, на правы бок пасёлка, у нізіне за дарогаю, што вядзе да моста на Дзвіне, амаль штодня робяцца засады — на змярканні, у прыцемках ужо, машыны прывозяць з горада салдат, узброеных кулямётамі і аўтаматамі. Гітлераўцы займаюць акопы на двух пагорках, што быццам запіраюць уваход у нізіну, якая спрэс парасла ляшчэўнікам і цягнецца да самай Дзвіны. Аднойчы ў лютым партызанская група выйшла той нізінаю на бераг ракі і з кулямёта абстраляла аэрадром — спалілі два самалёты. Нябожчык Чагін вадзіў гэ-

тую групу і шчыра радаваўся поспеху. Пасля таго вылазку фашысты і пачалі наладжваць засады ў старых акопах на пагорках — на пачатку вайны там стаяла наша зенітная батарэя,— спадзеючыся, што партызаны зноў выкарыстаюць гэтую зручную мясціну. І не памыліліся, на вялікі жаль: нешта праз тыдзень на іх агонь наляцела група невядомага Захару партызанскага атрада. Пазней стала вядома, што гэта былі разведчыкі атрада з-пад Расон, якія вярталіся з-пад Лепеля. Пра тое, што загінула ўся група — дванаццаць чалавек,— Захар даведаўся на другі ж дзень з паведамлення Ванды — у канцы лютага Ванда пачала працаваць у горадзе. Пахавалі забітых жыхары пасёлка толькі вясною, калі сагнала снег і адтала зямля.

Захар, прыгадаўшы гэта, захваляваўся. Дарэмна, мабыць, ён гэтак паверыў у ноч свае ўдачы. Усё ўлічыць цяжка, усё да каліўца ўвогуле прадбачыць нельга. Тыя кароўнікі раней, скажам, не ахоўваліся. А раптам у гэтую ноч варту паставілі? Ванда, якая павінна была начаваць на пасёлку, раптам не выбралася з горада своечасова ці з якое іншае нагоды не дайшла да пасёлка. І Файзуло дарэмна чакае яе ў вызначаным месцы. А гэты натурлівы камандзір узвода можа рынуцца і ў горад! Не, нікуды ён не кінецца — Юрша там з імі, не дазволіць. Юрша зробіць усё, як і планавалі, ён чалавек асцярожны, разважлівы. Можа, з гэтае свае асцярожлівасці ён і не хацеў узяць на заданне Гайдаш? Яна казала: не можа заставацца ў лагеры, калі ўся рота ідзе на заданне. І ён, Захар, не падтрымаў камісара, дазволіў ісці Гайдаш з ротаю... Дзіўна, чаго ён прыгадвае гэта цяпер? А можа, нешта там з імі здарылася, і таму гэткая трывога на душы?.. Не, не! Нічога благога там не магло быць. І Ванда іх павядзе на добры кірунак. І Кандрат жа там павінен быць!.. Сёння — ноч удачы!

Бой ля станцыі спыніўся — Зімніцкі, значыцца, зняў заслон. І ён, і Калечыц, і Голуб дарогу тут ведаюць, з закрытымі вачмі пройдуць!.. Слаўна, дужа ж слаўна яны маслазавод сёння распатранілі. Толькі ж нешта слаба ён гарыць. Атухаць пачаў ці атушылі? Не, гэта па нізіне яны едуць, таму і здаецца, што агонь паменшаў — дрэвы затуляюць.

Фурманка пачала каціцца цішэй — гравійка паката ўзлязала на пагорак, і Захар саскочыў на дол.

— Чаго не сядзіцца? — спытаў Яштокін.

— Едзеш, дык усё дугаецца перад вачыма. А калі ідзеш, дык нейк спакайней — заўсёды да бою гатовы.

— У-у, добра гарыць... Бы той штабок у Шлыкавай хаце. Колькі часу мінула, а мне тое зарыва помніцца...

— Між іншым, чаго я сёння Шлыка не бачыў?

— Паехаў жа... Ён мяне ўчора па абедзе прасіў. Неабходна, кажа, да сваіх падскочыць. На дваццаць чатыры гадзіны.

— Учора ж ён ранкам са мною гаманіў. Але пра гэта — каб табе слоўца!

— Не схацеў, мабыць,назаляць...

Яму, Захару, Шлык не схацеў назаляць? Нешта новае гэта. Ці, можа, Яштокін не гаворыць усяе праўды? Але чаму? Якая яму выгода ці разлік?

— Проста шукаў, думаецца, дабрэйшага чалавека, які зразумее яго і ўсё дазволіць,— прамовіў Захар, выклікаючы Яштокіна на шчырасць.— І ты, ведама ж, дазволіў?

— Ляжаў ужо гэты дазвол у кішэні яго.

— Юрша пастараўся, здагадваюся.

— Ён.

Спакойны тон Яштокіна абурыў Захара. Гэта ўжо як выклік нейкі. Як бы знарок. І дзе знайшоў месца пра ўсё гэта Захару паведамляць! Нібыта ўвесь час нешта знецца давесці, але ходзіць вакол галоўнага, не адважваецца сказаць у вочы. Незразумелая нейкая дыпламатыя!

— Знайшліся добразычліўцы, — хмыкнуў Захар.— Гэта ж хутка дажывем да таго, што ўвесь атрад разбрыдзецца па цёплых гняздзечках. Адзін — да цешчы. Другі — да жонкі. Трэці — у прымы. Во каб такую вайну: з сенцаў дубальтовачку высунуў, пальнуў абойму і заваліўся на печ да раніцы.

— Жорсткі ты нейкі робішся, Елісеевіч. Прабач за шчырасць.

— Жорсткі?

— Ну, можа, не тое слова.

— Слова? Ты мне факты давай. І сэнс іх.

— Сэнс? Я над сэнсам галавы не ламаў, ведаеш...

Нешта дужа знаёмае было ў гаворцы, і раптам Захар убачыў сябе не тут, на начной дарозе, а там, ля ручая, далёка ад гэтай нізіны, далёка ад гэтай ночы,— убачыў сябе ў час гаворкі з Ціханам. Гэта ж ён, Захар, папракаў Ціхана за жорсткасць, за патрабавальнасць і рэзкасць, якія яго тады ашаламілі. Цяпер папракаюць яго, Захара.

І хто? Яштокін! Чалавек, які з першага дня існавання атрада патрабаваў ад усіх дысцыпліны і здзіўляў гэтым Захара! Папракае чалавек, які сам толькі што крычаў на Санько і Калечыца, патрабаваў увішнасці, падспешваў, і кожнае слова яго гучала гнеўна! Папракае чалавек, якога Захар нядаўна спрабаваў утаймаваць, прасіў не націскаць на людзей без патрэбы!

— Над сэнсам галавы не ламаў, кажаш?.. Дык навошта ж тады бязглуздзіцу чаўпеш? У чым яна, гэтая мая жорсткасць? Даўно ты заўважыў гэтыя мае заганы?

— Якія табе заганы? — са здзіўленнем прамовіў Яштокін.— Я зусім не пра тое кажу...

— Вось таму я і ціспу. Факты мне давай. Мне галоўнае — да сэнсу дабрацца.

— Можа, у лагеры пагаворым?

— А як хочаш. Можам і ў лагеры,— пагадзіўся Захар і тут жа злавіў сябе на тым, што аніяк не хоча спрачацца з Яштокіным, не хоча даводзіць яму сваю думку. Ён пачынаў ужо і злавацць, што гэтую нязгоду без пары выказаў, як бы даў Яштокіну час праверыць правільнасць сваіх папрокаў. Раздражнёнасць ад гэтага мацнела, крэсліла добры настрой, з якім ён пахаджваў па падворку маслазавода.

Ад напружання ў скронях пачалося знаёмае бомканне, быццам раптоўна і моцна запульсавала кроў у адной толькі кропцы, вакол якой была халодная пустэча. Дзіўна ўсё ж: чаму Шлык не сказаў яму, Захару, што хоча паехаць на дзень-другі да сям'і? Жонка яго ў сястры жыве, у Марозах, здаецца. Гэта ж зусім непадалёк. Хіба ж ён, Захар, запярэчыў бы, не пусціў Шлыка, каб ён памог дома? Адпускаў жа, здаецца, ён яго вясною. Так, адпускаў. Адпусціў бы і зараз, бульбу хай бы абгапяў. Але ж вось не папрасіў яго, Захара. Відаць, не спадзяваўся атрымаць дазвол. Да гэтага міратворцы Юршы кінуўся. Нават «стыліст» гэты ў іх ужо чулы, аказваецца, памяркоўны, здольны і падтрымаць чалавека, паспачуваць. А ён, Захар, значыцца, жорсткі, адзін патрабуе жалезнай дысцыпліны, для ўсіх зацяты празмерна! Моташна неяк на душы ад гэтага.

— Хто ідзе? Пароль?

— Дзвіна,— таропка і ўладна адказаў Яштокін.— Што ў вас? Дзе Зімніцкі? З вамі?

— Яны ўсе ля фурманкі. Камроты іх паклікаў. Загадаў — прывал.

— Другой роты не чуваць?

— Пакуль што не чутно. Паслалі туды аддзяленне, на выпадак чаго. Але ж каб табе стрэл адкуль за ўсю ноч.

— Разумна зрабіў,— сказаў Яштокін, і голас яго прагучаў няпэўна.— Трэба нашу фурманку разгрузіць...

Ён як бы чакаў ухвалы з боку Захара, але Захар маўчаў, углядаўся ў абрысы самалёта, які віднеўся справа ад дарогі на нізкім пагорку. Хадзіла пагудка, што на гэты пагорак, акаймаваны з трох бакоў старымі тарфянымі копанкамі, якія густа параслі бярэзнікам і вербалозамі, зваліліся два самалёты. Адзін наш, які быў збіты ў першыя дні вайны. Другі — фашысцкі, і быў ён збіты не ў паветраным баі, а значна пазней, калі фронт адкаціўся далёка на ўсход: самалёт, нібыта, ляцеў дужа нізка, і нехта жарнуў па ім з вінтоўкі, і ён зваліўся. Першы самалёт, наш, нібыта гарэў, падаў з вялікай вышыні, зваліўся ў самую вялікую і глыбокую копанку і знік у ёй. Другі ж, фашысцкі, урэзаўся ў тарфяны бераг копанкі побач з дарогай, і хвост яго застаўся тырчаць над маладым бярэзнікам, бы нейкі дзіўны помнік. Фашысты спрабавалі выцягнуць свой самалёт, але кінулі гэты занятак, бо па тарфяной нізіне аніякія іх машыны не маглі прабіцца; забралі яны толькі крылы, якія адваліліся ад удару. Расправіліся з самалётам хлапчукі з навакольных вёсак, якія пасвілі за копанкамі кароў. Казалі, што нібыта яны і жарнулі тады па самалёту. І паабдзіралі, паадвінчвалі з самалёта ўсё, што паддалося іх рукам. Пакінулі толькі хвост, да якога падабрацца не здолелі, і цяпер ён тырчыць, добра відзён і ўначы нават.

Сюды, на скрыжаванне палявых дарог, павінны былі выйсці пасля выканання задання роты а другой гадзіне ночы. А ўжо на трэцюю павярнула, днець зараз пачне. Але ад Юршы нічога не чуваць. Можа, яны зблыталі дарогі? На гэтай, што верне ў лазнякі і пятляе ля копанак, дужа лёгка павярнуць не туды, куды трэба. Але ж гэта выключана. Ва ўсякім выпадку стаяць і чакаць тут усім няма патрэбы. Яштокін правільна замысліў: гэтую фурманку разгрузіць, пакінуць тут, а астатнія адправіць у лагер. Бялоў там нешта не пагаджаецца, нешта даводзіць. Але Яштокін цыкнуў на іх, загадвае разгружаць хутчэй.

— Правільна,— ухваліў Захар тое, што рабіў Яштокін.— Ты вядзі ўсіх у лагер. А я застануся тут. Дачакаюся, пакуль падыдзе Юрша.

— А хто з табою? — Яштокін адразу пагадзіўся, аніяк не запярэчыў Захару, нават як бы спяшаўся ўсё зрабіць у адпаведнасці з яго жаданнем.

— Санько і Голуб застануцца. І яшчэ — Бялоў.

— Каня зрушым з дарогі, на ўсялякі выпадак,— сказаў Санько.— Зірні, Голуб, ці гразка там?

— Як старую гравійку пяройдзем, пашлю разведку на той бок копанак. Можа, там яны пайшлі. І хлопцы сюды потым выве́рнуць.

— Сюды хай не ідуць,— сказаў Захар.— Мы тут як дома, лічы. А па-другое, пакуль яны сюды павернуць — сонца ўжо будзе. Рухайся, рухайся. Не цягні.

Бялоў, стаўшы побач з Захарам, прапанаваў:

— Я наперад пайду. Паслухаю — ці ідуць.

— Толькі недалёка. Дзе копанкі канчаюцца — назад павернеш...

Дарога, шчыльна атуленая драбналессем, была мяккая, тарфяная, і парыпванне колаў зглухла, аціхла. Запанавала цішыня. Памоўклі Санько і Голуб. І Захар, крыху пагадзя, седзячы на мяккай купіне, учуў, як спачатку адзін, а потым другі пачалі салодка пахропваць. Здзіўлены, ён узняўся і асцярожна наблізіўся да фурманкі. Паснулі?! Так, спяць! Скручаныя на фурманцы постаці былі падобныя на шэрыя мяхі, пакладзеныя шчыльна, але няроўна. А крэсла не перагрузілі, тут пакінулі, неяк яно скасабочылася, як вось-вось заваліцца. Жалезныя нервы, аднак, у хлопцаў. Гэта — «жалезныя нервы» — некалі казалі пра Ціхана. Дзе ён у гэтую ноч? Магчыма, з кімсьці яшчэ гамоніць гэтак жа сурова, як гамаціў тады з ім, Захарам. Як ён тады падкрэслена мыў у ручаі падкаўнерык: я, маўляў, падкаўнерык не цярплю брудны, а ў цябе і кашуля завэдзганая, і бінт на шыі брудны, бы ануча...

Захар, прыгадваючы апошнюю гаворку з Ціханам, у розных дробязях цяпер знаходзіў новы і вельмі важны сэнс. Справядлівай была тая суровасць Ціхана, бо не абысціся без яе. І яна, гэтая справядлівасць, што мяжуе з самай звычайнай жорсткасцю, перадалася ад Ціхана, відаць, і яму, і ён вярнуўся ў атрад ужо не тым чалавекам, якім быў раней. Магчыма, гэта і заўважыў Яштокін? Дзіўна, як усё можа мяняцца ў адносінах паміж людзьмі! Цяпер ужо не ён, Захар, папракае Яштокіна ў празмернай патрабавальнасці, а яго, Захара, папракаюць. Ён дзейнічае ў адпаведнасці з Майскім загадам Вярхоў-

нага. У адпаведнасці з тым, што патрабаваў і Ціхан! Але ён, Захар, і сам не са ўсімі словамі Ціхана пагаджаўся. Больш таго, нават неяк хваравіта ўспрымаў папрокі...

«Як ломіць руку. Сагнуў яе нязручна...»

Захар лёг на спіну, закінуў рукі за галаў. У небе скупа і мігатліва трымцелі дробныя зоркі. Дзіўнае неба, не чорнае, а нейкае бляклае, як крыху падбеленае. Знайшоў з чаго дзівіцца! Яшчэ ж крыху — пачне днець, вунь ужо і ліловасць на даляглядзе. Не, гэта ў тым баку, дзе маслазавод. А сонца ўзыходзіць зусім у іншым кірунку, прыблізна вось у тым баку, дзе чарнеюць над копанкамі вербалозы. Але ж там аніякага знаку на світанак не відаць — неба цёмнае. Падобна, што хмары ў тым баку груваецяцца. І расы зусім не чуваць.

Ён паварушыў рукою па траве ля галавы — суха, ані кропелькі расы: дождж, мабыць, удзень пойдзе. А як жа моцна пахропваюць гэтыя жартаўнікі! Нарагаталіся, прытаміліся і адразу ж, як толькі расцягнуліся на фурманцы, тут жа і заснулі. А яму спаць не хочацца, муляе шыю цвёрды і колкі багун, храбусціць ад кожнага руху. А тарфянік дужа цёплы, як угрэты...

А вунь і Бялоў вяртаецца. Вунь ужо, на краёчку дарогі, яго постаць. Гэта добра, што паслаў Бялова насустрач Юршу — неяк спакайней сябе пачуваеш, калі ведаеш, што наперадзе твае людзі. Бялоў апошнім часам зрабіўся нейкі маўклівы, замкнёны. Можа, ён пакрыўдзіўся, што Дамарад, яго былы падначалены, прызначаны камандаваць ротаю? Памяняліся — гэтак атрымліваецца! — яны месцамі: дырэктар у свайго былога брыгадзіра пад камандаю ходзіць. Але ж Дамарад — малодшы лейтэнант, гэтак жа, як і Пажога, паўтара месяца на спецыяльных зборах быў. І ён, Захар, правільна зрабіў, што гэтак вырашыў. І хай Бялоў — калі гэта так, як Захар думае,— самалюбства адкіне. Лёгка, аднак, як ты разважаеш пра лёс другіх людзей! А сам? Вось даведаўся, што Шлык прасіў дазволу ў Юршы, цябе абышоўшы, і ты ўжо ўзгарэўся. Не самалюбства хіба? І як твая пыха закіпела, як павярнулася — Яштокін адразу зрабіўся табе непрыемны. А ён, між іншым, чалавек прамы, кругаля даваць не будзе: што ёсць на душы, тое і скажа. І табе варта, о-ёй як варта паразважаць над словамі Яштокіна пра жорсткасць, пра той сэнс, над якім ён, як прызнаўся, галавы не ламаў. А табе — давядзецца.

— Нічога не чутно? — спытаў Захар, калі Бялоў стаў побач.— Ты прайшоў да апошняй копанкі?

— Яшчэ і далей. Ціха.

— Магчыма, напрамкі рушылі праз поле? Але тады ручаіну тую ім адольваць. І дамаўляліся ж, што дарогаю ісці.

— Вы не хвалюйцеся, таварыш камандзір. Статак вялікі, з таго, думаю, і позняцца. Ноччу кароў кепска гнаць. Яны цемры баяцца,— Бялоў прысеў побач з Захарам, потым сагнуўся, прыклаў вуха да зямлі і тут жа ўсхапіўся.— Падобна, што чуваць.

— Што там чуваць? — гукнуў з фурманкі Санько сантлівым голасам.— Таварыш камандзір узвода! Што там вашыя чуйныя вушы ўлавілі?

Бялоў не адказаў, зноў прыткнуўся шчакою да зямлі, потым павярнуў галаву, паслухаў другім вухам, выгукнуў упэўнена:

— Нашы! Да зямлі, да зямлі вуха прыкладзіце. Чуеце?

Захар прыціснуўся шчакою да зямлі,— у нос ударыў моцны і знаёмы пах багуну, тонкае і калянае лісце заказытала вуха. Ён паслухаў другім вухам і зноў пачуў бясконцае калянае шурханне. Багун гэта казыча вуха, ці што? Не, тупаценне, глухое і густое, як хваля коціцца. Статак! Статак гэта па дарозе гоняць!

Санько і Голуб таксама адразу падхапіліся, як і не спалі зусім, вывернулі фурманку на дарогу.

— Урэшце! Кароўкі нашы тупаюць,— узрадавана абвясціў Санько.— Я іх даўно ўчуў!

— Вы ж спалі! Ды шчэ і пахропвалі! — падзівіўся Захар.— А кажаш, што чуў.

— Адно вуха спала,— сказаў Санько.— А другое — слухала. Наш камандзір гэтага і патрабуе: спаць — спі, а ўсё, што робіцца наўкола, чуць павінен. У мяне ўжо звычка: у сне чую яшчэ лепей.

— А цяпер што чуеш?

— Крокі. Смех. Гайдаш нечага смяецца...

Санько і Голуб пабеглі на галасы, якія цяпер былі ўжо зусім выразныя. Захар жа не рухаўся з месца, чакаў, усхваляваны і ўзрадаваны. Значыцца, не памыліўся ён, паверыўшы ў ноч удачы! Удача, напэўна ж! Каб было інакш, дык не смяяліся б яны там, гэтак не гамонілі весела. І вось — Юршаў голас:

— Елісеевіч! Ты дзе? Выходзь з засады!

— Іду!

— А-а... Вось ты дзе! Зручнае месцейка падшукаў!

Юрша, дурэючы, схапіў Захара ў абдымкі, пакруціў, як спрабаваў узняць, адарваць ад зямлі.

— А што, няма сілы! — пажартаваў Захар.

— У-у, ты ж нават пацяжэў ад масла! Масліца бухаеш у кашу не шкадуючы, з таго гэткі і гладзенькі!

— Але ж і ты разбагацеў — гэткі статак маеш. Як прайшло ўсё? Ціха абышлося?

— Цішэй нават і быць не можа! Нават засады ў нізіне не было.

— Спалохаліся,— прамовіў, наблізіўшыся, Дамарад.— Дачуліся, што другая рота ідзе — адразу і пахаваліся.

Захар моцна пляснуў Дамарада па плячы:

— З перамогаю цябе, камандзір! Будзе ім у знакі ночка. Ранкам спахопяцца.

— Хай шукаюць ветру ў полі, як спахопяцца,— і раптам, заўважыўшы, што рух калоны замарудзіўся, сказаў незадаволена: — Што яны там перастраіваюцца?

— Бяжы туды! Глядзі там,— сказаў Юрша і дадаў Захару ўжо, быццам і дагэтуль вёў размову толькі з ім: — Удачлівая ночка ў нас з табою. Даўно не было гэткай.

— Гэта ўжо так: калі пашло шчасціць, дык скрозь тады шанцуе...

— Кандрату тут трэба сказаць дзякуй. Дужа дапамог яго фрэнчык з нарукаўнікам,— і Юрша засмяяўся.— Пайшла па-ацеха, як Грабко фрэнчык надзеў. Ён вартаўніку і апамятацца не даў. Які табе, маўляў, дакумент, доўбня! У Берлін кароў адпраўляем. Фюрэр баль наладжвае, перамогу святкуе! Вартаўнік адразу тады — ключы на стол.

— Ванда ж і казала, што ў іх там усё на замках.

— А тое, што тэлефон у вартаўніка — не ведала.

— І Кандрат не ведаў?

— Не ведаў. Але заўважыў — от жа дзед з галавой! — дрот ля акна. Гэтага дроту, кажа, не было на тым тыдні, не бачыў. Мы тоі дрот адразу і чыкнулі.

— Што яшчэ перадавала Ванда?

Юрша неяк стрымана і шматзначна засмяяўся:

— Не вельмі і нагаманілі. Яе адразу Файзуло згроб.

— Нешта я не чую яго галасочка.

— Застаўся там,— Юрша зрабіў знак рукою за спіну.— Тым краем пайшлі. Файзуло прасіў: з сонцам у лагеры буду. Я і дазволіў...

І гэтае «я і дазволіў» балюча шкрабанула самалюбства. Захар ведаў, разумеў, што аніякіх падстаў не мае на тое, каб у нечым папракнуць Юршу, і, разам з тым, зноў, як нядаўна ў размове з Яштокіным, узвілася ў душы непамысная, паганае адчуванне таго, што ў атрадзе нешта робіцца такое, пра што ён, камандзір, даведваецца ў апошнюю чаргу.

— Ты ўсім усё дазваляеш,— прамовіў Захар, стрымліваючыся і шкадуючы, што вось ён змушаны казаць Юршу непрыемнае.— Хутка ўвесь атрад па хатах распусціш,— і дадаў ужо Дамараду, які зноў наблізіўся да іх: — Чаго спыняемся? Рухацца...

— Там, на паваротку, фурманка адна загрузла.

— Дык бярыце людзей і выцягвайце,— і гукнуў Санько, які з'явіўся на дарозе: — А ты чаго? Таксама наперад! Я пешкі пайду...

Захар ішоў разам з Юршам па ўзбочыне, і яны хутка абагналі статак. Наперадзе рухаліся фурманкі. Чуліся ажыўленыя галасы. Але Захар не вельмі да іх прыслухоўваўся. Ён быў настроены на працяг размовы з Юршам, чакаў рэзкіх, якіх-небудзь нядобразычлівых слоў, крыўды, і быў здзіўлены, калі пачуў, як Юрша, ціха ўздыхнуўшы, папрасіў памяркоўна і па-сяброўску:

— Ты, Елісеевіч, даруй мне. Але не папрокамі нам трэба займацца, а — радавацца. І — штодня. Атрад моц набірае. І зірні, якое багацце за намі тупае! Сорак жа шэсць галоў — падлічылі дакладна...

— Ванда, значыцца, памылілася? Яна ж нам паведаміла, што іх там больш.

— Дзесяць кароў пагрузілі на машыны і павезлі ў Віцебск. І штодня па дзве — пад нож, у шпіталі вязуць. Ванда кажа, што параненых поўны шпіталь. І яшчэ новы адкрылі, у былым будынку Чырвонай Арміі — для афіцэраў спецыяльна. Параненыя там з-пад Ленінграда. Але ўчора прывезлі і аднекуль з поўдня.

— Нават адтуль?

— Уяўляеш, што робіцца, калі адтуль сюды вязуць? Там, паблізу, месца ўжо, мабыць, не хапае.

— Чуеш? Зноў, здаецца, Санько нешта мудрагеліць. Спяваць пачалі...

Захар, як і Юрша, пачуўшы наперадзе не вельмі гучны, але выразны голас Санько, пачаў услухоўвацца, нават паскорыў хаду, каб наблізіцца, пачуць словы; ён пачуў іх, і яны, гэтыя словы, яго збянтэжылі.

Идет Катюша рано,
С похмелья вся дрожит;
На ней рубаха рвана
И правый глаз подбит...

Санько кінуў спяваць, і тады пачуўся смех Гайдаш. Яна смялялася шчасліва, даверліва і добра, і гэты смех перабіў голас Санько, які, нібыта перадыхнуўшы, загучаў з новай сілаю і выразнасцю і ажно дрыжаў ад радаснай узнёсласці:

Катя, Катюша! Купеческая дочь,
Где ж ты гуляла сегодняшнюю ночь?..

На міг аціхла ўсё, і гэтае запытанне як бы завісла ў паветры. І раптам з надрывам, з ціхім подсвістам, падхоплены мужчынскімі галасамі і голасам Гайдаш, узляцеў у неба не вельмі гучны, але з робленым вясёлым аханнем і размахам, песенны паўтор:

А-ах, Катя! Катюша! Купе-е-ческа-а-а-ая дочь!
А-ах, с кем ты гуляла сегодняшнюю ночь?..

Голас Гайдаш — выразны і чысты — звонкай нотаю, як бы ішоў наперадзе суладнага, зладжанага хору мужчынскіх галасоў, і сярод іх вылучаўся голас Санько.

Нечакана і моцна, невядома, з якое прычыны, у Захара заныла сэрца. Зрабілася моташна і крыўдна. Смяюцца, спяваюць, весяляцца... А ён, Захар, брыдзе, абцяжараны непамыснасцю, якая засталася ў сэрцы пасля размовы з Яштокіным, усяляк спрабуе заціснуць закрануты Юршам самалюбства. Ты вось нядаўна трывожыўся — гэткая горкая думка заявілася нечакана і неспадзеўкі! — і непакоіўся, што Гайдаш пайшла з ротаю на адказнае заданне, што будзе побач з бядою, што куля не разбірае, каго ўдарыць... А яна вось смяецца, дзярэ горла... Дурная ж нейкая песня, а ім — весела. І ёй — у першую чаргу. Заваліліся ў фурманку і коцяць. Равуць, быццам перапіліся...

— Ну, як табе падабаецца гэтае воінства? — спытаў Захар, паўтарыўшы нядаўнія словы Яштокіна. І менавіта гэтая думка пра тое, што ён паўтарыў словы, якія настроілі яго тады прымірэнча, выклікала ў душы гнеўны выбух.— Дамарад! — гукнуў ён голасна і паўтарыў строга і жорстка: — Дамарад! Да мяне!

Дамарад падбег, далажыў, весела хакаючы:

— Слухаю, таварыш камандзір.

— Што вы там робіце? — і, здагадаўшыся, што і сам

камандзір роты ўдзельнічаў у тым несенным гармідары, дадаў: — Сняваем? Было ж загадана рухацца ціха.

— Дак жа ж у лес уваходзім. Чаго ж не павесяліцца? Настрой у людзей слаўны.

— Песню адставіць. У лагеры наспяваюць...

Дамарад казырнуў:

— Слухаю...

Сказаў і як растаў у світальнай цемры, якая тут, у лесе, раптоўна нагусцела. Юрша пацягнуў Захара да сасны, надалей ад вузкай лясной дарогі, па якой рухаўся статак:

— Пачакай, прапусцім статак. Каб не піхнула каторая ў цемры рагамі.

— Не піхнуць. Яны — разумныя. Бачыш, як ідуць? Не равуць, не штурхаюцца, ці-іхенька тупаюць, як ведаюць, што гэтак трэба...

— Каровак раздамо па вёсках. У першую чаргу чырвонаармейскім сем'ям дапаможам. І партызанскім. І ў нас — база магутная. Няхай фашыст пасядзіць без малачка і масліца...— прамовіў Юрша, і голас яго быў парапейшаму добразычлівы, задаволены.

— Што, у іх толькі гэтыя кароўнікі і былі?

— Не, ведама ж. Але ночка ў нас слаўная...

Захар не адказаў Юршу. Да прыкрага адчування, што давялося аддаць загад камандзіру другой роты, цяпер дадалася і непамыснасць ад нейкай падкрэсленай, як бы робленай радасці Юршы, ад яго абыякавасці да гэтых спеваў па фурманцы наперадзе. Знарок ён падкрэслівае гэтую сваю радасць? Відаць, знарок. «Але не папрокамі нам трэба займацца...» Вось і хоча цяпер неяк змякчыць гэты свой павучальны тон. Ды не, глупства гэта! Ён сапраўды ўзрушаны тым, што з-пад самага, як гаворыцца, носа ў ворага выхапілі яны гэты статак, разбурылі сепаратарны пункт, пусцілі па дым маслазавод!.. Ёсць з чаго і парадавацца. А яшчэ калі пад Боркавічамі Харэўскі спаліць мост... І гэта — у адну ноч! Вялікая пагудка пакоціцца наўкола: ды скрозь жа тут партызаны! У кожным куточку!

У шэрым перадранішнім змроку, які пачынаў увачавідкі радзець, было бачна, што каровы не разбрыдаліся, рухаліся шчыльна. Зрэдку суха тукаліся рагамі.

Захар пачуў вясёлую гамапу ззаду, ад фурманак, якія рухаліся ўслед за статкам, і прыслухаўся. Санько гамоніць? Як ён тут цяпер апынуўся? Але ж яго, здаецца,

голас. Так, яго! І пейкі жаночы галасок... Э, гэта ж ён свой голас пад жаночы падрабляе! То сваім, то жаночым галасам выводзіць...

«Але-е! Хто гэта гаворыць? Партызаны? А хто канкрэтна? А-а... Калечыц!.. Гэта я, твая галубка».

«А чаго ты так ціха гаворыш?»

«Камендант спіць. Баюся пабудзіць».

«Хай спіць. А ты, галубка, лупі сюды, на ганак маслазавода. Я чакаю, ажна гарыць ува мне».

«А што рабіць на гэтым ганку?»

«На гэтым ганку — пасядзім да ранку. Масліца зробім. Каменданту на фрыштык якраз. Любіць ён масла рускае?»

«А ён без яго жыць не можа. Дужа любіць!»

«Тады — дулю яму!»

«Дулю ён не зможа зжаваць, бо на зубы слабенькі».

«А мы яе квасам Давідавым змочым. Вось і праглыне!»

Раскаціста і дружна выбухнуў вясёлы рогат, як бы ўзляцеў на новую, самую высокую хвалю. Захар не хацеў смяяцца, ён стрымліваў сябе, усяляк праціўіўся, але губы яго міжвольна расціснуліся, і ён зарагатаў разам з усімі. Ён рагатаў упершыню за гэтую вясну, рагатаў уголас, і ўсе ранейшыя змрочныя думкі адляталі, саступаючы месца радасці, што паціху ажывала ў душы. Радасць, аказваецца, ёсць, яна заўжды жыве побач з табою. Трэба толькі заўважыць яе, зразумець, адкрыць ёй сэрца, адкрыць вось гэтак, як робяць тое Санько і Голуб, як Юрша і Калечыц...

«Чалавек толькі тады і моцны...»

Высновa была не новая. Але цяпер яна вымагала ад яго пэўнага стаўлення да свайго мінулага, і ён яшчэ не ведаў, ці здолее ўзняцца над сваёй асабістай тугой і скрухай, не ведаў, хоць і разумеў, што і не павінен і не зможа хутка перайначыць сябе — смех толькі маленькая слабасць, спроба прымусіць закрэсліць бяду, якая жыве ў душы і дужа доўга будзе жыць; ён, смеючыся разам з усімі, нечакана падумаў, што не мае права нават на маленечкую радасць, і са здзіўленнем заўважыў, што ранейшыя змрочныя думкі толькі на нейкі міг саступілі месца радасці і цяпер, быццам агледзеўшыся, зноў уладарна займаюць сваё звычайнае і звыклае месца ў сэрцы.

## 9

*Блакнот Ромеля. Старонка другая.*

«Тое, што робіць фюрэр зараз, трэба было рабіць летась. Там, на поўдні, і ўвосень сухія дарогі, чыстае неба — удача чакала нас там. А мы пайшлі па дрыгве, улезлі ў золь, туманы, снягі...

Але ж не вернеш стралу, якая пачала свой лёт. І ніхто ўжо не верне стралу нашага лёсу — імчыць яна туды, дзе зломіцца. Па начах мне блага спіцца, і я добра бачу і разумею лёт стралы нашага лёсу. Мы грузнем усё глыбей, залязаем усё далей, пакідаючы адкрытым свой левы бок. А ў левым баку — сэрца.

На будаўніцтве зямлянак заслужыў падзяку Шлыка — спадабалася яму, як вязаў вуглы: пасля вайны, маўляў, у маёй хаце вуглы гэтак жа звяжаш, праз цябе і твой штаб яна дымам пайшла — вось ты мне яе і адбудуеш. Я пагадзіўся: зраблю гэта з ахвотаю, зраблю старанна, збудую яшчэ лепшую, чым была. І тады адразу нешта жахлівае, звераватае ў яго позірку, вочы як у шалёнага: мне лепей, крычаў, не трэба! Гэткая, як была, патрэбна!

Тое, што адбываецца на поўдні, прыкмячаю, іх не хвалюе. Яны вераць толькі ў тое, што вакол іх. А я — губляю веру.

Вера, выяўляецца, знікае не адразу. Вера знікае па крупінках, і чалавек губляе сябе таксама не адразу цалкам — па драбнічках. Але тады — ён лёгкая здабыча смерці. Хто не скарыўся — той верыць, і смерць над вераю не ўладарна.

Калі ў чалавека ёсць вера, дык ён і памірае лёгка. Не, лёгкай смерці, мабыць, не існуе».

## 10

Мураваць комін узяліся апоўдні, і Загурскі працаваў як апантаны, ён быццам сіліўся нагнаць усё тое, што можна было зрабіць за гэтыя тры тыдні, якія мінулі пасля таго, як ён даў абяцанне Захару прыйсці ў лагер. Паляжаў тады, угрэўшыся, на халоднай зямлі, і скруціла хвароба, і вось толькі цяпер узяўся за працу.

Печ меліся завяршыць учора на адвячорку — Загурскі на гэта прыцэліўся, каб ранкам перайсці на другую

зямлянку. І вось зноў — як хто знарок шкодзіць — пяўправа: гліна ў яміне наплыла, залітая ноччу дажджом, і давялося цягаць жвір і нанава замешваць раствор. Потым зноў хвастанула залева, і добрыя дзве гадзіны давялося рабіць тое, што зусім не было прадугледжана: засыпаць зямлёю дах, ратаваць ад вады мох, які высушылі і падрыхтавалі, каб засцяліць нары — амаль да полудня праваландзіліся.

Комін клалі квадратовы, на дзве з паловай цагліны: адна цагліна на рабро, а другая і паўцагэлак — тарцом. Загурскі выхопліваў у Захара цагліну за цаглінай, спрытна абстукваў кельмаю, хуценька соваў у пямецкую каску з рудой вадой і тут жа выхопліваў, плёхкаў на кладку гліны, раўнаваў, прыціскаючы яе цаглінаю, і цагліна клалася роўна. Загурскі праводзіў па ёй, бы па струне, кельмаю, цагліна звінела, і ён зухавата падміргваў:

— Ох, ох! Комін — бог. Ух, ух — мы ўдвух!.. А што, камандзір, слаўныя з нас муляры атрымаліся. Якую печачку адгрукалі!..

Чарговую цагліну ён злавіў, але тут жа і выпусціў яе, сагнуўся, як зламаўся ў паясніцы, утаропіў позірк у дол, марудна і натужна захакаў. Захар падскочыў да старога, спытаў, зазіраючы ў шэры твар, дзе-нідзе заляпаны гліняпымі пырскамі:

— Што прыключылася? Што?.. Ці не сэрца схапіла? — гукнуў Артуру, які ля парожка зямлянкі мясіў рыдлёўкаю гліну ў яміне: — Артур! Дапамажы!

— Паясніца клятая,— урэшце вымавіў Загурскі.— Зноў схапіла, каб ёй пуста было... На жывот трэба легчы. Паляжаць крыху — адпусціць,— і аддаў кельму Артуру.— Гані, сынок, далей. Я дапамагаць буду...

Ён расцягнуўся па нарах, паляжаў, потым узняў галаву, моўчкі пазіраў за тым, як Захар падводзіць комін пад столь, і, заўважыўшы, што нешта ідзе не так, як гэта ён лічыў патрэбным, параіў:

— Скокні, сынок, на дах. Зірні, ці роўны хоць камінок. Адтуль, зверху, яно лепей відно...

Прасіў стары Артура, але Захар паабяцаў, што зараз яны гэта зробяць. Ён паклікаў Артура, але дайшлі яны толькі да парожка зямлянкі — гукаў Загурскі:

— Дапамажыце выкараскацца адсюль — сам зірну на камінок. І на верасах паляжу. Калі дух верасовы — тады мне лягчэй робіцца...

Зямлянка пад пякарню збудоўвалася ў схіле пясча-

най высны, дах быў нізкі, упоравень з верасам, высокім і гэткім густым, што аж вязла нага. Загурскі, лежачы на жываце, глядзеў, нахіліўшыся, на чорнае зеўрала коміна, які зраўняўся са столлю, паварочваў галаву, як грак, з боку на бок, потым папрасіў Артура пабегчы ўніз, зірнуць з зямлянкі. А што рабіць там, ён, маўляў, закамандуе.

— Роўна. Ніdзе, думаю, не зачэпіць столь,— гукнуў Артур знізу, і голас яго прагучаў глуха, як здаля.

Загурскі патрабаваў:

— Ты калок прасунь — раўнаваць тады па ім.

— Няма тут аніякага калка!

— Эх, партызан,— Загурскі асуджальна патрос галавой.— За дзеўкамі, нябось, лётаеш, а калка ён у лесе не знойдзе!

— Да дзевак яны ў мяне ўсе майстры. Вялікія спяцы па дзеўках!

Захар зусім не асуджаў Артура, сказаў вельмі ціха і толькі на тое, каб быць на адной хвалі са старым, які ўсё больш і больш быў яму па душы. Адчуванне свае віны перад Загурскім з кожным днём адыходзіла, хавалася ўсё глыбей, апошнім жа часам і зусім не паяўлялася. Помнілася, часцей вярэдзіла сэрца зусім іншае, аніяк са старым Загурскім не звязанае — папрокі ў яго, Захаравай, чэрствасці, жорсткасці і патрабавальнасці. Праўда, у чэрствасці яго ніхто не папракаў, ён прыдумаў гэта сам, выдаўшы за гатовы папрок тыя адценні ў словах Яштокіна, якія ён сам злавіў і якія не ўдакладняў. Працягу гаворкі з Яштокіным не было, бо навалілася безліч рознага клопату, халаднаватыя ж словы пра тое, што, маўляў, у лесе пагаворым, засталіся, не зніклі, і заўсёды наводзілі на роздум. У памяці засталася меціна. Як бы жадаючы абвергнуць тое, што думаў аб ім, Захару, Яштокін,— абвергнуць не проста словам, а справаю, абвергнуць навідавоку ва ўсіх! — Захар і надумаў пайсці за памагатага да Загурскага.

Але галоўнае, што прывяло яго да працы разам з Загурскім, было зусім іншае. Штоноч людзі і першай і другой роты, не кажучы ўжо аб групе падрыўнікоў, ішлі на баявыя заданні, і ён хадзіў разам з імі. Але потым, удзень, адлежвацца ў штабной зямлянцы Захар не мог: у душы ён лічыў сябе не толькі камандзірам, але і салдатам, радавым партызанам, і гэтая думка пасля апошняй гаворкі з Ціханам яшчэ больш зацвердзілася ў яго

розуме, і ён заўжды і ва ўсім намагаўся браць на свае плечы роўна гэтулькі, колькі выпадала і кожнаму.

Мураваннем печы ён захапіўся адразу, захапіўся насапраўднаму, з цікавасцю вывучаў, як Загурскі клаў под печы, як выводзіў калены, каб добра цягнула дым. Дзівіў яго і стары, і яшчэ болей Артур, які быў ад самага пачатку прыстаўлены да старога цягаць цэглу і мясіць гліну. Артура праца таксама захапіла. А цяпер, як старым прытаміўся, дык шчыруе з усяе сілы, і ўсё ў яго атрымліваецца прыгожа і добра. Вунь з якой увішнасцю ўзяўся мураваць комін! Не толькі рухі, але і голас Загурскага сіліцца надрабіць, выстаўляе сябе вялікім майстрам. Адкуль толькі спрыт бярэцца! Адкуль сілы ў хлопца! Уночы ж сёння па спарады ездзіў. Прывезлі яны з Санько поўную фурманку, разгрузілі ля кузні, вярнуліся ў лагер і мо якую гадзіну паспалі. І адразу ж — за працу. Цяпер вось завіхаецца — люба паглядзець. Гэта ж, відаць, усім пнецца давесці, што нездарма ён у падрыўной групе. А ты, Захар, яго, між іншым, не вельмі і беражэш. Рвецца хлопец на кожнае заданне, пад агонь усюды лезе, не зважае на небяспеку — не адставаць жа ад гэтых Санькoвых хлопцаў, што як арлы паўсюль лётаюць. І Артур, па маладосці сваёй, па дурноце, можа і паляцець на бяду. Дарэмна, можа, даў ты згоду, каб быў ён у падрыўной групе. Не, не! Хочаш, каб яшчэ папракнулі і ў тым, што сваякоў сабе пад крыло пасадзіў. Памятаеш, як Ціхан тады крычаў: няма, маўляў, у мяне сваякоў! Ёсць толькі салдаты!

Артур прыцягнуў жэрдку, піхнуў яе ў дзірку на даху, Захар схапіў яе, і руку балюча разапнула — востры, абламаны, як піка, канец разадраў скуру ля левага запясця. Захар, аднак, не выпусціў жэрдку, трымаў, пакуль добра не замацавалі, і толькі тады закамандаваў уніз:

— Ха-аро-ош! Габлюй сюды. Будзем адсюль класці!

Артур ускочыў на дах, фарсіста прыстукваў кельмаю цагліны, падрабляючы ўсе рухі Загурскага, падсвістваў:

— Бух, бух! Мы — удвух! Бох, бох! Комін — здох!

Захар ціха сказаў Артуру, што нейкую нялюдскую песню ён вядзе. Але Загурскі прамовіў ухвальна:

— Лоўка, сынок, працуеш. Вучыся, вучыся... Пасля вайны кельмачка ў вялікай пашане будзе. Добры кавалак хлеба ў руках мецьмеш.

— Пасля вайны я, дзядуля, тут не буду.

— Збяжыш куды?

— Сплыву! Капітанам зраблюся. Павяду караблі. Вялікія. Морам. Вакол Зямлі.

— Гэта ж хто цябе падвучыў?

— Ніхто. Сам вырашыў. Тата мой гэта ўхваліў. Капітан — гэта добра, ён сказаў.

Загурскі прамовіў ціха, як бы паведамляў зусім не Артуру, і ўжо не глядзеў на яго, скіраваўшы свой позірк на перапэцканыя гліпай свае рукі, якія ляжалі нерухома.

— А мой Петрусёк у лётчыкі ўсё рваўся. Япачка, дык той — трактар. А гэты — самалёт, у неба, казаў, вырвуся. І прабіўся ж, паступіў. За Масквой, паблізу недзе — ён мне пісаў...

Пра старэйшага сына Загурскага Захар пачуў упершыню, і гэтая гаворка старога, ціхая, нейкая заклапочаная, як толькі сабе адрасаваная, балюча шкрабанула сэрца. Ён пачаў кідаць цэглу здаровай рукой, кідаў, цаляючы, каб яна падала бліжэй да Артура. Артур усё спяваў, звінеў кельмаю, потым гукнуў Загурскаму:

— Ну, дзядуля, верна вяду!.. На дзве цагліны яшчэ дамо, і досыць. Харош тады будзе.

— Ля столі комін добра абвядзі. Гліпаю, гліпаю. Каб цяпло ўзімку не ўцякала.

— Я ж гэта і раблю. Калі што не ў той бок загну — кажыце — я на навуку здатны. Бачыцё?

— Бачу, сынок, бачу...

Але стары, здаецца, нічога ўжо не бачыў з таго, што рабіў Артур, і не імкнуўся сачыць і назіраць за яго працаю, і нічога падказваць не збіраўся. Ён ляжаў, паклаўшы галаву на абедзве рукі, якія заглыбіліся ў верасы, быццам хаваліся ад нечага. Захар перастаў кідаць цагліны, асцярожна ступаючы па верасах, як баючыся пабудзіць старога, падносіў іх да Артура і складаў адна на адну ля нямецкай каскі з жоўтай ад гліны вадой.

— Усё,— урэшце абвясціў Артур.— Ну, хай прымае працу дзядуля.

— Ціха ты. Ён жа спіць.

— Хай спіць. І нам адпачыць не пашкодзіць. Стаміліся. А затое працу далі!

Артур расцягнуўся на верасах, раскінуў рукі, цікаваў вершаліну сасны, адкуль ліўся звонкі спеў берасцянкі. Захар прысеў ля яго непадалёк, пачаў абціраць драпіну на запясці. Краем вока ён бачыў твар Загурскага, нягале-

ны, з дробнымі нашлёпкамі рудой гліны пад вачыма і ля носа, якія падсыхалі, зрабіліся бела-жоўтыя, і шчокі ад гэтага здаваліся пярэстыя і пухірчатыя. На лбе, белым, змакрэлым ад поту, чырванела меціна ад старой чорнай фуражкі, якая была ссунута казырком над правае вуха, і гэтая меціна была падобна на старую рану, якая пяроўна загаілася.

Берасцянка спявала недзе вельмі блізенька, на ніжняй галіне сасны, і скопчыла сваю поту кароткім і гучным росчыркам, крыху счакала і зноў залілася звонка і радасна. Загурскі зварухнуў галавой, як бы высочваў нешта ў голлі, і зноў знерухомеў, дыхаў роўна, бы моцна заснуў. Але ён не спаў — вочы яго былі адкрыты і цёмныя густыя бровы, шырокія, амаль злучаныя на седлавіне пераносся, час ад часу соўгаліся, зморшчынкі ад гэтага выпаўзалі з вачніц і набягалі на лоб, і тады чырвоная палоска-меціна ад фуражкі выгіналася пакатай прыступкаю, як бы бегла да левай скроні, пад белыя, як зляжалая кудзеля, валасы.

Недзе далёка грымнулі два выбухі, Захар адчуў, як ледзь улоўна дугнуўся дах зямлянкі. Берасцянка раптоўна змоўкла і не абзывалася. Загурскі марудна сеў, абапіраючыся на рукі, якія адставіў назад, на самыя локці ў верасы, і сказаў упэўнена, быццам у яго запыталіся пра тое, што ведаў толькі ён адзін:

— За Дзвіною,— і дадаў, нібыта толькі дзеля гэтага і ўзняўся: — Ля Баравухі грымнула...

Рэха выбухаў глухла, сплывала між соснаў, і гучала яно зусім не ў баку Дзвіны, а недзе за дарогаю, што вяла на стары лагер, потым, паслабеўшы, пашырылася, пакацілася зусім у адваротным напрамку і гэтак жа раптоўна, як і загуло, ацiхла.

«Блытае стары. Дзвіна ж зусім у іншым баку...»

Захар, аднак, не запярэчыў старому, яго ўвагу прыцягнула фурманка, што бязгучна кацілася за соснамі; белы конь мільгаў за соснамі, быццам плыў у паветры.

— Багдан коціць,— сказаў Артур, гучна свіснуў і саскочыў з даху.— Гэ-э, Багдане!

Багдан таксама свіснуў, і Захар пачуў, як колы цяпер шахцяць на лясной дарозе і як мякка тупацяць капыты. Дарога — дакладней не дарога, а шырокая сцяга, па якой пачалі ездзіць на фурманках толькі цяпер, як атабарыўся тут лагер,— вярнула з-за соснаў да зямлянкі, і Багдан спыніўся. Убачыўшы, што Захар сышоў з даху

зямлянкі, ён, не выпускаючы лейцы з рукі, адрапартаваў ліха:

— Таварыш камандзір! Патроны вязу на склад. Павінен далажыць, што ў тых дотах ля чыгункі слаба дзела...

— Што, нічога няма?

— Не, ёсць, напэўна. Але ж завалена выбухам — толу не пашкадавалі, гады,— што і не прабіцца. Шэсць цынкаў толькі і выдралі. І вельмі ж пагбаныя.

— Што, усе начыста? — спытаў Захар. У залацістажоўтым святле, што прабівалася праз галіны дрэў, валасы Багдана былі бліскучаста-чорныя, з частымі ніткамі сівізны, што паблісквала, як павуцінне ўвосень. Нейкая спагада да Багдана ўпершыню зварухнулася ў сэрцы, але ён тут жа адкінуў яе, заціснуў, спытаў зноў: — Усе начыста пагбаныя?

— Тое-сёе выбраць можна...

Багдан ссунуў набок салому, пад якой у два рады, адзін на адным, ляжалі попельныя, як з белым налётам па краях, пагнутыя ў розных месцах патронныя скрынкі. Пад адной пакрыўкай, закасанай у віток, былі відаць мядзяныя гільзы патронаў. Патроны былі і ў зрэбнай бруднай торбе — Захар пазнаў гэта па носіках куль, якія прапаролі рэдкую тканіну.

— А гэтыя ў россыпу былі,— сказаў Багдан, запускаючы ў торбу руку.— Здаецца, не адсырэлі,— ён дастаў патрон, патрос яго ля вуха.— Шасціць порах. Будуць покаць.

Захар даставаў з цынка патрон за патронам, аглядаў іх, потым клаў назад. У кулямёты, вядома ж, не пойдзе аніводны. А ў карабіны і вінтоўкі, падраўнаваўшы, пойдуць, напэўна, усе да аднаго. Шэсць цынкаў — гэта набытак!

Захар убачыў, што Загурскі робіць яму знак рукою, і з патронам у руцэ асцярожна ступіў да яго на дах зямлянкі.

— Вы ля Фарынаўскіх дотаў пашукайце, — сказаў Загурскі.— Там акопы выбухам пазасыпала, як ён бамбіў. Там можна накапаць гэтых патронаў...

Ля Фарынава і доты і акопы даўно абгледзелі, усё з іх выбралі. Але Захар, каб не крыўдзіць старога, паабяцаў:

— Пашукаем, пашукаем абавязкова...

— Дзед! — гукнуў Багдан, як бы не заўважаючы,

што Захар размаўляе са старым.— Я табе, як і абяцаў, табакі вязу. Зараз засмалім...

Багдан узышоў на дах зямлянкі і тады ўбачыў Ромеля, які дыбаў па сцежцы — цягнуў на плячы кароткае бервяно.

— І гэты, корань яму ў душу, тут швэндаецца,— Багдан сплюнуў, ціха вылаяўся.— Яго ж у старым лагеры пакідалі...— Дастаў з кішэні фрэнча вялікі капшук, добра напакаваны, пузаты ад табакі, адсыпаў сабе на цыгарку, капшук жа даў Загурскаму.— Гэта табе, дзед! Я табе абяцаў капшук поўненькі аддаць? Вось і маеш. Гэта за тое, што добрыя лекі даеш.

— Дзякую. А зёлак і сёлета нарасло. Гэтага дабра я назбіраю...

— Ромель на будаўніцтве штабной зямлянкі,— запозпена адказаў Захар Багдану.

— Яшчэ добра, што штабам не кіруе,— Багдан узвінціўся, размаўляў нейк рэзка, чаго раней ніколі сабе не дазваляў у гаворцы з Захарам.— Насоліць, ей-бо, насоліць нам некалі гэты фрыц.

— Які ж ён фрыц? Калечыц дакладвае, што ў разведцы Ромель — чалавек незаменны. А Часлава казала, што ён, нібыта, цвёрда вырашыў пасля вайны нікуды не ехаць. Тут застанецца, калі жывы будзе...

Захар знарок зрабіў націск на гэтым «нікуды не ехаць», прыдаўшы пяпэўным Чэсіным словам — яна і сапраўды казала, што Ромель, нібыта, збіраецца не вяртацца дамоў, калі застанецца жывы,— цвёрдасць прадуманых і замацаваных рашэнняў.

— Іш, падла,— Багдан злосна сплюнуў.— Яшчэ і жывым хоча застацца.

— Ніхто ж не ведае, які ў яго лёс,— прамовіў Артур, і гэта яшчэ больш падкруціла Багдана, ён пачырванеў, засоп.

— На мой розум, дык усіх іх, незалежна ад лёсу, я б не адпраўляў дамоў пасля вайны,— сказаў Багдан і паглядзеў на Захара, як бы чакаючы, што той зараз з ім і пагодзіцца, падтрымае. Чакаў. Але падтрымкі не было, і ён дадаў злуючыся: — Кожнаму рыдлёўку і сякеру ў рукі. Ну, шчэ і малаток можна. Бурылі, корань вам у душу, знішчалі? Вось і адбудуйце! Толькі тады дамоў пусцім. Гэтак — перакананы — яно і адбудзецца!

Загурскі, які дагэтуль моўчкі слухаў гаворку, нечакана рэзка кінуў Багдану:

— Марная твая спадзяванка.

— Чаго гэта — марная? А-а, яны не захочуць? Дык ведама ж! Дык іх усіх пад прымусам! Усіх гэтых зава-ёўнікаў, ведама тых, што ацалеюць,— на будоўлю! Хай вось табе, дзед, у першую чаргу хату адбудуюць!

Загурскі ўпарта запярэчыў:

— На чужыя рукі спадзяванка заўсёды марная. Нашым ручкам давядзецца ўсё адбудоўваць...

Багдан шумна ўздыхнуў:

— Сапсаваў ты, дзед, увесь настрой мне. І адно табе скажу: у печах гэтых — вялікі ты спец, роўнага нідзе, можа, і няма, не знойдзецца. Але ў палітыцы — слаба зусім цяміш. Палітыка... Палітыка — гэта...— Багдан пачаў прыпальваць цыгарку, колькі разоў пстрыкаў вузкай белай запальнічкаю, ляцелі чырвона-белыя іскры з-пад маленькага колца, але агню не было. Потым у канцы белага патрончыка выбілася бледнавата-сіняе полымя, заматлялася, і Багдан сунуў туды канец цыгаркі. Прыкурыўшы, ён пусціў струмень дыму на адстаўленую далонь і, калі сінія скруткі скаціліся на пальцах і растанулі ў паветры, закончыў сваю думку заўзята: — Палітыка, дзед, гэта — ведама, калі яна правільная,— ёсць жаданне ўсяго народа. Народ наш не схацеў іхняга «новага парадку»? Не схацеў. Дзе той «новы парадак» іхні? Вось ён дзе,— зноў пусціў струмень дыму на далонь і пахукаў, разганяючы сінія скруткі.— Паплыў! Ажно і не пахне.

Багдан раптам убачыў, як Захар спрабуе заляпіць бярозавым лісцем драпіну на запясці, шчыра абурыўся:

— Што вы робіце, таварыш камандзір? Бягом у санчасць трэба. Заражэнне крыві можна схапіць.

— З гэткае драбноты? Скажаш!

— Летась, у загарадцы пад Маладзечна, адзін у нас аб дрот палец надрапаў. Ранкам. А ўвечары — усю руку разнесла. У летні час з гэтым жартачкі кепскія. Ёдам трэба заліць.

— Гаючкаю лепей ад усяго. Пашлі каго на маю сялібу,— сказаў Загурскі.— Ваша грузінка брала ў мяне. Але там поўна нарасло.

— От і зноў блытаеш, дзед. Якая ж яна грузінка? — весела сказаў Багдан.— Зусім іншай рэспублікі. Таджыкістан! Адны горы — больш нічога.

— Ты пашлі каго,— сказаў Загурскі, палічыўшы, мабыць, што не варта спрачацца з Багданам.

— Я магу па капі, таварыш камандзір. Мігам! — узгарэўся Багдан, спрабуючы адляпіць ад ніжняй губы згаслы і скручаны, як пасохлы гарохавы струк, асмалак. Адляпіў, агледзеў яго з усіх бакоў, не кінуў, аднак, сунуў у ніжнюю кішэню фрэнча: — Ці во, па фурманцы, да Кацюшы падскочыць!

— Вязі патроны,— сказаў Захар суха.— Скажы, каб нерагледзелі цынкі, а пагбаныя — адразу ў работу. А сам — сюды. Дапаможаш тут.

Захар зазлаваў. Багданава фамільярнае «да Кацюшы» выклікала варожасць. Нейкі шчаслівы лёс на жаношы» выклікала варожасць. Нейкі шчаслівы лёс на жаночую няшчоту ў гэтага прайдзісвета! Чаславу кінуў. Маўчжуда — ля боку. І кахае яго па-сапраўднаму, не тоіцца, не баіцца казаць пра свае пачуцці. Цяпер Гайдаш — ужо «Кацюша» яму! От жа ж лайдак!

Захар ішоў да зямлянкі, якая звалася шпіталем, хоць у ёй параненых не было, ішоў хутка, узвінчаны сваімі думкамі пра Багдана і Гайдаш. Жартаўлівая ласкавасць, з якой Багдан назваў яе імя, нечакана знітавалася з вясёлай песняй, якую ён пачуў у перадсвітальным змроку, калі ішоў разам з Юршам ля старых тарфяных копанак. Ажыў у душы матыў, і ён неспадзявана замармытаў сабе пад нос тыя жартоўныя словы, адчуваючы, што песня прыляпілася, жыве ў душы, і нават неяк весялей з ёю.

«А песня, між іншым, хвацкая. Адкуль толькі яе Санько выдраў?»

Ён убачыў Гайдаш — яна выйшла з зямлянкі і стаяла, чакаючы, пакуль ён падыдзе,— і набліжаўся да яе, і тая жартоўная начная песня глухла ў ім імкліва і непапраўна. Як яна глядзіць! Быццам і зазлавала, і некуды дужа спяшаецца, і бачыць перад сабою нешта непатрэбнае, зусім не вартае ўвагі.

Ён, падыходзячы да Гайдаш, падумаў, што бачыць гэты позірк упершыню, што ён новы зусім, што ў ім няма ранейшай ветлівасці і цеплыні, да якіх ён ужо вельмі прызвычаіўся; ён звязаў гэтую перамену з тым даверлівым вымаўленнем Багданам яе імя, і гэтая, створаная ім жа сувязь таго, што ён лічыў несумяшчальным і пра што нават не мог думаць раней, цяпер прымусіла яго пакутаваць востра і глыбока.

— Часлава тут? — спытаў Захар, трымаючы параненую руку ля боку, каб яе не заўважыла Гайдаш, ён ужо вырашыў, што не папросіць яе завязаць яму драпіну, што гэта зробіць Чэся.



5 Зак. 1767

— У стары лагер паехала. Перавязку Харэўскаму рабіць.

Яна прамовіла гэта адчужана, прамовіла, быццам падкрэслівала сваю неахвоту гаварыць з ім, і ён зноў згадаў ноч, калі Гайдаш весела спявала з Саньковымі хлопцамі жартоўную песню, згадаў яе смех, і зноў звязаў усё гэта з настойлівымі, але вясёлымі парадамі Багдана, і спытаў падкрэслена, даючы ёй зразумець, што яго зараз цікавіць толькі лёс параненага Харэўскага:

— Як яму сёння? Лепей?

— Блага, на жаль. Чэся баіцца, што можа і не выжыць. Трызніць усё, трызніць...

Тая ноч удачы, як яе ахрысціў тады Захар, была, як выявілася, толькі на левы бок Дзвіны. І ў той час калі першая і другая роты з багатымі трафеямі кіраваліся ў лясны лагер, Харэўскага ледзь жывога перапраўлялі на чоўне з правага берага — чарга з фашысцкага кулямёта пасекла яму абедзве нагі. Мост яны ўзарвалі, але назад адыходзілі напрамкі, не па старых слядах, і на гравійцы наляцелі на засаду.

— Не пашчасціла хлопцу,— прамовіў ён са шчырай спагадай і на нейкі міг забыўся на падрапанае запясце, і ўзняў руку, пасоўваючы фуражку далей на патыліцу.

Гайдаш хіснулася да яго, вочы яе як пабольшалі.

— Кроў?!

— Вытворчая траўма,— пажартаваў ён і адчуў непамыснасць і згрызоту. Людзі ходзяць на баявыя заданні, рызыкуюць жыццём, пакутуюць ад ран... А ён? Швэндаецца з нейкай драпінай, заробленай па мураванні печы!

— Ну, ну! Паказвай сюды!

Голас Гайдаш прагучаў устрывожана, і ў вачах не было адчужанасці, і ўся яна страпянулася, змянілася з твару — чырвоныя плямы густа ляглі на шчоках і на шыі ля каўнерыка сіняй кофты, і гэты яе шчыры сполах яго абяззброіў.

— Каб ёду ды бінту... Сам і завязаў бы.

— Усе вы гэткія ўмекі. Кроў жа з брудам запяклася... Не чапайце! — як не крыкнула яна, калі ён пачаў аддзіраць бярозавыя лісцікі.— Нельга бруднымі рукамі! Зараз усё зробім як след!

Яго развесяліла і гэтая патрабавальнасць, і тая ўвішнасць, з якой яна мітнулася ў зямлянку і адкуль адразу ж і выбегла, несучы аберуч старую брызентавую сумку ад процівагаза.

Паставіўшы сумку на закладзены дзярнінаю бруствер ля ўваходу ў зямлянку, Гайдаш папоркалася ў ёй і выцягнула вузенькі скрутак бінту і бутэлечку з чорнай, як дзёгаць, вадкасцю.

— Памыем зараз рану,— паабяцала яна спагадліва.— Тады завяжам. І не глядзіце гэтак падазрона,— сказала, трасучы ў руцэ бутэлечку.— Гэта не ёд. Гэта тое, што ў нас упрошваюць і вымольваюць.

— Спірцік? — словы павярнуліся непатрэбныя, зусім не тыя, якія б яму хацелася сказаць, і ён, гэта добра разумеючы, усё ж прамовіў, лаячы сябе ў душы за паводзіны, якія лічыў не да твару яму, камандзіру атрада.— Дык яго ж лепей у нутро прымаць.

— Уга! Ахвотнічкаў у нутро прымаць ёсць, не адбіцца. Нават не палохае іх, што ён жа чорны, бы зямля. Уведалі ўжо: чорны ён ад зёлак, яго і піць карысна, і раны ён гоіць добра. Але я з імі проста: няма! І — кропка!

— А спірт які! З горада? Той, што Ванда прыслала? — папытаў Захар, хоць здагадваўся, што гэта, відаць, той спірт і ёсць, які прынёс ад Ванды Фаїзуло.

— Не, таго ўжо даўно няма. Гэта ў гаспадарнікаў вымаліла.

— Трэба было проста сказаць. А не выпрошваць.

— Ім скажаш. Гэтак адразу і паслухаюцца!

Яна глядзела на запясце, асцярожна абцірала скуру вакол драпіны, якая цяпер выдавала нейкай шырокай і чорнай. Потым узялася закручваць бінт, схілілася, і ён убачыў яе валасы, сцягнутыя светлай блакітнай стужкаю на патыліцы, бачыў выцвілую на плячах кофту, якая была ля правага пляча ў трох месцах зацыравана чорнымі ніткамі і зацыравана яшчэ па баках ля кішэньчыкаў. У гэтай кофце яна была і летась на полі ля горада, калі далягляд крывавіла барвовае полымя пажару. У нейкіх дзіўных месцах кофта падралася. На локцях, звычайна, рвецца, а тут — на спіне... Э, гэтую ж кофту Гайдаш не ўхапіла, пакінула ў зямлянцы, калі гітлераўцы паляцелі. Гайдаш жа тады расказвала, як кофтачку знайшла, паказвала дзюрачкі ад асколкаў гранаты. Шчэ і смяялася: кофта мая, маўляў, як ваша кепачка, на гранатным агні смажылася.

«Як асколкі гранаты, гэтае цыраванне...»

Яму здалося, што чорныя мецінны нітак прапаролі кофту, увайшлі глыбока ў цела, і ён бачыць толькі краёчкі сапраўдных асколкаў, ад удару якіх Гайдаш сагну-

 лася і памірае. І ад думкі, што гэта магло і сапраўды здарыцца так у той вясновы ранак — і здарылася б, напэўна ж здарылася, каб не паспела выскачыць з зямлянкі! — паганая пустэча выстудзіла яму грудзі. Але выстудзіла толькі на міг, і тады адразу шухнула ў грудзі гарачая хваля.

— Алес рыхтык, — пажартавала Гайдаш. Абрэзала бінт нажніцамі, схавала іх у сумку.— Толькі каб не брудзілася рука. І ад вады асцерагайцеся. У сухім каб было. А заўтра — перавязачку...

Яе вочы, шырока адкрытыя, зыркалі прыязна, і ў іх не было і знаку той абыякавасці, што папачатку гэтак здзівіла; яны галубілі, гэтыя яе вочы, бадзёрылі, нешта чакалі, чакалі гэтак жа, як тады на лясной дарозе, калі Гайдаш перавязвала яму шыю. І ён разгубіўся, нахіліў галаву, учапіўся зубамі ў матузы — рабіў выгляд, што папраўляе бінт.

Нейкі міг перад гэтым у яго міжвольна нарадзілася адчуванне ўзнёсласці, вытокі якой ён не ведаў, але цяпер яна растала яшчэ хутчэй, чым і ўзнікла. Ён ужо злаваў на гэтую ўзнёсласць, злаваў на тое, што пусціў яе ў сваё сэрца, і замест добрай і ласкавай падзякі, якую меўся выказаць, буркатнуў стрымана:

— Дзякую... Добра перавязала...

Ён рушыў назад да пякарні, і на кожным кроку адчуваў, што Гайдаш глядзіць яму ўслед, і злаваў, яшчэ больш таму, што там, ля зямлянкі, калі яна перавязвала яму руку, даў волю дзіўнаму і незразумеламу парыву. Спяваць яму ад радасці захацелася! Дзівак маласольны! Што яму гэтая дзеўчынёшка. Яна — медсястра твайго атрада. І — кропка.

Ён зноў прыгадаў, што гэтыя словы сказала і Гайдаш, калі закаркоўвала бутэлечку з чорнай вадкасцю, і цяпер вось ён іх паўтарыў. Як быццам сваіх слоў у яго няма. Ён ужо яе словамі пачынае мысліць, як на гатовенькае ўзбіўся!

У доле, пад нагамі, урэзаўшыся ў пясок, тырчала сухая яловая шышка. Захар мыском бота падкалупнуў яе, падфутболіў рэзкім ударам. Шышка ўзляцела высока, стукнулася аб тоўстую галіну сасны і зарыкашэціла па Шлыку, які выкаціўся з-за дрэва ў чорным доўгім плашчы, зусім незашпіленым.

— Каб крыху мацней, дык я б — туды,— ён торкнуў пальцам у дол і, націраючы патыліцу, па якой нацэліла

шышка, дадаў усё гэтак жа жартаўліва: — Дамарад меў бы новага камандзіра гаспадарчага ўзвода.

— А навошта яму новы? І ўлічы: цяпер за аднаго бітага чатырох даюць, якія без сінякоў.

— Во, цяпер мяне, з сінякамі, зноў на ранейшае месца — у другі, баявы.

— Зноў плачаш? А Дамарад не нахваліцца табою. Кажа, што табе гаспадаранне па душы.

Шлык незадаволена крутнуў галавою:

— Хай яно гарам ідзе, гэтае гаспадаранне. Гэтае — набудуй. Тое — зрабі. Усіх і ўсім забяспеч. Адкуль забяспечыць? З ветру садраць, гэтымі вось рукамі? — і выставіў наперад рукі, быццам заклікаў Захара падзівіцца.— А з ветру нічога не злупіш, як кажа Давід.

— Ужо і намеснік яму благі! А ён жа не з ветру, са слабенькага навеву вяроўкі саўе!

Шлык як і не пачуў апошніх слоў, нахіліў галаву, бы ў нейкім цяжкім і непрыемным роздуме. Раптам, як толькі цяпер згледзеўшы забінтаванае Захарава запясце, пацікавіўся са спачуваннем і заклапочана:

— А з рукою што, таварыш камандзір?

— Драпінка!

— Э-ёй! З малай драпіны — бяда вялікая здараецца. Тэатр, памятаю, збіраўся ехаць на гастролі. Спехам усё рабілася. Грузім, адным словам, скрыні...

— Ты працаваў у тэатры? — Захар са шчырым здзіўленнем агледзеў Шлыка.

— О, каб пералічыў вам, дзе давялося працаваць, зарабляць кавалак хлеба! Чыгунка. Спажывецкая кааперацыя — грыбыварыў. Выканком. Хлебзавод. Тэатр...

— А якія ролі ў цябе былі?

— Ролі? Адна-адзіная: грузчык. Грузілі, значыцца, скрыні. І малеча-цвічок — чырк руку. Э, драбяза, думаю. Залізнуў, газецінаю заклеіў. І праз тое месяц амаль у больніцы правалэндаўся.

— Гісторыя,— працягнуў Захар і зноў са здзіўленнем прыгледзеўся да Шлыка.— І як жа яно далей павярнулася?

— На добрае. Адтуль, з больніцы, і пайшло шчасціць. Точна — што дзівіцеся? — адтуль і пайшло ўсё ладам. Побач на ложку адзін чалавек ляжаў, з Віцебска — мы з ім пасябравалі. Можа, чулі прозвішча Шуцько? Вось ён аднойчы ўбачыў, што я дарожку ля больніцы падраўнаваў, да ладу давёў, і кажа: трэба, маўляў, табе

ў дарожнікі, душа ў цябе на гэта скіравана. І ўладкаваў мяне. Праўда, на голае месца. Усё сам будаваў: і хату, і хлявок, і студню, і садок садзіў, і награбок пад вішанькамі. А дарогу — шанаваў. Мой участак — лепшы быў, гэта ж вы ведаеце. Прэміі былі, павага — людзі працу заўсёды бачаць. А пачаў жа — анічагуткі. Як вось і ў атрадзе: маеш узвод — на пустым і роб...

Дзіўна, што ён, Захар, амаль нічога гэтага не ведаў. Няўжо ўсё тое, што ён пекалі бачыў на сядзібе дарожнага майстра, Шлык збудаваў і зрабіў сваімі ўласнымі рукамі? І сваімі ж вачыма бачыў, як гінула ўсё ў агні...

Горкае прыгадваць не хацелася, і яшчэ больш не хацелася нагадваць пра яго Шлыку, вярэдзіць чалавеку сэрца.

— Гэта ўжо гіпербала, дарагі Велізар,— засмяяўся Захар.— Выключнай сілы перабольшванне — гэтак ужо і на пустым месцы твой гаспадарчы ўзвод. Ну вось, скажам, пякарня. Атрымліваеш жа гатовенькую, новенькую, як з іголачкі. Вунь ужо і дым з коміна!

— Як? Пазаўчора ж і печы не было!

— Сам я мураваў, каб ты ведаў,— пахваліўся Захар.— Ну, скажам, не ўсю печ, ведама, цаглін нейкіх з трыццатку ўсяго і ўпёк. Аспоўнае — Загурскі. Ну і спец!

Пякарня была ўжо за колькі крокаў, і Захар, пахваляючыся перад Шлыкам, дзівіўся: над нізкім комінам — белаватыя хмаркі дыму. Толькі што ён жа тут быў! Няўжо Артур паспеў адзін усё зрабіць? Але ж нікога на даху не відаць. І да коміна нейкі каўпак прыладжаны. Гэты Артур, усё яму каб гарэла, паўсюль пнецца наперадзе быць! Удзень — печ паліць удумаў. Ён жа, Захар, загадаў, каб у лагеры аніякіх удзень дымоў. Праўда, дым не вельмі і ўзнімаецца ўверх, паўзе ляна, бы спаўзае па цаглінах на верасы і губляецца ў іх. Э-э, вось тут хто верхаводзіць — Багдан!

Багдан выбег з зямлянкі, ён не заўважыў Захара і Шлыка, схаваных дрэвамі, нечага завіхаўся на даху, нешта прыладжваў ля коміна. Ну і лаўкач! Гэта ж ён каску нямецкую на комін уздзеў. Гэта ж таму дым і паўзе!..

Багдан быў без фрэнча, у карычневай кашулі; кашуля збоку выбілася з-пад рэменя, надзімалася касым пухіром, які, калі Багдан нахіляўся над комінам, надзяляўся на два меншыя, але яны тут жа збягаліся ў адзін. Пачуў, урэшце, галасы, імпэтна саскочыў з даху, казырнуў кельмаю:

— Таварыш камандзір гаспадарчага ўзвода! Расчыняйце цеста. І — у печ! На гарачае места!

— А чаму ўдзень запалілі? — сказаў Захар, якому ўвішнасць Багданава была не па душы.— Сігнал фашысту даць, што пякарня гатовая? Каб прыляцеў і бомбачку кінуў?

— Хай ён сабе на сваю галаву кідае,— Багдан вылаяўся.— Дыму нашага ён не заўважыць — дровы сухія. І каска гэтая да зямлі ціснe дым. Гэта ўсё дзед мудруе. Праверыць, кажа, трэба.

— А дзе ён?

— Там, у зямлянцы.

Загурскі стаяў ля печы, маўкліва глядзеў на полымя. Багдан жа закруціўся, пачаў паляпваць далонёю па вільготных, няроўна падсохлых цаглінах; з бразгатам адчыніў і зачыніў бляшаную дзверцу.

— І — духовачка ёсць! Ну, дзед, залатыя твае рукі. Эх, каб фюрэра туды, насушылі б на нітачку. Праўда, дзед?

Загурскі нічога не адказаў, ён стаяў у ранейшай паставе, як і стаяў дагэтуль, абапіраючыся на калок, і моўчкі глядзеў у чэрава печы, дзе ўжо спорка ўгарэліся дровы. Ён як не чуў аніякай гаворкі, быў безудзельны да ўсяго навакольнага, і водбліскі полымя, што падала яму на твар, стваралі ўражанне, што Загурскі марудна і націху нагоўдваецца, быццам нешта спявае. Але губы яго былі шчыльна сціснутыя і надавалі твару выраз зацятай нядобразычлівасці.

— Ну і майстар жа ты, дзеду,— зноў у захапленні прамовіў Багдан. Але захапленне гэтае болей ішло ад збянтэжанасці, што яго ранейшае запытанне як бы завісла ў паветры.— І дзверцу ж якую адмысловую змікіціў!..

Загурскі не зварухнуўся, па-ранейшаму напружана ўглядаўся ў чэрава печы, дзе віхурыла полымя. Захар паважыўся быў таксама сказаць ухвальнае слова старому, але, зірнуўшы на быццам скамянелы твар, нечакана павярнуўся да Багдана, пагразіў яму пальцам, асуджаючы непатрэбную тут гаворку.

Нешта магутнае і прыцягальнае было ў маўклівым задуменні, з якім стары глядзеў на агонь, і хацелася толькі аднаго — гэтак жа моўчкі, як ён, сачыць за полымем. Захар неспадзеўкі і сам апынуўся ў палоне гэтай сілы, і не супраціўляўся ёй, падпарадкоўваўся, усхваля-

ваны і ўдзячны. Загурскі і сапраўды вялікі майстра! Вось ён скончыў сваю працу, і цяпер, перш чым перадаць яе людзям, павінен моўчкі і засяроджана пастаяць пры ёй, усё ацэньваючы, узважваючы, раячыся пакуль што толькі з сабою.

Дзівоснае і загадкавае полымя ў печы, зачароўвае яно, вабіць... І дзіўна: і не сам ты запаліў гэты агонь, не сам прыцёг на яго дровы, а вось глядзіш у агонь, і спакайнее душа, улагоджваюцца думкі, і нешта інакшыцца ў табе, перарабляецца, змяняецца, і над гэтымі зменамі ты ўжо не ўладарны, ты не можаш ні затрымаць іх, ні паскорыць, ні павярнуць куды-небудзь у іншы бок, не ў тым напрамку, які замысліў нехта без цябе...

Захар глядзеў і не мог адарваць позірк ад полымя, што ўпарта жэрла дровы. Пласт дыму, які адціскаў полымя ад скляпення печы, быў пераплецены доўгімі і звілістымі атожылкамі, і ўвесь час выгінаўся, поўз па бакавінах цаглін і, пераваліваючыся праз іх, перад тым як знікнуць у коміне, разліваўся, бы вадзяны струмень, перамешваў колеры, вылузваючы з сваёй чорнай сярэдзіны сінія ласкуты; дровы — большая частка паленцаў былі яловыя — патрэсквалі, час ад часу гучна выстрэльвалі дробнае вуголле, і яно вылятала на прыпечак, круцілася, падскоквала і падала на падлогу, пакідаючы за сабой у паветры белы дымны след.

## 11

Стомлены конь тупаў марудна, часта матаў галавою, незадаволена форскаў, і Захар, выбіўшыся з бярозавага ўзлеску на палявую дарогу, паабапал якой вагалася ад ветру зжаўцелае жыта, кінуў повад на конскую грыву. Хай тупае, як яму хочацца — Захару спяшацца няма куды. Усё, што было запланавана на сёння, зроблена: у Венцавым выступіў перад вяскоўцамі з дакладам аб падзеях на фронце, растлумачыў, навошта арганізаваны збор сродкаў сярод насельніцтва, настойліва раіў як мага хутчэй убіраць ураджай і надзейна хаваць яго.

Сход быў не лёгкі і не радасны — даводзілася даваць шмат тлумачэнняў. Як жа гэта сталася, што фашысты сёлета дакаціліся да Сталінграда — нехта нават папытаў, ці праўда, што горад імі ўжо захоплены? Што чуваць наконт адкрыцця другога фронту нашымі саюзнікамі? Ці

доўга яшчэ мужчынам, якім аб'явілі, што яны мабілізаваныя ў армію, сядзець і пачага чакаць па хатах?

Але яшчэ цяжэйшым быў сход, дакладней — нарада ў штабе, якую ён сам склікаў. На сходзе ў вёсцы можна было — і ён, часам, гэтак і рабіў — адказаць і агульнымі словамі, каб проста супакойваць і абнадзейваць людзей, і гэтыя адказы ад яго асабіста нічога канкрэтнага не вымагалі: тое, што ён казаў, нельга было адразу ж і праверыць.

На нарадзе ж у штабе — гаворка там ішла аб падрыхтоўцы атрада да дзейнасці ў зімовых умовах — кожнае пытанне вымагала ад яго не проста слоў, а дзелавых адказаў, адказаў канкрэтных, практычных: тут не ўвільнеш, тут не схаваешся за агульнымі разважаннямі, тут кожная дробязь, якую ты не ўлічыш ці наспрабуеш ад яе схавацца, можа — і напэўна ж! — абернецца бядою і для цябе асабіста.

Напачатку Захару здавалася, што ўсе праблемы можна будзе абмеркаваць і вырашыць хутка і проста. Тым больш што ў часе папярэдняй гаворкі камандпай тройкі — Захара, Юршы і Яштокіна,— на якой прысутнічаў і Гусараў, усе пытанні ў агульных рысах яны абмеркавалі і абгаварылі. Аднак калі размова пачалася не агульная, а канкрэтная, размова пра тое, як практычна вырашыць тыя праблемы ў ротах, ва ўзводах, дык абмеркаванне гэтае вылілася ў гаворку доўгую, часам мірную і памяркоўную, але часцей — рэзкую, з прэтэнзіямі і ўзаемнымі папрокамі і абвінавачваннямі. Спрэчкі былі натуральныя, але — Захар гэта заўважыў — далёка не ўсе правільна разумелі і ўяўлялі сабе складаныя задачы, што выпікалі з будучай дзейнасці атрада ў зімовых умовах, і аптымістычных перспектыў яго далейшага росту. Роты трэба папаўняць і людзьмі, і зброяй — гэта не выклікала пытанняў, як і не выклікала пытанняў патрабаванне ўзмацніць удары па акупантах. А як наладзіць гаспадарчую дзейнасць, без якой, натуральна ж, не можа быць актыўнай і баявая дзейнасць? Як наладзіць, скажам, працу майстэрань па рамонту зброі, вырабу вопраткі, абутку? Дзе ўзяць абсталяванне і людзей, якія ведаюць гэтую справу дасканала? Дзе размясціць майстэрні? Як улічваць і размяркоўваць харч у ротах, якія размешчаны ў зонах эканамічна далёка не аднолькавых? Які павінен быць харчовы «НЗ» для ўзводаў і кожнага партызана? Як ствараць і дзе гэты недатыкальны запас захоў-

ваць? А лазні? Дзе і ў якой чарговасці роты павінны карыстацца імі?..

Узнікла мноства іншых бытавых праблем і пытанняў. Абмеркаванне іх стаміла Захара да рэшты. Праўда, гаворка гэтая адкрыла яму шмат чаго новага, і ён закрываў нараду з адчуваннем дужа цяжкай, але ўдала завершанай працы. Пад канец нарады, слухаючы выступленні, прапановы і меркаванні, ён зразумеў вялікую мудрасць Ціханавай прапановы абгаварыць усе пытанні гаспадарчага забеспячэння атрада не толькі з камандзірамі ўзводаў, але і з непасрэднымі выканаўцамі ўсёй гаспадарчай работы. Тое, што яго дужа раней непакоіла, цяпер, абгаворанае з людзьмі кемлівымі, ініцыятыўнымі, здольнымі не толькі ставіць пытанні, крытыкаваць, але і падказваць найбольш разумнае выйсце ў вырашэнні гэтых пытанняў, бачылася яму зусім у іншым святле.

А ён жа — быў час! — не бачыў у гэтай нарадзе аніякай патрэбы. І нават больш: калі Ціхан пачаў настойліва раіць нараду гэткую сабраць, занатурыўся, пачаў даводзіць, што гаспадарчыя ўзводы маюць заданні, ведаюць, што рабіць, і хай робяць сваю справу, а ён з іх будзе патрабаваць. Яму ж, камандзіру атрада, трэба займацца баявымі справамі. Потым жа, убачыўшы Ціханаву непахіснасць, паабяцаў праз дзень і склікаць тую нараду, паабяцаў у жарт, смехам, і быў здзіўлены нечаканай рэакцыяй Ціхана, які рэзка абсек яго жартоўныя развažанні.

Цяпер жа, зглядзеўшы наперадзе счарнелыя ад дыму і часу сцяну і дах кузні, Захар адчуў запозненЫ сорам. З чаго ён тады жартаваў? Чаму не адразу зразумеў важнасць таго, пра што казаў яму Ціхан? А што, як і ў іншым, там, дзе будзе вырашацца справа не гаспадарчая, а баявая, ён дазволіць сабе гэткую ж неабачлівасць? Зараз — дакоры сумлення, проста згрызота. А не гэтым жа давядзецца расплачвацца тады!

Ён шчыра радаваўся цяпер, што намысліў паехаць у кузню. І адпачне дарогаю, і сам, на свае вочы зірне, што цяпер робіцца ў гэтым «арсенале», як жартоўна завуць у атрадзе старую калгасную кузню. Пажога ўчора скардзіўся, што «арсенальцы» нядбала раўнуюць патроны, працуюць, маўляў, абы-як. Нешта тут незразумелае. Першыя цынкі, якія прывезлі з узарваных фашыстамі дотаў — амаль усе патроны з іх былі падраўнаваны,— Пажога сустрэў радасна, як не расцалаваў Гнацюка з

Саўчыкам. А цяпер дык толькі з гневам пра іх і гаворыць: лайдакі, маўляў, кепска робяць усё, і ён не будзе болей браць у іх набоі, лепей павыкідае, каб не лічылі, што рота мае вялікі боезапас. Магчыма, Пажога не ўлічвае, што апошнія цынкі спляскапыя, скаржапыя выбухам — патроны ў іх амаль усе пагбаныя, раўнаваць іх цяжка, і прыдатны яны толькі для вінтовак і карабінаў. Але ж гэткія патроны і другая рота атрымлівае. А вось Дамарад чамусьці не абурасцца. Праўда, ён і ад пачатку не вельмі захапляўся «арсенальцамі». Аднак жа і да абурэння Пажогава паставіўся са смяшком: другой роце, маўляў, і патроны другога гатунку даюць, так што мы, маўляў, прызвычаіліся.

Магчыма, Захар зрабіў памылку, што пасля таго як паглядзеў на працу «арсенальцаў» пад патронамі з першых цынкаў, у кузню болей не зазірнуў — хапала клопату і без яе. І з кожным днём гэтых клопатаў усё больш і больш. У пачатку тыдня Гусараў прывёз зварот Цэнтральнага Камітэта партыі да ўсіх беларускіх партызан з заклікам актывізаваць баявыя дзеянні. Прывёз і кароткую запіску ад Ціхана, у якой нічога радаснага і абнадзейваючага для сябе Захар не знайшоў.

Запіска згадалася цяпер зноў, і Захар, гледзячы на чорны задымлены дах і гэткую ж сценку старой кузні, нечакана падумаў пра тое, што ён не да канца зразумеў сэнс таго, пра што пісаў Ціхан, і ўстрывожыўся. Няўжо сапраўды Захар, у знаёмай парадзе Ціхана спадзявацца толькі на свае ўласныя магчымасці, зразумеў не ўсё, нешта зразумеў не так, як трэба было?

Ад нечаканасці Захар спыніў каня і злез з сядла. Накінуўшы повад на слуп былога жардзяніка, што цягнуўся некалі ўсцяж дарогі да канца жытнёвага кліна, ён пацягнуўся па ліст, што ляжаў у кішэні скуранкі; пацягнуўся быў і апусціў руку. Не, нічога ён, Захар, не паблытаў, усё зразумеў правільна. У катэгарычным тоне кароткай запіскі была — і гэта яго тады дужа ўзрадавала! — прыхаваная бадзёрасць, прытоеная надзея на добрае.

Захар раптам падумаў, што не хоча перачытваць ліст, баіцца, каб пры другім чытанні не знікла гэтая агульная настраёвасць, якую ён, упершыню ўзяўшы ліст у рукі, злавіў, здаецца, беспамылкова. Ён добра ведае: Ціхан хоча і не мае права нешта сказаць яму, Захару. І дзіўна, што гэтай, стоенай надзеі на добрае ён, Захар,

не адчуў у час той гаворкі ля ручая, і ў гаворцы потым у зямлянцы, і ў часе гаворак пры расстанні. Тады Ціхан быў бязлітасны і патрабавальны. Ён і цяпер гэткі ж у кожным слове, але ў спалучэнні слоў тое, амаль няўлоўнае адценне, што надае запісцы зусім іншую пастраёвасць.

У кузні пачуўся рэзкі металёвы грукат, і Захар зноў зірнуў на чорную знаёмую будыніну. За кузняй, па далягляду, плылі белыя, як з чысцюткага снегу, аблокі, і неба было не блакітнае, а попельна-шэрае, скрозь зацягнутае, як дымам, гэтай бляклай хмурнасцю, і тыя белыя гурбы ўдалечыні над лесам нагадвалі горныя вяршыні, прыцярушаныя снегам. Яны прыцягвалі позірк, вабілі сваёй чысцінёю, і Захар, узлакціўшыся на жардзіну ля слупа, зачаравана глядзеў на іх. Але ў той момант, як ён нагнуўся над жардзінаю, чорны дах кузні як адскочыў, аддаліўся, упёршыся вільчыкам у тыя белыя гурбы аблокаў, раптоўна і рэзка змяніўшы іх абрысы.

Конь тузаў повад; стары, разгайданы ў зямлі слуп пахіснуўся, жардзіна дугнулася, як бы хто выдзіраў яе ў яго з-пад локцяў, і Захар павярнуўся. Справа ад галавы каня, які скуб канюшыну, жаўцеў край шырокага жытнёвага кліну, за ім цёмна-зялёным покрывам кучаравіўся бульбяны палетак, і за ім роўным ланцужком тырчалі стрэхі ліцвінаўскіх хат. Зжаўцелае, пераспелае жыта, цёмна-зялёны бульбоўнік, дзе-нідзе з фіялетавымі і белымі кропкамі квецені, стрэхі хат, белы бярэзнік за ручаём, у якім знікала гліністая, цаглянага колеру звілістая дарога,— усё гэта было да болю знаёма, і ён скалануўся.

«У Віроўлю прыехаў?!.»

Гэта ж там, як толькі выйдзеш з сенцаў Зінаідзінай хаты, вока адразу зачэпіцца за старыя вольхі ля ручая, за гэткую вось гліністую, выгнутую падкоўкаю, дарогу, з краёчкам чорнага прамавугольніка — масток праз ручай, які траскотна грукаціць пад коламі. Вось ідзе адтуль, ад ручая, Зінаіда з кашом выпаласканай у ручаі бялізны, нясе кош на плячы, і галавы не відаць, яна схавана кашом і бялізнаю — нібыта аблокі аселі ў той кош. Бынцам неба з аблокамі нясе яна на сваім плячы...

Мроя была кароткая, імгненная. Ляжала перад Захарам ужо дарога, пустая, гліністая, і чарнеў за вольхамі краёк драўлянага масточка... Ніякая гэта не Віроўля, дружа. Гэта ж тут спаборнічаў ты са Шлыкам, абга-

няў бульбу. Памятаеш, як даліся табе тыя дзесяць баразёнак — увагналі ў пот! А потым ляжаў у цяньку пад грушай-дзічкаю. Зірні, колькі дзічак нарасло. Трэба будзе сказаць гаспадарнікам, каб насушылі на зіму.

«У той дзень Багдан вёз цынкі з патронамі...»

Захар усяляк намагаўся прыгадваць падзеі менавіта таго добрага дня, калі ён працаваў на полі, весела жартаваў. Але шчымлівы боль на-ранейшаму ціснуў сэрца, думкі ўсё яшчэ былі пра жонку, пра дзяцей, якіх яму не суджана болей убачыць. Нядаўні клопат цяпер зусім не турбаваў яго. Захар неяк раптоўна страціў цікавасць і да Ціханавага ліста, які зусім нядаўна гэтак яго ўстрывожыў, і страціў цікавасць да таго, што вяло яго сюды, да старой калгаснай кузні. Нейкія патроны... Колькі гэтых патронаў — пагбаных і непагбаных! — аддаў бы ён за тое, каб сапраўды ўбачыць Зінаіду і дзяцей на гэтай дарозе жывых, каб пачуць іх галасы!..

Захар працягнуў руку, сарваў жытнёвы каласок, на адным вылушчваў рудыя, з белаватай шрамінкаю пасярэдзіне, зярняты, марудна кідаў іх у рот. Саладжавы хлебны смак зноў нагадваў Віроўлю, і стары боль зноў прабіўся ў сэрца. Навошта? Навошта ён тады пагадзіўся пусціць жонку з дзецьмі ў тую Віроўлю? Ён жа амаль дакладна ведаў, што нешта павінна адбыцца грознае, віхурнае — якраз перад яе ад'ездам у Віроўлю яны здавалі баявыя залікі ў знішчальным атрадзе — стралялі з ручнога кулямёта па мішэнях, якія рухаліся. Дзіўна як торгаліся ў хмызняках тыя мішэні — дзве чаргі па пяць куль давалася на знішчэнне іх. Ён раптоўна згадаў і гэтыя мішэні, і навюсенькія, бронзавага колеру патроны з чырвонымі і зялёнымі носікамі куль, і адчуў незнаёмую да гэтага дня стому. Стома была не фізічная, ён не адчуваў яе ні ў нагах, ні ў плячах; стома была ў сэрцы, яна размякчала волю, нарадзіла жаданне бухнуцца на дол, расцягнуцца сярод лапін чабору, якія падзяляла старая жардзіна.

Зноў у кузні нешта залязгала, потым пачуліся гулкія і рытмічныя ўдары па метале, і гэта быў як загад ісці, як штуршок, які зрушыў Захара з месца. Ён марудна нацёгся вузкім узмежкам усцяж дарогі. Ішоў, трымаючы адстаўленую ўбок правую руку над жытам; каласы гнуліся і зноў выпростваліся, мякка тукаліся ў далонь, і ад іх дотыку па скуры пракатвалася казытлівае трымценне, быццам біў у руку цёплы жвавы струмень.

Кузня была пастаўлена глухой сцяною ў бок жытнёвага кліна, і што робіцца на падворку і ў будынку, Захар не бачыў. Але як толькі завярнуў за вугал будыніны, адразу згледзеў шырока адчыненыя дзверы. Каля іх, нібыта толькі што выкаціўшыся адтуль, стаяла атрадная саракапятка, упёршыся коламі ў старыя бароны і ў пустыя гаўбічныя балванкі. Гнацюк грудзьмі прыхінуўся да гарматнага ствала, і над ім, бы каршун, завіс Жвірбля і нечага размахваў рукамі. От жа зацяты, гэты артылерыст! З усімі камандзірамі ўзводаў перасварыўся. Цяпер — з Гнацюком, здаецца, счапіўся. Але на гэтага дзе сядзеш, там і злезеш! Сварак Гнацюк не любіць. Калі нешта трэба загадаць, дык ён спакойна і проста выкажа сваю думку, як бы гэта і не загад зусім, і пойдзе з гэткім выглядам, нібыта тое, што ён сказаў, і ёсць адзіная праўда, супраць якой нельга запярэчыць, а трэба, як мага хутчэй, ажыццяўляць і выконваць. Але на гэты раз, падобна, асечка нейкая ў Гнацюка. Жвірбля цяпер аціх, стаіць нерухома, схіліў галаву, быццам вінаваты, а Гнацюк размахвае рукамі, нешта даводзіць, настойліва патрабуе...

На заўзятую гаману не звяртае аніякай увагі трэці чалавек на падворку кузні — Сачыўка. Стаў на адно калена ля правага задняга кола фурманкі, на якой устаноўлена гармата, дзелавіта грукае малатком, раўнуе на коле жалезны вобад.

Пустыя гаўбічныя снарады, з якіх выплавілі тол, заміналі ісці; Захар спачатку пераступаў іх, потым штурхануў нагою адзін, другі, і яны пакаціліся, стукнуліся і загулі, бы званы. Сачыўка ўзняў галаву, убачыў Захара, але зрабіў выгляд, што не пазнаў яго, ручкай малатка торкнуў Гнацюка вышэй калена і знік у кузні.

— Што гэта за сварка ў вас тут? — павітаўся Захар і паціснуў рукі Гнацюку і Жвірблю.

— Ды гэтыя сані, каб яны спрахлі,— сказаў Жвірбля.

— Рыхтуй калёсы зімою, а сані — улетку. Так заклікае народная прымаўка! — і раптам зацікавіўся шчыра: — Нешта я ў толк не вазьму, што тут і да чаго? Навошта гэтыя брусы? Гармата проста на санях стаяла ў сакавіку. Нешта вы мудрагеліце занадта.

Жвірбля ахвотна ўзяўся тлумачыць:

— Насціл з дошак — далоў, бо снегу туды наганяла страшна. Шырокія брусы — апірышча. А гэты — упоперак. Ён бы паваротнае кола. Прыблізна гэтак яна ў доўце

і паварочвалася, праўда, там колцы былі. Тут усё прадумана, таварыш камандзір. Не адну ночку галаву ламаў ды круціў.

— Ацалела аднак жа, не скручаная!

— Ха, яе ўжо і сам чорт не скруціць,— адгукнуўся Жвірбля на Захараў жарт.— Але ж вы паглядзіце, таварыш камандзір, як лёгка яе будзе паварочваць.

— Цягне, бачу, на прэмію,— сказаў Захар, упіраючыся рукамі ў старанна абчасаны сасновы брус і вывучаючы новае прыстасаванне.

— Абыдземся і без прэміі. А вось Шлыку вы скажыце, каб і артылерыстаў паставіў побач з кулямётчыкамі. На станкачы ён жа прадугледзеў заліўку на мароз. А нам — дулю.

— А-а, ты пра гэта. А куды ж ты заліеш тое, што ён станкачам прадугледжвае. Гармата без кажуха гэта табе не «максім».

— Нам не для заліўкі,— і вочы Жвірблі зухавата свяціліся.— На марозе, скажам, замок працэрці. Дульную частку... А ён мне адно цвердзіць: вы, маўляў, не тую частку будзеце змазваць.

— Дажывём да маразоў — улічым, гэта я табе абяцаю.

— Вось! Я ўсім кажу: у нас камандзір — разумная галава. Мудрая!

— Ты гэты падхалімаж адстаў!

З кузні павольна, крыху накульгваючы, тупаў Сачыўка, цягнуў перад сабою ў даўгіх абцугах два шырокія клямары. Кіўком галавы павітаўся з Захарам і кінуў іх у жалезную, напалову ўкапаную ў зямлю бочку з вадой; гарачае жалеза зашыпела, вада забулькала, над бочкай узнялася белая пара.

— А гэта што? — спытаў Захар, угледзеўшы на ствале гарматы нейкія малюнкі, падобныя на дзіцячыя, зробленыя рудой фарбаю.

Жвірбля расправіў плечы, на яго твары лупала задаволеная ўсмешка.

— Баявы рахунак гарматачкі. Танк спляжыла. А гэта — машына. А тут — па ўсё астатняе месцейка...

— Замнога дужа вольнага месцейка,— весела заўважыў Захар, здагадаўшыся, што незадаволенасць у вачах Жвірблі засталася, відаць, не таму, што падхалімаж быў рашуча абсечаны — не прайшла яшчэ крыўда на Гнацюка.— Наўрад ці і намалюеш калі.

— Замалюем. Гэткае вось толькі каб стаўленне хутчэй пераадолець,— Жвірбля шматзначна і выразна матнуў галавой у бок Гнацюка, які горбіўся цяпер над пустымі снарадамі — адкідваў іх за старыя бароны і жалезнае ламачча.

— Загадкі я не люблю. Калі што ёсць — выкладвай.

— А вы што, не бачыце, дзе мае коні? У-унь,— і Жвірбля красамоўна махнуў рукою сабе за спіну.— Спанкі зуёўцам возяць.

— А хіба гэта кепска?

— Я не кажу, каб не памагчы. Трэба і гэтае дзела ажыццявіць. А раптам давядзецца з ёю,— ён паляпаў даланёю па ствале гарматы,— манеўр зрабіць баявы? Як ты яго зробіш, калі коні знясіленыя? — і дадаў вельмі гучна, як бы забіваючы апошні шпунт у сваю пядаўнюю спрэчку з Гнацюком.— Баявое цягло ёсць баявое цягло! І яно павінна быць штохвілінна ў поўнай баявой гатоўнасці!..

Сачыўка выцягнуў з вады шырокую скабу, па якой паўзла, курачыся, пара, і жалеза ўвачавідкі падсыхала, імкліва змяньваючы вільготны цёмны колер на попельны і сухі.

— Будзем браць у клямары,— папрасіў Сачыўка спакойным, упушальным тонам, і яго словы прагучалі цвёрдай прапановаю канчаць непатрэбную гаворку і займацца справаю неадкладнай і важнай.— І вобад там чакае...

— А што з вобадам? — пацікавіўся Захар, чамусьці вырашыўшы ўлагодзіць Жвірблю, каб той не злаваў на Гнацюка.— Яны ў парадку, я гляджу!

Гнацюк паспяшаўся патлумачыць:

— Ставім танчэйшыя. Але шырэйшыя ўдвая, супраць гэтых старых. Каб колы меней грузлі, як па сыпкай дарозе едзеш. Шчэ паспрабуем і бартавіны абсячы, калі выгарыць — тады зусім лёгенькая гарматачка будзе,— і падкалупнуў Жвірблю.— Гэта ж тады на руках адзін пакоціш. І пфэрды не спатрэбяцца.

— Вы ж іх даб'еце да ручкі! — з жалем выгукнуў Жвірбля.— Адно тады і застанецца — на ручках каціць гармату.

— Гэтак ужо і даб'юць,— сказаў Гнацюк.— Снапы звозіць — гэта ж не аблогу плугам узнімаць. А што ты скажаш, калі давядзецца іх у плуг паставіць? Райком жа даў указанне, каб памаглі людзям на зяблівс...

— Баявое цягло ставіць у плуг? — Жвірбля глядзеў на Захара з жалем і спачуваннем, як бы прасіў патлумачыць гэтаму Гнацюку, што тоїї чаўпе лухту.— Дзерці аблогу? Ну, дык давайце калупацца на зямлі. А ваяваць за нас дзядзька добры будзе.

— Не перабольшвай ты, не перабольшвай,— папрасіў Захар лагодна.

— Баявое ж цягло! Таварыш камандзір! Ды даўней мой камроты і рыдлёўку не дасць анікому, калі справа не вайсковая. А тут? Баявое цягло!

Трэба было пераконваць Жвірблю, і Захар гэта разумеў.

— Калі бой — яно баявое,— сказаў ён зноў лагодна і прымірэнча.— А калі ціха — мірныя каня́гі. І яшчэ адна акалічнасць ёсць, якую ты не ўлічваеш. Ромель хто? Немец. Коні якія? Нямецкія. І вось Ромель на гэтых конях возіць з поля наш, беларускі, хлебец. Каму возіць? Тым, хто яго вырасціў. Сапраўдным гаспадарам.

— А вы ведаеце, што ўчора ў Залюхаве было? — з выклікам спытаў Жвірбля.

— А што там было?

— А тое, што Ромеля гэтага ледзь на вілы не ўсадзілі,— з урачыстасцю сказаў Жвірбля.— Коні — добра, кажуць. А паганца забірайце, каб і духам у нас фашысцкім не смярдзела.

— Дык ты ж расказвай, чым усё скончылася,— перапыніў Гнацюк, незадаволены тым, што Жвірбля спрачаецца з Захарам.— Трафейныя гэтыя пфэрды слухаюцца Ромеля,— дадаў ён і тлумачыў гэта ўжо Захару.— Слухаюцца і цягнуць добра. І людзі гэта заўважылі. Чорт з ім, хай будзе з конямі. Нам як бы хутчэй хлеб з поля выхапіць.

— Пятро! Хадзем, вобад зрыхтуем,— паклікаў Сачыўка Жвірблю, і яны пайшлі ў кузню.

Гнацюк праводзіў іх позіркам, потым імпэтна і рашуча павярнуўся да Захара, сказаў умольна:

— Хачу ва ўзвод, таварыш камандзір. Ну, паверце, не па душы мне гэтая кузня, мітрэнга гэтая не па сэрцы. Рукі да кулямёта цягнуцца. Да яго і сэрца просіцца...

Пад нагу трапіўся пусты, без толу, снарад, і Захар шараваў яго, ганяў падэшваю, як качалку. Потым сагнуўся, узняў балванку, зазірнуў у цёмнае чэрава, падзьмухаў.

— Не па душы,— Захар паўтарыў словы Гнацюка з

развагаю, як бы ўслухоўваючыся ў іх.— Тое, што на душы, ведаеш цяпер дзе? — адказаў, прысвіснуўшы: — Фю-ю-ю... Далёка-а!.. Я вось уявіў сабе: да вайны, скажам, Артур прыцягнуў да хаты вось гэтакага кабанчыка, расклаў пад ім агонь — тол выплаўляе. Ды ад гэткага відовішча — да апошняй валасінкі ссівеў бы!.. А, бачыш, колькі кабанчыкаў гэтых тут абсмалена? — Захар кінуў пустую балванку, яна шмякнулася на дол, падкацілася да тых, што ляжалі роўным шнурочкам, цюкнулася аб крайнюю, звонка бомкнула.— Ты хоць сачы, каб хлопцы пасля гэтай працы са спарадамі болей малака пілі.

— Ды малака хапае. Яны ўсё пасмейваюцца: нашы лёгкія, маўляў, дым толавы не бярэ. Казлоўская штодня сюды два гарлачы носіць.

— Сачыўка ж хоць ім памагае?

— Яны яму адстаўку далі. Адно цвердзяць: мы спарады, маўляў, знайшлі, мы і тол выплавім.

— А табе што, таксама адстаўка?

— Я сам яе сабе даю,— шчыра прызнаўся Гнацюк.— Як зірну на спарад, што хлопцы ў горан кладуць, дак сэрца — бубнам: тух-тух-тух... І глядзець на полымя, як яно вакол спарада закруткамі ідзе, не магу. А хлопцы — жартуюць, рагочуць.

— І ты разам з імі рагачы,— жорстка параіў Захар і зірнуў на Гнацюка з-пад ілба. Бач ты, глядзець ён на полымя не можа. А маладыя падрыўнікі могуць? Маладым, значыцца, не страшна? Відаць, таму і ва ўзвод просіцца, што спалохаўся гэтай кузні.

— Спрабаваў,— прамовіў Гнацюк і закашляўся.— Не атрымліваецца. Тол як трапіць на агонь, дык гэткі смурод дае, што мяне ўсяго вывaрачвае. Нават вось гаварыць пра гэты дым пачаў, а нутро і шкрабе.— Ён закашляўся і кашляў надсадна, і голас гучаў, бы сабачы брэх.— Аў-аў-аў... Гэта мне ўсё фашысцкая загарадка бокам лезе...

Па твары Гнацюка пайшлі дзіўныя палосы, белыя ля падбародка і чырвоныя ля носа, і Захар нечакана адчуў непамысныасць і тут жа ўзрадаваўся, што не папракнуў Гнацюка дурным запытаннем — ва ўзвод, маўляў, просішся, бо спалохаўся кузні? — і спытаў дабрадушна, як бы спачуваючы ва ўсім:

— А чаго, ты мне скажы, скаргі пайшлі: блага, маўляў, раўнуюць нашы «арсенальцы» патроны. Раней дык лепей было.

— Пажога скардзіцца?.. Гэтаму ўвогуле аніяк не дагодзіш. Дамарад жа не скардзіцца?

— Не.

— І не будзе. Бо ён разумее, што на нашым станку з пагбанага патрона новы не зробіш. Вось, хадземце...

Гнацюк павёў Захара пад навес, зроблены ля сцяны кузні. На кароткім і нізкім варштаце тут стаяла прыстасаванне, зробленае з двух шырокіх жалезных брусоў, на якім калібравалі патроны.

— Ды што ты хочаш мне давесці? — Захара ўсё больш пачынала раздражняць жаданне Гнацюка ва ўсім апраўдацца.— Ведаю, як станок працуе. Лепей у весялейшую якую дуду пачні дзьмухаць. Каб без тугі.

— Дзьмухай ці не дзьмухай — весялосці не прыбавіцца,— сказаў Гнацюк і заціснуў у брусы патрон, які ўзяў з цынка, што стаяў пад варштатам.— Бачыце, якія пагнутыя? Да ладу ж даводзім,— і ён асцярожна і плаўна, як качалкай, пачаў ганяць патрон узад і ўперад.

— А гэты шчыток навошта? Раней жа не было, помніцца.

— Двойчы стралялі патроны,— ціск усё ж. А шчыток уратоўвае, хоць не па вачах сцебане...

— А чаму не дакладвалі аб гэтых выпадках?

— Гэта ж не снарад. Хаця, калі той кахне, дык пачуеце без дакладной,— ён выцягнуў патрон з-пад бруса — патрон быў ужо амаль і не пагбаны, толькі змяціны засталіся каля вузкай галоўкі, дзе абціснута куля,— і пачаў круціць яго ў пальцах, потым, паказаўшы Захару, спытаў: — Ну, як яго лепей адштукуеш?.. А Дамарад што робіць? Узяў стары карабін, баёк з затвору — далоў. Кожны, пасля нашае апрацоўкі, ён разы са два ў патроннік загоніць, а потым толькі — у падсумак. А Пажога, бач ты, клопат на сябе не можа ўзяць! Ды шчэ хоць крышку мазгамі паварушыць!

— Ты хто, між іншым, у мяне? — Захар зазлаваў, але зазлаваў дабрадушна, дзеля таго, каб паказаць камандзірскую строгасць.— Хіба не ты начальнік боепіта! Дык чаго ж дакладную не ціснуў?

— Ха... Та нэма часу канцылярыю разводзіць!

— Далікатны ты, аднак, Гнацюк.

І гэтае «та нэма», якое ў Гнацюка заўсёды прарывалася, калі ён пачынаў сердаваць, зусім расчуліла Захара. Дарэмна ён, камандзір атрада, гэтак непачціва думаў пра свайго падначаленага. А гэтаму Пажогу трэба

будзе прачоску наладзіць. Ён, Захар, шчэ з ім пагамоніць, падраўнуе тое-сёе ў мазгоўні!

— А гэта што там? — спытаў Захар, убачыўшы пад грушай-дзічкаю пазабіваныя ў зямлю, кружком і шчыльна, учарнелыя ад дыму снарады і падобныя на маленькі столік. На століку, донцам уверх, былі авернуты тры кубкі; былі яны, відаць, укрыты ручніком, але вецер садраў яго, і ручнік вісеў, зачапіўшыся за мядзяны абадок ля донца снарада.

— Малако тут хлопцы п'юць — Казлоўская сюды гарлачы прыносіць. Адзін уранні, а другі — увечары. Поўны — пакіне, пусты — з сабою панясе. Сказаў, каб сённяя не прыходзіла, бо хлопцы толькі ўночы вернуцца са снарадамі. Далёка, між іншым, іх вазіць. Можа, дзе-небудзь бліжэй кузню пашукаць.

— Ды глядзелі. Няма, каб вось гэтак, наводшыбе. Усё болей ля вёсак. А ля хат не будзеш жа завод свой стаўляць.

За сцяною кузні глуха, як стары хворы чалавек, чухкаў кавальскі мех, рыпеў драўляны дышаль і недзе дужа далёка, але не з боку пагорка, у канцы якога рухаліся постаці жней, далятали нейкія невыразныя галасы, падобныя на абрыўкі сумнай і горкай песні. Захар быў падумаў, што гэта спяваюць жнеі. Гора, бяда вакол людзей сцеражэ, а яны працу сваю робяць і песні шчэ спяваюць. Вераць, значыцца, што лепшае наперадзе. І гэтая думка — думка пра веру людзей у добрае,— і ранейшая думка пра Гнацюка, у руках якога ўзрываліся патроны, зноў настройвала Захара добра, і ён не шкадаваў, што, нягледзячы на стомленасць, усё ж паехаў сюды, да кузні.

— Старавойціха галосіць,— прамовіў Гнацюк, паднімаючы з долу ручнік і асцярожна адчапляючы другі канец ад снараднага абадка.— Карову ў яе забіла сёння ранкам. З таго берага, з-за Дзвіны, фашыст з кулямёта жарнуў. Туман з раніцы быў, дык зуёўцы кароў на поплаў пагналі папасвіць.

— Ты што, быў ужо ў Зуях сёння?

— Не, ад Казлоўскай даведаўся. Яна малако прыносіла.

— Ты ж баяў, што наказалі ёй, каб не прыходзіла сёння, бо хлопцы паехалі па снарады!

— Ну... Пятру дагадзіць хоча — усё да яго падлабуньваецца.

— А цябе што, і не заўважае?

— Не, я б не сказаў. Запрашала ў хату, каб зайшоў. Але я не хадзіў. Цяжка ў вёску хадзіць.

— Цяжка? Вунь жа, рукою да страхі дацягнешся!

— Я не ў тым сэнсе. У вёсцы да цябе адразу пытанні, бы гарох, сыплюцца: калі, маўляў, сваю зямлю вызвалім, калі гадаў назад пагонім... Ну, пачнеш ім пра цяжкасці, пра сілу, пра жорсткія баі... А ў вачах людзей адно і тое ж: калі, урэшце, мы па-сапраўднаму націснем?.. А тут атрымліваецца, што не мы, а яны нас пакуль што ціснуць. На Волзе — сеў. На Каўказ — узлез! А як гэта людзям патлумачыць? — разважліва, як бы і сцвярджаючы і запытваючы нешта ў Захара, прамовіў Гнацюк.— Вось у чым загваздка! Хлусіць? Можна было б, каб гэтых людзей потым не страчаць. А з імі ж — штодня,— ён сагнуўся, адсунуў з-пад галін грушы-дзічкі ржавую бляху; пад бляхай была яміна, і Гнацюк узяў адтуль гарлач з малаком, пачаў наліваць у кубак.— Выпіце кубачак, халодненькае малачко,— і дадаў з усмешкаю: — У кузні былі, снарады цягалі — на законнай падставе малачко! Гэтак усё Артур жартуе, калі кубак бярэ. До-обры ён хлопец. Мы часцяком з ім прыгадваем, як пад бомбамі ляжалі ля чыгункі. Як яго маці? Папраўляецца?

— А што, ён табе не казаў? Папраўляецца. Але не скажаш, каб ужо і вельмі...

— Гэта захварэць лёгка. І вось жа скажыце, застудзілася, а гэтак блага...

Захару падалося, што Гнацюк завёў гэтую гаворку пра Артура і хваробу яго маці знарок, завёў умысля, шукаючы зачэпку, каб выбіцца да ранейшай гаворкі пра перавод у баявы ўзвод. І гэта дзівіла, бо паводзіны Гнацюка аніяк не адпавядалі яго натуры, якую Захар, як ён лічыў, ведаў груптоўна і даскапала: Гнацюк і паплачацца, і паскардзіцца, што цяжка, але даручаную справу ніколі не кіне, зробіць усё добрасумленна. Падобна, што і тут Гнацюк не шукае зачэпкі. Проста трывожыцца, маркотна і ў яго на душы ад нашага адступлення, ад нашых няўдач па фронце.

Захару нясцерпна хацелася піць. Смага сушыла губы яшчэ на полі, калі ён ехаў сюды. Цяпер адпіўшы халаднаватага малака з кубка, які прапанаваў яму Гнацюк, ён адразу супяў яе, імгненна знікла з паднябення паганая шархоткасць. Але ў горле з'явіўся вялікі мяк-

кі камяк, і Захар двойчы, прыгнуўшы галаву, натужна адкашляўся, і тады прагна і з асалодаю апаражніў кубак, і зноў падставіў яго.

— Што можаш удружыць?

— Калі ласка! Гладыш вялікі...

Лілося малако ў кубак, і Захар глядзеў на гэты белы струменьчык, глядзеў на рукі Гнацюка, на яго постаць, неяк дзіўна прыгорбленую. Ён як баіцца гэтых спарадаў, на якіх стаіць кубак. Дзіўны, аднак, столік хлопцы змайстравалі. Ніколі табе, дружа, не даводзілася ля такога пасядзець... І як дзіўна абвісае на Гнацюку пінжак, карычневы, у тоўстую чырвоную палоску. Каўнер кашулі выпушчаны на пінжак і няроўна прыкрывае замусоленыя штрыфлі. Гэта ж Важнікаў пінжак. Той самы пінжак, у якім прыходзіў Важнік перад вайною да Пахома — скардзіўся... Не, не скардзіўся, а проста раіўся, асцярожна звяртаў увагу Пахома на сяброўства Артура і Рымы... Потым яны пілі чай на тэрасе, і Ягор абярнуў спадак — аблілі чаем рукаў Важніку. Колькі тады пярэпалаху было: чысцілі, прасавалі, сушылі... Усе за сталом, помніцца, усхадзіліся. А Гнацюк прыйшоў у атрад у адной гімнасцёрцы, і Важнік аддаў яму свой пінжак — Гнацюк хварэў тады, застудзіўся, пераплываючы Дзвіну. Цяпер у гэтым пінжаку — святочны пінжак быў у Важніка! — у кузні працуе: у рэчаў, мабыць, як і ў людзей, ёсць лёс, свой час... Дзіўныя якія супадзенні! Каго дык упь як раскідала вайна! А каго, дык як знарок — разам сабрала. Артур тады з Гнацюком выпадкова стрэліся, і вось зноў разам, як прышпіленыя... І Рыма з гэтым Артурам! З-за лініі фронту — сюды. І — побач амаль. Трэба будзе з сувязнымі да Ціхана і яго, Артура, паслаць — хай ужо зірне на сваё сэрцайка. І да возера, на бацькаву магілу, трэба дазволіць Артуру паехаць. Ён жа, Захар, абяцаў Ціхану, і сам збіраўся... Проста не можа як след планаваць сваю дзейнасць... Файзуло дакладваў, што барадач той, які рыбай свежанькай іх частаваць хацеў, не паведамляў фашыстам на станцыю, што ў вясковай лазні мыюцца савецкія салдаты. Паведамляў хтосьці іншы. А хто — невядома і дагэтуль. І, магчыма, увогуле ніколі не будзе вядома. Гэтак жа не будзе вядома, як невядома, колькі магіл вырасла на гаротным шляху ад дзяржаўнай мяжы да Волгі... Як гэта Гнацюк кажа?.. «На Волзе — сеў!.. На Каўказ — узлез!..» Вось, відаць, з чаго гэткі стрыманы

топ у запісцы Ціхана, вось з чаго гэткі знерваваны і раздражнёны Гусараў... Магчыма, Ціхан і Гусараў ведалі, прадбачылі наша адступленне сёлета? Ведалі? Але адкуль? Як ты можаш прадбачыць, скажам, які снарад гахне ў горне кузні?.. Не, навошта гэта прадбачыць! Хай без прыгод плавіцца са снарадаў тол, хай раўнуюцца патроны. І не хвалюйся вельмі, дружа: неўзабаве скончацца твае хваляванні, бо з нечага будзе плавіць тол, не будзе і патронаў, якія даводзіцца раўнаваць. Вось тады што ты запяеш!

«А Пажогу я ўсё-ткі пакручу хваста!»

Захар дапіў малако, падзякаваў і паставіў парожні кубак на донца снарада. Ён заспяшаўся да каня, спіна якога была відаць ужо ў канцы жытнёвага кліна. На дарозе, як толькі ступіў на яе, згледзеў, што слупа ўжо няма, ён ляжаў далей, а конская спіна ўвесь час марудна аддаляецца, як сплывае за жыта, і пакрочыў шпарчэй. У канцы поля дагнаў каня.

Пачуўшы Захаравы крокі, конь узняў галаву, пахітаў ёю, быццам вітаў яго, і зноў зарыўся пысаю ў густую канюшыну. І хай сабе, хай шчэ крыху папасвіцца. Трэба было гэта адразу зрабіць, як толькі спыніўся, адпусціць каня, хай бы папасвіўся. А ён яго да слупа, вось конь і звярнуў яго.

Захар сеў на траву, пасядзеў крыху ў задуменні. Ад таго, што пасядзеў, нізка сагнуўшыся, запыла шыя, і Захар, не здымаючы скуранкі, расцягнуўся на траве.

Жыта пагойдвалася, і ўсе каласы здаваліся буйныя, важкія. Ён узяў адзін, растрыбушыў на далоні, падзьмухаў і ўзяўся лічыць зярняты; далічыў да адзінаццаці і збіўся — прыгадалася жытнёвае поле, дзе летась ляжаў паранены Балаш. Як ён прасіўся тады на поле з сасоннiку, каб пачуць пах жыта, пачуць пошум каласоў... Нешта вельмі часта апошнім часам ён, Захар, пачаў прыгадваць тое поле!.. А сапраўды, хораша ж вось так і памерці, у полі, слухаючы шалахценне жыта, адчуваючы на сваім твары подых ветру. Слухаць, потым заснуць і не прачнуцца болей... Не, глупства гэта. Там, у доле, не пачуеш шолаху каласоў. І паху жыта не пачуеш. Тут, на зямлі, ён павінен яшчэ зрабіць сваё! А заснуць хвілінку не пашкодзіць. Як гэта казаў Ціхан? Дзесятачак хвілінaчак паспаў — і суткі стомы не ведаеш. «Тэарэтык, аднак, мой брат...»

Захар заплюшчыў вочы і, дзіўна ўлагоджаны, заспа-

коены, правальваўся ў сон; ён чуў, аднак, як венькаюць цуглі, як ціха форскае конь, і малюнак жытнёвага поля, якога вочы ўжо не бачылі, па-ранейшаму не знікаў, жыў, пераліваўся жывымі, натуральнымі фарбамі. Потым пачуў песню, якую спявала Гайдаш, і адразу пазнаў яе голас — песня гучала якраз у тым баку, дзе толькі што мільгала за вербалозамі чырвоная хусцінка; пачуў і не здзівіўся, што Гайдаш апынулася тут, і слухаў песню, і сэрца яго замірала. «Наши хаты сожгли, наши семьи ушли — только ветер в развалинах воет...»

Захар ведаў гэтую песню — яе прывезла ў атрад Рыма. Але цяпер ён слухаў яе, зачараваны і голасам Гайдаш, дужа напеўным, сакавітым і гучным, і тым новым, што адкрывалася яму ў простых і вядомых словах. Гайдаш не спявала, а як бы размаўляла з ім, раілася і бедавала. І ён захваляваўся. Каб жа яна не прайшла далёка, не пайшла дарогаю на лагер! Каб павярнула сюды!

Ён зноў глядзеў на кусткі вербалозаў, дзе то правальвалася, то зноў вынырвала з-за шэра-попельных хісткіх пагоркаў чырвоная хусцінка, і прагна чакаў, каб Гайдаш павярнула сюды. І яна павярнула, ішла па ўзмежку зусім блізка і вяла рукою па каласах — гэтак жа, як і ён, калі шнураваў да кухні,— і жыта гнулася ў яе пад далонёю і зноў выпроствалася. Рука то ападала, то ўзнімалася, быццам зыбалася па хвалях.

Гайдаш убачыла Захара і не спалохалася і не здзівілася, потым спуджана войкнула, кінулася да яго, прысела на кукішкі.

— Бачыце, бачыце, таварыш камандзір, што прыключылася. Я ж казала, што руку трэба перавязаць! — і засмяялася ласкава і добра.— Загаілася рука. І зусім жа загаілася.

Ён глядзеў на яе, прымружыўшы вочы — рабіў выгляд, што спіць. Адчуваў, што яна ўсё заўважае, і дзівіўся. Як яна дзіўна глядзіць на яго! Як бы пасміхаецца з таго, што бачыць яго спробу прыкінуцца. І зусім жа не бянтэжыцца. Ля правага вуха, заціснутая пад чырвоную, у белую палоску, хусцінку, зыбаецца валошка — чатыры кветачкі на адной буйнай сцяблінцы.

— А я ў Пятроўцы кіруюся,— паведаміла яна, хоць ён маўчаў і нічога не пытаўся.— Дамоўлюся з жанчынамі, каб насушылі чабору і святаянніку. А потым у кузню заскочу — Артур абяцаў толу. Але не плаўленага. З плаўленага мазь горшая. У Ліцвінаве я ўсю каросту

павыганяла. Людзі дзякуюць. А тут — далёка мне ісці,— яна зняла з пляча проціваґазавую сумку, разбухлую, напханую печым, кінула яе на ўзмежак. Потым павярнулася, насунула сумку, села зручней, як прыхінулася спіною да жыта.— А вы спалі ж, я гэта заўважыла здалёк шчэ...

Цяпер ён ва ўпор разглядае яе, не злуючыся, што яна парушыла тую дзівосную хвіліну заспакоенасці і ўлагоджанасці. Выправілася ў Пятроўцы? Ну і хай бы сабе ішла! Дык не ж, сюды ёй собіла завярнуць. А-а, у кузню ёй трэба. «Артур абяцаў толу». Дык няма ж Артура, пад самы горад паехаў, толькі пад раніцу і вернецца. А ёй — Артура падай. Дзівак ты! Сам жа хацеў, каб яна сюды павярнула! Як не клікаў амаль!

— Натаміўся, дык вось лёг,— прызнаўся Захар.— І конь пасвіцца. Тут канюшына добрая...

— А мне падалося, што вы захварэлі,— і Гайдаш рашуча паклала яму далонь на лоб.— Гарыць крыху галава... Не, падалося толькі.

— Спаў жа, кажу ж, спаў, і добра, між іншым...

— А я, дурніца, пабудзіла. Спіце, спіце... Сумку пад галаву пакладу. Яна чаборам напханая, мяккая.

Гайдаш бесцырымонна прыўзняла яго галаву, падсунула сумку, і ён прыняў гэты клопат як належнае, нават пажартаваў:

— А што, і някепска.

— А, не бачна! Які ж у цябе стомлены твар! — яна гаварыла яму «ты», і голас гучаў не строга, а мякка і даверліва — гэтак гаворыць звычайна ўрач хвораму чалавеку.— Паспаць трэба, адпачыць, сілы набрацца. Скажы сабе: я сплю. І зноў паўтарай тое ж самае: сплю... І яшчэ: мне трэба спаць...

Захар паўтарыў тыя словы і добра чуў, што сапраўды паўтарае яе словы, і яны зноў вярнулі яго ў свет заспакоенасці і ўлагоджанасці. Шапацела спелая збажына, запаволена венькалі цуглі, з рыпеннем храбусцела канюшына, якую конь скуб у канцы жытнёвага кліну, і ўсе гэтыя гукі гушкалі, закалыхвалі. І як жа хораша яму, Захару, ляжаць тут і слухаць жыццё хлебнага поля! І як жа хораша шамаціць ад ветру збажына, як суха шурхаюць каласы і якая ласкавая ад іх цеплыня. Не, гэта не ад каласоў цеплыня — рукі Зінаіды гэткія цёплыя. Адкуль жа тут Зінаіда? Ён жа толькі што з Гайдаш гаманіў! Не, Гайдаш недзе тут, паблізу, а побач — Зінаіда. І нешта

яна, Зінаіда, усё шапоча, шапоча... А-аа, знаёмыя папрокі! Як у Віроўлю ён прыедзе, дык яна, Зінаіда, рэдка бачыць яго: не пасядзіць, не пагамоніць ён толкам — усё з цесцем бавіцца ў кузні. А калі і адзін, дык справу тут жа знойдзе — лупіць калуном бярозавыя цурбакі на падворку пад паветкаю.

Ласкавы дотык Зінаідзіных пальцаў слабеў, слабеў і шэпт, і словы гучалі цяпер як здаля, быццам Зінаіда сядзела недзе ў жытах.

— Ссівеў, мой саколічак... Бялюткі амаль... Увесь бялюткі зрабіўся...

Дзіўна! Гэта ж Гайдаш голас! Так, яна гэта гаворыць! І яна ж вось і стаіць у жыце, а справа ад яе — захмаранае сонечнае кола. І кола неяк праясніваецца, зыркае робіцца, чамусьці паўзе ў бок дарогі — яму да лесу трэба хіліцца, а яно, кола гэтае, на ўсход верне — і цяпер вось пакацілася назад, завісла пасярэдзіне жытнёвага кліна. Якое ж яно яркае цяпер, сляпучае, зачапілася вось сваімі промнямі за каласы і ўсё зыбаецца, зыбаецца, штурхае Гайдаш сюды, да ўзмежка, дзе ляжыць ён, Захар...

Як жа нясмела ідзе Гайдаш! Пройдзе крокі са два, спыніцца, стаіць, галаву апусціўшы. Села вось побач, а ўзняць на яго вочы не хоча. Толькі нешта дужа ціха гаворыць...

«Збаялася. Яна мяне збаялася...»

Адкрыццё ўзрадавала яго, і ўзрадавала дзівосная сіла, якая адчувалася ў руках і плячах і бруілася ва ўсім целе. І яшчэ больш узрадавала дзівоснае падабенства галасоў: як Зінаіда, Гайдаш гаворыць. І вочы ў яе дужа падобныя, дужа, і ўся яна, Гайдаш, на Зінаіду падобная. Гэткая вось была Зінаіда, калі ён упершыню пацалаваў яе на беразе Дзвіны: цёмныя кудзеркі над чыстым белым ілбом, шырокія дужкі броваў, сінія, як валошкі, вочы і адбітак яго твару ў тых блішчастых зрэнках. І гэткага ж колеру жыта! Яна тады пагадзілася паехаць з ім рыбаліць, і ён выбраўся з чоўна на бераг, на пакаты ўзвал, і ад самага ўзвалу да лесу жаўцела вось гэткае ж спелае жыта.

«І зусім падобная рука! Ну, зусім падобная!..»

Рука Гайдаш была цёплая, і ён адчуваў гэтую цеплыню, і зусім блага бачыў стрэлкі гадзінніка. Пад яго пальцамі трапятка біўся ў яе кісці пульс, і кожны штуршок крыві ў яе руцэ грымліва тукаў яму ў скроні, і стрэлку гадзінніка быццам рухалі гэтыя штуршкі крыві,

і яна соўгалася рыўкамі, і гэтак жа, рыўкамі, дугаліся яе бровы. Захар правай рукою пагладзіў гэтыя бровы, быццам намагаўся спыніць дуганне, якое замінала яму ўбачыць стрэлку гадзінніка. Рука яго не затрымалася на твары, пальцы саскочылі з броваў і пасунуліся да скроні. Пад мезенцам ён адчуў усё тое ж пульсаванне крыві, што адчувала рука, якая ляжала на запясці.

Праз мезенец у руку, потым у плячо і ў голаў ударыла Захару гарачая тлумнасць. Ён прыцягнуў Гайдаш да сябе, і яна неяк дзіўна напружылася і тут жа звалілася ў канюшыну ля яго пляча, павярнула да Захара радасны, умольна-шчаслівы твар. Ён пацалаваў яе ў вусны, і яна, нібыта чакала гэтага знаку, парывіста і моцна абвіла Захараву шыю рукамі, крутнулася, як бы завінчваючыся пад яго калені.

— Нягоднік я,— глуха, з нянавісцю да сябе прабубніў Захар.— Разумееш? Апошні нягоднік!

— Жаданы мой... Сівенькі... Зусім жа сівенькі...

Шэпт аглушыў Захара, у скронях забомкала, і ён прамовіў таксама шэптам гарачым і таропкім:

— Сівенькі нягоднік. Разумееш?

— Разумею, разумею, разумею...— Яна прагна, але няўмела цалавала Захара і цвердзіла адчайна і ўмольна: — Маўчы! Маўчы! Маўчы!

Ён глух ад яе шэпту і па-сапраўднаму ненавідзеў сябе за тое, што здраджвае Зінаідзе, ненавідзеў і разумеў сваю нянавісць, разумеў, што хоча, каб ласкавы шэпт не сціхаў, разумеў, што здраду ніколі сабе не даруе, і яшчэ больш выразна разумеў, што бясконца ўдзячны Гайдаш, якая прагна і шчыра галубіць яго.

Шэпт аціх раптоўна, і ў галаве адразу як пасвятлела. Ён адкрыў вочы і нейкі міг ляжаў прыгаломшаны, слухаючы, як пазвоньваюць цуглі, як форскае ледзь не ля самых ног конь і каляным шурханнем гудуць пераспелыя сухія жыты; у целе была лёгкасць незвычайная, нібыта ён быў пусты ўсярэдзіне. Захар працягнуў руку, пакратаў каласы, і тады як што выбухнула ў ім, і ён імкліва сеў. І тады адразу ўсё тое, што было толькі што ім перажыта, паўстала перад ім аголена і бязлітасна. Ён разумеў, што ўсё гэта было ў сне. Сон адляцеў, але нянавісць да сябе, перажытая ў сне, засталася, жыла, і ён не мог закрэсліць, адкінуць і яе, і сарамлівую радасць, якая невядома адкуль заявілася і якой — ён гэта добра памятаў! — не было ў сне.

Конь раптам перастаў скубці траву, стаяў побач, глядзеў на Захара, крыху нахіліўшы галаву, і ў яго бліскучастых агатавых вачах Захар бачыў свой адбітак.

## 12

Усцяж усёй лініі абароны другой роты, якая разразала ўзгорак, рэдкай шчоткаю тапырыўся заінелы хмызняк, што быццам не рос у зямлі, а трымаўся на снезе, які чамусьці тут, на пагорку, мацней і шчыльней, чым у нізіне, на полі і ля дарогі, зацярушыў слаба прамерзлую зямлю. За хмызняком праглядваліся макавіны прырэчных лазнякоў, за якімі, быццам пасаджаны на тонкае голле, жаўцеў супрацьлеглы бераг Дзвіны. Дзвіна была даволі далёка, і сасновы бор на глiністым абрыве, толькі месцамі зацярушаны снегам, здаваўся шчыльным, як сцяна.

Пакінуўшы лёгкі вазок на ўскрайку лесу, Захар марудна ўзбіраўся на пагорак. Ля вялізнага валуна, што вытыкаўся з зямлі вострай, як зламанай бакавінай, ён спыніўся і адразу ж учуў, што спыніўся і Файзуло, з якім яны прыехалі сюды. Захар маўкліва паглядзеў за раку, потым перавёў позірк на акопы, што ў двух напрамках, пад вострым вуглом, прарэзалі пагорак, чакаў, што Файзуло будзе зараз нешта тлумачыць. Але Файзуло маўчаў з гэткім выглядам, быццам тлумачыць нешта павінен быў ён, Захар, быццам загадзя ведаў, аб чым пачнецца гаворка, і рыхтаваўся адразу ж не пагадзіцца з тым, што пачуе.

У дарозе Файзуло пачаў быў зноў даводзіць тое ж, што даводзіў у верасні, калі рыхтаваў на гэтым пагорку абарону свайго ўзвода: цвёрдая абарона ў зоне кожнай роты, маўляў, непатрэбшчына, што па іншае ім трэба прыцэльвацца, і трэба ў гэтым пераконваць Гусарава. Але Захар і тады, і цяпер спрэчку не падтрымаў. Стварэнне цвёрдай абароны сваёй зоны — не прыхамаць Гусарава, а загад Ціхана, і ён, Захар, яго выконваў і цяпер, збіраючыся на сустрэчу з Ціханам, вырашыў сам на свае вочы ўбачыць, чаго варты зімой, у снезе, акопы, што былі зроблены ўвосень.

І не толькі гэта — разуменне таго, што Ціхан жа, напэўна, пацікавіцца акопамі! — прывяло Захара сюды, на лінію абароны першай роты. Захар даўно ўжо зрабіў для сябе пэўную выснову: Ціхан ведае значна больш за яго, і таму ён павінен не толькі давяраць яго вопыту, але заў-

жды крытычна ставіцца да сваіх уласных рашэнняў і навучыць гэтаму ўсіх камандзіраў рот і ўзводаў. Аднак жа бачыш, як да такой навукі хінуцца! Зірнеш толькі на твар Файзуло — і ўсё разумееш. Паганая рыса ў чалавеку — самалюбства. Нават не самалюбства, а вось гэткая пыха!

Позірк запыніўся на брустверы бліжняга акопа, замаскіраванага нядбала і неахайна, і Захар капнуў ботам снег:

— Гэта што, маскіроўка ў вас завецца?

Файзуло чотка казырнуў:

— Так точна, таварыш камандзір. Маскіроўка. Але — падманная.

Увішнасць Файзуло, увішнасць падкрэсленая і разлічаная на тое, каб падкалупнуць, Захара пакарабаціла.

— Якая? — спытаў ён строга, як бы дакараючы Файзуло гэтай сваёй строгасцю.

— Падманная. Каб у зман увесці... Пару разоў з іх стралянем, а потым — на той пакоцімся пагорак. Там, бліжэй да лесу,— асноўная лінія. Там, калі давядзецца, паспрабуем затрымацца...

— Як гэта, «паспрабуем»? Вядзі на тую, асноўную,— і, пераскочыўшы акоп, пакрочыў шпарка, пры хадзе абураючыся: — «Калі давядзецца», «паспрабуем»... Каб я болей гэткіх слоў ад цябе не чуў.

— А якія б вы хацелі пачуць?

— Свой рубеж узвод будзе трымаць памёртва. I — ні кроку назад! Вось якія словы...

Файзуло параўняўся з Захарам, але не абагнаў, крочыў плячо ў плячо. Не тоячыся, з сумнай развагаю, уздыхнуў:

— I — ні кроку назад! Мне гэтыя словы даліся ў знакі: я часта нагадваю, як Браткоўскі іх нашаму камбату казаў. Тады, у той першы дзень. Ля граніцы...

У нечаканым, з гарыччу, прызнанні былі і папрок, і нядобразычлівасць, і Захар, павярнуўшыся, ва ўпор зірнуў на Файзуло. Але нічога не прачытаў на яго твары, смуглявым, blішчастым, як бы намасленым і замкнёным, неабуральным, бы выразаным з старога, высмаленага сонцам дрэва; дзве светлыя звілістыя баразёнкі — след не зусім яшчэ прасохлага поту — віліся на шчоках, і шчокі здаваліся пераціснуты імі, бы вузенькімі раменьчыкамі.

Моўчкі яны дайшлі да акопаў, якія вузкім клінам сыходзіліся на бліндажы, замаскіраваным старанна і дбала.

Захар, усё яшчэ разважаючы над горкім прызнаннем Файзуло, не адразу прыкмеціў гэты бліндаж, зроблены трывала і падзейна, але, заўважыўшы, адразу ж і шчыра ўхваліў:

— Вось гэта — абарона. А дзе месца «максіму»?

— Ву-унь ён стане,— і, заўважыўшы, што Захар не прыкмячае спецыяльны акоп управа ад бліндажа, паказаў рукою на вузкія кусцікі заіпелага палыну.— Ля палыну. Бачыце? Тут маскіровачка — першы гатунак,— і неяк дужа весела дадаў: — Э-эх, каб мне гарматачку туды, пад лясок, паставіць. Адну-адзінюсенькую. Тады ўжо — ні кроку назад!

— А без яе?

— Казаць напраўду, як ёсць? — спытаў Файзуло, як бы чакаючы дазволу.

Дрымотная санлівая ціша асела наўкола, здавалася, яна маўкліва і маруднa паўзе з нізіны, што белым палагам ляжала ад лесу да ракі. Нізіна, прарэзаная дарогай, была відаць з канца ў канец і нагадвала возера са звілістай палосай-зімнікам пасярэдзіне.

«Зусім як у Віроўлі возера...»

Перад вачыма паўстала возера, якое было за вёскай і куды яны з цесцем звычайна цягаліся на вечарах у рыбу. Вада ў тым возеры, нават у непагадзь, выдавала светла-блакітнай, амаль белай — дно было камяністае і ля берагоў выслана белым пяском,— і яно заўсёды нечакана краёчкам вытыркалася з-за павароткі ледзьве прыкметнай палявой дарогі, што вілася ля ручая, потым агінала возера з усходняга боку і пад прамым вуглом упіралася ў жоўтую, як вохрай пафарбаваную, гравійку.

— Як ёсць, ведама ж,— дазволіў Захар, адкідаючы ўспаміны.

— Так што давядзецца і не адзін крок назад рабіць. А потым — бегчы... І ўвогуле...

— Пачаў, дык ужо вядзі да канца!

— А што тут да канца? Марная праца, гэтая абарона,— хмурна праказаў Файзуло, і Захар заўважыў, што казаць яму гэтыя словы цяжка і ён увесь час перасільвае сябе.— Пару танкаў яны пусцяць? Пусцяць. І — сапхнуць нас з гэтае вышынькі. І я гэта добра разумею... І я вось загад выканаў, гэтую лінію пабудаваў, зрабіў усё як след, вопыт франтавы выкарыстаўшы. А ў галаве што? А раптам фашыст знарок нам усё гэта дазваляе? Каб прывязаць нас да гэтай лініі, каб сілу мы сваю яму на далонь-

цы выставілі. А ён, сілу нашу разведаўшы, ды на ёй — чар-ча-ах!

— А ў цябе ад гэтага «чар-ча-ах» ужо і душа трымціць?

— Кепска гаворыш, таварыш камандзір!

— Скажы лепей. Скажы тады, што, па тваю думку, лепей.

— Што лепей? — з гатоўнасцю спытаў Фаізуло.— Скажу... Лепей не акопы нам выграбаць, а — ворага біць. Рухацца. На месцы не сядзець. Тут злаўчыўся — ударыў сёння. Там злаўчыўся — заўтра гвазданўў. І гэтак — штодня. Каб баявы рахунак у кожнага з нас рос. Гэта — галоўнае!..

Для Захара не новыя былі гэтыя думкі, не новыя сумненні, не новыя пярэчанні. Ён іх ужо чуў неаднойчы і сам нейкі час знаходзіўся пад іх уплывам. Больш таго, нават спрабаваў прыблізна гэтак жа спрачацца з Ціханам, даводзіць прыблізна тое ж, што зараз гэтак рэзка і горка выпаліў Фаізуло. Ціхан загадаў «выкінуць смецце» з галавы, і ён, Захар, успрыняў гэты загад па-салдацку: загады камандзіра не абмяркоўваюць, а выконваюць.

Захар гэта прыгадваў неаднойчы, прыгадваў зусім нядаўна, і чым больш прыгадваў, тым усё больш пераконваў сябе. Сёння ў Захара ўжо нічога не засталося ад былых сумненняў, цяпер былыя сумненні зрабіліся перакананнямі. Яшчэ ў той час калі ён у верасні вяртаўся ад Ціхана, ён ехаў праз зону, якую кантралявалі іншыя партызанскія атрады, глядзеў на партызанскія акопы і канчаткова пераканаўся ў неабходнасці мець гэтую нерухомую, стабільную лінію абароны зоны, што гэта не прыхамаць нейкага з зацятых штабістаў, а новая тактыка, якая склалася зусім аб'ектыўна, як вынік шырокага і ўсенароднага партызанскага руху.

— Галоўнае зараз не толькі гэта,— памяркоўна прамовіў Захар, удзячны Фаізуло за шчырасць.

— Не г-гэта галоўнае? — Фаізуло напярхнуўся нават, рэзкім рухам папраўіў парабелум на рамяні. Прыжмураныя вочы яго зрабіліся падобныя на дзве вузкія шчылінкі.— Не баявы рахунак, кажаце, галоўнае? А што? Што? — неяк адчайна запытаўся ён і, як сабе гаворачы, тут жа і адказаў: — Баявы рахунак ёсць самае галоўнае для кожнага з нас. Таварыш Гусараў што казаў? Разгортвайце шырэй баявое спаборніцтва ва ўзводах, павялічвай-

це баявы рахунак! Дык што, цяпер гэты загад — ішаку пад хвост кідаць?

— І казаў Гусараў правільна. І загад правільны!

— Слава алаху! — радасна выгукнуў Файзуло.— Я — салдат. Я сваіх арлоў як арыентую? На перамогу ў спаборніцтве. Мы хто? Першы ўзвод першай роты. Ва ўсім, значыцца, першыя і павінны быць,— гаворка гэтая ўзвінціла Файзуло, ён казаў ярасна, быццам дзівячыся таму, што Захар не разумее яго, як разумее кожны ў першым узводзе.— Кожны ўдар па ворагу, па захопніку — галоўнае. І з гэтага мяне не сапхнеш. З акопаў могуць выбіць, калі танкі... А вось з гэтае тактыкі, з клопату, каб баявы рахунак майго ўзвода рос штодня — з гэтага мяне не зрушыць аніякая сіла...

Упартасць Файзуло, з якой Захар сустракаўся і раней, не здзівіла, нават не раззлавала, ён прыняў пярэчанне спакойна, заняты зусім іншай думкай. «Майго ўзвода!..» З якім націскам, з якім гонарам прамовіў гэта Файзуло! І ты павінен гэткіх вось абстраляных салдат слухацца, вопыту іх давяраць. Файзуло быў у страшэнным агні, і вось вылез, жывы вылез. А Пахом — застаўся. Выпадковасць нейкая — і няма чалавека. Так, каму як павернецца на вайне. Ягору вось як пашчасціла. Дзіўна толькі, чаго гэта Файзуло прыгадаў той першы дзень ля граніцы і гэтага, невядомага Захару Браткоўскага? Каб яго, Захара, з ім параўнаць? І ў чыю карысць гэтае параўнанне?..

— Давай далей,— мякка папрасіў Захар.

— Далей? Я ўсё сказаў.

— Пайшлі, кажу, далей. Абарону глядзець...

Яны ўзняліся па схіле на самую вышыню пагорка, адкуль лінія добра замаскіраваных акопаў ішла ўніз, потым крута вярнула на гліністы ўзлобак, дзе, як падкапаныя з аднаго боку, ляжалі, нахіленыя ўсе ў бок ракі, вялізныя валуны. Здаецца, закрані, і яны пакоцяцца ўніз. І як добра відаць адсюль, з пагорка, паваротка Дзвіны. Пасярэдзіне ракі плынь шчэ не скарылася марозам, і вада, сціснутая белым ільдом, выдае чорнай. Лёд таксама не роўны па колерах: белы толькі ля берагоў, а чым бліжэй да вады, якая не замерзла, цямнейшы, ляжыць шырокімі няроўнымі палосамі.

Крыху ўлева ад тых валуноў, бліжэй да лесу, летась стаяў ён разам з Ціханам. Ціхан пасля актыву па млыне — па другі дзень раніцам — схацеў паехаць у Падкасцельцы, і яны былі тут. Ціхан яшчэ, жартуючы, паспраба-

ваў скрануць з месца адзін з тых валуноў: вось і нам, маўляў, трэба ў баі гэтак жа за зямлю трымацца — не скранеш. Тады таксама быў не сонечны дзень, хмарны, і далеч над лясамі была шэрая, і лясы былі шэрыя, змрочныя, і змрочнымі выглядалі і гэтая наваротка ракі, і хаты Падкасцельцаў, што быццам спуджана трымцяць удалечыні за лазнякамі. Брама, помніцца, сказаў тады нечакана Ціхан, брама, маўляў, у тваю партызанскую зону...

Захара тады не дужа ўразіла адкрыццё, якое зрабіў Ціхан. Але зараз ён вельмі выразна злавіў гэтае падабенства з брамай. Снег абвастрыў грані, далягляд адсунуўся, адкрылася далеч, і вузкі калідор паміж лесам і берагам Дзвіны відаць з краю ў край; лясы ў тоё далечы амаль на адным узроўні з лазнякамі, і гэта сапраўды нагадвае нейкі калідор, у якім ляжыць аснежаная нізіна, пакручастая стужка дарогі і дрыготкія за лазнякамі стрэхі хат. Пагорак быццам запірае тую браму. Слаўная пазіцыя для абароны. І дарэмна Файзуло скардзіцца, што лёгка сапхнуць з пагорка абаронцаў акопаў, калі яшчэ дарогу і нізіну замініраваць. А сюды, на ўзлобак, паспрабуй ускоч на танку! Нешта, аднак, тут зусім не так ціха, як там, у нізіне. А-а, недзе паблізу пастуквае сякера, пазвоньвае піла...

Захар прайшоў крокаў дваццаць, арыентуючыся на цвырканне пілы, і ўбачыў яшчэ адну лінію акопаў на схіле пагорка, за рэдзенькай палосаю маладога бярэзнічку. Адтуль цяпер звонкае шорханне рыдлёўкі, як дзяўблі ёй глебу.

— Другі вузел абароны абсталёўваем,— патлумачыў Файзуло, заўважыўшы, што Захар уважна глядзіць на вузкі ўваход у бліндаж.— «Максіму» нашаму запасную хату ладзім...

Захар весела хітнуў галавой:

— А ты хітру-ун!.. «Давядзецца», маўляў. «Паспрабуем», маўляў. А сам — кратом у зямлю зарываешся... А гэтыя калкі за хмызам навошта?

— Дзе? А-а... Міны.

— Пажога ж плакаўся: толу, маўляў, няма.

— Учора дзве бомбы знайшлі. Сёння выплаўляюць тол. Так што дадаткова міны паставім да тых, што на дарозе. У нізіне.

— У нізіне, тут? Адтуль жа табе небяспека не пагражае!

— Другому ўзводу пагражае. У іх акопы туды, у бок лесу павернуты. А нізіна ж гэтая слаба прастрэльваецца

і ад іх і ад нас. У-уу, каб яны пізінаю супуліся. Сядуць там макам!

Захар выгукнуў, не стрымліваючы сваііго захаплення:

— Та-ак, закрыў ты брамачку крэпка, шчыра скажу табе. Вопыт! Дарагі вопыт маеш.

— Не так дарагі, як дорага дастаўся.

— Дарагі вопыт у цябе,— паўтарыў Захар дабрадушна і дадаў разважліва, адчуўшы, што не скончыў пядаўнюю спрэчку з Файзуло, што павінен выказаць да канца і сваю асабістую думку: — Але чаму, такі вопыт маючы, столькі хібаў у тваёй тэорыі?

— Не разумею, таварыш камандзір. Якія хібы? У якой тэорыі?

— Склаў ты тэорыю і не заўважаеш: акопы, маўляў, замінаюць павялічваць баявы рахунак. А я лічу, што аніяк не замінаюць. І безумоўна, трэба павялічваць рахунак, і рабіць як мага больш дыверсій, і знішчаць ворага паўсюль. Але галоўнае зараз у чым? Не пусціць ворага туды,— Захар зрабіў кароткі і рэзкі ўзмах рукою, паказаўшы ў прастору за сваёй спіною.— Там жа не проста наша зона. Там — людзі. Там — хаты людзей. Там — тысячы акон, з якіх глядзяць на нас як на сваіх абаронцаў. І вераць, што мы не пусцім ворага, не дамо рабаваць вёскі...

Файзуло, крыху жмурачыся, глядзеў не на Захара, а перад сабою, глядзеў уважна і напружана, быццам сіліўся разгледзець нешта дзіўнае, што ён раптам прыкмеціў, і Захар, згледзеўшы яго позірк, нечакана падумаў пра тое, што, мабыць, у свой час ён, Захар, бачыўся Ціхану вось гэткім жа, як зараз Файзуло бачыцца яму. У пярэчанні Файзуло ёсць, аднак, і шмат слушнага, над чым варта разважаць. Тактыку партызанскай барацьбы нельга разглядаць як нешта назаўжды нязменнае, трэба ўдасканальваць яе, шукаць усё новыя і новыя формы, найбольш актыўныя, плённыя, дзейсныя.

— Я ўсё разумею, таварыш камандзір. Усё разумею... І што зона наша — нож востры ў спіну гітлераўцам, і што мы непасрэдна ў тыле трэцяй іх танкавай арміі, якая трымае фронт пад Віцебскам, і што мірыцца з гэтым яны не будуць...

Файзуло перапыніў Захара з выклікам, быццам папракаў яго за павучанні, у якіх ён зусім не мае патрэбы, і выслухаў толькі з тае прычыны, што ён падначалены; і ў тоне пярэчання Захар злавіў пязгоду. Але ён не пакрыў-

дзіўся, прыняў яе за належнае, памяркоўна пагадзіўся:

— Што ты ўсё разумееш — добра, безумоўна. Але трэба, каб кожны ў тваім узводзе гэтак жа мог аб сабе сказаць. Кожны — вось у чым загваздка,— і, прыгнуўшыся, зазірнуў у вузкую шчыліну бруствера, заўважыў ухвальна: — Добрыя акопы! Добрая і надзейная лінія абароны,— і ўсміхнуўся.— На лінію не спадзяешся, а робіш з душою, па-майстэрску. Глыбіня — з запасам нават...

Файзуло, адмятаючы снег далапёю з краёчка бруствера, таксама ўсміхнуўся ў адказ:

— Жыццё навучыла. Яшчэ ў сорак першым навучыла. Каб тады, памятаю, камбата свайго не паслухаў, паленаваўся глыбіню ў траншэі даць, дык не сядзеў бы зараз на гэтым пагорку. Камбатавым розумам я і сёння жывы...

Зноў у голасе Файзуло прагучаў нейкі выклік, і Захару падалося, што той па-ранейшаму ў чымсь не згодны з ім, не згодны, але не спрачаецца і спасылаецца ў другі раз сёння на той першы дзень вайны знарок, каб не толькі падкрэсліць свой баявы і вайсковы вопыт, але і тое, што ёсць навука вайны, і гэтаю навукаю яго былы камбат, Захараў брат, валодае даскапала, а ён, Захар, чалавек зусім не вайсковы, прафесіі мірнай, і таму ён павінен, калі ён чалавек разумны, паважаць гэты вопыт, ставіцца да яго з даверам, бо гэты вопыт — горкі, аплочаны крывёю, жыццём людзей. Падумалася яшчэ, што Файзуло спецыяльна ўсё падкрэслівае: Ягор выйшаў жывы з пекла, бо авалодаў навукаю вайны, Пахом жа загінуў, бо авалодаць ёю не паспеў.

Захар зноў зазірнуў у вузкую шчыліну на брустверы акопа, і яму на нейкі міг падалося, што там, удалечыні, за лазнякамі, разлёгся не бераг Дзвіны, а бераг возера, таго возера, ля якога вёў свой апошні бой Пахом...

Гэта ўяўленне было на дзіва выразнае, і яно збянтэжыла і напалохала. Захар вылез з акопа, агледзеўся паўкола. Думка пра тое, што яму толькі што памроілася, упарта не знікала, увесь час непакоіла і хвалявала, і Захар, баючыся зірнуць на Файзуло, які стаяў яшчэ ў акопе, спытаў, чамусьці не назваўшы імя свайго брата:

— Скажы, ля той лазні ён мог знайсці іншае выйсце? Ці такога выйсця ўвогуле не існавала?

— Казаць, як думаю цяпер? Ці як тады думаў?

— А што, ёсць розніца?

— Шчэ і якая! У нас кажуць: сядзець на двух ішаках можна. Ехаць толькі нельга.

— Мудропая пейкая алегорыя.

— Бяда, якую пе пераўжыў, заўсёды здаецца простая...

Ціснула сэрца пезразумелая трывога, пе было сілы стаяць на месцы, спакойна размаўляць, і Захар прапапаваў, сам дзівячыся намяркоўнасці свайго голасу:

— Пайшлі, агледзім усе акопы...

Ён аглядаў лінію абароны прыдзірліва, і Файзуло, разумеючы яго настрой, стрымапа даваў тлумачэнні.

— Па-гаспадарску абарона скляпапа,— сказаў Захар.— Гэта трэба прызнаць. Рабіў усё, як сабе...

— Гэта ўжо точна — сабе! Мне заўжды шанцуе: як што самае цяжкае — Файзуло аддадуць.

— Спадзяюцца. Вось і аддаюць...

Файзуло прыняў ухвалу спакойна, як тое, што яму належыць даўно і законна, і Захар падзівіўся з гэтае вытрымкі і пазайздросціў ёй. Наважыўся быў ухваліць і яе, але не паспеў. Раскаціста гакпуў удалечыні адзін гарматны стрэл, затым другі, трэці, і рэха стрэлаў і гарматных выбухаў загуло над полем, быццам выскачыла з лесу і пакацілася па снезе.

Файзуло моўчкі зірнуў на Захара, счакаў, услухоўваючыся.

— Саракапятачка наша гэта...— сказаў ён устрывожана і азіраючыся наўкола.— А кулямётаў не чуваць. Толькі гармата лупіць.

— Дзе ж лупіць? Аціхла. Сем стрэлаў было. Гэтак?

— Я не лічыў, слухаў толькі... Гэта ля Пятроўцаў, думаю.

Стрэлаў болей не было, пакрысе растала і рэха. Захар, як прыкуты, не рухаўся з месца. Падобна, што Файзуло правільна вызначыў: у бок Пятроўцаў біла гармата. Значыцца — атрадная. Але па кім яна біла? Бою ж не чуваць аніякага. Нешта незразумелае. І невядома, куды імчаць, каб даведацца. І Файзуло маўчыць, толькі галавой круціць.

— Бачу рух. На санях, здаецца, імчаць,— прамовіў Файзуло і пачаў таропка расшпільваць футарал бінокля, які цягаў пад кажухом.— Пыл толькі белы курыць...

— Дай сюды,— і Захар амаль выхапіў з рук Файзуло бінокль.— Здаецца, нашы.

— А па кім жа тады саракапятка малаціла?

— Сказаў бы, каб ведаў!

— Гэта ж Калечыц коціць! Яго конь!

Захар падкруціў валік рэзкасці. Так, сапраўды, сіні

вазок разведчыкаў выкаціў з лесу і імчыць дарогаю. Але ж і вочы ў Файзуло! На гэткай адлегласці ён і вазок і Калечыца пазнаў!

— Навошта ты толькі бінокль цягаеш,— сказаў Захар, аддаючы бінокль Файзуло.— Усё роўна простым вокам лепей бачыш. Аддаў бы каму-небудзь, у каго зрок горшы.

— Джыгіты! З песняй гоняць,— у захапленні выгукнуў Файзуло, як бы і не пачуўшы Захаравай прапановы аддаць каму-небудзь бінокль.— Яны, разведка, не могуць, каб не спяваць. Э-э, хараша ідуць!..— Файзуло працёр шкельцы, запхнуў бінокль у футарал, зашпіліў кажух і паўтарыў: — Э-э, хараша ідуць джыгіты. У разведку толькі не трэба з песняй.

— Значыцца, няма бяды, калі спяваюць. Усё ладам, таму і едуць з песняй...

Кудлатае воблака пылу наблізілася пад узгорак, ад якога пачыналася першая лінія акопаў, і зусім выразна чулася цяпер песня — спявалі весела, з прысвістам, і Захар, ад усяго адключыўшыся, слухаў яе. «К нам пришел один такой посол, хрен моржовый, глупый, как осел. Говорит, что Муссолини вместе с Гитлером в Берлине разговор о наших землях вел».

Упершыню Захар пачуў гэтую песню ўлетку — спявалі Санько і Голуб. Потым шмат разоў даводзілася чуць яе ва ўзводах, і штораз яна была перароблена. Аднак заўсёды заставалася ў ёй ідэя і настраёвасць, і заўжды гучала песня празмерна гуллівa, не зусім прыстойна. Але «салёнасць» яе ўспрымалася натуральна, яна не абражала слых — слухаць песню без добрай усмешкі немагчыма было.

Цяпер жа песня спарадзіла ў Захаравым сэрцы трывогу. Дакладней, не песня — убачыў у вазку Багдана.

— Калечыц! — махнуў Захар рукою, убачыўшы, што той прытрымаў вазок.— Сюды!

Багдан па-ранейшаму насвістваў мелодыю, і ў Захаравым сэрцы ажыў стары боль, што асеў у душы пасля той вясновай ночы на папялішчы бацькавай хаты, ажыла непрыязнасць, з якою Захар па-ранейшаму ставіўся да Кандратавага сына. Дзіўная гэтая непрыязнасць. Захар даваў даручэнні Кандрату, ведаючы, што той іх выканае, і ніколі не памыляўся: Кандрат сапраўды добрасумленна выконваў цяжкія і небяспечныя заданні. Праўда, Кандрат яшчэ не выканаў абяцанне, што даў на беразе Дзвіны пад шаргаценне крыгалому, і амаль у кожным паведамленні

з горада рабіў кароткую прыпіску «пад тым заданнем працую». Яштокін быў у захапленні ад Кандратавых звестак і заўсёды казаў з націскам: «Прыроджаны разведчык. На гэтага старога, як на самога сябе, спадзяюся». Захар ніколі не запярэчыў Яштокіну, у яго не было падстаў запярэчыць нешта, але ў душы ўсё жыў і жыў знак, які не сціраў ні час, ні добрыя справы старога, ні заўжды вельмі ж удачлівая рызыка сына: Багдан ужо неаднойчы даводзіў і ў баях, і ў начных рэйдах, чаго ён варты — яго лічылі самым, бадай што, смелым і рызыкоўным чалавекам у другой роце, рызыкоўным да адчаю, нават як бы з падкрэсленай пагардаю да смерці.

Цяпер раптоўна ўспамін пра тое, не выканапае Кандратам абяцанне, звязаўся з тым знаёмым старым болем, спарадзіў нейкую непрыемную зайздрасць да Багдана. Свішча, дый годзе! I галаву сабе анічым не тлуміць!

Калечыц саскочыў на снег і, крыху сагнуўшыся, прыпадаючы на левую нагу, пачаў узбірацца на пагорак. Вазок пакрысе рухаўся ўніз, пад пагоркам — аб'язджалі глыбокую траншэю, якая перапалавініла дарогу,— і Захар не вытрываў, прыпусціў уніз па схіле насустрач.

Калечыц спыніўся крокі за два ад Захара, казырнуў:

— Імчым у разведку. З гарматы ўлупілі па калоне!

Вазок, абмінуўшы перакапаны ўчастак дарогі, спыніўся на ўзбочыне. Харэўскі, які сядзеў за спіною Багдана, спяваў, але цяпер цішэй, прыглушана. Багдан жа толькі насвістваў мелодыю, насвістваў лёгка і прыгожа, і песня ад гэтага гучала яшчэ больш гулліва.

— Чаго яны гарляць? Адставіць песню!

На вазку Захара пачулі, і песня адразу згасла. Калечыц, аддыхаўшыся — на пагорак ён ускочыў, як узлягцеў,— цяпер хутка і талкова далажыў, што па гравійцы па той бок Дзвіны рухалася фашысцкая калона, па ёй, ля Пятроўцаў, Жвірбля ўлупіў з гарматы. Пажога паслаў цяпер разведку наперад, следам рухаецца гармата, каб заняць зручную пазіцыю і зноў абстраляць калону. Гравійка вядзе ў Баравуху, калона, мабыць, туды і рухаецца, нікуды не зверне, бо там ёсць і машыны і фурманкі — дарогі трэба трымацца. Так што разы два ці тры можна будзе заскочыць ёй наперад.

— Вунь, артылерысты ўжо коцяць,— сказаў Калечыц, паказваючы на паракопныя сані з гарматай, якія выскачылі з лесу.— Дазвольце нам наперад! Каб жа не спазніцца!

— Толькі каб без песні! Хто гэта ў разведку едзе і гарланіць на ўсю ваколіцу!

— Ёсць — схаць без песні!

Захар загадаў Калечыцу рухацца далей, а сам, амаль упрыдбег, пакіраваў да свайго вазка. Пакуль ён дабег, развярнуў вазок і выехаў на дарогу, паракопныя сані з гарматай ужо аб'язджалі глыбокую траншэю, напаўзасыпаную снегам. Гнацюк і Сачыўка беглі па той бок саней, быццам падтрымлівалі гармату, каб не перакулілася. Жвірбля бег па гэты бок, трымаў лейцы ў руках, пашлёгваў імі, гукаў у бок партызанаў з узвода Файзуло, якія спынілі сваю працу ля бліндажа:

— Гэ-эй, пяхота! Чаго варон ловіце? Давай следам за намі! Ударым па фрыцах!

Вывеўшы сані з гарматай на дарогу, Жвірбля нацягнуў лейцы і, не выпускаючы іх з рук, пахваліўся задаволена і радасна:

— Сем снарадаў, таварыш камандзір, паклалі. І кожны — у кропачку. Дзве машыны гараць!..

Жвірбля дакладваў гэта, нібыта быў цвёрда перакананы і зусім упэўнены, што Захару дакладна вядомы ўсе падрабязнасці.

Захар перапыніў яго выхваленні:

— Кажаш, што кожны снарад — у кропачку? А дзве машыны толькі гараць. А дзе ж яшчэ пяць снарадаў?

— І яны таксама класна ляглі. Калона ж до-оўгая. Відаць, вёскі недзе рабавалі ля Дзісны. А мы — улупілі!..

Адчуўшы, што Захара не дужа прывабілі гэтыя выхваленні Жвірблі, Гнацюк сказаў:

— Чаго ты раскрычаўся аб сваіх поспехах? Дарогу пільнуй. Тут кожная хвілінка на ўліку...

— Паспеем, паспеем! Манеўр зробім як мае быць! — Твар Жвірблі асвяціўся задаволенай усмешкаю, ён паглядзеў на Захара з перавагаю, быццам падкрэсліваў тое, што меўся даўно зрабіць і толькі цяпер вось выпала нагода: — Во-ось чаго я ўвесь час патрабую, каб баявое цягло было ў поўнай баявой. Р-раз — маневр маланкаю робім! Ну-у, пфэрды!

Захар кульнуўся ў свой вазок, тузануў лейцы і на ўзбочыне лёгка абмінуў сані з гарматай — вырашыў даганяць разведчыкаў. Конь імчаў лёгкі вазок хутка, камякі снегу з-пад капытоў глуха, бы ў бубен, білі ў передок вазка, акуты бляхай; снегавы пыл ляцеў у вочы, і Захар нахіляўся то ўлева, то ўправа, каб лепей бачыць дарогу

і вазок разведчыкаў. Адлегласць паміж імі не скарачалася, і Захар падумаў пра гэта з усмешкаю. Не хочуць, відаць, паддавацца, увесь час падварушваюць каня, імчаць, толькі пыл курыцца.

Захар пагнаў разведчыкаў праз кіламетраў пяць, у сасновым гаі, дзе дарога крута вярнула ў бок Дзвіны. Сіні вазок стаяў пад сасной, Калечыц туліўся ля тоўстага камля сасны на ўскрайку, Багдана і Харэўскага ўвогуле не было відаць.

— Рухаецца калона, таварыш камандзір,— Калечыц хітнуў галавой у бок поля.— Бачыце? Ву-унь, па дарозе ля бярэзніку. Э-эх, артылерысты мне гэтыя — спозняцца ж! — і Калечыц вылаяўся.— Упусцяць!..

Правы бераг Дзвіны быў у гэтым месцы ніжэй за левы, і дарога, што ішла ля рэдзенькага бярэзніку, была добра відаць; па ёй, у напрамку да хваёвага лесу, дзе дарога знікала, марудна рухаліся фурманкі, акаймаваныя доўгімі і густымі ланцужкамі салдат. А вось Жвірбля па лесе коціць!..

— Давай, давай! — гукнуў Калечыц і кінуўся да гарматы.— Хутчэй, бо не паспееш!

Жвірбля з ходу пачаў разварочваць коней, потым напусціўся на Калечыца:

— Чаго ты пад нагамі круцішся? Твае дзела не тут. А там,— і ён махнуў рукою ў напрамку поля.— Ты давай новую пазіцыю мне забяспеч! Гані, гані туды!

Захара абурыла гэтая бесцырымоннасць. Калечыц — начальнік разведкі. А Жвірбля ім камандуе, як сваім падначаленым!

— Чаго па разведку бурчыш? — кінуў Захар.— Куды зноў яе гоніш?

— Наперад! — выгукнуў Жвірбля.— Зараз урэжам. І — зноў манеўр. На новую пазіцыю. Мы яшчэ разок за Венцавым іх пачастуем. Там дарога яшчэ бліжэй да берага. Праўда, і мы там адкрытыя з усіх бакоў. Але нічога, вывернемся...

— Меней гавары! Болей — справу давай,— сказаў, пядобра схмурнеўшы, Гнацюк.— Калона зараз хвост табе пакажа!

— І добра! Якраз пад хвост і ўліпне снарадзік! Гані наперад, разведка!

Калечыц моўчкі зірнуў на Захара, як бы запытваючы, што і як яму рабіць. Але Захар, быццам падхоплены

тарошкай плынню, на якой жыў Жвірбля, наспешліва прасказаў, аніяк не аспрэчваючы тое, што сказаў Жвірбля:

— Вы рабіце сваю справу! Сваю!

Ён стаў непадалёк ад гарматы ля сасны, краем вока бачыў, як мільгаюць за дрэвам сіні вазок і постаць Сачыўкі, і ўглядаўся ў правы бераг Дзвіны, спрабуючы як мага лепей разгледзець калону, якая там рухалася. Ён не адразу сцяміў, што гэта на яго, прыўзняўшыся над браніраваным колам, ярасна сіпіць Жвірбля:

— Перад гарматаю не стойце! Не паложана там стаяць! Чуеце, таварыш камандзір? — і замахаў рукою, загадна і ўладарна: — Назад! Наза-ад! За башню, я кажу!

Захар адскочыў ад сасны, шкадуючы, што страціў гэткі зручны назіральны пункт. А тут кепска бачыш правы бераг — галіны сасны замінаюць. Ды яшчэ гэтая гаргара — браніраванае кола: колькі ні спрабавалі, а не ўдалося пазбавіцца ад яго: гэткую і возяць, якая стаяла на доце. І як марудна паварочваецца ствол! Рукі Жвірблі мільгаюць, і галава хутка хістаецца то ўніз, то ўверх, а ствол неяк нясмела сунецца, быццам намацвае сабе дарогу ў паветры. І чорны які ствол, бы з агню яго выхапілі. А ўчора ж фарбавалі!..

Чырвонае траскотнае полымя пыхнула наперадзе, і пругкая цёплая хваля кінула Захара на дол. Ён падаў у снег, не разумеючы, што здарылася. У вушах гуло ад выбуху; вочы сляпіла ад полымя, што выбухнула наперадзе, у галінах сасны; нешта звонка праляскатала па браніраваным коле, паляцела ўвысь з прарэзлівым віскатам: доўгае чорнае вурвалле валілася з макавіны сасны ўніз, у дымнае шэра-белае воблака.

«Гармата ўзарвалася...»

Захар на міг закрыў вочы. Калі зноў зірнуў перад сабою, убачыў Жвірблю, які выскачыў з браніраванага кола, расхрыстаны, без шапкі, тузаў сябе за штрыфлі бруднага зялёнага бушлата.

— Маржовы я... Маржовы я...— лаяўся ён брудна і адчайна, і голас яго быў хрыпаты.— На сасне гвазданула! — ён кінуўся наперад, учапіўся ў сасновыя галіны і, лаючыся, павалок іх ад сасны.— А ўсё з чаго?.. А ўсё з чаго?.. Усю работку — на аднаго Жвірблю! Усё спехам, усё — спехам! І кожны раіць, раіць...

Захар узняўся, знайшоў у снезе шапку, улупіў ёю па калене — атрэсваў снег. Гнацюк кінуўся да яго.

— Не зачапіла, таварыш камандзір?.. Пад самым носам снарад гакнуў. Вось які манеўр робім!

Жвірбля, быццам лёс Захара зусім яго не цікавіў, упіраўся плячом у браніраванае кола, гукаў усё тым жа сіпатым голасам:

— Сачыўка! Сюды! Бягом! Коней не чапай! Сюды бяжы! Хоць на метар нам гэтую гаргару наперад зрушыць! От жа маржовыя намагатыя ў мяне...

— Трэба дапамагчы,— сказаў Гнацюк і ўпёрся абедзвюма рукамі ў паваротны брус, падкалоў Жвірблю: — Слыш, артылерыя! Давядзецца мне зараз на чацвярэнькі стаць, каб ты ў с... пацэліў!..

Падбег Сачыўка, схапіў дышаль, цягнуў яго з усяе моцы, камандаваў, быццам усё павінна было рабіцца толькі па гэтай яго камандзе:

— Р-разам! Узя-ялі!.. Шчэ разок — у-узя-я-ялі!..

Сані марудна скрануліся з месца, крыху прапаўзлі, упёрліся ў нешта і спыніліся. Жвірбля ўскочыў у сярэдзіну браніраванага кола, заціснуў тонкую снарадную гільзу і, звінчваючы каўпачок з белай снараднай галоўкі, ярасна зароў:

— Усім — з пазіцыі! Усі-м!

Захар не паспеў адбегчыся да сасны, як за яго спіною гаўкнула саракапятка. Ён спыніўся і азірнуўся, яму падалося, што ў снегавым пыле, змешаным з парахавым дымам, галава Жвірблі марудна плыве над браніраваным каўпаком, потым побач з галавой узніклі дзве рукі — Жвірбля трос сціснутымі кулакамі:

— Што, ухапілі гарачанькага?.. Ну, гарматачка! Просяць нас пацэліць у с..., дык і пацэлім шчэ разок!..

Захар цяпер бачыў, як са ствала гарматы вырвалася бела-чырвонае, як абернутае па краях чорным полымя, згасла ў шэра-белым дымным воблаку, што зноў завіхурыла з долу, і потым, амаль імгненна за ім, ірванулася новае полымя, святлейшае па колеру, затым яшчэ адно, яшчэ... Захар шчыра пашкадаваў, што аддаў бінокль Файзуло. Трэба было прыхапіць у яго бінокль — цяпер бы ён тут спатрэбіўся. Калона ўжо запаўзае ў хваёвы лес, канец яе пашкамутаны, як укрыты белымі воблакамі снарадных выбухаў. Трапна страляе Жвірбля! А каб ён трошкі раней сюды падскочыў! Ды каб не гэты дурны снарад, што зачапіў галіну. І як гэта здарылася? Танюткія ж галінкі вісяць, а вось зачапіла, хапіла і гэткай, танюткай!

— Сачыўка! Коней сюды! Мі-ігам! — голасна гукнуў

Жвірбля, выскачыўшы з браніраванага свайго кацялка; стаяў, трымаючы папагатове доўгі дышаль.— Чапляй! Чапляй, дарагі! — і цісиуў дышаль да Сачыўкі, які заводзіў коней па абодва бакі. Схапіў ворчык, дапамагаў зачапіць на колцы ў канцы дышля.— Сачыўка, не чапай скрыні! Потым збяром. Манеўр! Мігам! Н-о, пфэрды! — ён тузануў лейцы, сані скрануліся, і ён пабег побач з гарматай, гукнуў Захару: — Вам не трэба, таварыш камандзір! Мы адны ўправімся! Там, на полі, калі пачнем круціцца, яны нам могуць і сыпануць. Якраз у тое месца, куды Гнацюк мне раіў нацэліць! — і зарагатаў, радасны, незалежны, поўны баявога шалу.— Н-но!

Сані выкаціліся на ўзлесак і панесліся далей, і неяк раптоўна аціхла і шлёганне лейцаў, і голас Файзуло, і рыпенне палазоў. Захар марудна пайшоў да свайго вазка, потым нахіліўся, узняў галінку сасны, ссечаную асколкам. На зломе галінка была жаўтлявая, падобная па колеру на ліпавы мёд, з рудым атожылкам сэрцавіны; Захар паднёс яе да губ, учуў пах жывіцы, глыбока ўдыхнуў яго і крануў языком халодную каляную дзеравіну — злом быў халодны, як лёд, і колкі.

«Выпадак... Шчаслівы выпадак. Асколак мог секануць не галіну сасны, а мяне...»

Думка яго не суцешыла, у ёй была нейкая незразумелая горыч, і ад яе Захару зрабілася зябка. Ён сеў у вазок, крануў лейцы і раптам нацягнуў правую, рэзка павярнуў каня ў бок поля — пагнаў следам за гарматай. Зноў глуха, як у бубен, білі снегавыя камякі ў перадок вазка, разляталіся, і снегавы пыл курыўся, засынаў Захару кажух і боты. Звінелі, пазвоньвалі цуглі, рыпелі палазы, і на калдобінах звягліва джугаліся ў жалезных колцах крукі аглобляў.

## 13

У цемры, што панавала ў зямлянцы, Багдан не бачыў твару Маўджуды, але адчуваў яе ўсю, кожную часцінку. Доўгія халаднаватыя валасы яе прыемна і знаёма пахлі святаяннікам, струменьчыкамі цяклі між пальцаў, і ён падумаў пра тое, што вось гэтак жа, як валасы з рук, адплывае, уцякае ад яго тое добрае, чаго ўвесь час жадала і прагла сэрца. Трывожнае адчуванне перарывалася шчасця ўзварушыла, потым напалохала, і Багдан пры-

гарнуў Маўджуду да сябе парывіста, галубіў таропка, цалаваў паспешліва, прагна, быццам развітваўся назаўсёды.

Імклівая, як бы адчайная яго няшчота занепакоіла Маўджуду, і яна прамовіла пошапкам:

— Ты нейкі дзіўны сёння.

— Засумаваў. Даўно не бачыліся.

— І я таксама, таксама,— прызналася Маўджуда і тут жа засумнявалася, пачала допыт: — А можа, нешта ў цябе адбылося кепскае? Здарылася што-небудзь, і ты казаць мне не хочаш? Чаму не хочаш? — патрабавальна і паспешліва папрасіла: — Кажы зараз жа!

Знаёмыя, абрыдлыя ўжо допыты. Як толькі ёй не надакучыць гэта? Не вытрываў, з прытоенай горыччу папракнуў:

— З табою проста немагчыма. Як слова — каманда. А я не люблю, калі мною камандуюць.

— Але так ужо чалавек зроблены: калі ім ніхто не камандуе, дык ён сам сабою камандуе. І нічога благога.

— Цяпер — філасофія пачалася. Цярпення ўжо не хапае!

— А ты ўяві сабе. У нашым атрадзе ніхто і нікім не камандуе! Ці ў арміі, скажам...

Ён прамовіў тонам крыху ўзвінчаным, тонам знаўцы, які ўжо стаміўся, але змушаны тлумачыць:

— Адно — вайсковы статут. Справы асабістыя — зусім іншае. Салдат жыве і павінен жыць па загаду. Але сэрца па загаду не хоча жыць...

Ён адчуў, што яна ўпотай пасміхаецца.

— Паспі, вялікі знаўца сэрца. Адпачні.

— Мне з цёмным трэба пайсці. Каб не трапіць пад гусараўскую пастанову. І трэба ж гэткае прыдумаць! «Забараніць усялякую сямейнасць ва ўзводах...»

Маўджуда сказала разважліва:

— У гарах кажуць: у каго дах шырэйшы, у таго і вады цячэ больш. У нас — свой дах. Спі...

— Ты — мудрая. Я заўсёды гэта казаў.

— Разумны ўслаўляе свайго каня,— голас яе быў вясёлы і задаволены, быццам яны цяпер памяняліся месцамі, і яна ведала тое, чаго ён не ведаў і не разумеў: — Дурны — сваю жонку. Гэтак кажуць у гарах.

— Чужыя паўтараеш думкі — Лермантаў гэта казаў. Разумны, маўляў, пахваляецца грацьма, а дурны — сваёй жонкаю.

Яна сказала павучальным тонам:

— Лермантаў разумеў горы. І звычаі гор ведаў. У гарах, мушу табе сказаць, не вядуць размовы перад сном. Размовы вядуць у часе застолля... Спі!

— А каб ты спрахла з гэтымі сваімі гарамі,— прамовіў ён хмурна — злавіў у яе голасе адценне загаду, і гэта яго непрыемна зноў зачапіла; прыгасіў хмурнасць, дадаў прымірэнча: — Гэта я ў сне з табой размаўляю...

Ён ляна, прымушаючы сябе, пагладзіў Маўджуду, і зноў яе пругкія валасы халаднаватымі струменямі пацяклі між пальцаў, узмацняючы крыху прыгаслае трывожнае адчуванне нетрываласці шчасця. Як што, сапраўды, адплывае ад яго — дзіўнае нейкае адчуванне. І чамусьці тады прыходзіць, калі гладзіш яе валасы. Каляныя ў яе валасы, як жытнёвыя сцяблiны ўночы, калі раса на іх. А ў Чаславы валасы бы маладыя лёп, угрэты сонцам: танюткія, мяккія, цёплыя... А ты, галубок, зноў сабе сэрца старым кроіш! Што табе валасы Чаславы? Не ты іх галубіў — Мсціслаў... Але ж Мсціслава няма! Кінь! Кінь, дурань, яго прыгадваць! Гэта— мінулае! Яно пахавана!

Яго злавалі, выматвалі думкі. Колькі ўжо разоў казаў сабе, што няма таго паліцая, у кабур да якога трапіла запіска, што знік ён, забіты партызанамі, а думкі пра гэта ўсё роўна прыходзілі, жывілі сумненні. Трапашка тое казаў — пра паліцая. Але ж Трапашкаў язык — памяло, нават яшчэ і горш. А як не забілі — выжыў, скажам? А як заўтра, скажам, ён — хоп, заявіцца! Не, з магілы не ўстаюць! Мінулае — пахавана! Ты — партызан! Пажога ж сказаў, што пішуць у штабе дакументы на ўзнагароды за мужнасць і смеласць, і ў спісе тым — Багдан таксама. Табе, дружа, увогуле, у вайсковай справе шчасціць. Памятаеш, як па тых палкавых матагонках першае месца ўхапіў? І адразу — водпуск. Часлава стрэла тады — як варам абдала. А цяпер — дзіўна ласкавая зрабілася. А мо і не кахала яна па-сапраўднаму Мсціслава свайго? Замарачэнне нейкае найшло — ты ж два гады ў арміі бухаў! — і з'явіўся той Мсціслаў. А да гэтага ж усё добра ішло: і вяселле, і лад у хаце, і ласкавасць у вачах. Між іншым, Часлава ашколі ім не камандавала. А гэтая гаранка і гадзіны без загаду не можа пражыць.

Дзівіла, аднак, не тое, што гэта ўсё помнілася — ён не стамляецца прыгадваць. Час бы ўжо гэта павыкідаць з галавы! Хаця не дужа ж і вялікі час мінуў — год толь-

кі ўсяго. Дзе ж год — пад другі падбіраецца! А здаецца, што ўсе дзесяць адляцела... І колькі змясцілася ў ім, гэтым часе, і агню, і бяды, і добрага, і благога... Добрага? А што добрага ты пабачыў? А тое, што жывы застаўся — мала табе? Палічы, прыгадай, колькі сяброў тваіх, што ішлі побач, зямельку парадь! Дзіўна ўсё гэта. Дзіўна ён, час, складзены, і яшчэ больш дзіўна жыве чалавек. Але тут — кожнаму сваё, як гаворыцца. Адзін, скажам, у першым жа баі схопіць кулю, загіне нават без бою, па дурноце нейкай... Другога ж бойкі тыя круцяць-перакруцяць, а ён — цалюткі! Пройдзе, як гаворыцца, агонь, ваду, медныя трубы — каб хоць драпіна на ім якая! Няўжо і ён, Багдан, з гэткага шчаслівага племя? Не, на ім драпін і меціп — не злічыш. Адных рубцоў лагерных колькі. А на сэрцы! Хто гэтыя рубцы злічыць?.. Ніхто. І сам ты не злічыш. Не злічыш і нікому не пакажаш! Лёсам табе, голубе, праднаканавана ўсё. Неба гэтак замысліла, відаць,— каб з болем ты ўвесь час жыў! Не, Багдане, на свой лёс ты не наракай! Ніколі не наракай! Штодня ты павінен неба і лёс услаўляць! Хаця... Неба — небам! Ты сваю галоўку ўслаўляй, розум свой услаўляй... Як гэта млынар казаў?.. «Калі ў чалавека галава варыць, дык і неба на яго ласкавей паглядае. А дурню аніякае неба не дапаможа». Разумны млынар, ды не вельмі: у вайну гэтая яго мудрасць — вецер. Куля ж не разбіраецца: дзе — разумны, дзе — дурань. Дужа разумным ты сябе, голубе, лічаш? Дурань жа ты апошні! Боты Маўджудзе прывёз, а дагэтуль хатуль не развязаў. Як гэта млынар пахваляўся? «Боты мае работы жанчына надзене — няма раней шай жанчыны. Каралева перад табою стаіць!» А яму, Багдану, няшчота гэтая галаву затлуміла — вылецелі з галавы ўсе думкі пра боты. А каб аддаў — Маўджуда б і на загады свае забылася... Боты ў яе зусім кепскія, кашы даўно просяць. Ён нечаканы падарунак ёй і падваліць — хай парадуецца. Ён зараз іх ёй і аддасць, паляжыць вось крышку. Боты млынар зрабіў хвацкія — да канца вайны яна іх не зносіць. У гэтых ботах яна і дамоў паедзе, у горы тыя свае...

Багдан задрамаў і ўбачыў горную дарогу, паабапал грувасціліся чырвоныя зыркія скалы, і дарога была гэткая ж зыркая — невядома толькі, адкуль свяціла сонца, і было яно зыркае, сляпучае, і ён адчуваў яго гарачыню,— і яны з Маўджудой несліся па гэтай дарозе ў матацыкле з каляскай. Потым горы зніклі, і матацыкл ім-

чаў па палявой дарозе, і ўжо не горы, а старыя бярозы стаялі паабапал. Матор не грукацеў, і было чутно шухценне маладзенькай зялёнай лістоты на гнуткіх доўгіх галінах, што як не чаплялі галовы. Гэтак жа раптоўна, як і ўзніклі, бярозы скончыліся, і матацыкл нібыта ўпёрся ў абсаджаную сліўнікам сялібу. Гэта ж на сялібу таго хутараніна ён, Багдан, трапіў! Драўляная ражачка ля студні, фіранкі ў вокнах, доўгі і рэдкі жардзянік. І чатыры фашысты шпуруюць, прыгінаючыся за сліўнікам, бягуць усцяж плота — імчаць напярэймы гармаце, якую Жвірбля разварочвае на полі. Жвірбля не бачыць фашыстаў. І Гнацюк не бачыць! І Сачыўка не бачыць! Дурні! Фашысты ж зараз гармату захопяць! Да лесу вярнуць трэба! «Сюды! Да лесу!» Не, не пачуе Жвірбля! Трэба яму, Багдану, страляць!.. Але ж не паддаецца спуск! Як прыкіпеў ён, гэты спуск!..

Багдан выдраўся са сну і падхапіўся; яго трэсла як у ліхаманцы; балелі, аж калола ў пазногцях, пальцы, якія ўчапіліся ў цвёрдую рабрыну прыклада.

— Нешта снілася? Так? — Маўджуда, сеўшы побач на раскіданай па нарах саломе, пагладзіла яму лоб.— Толькі заснуў і закрычаў. Жудасна гэтак закрычаў...

Знаёмы востры лядаш узнік у Багдана пад сэрцам. Крычаў? Што ён мог крычаць? У сне, услых, выказаў тое, што мучыла яго апошнім часам, гняло, не давала спакою ні ўдзень ні ўночы?.. Не павінен ён крычаць пра гэта. Благое закрэслена, адкінута! Назаўжды пахавана!

— Крычаў? — з робленым здзіўленнем спытаў Багдан, узіраючыся ў бляклы прамавугольнічак вузкага акна.— І што ж я, цікава, крычаў?

— Штораз новае нешта. Незразумелае.

— Штораз? Ты не казала, што я крычу ў сне!

— Раней не крычаў. Нешта ўсё, здаралася, мармычаш, мармычаш. Благія сны — гэта з таго.

— А сёння што я крычаў?

— «Сюды! Да лесу!»

Ён, аблегчана ўздыхнуўшы, зноў пагладзіў яе валасы.

— На матацыкле мы з табою ў гарах несліся — гэта снілася. Потым — хутар. І за хутарам — Жвірбля гармату разварочвае, як спецыяльна коней сваіх пад нямецкі агонь падстаўляе...

Яго трэсла болей не з таго, што снілася, а з таго, што перажыў нядаўна ля Дзвіны, калі гармата абстрэль-

вала калону на правым беразе ракі. Як ён тады з Калечыцам і Харэўскім ірванулі на вазку па адкрытым полі! Каб не гэта, каб не адчайны гэты іх манеўр — ляснулася б гармата: фашысты пільнавалі яе, сядзелі ў лазняках. Багдан тады выхапіў лейцы ў Калечыца, нагнаў каня на фашыстаў. Каня ў іх потым забіла. Але яны ашаламілі фашыстаў сваёй дзёрзкай смеласцю, якая была на мяжы дурноты і магла ўсім ім — і Калечыцу, і Харэўскаму, і Багдану! — каштаваць жыцця! А вось жа вывернуліся! І фашыстаў скінулі пад узвал, і гармату ўратавалі. А калі фашысты апамяталіся, яны былі ўжо на ўзлеску, і Жвірбля, як не плачучы ад радасці, цалаваў Багдана...

— Баюся за цябе...— сказала Маўджуда.— Рызыкуеш, кідаешся на злом галавы. Неразумна ў вайну гэтак.

— Яно разумна атрымліваецца, калі мы вось так з табою гаворым. А ў баі? Ты ведаеш, што было б, каб мы не рванулі праз поле, пад іх агонь?.. Гарматачкі ў атрадзе ўжо і не было б. І што самае дзіўнае? Як быццам памылка, дурное наша гэтае рашэнне аказалася самым разумным.

— А ты ўсё ж старайся не рабіць памылак.

— Ха! Гэтак не пражывеш, каб толькі разумныя рашэнні прымаць. Памятаеш, як ты да матацыкла рвалася? Ну, што было б, каб паспела, скажам, і дабегла?

— Цікава, а дзе Браткоўскі зараз? — Яна адказала сваім пытаннем, і ў гэтым пытанні было прызнанне віны.

— Хіба не чула, што Крупня казаў? Камбат наш зараз на яго месцы.

— А я ўсё часцей і часцей пра нашага камбата думаю. Даў ён нам баявы загад, а мы яго не выканалі.

Багдан змрочна хмыкнуў:

— Затое Мяцін выканаў.

— З яго ўжо ніхто і нічога не запатрабуе.

— І з нас ніхто і нічога не запатрабуе. Хай запатрабуюць з тых, хто спаў, замест таго каб у акопе сядзець ды ля гарматы стаяць!

— З нас уласнае сумленне запатрабуе. У нас, у гарах, гэта самае ганебнае, калі ў баі ты зрабіў нешта супраць абавязку.

— Божачка святы! Я хутка вар'яцець пачну ад гэтых законаў тваіх гор. Я чалавек раўнінны. Сто разоў табе казаць?

— І сто разоў казаць не трэба. І хваляваца не трэ-

ба. Адно прашу цябе: пасні крынку,— і яна ласкава, але патрабавальна прымусіла яго легчы.— Яшчэ не золак. Ляжы і думай. Пра мяне думай...

Што ні кажы, а дзіўная яна, Маўджуда гэтая. Ціспе па цябе, ціснє, а потым, як мяжу якую пераступіць — ласкавая робіцца, як спалохаецца нечага. І ў гэтых яе словах — «Шторaз новае нешта. Незразумелае» — таксама нейкі спалох. Гаворыць, што ён незразумелае нешта крычыць. А можа, і зразумелае? Зразумела яго словы, спалохалася, прызнацца баіцца? Не-е, тое, што ў Багданавай душы, нават ён сам як след не можа спасцігнуць. І што дзіўнае: лічыць жа ён мінулае тое старым, як бы і несапраўдным. А вось жыве яно! Ён яго крэсліць, адкідае, а яно — жыве, бунтуе яго думкі і ўдзень і ўночы. І няма спакою на душы, усё глыбей і глыбей запаўзае ў душу брыдотны жах, паганае адчуванне таго, што нехта сочыць за ім, падглядае, цікуе, як бы назіркам крочыць штодня, паўсюль. З таго і марная гэта, відаць, спадзяванка на тое, што мінулае пахавана і закрэслена. Паспрабуй закрэслі! Усё чысцютка жыве ў сэрцы — і тое, што было, і тое, што ёсць. А што будзе — жыве недзе далей, яно непадуладна сэрцу. Скажам, прызнаўся б ён Захару ва ўсім, адкрыўся б, як на споведзі... А што, каб тады, вясною, як прыйшоў у атрад разам з Траянам і Рымаю, адкрыўся ён Чаславе ва ўсім, паспавядаўся б перад Захарам, бухнуўся перад усімі на калені, паабяцаў, што змые віну крывёю, баявымі справамі? Хай даруюць яму, хай дазволяць, каб фашысцкая куля яго скасіла. Але ж ён перад гэтым, цяжар з душы скінуўшы, шмат добрага зробіць. Не-е! Марная, яшчэ больш марная і гэтая спадзяванка па дараванне. Захараў прысуд адзін будзе: судзіць і расстраляць. І ты на яго месцы сказаў бы тое ж самае! І Маўджуда, каб у яе папыталі, што ў гэтым выпадку рабіць,— пусціла б кулю ў тваю дурную галавешку, аніводны палец бы ў яе не здрыгануўся. «У гарах ганьбу змываюць толькі крывёю...» І гэта — не словы, браце! Гэта — закон, па якім жывуць там, у тых далёкіх і невядомых табе гарах. А што тут, на берагах Дзвіны, не тыя ж законы? Хіба ж па нейкіх іншых законах жыве Захар, Часлава?.. Дарэчы, а каб у Чаславы папыталі, што ў такім выпадку рабіць? Ды і пытаць тут нічога не трэба! Хіба не ў памяці тое, што паабяцала яна, калі гарэла Зінаідзіна хата?

— Усё ўздыхаеш, уздыхаеш... І не спіш,— ціха прамовіла Маўджуда.

— Думаю ўсё...

— А ведаеш, якая думка мне зараз сэрца вярэдзіць? Нешта ты ад мяне ўтойваеш, быццам нешта схаваць хочаш,— ціха, як бы сам-насам прамовіла Маўджуда, і гэта прагучала працягам думкі пра тое, што Багдан у сне крычыць штораз нешта незразумелае.

«Зноў за старое ўзялася! Як патэфон круціцца, у якім іголку заела — адно і тое ж, адно і тое ж!..»

Аднак не папракнуў, спытаў глухаватым, адчужаным голасам, накусваючы ніжнюю губу, якая была шархоткая, бы закарэлая ў старых і ссохлых больках:

— Утойваю? Ад цябе? Не прыдумляй!..

— Прабач, можа, не так я сказала... Нейкая апошнім часам усё больш і больш — я заўважыла! — цябе трывога мучыць.

— І даўно заўважыла? — спытаў ён са смехам. Але ўсё ў ім напялася.

— Не. У тую ноч... Памятаеш? Ля пуні той непадалёк.

У Багдана пагана затрымцела нейкая тонкая жылка ля правага пляча. Ён, значыцца, не памыліўся: яна прыглядалася да яго, як бы высочвае, спрабуе зразумець, што адбываецца ў яго душы. І тады, у тым бярозавым гаі, амаль гэткая ж гаворка ў іх была. Гэтак жа яна дапытвалася, што яго мучыць. Гэтак жа — нішчом — лезла ў душу і пазней, штораз пры сустрэчах. Як бы віжун ідзе назіркам па пятах, ціхенька ідзе, быццам боты скінула...

«Боты! Ёлуп! Ты ж дагэтуль боты ёй не аддаў!..»

Вырашыў пажартаваць — сказаў тое ж, што яна аднойчы яму сказала:

— Мучыць. Правільна ты заўважыла...

Яна ўсхапілася, сціснула яму скроні далонямі.

— А што цябе мучыць?

— Твае боты. Яны ж у цябе добрай кашы просяць!..

Крыху памаўчаўшы, Маўджуда прамовіла са шкадаваннем:

— Жартаваць табе ўсё...

— Добрыя жарты, калі басанож амаль. У цябе навю-юсенькія хромавікі былі. У палкавым клубе калі выступалі...

— Няўжо і гэта памятаеш?

— Ну! За сцэпаї — тыя прыступкі памятаеш? — мне ніжэй давялося стаяць. Дык я свой пос па мысках бачыў, як у люстэрку — гэтак хромавікі твае зіхацелі.

— Хлус! О-о-ёй, як навучыўся хлусіць!

— Дзе ж хлусня? Праўда! І хромавікі твае блішчалі, і сама ўся зіхацела. А цяпер дык і яшчэ прыгажэйшая зрабілася,— прыгадаў словы млынара і дадаў узнёсла: — Каралева!

Ён спасціг даўно ўжо: ухвала, хай сабе і наіўная, Маўджудзе заўсёды па душы. У-унь, як пачалі торгацца бровы — усміхаецца і ўсміхаецца... Жанчыны, відаць, у гарах тых дужа па ўхвалу прагныя, бо камень жа вакол, адно голае каменне, і сэрцы ад гэтага, напэўна ж, чарсцвеюць... А жаночае сэрца любіць цеплыню, пяшчоту, ласкавыя словы. Ад ласкавых слоў сэрца жаночае мякчэе... Хаця, не кожнае сэрца. О-ой, не кожнае! Хіба ж мала ласкавых слоў сказаў ён у свой час Чаславе? Каменняя, можа, на беразе Дзвіны меней. Каменнямі і абярнуліся тыя твае словы... Зноў дае ён волю сваім думкам пра Чаславу! Як іншага клопату ў яго няма!

— Дзіўна як бровы твае торгаюцца: дуг-дуг-дуг,— ён зноў адчуваў пад даланёю казытлівае і пяшчотнае дуганне густых броваў.— У цябе дужа бровы прыгожыя,— і тут жа спахапіўся, паспешліва запэўніў: — і бровы, і веі, і вочы, і валасы... Але ты пасміхаешся — па бровах адчуваецца, вельмі адчуваецца. Не верыш, што ты такая прыгожая?

— Вялікай веры няма. Але слухаць — прыемна... І смяюся, ведаеш — чаго? Прыгадала, як хромавікі свае сушыла ў тым лесе. Ля нашага будана...

— Гэта тады, як я з пошукаў не вярнуўся?

— Не, назаўтра. У той дзень я толькі ля будана кружылася: адыду, пачакаю, ціхенька паклічу — і назад. Уночы агню не раскладала — баялася, дрыжэла да раніцы. Ранкам, як толькі развіднела, зноў шукала, клікала... А раса вялікая, на верасах ажно бела — хромавікі хоць выкручвай. Павесіла іх на галіну — хай сушацца на сонцы. Басанож цябе шукала — кепска дужа басанож па лесе. А назад вярнулася — няма ботаў. Тут жа вось іх павесіла — і няма! За пісталет схапілася, за яліну кінулася і стаілася. Нехта ж тут быў, калі хромавікі зніклі. А ў лесе ціха. І тут нада мною птушка нейкая — цвыпь! Я галаву задрала — вісяць мае боты. Аказваецца — я з другога боку на будан выйшла. Надзяваю боты і сама сабе

кажу: боты знайшліся, знойдзецца і Багданка мой. Гэтак я сабе сказала...

Усё, што было далей, ён ведаў — яна шмат разоў расказвала яму аб усіх сваіх прыгодах. Але вось гэтая маленечкая падрабязнасць — як згубіліся і потым знайшліся боты,— была ў навіну, і ён быў падумаў, што ў свой час яна расказала не ўсё, нешта ўтаіла, утаіла значнае і сур'ёзнае, і ён сказаў з роблепай весялосцю, як бы працягваючы яе апошнюю думку:

— А як сялібу знайшла і з тым хутаранінам пагаманіла — агнём узгарэлася: пакараю! Гэтак сабе сказала: за тое, што адну кінуў і ўцёк — кулю ён ад мяне палучыць!

Яна маўчала, і ён чакаў. Кожны раз, калі Маўджуда пачынала прыгадваць свае вандроўкі і гаротны шлях да Дзвіны, ён чакаў, што яна гэтак скажа, і кожны раз Маўджуда вымаўляла зусім іншыя словы, словы пра тое, што сэрца яе ніколі не верыла благому, што не кінуў ён яе сумысля. Чаму ж яна цяпер змоўкла? Чаму не засмяецца, не скажа, каб не малоў ён пустое?

— Было, Багданка, і гэткае,— прамовіла яна ўрэшце са скрухай у голасе.— На падворку было, як мне хутаранін пра пілотку сказаў. Ён жа мне і пілотку тваю паказаў...

Ён пачуў словы, якіх раней не чуў ад яе, і яны прымусілі яго захваляваіцца — не хлусіць Маўджуда, не жартуе, гаворыць праўду, гаворыць тое, што сапраўды было! — і зноў прывялі да высновы: не ўсю праўду, браце, гэтая гаранка табе казала і кажа, і поўнай праўды табе ад яе, мабыць, ніколі не дазнацца. Ашаломлены, што яна ўсё ж яму хлусіла, ён не спытаў, а неяк разважліва, з роздумам, прамовіў:

— І каб у той дзень, дзе-небудзь далёка ад лесу, мы стрэліся з табою... Напэўна ж стрэліла б у мяне...

Маўджуда парывіста прыціснулася да яго, нейкі прыглушаны стогн сарваўся з яе губ:

— Гэтыя ўспаміны праклятыя!.. Не хачу я іх! Не хачу!

— А хто іх хоча? Хай толькі неба нас ад горшага ратуе,— і па тым, як яна ўся напружылася, ён зразумеў, што яшчэ больш растрывожыў яе, і таму прымусіў сябе засмяяцца: — Вось як яно ў жыцці здараецца! Ты мне кулю хацела даць, а я табе — боты даю. Навюсенькія! Хай сабе і горшыя за хромавікі, але ж — уласныя,— і ён

выцягнуў з рэчмяшка боты, паклаў іх на рукі Маўджуды.— Млынар на маёй мерцы табе іх пашыў. Ты ведаеш, як гэтага майстра славяць па навакольных вёсках? У-у! І з тымі, хто да яго з душою, ён хаўрус водзіць.

— Ты, значыцца, да яго — з душою? — весела, але з асуджэннем прамовіла Маўджуда.

— А як жа! Мы з хлопцамі не адны трафейныя боты праз гэты млынок на гарэліцу пусцілі. Без малога і гэтыя не паплылі,— Багдан паляпаў далонёю боты.— Лёс ужо гэткі быў у іх: на жаночых нагах красавацца. Вось таму і ацалелі...

Ён не чакаў вялікай радасці, але на падзяку — шчырую і зусім натуральную! — разлічваў і атарапела маўчаў, калі яна, схіліўшыся над ім, тройчы памалаціла кулачком па яго грудзях:

— Навошта гэта робіш? Навошта ўлез у нейкі гандаль...— і раптам ціха, з адчаем выгукнула: — О, неба! Ён, партызан, гандлюе! Боты на гарэлку мяняе. Ганьба ж гэта! Ганьба! — і зноў патрабавальна замалаціла кулачком па грудзях, папярэдзіла з гневам у голасе: — Калі хоць разок шчэ пачую, шчэ гэта... Пра гандаль ганебны...

— А што, у гарах ніхто і нічым не гандлюе?

— Чуў, што сказала?!

Голас прагучаў гнеўна і патрабавальна, і ён разгубіўся. Жартаваць, як бачна, не выходзіць. Самае лепшае — адступіць.

— Не глухі ж!

— Ты мне клянвіся!

— От жа ўдумала баба — клясціся. Чым? Навошта?

— Тады бяры свае боты. Не буду я іх насіць!

— Ну, чаго ўсхадзілася? Чаго? Ходзіш, да нечага рвешся... А ў чым? Мне ажно душа баліць, калі на гэтыя падраныя хромавікі гляджу! Снег жа! Зіма! Гэта ж табе не ў гарах тваіх, дзе цёпла.

— Лепей басанож пайду,— сказала яна, і голас яе не памякчэў.

— Ну, чорт з табой! Клянуся, калі табе ўжо гэтак хочацца!..

І тое, што яго прымусілі сказаць гэта — як выдралі з болем у душы, з крывёю, словы! — абудзіла ў яго сэрцы глухую варожасць: яна выбухнула з такой сілаю, што ён сам спалохаўся, ляжаў ціха, услухоўваючыся ў шалёны грукат свайго сэрца. Ён пачынаў яе ненавідзець, хоць яшчэ

і не прызнаваўся ў тым і не хацеў, каб няпавісць была: міжволі прарастала няпавісцю нязгода з яе загадамі, з яе патрабаваннямі рабіць тое, што яму не па душы, павучальны тон, на які ён напачатку не звяртаў увагі.

— У нас па гэта ёсць гаспадарчы ўзвод,— сказала яна, ціха тукаючы пальцам у падэшву бота.— Боты, адзенне — гэта іхні, не наш клопат. Туды, ва ўзвод, боты і аддасі.

— Сама і аддавай, калі табе лейчына муляе.

— Добра. Я — занясу...

Ён злавіў перамену ў яе настроі — яна прамовіла абяцанне занесці боты ў гаспадарчы ўзвод ласкава, таропка, быццам спяшалася як мага хутчэй супакоіць яго,— перамену на лепшае, і буркатнуў, спадзеючыся, што зможа яе пераканаць не рабіць глупства, пакінуць боты і насіць:

— Знайшла клопат сабе!

— Гэта не галоўны клопат,— адгукнулася яна таропка, як напалоханая нечым.— Галоўны клопат мой — цябе галубіць. Галубіць моцна, каб ты толькі пра мяне і думаў. А ў маім сэрцы каб толькі адно слова жыло: Багданка. Багданка мой!

Маўджуда сціснула яму рукі, пацалавала іх, потым заціснула пад патыліцу і гэтак трымала, прымушаючы не варушыцца. Яна сядзела на ўколенцах, нізка схіляючыся над ім, і яе валасы рассыпаліся ў яго па лбе, забівалі рот і нос, і ён спрабаваў іх здзьмухнуць, і не мог, і яму рабілася ўсё цяжэй дыхаць, горача,— зноў прымус! Зноў сілаю прымушаюць рабіць не тое, што яму хочацца, быццам скручанага некуды піхаюць! — і ён пачаў задыхацца, і тая варожасць, што выбухнула на кароткі міг, цяпер зноў ажыла.

Ён крутнуўся, вызваліўся ад яе абдымкаў, сеў.

— Пайду,— сказаў глуха і незадаволена.

— Калі цяпер прыйдзеш?

— Не ведаю.

— На доты вы ўжо не ходзіце?

— Куды пасылаюць — туды і шпуруем.

— Не рызыкуй ты гэтак адчайна, Багданка. У баі не рызыкуй. Ведаеш, як у гарах кажуць? Ідзеш паляваць на лісіцу — прыхапі зброю на льва.

— Наша зброя на ўсіх прыдатная,— сказаў ён, закідваючы за плечы аўтамат.

Яна папраўліла яму аўтаматны рэмень, парывіста аб-

шчапіла шыю рукамі, прыціснулася шчакою да падбародка і носа, зашаптала таропка:

— Хутка блізка ад цябе думаю быць. Я Крупні пра нас гаварыла...

Яна раней казала, што будзе прасіцца, каб яе перавялі ў першую роту — ён разумеў гэта як рэўнасць з яе боку, і гэта яму імпанавала, гэтае жаданне быць побач, каб падалей адсунуць Чаславу,— але казала няпэўна, як пра нешта зусім яшчэ дакладна не вырашанае, як пра тое, што існуе толькі ў далёкай перспектыве. Цяпер жа, выяўляецца, гэтая размова адбылася! Паспела ўжо з камандзірам атрада пагаварыць, яго не папярэдзіўшы, не абмеркаваўшы папярэдне тую гаворку!

Ён пакруціў галавою, як бы адпіхваючы яе рукі,— рукі апалі на плечы. І як новае бачанне свету цяпер яму адкрылася, ён быццам збоку назіраў і за ёю і за сабою: вось яны стаяць, а ён на іх паглядае, вывучае, што ж яны гэта робяць і пра што гавораць.

— І што ж ты яму пра нас гаварыла? — спытаў ён і зноў адчуў знаёмы колкі лядаш пад сэрцам.

— Тое, што ёсць. Калі хто-небудзь у гарах сваё каханне ад людзей тоіць — лічаць баязліўцам гэткага чалавека. З баязліўцаў у гарах смяюцца.

Ён упарта ішоў да свае мэты — вызнаць усё, вызнаць дакладна, а потым ужо нешта рашаць! — і спытаў, надаўшы свайму голасу адценне весялосці і бесклапотнасці; голас, аднак, міжвольна здрыгануўся:

— І што ж ён табе адказаў?

Яна не пачула, як уздрыгануўся яго голас, ці, пачуўшы, не надала гэтаму аніякага значэння, прамовіла ўзрадавана:

— Ён разумны, наш камандзір. Ён усё разумее, і сэрца чалавечае разумее. Паабяцаў, што перавядзе мяне. А яе — сюды, у другую...

І менавіта ад гэтага таропкага, паспешлівага і дужа радаснага шэпту — «А яе сюды, у другую...»! — вострым лядаш як узарваўся ў Багданавым сэрцы, колкія шыпы, як шротам, прабілі грудзі, і ён, звярэючы, скінуў рукі Маўджуды з пляча.

— Чаго ты лезеш, куды цябе не просяць?

— Я ж нічога кепскага не зрабіла. Ты не будзеш гэтулькі сілы траціць — з першай роты, ды сюды... Гэткі свет!

— Хочаш, каб смяяліся з Багдана? Выпхнуць, як

блазна, на агляд усім? Мы ж толькі што з табою гаварылі пра гусараўскую пастанову!.. Дурная галава!

— Апамятайся, Багданка! Гнеў — благі дарадца. У гарах кажуць...

— У-у-у,— замычаў ён, быццам папнякілі яго галавешкаю.— Ды ідзі ты да д'ябла са сваімі гарамі! Чуць пра іх не магу! Каб яны — корань ім у душу! — праваліліся!..

Яна паспрабавала ўтрымаць яго, неяк улагодзіць, схапіла за рукі. Але ён вырваўся, бязлітасна і злосна адпіхнуў яе і, як здурнеўшы ад гнеўнага шалу, выскачыў з зямлянкі. Яна пабегла следам, паклікала. Але ён не пачуў, ён ужо бег пад шатамі ялін, і цяжкія заснежаныя галіны хвасталі яго па грудзях, па галаве; у вушах звінела, ён чуў толькі шоргат галін і падвойнае, як звязанае, рыпенне снегу пад ботамі.

## 14

*Блакнот Ромеля. Старонка трэцяя.*

«Вершы — попел душы. Магчыма, лепей гэта, што вецер лёсу невядома куды сагнаў той попел — мой лірычны сшытак. І пераканаў, быццам сябе, што гэта — лепей. А сэрцу — баліць.

Апратка чалавека — таксама попел. На мне ўжо анічагуткі з таго, у чым я крочыў па дымных вуліцах Беластока. Штаны, мундзір, боты — нямецкія, праўда,— чужыя. Тая ж мая апратка, у якой ступіў я на рускую зямлю,— даўно попел. І не ў памяці ўжо, на якім вогнішчы пайшлі яны дымам, тыя мае лахманы.

Беручы цяпер у рукі адзенне, я штораз думаю пра лёс былога яе гаспадара: ляжыць, небарака, у зямельцы. І магчыма, мая рука адправіла яго туды: я таксама быў у засадзе на гравійцы з першай ротаю, таксама страляў па маіх суайчынніках, якія выскоквалі з кузаваў чатырох машын. Усе машыны тыя — попел. З тых, хто ехаў у іх, не засталося ў жывых анікога — дваццаць сем чалавек.

Я страляў па сваіх. Але не лічу сябе забойцам. І не лічу сябе здраднікам. Забойца і здраднік той, хто прывёў нас сюды, прымусіў паміраць на чужой зямлі. Навошта яна нам? Валодаць ёю мы не будзем ніколі! І нашы мары пра сусветнае панаванне — усё той жа горкі

попел. Папавацъ можна толькі пад самім сабой, не над народам.

Летась, у Беластоку, за гэтыя думкі я пусціў бы кулю ў лоб кожнаму. І сабе — таксама. Сёння на мне — чужое адзенне. У галаве — чужыя думкі. Але спарадзіў іх мой уласны розум. Перш-наперш — розум. Адзенне — гэта потым ужо. Адзенне можна надзець і зняць. Розум у чалавека адзін, і памірае ён разам з чалавекам. Не памірае толькі тое, што гэты розум стварае, усё застаецца — і добрае і благое».

## 15

Вочы даўно прызвычаіліся да густой, як спрасаванай, чарнаты снежаньскай ночы, і Чэся добра бачыла наперадзе невысокі ельнік і ўсю дарогу, вузкую, роўную; ельнік быў і справа ад дарогі, а па левы бок густой суцэльнай сцяною стаялі старыя, разгалістыя яліны, і над імі раз-пораз успыхвалі чырвоныя светлякі цыгарак; калі светлякі пыхалі нізка ля самага долу, колер іх быў бледна-ружовы, амаль белы.

Часцей за ўсё яна пазірала не наперад, а сюды, над кашлатыя яліны, і ў сэрцы ад светлячкоў узрываліся хвалі жаху, дзіўнага, абвостранага. Гэтага пачуцця не было, калі перапраўляліся на правы бок ракі — Дзвіна заставалася цяпер далёка ззаду,— не было і пазней, калі ўдала, без адзінага стрэлу, перайшлі гравійку, якая таксама ўжо ляжыць за спіною. Жах узнік цяпер, тут, на ўзлеску, дзе калона мабілізаваных спынілася адпачыць перад самым небяспечным кавалкам шляху — чыгункаю на Віцебск, якую неўзабаве давядзецца пераадолець.

Чэся паправіла санітарную сумку, каб меней рэзала плячо, потым пасунула бліжэй пад руку трафейны парабелум, што адцягваў рамень, і нечакана зразумела, што жах у сэрцы — гэта жах невядомасці. Там, ля Дзвіны, усё было знаёмае. Тут, ля чыгункі,— усё нейкае чужое, поўнае невядомасці. Нават яліны быццам з нейкага чужога і незнаёмага краю. І хіба меншая невядомасць наперадзе? Не меншая, ведама ж: там, за чыгункаю, ляжыць шырокі партызанскі край, пра які — вызвалены ад ворага былыя раённыя цэнтры Асвея, Расоны і шмат вёсак! — не раз ужо гаварылася нават у зводцы Саўінфармбюро. Так што там, за чыгункаю, можна будзе ісці

нават і ўдзень, нічога не баючыся. Яна, праўда, і ад Дзвіны ішла, нічога не баючыся: жах заявіўся ў сэрцы нядаўна, калі група Санько пайшла шукаць падыходы да чыгункі, а яна — адна толькі ўзброеная! — засталася ў сярэдзіне вялізнай калоны мабілізаваных. У яе — парабелум. У людзей жа і гэткай зброі няма — толькі нажы, ды і то не ў кожнага.

Імгненна, як толькі прагучала каманда на адпачынак, калона бязгучна знікла з дарогі — як растала ў цемры пад ялінамі. Нейкія адразу загадкавыя і патаемныя галасы парабіліся ў людзей: пра нешта — толькі дужа ціха — гамоняць, гамоняць, гамоняць. І што яшчэ дзіўна: як толькі яна, Чэся, набліжаецца, галасы адразу атухаюць, бы адкатваюцца некуды ўглыб пад павісь галля, і ўзнікаюць зноў, калі яна крыху аддаліцца — сцішаная гаворка абмінае яе, як абцякае вада камень на гонкай плыні. Хоць бы пачуць, пра што гамоняць! Ды, зрэшты, лёгка і здагадацца. Цябе палохае невядомасць? Палохае. Але ж ты з парабелумам — не з голымі рукамі ідзеш ўночы да чыгункі, якая паўсюль цяпер моцна ахоўваецца. І не гэта, мабыць, самае галоўнае. Ты ідзеш і ведаеш, што, прайшоўшы лінію фронту, праз нейкі час зноў вернешся сюды. А яны? Яны ведаюць, што чакае іх там, за той лініяй фронту? Хаця, чаму ж не ведаюць! Усім гаварылі неаднойчы, што частка пойдзе ў армію, частка, атрымаўшы зброю і сабе і тым, хто застаецца ў вёсках, вернецца назад і будзе ваяваць у тыле ворага, у сваіх мясцінах. Так што кожны, ведама ж, думае пра свой лёс, куды ён павернецца там, за лініяй фронту. Ды, зрэшты, трэба да той лініі фронту яшчэ датэпаць! А раптам калона паляціць на фашыстаў? Чым бараніцца? Як? Калону амаль у трыста чалавек суправаджае аддзяленне Галяна і група Санько. Але ў падрыўнікоў заданне простае: пераправіць калону за чыгунку і вярнуцца назад. Далей калону будзе суправаджаць пяць узброеных чалавек: тры наперадзе, два — ззаду. Захар сказаў усім бязлітасную праўду перад адпраўленнем: на трыста чалавек у вас ёсць аўтамат, карабін і тры вінтоўкі, і хай кожны, маўляў, лічыць гэта і сваёй уласнай зброяй. Так што ёсць пра што пагаманіць і тым, хто ідзе са зброяй, і тым, хто ідзе без яе. Як бы, скажам, вось ты ішла, каб у цябе не было парабелума? Пра што б думала?..

Ад гэтых думак рабілася непамысна: быццам шкадуе яна, што ідзе з калонай. Але ж можна было і не ісці! Ні-

хто яе не прымушаў, і паїсці з калонаю павінна была Гайдаш. Але потым усё пераіначылася, і ўчыніла гэтую нературбацыю яна сама, Чэся. Зусім выпадкова пачула пагудку, што паўзла па першай роце: камандзір атрада, маўляў, сваякоў ад куль беражэ. Факты? Калі ласка! Пляменнічка з небяспечнай і шкоднай працы ў кузні зняў? Зняў. А другіх людзей у тое пекла сунуў. Сястрыцу сваю ў лепшую зямлянку пасяліў? Пасяліў! І на небяспечныя заданні не пасылае...

Дачуўшыся пра гэта, Чэся абурылася, ледзь не плакала, потым пабегла да Захара. Той выслухаў усё моўчкі, схмурнеў, зазлаваў і нечакана пачаў рагатаць: бабскія, маўляў, плёткі яна слухае! Але Чэся заўважыла, што смех роблены, што пагудка тая балюча сцебанула і яго. І тады ў яе адразу нарадзілася рашэнне: яна пойдзе з калонаю, а Гайдаш хай застаецца. Захара яшчэ больш узарвала: з калонаю ідзе Гайдаш, то вырашана цвёрда і канчаткова. Загад аддадзены, тлумачыў ён потым, і ўсе яго ведаюць, і ён, камандзір, маўляў, не можа павесці сябе як чалавек несамастойны: сёння — адно, заўтра — іншае. І дзеля чаго, зрэшты, гэта рабіць? Каб абвергнуць нейкую дурную плётку? Захар на гэта не можа ісці і не пойдзе. Усё ўзгоднена з Ціханам, а той нават прозвішчы людзей, якія ў групе суправаджэння, паведаміў у штаб партызанскага руху.

З Захарам і Артур нібыта згаварыўся — рашуча паўстаў і пярэчыў супраць уключэння Чэсі ў групу суправаджэння калоны. Дакладней, не пярэчыў — каму яго пярэчанні патрэбны і хто б іх слухаў! — а ўсяляк адгаворваў: дарога, маўляў, цяжкая, небяспечная, назад ідучы, давядзецца цягнуць на сабе вялікую паклажу. І пядобра, што малога яна аднаго пакідае — на гэта ён асабліва напіраў. Але гучалі яго словы непераканаўча, і дужа ж кідалася ў вочы тое, што ён нечым узбуджаны, імкнецца пераканаць Чэсю як мага хутчэй. Ёй здалося, быццам Захар яго на яе напусціў! Настойлівасць Артура яшчэ больш надала ахвоты пайсці наўпярок усім.

Усё вырашыў выпадак — прыехаў Ціхан, і Чэся кінулася да яго. І дзіўна: Ціхан, крыху разважыўшы, яе рашуча падтрымаў. Відаць, пераканала тое, што калоне давядзецца ісці непадалёк ад Віроўлі, а мясціны тыя Чэся добра ведае — збірала ў тых лясах грыбы і ягады, калі ездзіла ў госці да бацькоў Зінаіды. Зрэшты, яна не вельмі і дакапвалася да прычыны Ціханавай прыхільнасці, яна

нават імкнулася меней яму трапляць на вочы, каб ён не перадумаў і не змяніў сваё рашэнне.

Як аднесліся да гэтай перастаноўкі ў групе суправаджэння — не ведала. Але прыкмеціла, што Галян дужа ўзрадаваўся. Дарогаю, ад Артура, яна дачулася, што Галян адыграў не апошнюю ролю ў тым, што Ціхан так хутка пагадзіўся на перастаноўку.

Чэся шчыра падзякавала Галяну. І зрабіла гэта не толькі з тае нагоды, што ён яе падтрымаў, болей, відаць, за тое, што яго ранейшая прыхільнасць да яе здалася больш важкай, шчырай і важнай. Сэрца ў гэтага Галяна, відаць, залатое. За ўвесь час, які яна ў атрадзе, Чэся не пачула ад яго аніводнага грубага ці злоснага слова, гаворыць пачціва, глядзіць ласкава, з даверам. І рукі ў чалавека залатыя! Якія хвацкія чаравічкі змайстраваў Толічку з халяў нямецкага бота! А як з малым забаўляецца! І малы ахвотней да яго ідзе, чымся да каго другога.

Калі паводзінам Галяна яна знайшла нейкае апраўданне, дык Багданава радасць была зусім незразумелай. Праўда, ён нічога не сказаў — каб табе слоўца ўхвалы ці нязгоды, калі дачуўся, што ў групе суправаджэння замест Гайдаш пойдзе Чэся! — але гэткім радасным шалам запаліліся яго вочы, у гэткай вясёлай усмешцы выгнуліся яго губы, што яна спалохалася. З чаго ў яго такая радасць? Ён вунь і цяпер ідзе і насвіствае нешта вясёлае, як тады, у лагеры, бы птушачка ціліўкае на золаку: цвыр-чур-р, цвыр-чур-р... Багдан гэта! Але ж чаго ён дзярэцца праз ельнік? Чаму не прастуе дарогаю?

Ён убачыў яе, аціх; веньказ затвор аўтамата.

— Хто? — спытаў адрывіста і тут жа яе пазнаў, дадаў весела: — А хто мне насу-устрач выйдзе? Ведаць не ведаю я...

Весялосць у голасе чулася не робленая, шчырая, як і шчырай была непрытоеная горыч у словах запытання і адказу, які прагучаў сцверджаннем горкім і няпэўным; і ад гэтай яго весялосці Чэсі зрабілася хораша. Пачуццё жаху знікла — побач стаяў чалавек, якога яна ведала.

— Ёсць чыгунка? — спытала Чэся.

— А куды ж ёй дзецца? Ляжыць, акалеўшы. І ахоўваецца добра.

— Дык што, не пройдзем?

— Мы ды каб сваю родную чыгуначку не пераскочылі? Пяройдзем! Дзірачку намацалі добранькую. Так што лічы: ты — ўжо там, далёка ад ненавіснага табе Багдана!

— Навошта ты гэтак гаворыш? Не трэба!

Ён папрасіў дзелавіта, але зноў усё з той жа ранейшай і добра ёй вядомай фанабэрыяй:

— Разгарні шпіталёк, калі ласка. Аджалкуй галавешцы роднага чалавека ёду кроплю і бінціку кавалачак,— і, скінуўшы шапку, пачаў абмацваць галаву.— Чую, цячэ за каўнер нешта. Думаў, што снег растае. Ажно — кроў...

— Небачка! Быццам нажом па скроні чахнулі! — і Чэся хуценька выцягнула з сумкі ёд і бінт.— Як жа гэта?

— Ты неравяжы і маўчы. Я гэтага Галяна ведаю! Возьме ды назад турне. Чуеш?

— Як хочаш — гэтак і скажу.

— Залатое ў цябе, Часлава, сэрца.

— Ты лепей скажы, як гэта табе собіла?

— Патрулі праклятыя — праз іх усё. Чакалі, чакалі — няма і няма.

— А дзе ж ты параніўся?

— Кажу ж табе — патрулі. Няма і няма, пачалі іх шукаць, каб на засаду не наляцець — калона ж! Я пад самы бункер падпоўз. І тут чую— выходзяць: гер-гер ды гер-гер... Ляснуўся ў снег — ледзь вочы не прапароў. Хмыз там пассякалі, а карчэўе тырчыць пікамі, і як нажы вострыя. Трэба ўсіх папярэдзіць, каб не кідаліся на зямлю абы-як, у выпадку чаго. Хай прыглядаюцца. Дзе калона?

— Усе пад ялінамі. Ззаду. Я наперад выйшла.

— У-у-у... Пячэ!

— Гэта і добра. І не варушыся, бо бінтаваць замінаеш.

Чэся лоўка і хутка бінтавала яму галаву, і ён падахвочваў яе, ухваляў, і голас яго неяк пацішэў, загучаў даверліва і ўдзячна:

— До-обра робіш! Мацней толькі круці, каб не звалілася. І шырока не пускай бінта, не пускай! Я потым аблавушкай прыцісну — знаку не будзе, ніхто і не ўгледзіць да раніцы,— і нечакана прамовіў шчыра і прыязна: — Рукі ў цябе добрыя. Я рукі твае шчэ ў першы дзень, як стрэліся, заўважыў: рукі жанчыны, у якой добрае і спагадлівае сэрца. Ты памятаеш, які тады быў дзянёк, калі я цябе стрэў? І дзе гэта было, памятаеш?

— Не балбачы,— строга папрасіла яна.

— Значыцца, не памятаеш. Ты шмат чаго не памятаеш. Ведаў я і гэта, прыкмячаў. Я вось добра памятаю, як прыехаў з арміі ў адпачынак... Ехаў — спяваў. Э-эх, думаю, прывязу дамоў тую перамогу на матагонках. Табе прывязу. З вялікім гонарам ехаў...

Яна перапыніла яго адрывіста, тонам незадаволеным, дзівячыся, што гэтая незадаволенасць гучыць слабей, чым ёй гэтага хацелася:

— Памаўчы! Слухаць не хачу!

— Не хочаш? Гэта ўжо не пераробіш. Сілком нічога добрага ў жанчыны не выцыганіш. Ніхто і ніколі нічога добрага не дамогся ў жанчыны прымусам...

— Сціхні, філосаф! Слухаць лухту мотатпа!

— Табе — лухта,— ён уздыхнуў, і яна зноў здзівілася, што гэта прагучала вельмі шчыра. Ён дадаў тут жа, дадаў зусім іншым тонам, у якім, аднак, гучала шкадаванне, што яна не хоча слухаць яго і разумець: — А ў ёй — жыццё, можа, усё жыццё...

— Калі мы далей рушым? — яна спытала, абсякаючы гаворку, якая была ёй не па душы.

— Можаш радавацца: праз паўгадзінкі пераскочым чыгунку. Падыходы Шлык, корч гэты стары, сапраўды ведае: цюцелька ў цюцельку падвёў. Кажа, што гасцяваў тут у нейкага дарожніка. Да вайны, кажа...

— Колькі да чыгункі?

— Трыста сорак восем крокаў. Ішоў і лічыў, бо ведаў, што Часлава абавязкова папытае.

— Трэба цішэй. Пачуюць.

— Лухта гэта, як ты кажаш. У ельніку, ды ў туманку галасы адразу глухнуць — далёка галасы не ідуць,— і раптам патрабаваў незадаволена: — Досыць! Расшчодрылася і круціць усё, круціць... Завязвай!

— Усё табе спехам. Усё і спехам і смехам,— і раптоўна, зусім нечакана для сябе, пажартавала: — Не хвалюйся. Да вяселля шчэ загоіцца.

— Да майго ці твайго?

— Там відаць будзе.

— Цяпер як сонца мне наперадзе — ёсць хоць чым жыць!

Багдан паспрабаваў зазірнуць у Чэсін твар, але яна, зашпільваючы санітарную сумку, была занята гэтым сваім клопатам, як адвярнулася ад яго, і ён пацалаваў яе ў патыліцу. Чэся здрыганулася, сціснулася, потым адхіснулася як ад удару, піхнула яго. Ён стаяў, пахіліўшыся, і яе правая рука, слізгануўшы па рамяні аўтамата, тыкнулася ў скронь, указальны палец зачапіў бінт, ссунуў яго і шкрабануў скуру.

— О-от, нарабіла,— прамовіў Багдан з разгубленым

смяшком.— Замест адной драпіны — дзве маем. Усе бінты зрасходуеш на мяне.

— Калі ўжо свае выбрыкі кінеш? Сказала ж табе...

— Што Багдан ні робіць — усё ёй пагана. Аддзячыць жа хацеў — перавязала добра, не баліць зусім. Дай, думаю, пацалую.

— Маеш каго цалаваць!

— Калі сэрца гарнецца — тады і цалуеш. А ў адпаведнасці з нашым законам, ведаеш, хто ты ёсць? Мне хто ты ёсць?

— Ну, ну! Хто ж гэта я табе?

Спытала і імгненна сцяміла, што Багдан гоніць яе ў капкан — прымусіў да гаворкі з ім пра іх мінулае, да той гаворкі, дзе ёй, так ці інакш, давядзецца апраўдвацца. Ліхаманкава шукала выйсце і з жахам, які цяпер зноў ціснуў ёй сэрца, адчувала, што капкан сціскаецца не так яго воляй, як яе ўласнай паспешнасцю і гарачнасцю, жаданнем давесці нешта Багдану.

— Хто ж гэта я табе,— паўтарыў ён яе словы без запытання, паўтарыў спакойна і памяркоўна, і скончыў сваю думку з падкрэсленым гонарам: — Тое ты і без мяне ведаеш. Наш шлюб скасаваны? Не, не скасаваны. Разважаем далей. Вайне — канец. Мірнае жыццё. І ў тым мірным жыцці — я ўпруся: не хачу, маўляў, скасоўваць наш шлюб. Хачу, каб сям'я не бурылася. Кахаю толькі Чаславу — сваю законную жонку!

І гэтае, з націскам «сваю законную жонку» зламала капкан. Чэся развесялілася па-сапраўднаму, сэрца зноў вызвалілася ад жаху, глыбока ў душы ажыло добрае пачуццё да Багдана, за гэтыя яго словы, у якіх — яна гэта добра адчувала! — няма аніякай праўды. І тут жа адвергла гэтую думку, пачала апраўдваць Багдана. Ён кахаў яе — і гэта, ведама ж, шчыра ён гаворыць,— і гэтаму каханню балюча зрабіла спачатку яна, Чэся, і ён жа мае права і папракаць яе; адчуванне старой віны перад ім нечакана прывяло яе да высновы, што Багдан не зусім кепскі чалавек і што сэрца ў яго добрае.

Сама выснова не толькі бянтэжыла яе, але спараджала злосць. Як хутка яна можа мяняць сваю думку! Сказаў ёй колькі прачулых, ліслівых слоў, і — маеш табе! — адтаяла, з даверам ужо.

— І паклічаш Маўджуду ў сведкі. Каб яна ўсё пацвердзіла? Але ж яна — не Чэся,— і дадала цяпер ужо з адкрытай злосцю, раптоўна зразумеўшы ўсю памылко-

васць сваёй думкі пра нейкую дабрыню Багданавага сэрца.— Яна табе кулю ў тваю дурную галавешку адразу ўлепіць. І яшчэ і скажа, што гэтак, з куляю, было і раней!

Ён нейкі час глыбока, зацяжна соп носам, потым прамовіў пакрыўджана, і гэтая крыўда як бы ёй і не адрасавалася:

— Злосныя вы стварэнні, бабы! Цяжка ім нажартаваць, калі чалавеку трэба.

— Жартаваць мне не хочацца.

— Вось тут праўду гаворыш: не хочацца — вось у чым грунт.

— Добра, што хоць гэта разумееш.

— Каб жа толькі гэта! Разумею значна болей, чым табе здаецца...

Багдан пакрыўджана зацяжна дыхаў носам, і Чэся здагадалася, што ён чакае, куды ж далей выверне гаворка, куды ж можа скіравацца. Ён усё разлічыў правільна — яе сапраўды зацікавіла нечаканая паваротка гаворкі,— апрача аднаго: яна разгадала яго намер, разгадала і бязлітасна абсмяяла не яго, а сябе, загадала не паддавацца на Багданаву вудачку, не спрачацца, нічым не цікавіцца. Насцярожанасць, што заўсёды гучала ў яе сэрцы пры сустрэчах з Багданам, цяпер бруілася з новай сілай, і яна, надпарадкоўваючыся гэтаму голасу, спытала строга, даючы зразумець, што пра асабістае гаварыць болей не будзе:

— Калі мы рушым?

— Чакаем Артура.— Паявіцца — поїдзем. Пайду, калону падварушу.

— А чаго яны адкрыта кураць? Трэба ім сказаць.

— Што ты ім скажаш? Хвалююцца людзі...— і зноў, з нейкім радасным смяшком папракнуў: — Гэта толькі ў цябе сэрца каменнае...

Стрымалася, не палезла ў гаворку. Нейкі час чуліся мяккія і асцярожныя крокі Багдана, потым загучаў яго сцішаны голас — Багдан пра нешта гаварыў з людзьмі, якія адпачывалі пад ялінамі. Чэся стаяла нерухома, узіраючыся ў цёмнае ўзлессе наперадзе. Яна толькі цяпер заўважыла, што дровы на ўзлеску неаднолькавыя па колеру: маладыя ельнік цёмны, а старыя дрэвы святлейшыя, як бы крыху выбеленыя з сярэдзіны, і макавінкі іх з выразнымі зубчыкамі, бы намаляваныя. Ціншыня, як у сутарэнні. А вось чуецца слабае храбусценне снегу за спіною. І як галасы нейкія.

Чэся азірнулася. Бліжэйшыя яліны як бы яшчэ больш

сцямнелі, нават макавінак не відно. Пыхнуў у доле адзін святляк, другі. Зноў курыць людзі: шчэ нават пабольшала гэтых светлякоў, як Багдан там нагаманіў. Дзіўнае нешта адбываецца з ім, Багданам. Усю дарогу, як праз Дзвіну пераправіліся, выхваляецца, фатыгуе ці пачынае малоць нейкую лухту. Перад гравійкаю дык клапатлівы зрабіўся — паважыўся быў камусьці яе санітарную сумку ўціснуць: яна ж, маўляў, вас ад смерці ўратуе, а вы паклажы не хочаце памагчы паднесці. Ледзьве яна ўгаварыла гэткага жаласніка! Цяпер — з пацалункамі палез: падзякаваць яму, бачыце, захацелася! Ці гэтая яго гаворка — не хачу, маўляў, скасоўваць наш шлюб. Кахаю, маўляў, толькі Чаславу... От жа хлус! Паганы хлус, у якога і сораму не прыкмеціш!.. Але ёсць у гэтай лухце і каліўца праўды: пасля вайны шлюб сапраўды афіцыйна скасоўваць давядзецца! Дурны і неразумны шлюб!.. Колькі гора і пакуты давялося перажыць ёй праз гэты адзіна-адзіны няправільны крок... Дзіўна як у жыцці. Адзін крок — і ўсё дагары нагамі паляцела. Але гэта тады, як вайны не было. А цяпер? Паспрабуй, зрабі гэты няправільны крок — на тым і канец: і няправільным крокам, і шкадаванням, і пакутам, і радасцям... І ніяк жа нельга прадбачыць яго, гэты крок, нельга счакаць, каб угледзець верную сцежку, што не да бяды вядзе... Гэта ж не тое, што мірны час, калі ніхто не замінае, калі можна ўсё і абгледзець, і ўзважыць... А вось бачыш жа, у той час якраз і збочыла, галубачка, не ў той бок, куды трэба было, пайшла. Хіба ж цяжка тады, перад вяселлем тым, сказаць Багдану шчыра і ад душы: к чорту вяселле, не будзе ў нас ладу. Цяпер ёй здаецца, што быў гэты намер. А тады яна ўся ажно агнём гарэла, ад радасці ледзь не ў скокі ішла: адпомсціла, маўляў, Мсціславу, сваё давяла, хай жа ведае!..

«Ты шмат чаго не памятаеш...»

А можа, і тут таксама Багданава праўда?.. Не-е, усё чысцютка ляжыць у памяці. Нават горыч і нянавісць, што чуліся ў Багданавым голасе, калі гарэла хата, і ён смаргануў яе за руку. Якія ў яго тады былі вочы! Як у забойцы вочы! І вось жа адчувае сэрца, што вінен Багдан у смерці Слаўчыка! Прыклаў ён тут руку, прыклаў... А вось доказаў аніякіх няма. А калі доказаў няма, дык нельга ж чалавека абвінавачваць, нельга на яго ўвесь свет вярнуць. А ты ж яго ўвесь час абвінавачваеш! Праўда, не розум абвінавачвае — сэрца тваё. А толькі голасам сэрца нельга кіравацца! Не, толькі сэрцу і трэба давяраць: яно, сэрца, не намы-

ляецца. І цікава, а чым жа Багдан кіруецца? Розумам толькі?.. Наўрад. Але розум у яго ёсць, дурнем яго не назавеш. Ці толькі сэрцу давярае?.. Мабыць, болей сэрцу ўсё ж. Каб толькі розуму давяраўся, хіба ж не перакапаў бы сябе, што яму ў Чэсіным сэрцы нават і маленькага месцейка няма? Перакапаў бы, напэўна. Перакапаў бы даўно! Значыцца, розумам ён не кіруецца. А ты? Ты чым кіравалася ў тыя дні, калі Багдан прывёз табе перамогу з тых матагонак? Розумам? Сэрцам? Ты ж і першае, і другое — розум і сэрца, жыццё да апошняй кропелькі! — гатовая была аддаць, каб толькі Слаўчыку свайму не нашкодзіць. А каму нашкодзіла? Каму блага зрабіла? Сабе толькі, бо ўсё з вывертамі рабіла. Багдан жа на чым стаяў, на тым і сёння стаіць. Магчыма, памылка гэтая ў тваіх развагах? Але ж ён што гаворыць? «Не хачу скасоўваць наш шлюб...» Шчыра гаворыць гэта ён. Калі чалавек кахае насапраўднаму, каханне будзе жыць у яго сэрцы ўсё жыццё, да скону дзён. «Кахаю толькі Чаславу, сваю жонку...» А якія ж словы, цікава, казаў ён гэтай сваёй гарапцы?.. Маўджуда яго па-сапраўднаму кахае. Яна за яго і на смерць пойдзе... А небачка! Яна ж, Чэся, раўнаваць пачала!

Думка здавалася ёй смешнай і наіўнай. Але яна выклікала ў душы пратэст: што табе да чужога кахання! Ты кахала толькі Мсціслава! Аднаго яго! І кахаць яго будзеш да скону дзён, усё жыццё, якое табе давядзецца пражыць. І калі Толічак вырасце, ты яму раскажаш пра смерць бацькі, пра тое, які гэта быў добры, мужны, шчыры і ласкавы чалавек...

Занила, зайшлося болем сэрца. Чым узялася суцяшаць сябе! Ты шчэ дажыві да тых дзён, калі Толічак падрасце і зможа цябе зразумець. Зрэшты, хлопчык зразумее. А ты чым будзеш жыць тады? Успамінамі? Думкамі пра каханага чалавека, якога побач няма і не будзе?.. Небачка, каб жа яна магла прадбачыць усё тое, што зараз вакол? Хіба ж ставілася б яна гэтак ашчадна да свайго кахання, як ставілася? Хіба ж саромелася б яна свае пяшчоты і яго, Слаўчыкавай, пяшчоты?..

Ёй раптам прыгадаўся адзін з вечароў, калі Мсціслаў быў побач. Мсціслаў толькі што залюляў Толічка, моўчкі прыхінуўся шчакою да яе пляча, потым паклаў рукі на паясніцу, ціха павёў іх уверх. Яна прасавала бялізну, якую ранкам трэба было несці ў фашысцкі шпіталь, і не зусім ласкава сказала Мсціславу, каб ён клаўся спаць —

процьма ж вось, маўляў, працы. А ён усё стаяў побач, і яна тады скінула яго рукі, зноў сказала, каб ён ішоў і клаўся спаць, і не замінаў ёй, і ён, прыцішана ўздыхнуўшы, паваліўся да ложка і потым, лежачы пад коўдраю, зноў наклікаў яе. Яна паабяцала, што зараз прыйдзе, і не ішла. Скончыла прасаваць бялізну позна, амаль апоўначы ўжо, і прылегла, калі Мсціслаў спаў. Прылегла асцярожненька, каб не пабудзіць яго, і адразу ж заснула, а ранкам абудзілася і была ўжо ў ложку адна.

Удзень Мсціслава не ўбачыла — яго схапілі фашысты.

Памяць вярнула цяпер і Мсціславаў голас, і яна застагнала ад думкі, якая прыходзіла ўжо неаднойчы, але цяпер была асабліва балючая, нясцерпная: той вечар, апошнюю ноч з Мсціславам яна прамяняла на прасаванне фашысцкай бялізны. Яна разумела, што гэта не так, што яна не вінаватая, што бялізну трэба ранкам несці ў шпіталь, і ўсё роўна не магла дараваць сабе тую ноч, не магла дараваць сабе анічога ў той ночы: і паганы клопат, і тое, як яна скінула рукі Мсціслава, і голас, і сваё жаданне ўправіцца з праклятай і ненавіснай працаю.

І кожны раз, як такая думка прыходзіла, адчуванне віны свае — нават не віны, а той сваёй чорствасці, веры, што шмат яшчэ дзён і начэй у іх з Мсціславам наперадзе,— усё абвастралася і мацнела. І вось цяпер ёй зноў заняло дыханне, і яна стаяла, слухаючы, як нарастае ў грудзях буханне сэрца. Яна глядзела прагна ў цемру, быццам Мсціслаў быў недзе побач, тут, у гэтай ночы, і ў вушах чуўся і яго голас уночы, і голас сына, голас уранні ўжо, калі яна ляжала на ложку адна: нібыта яны наклікалі яе, наклікалі ціхутка, але разам, і галасы іх спляліся ў адзін далёкі і трывожны покліч...

А што робіць цяпер? Гамоніць з Багданам! Спрабуе суцешыць сябе наіўнай думкаю пра тое, што ёсць нейкі сэнс у тым, што той чаўпе! Ён, маўляў, пасля вайны ўпрэцца і не схоча скасаваць шлюб. І яна, дурнічка, растрывожылася, пачала думаць пра гэта, пачала нават нешта шукаць добрае ў Багданавай натуры!..

Чарнелі блізкія і шчыльныя, як сцяна, старыя яліны, ледзь улоўна мігатнуў чырвоны светлячок і як ударыў яе пад сэрца. Вось гэтак, мажліва, блісне стрэл, блісне нечакана і неспадзявана, блісне зусім не ў тым месцы, дзе яго чакаеш. Убачыш яго, і канец усім тваім трывогам!

«А Толічак жа... Толічак жа тады адзін застанецца, гаротнічак маленькі...»

Шырокай хваляй паўзла па плячах халодная паганая дрыготка, і сэрца вярэдзіла думка, якую Чэся гнала прэч, прагна намагалася закрэсліць — думка пра тое, што, відаць, трэба было паслухаць Захара, не ісці, застацца, быць зараз там, побач з малым, а не нудзіцца тут, на гэтай дарозе, сціснутай чорнымі ялінамі. А раптам бяда там якая, навала непрадбачаная?.. Хто яго, малога, уратуе, хто дапаможа?.. Не, яму, малому, там добра: і цётка Марыля дагледзіць, і Шлычыха, і Тоська, гарэза тая... Не, не на чужых людзей яна пакінула малога: яны яго і накормяць, і напояць, і спаць пакладуць, і ад бяды затуляць... Бяду ж цяпер паўсюль можна напаткаць. Кожнага яна, бяда нечаканая, можа сустрэць, у самым нечаканым месцы. І дарэмна ты толькі аб сабе клопат трымаеш, толькі сваё сэрца слухаеш, толькі сваёй трывогаю жывеш. Вунь, пад ялінамі, сотні людзей ляжаць, і ў кожнага і жонка засталася, і дзеткі, мажліва, і ва ўсіх у іх адзіны клопат галоўны — узяць зброю ў рукі, каб біць ворага, бараніць сваю зямлю ад чужынцаў... А ты гэтых людзей напалохалася! Ты ж з імі павінна ўвесь час быць! Ты ж на тое з імі і паслана, каб у бядзе, калі надарыцца, ім памагчы. А ты што робіш? Нудзішся, мітрэнгаю рознай сабе сэрца вярэдзіш. А ты ж ім за ўзор павінна быць, бо ў тваіх руках ёсць зброя!..

Яна павярнула назад, да ялін, і, крыху прайшоўшы, пачула прыцішаную гамонку. Багданаў, здаецца, галасочак? Так, Багдан там нешта пляце — вясёлае, гуллівае: зноў, відаць, пацяшаць людзей узяўся. От жа чалавек: не можа жыць, каб галавы каму-небудзь не падурыць.

Чэся спынілася, услухоўваючыся. Багданаў голас гучаў цяпер выразна.

— Раскажу адну гісторыю — тое, што сапраўды было. Толькі месца, дзе тое было,— вы потым зразумееце, на якіх меркаваннях,— назваць не маю права. Людзі тыя шчэ там жывуць. І хай сабе на здароўечка жывуць яшчэ сто год.

— А што нам тая назва? Абыдземся!

— Але ж у вас, не скажы я, дзе тое было, веры не будзе.

— Ды будзе вера. Ліха з ёй, той назвай. Гані сюды гісторыю!

— Каб толькі потым наракання не было, што збрахаў, маўляў, Багдан.

— Якія шчэ гэта нараканні! Расказвай!

Багдан адкашляўся, крыху счакаў, потым пачаў гола-

сам спакойным і кволым, быццам з-пад прымусу гаворыць, быццам гэтым самым вялікую паслугу робіць сваім слухачам:

— На адвячорку, прыцемачкам ужо, Цімох — жыве ён у першай хаце ад краю, ля выгану, там, дзе студня з новым зрубам, шчэ перад вайною зробленая,— пасылае Гэльку, бабу сваю, за вадой — халодненькай вадзіцы на ноч яму захацелася. Гэлька кабета ядроная, прыгожая. Сагнулася яна над зрубам, ваду са студні цягне — поўнае вядро. А сусед ззаду прыладзіўся — ца-алуе ў патыліцу. Цімох убачыў, на ганак выскачыў — бугаём раве: Гэлька, карань табе ў душу, не бачыш, што ззаду робіцца? Гэлька галаву павярнула — вядро трымае, баба яна гаспадарлівая — і на Цімоха свайго таксама сыкнула: як мне, маўляў, бачыць, што ззаду робіцца? Вачэй у мяне ззаду няма! Ды шчэ кулаком яму грозіць: ты чаго, маўляў, дурная галавешка, равеш на ўсю ваколіцу? Дакрычышся да таго, што вядро ўтаплю — сам тады ў студню скочыш. Мяне туды не загоніш!

Душыліся рогатам — уголас рагатаць баяліся,— але воклічы прарываліся адчайныя і вясёлыя:

— Гу-у-у... Ззаду вачэй няма!

— Юу-у-у... Каб жа ты жыў здаровенька і лоўка, Багдане, як і брэшаш!

Чэсі зрабілася сорамна: слухае разам з гэтымі бугаямі брудную несусветчыну. І што самае дзіўнае! Яна, брудная гэтая несусветчына, прымусіла і яе заўсміхацца, не выклікала гневу і абурэння да таго, хто яе сплёў. І галоўнае — паддалася і яна, стаяла, вушы развесіўшы, спадзявалася пачуць нейкую цікавую гісторыю. І паспрабуй жа сказаць, папракнуць Багдана — яе не зразумеюць, улезла, маўляў, у мужчынскую гаворку!

— Хлопцы, цішэй,— папрасіў Багдан.— Фрыцаў павошта палохаць, хай спяць ля печачкі,— і, заўважыўшы Чэсю, паклікаў ціха, як бы віпавата: — Чэся, Чэся! Куды ты? Пачакай...

Яна не адгукнулася, пайшла да тоі яліны, дзе нядаўна стаяла, ішла таропка, не азіраючыся. Ён пабег следам, спытаў, быццам не рагатаў толькі што — голас гучаў заклапочана:

— Зараз рушым на пераход. Не адрывайся ад калоны.

Яна абурана выпаліла:

— І што толькі твой язык плешча! І як ён не ўсохне ад нахабнічыны гэткай.

— Ха! — Багдан грэбліва, але дабрадушна хмыкнуў.— Бабы, калі хочаш ведаць, яшчэ не гэткае заліваюць!

— Скрозь ты — вялікі знаўца!

— Злосная ў вас парода, у Крупняў,— сумна прамовіў Багдан пасля кароткай развагі, і гэты сум у яго голасе яе насмяшыў.

— Спачатку толькі адна Чэся была злосная. Цяпер — парода, ажно ўся цалкам!

— А ты зірні на ўсё як ёсць. Ціхан прыедзе, усіх струніць! Захар — ды ён жа бы з каменя зроблены! У другіх атрадах дык муж і жонка ў адным узводзе. І нармалёва. Нават вяселлі ладзяць. І нічога, не развальваюцца атрады. А ў нас? Да жанчыны бліжэй як на дзесяць крокаў падыдзеш — распуста. А ўжо калі на два крокі — у-у-у,— і Багдан ажно рукі ўзняў, слова патрэбнага не знайшоў.

— Ты ж вось бліжэй стаіш. І ніхто цябе не струніць!

Ён засмяяўся:

— Бо ноч. І Захар не бачыць. А каб быў недзе побач, мелі б на арэхі.

— Дык точна. За гэтую брыду, што людзям чаўпеш. І добра, каб прыструніў.

— Пра закон Архімеда чула? — спытаў ён памяркоўна.— Не, не пра той, што ў падручніку. Наш «стыліст» яго вывеў — мне хлопцы казалі. Чалавек па тым законе, бы той акумулятар: няма ў ім току — не свеціць. А чалавек ад смеху, як акумулятар, зараджаецца.

— Мудрэц ты зрабіўся!

— Натуральна. Чым больш абставіны на чалавека ціснуць, тым больш у чалавека воля да супраціўлення.

— Як што — адразу на абставіны спасылацца!

— Не-еа, я на чалавека спасылаюся. Пачакай,— і ён, прыгнуўшыся, ціха запытаўся: — Артур?.. Як там?

— Па рэчках усё коціцца. Узнімай людзей... Хто тут з табой?.. Цётка Часлава?.. Яе, дарэчы, і чакаем — Шлык руку сабе прапароў.

— Ён жа цалюткі быў, як я сюды пайшоў!

— Гэтак жа, як і табе, собіла — на карчэўе ляснуўся.

— От паганцы! Нават хмыз на свой лад цярэбяць,— Багдан ціха вылаяўся.— Нібыта бароны наточаныя пад снегам.

— Пішы скаргу — мякчэйшае табе пасцеляць,— пажартаваў Артур.— Узнімаем людзей. Па маіх слядах цяпер пойдзем,— паклікаў Чэсю: — Пайшлі, Часлава бацькаўна...

Яна ішла за Артурам, які, крыху прыгнуўшыся, быццам плыў каля маладых яліпак, і галіны амаль не шапацелі — ён адсоўваў іх рукамі па бакі,— і ногі ступалі нячутна, мякка чурхалі па снезе. А ў яе пад ботамі снег увесь час суха шамацеў, углыбі патрэскваў, быццам там ламалася нейкае сучча, і яна кожны раз уздрыгвала ад пошчакаў аснежанага галля, якое час ад часу хлабыстала санітарную сумку. Ёй было няёмка, што яна не можа ісці гэтак ціха, як ідзе Артур, злавалася яшчэ і таму, што ён па роўных размаўляе з Багданам, што гэтак жартаўліва сказаў ёй «Часлава бацькаўна». Закінула сумку за спіну, падтрымлівала яе адной рукой, левай, а другой, правай, сціскала ручку парабелума, які быў у кабуры.

— Зашпіліць трэба,— параіў не вельмі строга, але з прытоепым смяшком Артур.— Кабуру зашпіліць, капцы каб не былі парабелуму.

— Зыркасты ў мяне пляменнік, аднак,— сказала яна незадаволена.— Чаго гэта — капцы?

— Зваліцца ў снег — і не знойдзеш. А страляць тут няма па кім. Патрулі сядзяць у бункеры, грэюцца ля печкі. Хлопцы з таго боку ў засадзе — пільнуюць.

Ельнік парадзеў, дрэўцы цяпер раслі паасобку, прысадзістыя, з доўгім у доле голлем і намнога святлейшыя за тыя, што ля сцежкі ў лесе. Роўным трохкутнікам, прыўзнятым над зямлёй і як бы пасаджаным на два слупы, чарнела старая яліна са стромкай вяршыняй і доўгімі, заснежанымі ўнізе галінамі.

Чэся наблізілася да іх амаль ушчыльную і тады прыкмеціла, як адзін са слупоў, што трымалі чорны трохкутнік, зварухнуўся, паплыў убок і адразу набыў абрысы чалавечай постаці. Яна разгубілася, не магла вымавіць нічога, толькі схапіла Артура за руку, і тут жа ўчула ціхі Шлыкаў голас:

— А што я калоны не бачу?

— Багдан вядзе,— сказаў Артур.— Цішыня тут?

— Поўная. Заслоны стаяць. Самы час чыгунку пераскочыць. Не варта марудзіць, пакуль неба не пачало праясняцца.

— Спачатку вам трэба руку завязаць,— сказаў Артур і сеў на снег пад ялінай.— Хоць хвілінку пасяджу.

— Пяройдзем, тады ўжо рукою зоймемся. Неба мяне непакоіць. Быццам пасвятлела. І не будуць жа яны поўную ноч ля печкі сядзець у бункеры — выпаўзуць...

— Давайце сюды руку.

— Потым, потым, потым!

Упартае гэтае пярэчанне адразу супакоіла Чэсю.

— Якая? Правая ці левая? — спытала яна прыцішаным голасам і, саўладаўшы з сухасцю ў роце, запатрабавала: — Давайце, давайце... Хоць папярэдне перавяжам,— узяла левую руку, якую паслухмяна працягнуў Шлык, агледзела тыльны бок далоні з цёмнымі шырокімі пісягамі крыві, паабяцала: — А ўдзень, як пасвятлей будзе, зробім як след...

— Удзень? Удзень яна ўжо загоіцца!

— Вось і добра. Тады і гэтая павязка не спатрэбіцца.

Чэся бачыла, што ў Шлыка будзе нямала клопату з параненай рукою — не адразу загояцца гэткія дзве шырокія раны ад касцякоў пальцаў да запясця,— але нічога яму не сказала. Шлыкавы пальцы трымцелі, ён цёпкаў губамі, глытаючы сліну, і яна намагалася як мага асцярожней нагматваць бінт. Баліць, ведама ж, чалавеку. Але трывае, не скардзіцца!..

Пачуўся глухі шоргат, які ўсё набліжаўся, і, урэшце, у ім акрэслілася прыглушанае снегам тупаценне мноства ног — у прагалы паміж купкамі маладых ялін выцягвалася калона, падобная ў цемры па тоўстую марудную яшчарку.

Чэся вобмацкам, спяшаючыся, завязала канцы бінта, і Шлык адразу ж пайшоў да калоны, нават не сказаўшы і слова падзякі.

— У сярэдзіне калоны ідзіце,— параіў ён і нечакана закрэсліў гэтую сваю параду: — Не, не! Мяне трымайцеся. І не адставайце...

Шлык праставаў шырокім размашыстым крокам, і Чэся ледзьве паспявала за ім. Потым ён нечакана спыніўся, і яна, за нешта зачапіўшыся правай нагою, навалілася яму на плячо. Шлык падтрымаў яе забінтаванай рукою — рука ў яго была ўчэпістая, моцная, і пальцы не дрыжалі,— сказаў шэптам, як праспяваў:

— Асцяро-о-ожненька...

Ад усёй Шлыкавай постаці бруілася ўпэўненасць, і Чэся зусім заспакоілася, толькі па-ранейшаму перасыхала ў роце.

Нізкі насып Чэся ўбачыла нечакана. Мякка пасунуўся снег пад ботамі, яна зрабіла шырокі крок наперад, і нага ступіла на цвёрдае. Шпалы! І нейкія чорныя, як цьмянае халоднае лязо, палосы... Гэта ж рэйкі. І як блізенька ляжаць, быццам адна ў адну збягаюцца непадалёк у цемры.

I снег ля іх чорны, як спрасаваны, крышыцца, трашчыць пад нагамі...

Асцярожна, як бы апасаючыся нарэзаць падэшву, Чэся пераступіла адну рэйку, потым другую, і пераступіла яшчэ двойчы, штораз трапляючы нагамі на шпалы. Потым зноў мякка шухнуў снег пад нагамі, і яна пасунулася, як сплыла па сыпкім снезе, уніз з насыпу, які па гэты бок быў ужо вышэйшы. Злева і справа ад яе мільгацелі ў цемры чалавечыя постаці, маўклівыя, расплывістыя, як прывіды; здавалася, што людзі бягуць навыперадкі. Чэся прымусіла сябе не бегчы, ісці размераным крокам, але жаданне паскорыць хаду, кінуцца наперад, каб адразу апынуцца далей ад небяспечнага месца, увесь час не знікала. Ёй здавалася, што небяспека яшчэ недзе блізка, наперадзе, і яна рыхтавала сябе да сустрэчы з ёю, каб не разгубіцца, не спалохацца, а ногі наўпярок волі неслі яе ўсё хутчэй і хутчэй.

Злева і справа купкамі пачалі пракідацца маладыя бярозкі, наперадзе пагрозліва зачарнеў лес, і абрысы яго з кожным крокам усё выразней акрэсліваліся. Побач раптоўна загусцела шухценне паспешлівых крокаў, і яно цяпер гучала не гэтак мякка, як па той бок насыпу, а суха, адрывіста, і шухценне гэтае ўвесь час паскаралася, набіраючы хуткасць і разгон, і Чэся як бы сунулася пасярод гэтага прыглушанага тупацення.

— Чэся! Пачакай! Спыніся, кажу ж табе!..— Багданаў голас прагучаў нечакана, трывожна, як паспешлівае і адчайнае маленне.— Чуеш ты ці не?

Яна спынілася, уражаная. Багдан жа там павінен заставацца, па той бок насыпу. А што яму тут спатрэбілася? І далёка ж ужо чыгунка!

— Ты чаго тут?

— У-уф, ледзьве дагнаў,— ён шумна і ўзрадавана выдыхнуў, як бы і не пачуўшы яе запытання.

— Ты ж там павінен заставацца.

— Вярнуся. Паспею.

— А чыгунка?

— А што чыгунка? Мне яна — сцежка знаёмая. Не бядуй... Ведаеш, што я хачу табе сказаць?

— Зноў мудрошчы?

— Ды не, не,— таропкім пошапкам перапыніў ён яе.— Я што табе хацеў сказаць? Каб ты спакойна ішла... Хлопца, Толічка, калі небяспека, крый неба, на хутар націс-

не — я ў атрад забяру. Жыццё аддам, а яго — уратую. Абяцаю табе. Дзеля гэтага і прыбег...

— Не магу сцяміць... Ты гаворыш неяк... Дзіўна неяк гэта ўсё...

— А што тут дзіўнага? Багдан які быў, гэткі і ёсць. І не зусім благі ён — гэта праўда, каб ведала...

Багданаў голас цяпер гучаў неяк дзіўна, па-новаму, і яна аніяк не магла сцяміць, што новага ў ім, гэтым таропкім і паспешлівым шэпту. Багдан як бы не ёй, Чэсі, казаў усё гэта, а некаму яшчэ, чалавеку, які стаяў недзе побач, і гэта менавіта яму, гэтаму чалавеку, Багдан і сіліўся нешта даводзіць, пераканаць, і пераканаць адразу ж, не чакаючы нейкіх пярэчанняў і сумненняў.

Яна бегла хутка, і цяпер гэтая хвіліна перадыху была ёй дужа дарэчы, і можна было аддыхацца, і яна ўслухоўвалася ў грымлівы бой сэрца, не разважаючы над тым, што робіць памылку, спыніўшыся і размаўляючы з Багданам. Паміж купкамі маладых дрэўцаў мільгалі хуткія і расплывістыя цені, і ўвесь час чулася ціхае, але паспешлівае тупаценне ног. Калона цяпер не была суцэльнай шэрай яшчаркай, яна распалася на кароткія кавалкі, і кожны з іх рухаўся самастойна, нібы парваны ланцужок спаваў цяпер паміж бярозкамі.

Адчуванне таго, што небяспека недзе тоіцца паблізу і трэба быць гатовай да яе ўвесь час, трымала Чэсю ў напружанасці і трывозе. Багданавы словы, нейкія вясёлыя, без аніякай трывогі, выплывалі быццам з нейкага іншага свету і дзівілі сваёй недарэчнасцю. Няўжо ён бег следам за ёю сюды, на гэты бок чыгункі, толькі на тое, каб пераканаць яе, Чэсю, у тым, што ён — чалавек не благі? Здурнеў? Не, не здурнеў Багдан. І тое, што ён гаворыць зараз, проста працяг ранейшай гаворкі пра тое, што ў будучым, пасля вайны, ён адмовіцца скасаваць іх шлюб! Што ён убіў сабе ў галаву? Яна ж яму сказала тады, сказала зусім зразумела, і ён, здавалася, усё спасціг належным чынам, нават сказаў ёй пра тое. А цяпер — зноў? Не, ён тады гэтак не казаў пра Толічка...

— Ты з глузду зусім з'ехаў,— прамовіла Чэся, здзіўленая не сваімі думкамі, а адчуваннем таго, што ў яе няма жадання лаяць Багдана. Яна была і расчуленая, і растрывожаная, і ўдзячная яму за тое, што ён гэтак шчыра і аддана паабяцаў клапаціцца пра малога. І паабяцаў — яна гэта добра заўважыла і зразумела! — не проста дзеля прыгожага слоўца: ён і сапраўды зробіць тое, што паабяцаў.

— Розуму я не страціў. І ведаеш, дзеля чаго я гэта ўсё кажу табе?

— Каб жа хоць на каліўца ведаць!

— Мне толькі ты патрэбна, адна ты. І ніхто больш. Ведай гэта.

— Што ты чаўпеш?.. Вар'ят нейкі.

— Я не вар'ят. І на Галяна ты не разлічвай. У яго — жонка і дзеці.

— Ты і сапраўды вар'ят!

— Я не вар'ят,— ціха, але зацята і ўпарта паўтарыў Багдан.— І тое, што я сказаў,— праўда. Жыццё аддам, а Толічка ўратую. У бядзе яго не кіну.

Падпарадкоўваючыся незразумеламу парыванню, яна памкнулася да яго, пацалавала ў шчаку, прамовіла таропка і шчыра, спалохана думаючы пра тое, што робіць глупства непапраўнае:

— Дзякую, Багдане... За Толічка табе дзякую. Мне ён даражэй за жыццё...

Ён паклаў ёй руку на плячо, бы нешта раздумваў нейкі час, потым клапатліва паправіў рэмень сумкі ў яе на плячы.

— Бяжы... І ў хвасце калоны не ідзі. У хвасце — на маршы калі — заўсёды бегчы даводзіцца. У першых ідзі, там — лягчэй заўсёды...

— Дзякую, Багдане...

— Ну, каб удача вам усім...

Багдан ціха падштурхнуў яе, і яна пабегла, потым азірнулася — Багданава постаць ужо растала ў цемры — і зноў заспяшалася. Ёй трэба адшукаць Галяна! Ля Галяна ёй трэба трымацца! Смешна, яна пачынае выконваць тое, што раіў ёй Багдан!

Галян сам шукаў яе і, убачыўшы, зарадаваўся:

— А я паўсюль урача нашага шукаю. Лётаю і шукаю. Думаў быў на пошукі людзей слаць...

— Здарылася што-небудзь?

— Не, усё ладам! Калі і далей гэтак — спяваць неўзабаве пачнем. Крыху яшчэ праідзем — прывал робім. Адпачнем, трэба будзе агледзецца, ці не пагубляліся.

— А тут цяпер спакойна можна ісці?

— Я ж кажу: неўзабаве з песнямі будзем тэпаць. І ўдзень адкрыта пойдзем. Наперадзе — цалкам наш край. Партызанскі...

Кусткі дрэў ззаду як бы сышліся і зліліся ў суцэльную сцяну. Гусцейшы зрабіўся хмыз наперадзе, і па глеістым

духмяным паху Чэся здагадалася, што ідуць яны цяпер праз малады альхоўнік. Яна дыхала гэтым водарам і ўвесь час намагалася не думаць пра гаворку з Багданам. Але ўсе яго словы ўпарта жылі ў памяці, і яна міжвольна паўтарала іх, дзівілася, знаходзячы іх непатрэбнымі, і лаяла сябе за тое, што адбылося там, непадалёк ад чыгункі, лаяла сябе за тое, што цяпер прыгадвае Багданавы словы. І міжвольна прыходзіла нянавісць. Каго яна цалавала? Багдана! Гэта ж як здрада Мсціславу! Не, дарэмна, зусім дарэмна яна вярэдзіць сабе сэрца думкамі пра нейкую здраду Мсціславу. Багдан?.. Ён проста расчуліў яе гэтым сваім абяцаннем, што бяда не зачэпіць Толічка. Якая маці не падзякуе за гэта! А ўсё іншае, усё астатняе, пра што казаў Багдан,— лухта, несусветчына, і яна хоць зараз гатовая прысягнуць, што яна, Чэся, абыякавая да Багдана, што не толькі няма і не будзе ў яе веры Багданавым словам, але і зусім няма патрэбы ёй слухаць іх!..

Чэся верыла ў гэта цвёрда. Верыла і чамусьці не заўважала, што не толькі ад слоў пра Толічка, але і ад усёй Багданавай гаворкі, ад слоў, якія яна палічыла лухтой і несусветчынай, робіцца святлей на душы, больш уважна тупаюць ногі. І як бы нанава прыходзіць вера — Багдан жа раўнуе яе да Галяна! — у тое, што ты жывеш, што некаму вельмі патрэбны і што цябе нехта вельмі чакае.

## 16

Захар на кароткі час зажмурыў вочы і тут жа адкрыў іх: як ні сіліўся заснуць, а сну няма, толькі быццам у вір праваліўся на нейкае імгненне і зноў ляжыць бадзёры, быццам добра наспаў. Нешта дзіўнае і незразумелае робіцца з ім у гэтай хаце. У лясным лагеры толькі варта было легчы на нары, засланыя саломаю, і адразу прыходзіў добры і глыбокі сон. А тут, у вёсцы, вось ужо на трэці тыдзень павярнула, як ляжа, бы на гарачым вуголлі круціцца. Можа, таму, што поўня — як сонца свеціць: на дварэ, бы ўдзень, светла. Вокны шырокія ў хаце, свету поўна, паветра шмат — таму, мабыць, і неспакойна, незвычайна ўсё, не можа апіяк вока абвыкнуць.

Ён прыўзняў галаву, агледзеў пакой. За вокнамі хаты быццам яшчэ паярчэла святло поўні.

Ціха зарыпелі намерзлыя дошкі ганка, потым глуха тукнуў слясак, дзверы адчыніліся, і ў пакой крадком

увайшоў Юрша. Ён рухаўся амаль нячутна, і Захар, лежачы нерухома на ложку, моўчкі сачыў, як той асцярожна, на дыбачках — быццам ляціць у паветры! — ідзе ў кут, дзе стаіць ложак, як пачынае здымаць кароткае паліто, як кладзе шапку на падаконнік. Шапка звалілася на падлогу, ён нагнуўся, узняў яе, павесіў на кутасік спінкі ложка, і яна зноў нячутна звалілася.

— Што ты сваю кубаначку мучыш,— пажартаваў Захар.— Ёй на падлозе хочацца паляжаць...

— А-а, не спіш!

— Ложак гэты, хай яму добра будзе. Рыпіць, як рэзаны — не павярнуцца.

— Заўтра скажу Пазняку, каб саломкі прыцёг і падсушыў,— паабяцаў Юрша.— Будзем на падлозе спаць.

— Прызвычаіліся мы да сваіх нараў у зямлянцы — на саломцы, дык і спалася. А вайна скончыцца, то і спаць у людской хаце не змажам — у зямлянку пацягне.

Юрша, сагнуўшыся, пачаў здымаць боты, сказаў, натужна дыхаючы:

— На-ажывемся шчэ і ў зямлянках. Не бядуй, чагочаго, а гэткай жыткі — будзе,— прашлёпаў па падлозе да печы, што выходзіла ў пакой вузкай бакавінаю, ускінуў анучы на высокі чэрап.— Трэба паспаць. Шчэ гадзіны са тры ў нас.

— А я марозцу дыхну. І на пасты прайдуся.

— Я толькі што быў на пастах — з Яштокіным да Пятроўцаў праехаў. Адтуль — пешкі. Нейкае дзіўнае адчуванне, калі ішоў па лесе,— Юрша сеў на ложак, які звягліва зарыпеў, звесіў босыя ногі, пацірау адна аб адну.— Няма вайны — і ўсё. Цішыня наўкола. Спіць усё... А на душы неспакой. І адкуль, не магу даўмецца... Як перабраліся ў вёску — гэтак вось на сэрцы ўвесь час. Як нешта важнае чакаеш. А яно, тое важнае, недзе затрымалася...

Яны не згаворваліся, думалі пра адно і тое ж, гаманілі пра тое ўпершыню, і Захар прызнаўся, хоць раней і не рабіў гэтага, баючыся, каб яго трывогу Юрша не зразумеў, як слабасць і баязлівасць:

— І ў мяне гэткае ж адчуванне. Як бы ўвесь час чакаеш нападу з усіх бакоў. У лясным лагеры гэткага адчування не было.

— Пройдзе,— аптымістычна паабяцаў Юрша.— Усё ў свеце праходзіць, гаварылі ў старажытнасці. О-ох-хо-хо-о...— Юрша расцягнуўся на ложку, глыбока ўздыхнуў, за-

соп носам, потым прамовіў працягла, як бы раздумваючы над сваімі словамі:— Но-овы го-од... Чуеш, Захар? — і спытаў весела, узнёсла: — Што ён нам прынясе?

— Калі ўсё будзе добра — па эшалончыку ўдарым!

— Я не пра гэта. Сваю справу мы зробім. Я ўвогуле кажу. Добра было б, каб у гэтым годзе ў Берлін нам уваліцца.

— Праз год, магчыма, дабяромся да іх логава. Але не раней. Гэта — мае ўласныя падлікі!

— Небачка! Яшчэ два гады! Навошта ты мне пра гэта перад сном гаворыш! Лепей пра што-небудзь весялейшае. Перадваенны год ты як стрэў?

— Дзеці застудзіліся і хварэлі. Настаўнікі ўсе ў школе сабраліся. А мы не пайшлі. Пасядзелі крышку каля ёлкі. Маленечкую ёлку я паставіў...

— А я новы Дом культуры адкрываў. Ёлка — пад самую столь. Аркестр, буфет, віно шыкоўнае — у Ялце спецыяльна гандлярам заказваў. Да самага світання — баль... Зараз сасню гэты баль, вось пабачыш...

Юрша ціха засоп і, крыху пагадзя, заснуў. Захару ж не спалася па-ранейшаму, муляла патыліцу, чамусьці дужа горача было ў плечы, быццам сяннік грэлі знізу, і непрыемна пачала свярбець шыя. Мімаволі лезлі ў галаву думкі пра той Новы год, аб якім толькі што гаварыў Юршу, і ад гэтых думак пачынала балець сэрца. «Трэба, мабыць, узняцца і пайсці. Сапраўды, прайсціся па марозу, дыхнуць свежага паветра, супакоіцца, тады, можа, і сон будзе».

— Не спіш? Ці ўжо свой баль глядзіш? — спытаў ціха Захар, спытаў, яшчэ не ведаючы, пра што будзе гаварыць з Юршам.

У адказ пачулася спакойнае пахропванне — Юрша моцна спаў. Захар пазайздросціў яму, паляжаў крыху, асцярожна пачаў узнімацца. Ложак аніводнага разу не зарыпеў, як на дзіва. Не зарыпела і аніводная масніцына, дзверы таксама адчыніліся бязгучна.

На двары ветру вялікага няма, і мароз слабенькі, і нейкая імгла наплывае ад лесу, што за белым узгоркам. Відаць, зноў пачнецца адліга. Гэта, ведама, добра, бо ў адлігу не гэтак гучна рыпяць палазы саней, на якіх стаіць гармата. Звычайныя розвальні дык ледзь улоўна парыпваюць палазамі, а гэтая гармата — быццам добры дзесятак саней коціць.

Захар спыніўся пад сасной, аглядаў неба, пазіраў наў-

кола. Усю другую палову снежня — больш як два тыдні атрад ужо размешчаны ў вёсках — надвор'е было кепскае: то снег круціў, то нейкая густая пагапая золь стаяла, то дуйка залізвала спрасаваны зледзянелы наст. А сёння — першая ноч у студзені — неба ачысцілася, выкацілася на небе поўня, і ўсё наўкола асветлена яе бляклым, як водсвет далёкай ракеты, святлом. І пейкім дзіўным і ўпушальным здаецца Падрэзаў надворак, як бы ўпершыню яго бачыш. Хата — высокая — Захар размясціў у ёй штаб атрада,— з шырокімі вокнамі, хлеў шырокі, пад добрым дахам, дровы пад паветкаю складзены роўна і дбала. Надзейна і трывала будаваў і рабіў усё тут гаспадар, нават жардзянік, якім абнесены агародчык і сад, пастаўлены на моцныя і добрыя слупы. І ў вёсцы жыве, і быццам наводшыбе — сад адным краем упіраецца ў сярэдняга веку сосннік, што вузкай палосаю адгараджвае вёску ад Дзвіны. І назва ў вёсцы дзіўная — Завалыпка: сапраўды, як заваліліся хаты за лес і аселі роўным шнурам толькі па адзін бок вуліцы. З другога боку — узгоркавае поле, і зноў лес па далягляду — цёмная чорная сцяна. Ціхі і добры закутак. І для абароны, на выпадак чаго, таксама зручны: з трох бакоў заставы, а з чацвёртага — Венцавое і Пятроўцы, дзе размясціла два свае ўзводы другая рота. Лепшая, непараўнальна лепшая дыслакацыя, чымся ў лесе, у тым новым і старым лясных лагерах. А вось жа няма спакою Захару і ў гэтым зацішным кутку.

Захар пагладзіў рукою шурпатую кару сасны — мароз, а кара цёплая! — і зноў падумаў пра тое, аб чым думаў ужо сёння ў хаце: не куток, зусім не куток тут прычынаю. Перш за ўсё, бадай, аперацыя, якую яны з Юршам і Яштокіным вырашылі правесці ў гэтую першую ноч новага года. Дакладней, штаб толькі ўхваліў ідэю Жвірблі — абстраляць з гарматы варожы эшалон. Уночы падцягнуць да чыгункі гармату, замаскіраваць яе, паставіць заслоны і дачакацца дня. Рызыкоўна, ведама ж, бо падыходы да чыгункі скрозь прыстраляны з бункераў. Але ж і зманлівая задума, якую гэтак горача прапаноўваў Жвірбля яшчэ ў лістападзе: пры святле дня, ва ўпор, на прамую наводку ўдарыць па вайсковаму эшалону. Пакуль у гарнізонах ачомаюцца, што да чаго, пакуль расшалопаюць, адкуль лупіць гармата, яны паспеюць зрабіць сем стрэлаў. Чаму іменна сем? Жвірбля стаяў на гэтым цвёрда: адзін снарад — у галаву, другі — у хвост, пяток снарадаў, маўляў, усярэдзінку. Захар прыгадаў, як усхадзіўся Жвірбля, калі

Гнацюк пажартаваў, што, маўляў, трэба браць з сабою абавязкова і восьмы, з разлікам на сасну ці якое іншае дрэва, і ўсміхнуўся: не церпіць Жвірбля, калі над ім кепікі ладзяць. А сам, між іншым, і жыць не можа, каб не падкалупнуць каго-небудзь.

Захар перайшоў падворак і памалу падыбаў вясковай вуліцаю. Якімі маленькімі і нізкімі выдаюць усе хаты, засыпаныя снегам, залітыя бляклым святлом поўні, якім закінутым і быццам нежывым выдае ўвогуле ўвесь гэты кут! Нейкі палахлівы, спуджаны, быццам ад страху зарыўся ў снег і чакае бяды. І, між іншым, бяда можа лёгка наваліцца сюды. Вартавыя стаяць у лесе, на дарозе, што вядзе на Пятроўцы і Венцавое. А калі раптам карнікі пойдуць не дарогаю, а нацянькі? Праз гэтыя, скажам, пагоркі. Ці зойдуць ад рукі? Лес жа рэдзенькі, на паўкіламетра, не больш...

«Ноччу ўвойдуць у вёску. І нас, сонных, як курапят тых, перадушаць...»

Зусім нядаўна ён верыў у тое, што гэты кут вельмі зручны на выпадак бою, верыў у свае заставы, верыў у вартавых, якія размешчаны ў лесе ля дарог. Цяпер гэтая вера пабурылася, і Захар адразу і моцна ўпрэў. Ён рыўком расшпіліў кажух, знерухомеў, прыгнуўшыся, узіраючыся ў дужа блізкія, бліскучастыя пад снегам пагоркі. Нешта гулка трэснула справа, з боку штабной хаты, і ён імкліва павярнуўся. Не, нічога наўкола.

Ён зноў павольна пацёгся па вуліцы, занепакоена азірнуўся па баках, па-ранейшаму ўстрывожаны думкаю, што нядаўна прымусіла яго спыніцца. Нейкае дзіўнае адчуванне ўсё не праходзіць штоночы, калі ён вось гэтак ідзе па вуліцы — нібыта сапраўды з усіх бакоў ты адкрыты ворагу.

«Сілы ў яго, праклятага, не хапае. Атрады скрозь цяпер. Дзе ўсе вёскі зацісцеш...»

Думка гэтая дзівосна ўзбадзёрыла Захара, і ён зусім іншымі вачыма зірнуў на заснежаныя пагоркі, дзе цьмяна зіхацеў падмерзлы пасля адлігі снег. Як з лёду пагоркі, асабліва гэты, што звернуты схілам у бок аселіцы. Быццам промні ад яго адскокваюць. І вось яшчэ нешта бліснула. Але гэта ўжо ў другой ад краю хаце. Як агеньчык там запаліўся і згас. Каравулка ж там — курацць, мабыць. Не, каравулка — чацвёртая хата. У гэтай хаце — Гайдаш, шпітальная хата.

Ён стаяў і глядзеў на цёмныя вокны, крыху зацененыя

густым голлем бэзу з макаўкамі пасохлага насення, вельмі падобнага на тоўстыя чорныя свечкі. Бэз рос у палісадніку, ля самага акна, і варта было толькі Захару змяніць паставу, як зноў за густой сеткай голля бліснула шыба. Падалося і першы раз — ніякага агеньчыка ў хаце няма, шкло ад святла поўні бліснула. І Гайдаш, вядома ж, спіць. А калі нават і не спіць? Што табе з гэтага? Прыдумаў сабе клопат! Зрабіў адно глупства — паддаўся настырнасці, з якой насела Часлава,— не адправіў Гайдаш з калонаю мабілізаваных, дык цяпер новае глупства робіш: стаіш ля хаты і сэрца сабе дурнымі думкамі вярэдзіш.

«З новай калонаю адпраўлю Гайдаш. Як ранеи збіраўся».

Думка гэтая была не новая, яна жыла ў яго сэрцы даўно. Але цяпер, уночы, на адзіноце сярод замеценай снегам вясковай вуліцы, Захар зразумеў, што менавіта гэта — роздум пра Гайдаш — не дае яму спакою па начах. Тое, што аднойчы саспілася яму на ўзлеску ля жытняга поля, не знікала з памяці, набывала абрысы рэальнага, сапраўды неражытага.

Ён бязлітасна абсякаў усялякія праявы сямейнасці ў ротах, забараніў адпускаць мясцовых партызан на сустрэчы з сем'ямі, якія жылі ў вёсках непадалёк, і ганарыўся дысцыплінаю ва ўзводах, як бы падкрэсліваючы гэтым, што кожны павінен быць у сваім асабістым жыцці гэткім жа строгім і патрабавальным, як і ён сам, іхні камандзір. Ён заўважаў прытоеную незадаволенасць, з якою ставіліся да гэтай патрабавальнасці і камандзіры рот, і камандзіры ўзводаў, і рабіўся яшчэ больш зацяты і ўпарты ў гэтым сваім камандзірскім рашэнні.

Сваёй зацятасцю ён як бы сіліўся пераканаць сябе, што яго сумленне чыстае перад кожным, хто быў пад яго камандаваннем, як бы імкнуўся закрэсліць думку пра тое, што ў дачыненні да Гайдаш ён сказаць гэта не мае права. Але пра гэта ведаў толькі ён адзін. І цяпер, на адзіноце, канчаткова зацвердзіўшыся ў думцы, што ў бліжэйшы час Гайдаш у атрадзе не будзе, ён нават павесялеў.

Захар паскорыў хаду, увайшоў у лес. Вартавы, схаваны ў заснежаным акопчыку ля соснаў і зусім не бачны ў цемры, спытаў пароль. Пачуўшы адказ, далей гаманіць з Захарам адмовіўся, спаслаўшыся на тое, што, у адпаведнасці з загадам, ён не мае права размаўляць ні з кім. Такое ж паўтарылася і ля Пятроўцаў, дзе стаяў другі сакрэт, і настрой у Захара яшчэ больш палепшыўся. Недарэмна,

значыцца, патраціў ён шмат часу, патрабуючы вайсковай дысцыпліны ва ўзводах. А Файзуло дык болей ад усіх малайчына! Вось як сваіх людзей вымуштраваў! Вартавы ёсць вартавы. Толькі каравульны начальнік яму, вартавому, галава.

Ад узлеску Захар павярнуў у бок Дзвіны, дайшоў да лазнякоў і спыніўся. Тут, на ўзвале, вецер быў моцны, якога там, у вёсцы, зусім не адчувалася, і лазнякі памалу гайдаліся, журботны спеў ветру ўвесь час гучаў у адным месцы, ля долу, быццам ублытаўся ў тонкім хісткім голлі. Неспакой зноў вярнуўся да яго, і ён нечакана вырашыў прапаставіць сябе асабіста на ролю чалавека, які хоча прабрацца ў вёску, дзе стаіць штаб партызанскага атрада, апікім не заўважаны,— ён вернецца ў вёску не дарогаю, а нацянькі, праз лес. Адолее зараз гэтую роўнядзь і выскачыць проста на штабную хату!

Ён збочыў з вузкай сцежкі, па якой з Пятроўцаў хадзілі ў крыніцу за вадой, і пашнураваў уцалік, вызначыўшы ў цёмным лесе наперадзе самае высокае дрэва. Роўнядзь, што аддзяляла ўзвал ад узлеску, як выявілася, была дужа няроўная і падманная: на кожным кроку калдобіны, хмыз, нейкае каменне, куды часта трапляе нага, і ён увесь час бухаўся ў снег, балюча тыцкаючыся то каленкам, то локцем аб вострыя граніты, засыпаныя снегам. А снегу — дык як адусюль яго сюды пазносіла — ледзьве не ў пояс! Не прайшоў і палову адлегласці да лесу — паўкіламетра якія! — і павярнуў назад, на сцежку. Выбраўся распараны, узмакрэлы, з набітымі нагамі і, стоячы на цвёрдым насце і аціраючы з ілба пот, нечакана пасмяяўся з свае пядаўняе трывогі. Ты нейкія чатыры сотні крокаў з цяжкасцю адолеў, узмакрэў, хоць выкручвай! А паспрабуй дваццаць кіламетраў ці ўсе трыццаць прайсці гэтак! Ды шчэ боезапас, кулямёты, мінамёты пагрузі людзям на плечы!.. Так што можаш спаць спакойна ў вёсцы за лесам — зняпацку не наскочаць фашысты. Калі і будзе ў іх гэткі намер, дык па дарозе ім давядзецца рухацца. А па дарогах — партызанскія заставы!..

Захар павярнуў да штабной хаты, ішоў хутка, у добрым настроі, нават пачаў ціха насвістваць песню, якую нядаўна пачуў ад падрыўнікоў.

Гэтак, з ціхай песняю на вуснах, ён увайшоў на падворак, зноў спыніўся пад сасной і паспешліва выхапіў з кішэні гадзіннік, разглядаў стрэлкі, як бы не верачы ім, з дакорам хітаў галавою. Вось і маеш! Упусціў Новы год!

Нават не заўважыў, калі ён прыйшоў! Палова першай зараз, крыху больш. Хвілін дваццаць ён ішоў паміж узлескам і ўзвалам, коўзаючыся ў глыбокім снезе. Гэтак вось і будзе табе цяпер увесь год — па цаліку ды па бездарожжы! А Юрша дык і ўвогуле праспаў! Спіць жа, напэўна, спіць і сны добрыя бачыць!

Захар ціха ўвайшоў у хату, паслухаў сонпае дыханне Юршы і, скінуўшы кажух і боты і далей не распранаючыся, асцярожна апусціўся на ложак. Стаміўся ён, аднак. Гэтак, мабыць, і трэба рабіць, калі бессапь паваліцца: пайсці дарогаю, пайсці па снезе, пайсці, каб зматаць сілы, стаміцца, а потым бухнуцца вось гэтак на ложак... А падрыўнікі, між іншым, штоночы ходзяць па гэткім бездарожжы, ходзяць, і ніхто не скардзіцца.

«Яны маладзейшыя. Там, у падрыўной групе, хлопцы ўсе, як спецыяльна падабраны... А ты — не малады...»

Ён упершыню за апошні час падумаў пра свой узрост, параўнаўшы яго з узростам другіх людзей, і гэтае параўнанне чамусьці вельмі яго заспакоіла, не засмуціла, прымусіла падумаць аб сабе са спачуваннем, і ён незаўважна, але хутка і моцна заснуў.

Абудзіўся Захар ад таго, што Юрша тузаў падушку, уголас і шчыра бедаваў:

— Праспалі, камандзір, мы з табою Новы год. Тры гадзіны ўжо! На чацвёртую верне!

Захар ускочыў.

— Ну, хоць сасніў свой баль? — спытаў ён, апранаючыся.

— А, ведаеш, сасніў-ткі. Усё гэтак, як і было. Нават віно саснілася. Пенілася ў залачоных кілішках.

— Залаты год, значыцца, будзе ў цябе. А мне — снег. Гэта ж я, ведаеш, у снезе Новы год стрэў.

— Гэта і саснілася?

— Каб жа саснілася. Ты сон глядзеў, віно ў залачоных кілішках перад табою пенілася, а я — носам снег рыў ля Пятроўцаў. Напрамкі, ведаеш, удумаў да штабной хаты ад Дзвіны выбіцца. А — скулле. Сне-ег. Не прабіцца.

— Я вось думаю, як мы са сваёй гарматаю па гэткім снезе павернемся.

— Калечыц жа казаў, што па тым пагорку снегу мала. У нізіне кепска, а на пагорку — добра. І Жвірбля спецыяльна ж учора там усё агледзеў. Я тыя мясціны ведаю.

— Ну, гэтага рызыканта слухаць! Шкадую, што сам

учора туды не падскочыў. Гэта ж не так проста з таго пагорка агонь весці — могуць накрыць з мінамётаў.

Нацягваючы правы бот, Захар быў незадаволены, што не наставіў боты да печы, калі клаўся спаць.

— Нешта пасля сну нярадасныя думкі ў тваёй галаве, камісар. Можа, гэта ад таго віна, што ў залачоных кубках пепілася?

— А праўда. Усё яшчэ мяне той баль круціць.

— А я, ведаеш, разаспаў-аў-аўся,— і Захар працягла, на ўвесь рот, пазяхнуў.— Даўно гэтага са мною не было. Сяджу вось, і спаць хочацца. Хоць ты кладзіся і вочы закрывай. У розвалках паспрабую, на марозцы, на вуха прыцісnуць.

Яны выйшлі з хаты і селі ў розвалкі, на якіх чакаў іх Падрэз. Ён выехаў з падворка на вуліцу і сядзеў у перадку, падгробшы пад сябе сена.

— Добра,— ухваліў Юрша.— Сёння хоць сена не пашкадаваў. Вось, камандзір спаць будзе.

— А гэта можна, можна,— Падрэз пачаў завіхацца, саскочыўшы з розвалак, патрос сена, зноў сеў.— Тут будзе мякка... Кладзіцеся...

Захар зарыўся ў сена, наставіў каўнер кажуха, папрасіў з усмішкам:

— Калі звалюся, заснуўшы, на снезе не кідайце.

— Як будзеш спаць моцна дужа, дык пакінем,— паабяцаў Юрша.— А назад едучы, прыхопім...

— Паспрабую не заспаць.

Ехалі хутка. Але розвалкі гайдала плаўна, быццам плылі на вадзе; час ад часу на паваротах розвалкі нарыпвалі. Захар і сапраўды пачаў драмаць, услухоўваўся ў неторопкую размову Падрэза з Юршам, якую зрэдку перапыняла шлёганне лейцаў і мяккае цмоканне — Падрэз падварушваў каня.

— Вось вы кажаце, яны там, у Берліне, разумеюць, што прайгралі,— сказаў Падрэз.— Тады чаму не загадаюць спыніць вайну, якая сэнсу ўжо не мае? Хай бы фюрэр і сказаў, што, маўляў, памыліліся.

— Лёгка гэта казаць, на мяккім сене седзячы. А як там сказаць? Гэта тут, з розвалак, чык — саскочыў —пайшоў. А адтуль, з вышыні, ляснешся. Вось і мапяць сабе. І народу сваіму галаву дураць.

— А я ўсё роўна не магу зразумець. Як жа гэта ўдаецца народу галаву гэтак доўга дурыць? У імя чаго?

— Ха, у імя чаго? За сёдлы свае ўчапіліся, парабава-

нас багацце страціць баяцца. І каму наміраць хочацца? У зямлю па сваёй ахвоце класціся?

— Гэта і я магу растлумачыць. Тут усё ясна. Але ж на што спадзяюцца чужынцы тут? Тыя, што са зброяю ў руках? Чаго не ўцякаюць адсюль, з чужой зямлі? Гэта ж кожнаму з іх відаць, што скрозь — толькі нянавісць да іх, што гэтая зямля ім толькі магілаю будзе... І вось учапіліся, смерці чакаюць...

Розвалкі гайданула, і Захар прыўзняў галаву — ехалі адкрытай нізінаю. Справа ў белаватым, як змарожаная лебяда, небе вісела дзіўна жоўтая поўня, на якой выразна акрэсліваліся загадкавыя цёмныя плямы. Калі розвалкі дугаліся — цяпер, у нізіне, гэта паўтаралася ўсё часцей,— поўня таксама дугалася, і ўсе цёмныя плямы на ёй як бы сціскаліся, меншалі, рабіліся цямнейшыя. І гэтае дуганне закалыхвала — галасы Юршы і Падрэза цішэлі, быццам праваліваліся некуды. Захара пацягнула на сон, ён не супраціўляўся, ахвотна аддаваўся плыні, якая пачынала ўжо гушкаць яго.

Прачнуўся ён раптоўна, прачнуўся ад цішыні. Розвалкі не рухаюцца. Ніякай гаворкі не чутно. Навокал дужа цёмна, і цемра дужа блізкая нейкая. Дрэвы гэта! У лесе, значыцца, спыніліся. Марознае паветра не колкае, а мяккае, прапахлае хвояй. Нехта таропка крочыць, і чотка, падвойна, рыпіць снег пад ботамі: р-ры-рып, р-ры-рып... І нешта гучна і адрывіста дугае: дум-дуг, дум-дуг... Юрша сядзіць нерухома, толькі нахіліўся ў той бок, адкуль чуваць крокі. Падрэз, мабыць, ідзе. Так, гэта ён. Ідзе і цугаўём па ботах пастуквае.

— Што там? — спытаў Юрша.

— Калечыц кажа, што Яшток[і]н згубіўся.

— Дзе гэта ён згубіўся?

— Заслоны павёў. І не вяртаецца. Далей рухацца будзем пешкі. Коні тут застаюцца...

Захар злез з розвалак, страсянуў кажух, адкінуў каўнер. Зусім непадалёк узляцела ракета, высветліла ўсё навокола дрогкім, вельмі бляклым пры поўні святлом, і Захар адразу пазнаў мясціну: тут, на гэтай лясной пуцявіне, сціснутай крутымі пагарбамі, на грабяні якіх тырчыць не зацярушанае снегам карэнне соснаў, яны з Калечыцам падводзілі Ціхана летась да чыгункі, пасля актыву на млыне, і сёлета — тут заўсёды пераходзілі чыгунку без стрэлаў. Нейкая як бы дамоўленасць была з аховай: на гэтым участку аніводнага эшалона не кінулі пад адхон.

Цяпер нечага ўзляцела ракета. І вось яшчэ адна. Гэтак густа аніколі тут не свяцілі ракеты.

— А ты гадзіны са дзве на вуха ціспуў,— сказаў Юрша.— Што сасніў?

— Проста дзіўпа — нічога.

— А дзе гармата? Бачыў? — гэта Юрша спытаў ужо у Падрэза.

— На ўзлеску. Чакаюць.

— Распрэглі?

— Не, Жвірбля думае яшчэ бліжэй падацца. Распрагаць, кажа, не будзем.

Юрша чмыхнуў, але голас яго прагучаў задаволена:

— Чуеш, камандзір,— і Юрша стаў побач з Захарам.— Ён, гэты Жвірбля наш, чаго добрага, шчэ і па чыгунку сядзе. Трэба туды ісці.

— Мне што цяпер рабіць? — спытаў Падрэз, і гэта адрасавалася Юршу, быццам Захара ўвогуле тут не было.

— Спявай,— пажартаваў Юрша.— Але спачатку коней павярні. Каб адразу рвануць, калі нявыкрутка.

Захар, правальваючыся ў глыбокі і сыпкі снег, ішоў каля саней, звернутых з дарогі да старых соснаў, дзе купкамі рос ядловец. Сані стаялі, як звязаныя ў адзін ланцуг, коні былі раскілзаны і хрумсталі; пах сухой канюшыны, конскага поту біў у нос і быў на марозе незвычайна вострым; ездавых нідзе не было відаць, і коні з саньмі былі падобны на чорныя нерухомыя кусты ядлоўцу.

Зачарнела наперадзе, невядома, з якога боку з'явіўшыся, постаць Яштокіна, і Юрша ўзрадаваўся:

— Знайшоўся-ткі, дзякуй богу.

— А я не губляўся. Паставіў заслоны, цяпер да вас іду,— Яштокін узняў галаву, паўзіраўся ў сцямнелы дыск поўні.— Урэшце, гадаўка, пачынае хавацца. Ля чыгункі дык добра — туман над снегам, імгла такая марозная вісіць.

— А Жвірбля маліў бога, каб туману не было. Хоча, каб чысты дзень быў. У тумане, кажа, блага страляць.

— А мяне ад гэтай золі ажно трасе,— Захар пазяхнуў шырока, да болю ў сківіцах, і дадаў, апраўдваючыся: — Нейкі дурны сон на мяне сёння наваліўся.

— Нервы,— сказаў Яштокін.— Гэткае ў мяне летась было ў навагоднюю ноч. Памятаеш, Елісеевіч? Як слова скажаш — рот дзярэш, пазяхаючы.

— А мне нешта не помніцца. Як дарогаю закон Архімедаў выводзіў — гэта ў памяці. І як эшалон ляцеў над

адхоп, помніцца добра. Нават як паравоз у полымі падскочыў. І шмат жа іншых разоў на чыгунцы быў, а вось гэта болей за ўсё помніцца.

— Наша памяць мудра пабудавана,— сказаў Яштокін.— Каб яна, памяць, нічога ад сябе не адкідала, дык даўно б галава трэснула. Чуеш? Жвірбля зноў нечага кіпяціцца...

— З Калечыцам зноў чубяцца. От жа натура! Што адзін, што другі!..

Ля гарматы, што стаяла амаль пры самым ускрайку лесу — цяпер яе было добра відаць,— чулася прыглушаная гамана, з якої вылучаўся пакрыўджаны голас Жвірблі:

— Каго чакаць трэба, таго і чакаем. Што ты ў туман нас піхнуць хочаш? Стаць на пазіцыю — разочак плюнуць.

Калечыц сказаў з развагаю, як бы адразу згадзіўшыся з тым, што меў на ўвазе Жвірбля:

— Тады туман трэба выкарыстаць на больш важнецкую рабацёнку. А ты яе з балансу скідаеш.

— Якая шчэ табе рабацёнка?

— Галіны па ўсяму ўзлеску пассякаць. Бо ты ж зноў можаш смальнуць у сучча. А цягнічок тым часам — ту-ту-у-у...

Калечыц ціха прадудзеў, і гэта развесяліла Гнацюка і Сачыўку, і яны, давячыся рогатам, ажно селі ў снег. Жвірбля ж зноў узгарэўся, цяпер пакрыўджаны па-сапраўднаму.

— Я шчэ пагляджу, якое ты мне «ту-ту-у-у-у» падгоніш. На паражняк я аніводнага снарадзіка не аджалкую. От я тады скажу, чаго варта тваё «ту-ту-у-у».

— Канчайце базарыць,— строга загадаў Яштокін.— Што не падзялілі?

— Нічога не дзелім, таварыш начштаба. Абгаворваем баявы манеўр.

— А што яго абгаворваць? Яго выканаць трэба. І выканаць дакладна, каб камар носа не падтачыў,— і спытаў ужо ў Калечыца: — Схіл вы агледзелі добра? Калі гармата кульнецца — часу ў вас узнімаць яе ўжо не будзе,— і павярнуўся цяпер да Жвірблі.— А можа, зробіце адзін заезд? Каб на прыкідачку?

— Баюся, каб грукату залішне не парабіць. Лепей адразу, як цягнік пойдзе. Мы на пагорак выскачым, ударым, а тады — нізам ужо,— і дадаў, як бы спецыяльна для За-

хара: — Цягло баявое ў мяне — на вышыні. Мапеўр зробім. Я там зараз на каленках усё апоўзаў. Там дарога над снегам ёсць, ро-оўненькая.

— Ну, глядзі,— сказаў Яштокін.— Багдана сёння няма тут паблізу. Не будзе каму выручаць...

Захар ішоў па глыбокім снезе, раптоўна паглыбіўшыся ў свае думкі, якія выклікалі ўспамін Яштокіна і заўвага Жвірблі пра тое, што ў яго, маўляў, баявое цягло на вышыні. І дагэтуль жа той выпадак памятае. Пры любой нагодзе — шпільку падпусціць. Але ж і яму, Жвірблю, шпілек адпускаюць па самай высокай норме. І ён нічога, трывае, адбіваецца ад усіх...

Захар пакаўзнуўся. Яштокін тут жа спыніўся, чакаў, пакуль Захар узнімецца з гурбы, потым сказаў:

— Зараз на дарогу выскачым, там будзе лягчэй ісці. Праўда, адна толькі назва, што дарога: хто і калі па ёй ездзіў — невядома,— і нечакана прамовіў зусім іншым тонам, як бы прыгадваючы тое, што было яго сэрцу блізка і хвалявала: — А летась снегу было меней. У лесе, помніцца, пад ялінамі, дык і зусім гола было. Памятаеш, дзе коней тады кідалі?..

— Ну...

Захару чамусьці не захацелася прызнавацца ў тым, што гэтую дробязную акалічнасць ён не памятае. І зноў успамін Яштокіна павярнуў яго да развагі. Як хутка праляцеў год! Колькі вялікіх і малых падзей было ў яго жыцці і жыцці атрада. А вось усё адляцела, прайшло, і адразу ўдаўнілася, і прыгадваецца, як нешта дужа далёкае, а нешта і ўвогуле немагчыма ўжо аднавіць у памяці! Дзе, пад якімі ялінамі не было тады, у леташнюю наваготнюю ноч, снегу? Не прыгадаеш. Якое неба тады было, летась, калі яны разам з Яштокіным і падрыўнікамі Санько падбіраліся да чыгункі кіламетры за чатыры ад гэтага пагорка? Не ў памяці. Што гаварыў Яштокін цікавага тады, апрача гэтага свайго «закона Архімеда»? Не прыгадаеш ужо. Якое прадчуванне прымусіла цябе змяніць напрамак руху групы, у выніку чаго не наскочылі на фашысцкую засаду ля пераезда? А можа, і ўвогуле не было аніякага прадчування? Можа, ішоў ты вось гэтак жа ўпэўнена, як ідзеш зараз за Яштокіным, па слядах у глыбокім снезе?.. Не, снег ужо не глыбокі, і слядоў тут вельмі ж шмат — Жвірбля, значыцца, тут поўзаў, выглядаючы зручнае месца, каб адразу развярнуць гармату. Сапраўды, роўна тут і снегу мала. Снег там, ля лесу, глыбокі — нагнала з гэтых гладкіх

пагоркаў. Нечым нагадвае гэты схіл той схіл, па якім летась яны адпаўзалі, узарваўшы эшалон. Помніш, значыцца, які там быў схіл. Ён, той схіл, быў амаль без снегу, абдзьмуты вятрамі, і кулі рыкашэцілі, пранізліва вішчалі, як бы завінчваючыся ў чорную высь... Тады была ноч, і можна было адпаўзаць, унікнуць прыцэльнага агню... А цяпер, удзень, як усё павернецца? На гэтым схіле іх з бункераў не будзе відаць. Але ж з мінамётаў яны ўдараць адразу ж, як толькі расшалопаюць, што да чаго...

Ад моцнага рыўка за крысо кажуха Захар паваліўся ў снег і адчуў над сабой узбуджаны шэпт Яштокіна:

— Патрулі... Ты бачыш іх?.. Ды не туды глядзіш. У-унь, на насыпе...

Захар блага бачыў усё наперадзе, і толькі крышку спагадзя, змахнуўшы з броваў і веяў раставы снег, угледзеў недалёка ўнізе цёмную палосу насыпу і два белыя слупкі, якія марудна рухаліся. Прыгледзеўшыся, ён прыкмеціў і яшчэ два гэткія ж слупкі, і яны таксама рухаліся, збліжаючыся.

— Цяпер — бачу. Як і раней — у дзве пары ідуць. Нічога не мяняюць у сваёй тактыцы.

— І ўсё ж дурні яны,— пошапкам вясёлым і задаволеным праказаў Яштокін.— Маглі за гэты час здагадацца, што на чорным белае у-унь як відно. Здалёк.

— Каб ішлі без халатаў, дык не адразу і ўгледзіш.

— Памятаеш. Гэтак жа і летась ішлі. Два — злева. Два — з правага боку. Цяпер сыдуцца, пакураць і пойдуць у бункер грэцца...

— Ты цішэй гамані.

— Ды не пачуюць. І нас на снезе сам д'ябал не заўважыць з такога насыпу.

— Бачыш? Нечага спыніліся.

— Здаецца табе. Яны ідуць. Рухаюцца, але асцярожна.

Захар цяпер добра бачыў, што патрулі не спыніліся, рухаюцца. Але рух заўважаеш, калі глядзіш на зубчыкі бору па той бок насыпу, і гэтыя постаці вартавых тады марудна супуцца па тых зубчыках.

— А ўсё-ткі рызыкоўны манеўр мы робім,— прамовіў Захар. Маўчанне хвалявала, трывожыла, а ў гаворцы не гэтак назаляюць думкі, адчуваеш сябе спакайней, час бяжыць хутчэй.

— Рызыка ёсць.

— Хаця, дзе яе няма, гэтай рызыкі? Паўсюль і скрозь.

— Абы эшалончык найшоў не пусты. Чуеш? Зноў

грукоча паражнячок. Разумна яны ноч выкарыстоўваюць.

— Калі сёння ўсё абыдзецца добра, мы гэты манеўр паўторым. Налаўчымся як след і пачнем іх надсмажваць. Пазіцыю толькі мяняй.

Яштокін сказаў пасля маўчання, якое Захара чамусьці пачало трывожыць,— ляжыць нерухома, як спіць чалавек:

— Мяняй ці не мяняй, а гармату мы скора на сушку пастаўім. Сорак сем снарадаў застаецца. Ты ж гэта ведаеш?

— Ды дзесятак сёння адкіпь.

— Ты пачакай адкідваць. Магчыма, усе цэленькія дамоў папром.

— Ну, каркаеш ты сёння!

Захар сказаў гэта рэзка, здзіўлены тым, што Яштокін сёння нечым узвінчаны і паводзіць сябе без ранейшай стрыманасці і разважлівасці. Але Яштокін не звярнуў увагі на рэзкі тон, казаў па-ранейшаму памяркоўным шэптам, як не ў самае вуха Захара:

— Думаю зноў дакладную на імя Ціхана Елісеевіча ціснуць. Можа, што і падкінуць. Гусараў, праўда, сказаў, каб я паперы не псаваў.

— Ён мае рацыю. Ціхан мне шчыра сказаў, каб на снарады не разлічвалі. Цяжка іх самалётам вазіць І не гэта галоўнае. Саракапятку, кажуць, здымаюць з узбраення ўвогуле. Што яна супраць танкаў? Чмых — не больш.

— Не-е, з гэтым цяжка пагадзіцца. Проста тут іншае зусім, на мой розум. Відаць, нехта там сказаў, што смеху гэта варта — партызанам снарады падвозіць. Партызаны ў лясах — навошта ім гарматы. Гарматы на фронце патрэбны!

— Сам сябе абвяргаеш!

— Чаго гэта я абвяргаю. У мяне на ўсё ёсць свая думка. І ты гэта ведаеш. І калі нам снарадаў больш не адшукаць — хай сабе. Яно і правільна будзе. Гэта добра нам зараз, калі ад Дзвіны да чыгункі — усе дарогі ў нашых руках. А як зноў нам у лесе хавацца? Куды там з нашай гарматай?

— А чаго гэта нам у лесе хавацца? Гэта — мінулае. Мы туды ўжо і не пойдзем.

— Пагоняць, дык пойдзем.

— Можам і не паддацца.

— Рана ці позна давядзецца вяртацца ў лясы,— сказаў Яштокін хмурна, як бы злуючыся, што Захар навяз-

вае яму размову непатрэбную і не зусім разумную.— Абавязкова. І нам да гэтага трэба быць гатовым.

Захар прыкусіў губу, разважаючы над тым, што гэтак адкрыта, не таячыся, казаў яму зараз Яштокін. Ён, Яштокін, аказваецца, скрытны чалавек. Раней стаяў зусім на іншых пазіцыях, усяляк падтрымліваў ідэю трывалай абароны, рабіў усё без пярэчанняў, ваяваў з камандзірамі рот, даводзячы ім, як гэта важна мець трывалую абарону, сам ездзіў і аглядаў усе акопы скрозь. Няўжо ён, начштаба, рабіў гэта, не верачы ў патрэбнасць таго, што робіць?..

Было непамысна, прыкра неяк, і не хацелася пярэчыць, не хацелася спрачацца менавіта тут, непадалёк ад бункераў, ля насыпу, з якога можа зараз грымнуць аўтаматная чарга і закрэсліць і твае доказы, і пярэчанні Яштокіна, і ўвогуле ўсе размовы. Але ад гэтай думкі не рабілася лягчэй, і яшчэ больш прыкра было маўчаць, і Захар спытаў, у апошні міг, праўда, закрэсліўшы сваё жаданне ў нечым не пагадзіцца з Яштокіным:

— Куды ж гэта падзеўся твой ранейшы ваяўнічы настрой, таварыш «стыліст»?

Грукат цягніка набліжаўся, можна было гаварыць гучней, не баючыся, што пачуюць з насыпу. Яштокін, аднак, не прыняў гэта пад увагу, казаў шэптам, але шэпт цяпер быў весялейшы:

— Ува мне ён. Ува мне сядзіць. Але трэба цішэй нам пра тое з табою гаворыць. Каб і гэтыя, у халатах, не ўзяліся дашуквацца, дзе той ваяўнічы настрой падзеўся ў начальніка штаба!..

Захар ледзь стрымаўся, каб не засмяяцца ўголас. Што, атрымаў па закусь па носе? До-обра Яштокін хлабыснуў табе. Ён жа з табою шчыра гаварыў. А ты ж яго пачаў абвінавачваць у тым, што ён, маўляў, чалавек скрытны. А ён проста шчыры, ва ўсім — з душой чуйнай і тонкай. Ты вось гэтыя свае абвінавачванні ўслых не выказаў, а ён іх зразумеў. І не толькі зразумеў, але і падкрэсліў, што ты памыляешся. Ты ж сам у душы разумееш, што будзеш трымаць абарону да пэўнага часу, што зацяжных баёў табе не вытрымаць — давядзецца адыходзіць у лясы. Ды каб жа толькі ў душы тое было! Ціхан жа табе казаў, падкрэсліваў, што зону сваю, магчыма, давядзецца пакінуць, але пакінуць толькі ў выключным выпадку, калі сілы будуць няроўныя. Захар павінен берагчы кожнага чалавека. Там, у лесе, трэба мець запасны лагер для кожнай роты, якая, па сутнасці, з'яўляецца амаль самастойным

атрадам. Дык чаго ж цяпер ты напусціўся на Яштокіна? Не, гэта проста ад таго, што небяспека блізка, што ты яе бачыш, што павінен чакаць ворага тут, на адкрытым пагорку, дзе ўдача залежыць ад абставін, якія невядомы пакуль што, якія запланаваць і прадбачыць немагчыма.

Нейкі час ляжалі моўчкі, назіраючы за цягніком, які грукацеў насупраць пагорка. Вартавыя сышлі на краёк насыпу, потым, калі цягнік прамчаў, пачалі закурваць, і было відаць, як пыхнула і згасла слабенькае полымя запальнічкі. Крыху спагадзя яны рушылі па насыпе і пакрочылі чамусьці вельмі хутка і неяк раптоўна расталі ў белаватым ранішнім сутонні. Гэтак жа раптоўна, як і ў першы раз, растаў, як заваліўся некуды, гул цягніка.

— Калі гружоны эшалон, дык доўга гудзе наваколле,— прамовіў Захар. Яму карцела першым пачаць гаворку зноў, ён адчуваў сябе як бы моцна вінаватым перад Яштокіным і намагаўся як мага хутчэй скасаваць непамыснасць.— А гэты, парожнячок, праляскатаў — і цішыня.

— Ужо і відавочна світае. Дзень без сонейка будзе.

— Не, сонца павінна быць. Табе не холадна?

— Мерзне правая нага. Валёнкі трэба было надзяваць.

— А я дык не магу ў валёнках. Нават малы калі быў, ваяваў супраць валёнак.

— У вас тут можна і без валёнак. А ў нас — не пражывеш. Як пачне сорак градусаў прыціскаць — гэтак і стаіць да вясны. Аніводнай адлігі.

— Добра, што папярэдзіў. Калі к табе ў Новасібірск заскочыць давядзецца — валёнкі прыхаплю абавязкова.

— Мы ж дамаўляліся, што ты ўлетку прыедзеш. Каб парыбаліць нам на Абі.

— Яна там у вас на Дзвіну падобная?

— Шырэйшая. І ры-ыбы! Асятра пудзікі на тры ўзваліш — і дамоў. Пад соль яго, у бочачку. Ці пад дымок...

Усё гэта было вядома Захару зімовымі вечарамі, яшчэ калі былі ў зімовым лясным лагеры. Яштокін шмат разоў расказваў пра свой горад, пра тое, як яны едуць рыбаліць у нізоўе, як робяць балык з асятра. Але цяпер гэтая гаворка неназаляла, заспакойвала, і Захар нечакана адчуў, што гэтыя хвіліны яшчэ больш зблізілі яго з Яштокіным, адкрылі шмат таго, чаго ён дагэтуль не ведаў у натуры гэтага чалавека. Углядаючыся ў пасвятлелае неба над лесам, Захар упершыню падумаў пра рэальнасць абяцання, якое ён толькі што зрабіў — абяцання паехаць пасля вайны да Яштокіна ў Новасібірск. Сапраўды, а што

тут цяжкага? Сесці ў цягнік і паехаць. Ён гэта абавязкова зробіць. Трэба будзе ўвогуле пасля вайны праехаць па ўсёй краіне з краю ў край.

— Ведаеш, «стыліст», пра што я зараз мару? Каб і сапраўды паехаць к табе ў госці. Прыеду, вось пабачыш!

— Паспрабуй не прыехаць! Я цябе тэлеграмамі закідаю. Адмаўляцца пачнеш — у міліцыю звярнуся. Так што адзінае ў цябе выйсце — сесці на цягнічок і ехаць.

— Ты паслухай, паслухай. Адтуль з Новасібірска, я далей еду — Сахалін глядзець. Хачу краіну на свае вочы ўбачыць.

— Ад мяне ўжо тады разам далей паедзем,— паабяцаў Яштокін, і нечакана ў яго шэпце прабіліся гарэзныя ноткі.— І ведаеш, пачнем рыхтавацца ўжо зараз.

Захар не злавіў іроніі, запытаўся шчыра:

— Зараз?

— Ну. Зарыемся глыбей у снег — гэта і будзе падрыхтоўкаю. Бо калі нас на гэтым пагорку куля пакладзе, дык паездка можа і сарвацца. Як думаеш?

— Сарвецца. Гэта ўжо дакладна можна сказаць.

Яны закапаліся глыбей у сыпкі падатны снег. Захар угрэўся. Але праз колькі хвілін холад пачаў падціскаць зноў, знаёмыя дрыжыкі пакаціліся па спіне, і Захар накруціўся ў вузкім снегавым акопчыку. Позірк яго зачапіўся за белаватую палоску, што пакрэсліла неба над лесам за чыгункаю.

— Хутка як світае.

— Усход хмарамі не зацягнуты,— тут жа адгукнуўся Яштокін, быццам тое, што сказаў Захар, патрабавала неадкладных тлумачэнняў.— Хмары над намі вісяць. А там — ружовіцца ўжо неба.

Захар павярнуўся з правага боку на спіну і глядзеў у неба. Сапраўды, дзіўна расцягнуліся хмары. Нейкія тоўстыя, шчыльныя, але як па лінеечцы адрэзаныя, закрылі толькі палову неба, і краёк хмар ужо асветлены сонцам, але асветлены яшчэ зусім слаба, і хмары быццам не сунуцца па небе, а ціха апускаюцца з высі на зямлю. Чыстая палова неба, дзе няма хмар, увесь час як бы глыбее, пашыраецца, хутка змяньвае свой попельны колер на блакітны.

— Падобна, што зноў цягнік. Чуеш? — Захар прыўзняў галаву, паглядзеў у бок лесу, дзе, быццам у вузкай чорнай браме, знікала светлая палоска насыпу.

— Чую. Але гэта — рэха. Паражнячок адгрукацеў.

— Ды не, ты ўслухайся. Ідзе гружоны.

— Не можа быць! Патрулі павінны спачатку перагон свой агледзець.

— А навошта? Паражняк праскочыў? Значыцца, усё ў парадку, нідзе не замініравана...

Невыразны гул цягніка, што на нейкі міг пачуўся ўдалечыні, растаў. Было зноў дужа ціха, і Захар канчаткова пераканаў сябе, што пачуў ён сапраўды рэха. На чыгунцы цяпер парадак строгі: уночы — паражняк гоняць, ранкам — вартавыя выходзяць з бункераў, уважна правяраюць кожны перагон, і толькі потым пачынаецца рух цягнікоў. Гэтак яно і ёсць! Вунь, ідуць патрулі зноў! Ідуць хутка, голасна перагаворваюцца, без халатаў. Правільна ўсё ж ты, Захар, разлічыў з Яштокіным, што не выцягнулі гармату сюды ўночы. Вартавыя заўважылі б яе абавязкова, далі б сігнал бункерам. А там — мінамёты, і ўсе гэтыя пагоркі і нізінкі ля чыгункі прыстраляны добра. Было б горача, каб іх заўважылі вартавыя. Яшчэ і зараз можа ўсё пабурыцца, калі вартавыя заўважаць нешта падазронае. Не, не заўважаюць яны гэтых снегавых акопчыкаў, ідуць паспешліва, заклапочана аглядаюць і правяраюць рэйкі, шукаюць, ці не замініравана дзе-небудзь.

Патрулі схаваліся — іх затуліў пагорак — і тады зноў пачуўся знаёмы гул, той гул, які зусім нядаўна прабіваўся ў марозным паветры і знік. Захар моўчкі зірнуў на Яштокіна. На твары Яштокіна адбілася трывога, ён нават прыўзняўся на калені ў сваім снегавым акопчыку, глядзеў у бок узлеску.

— Гэта не рэха,— сказаў Захар.— Я добра чую. Ты прыцісніся да снегу — яшчэ больш выразна тады чуваць.

— На крылах ён ляціць, ці што? Гэтак адразу гул наблізіўся. Не паспееш азірнуцца — тут праскочыць.

— І чуваць, што гружаны.

— А яны чаго там марудзяць? Чаго спяць у шапку? — з ярасцю запытаўся Яштокін.— Гэтая артылерыя мне ўсе нервы на нітачку паравяла. Ты забач! Іх нават на ўзлеску не відаць!

Захар таксама не заўважыў на ўзлеску аніякага руху — коні з гарматай не казюрка якая-небудзь! — і пачынаў гневацца гэтак жа, як і Яштокін. Цягнік наближаецца! Ён ужо зусім непадалёк грукоча!

Ад первовага напружання моцна, мацней, чым усе папярэднія разы, заторгалася брыво, і Захар, схапіўшы поўную жменю снегу, пачаў хутка церці ўвесь твар. Торганне брыва супялося, і неяк адразу ён заспакоіўся, не-

чакала падумаў пра тое, што вартавых, безумоўна, заўважылі, і заслоны далі знак артылерыстам, і тыя счакалі, і зараз павінны паявіцца.

— Вунь дзе яны! — ледзь не ўголас выгукнуў Яштокін.— Чаго іх туды пагнала! Хаця... Можа, і разумна яны робяць...

Хваляванне перадалося і Захару, і ён, на нейкі міг страціўшы ўпэўненасць, якая гэтак нечакана прыйшла да яго, папракнуў Яштокіна, як бы вінавацiў яго ў тым, што ўсё адбываецца па іншых планах, чым было імі разам прадугледжана:

— Што ты разумнага ўбачыў? Ім тут, ля нас, трэба ўжо стаяць! На баявой стаяць.

— Ну, артылерыя! Ну, арлы! — прамовіў Яштокін у захапленні.— Гэта ж яны круга даюць, каб тут, на схіле, не круціцца. Разумееш?..

Тое, што рабіў Жвірбля, Захар зразумеў крыху пазней, калі ля яго, з хрыпеннем, узбіваючы снег капытамі, коні ўсцягнулі на схіл пагорка цяжкія сані з гарматай. Так, калі ехаць ад лесу напрамкі і потым разварочвацца па верху пагорка, з правага бункера іх маглі заўважыць. Акрамя ўсяго — схіл няроўны, можна было б і перакуліцца. Жвірбля ўлічыў гэта і з узлеску пагнаў у нізіну, тады заламіў усцяж чыгункі і цяпер без развароту стаў на баявую пазіцыю. І коней жа адгадаваў — як звяры цягнуць!

— З пазіцыі! Усе далоў з пазіцыі! — ярасна прасіпеў Жвірбля, кідаючы лейцы Сачыўку. Ён схапіў стракатую посцілку, укрыў ёю галовы коням.— Ты трымай іх моцна. Чуеш? І рукою ля вушэй пагладжвай. Фарштэен? — скінуў упоры, падпёр імі сані, наваліўся на іх плячом, каб глыбей увайшлі ў снег. Потым патузаў жалезныя распоркі рукамі, застаўся задаволены.— Гут! Гут! Поўная клёпачка, корань ім у душу!..

Жвірблю было не пазнаць. Чырвоны, мокры ад растаялага снегу твар, бліскучыя ад узбуджэння і радаснага шалу вочы. Гэткі ж ён цяпер, якім быў там, ля Дзвіны, калі рыхтаваўся зрабіць той стрэл, які мог каштаваць жыцця і яму асабіста, і Захару, і Гнацюку. А дзе ж тады быў Сачыўка? А-а, коней адводзіў глыбей у лес. Цяпер коней няма патрэбы адводзіць, ды і нельга: усё будуць вырашаць лічаныя хвіліны.

Яштокін уголас пабедаваў:

— Э-эх, не ўлічылі адно. Запасных коней на ўзлеску

трэба было трымаць. На выпадак чаго. Каб перапрэгчы тады.

— Перапрэгчы? Гэ-гэ! — і Жвірбля спарадам, які трымаў у руках, ссунуў шапку на патыліцу.— Перапрагаць нам патрэбы няма! Удача коціць! У самыя ручкі коціць. Каб жа толькі не апячыся, ухапіць моцна,— і раптам твар яго дзіўна змяніўся, у голасе зноў прабіўся хрыпаты топ і яраснае сіпенне: — Богам прашу: з пазіцыі! Далоў, далоў з пазіцыі. Тут толькі разлік застаецца!

— Цягло зараз мы забяспечым. Ты як хочаш, а гэта зрабіць неабходна...

Жвірбля перапыніў Яштокіна ўсё тым жа сіпатым голасам, у якім гучала незадаволенасць і патрабавальнасць:

— Мае пфэрды з агню і полымя выпясуць. Вучаныя яны ў мяне — прысягу прынялі,— і зноў на твары ў яго, які быў пасвятлеў ва ўсмешцы, выразна акрэсліўся злосны абрыс.— Ну, што вы стаіцё? У лес адыходзьце! Таварыш камандзір, богам прашу! — Жвірбля ўскочыў усярэдзіну браніраванага кола і ўжо не звяртаў больш увагі на Захара і Яштокіна, як бы іх тут зусім не было, і ярасна закрычаў Гнацюку: — Снарады рыхтуй! Каб дзве секунды — і залп! Фарштэен?

— Пайшлі, тут нам і сапраўды няма чаго рабіць,— сказаў Яштокін.— Дапамога з нас — нуль. Хай ужо сам арудуе. Ну, як шалёны ён робіцца, калі да спарадаў рукою дакранецца. Анікога не прызнае...

Прыгінаючыся, Яштокін пабег па схіле пагорка, і Захар ледзь паспяваў за ім. Яштокін нечакана паваліўся, як наўмысна, пад ногі Захару, і Захар бухнуўся носам у снегавую гурбу. Снег раставаў на твары, на шыі, і халодныя жвавыя пацеркі пакаціліся за каўнер, і Захар узняўся на ногі з жаданнем, якое нарадзілася імгненна — жаданнем вярнуцца назад, на пагорак.

— Я пайду да іх. Вярнуся,— ён махнуў рукою ў бок гарматы.— А ты бяжы. Сапраўды, коні на запас могуць і спатрэбіцца.

— Толькі замінаць ім будзем. Гэтаму шалёніку аніхто цяпер не патрэбны.

— Хай сабе. Пайду туды!

— Э-э, абодва вы гэткія: калі ўжо ўлезла ў галаў,— і Яштокін, махнуўшы рукою, павярнуў у бок узлеску.

Захар клыпаў па сваіх слядах, зморана дыхаючы. Ён убачыў, як з чорнага, падобнага на вузкую браму прагалу лесу, куды бег насыпь, марудна неяк выпаўз паравоз і за

ім хутка выстрайваліся пярэстыя, як размаляваныя белай фарбай, цыстэрны, і яму зрабілася горача. Ён змахнуў вушанкай з твару расталы снег, зноў націснуў вушанку і пабег да гарматы. Разварушаны снег чамусьці зрабіўся слізкі, быццам там, пад ім, была не зямля, а лёд, і нечакана паваліўся і пачаў узнімацца, упіраючыся рукамі ў снег. У гэты момант неяк слаба, амаль што прыцішана, стрэліла гармата. Ён узняўся, рукавом кажуха цярнуў твар і тады ўбачыў рэдкае воблака снегу, што завіхурыла, як бы схаваўшы гарматны ствол, быццам абламаўшы яго, і праз гэтае сяйво ўбачыў белы дым, што завалок паравоз. Дым выгінаўся шырокай паласою, якую быццам хто цягнуў на пярэстыя цыстэрны, і ў сярэдзіне гэтай палосы раптоўна выбіўся чырвоны знак, разваліўся, ператварыўся ў бляклае жаўтлявае полымя, і гэтае полымя нібыта ліхнула ад сябе залачоныя стрэлкі агню, і як бы ад іх, ад тых агнявых стрэлак, ірвануўся ў марознае паветра пранізлівы і жаласлівы, прарывісты роў паравознага гудка.

— Гарыць! — гукнуў Гнацюк.— Пацэліў у цыстэрну! Адыходзім! Цяпер згарыць увесь да нітачкі. Адыходзім!

Жвірбля перапыніў яго злоснай лаянкаю:

— Стаяць да апошняга, корань ім у душу! Снарад! Снарад давай!

Зноў гакнула гармата, і зноў, цяпер ужо ў сярэдзіне эшалона, узвіліся бляклыя языкі полымя. Чорныя шлейфы дыму звіваліся з белымі палосамі, скручваліся, распаўзаліся, выгіналіся шырознай дугою, як бы падкінутыя з долу нябачнай сілаю, і здавалася, што імчыць не цягнік, а яна сама, гэтая віхрастая, клубамі, дуга ляціць яму насустрач.

Паравоз усё роў, нібыта крычаў, маліў дапамогі і ратунку, і цяпер неяк віскатліва грукацелі колы, і ў гэтым грукаце і жалезным гудзе новы стрэл гарматы выдаваў слабенькім пошчакам, і ён, гэты пошчак, абарваўся неяк раптоўна, быццам падрэзаны прарэзлівым тонкім свістам, які Захар адразу пазнаў. Міна! У бункерах, значыцца, іх засеклі.

«Зараз тут будзе пекла!..»

Захар не спалохаўся, ён толькі адзначыў гэты факт і чамусьці паставіўся да яго дужа спакойна. Ён як настроіўся на тую шалёную хвалю, на якой жылі Жвірбля і Гнацюк, і хацеў крычаць і лаяцца разам з імі, нешта падказваць, у нечым памагчы, хацеў апынуцца побач з імі, а не коўзацца тут, у снезе.

Свіст міны набліжаўся імкліва, набіраў сілу, перарастаючы ў віскатлівую прыглушаную ноту, і абарваўся раптоўным выбухам на вяршыні пагорка. Коні спуджана захраплі, скінулі посцілку, ірваліся з настропяў, і Сачыўка ледзьве ўтрымліваў іх. Зваліўшыся на дышаль, посцілка матлялася, як сцяг, і Сачыўка сіліўся адной рукою садраць яе, каб зноў ухутаць коням галовы, а другою сціскаў аброць і лейцы.

Захар кінуўся на дапамогу, схапіў за аброць каня, які быў прыпрэжан на левы бок дышля, і ў гэты момант зноў пачуўся пранрзлівы свіст, і Захар адчуў, што ногі яго адарваліся ад зямлі і коні валакуць яго наперад, уніз з пагорка. Жвірбля лаяўся, загадваў спыніцца, і словы яго глухлі ў рэзкіх траскотных выбухах мін на пагорку, грукаце колаў і рове паравоза. Коні спуджана храплі, неслі шалёна і раптам задралі галовы, спыняючыся, лейцы неяк занесла на браніраванае кола — Жвірбля паспеў схапіць іх і нацягнуць з усяе моцы.

— Ста-а-аяць! — Жвірбля злосна мацюкнуўся.— Стаяць, душу... корань... Пфэрды, ста-аяць! — Жвірбля патрос кулаком, перакінуў лейцы Гнацюку.— Трымай! Апошні снарадзік у с... яму ўлепім! Апошні! Няможна ж без гэтага!

Следам за цыстэрнамі ў эшалоне ішлі таварныя вагоны, але не чырвоныя, а таксама пярэстыя, размаляваныя, як фарбаю, снегавым пылам. Чорна-белы дым гнала ўжо і над імі, і вагоны быццам трэсліся, падскоквалі ў гэтых скручаных, звітых у тоўсты жмут дымных шлейфах.

Разгарачоны барацьбою з ашалелымі коньмі, Захар быў гатовы кінуцца з лаянкаю на Жвірблю. Здурнеў ён хіба! Няўжо ён не бачыць, што выбухі мін спаўзлі з пагорка ў нізіну — паварочваюць у бок лесу. Яшчэ крыху, і яны абрынуцца сюды, якраз на сані з гарматаю! А Жвірбля як і не бачыць гэтага — стрэліць яму карціць яшчэ разок! А няма ж патрэбы ў гэтым! Эшалон гарыць, яго цяпер ужо не атушыш, і зараз пачнуць узрывацца цыстэрны. І хавацца апошнія вагоны за пагоркам — у белы свет яму трэба нацэліць...

У трэску мінамётных выбухаў, у рове паравоза, які, здавалася, не аддаліўся, а наблізіўся, стрэл з гарматы прагучаў суха і слаба. Але тое, што адбылося следам, прымусіла Захара здрыгануцца і прысесці. У хвасце эшалона пыхнула асляпляльна белае полымя, і Захар на нейкі міг змружыў вочы, аглушаны страшэнным грукатам і гулам;

цёплае паветра пікнула яго ў твар і грудзі, зямля зыбанулася пад нагамі, як нехта страсянуў яе, і Захар паваліўся ў снег. Ён тут жа ўскочыў. Што ж гэта робіцца! Ні вагонаў, ні насыпу! Знік і край пагорка, і лес за чыгункаю, і ў небе звіваюцца злавесныя мядзяна-бурыя хвалі, якія выстройваюцца лесвічкаю і тут жа разломваюцца і распаўзаюцца.

«У вагонах снарады, мабыць. Ці тол ляжаў...»

Коні зноў ірванулася і панеслі, і Захар ледзь паспеў ускочыць на заснежаны брус і ўчапіцца за руку, якую працягнуў яму Жвірбля. Сані дугаліся, іх кідала то ўлева, то ўправа, то яны ўставалі ледзь не строма, гатовыя абярнуцца. Захар, учапіўшыся цяпер абедзвюма рукамі ў настылую рабрыну жалезнага кола, сіліўся знайсці больш зручную паставу для ног, каб не зваліцца. Але гэтая небяспека яго хвалявала мала, ён увесь час вярнуў галаву ў бок гарматнага ствала, глядзеў назад, у тую прастору, якую ўвесь час кончык ствала як бы крэсліў і падзяляў, глядзеў, шырока адкрыўшы вочы ад здзіўлення і радаснага сполаху, як круцяцца і ў доле і ў высі агнявыя палосы і чорныя шлейфы, выносячы ў неба нейкае дымнае вурвалле і рудыя, спавітыя полымем лахманы.

— Пацэліў! Пацэліў, корань ім у душу,— радасна роў Жвірбля, трасучы кулаком.— Вось гэта шпокнуў! Цяпер лупіце, пфэрдзікі родныя! — і ён, схапіўшы лейцы аберуч, затузаў імі, прысвіснуў.— Фю-ю-ю... Гэ-эй, брацянікі!

Жвірбля крычаў нешта яшчэ, нешта патрабавальнае гукалі Гнацюк і Сачыўка, і Захар, падхоплены гэтай імклівай хваляй радасці, руху і небяспекі, шалёным тупатам капытоў, візгатам снегу пад палазамі, роў разам з імі, учапіўшыся, да болю ў пальцах, у халодны, няроўна абсечаны вобад брані.

«Калі сарвуся з бруса пад палазы — капут у момант!..»

Захар падумаў гэта, і тут жа абедзве яго нагі намацалі добрае апірышча, і ён зарадаваўся. Цяпер, стаўшы на два брусы, можна перадыхнуць, можна паслабіць рукі, каб адпачылі пальцы — цяпер ужо не зваліішся.

— Магутная, аднак, гарматачка,— жартаўліва гукнуў Захар Жвірблі, перавёўшы дыханне.— Можа і свет перавярнуць!

— Перавернем, таварыш камандзір! Перавернем!

З кожным імгненнем набліжаўся ўзлесак, і вось ужо сані цірнулі стары след, пракладзены на дарозе. Жвірбля па-ранейшаму тузаў лейцы, падспешваў коней, лаяўся, але

ў лаянцы ўжо не было ранейшай ярасці, і коні з новай сілай ірвалі наперад, у цішыню лесу, ірвалі падалей ад пагорка, дзе грымелі і трэслі паветра магутныя выбухі і высока ў небе білі грывастыя султаны агню і дыму.

## 17

Песню зацягнуў Лавягін — узяў на нізкай, прыглушана-даверлівай ноце, як шчырую споведзь павёў,— і вясельнае застолле падхапіла паўтор дружна, як бы раптоўна і дужа ўражанае гэтай споведдзю:

> Под осенним дождем мы врага подождем,—
> Нам спешить, торопиться не надо...

Нейкае імгненне панавала цішыня, нібыта ўсе за сталом услухоўваліся ў тое шамаценне дажджу, затым неяк тонка, на сумнай і тужлівай ноце павяла песню Гайдаш далей — яна сядзела ў куточку, пры самым акне, адгароджаная ад Захара шырокай спіной Яштокіна. Сумны і тужлівы голас Гайдаш асеў у Захаравым сэрцы болем, моцным і незнаёмым болем, выціснуў з вачэй слёзы; застолле ґайданулася, быццам некуды паплыло, і ён апусціў галаву, хаваючы ад усіх свой твар! Што з табою робіцца, Захар? Чаму размагніціўся? Хіба ўпершыню табе спяваць гэтую песню? Не ўпершыню — словы ўсе ведаеш! Дык чаго ж галаву звесіў? Сваю хату прыгадаў? Не яе адну зжэр агонь. І не адзін ты з гэткім болем у сэрцы. Спявай! Ніхто з баявых сяброў не павінен бачыць, што камандзір іх пусціў слязу. Не думай, што толькі табе баліць сэрца. Усім баліць!

Унутраны голас, які сіліўся пераканаць Захара, быў упарты. Захар ужо зжыўся з ім, разумеў яго і заўсёды слухаў з ахвотаю — ён змякчаў боль, суцяшаў, пераконваў, што ёсць у жыцці кожнага чалавека не толькі сваё, асабістае, але і больш высокае, значнае, у імя чаго варта жыць. Цяпер у гэты знаёмы голас прабіліся новыя ноткі, і Захар з горыччу адчуваў, што боль не змякчаецца, што ў ім цяпер бачацца новыя адценні, якія па-новаму высвятляюць тое, што ён даўно і добра ведае. Так, баліць усім. У кожнага — свая бяда! У кожнага — свая сляза! Свая — у Лавягіна. Свая — у Чэсі. Свая — у Марылі. Свая — у Файзуло. Свая — у Артура... Не, яго сляза цяпер далёка, ён схаваў яе глыбока, і зараз у яго з Рымаю — радасць.

І ты, Захар, мудра зрабіў, што стварыў ім гэтую радасць... Хаця, які ж ты творца? Яны самі, сваім розумам, сваёй воляю стварылі сабе радасць. А ты толькі сабраў людзей сюды, у гэтую хату, дзе стаіць на сталах пітво і закусь, дзе пядаўна ўрэзаў гарманіст вясельную польку. А каб не сабраў, каб не зрабіў гэтак, як ёсць, хіба інакш бы стукалі сэрцы маладых? Хіба інакшым, не гэткім шчаслівым бляскам свяціліся іх вочы?.. Не, дружа, тут твая ўлада і канчаецца. І добра зрабіў, што наладзіў гэтае вяселле. Наладзіў насуперак маўклівай нязгодзе Яштокіна, настойлівым папярэджанням Юршы. І таму — далоў слязу! Усе спяваюць? І ты спявай разам з усімі.

Захар, не таячыся, быццам аціраючы пот, правёў далонёю па твары, узняў галаву, адкінуўся на лаўцы, падпёршы плячыма бярвенне сцяны, і ўнутраны голас быццам заблытаўся ў шамаценні старых, шмат дзе падраных шпалераў, якімі былі абклеены некалі сцены.

Калі заціхла музыка і ў хаце ўсталявалася цішыня, яму падалося, што яна яшчэ гучыць блізенька, дзесьці за шыбамі; ён нават нахіліўся да акна, паўзіраўся ў шкло, слаба размаляванае марозпай насечкаю; адтуль, з-за той белай мярэжкі, пачулася невыразнае дудуканне буйнакаліберпага кулямёта, і белая марозная насечка на шыбіне затрымцела, быццам насыпалася тонкім зорным сяйвом.

Захар павярнуў галаву і сутыкнуўся з позіркамі Артура і Рымы. Як яны глядзяць на яго! Нібыта нешта чакаюць... Нешта?.. Не, дружа, не нейкага там «нешта» чакаюць яны ад цябе! Вяселле пачынаў сваім тостам Рымін бацька. Потым гаварылі і Марыля, і Фаїзуло, і Пажога, і Часлава, і Санько... А ты дагэтуль маўчыш, быццам дэманструеш сваю нязгоду з усім тым, што адбываецца на тваіх вачах.

Захар узняўся з чаркаю ў руцэ. Глухім ад хвалявання голасам ён прамовіў два словы, і яны прагучалі сцішана, неяк суладна цішыні, што ўсё яшчэ панавала ў хаце:

— Дзеці мае...

Боль гэтак моцна сціснуў сэрца, што Захар замкнуў вусны, баючыся дыхнуць, каб не выклікаць новы выбух болю. Дзеці мае... Не, Захар, не твае гэта дзеці. Твае дзеці далёка, там, дзе няма аніякіх слоў, аніякай турботы і клопату. Ім, дзецям тваім, ужо не сесці вось гэтак за вясельны стол, не пачуць добрых і ласкавых слоў... Гэта яны, жывыя, павінны пачуць. І яны маюць права на гэтыя словы, чакаюць іх, і ты павінен сказаць ім такія словы. І не

марудзь, не цягні, скажы ім тое, што сказаў бы сваім дзецям!..

Ён разумеў, што патрэбны словы незвычайныя, і добра бачыў па радасна-ўзбуджаных, неяк насцярожаных тварах Артура і Рымы, што яны, маладыя, чакаюць ад яго менавіта гэткіх слоў, і шукаў гэтыя словы, услухоўваючыся ў вясельны гармідар, які надламаў цішыню і пакрысе набіраў ранейшую сілу; чарка ледзь улоўна трымцела ў яго руцэ, і гэта было яму дзіўна бачыць; недарэчны боль у сэрцы не праходзіў, аддаваў ціхім гулам у скронях, і Захар нечакана адчуў, што ад яго слоў вяселле ўжо не залежыць, што яно ўжо жыве па сваіх законах, якія яму непадуладныя, якія перарабіць ужо ніхто ў свеце не зможа. Але ён змушаны, ён абавязаны сказаць ім самыя добрыя словы зусім не таму, што гэтага патрабуе вясельны статут. Ён абавязаны сказаць ім самыя добрыя і шчырыя словы таму, што таго, хто павінен быў бы сказаць іх, ужо няма, не існуе ўвогуле на зямлі. Той чалавек — Артураў бацька — ужо далёка, там, дзе не ладзяць вяселлі, дзе толькі цішыня, спакой, нябыт.

«І дзеці мае там, побач з ім...»

Недарэчная гэтая думка як бы падкрэсліла, што ўсё па гэтым свеце адноснае і прадбачыць лёс свайго заўтрашняга дня чалавек не ў стане. Ву-унь, як яно ўсё дзіўна павярнулася! Тады, у той вечар напярэдадні вайны, калі ў бацькавай хаце гасцяваў Ягор, Лавягін жартаваў: не аддам, маўляў, Рыму табе, зяцёк, пакуль не «ўхопіш вышэйшую адукацыю». Артур, як дарослы, абсек яго, сказаўшы, што скончыць школу і розуму, як чалавек самастойны, пазычаць не будзе ані ў кога. Як весела смяяўся тады Пахом! І гэтак жа весела пацяшаліся ўсе яны, дарослыя, што сядзелі на тэрасе! І вось аддае дачку Лавягін наўпярок сваім перакананням. І вось сядзіць перад імі, дарослымі, той зялёны юнак... Былы зялёны юнак! Зачарнелі стрэлкі вусікаў над верхняй губою, акрэслілася ямінка на падбародку, позірк немігатлівых вачэй упарты, позірк чалавека, які ведае, чаго хоча дамагчыся і верыць у свае сілы. І як змянілася з твару Рыма — анічога ж дзіцячага і наіўнага! Прыгожая маладая жанчына — мажныя, поўныя грудзі над расшпіленай на два верхнія гузікі гімнасцёркаю з асляпляльна белым падкаўнерыкам... Гэткім сталым, сапраўдным мужчынам хацела ўбачыць свайго сына Марыля. Але ж не пра гэткае вяселле марылі яны тады — і Марыля, і Лавягін. А можа, гэтая партызанская сябры-

па, гэтае маладое каханне, што жыве і ідзе наўпярок жахлівай навалы, даражэй за самыя пышныя і багатыя вяселлі?.. Хай жа толькі адзінае абміне маладыя сэрцы — варожыя кулі. І адзінае, што хочацца яму, Захару, пажадаць маладым, і менавіта гэта ён ім і жадае — хай дажывуць да перамогі!..

Захар думаў гэта ўсхваляванa, сціснуўшы келіх абедвума, потым нахіліўся да маладых, па чарзе пацалаваў, выпіў свой келіх да дна і сеў на сваё ранейшае месца пад вясёлы і адчайна-патрабавальны вір галасоў:

— Г-г-го-о-о-орка!..

Нейкі час Захар сядзеў, змружыўшы вочы, дзівячыся, што гарэлка не выклікае тлумны пошум у галаве і думкі па-ранейшаму строга паслядоўныя і ясныя. А ён жа трэці келіх сёння кульнуў! І каб табе знак — быццам вады глынуў.

— Закусваць трэба, таварыш камандзір. Закусвайце... Вы ж нічога не ясцё.

Захар адкрыў вочы. Гайдаш цяпер не адгароджана спіною Яштокіна, сядзіць не ў кутку, а насупраць за сталом. На яго талерцы ляжаць дзве тоўстыя лусты свежаніны, блішчастая ад святла лямпы горбіцца капуста з густым россыпам кмену. Напэўна, Гайдаш пастаралася. Яна ці не яна — бяды той: ён павінен гэта ўсё з'есці. Свежаніна засмажана добра, з цыбуляю. І капустка, напэўна ж, смачная.

Ён адкусіў кавалак хлеба, адкроіў скрылёк свежаніны, падчапіў відэльцам капусты. Сапраўды смачна. І мае, ведама ж, мае рацыю Гайдаш: паесці трэба.

Добра закусіўшы, Захар узняўся, адчыніў фортку, нейкі час стаяў, дыхаючы свежым марозным паветрам. Каб жа не застудзіцца — разагрэты пад самую фортку падсунуўся. Ён сеў на краёк лаўкі і тады ў бязладнай мешаніне галасоў выразна пачуў ціхую гаворку — Артур шаптаўся з Рымаю.

— Бачыш, якія зоркі буйныя?

— Быццам пры самеенькім акне вісяць. І густа ж як, бы намаляваныя. Сапраўды, як неба гэтая шыба.

— Хочаш зорку? Кажы, якую табе хочацца? Ці, можа, усе разам?

— Усе разам нельга. Трэба ж і людзям пакінуць. Сабе ўсё заграбастаем — нядобра.

— Тады самую буйную. Ву-унь тую!

— Ой, яны ж гайдаюцца.

— Натуральна: я зняў зорку, неба страціла раўнавагу. Таму і гайдаецца. Давай руку. Бяры, гэтая зорка — твая.

— Наша зорка хай будзе.

— Ага, наша... Я кахаю цябе, а зорка — наш таліеман.

— І я з табою буду да скону дзён...

Захар адхіснуўся ад сцэны — нядобра, быццам падслухваць узяўся! — і таропка вярнуўся на сваё месца. Тое, што ён пачуў, узварушыла яго, расхвалявала. І раптам, як новая сіла нарадзілася ў ім, прыйшла задаволенасць сабою. Правільна, вельмі правільна ты зрабіў, што наладзіў гэтае вяселле! Калі гіне ў баі салдат гэткага, скажам, узросту, як ты сам, як Яшт.окін, як Файзуло,— гэта натуральна, у баі нехта павінен паміраць. Горка, ведама ж, але ў гэткім узросце частка свядомага жыцця за плячыма. А калі гіне салдат малады... Гэта страшна, калі памірае салдат, які ўчора быў зялёным хлапчуком, які нічэ і не пачынаў свайго самастойнага жыцця... Хай будзе шчаслівая дарога ў Артура і Рымы. І ён, Захар, усё жыццё б кляў сябе, ніколі б не дараваў, каб не наладзіў гэтага вяселля! І таму — прэч развагу! Прэч ад сэрца роспач! Ён парадуецца з чужое радасці, радасці гэтых прыгожых, маладых!

Але радасць чамусьці ўпарта не ішла ў Захарава сэрца. Ён скоса паглядзеў на свежаніну, што ляжала ў яго на талерцы. Нешта як пабольшала яе тут, пакуль ён тупаў да форткі і сядзеў пры ёй. Тады на талерцы заставаўся вузкі скрылік, капусты крышку і палова бульбіны. Хай сабе. Трэба есці.

Захар пакроіў свежаніну, падчапіў відэльцам шырокі скрылёк, паклаў у рот, узняў галаву і сустрэўся з позіркам Гайдаш. Нешта было ў ім дужа знаёмае, ласкавае, не сарамлівае, а смелае, адкрытае, даверлівае і шчырае. Захар згледзеў яшчэ ў яе вачах прытоены боль, спачуванне і спагаду, жаданне памагчы і суцешыць, абнадзеіць і прыгалубіць. Скварка ў роце зрабілася калянай, як каменнай.

— Трэба есці, таварыш камандзір,— зноў нагадала Гайдаш.

— А я што раблю?

— Зусім мала ясцё. Вось што вы робіце.

У голасе ўжо нічога не было з таго, што ён прыкмеціў у яе вачах — будзённы, звычайны голас. Памыліўся ты, дружа, проста намроілася табе спагада, цеплыня, прыветнасць, і не было ні адкрытага, даверлівага позірку, спагады, аніякага таямнічага святла, што гэтак узрушыла цябе

і здзівіла... Не! Было гэтае святло! Яна хавае яго, як баіцца, што нехта іншы заўважыць, пацікавіцца. Вунь, у зрэнках водбліск яго, кароткі, аддалены і прытоены, але ўсё яшчэ яркі, як апошні водбліск сонца на ціхай вадзе.

— Ты, я гляджу, медыцыны не слухаешся. О-ох, не слухаешся. І, павер мне, блага робіш. Сабе на шкоду, адным словам,— забубніў у Захара над вухам Юрша.— Пасунься, пасунься, дарагі камандзір,— Юрша сеў побач, апетытна жуючы.— Бульба з капусткаю ды свежанінка — гэткага харчу хапянуўшы, ворага ўмігадолееш. Ад гэтай ежы — мо-оц ва ўсім целе: і ў нагах, і ў руках, і ў галаве. На такой закусі можна да раніцы сядзець — і ні ў адным воку не прыкмеціш. Таму прыцэлімся, каб да раніцы — з-за стала ані кроку.

— Лепей на святочны канцэрт прыцэльвайся!

— Тут позна прыцэльвацца. Тут справу трэба рабіць.

— Дык не з чаркаю ў руцэ яе рабіць!

— Ведама! Заўтра роўненька а пятай усе, хто занятыя ў канцэрце, збіраюцца ў клубе. Канцэрт народу дамо — першы клас! От жа тады скажаш...

Гайдаш узнялася — яе нечага паклікала Марыля — і Захар павесялеў. Цяпер, калі Гайдаш не глядзела на яго, ён пачаў увішна і са смакам есці.

— Ты ведай,— прамовіў Захар, нахіліўшыся над талеркаю.— Канцэрт і слухачы — на тваёй адказнасці. Трэба, каб усе, хто адпраўляецца з калонаю, абавязкова былі. І з Ліцвінава, і з Венцавога, і з Пятроўцаў, ведама ж. Дарэчы, а ў Зуі паведамілі?

— А як жа! Сам там быў. Але мяне, шчыра кажучы, канцэрт у клубе мала непакоіць. Вось калі мы эшалончык кульнём ды па гравійцы той масточак узнімем — вось гэта канцэрт. Тады па ўсіх напрамках — поўны святочны профіль. Санько вунь сядзіць і не шмапае. А ўночы ж па чыгунку ісці.

— Пад раніцу пойдуць. Шчэ і выспацца паспеюць.

— І гэта — разумна. Свята — усім хай свята!

— А памятаеш, як мы летась свята сустракалі? Драпалі, толькі снег курыўся!

— Чаго ты ўсё благое прыгадваеш? Добрае трэба прыгадваць. І наліем яшчэ па адной, апошняй сёння, за свята. Налівай, налівай. Дзень Арміі нашай — маё свята. Я ж у гэты дзень нарадзіўся.

— Каб ты быў здаровенькі сто год, чарцяка! І не сказаў жа. Дай я тост зараз...

Юрша пацягнуў Захара за руку, прыціснуў плячо, прымусіў сесці, сказаў умольна, але неяк дужа строга:

— Ты што? Ты што?.. Ні-ні! Новуюналосу тады пусцім — пачнуць скрозь адзначаць. Я сказаў: за нашу Армію! А потым будзе ў мяне з табою адна важная гаворка...

Юрша пацягнуўся па бутэльку, наліў сабе ў келіх і, дапоўпіўшы Захару, чокнуўся, выпіў і ўзяўся закусваць. Твар яго быў замкнёны, нейкі строгі, быццам чалавек рыхтаваўся да нечага важнага, як нешта ўсё абдумваў, узважваючы і прымерваючыся. Двойчы Юрша зыркнуў на Захара скоса, уважна, але нічога не папытаў, і позірк яго пайшоў далей, у той бок, дзе Важнік усё нешта даводзіў Яштокіну.

Аніякага неспакою папярэджанне Юршы ў Захара не выклікала. Ён па-сапраўднаму захацеў есці, і гаворка, якую абяцаў яму Юрша, зусім і не займала яго. Але ён памятаў пра яе. Калі добра закусіў, адклаў відэлец убок, падахвоціў Юршу, усміхаючыся:

— Ну, чаму не пачынаеш сваю гаворку? Цяпер, добра падсілкаваўшыся, да любое гаворкі я здатны,— і засмяяўся, здагадваючыся, што Юршу турбуе вяселле.— Вяселле цябе, камісар, непакоіць. Дык спі спакойна — адказнасць на мне. Усё на сябе бяру. Я ж табе сказаў тады яшчэ: сваю галаву кладу пад абух.

— Насмалілі — сякера завісне. Пайшлі з хаты. Падыхаем.

— Можна,— адразу ж пагадзіўся Захар.— Мо-ожна і падыхаць. І зоркі палічыць...

Яны выбіліся з хаты, прайшлі пад яблынямі ў канец саду па гулкай, слаба прыцярушанай снегам зямлі. Пад нагамі мякка, але падвойна, як у моцны мароз, рыпеў снег і суха трашчала скалелае будыллё лебяды.

— Увесь снег адліга зжэрла,— прамовіў Юрша.— Блага, калі снегу не падваліць. Памерзнуць яблыні. І жыта памерзне.

— Ты пра гэта хацеў гаманіць?

— Не-е, сам разумееш. Хацеў сказаць, што мудры ты чалавек. Правільна ўсё: патрэбна было яно, вяселле.

— Знайшоў мудраца! Вось прыкаціць Гусараў і гэтаму мудрацу зробяць памылку першакласную. А ты з Яштокіным — чысценькія. Мы, маўляў, яго папярэджвалі, сваю нязгоду выказалі. Але вы аднаго не разумелі: пагалоска пра гэтае вяселле пойдзе далёка.

— У тым і загвоздка, што далёка. На бюро Гусараў цябе паваляць — як ніць даць. І ведаеш, як усё павернецца?.. Рыму Лавягіну ў наш трохкутнік навошта прыслалі? Каб інфармацыю без спазнення штабу перадавала. А мы якія ёй умовы стварылі? За стол вясельны пасадзілі. Так што трэба нам падумаць, як і чым бараніцца лепей!

— А навошта бараніцца, хавацца навошта? Наступаць будзем!

— Як гэта ты будзеш наступаць, хацеў бы я ведаць.

— Проста. Якую я мэту ставлю? Каб людзі ўбачылі зноў: мы не тулягі нейкія. Мы — народныя мсціўцы, і мы — гаспадары тут. Наша гэта зямля. Яна нам належыць, і нашы тут, савецкія, парадкі і законы. І цяпер, калі мы выйшлі з лесу і размясціліся па вёсках, гэтае перакананне — важная зброя. Вера людзей — вера народа! Мы, калі хочаш ведаць, і самі яшчэ як след не разумеем і не ўяўляем сабе сілу гэтай зброі. Вера людзей, гэта як крыніца, заўсёды невычарпальная...

— Гэтым ты нічога Гусараву не давядзеш,— у шчырым роздуме прамовіў Юрша, зусім не клапоцячыся пра тое, ці слухае яго Захар.— Тое ж самае ён табе, як па пісанаму, скажа!

— Хай гаворыць што хоча. Важна, каб ён нас зразумеў. А чалавек ён разумны.

— Дзіўлюся з тваёй здольнасці ўсё прадбачыць. З Ромелем — твая праўда. З гэтым перасяленнем ў вёскі — твая праўда. Цяпер з вяселлем...

Захар перапыніў яго незадаволена:

— Ты кінь гэта. Я не прарок. Атрад з лесу выводзіць — загад штаба быў. Мы яго з табою сумленна выконвалі.

— Гэта ты сумленна выконваў. А я... Я, дарагі мой, сумняваўся. Нават паганая думка пра здраду тачыла душу...

Дзіўная нейкая паваротка гаворкі. Як нечага спалохаўся Юрша, спалохаўся і цяпер настойліва спрабуе патлумачыць Захару прычыны гэтага свайго настрою, як баіцца, што яго паводзіны могуць зразумець інакш, чым гэта яму хочацца.

— Сумненні ў мяне былі. Толькі я нікому пра іх не казаў, у душы трымаў. Калі загад ёсць — свае асабістыя сумненні трэба закрэсліваць.

— Я вось яшчэ не навучыўся гэтак рабіць. І ў здольнасць Гусарава зразумець гэтае вяселле вельмі сумня-

ваюся. Пацягне ён нас на бюро. Важнік, між іншым, гэткай жа думкі...

Юрша спыніўся ля апошняй яблыні, павярнуўся, марудна патупаў назад да хаты, і Захар, нага за нагу, пацёгся следам. Нешта мудрыць Юрша. Зусім не пра тое, што зараз адбываецца ў хаце, карціць яму пагаманіць. А вось жа ўсё кругом ды вакол ходзіць, галоўнага не чапаючы.

— Сам сядзіць на вяселлі, а мяне як арганізатара хоча і на бюро,— са смяшком у голасе, павольна расцягваючы словы, прамовіў Захар.— І ты — і гэта мяне дзівіць! — туды ж гнеш!

— Важнік у любым выпадку будзе цябе абараняць. Ён Артура і Рыму любіць дужа.

— І дужа не любіць Гусарава.

— Вялікай любові і ў мяне, калі ўжо шчыра, няма. Усю сваю работу ў сухар пераводзіць, усё яму — на паперку пакладзі, аб усім — справаздачу дай. Нейкі папяровы чарвячок у ім завёўся. Летась гэтага ў яго не было.

— Важнік таксама тое заўважыў.

— Думаеш, што ён па гэтай прычыне будзе цябе абараняць? Не-е, Важнік — прынцыповы. Сваю думку ён ніколі не пабаіцца выказаць. Памятаеш, як ён даводзіў Ціхану, што Бахнара нельга больш пакідаць у горадзе?

— У Ціхана быў загад. Там быў загад. Разумееш?

— А Важнік спачатку чалавека вывучае. Потым ужо — загад.

— Ён, Важнік, Ціханавы словы паўтарае. І ў тым выпадку з Бахнарам я сам настоійваў. І гэта мяне гняце. Увесь час — цяжар на сэрцы. Як на смерць чалавека наслаў...

— Бач ты! «На смерць чалавека наслаў...» Мы ўсе на смерць пасланыя, калі хочаш ведаць. Сумленнем пасланыя. І кожны з нас не на нагулянку пайшоў — смерць перад кожным.

— Яно, ведама ж, гэтак...

Захару карцела спрачацца, але ён прамовіў дзяжурныя словы і змоўк. Ён з кожным годам усё больш і больш паважаў Ціхана, лічыўся з кожным яго словам і парадаю, і цяпер, злавіўшы ў словах Юршы спробу ўскласці на Ціхана віну за смерць Бахнара, адчуў непрыязнасць да гэтага чалавека, чалавека, якога ён таксама паважаў і якому давяраў ва ўсім. Ды не вінаваты тут Ціхан і на каліўца. Болей, відаць, віны тут яго, Захаравай. Але віна гэтая

ў яго, Захаравым, сэрцы. Юрша адмятае віну Захара. І Яштокін адмятае. І кожны скажа, што ў смерці Бахнара вінавата вайна, вінаваты толькі чужынцы — яны забілі Бахнара.

Знаёмыя, дужа знаёмыя думкі. Гэта ж ад іх па начах часцяком спрабуе Захар уцячы, неяк адкасацца, закрэсліць. А яны ўсё роўна прыціскаюць яго, і яму не схавацца ад іх, і яны з кожным новым днём як бы нанава крояць, трывожаць сэрца. Ды, уласна кажучы, як жа жыць без іх? Страты... Страты сяброў, страты надзеі, страты ўпэўненасці, што ты ўсё можаш прадбачыць, ад кожнага адхіліць бяду... А бяда ідзе і па тваіх слядах, і па слядах сяброў. Забіты не толькі Бахнар. І не адно яго жыццё адляцела... І тут нельга спасылацца на гэтае абстрактнае — чужынцы. У кожным канкрэтным выпадку ёсць і канкрэтны забойца, той, хто паслаў кулю, якая абарвала чалавечае жыццё. Толькі вось як даведацца, дзе ён, гэты забойца?.. Кандрат яшчэ летась паабяцаў: знайду, маўляў, таго, хто забіў Бахнара, хто прадаў Балаша. Смерць стаяла побач з Кандратам — вось і паабяцаў. Цікава, а як бы ты, дружа, паводзіў сябе, каб — нос у нос! — смерць перад табою?.. Ты ж мог апынуцца на месцы Бахнара і на месцы Балаша, і на гэтым месцы мог апынуцца і Ціхан, і Важнік, і Юрша... Вайна — гэта ахвяры. Заўсёды ахвяры, і ўсё трэба прымаць як няўмольны закон, што не падпарадкоўваецца жаданню чалавека жыць. Ты вось жывеш, прыйшоў на вяселле, узяў чарку, глядзіш цяпер на зоры, дыхаеш марозным, прапахлым яблыкамі паветрам. Дзіўна, нават зімою, у маразы, у садзе адчуваеш пах яблыкаў. І гэта — жыццё. А што, уласна кажучы, смерць? Міг!.. Толькі нейкі міг, за якім — попел, цемра, нябыт... У дзіўнае, аднак, рэчышча скіраваліся твае думкі, Захар! Ты лепей падумай, з чаго гэткі шчыры сёння Юрша, з чаго гаваркі гэткі. Як нечага наддобрыцца хоча. Цяпер вось маўчыць, утаропіўся на асветленыя вокны хаты. Фортка ж была адчынена, а цяпер дык акно — угрэліся яны там. І мітусня нейкая ля сталоў. Гэ! У скокі пайшлі. І гармонік залівaецца. Валяўка свой спрыт паказвае — гарманіст ён выдатны, нічога тут не скажаш. Але Янка Загурскі быў музыка вышэйшага класа: неяк зусім іначш спяваў гармонік у яго руках — мякка, лірычна, за сэрца крапаў. Валяўка таксама майстра адмысловы. Але ўсё нейкія гучныя, імклівыя ў яго мелодыі — быццам усё спяшаецца некуды чалавек... І якія ж розныя лёсы ў іх! Валяўка пасля ранення паправіўся, у

арміі быў, у палон трапіў, шчасліва выбавіўся з таго пекла, і зараз на гармоніку Загурскага польку шпарыць. А Загурскі?.. Колькі тых дзён у атрадзе пабыў, і ўжо ў зямельцы другі год ляжыць — знайшоў сваю кулю. Сваю кулю? Не, Захар, твая гэта тады куля была. Янка свядома тады кінуўся пад аўтаматную чаргу, свае грудзі тваёй кулі падставіў...

Смерць Загурскага ўспомнілася раптоўна, думкі аб ёй — даўнія і знаёмыя! — цяпер спарадзілі ў душы не знаёмы, тужлівы боль, а дзіўную халодную пустэчу, быццам грудзі рассеклі, усё адтуль выдралі і імгненна забілі марозным паветрам.

— От жа сарвігалава! Ты зірні, як ён у скокі пайшоў! — з захапленнем выгукнуў Юрша.— Арлом лётае! Аго-онь мужык. Нездарма гаранка наша да яго прыкіпела. Як вяровачкаю прывязана!

— Сатлела гэтая вяровачка. Зусім іншая стрэмка ў яго сэрцы сядзіць — старая. З ёю яму і паміраць.

— Часлава?

— Ну. Яна яго не любіла і не любіць. І вось з гэтым ён змірыцца аніяк не можа.

— А ты — псіхо-о-олаг,— дужа радасна працягнуў Юрша і павярнуўся, пляснуў Захара па плячы.— Але — кепскі. Вернецца Маўджуда — ён зноў у гаранцы на шыі завісне. А па-другое, яна яго анікому не аддасць. Жанчына гор — агню роўная. Толькі нешта дужа доўга яе няма. Нешта другая наша калона мне спакою не дае. Не хочацца пра бяду думаць. Свярбіць думка: сёння Калечыц вернецца ад Ціхана і нешта радаснае прыцягне. Не можа ж быць, каб яму не паведамілі!

— Вернецца — даведаемся.

Захар не прызнаўся ў тым, што яго ўсё больш і больш трывожыць лёс другой калоны мабілізаваных. Група суправаджэння першай калоны вярнулася назад нешта тыдні праз тры. А тут ужо амаль паўтара месяца — ні слыху ні дыху.

Юрша нечакана прамовіў заклапочана:

— Ведаеш, якую я ўчора пагудку злавіў у Зуях? З першай калоны, маўляў, толькі дзесяць чалавек у жывых засталося — толькі тыя, што вярнуліся са зброяю, ды група суправаджэння. А з другой — аніводнага ўжо ў жывых. Самалёты, маўляў, ля Дрэтуні нацэліліся — і пасеклі з кулямётаў і бомбамі ўсіх начыста.

— І тыя, хто ўключаны ў трэцюю калону, ведаюць гэта?

— Натуральна. Ад іх я і пачуў.
— Чаго ж адразу не далажыў?
— Калі? Я ж толькі нядаўна вярнуўся.
— Рэагаваў як? Ты хоць ім патлумачыў, што да чаго?
— Натуральна. І даў заданне сваім групам у вёсках знайсці, адкуль гэтая брыда паўзе. Але плёткі, як туман: у руку не зловіш.
— Заўтра перад канцэртам самадзейнасці трэба аднаго ці нават трох выпусціць на сцэну. Хай расказваюць, як атрымлівалі зброю, як ішлі, як за фронтам людзі працуюць на Перамогу. Пра ўсё, што бачылі. Хай сабе і расказвалі яны ўжо, але не пашкодзіць і афіцыйна — са сцэны.
— Гэткая і ў мяне, скажу табе, думка была. Хацеў параіцца з табою.
— І чаму не параіўся,— падкалупнуў Захар.— Ці чарка замінала?
— Не гаварыць жа ў хаце! Пры ўсіх.
— Выкруціўся, аднак.
— Слыш, камандзір! Нешта мы з табою сёння ўсё пра змрочнае ды пра змрочнае — сабе нуду наганяем. Пайшлі, тупнем ботам у грамадзе!
Захар наважыўся быў адказаць згодаю, але, узіраючыся ў адчыненае акно, заўважыў, што там, пад гукі гармоніка і дружнае плясканне далоняў, плыла, узняўшы рукі над галавою, Гайдаш, і сказаў рашуча:
— Не хачу! Падыхаю тут. Горача там...
— А я — пайду, патрасу старыя косці. О! Гайдаш выцягнулі! Э-эх, як жа слаўна ідзе! Кацечка — залатое сэрцайка, як Голуб кажа,— Юрша ўздыхнуў, быццам нешта згубіў і ведаў непапраўнасць свае страты, пабедаваў шчыра: — У такую б і я закахаўся, каб не спазніўся.
— А што, наспелі ўжо?
— Падрыўнікі ўсе пачыста. І Санько, і Зімніцкі, і Голуб. Гэты дык сур'ёзна клінкі падбівае...
— А яна?
— А яна Захарку свайго любіць. Захарку Круппю... Ведаеш гэткага гусачка?
— Ты хоць разумееш, што гаворыш? — з нязлосным смяшком запытаўся Захар і паўтарыў ужо больш настырна: — Ты хоць разумееш, што гаворыш?
— Пакуль — толькі бачу. Бачу, як яна глядзіць на цябе — вочы жанчыны, якая кахае! Голас можа схлусіць, словы могуць схлусіць. А вочы... Не-е, вочы не схлусяць!..

— Ты колькі ўзяў сёння? Колькі выпіў, пытаюся?

— Пытайся ці не пытайся — усё адно: вочы не сёння не лгалі. Гэтыя вочы кахаюць. І яны глядзелі на цябе, гэтыя вочы. І гэтак глядзяць заўжды.

— Не ведаў, што камісар у мяне дужа кемлівы і зіркасты.

— Дурны твой камісар, калі хочаш ведаць,— са шчырым шкадаваннем прамовіў Юрша.— Ёлуп вялікі! Не трэба ж мне было гэта казаць табе. Не меў я права казаць.

— Мне сказаў — памерла. Але не ўдумай гэтую лухту каму-небудзь яшчэ плесці. Чуеш?

— Чую. Але і ты паслухай, што я табе скажу.

— А што ты мне шчэ скажаш?

— А тое скажу, што не толькі твой наглядальны камісар можа нешта заўважыць. Людзі ж не сляпыя,— і, зрабіўшы крок, спыніўся, сказаў дзелавіта, падкрэсліваючы, што яго папярэджанне нельга лічыць жартам: — Сам не горш за мяне разумееш — людзі ўсё бачаць.

— Гайдаш пойдзе з трэцяй калонай. Хай і гэта людзі пабачаць!

— Памыліўся, аказваецца, твой «наглядальны камісар»,— з сумным шкадаваннем прамовіў Юрша.— Не ён ёлуп вялікі, а — ты, дружа,— і прапанаваў, адразу павесялеўшы: — Пайшлі! Там весялей, у хаце! Грымнем абцасамі!

— Сказаў жа. І не ўпрошвай.

— Тады хоць на месцы не стой. Тупай памалу, каб не застудзіцца.

— Ідзі. Ідзі. Цяпла ў сад нагоніш...

Захар пакіраваў у канец саду па сваіх старых слядах, намагаючыся ступаць след у след. Але крочыць было нязручна — быццам ідзеш па шпалах,— і ён павярнуў управа, біў уцалік, кіруючыся на гонкі вішняк, што шнурам стаяў ля старой, у дзве жардзіны, агароджы. У адным месцы ўбачыў зламаныя жардзіны, пераступіў іх, крыху прайшоў і спыніўся. Адкуль тут рака? Але ж выразна акрэсліваецца бераг, цёмны, дужа звілісты, з крутымі сінявымі ўзваламі. Лёдзацярушаны снегам, няроўны, як пабіты на квадраты, і чорная сцяна лесу за ўзвалам, быццам за ракой чарнее... Ды не! Зусім не рака гэта! Нізінка тут на полі, і туман пад ёю грувасціцца...

Ён добра бачыў цяпер поле і нізіну, якую зацягнуў рэдкі туманок, і ўсё не мог пазбавіцца ад раптоўнага здзіўлення, і крочыў наперад памалу, асцярожна, быццам

баючыся зваліцца ў ваду. З кожным крокам падманны бераг адсоўваўся, адсоўвалася і чорная сцяна лесу, раставала і сінеча ў нізіне, на ёй усё выразней акрэслівалася занесенае снегам іржышча. Ён нахіліўся, калі ўзышоў на яго, пакратаў рукою густы і колкі ржэўнік і адчуў горыч адзіноты, адчуў сябе дужа няўтульна пасярод гэтага ціхага белага поля. Уверсе, у блізкай чорнай высі, зіхацелі зоркі, і ён доўга, пакуль не знямела шыя, глядзеў на іх, потым павярнуў галаву ў бок хаты. За вішняком ярка свяціліся адчыненыя вокны — сапраўды ўгрэліся там, паддаў ім там Юрша дыху! — і галіны дрэў як бы зыбаліся на зіхатлівых промнях святла. Асабліва ярка прасейвалася святло праз шаты вішняку, і снег на яго тонкіх галінах быў як агнявы, ад яго ўвесь час адскоквалі мігатлівыя зоры і падалі на аснежаны дол, як бы высякаючы з яго іскры. Непадалёк ад акна, злева ля сенцаў, чарнела нерухомая постаць, і Захару падалося, што гэта Юрша выбег з хаты, чакае яго, каб павесці зноў у той вясельны гармідар. Гарачая хваля пайшла з грудзей уверх, як абручом сціснула Захару горла. Як гэта сказаў Юрша? Людзі, маўляў, усё бачаць. А што яны, уласна кажучы, могуць убачыць? Што гэтая Гайдаш закахалася ў свайго камандзіра? Дык Юрша ж сам сказаў, што ўсе падрыўнікі ў яе закаханы! Што тут Захару свеціць? Яна яго кахае, камандзіра свайго? Хай сабе! Захар пакладзе канец і заляцанням гэтым, і плёткам, калі яны ёсць. Гайдаш пойдзе з калонаю мабілізаваных, пойдзе літаральна на гэтых днях — як толькі вернецца ад Ціхана. Калечыц са сваімі разведчыкамі: ён павінен там атрымаць зброю для атрада і распараджэнні, калі выправіць калону. Яна б пайшла з калонаю яшчэ ў снежні, калі яны ў другі раз накіроўвалі мабілізаваных за лінію фронту. Дык жа апякла руку ў кузні — узялася рукою за гарачы спарад. Таму ў групе суправаджэння пайшла Маўджуда. Цяпер Гайдаш, яна направілася, вунь як у скокі пайшла. Юршу, аднак, трэба наківаць. А ён зараз пад чаркаю і можа, жартуючы, узяцца баяць пра вочы, якія не ўмеюць ілгаць. Знаўца знайшоўся! Трэба абавязкова ўтаймаваць яго!

Захар, аднак, памыліўся: ля хаты, на левы бок адчыненага акна, стаяў не Юрша, а Калечыц. Убачыўшы яго, Захар узрадаваўся: вярнуўся Калечыц з разведчыкамі! Значыцца, навіны ад Ціхана ёсць, і ён іх зараз пачуе!

— Ну, з вяртаннем цябе,— і ён перапыніў даклад Ка-

лечыца, па-сяброўску паціснуў руку.— Чыгунку добра праскочылі? Ніякай нідзе бяды — па твары бачу.

— Усё шчасліва прайшло. Прывезлі тол, патроны.

— Аўтаматы?

— Дзевяць. І дзве бязгучкі. Таварыш Крупня сказаў, што ў сакавіку нам выдзеляць пятнаццаць аўтаматаў. Да дзесятага трэба будзе атрымаць.

— Якія-небудзь загады ёсць? Пісьмовыя.

— Не. Прывезлі яшчэ кнігі. Дваццаць экземпляраў кнігі таварыша Сталіна «Аб вялікай айчыннай вайне». Гусараў сказаў, каб тэрмінова размеркавалі дзесяць штук па ўзводах. А дзесяць раздаць па вёсках. На чытку.

— Калі ён сам, Гусараў, вернецца?

— Не сказаў. Але я даведаўся, што не раней дваццатага.

— Што яшчэ Ціхан перадаваў?

— Загадана калону не адпраўляць. Паступіць распараджэнне.

— Прычыны?

— Не казалі. Але я даведаўся: пачалася блакада за чыгункаю. На Расоны яны пруць і на Асвею...

Вось гэта разведчык! Начальства яму нічога не скажа, а ён ідзе сваім шляхам — «але я даведаўся». І гэтым звесткам можна верыць цалкам — памылак не здаралася.

— Стаміўся? — клапатліва спытаў Захар.— Ідзі, адпачывай. Потым раскажаш аб усім падрабязна.

— Адпачываць потым. Хлопцы зараз зброю здадуць Гнацюку, а потым — сюды. Камісар дазволіў.

— А дзе ён?

— Там, ва ўзводзе. Кнігі разглядае.

— Добра. Ты ў хату ідзі. Паясі там...

— Хлопцаў дачакаюся. Тады ўжо разам за стол шуснем.

Захар пакіраваў па вуліцу і пашыбаваў да штабной хаты хуткім крокам. Увесь час, пакуль ён не павярнуў з вуліцы на сядзібу Падрэза, за яго плячыма хутка, як бы спяшаючыся некуды, спяваў-заліваўся гармонік. Ён слухаў гэтую мелодыю, а галава была занята іншым клопатам, як цвік сядзела думка пра тое, што сказаў Калечыц. «На Расоны і Асвею яны пруць...» Значыцца, блакада пачалася. Але чаму не сказаў пра гэта Калечыцу Ціхан? Баіцца, каб не пайшла непатрэбная пагудка? Але ж пра гэтую блакаду будуць ведаць заўтра ва ўсіх вёсках! І чаму толькі дзевяць аўтаматаў атрымаў Калечыц? Абя-

цалі ж выдзеліць атраду пятнаццаць. Відаць, не было з чаго выдзяляць. І гэта натуральна, бо зброю трэба кіпуць туды, дзе зараз ідуць баі. Але ж і тут трэба актывізаваць дзеянні, каб памагчы тым атрадам, за чыгункаю. Пра гэта Ціхан чамусьці нічога не гаворыць. Мажліва, вернецца з пэўнымі дырэктывамі Гусараў? Мажліва, ён нешта будзе ведаць і пра другую калону, якая пайшла адсюль? А што, як не плётку прыцёг Юрша з Зуёў? Можа, сапраўды трапіла пад агонь калона?..

«Сотні людзей... І ўсе — без зброі... Якія ж яны ваякі без зброі?»

Ён спыніўся, зрабілася зябка ў плячах. Ледзьве чутная цяпер мелодыя гармоніка была ўсё яшчэ жвавая і імпэтная, яна клікала, падварушвала, і Захару раптам дужа захацелася з пустыннай марознай вуліцы туды, дзе гарыць святло, дзе дружна спяваюць людзі і весела заліваецца гармонік.

## 18

Пад раніцу густы туманны полаг, што, як пасам, звязваў уночы берагі Дзвіны, пачаў хутка чэзнуць, сплываць; набрынялы талай вадою лёд адразу ж зрабіўся святлейшы, і раптоўна пасвятлела ўсё на беразе, і гнутая лазіна, на якой нядаўна Захар сядзеў і гутарыў з Лавягіным, нібыта вылузнулася з маладога вербняку, адскочыла, раздалася ўшыркі, падаўжэла; Захару падалося, што ад гэтага раптоўнага святла ўвысі яшчэ выразней забухаў пад узвалам кашаль Гусарава — Гусараў усё нешта даводзіў Клубічу, які не хацеў адводзіць коней за дарогу,— і яшчэ трывожней, мітусліва неяк, завенькалі цуглі.

Захар задраў галаву, і на твар адразу пачала асядаць ледзь чутная імжа, лёгкая, бязважкая, як бы дакранаціся да скуры і тут жа выпарваліся дробныя густыя расінкі; твар ад іх змакрэў, і змакрэлым парабіўся рукаў скуранкі, на якой Захар правёў далонёю.

— Бачыш, які мукасей бярэцца? — спытаў Гусараў, стаўшы на правую руку ад Захара.— І цеплыня-я ж ударыла! Дзень-другі — Дзвіна лёд пагоніць.

— Думаю, што сёння.

— Табе з нябёснай канцылярыі паведамілі?

— Берагі адмяклі — прыкмета верная. Цяпер мукасей

вадзіцы даліе. І ранкам лёд крапецца. Добра, што сёння неправілі калону. Заўтра магло быць і позна.

— Лавягіну, значыцца, здорава пашэнціла. Ён, Лавягін гэты, чарцяка, удачлівы. Праўда?

— Праўда.

— А Гайдаш чамусьці ўвесь час з ім сварылася,— Гусараў адхінуў рукою лазнякі, углядаўся ў цьмянае ледзянос волава Дзвіны, ад сярэдзіны якой ішла, вузеючы пад супрацьлеглым берагам, палоса белага лёду; чорны лес за ракой быў ёю нібыта падсечаны ад зямлі; лес, бераг і гэтая белая палоса, здавалася, памалу пагоїдваюцца — туман увачавідкі радзеў.— О-ох і рызыкоўная, гэтая Гайдаш. Праўда?

— Праўда,— зноў каротка пагадзіўся Захар; ён нечакана злавіў сябе на тым, што пачынае думаць пра Гайдаш з трывогаю; гаворка з Гусаравым яшчэ больш узмацняла гэтую трывогу, замінала ёй зглухнуць.

«Непакоіцца таксама і Гусараў — час ужо і вярнуцца Калечыцу. Таму, мабыць, пра Гайдаш і распачаў гаворку...»

— Спрабую паставіць сябе ў гэтую калону,— нечакана прызнаўся Гусараў.— Гэта ж як галаруч чалавека ў бой пасылаць...

Захар не мог даўмецца, куды гне Гусараў, прамовіў памяркоўна, пакідаючы сабе магчымасць і на згоду і на пярэчанне:

— Удача, часцяком, і не ад зброі залежыць.

— Сам чорт не ведае, да чаго і да каго тая ўдача можа прыхінуцца.

— Файзуло, ведаеш, як кажа? Калі ў кулямёціку добрыя патроны — удача садзіцца дакладна на мушку.

Гусараў нечакана ўздыхнуў, уздыхнуў падкрэслена шумна, не таячыся:

— У кожнага з нас — сваё да яе стаўленне. Я вось заўважыў па сабе: што-небудзь раблю весела, дык і канец не сумны. А сёння сумна ў нас неяк пачыналася...

— Я не заўважыў. Жартаў хапала.

— Дзе ж іх хапала. Паўзе ў тумане калона — быццам прывіды сунуцца. Ды Гайдаш усё на Лавягіна бурчыць: не падбівайце, маўляў, людзей, каб спявалі. Застудзяць гарлякі, пахвараюць потым, што мне з імі рабіць.

— І першы раз калона ціха ішла.

— А з лагера як выходзіла? З песнямі. І другая гэтак жа ішла — жартаў хапала. А гэтая — быццам прывіды,—

сказаў Гусараў і паўтарыў яшчэ раз вызначэнне, якое, відаць, яму нечым дужа спадабалася: — Быццам прывіды... Адзін толькі Лавягін ішоў, пасвістваючы.

— Лавягін чалавек смелы.

— Я ім захапляюся. Ты толькі ўяві: ад самага фронту — без зброі. Скрыначку гэтую з мулярскім начыннем у рукі — і пайшоў. Хаця, калі разабрацца, і правільна яно: скрыня тая зараз любы дом адчыніць. Комін, скажам, падправіць, печ скласці — дзе цяперака муляра знойдзеш? А ён тут спец вялікай рукі.

— Платон, бацька яго, па ўсім Паддзвінні славіўся. Калі ўжо ён складзе печ — у хаце холаду не зазнаеш. Славуты майстра быў.

— А Лавягіна ты чамусьці на ордэн не паставіў. Таксама і Гайдаш у спісах я не бачыў. А заслугоўваюць жа. Ці, можа, не заслугоўваюць?

Пытанне было зусім нечаканае. Захар памарудзіў з адказам, шукаючы больш ці менш грунтоўнае тлумачэнне.

— Заслугоўваюць,— нагадзіўся ён, вырашыўшы нічога не тлумачыць Гусараву.— Вернуцца — тады і паставім.

Гусараў параіў з націскам, быццам тое, што ён казаў, трэба было выканаць неадкладна:

— А ты не чакай гэтага «тады», стаў без ваганняў іх у спіс. Пакуль дакументы дойдуць, пакуль разгледзяць... Ці, можа, узнагароды шкадуеш?

Захару пачулася ў гусараўскім голасе кпіна, і ён адказаў рэзкавата:

— Не я ўзнагароджваю. Урад!

— Ведама. Але ж там глядзяць на дакументы, а дакументы твая рука падпісвае... А за гэтым дакументам — чалавек жывы, які штодня сваёй галавою рызыкуе, пад кулямі ходзіць. Так што з узнагародамі лепей перабраць, чым недабраць...

Гусараўская шчодрасць — звычайна ж быў скупаваты і на ўхвалу і на ўзнагароды — не здзівіла. Знаёмыя — Ціханавы — інтанацыі гучалі ў гусараўскім голасе, і паўтараў ён знаёмыя Захару Ціханавы думкі — у навіну былі толькі апошнія словы, якія аніяк не вязаліся з былой скупасцю,— і Захар прамовіў стрымана і каротка:

— Улічым...

Гусараў, як падалося Захару, застаўся задаволены адказам. Спытаў жа ён неспадзеўкі:

— Гайдаш, здаецца, ад першага дня ў атрадзе?.. Так,

так. Нябожчык Чагін, помніцца, тады настояў, каб яе ў атрад да цябе ўключылі...

— А чаго гэта вас зацікавіла? — не тоячы здзіўлення, папытаў Захар.— Вы ж у снежні сядзелі на партсходзе, калі яна біяграфію сваю расказвала.

— Біяграфію я і да партсходу ведаў. Але вось зараз прыгадваю, ці бачыў яе прозвішча ў баявых данясеннях па атраду? Здаецца, аніводнага разу не бачыў. І раптам — гэткае адказнае заданне.

— Чаго ж цяпер сумнявацца, калі чалавек на заданне пайшоў? — і Захар ціха засмяяўся.— Раней трэба было!

— Я не сумняваюся. Я проста хачу зразумець, чаго яна гэтак ірвалася, каб з калонаю ісці?

Былыя сумненні — Юрша, маўляў, нешта ўвёў Гусарава ў вушы — адпалі, і Захар зразумеў, што няма патрэбы рабіць нейкія грунтоўныя тлумачэнні.

— Лавягіну, між іншым, сваячка яна. Ягоная Клара і Гайдаш — сёстры. Не родныя, праўда...

— Што гэта? — перапыніў яго Гусараў.— Як чалавек недзе на рацэ застагнаў.

— Лёд. Разломваецца лёд. Відаць, зрушыцца Дзвіна. Вось тады паскача Калечыц.

— Гэта не калона — пераправяцца.

— А вось яшчэ! Чуеш? Жум-жум-жум... Маленькую крыгу плынь пад лёдам пагнала.

— Ціха. Давай паслухаем...

Захар глядзеў на Дзвіну, зацягнутую туманнай шэранню, услухоўваўся ў ціхае бульканне вады пад лазнякамі і радаваўся: лепей памаўчаць, лепей не гаварыць пра Гайдаш. Гусараў жа нездарма спрабаваў скіраваць гаворку на Гайдаш. Ці, можа, здаецца ўсё гэта табе?

Знаёма, як мноства разоў дагэтуль, ціснуў галаву шырокі цяжкі абруч, і ўсё бомкала і бомкала ў скронях. Праз боль даўняй бяды ўсё выразней і мацней працярэбліваўся, прабіваў сабе дарогу зусім нейкі новы клопат, зусім новае пачуццё цеплыні, трывожнае, але не балючае, і Захар не мог патлумачыць сабе яго вытокі. Дакладней, ён ведаў, што гэтае пачуццё звязана з той няшчырасцю, якую ён дапусціў, адказваючы на пытанні Гусарава пра Гайдаш, але намагаўся пераканаць сябе ў адваротным, не жадаў звязваць свае думкі з празмернай, як яму падалося, цікавасцю Гусарава, баючыся, што гэтая цікавасць утоівае ў сабе нешта, асабіста яму непрыемнае. Гусараў кажа, што ведае

біяграфію Гайдаш. Тады чаго ён распытвае? І асабліва карціць яму, чаго гэтак ірвалася яна пайсці з калонаю?

«Лавягіну, між іншым, сваячка яна...»

Гусарава, здаецца, і задаволіла гэтае тлумачэнне. Але ж у ім ёсць, мякка кажучы, наўмыснасць. І гэтую наўмыснасць ты, браце, дапусціў знарок. Знарок? Так, знарок! Зусім не сваяцтва Лавягіна і Гайдаш паўплывала на рашэнне, якое ты прыняў, пасылаючы яе ў групу суправаджэння. Усё інакш было! Зусім інакш! Ну, хай сабе не ва ўсім інакш, а — крышачку... Толькі крышачку... Але ж у гэтым «крышачку» і ёсць уся сутнасць! Ты прыгадай, прыгадай, як усё было...

Ён зmружыў вочы і, на здзіўленне самому сабе, пачаў прыгадваць зусім не тыя дні, калі прыняў канчатковае рашэнне неяк падалей справадзіць Гайдаш з атрада, паставіць яе як мага далей ад сябе — прыгадаў жытнёвае поле пад ранішнім сонцам, па якім няспынна коцяцца мяккія, пакатыя хвалі. Вецер тады цягнуў дым ад горада, даўкая горыч была ў роце, і здавалася, што каласы на полі гарачыя і дымяцца. На тым полі мучыўся ад ран Балаш. І на тым полі ўпершыню Гайдаш раззлавала Захара, і ён аблаяў яе. Ёй, маўляў, не румзаць трэба, а параненага ратаваць, надзею яму даваць, бадзёрыць. Хай сабе і безвыходнасць — бадзёрыць усё роўна!

У куточках яе вачэй зіхацелі бліскучыя слязінкі — па адной кропельцы ў кожным — і кропелькі гэтыя былі зыркія, як расінкі, і марудна выкатваліся на веі. Гайдаш пайшла да сасонніку, дзе ляжаў паранены Балаш, і Захар глядзеў ёй услед з ярасцю. Каго ўрачом у атрад узялі? Дзяўчо горкае! Ён тады, помніцца, і на Чагіна заззлаваў. І хтосьці, нячутна наблізіўшыся, параіў,— Яштокін ці Юрша? — што, маўляў, на яе не трэба крычаць, яна тады губляецца. І Захар не ўзарваўся, але ярасць у сабе не падавіў: хай, маўляў, у дзіцячы сад ідзе, там — ласкавейшыя...

Захар на міг адкрыў вочы, а потым зноў зmружыў, і памяць зноў вярнула яму пошум жытнёвых каласоў. Але ўжо не на тым полі, а ля ўзмежка, дзе Гайдаш у сне галубіла яго. Дзіўна: сон жа, мроя! І колькі часу сплыло! А вось жыве ў памяці. Цяпер Гайдаш няма побач, яна далёка і з кожнай хвілінаю будзе ўсё далей і далей, і яму ўжо неяк шкада, што ён пагадзіўся адпусціць яе з калонаю. Не дужа ж загаілася ў яе рука. Дык жа ж утаіла, не прызналася — толькі ўчора ад Чаславы Захар дачуўся

пра тое. А Лавягін, аказваецца, ведаў. Але ж вось не запярэчыў, нават патрабаваў, каб менавіта яна, Гайдаш, ішла з калонаю ў групе суправаджэння. Чым жа яна перакanaла Лавягіна? Але ж перакапала! І самае дзіўнае, бадай, не гэта. Дзіўна, што яго, Захара, і цяпер тое непакоіць. А што абыходзіла тады ж адразу і папытаць Лавягіна? Дык жа ж не, не папытаў! Чаму? А што, хіба не ведаеш? Ведаеш, дружа! Ты ж сумысля не папытаў, баяўся! Баяўся, што Гайдаш застанецца ў атрадзе!..

Зноў нейкі глухі пошчак, як прыдушаны стогн, пачуўся ўнізе пад узвалам, і Захар адкрыў вочы. Чэзне, сплывае з сярэдзіны Дзвіны белы туман, усё выразней акрэсліваецца лес на супрацьлеглым беразе. Мякка, але трывожна шамаціць пад ветрам вярбняк. Зноў нешта глуха хруснула ўнізе, пад лёдавай тоўшчай.

Гусараў, ціха пакашліваючы, прамовіў:

— Шкадую... Кха-кха... Шкадую.

Захар моўчкі чакаў.

— Шкадую, што мала ведаў Лавягіных да вайны,— скончыў сваю думку Гусараў.— Ён, калі не памыляюся, па ліцейна-механічным працаваў...

Захар з адчуваннем раптоўнай, але знаёмай падзякі Гусараву пацвердзіў:

— Так, на ліцейна-механічным. Бацька Міроніху — суседзі ж былі і штодня бачыліся — паважаў: ціхамірная, працавітая. А Мірона — не вельмі. Мірон на заводзе ані з кім не спрачаўся, слова наўпярок не казаў. А перад начальствам — травіцаю клаўся: «Правільна вы гаворыце, слушна вы гаворыце і раіцё слушна...» Бацька казаў, што на заводзе яго гэтак і звалі — травіцаю...

— Блага вы ведалі сваіх людзей.

Гусараў змоўк, нібыта чакаў пярэчанняў, і Захару падалося, што гэтае «блага вы ведалі» тычыцца толькі яго, Захара, што папрок адрасаваны яму асабіста. Але жадання спрачацца, нешта даводзіць не ўзнікала: папрок вымагаў роздуму, аналізу. З Гусаравым нельга спрачацца дзеля таго, каб паспрачацца. Трэба ведаць, што хаваецца за яго цікаўнасцю да асобы Гайдаш? А нешта ж хаваецца — сумненняў тут няма. Але ж паспрабуй здагадайся! А ты не спяшайся, спачатку прааналізуй кожны свой крок, сваё стаўленне да Гайдаш — тут, відаць, і хаваецца тое, што жывіць гэтую цікаўнасць Гусарава. Гайдаш сама кінула табе выратавальны круг — яна патрабавала адправіць яе з калонаю. Рашэнне Гайдаш ісці з калонаю, якую вядзе

за лінію фронту Лавягін, было нечаканым паратункам, збаўленнем ад згрызоты, што змучыла цябе: Гайдаш будзе далёка, ты не будзеш з ёю сустракацца, і табе будзе лягчэй глядзець людзям у вочы. Гайдаш, відаць, гэта добра разумела. Зразумела яна і тое, што ты яе ненавідзіш. Памятаеш, як ты застудзіўся пасля лёдавай купелі летась, калі Кандрат выцягнуў цябе з праломкі? Тады, у зямлянцы, пасля бою на ўзлеску, яна перавязвала табе шыю другі раз... Не, гэта ўжо на ранку было — яна бінты табе памяняла, руку на патыліцы затрымала, як бы збіралася пагладзіць галаву. А ты гыркнуў на яе, адкінуў руку... А потым узяў яе, тую руку, і пацалаваў...

Магчыма, Гусараў ведае аб усім.

Ды, уласна кажучы, не гэта цябе, дружа, мучыць. І згрызоты ніякай у цябе няма. І ўхіляешся ты ад роспытаў Гусарава зусім не таму, што табе няёмка гаварыць пра Гайдаш. Ты проста ўстрывожаны яе лёсам. Калі яна была побач, табе здавалася, што яна замінае табе ва ўсім, замінае быць да ўсіх строгім, патрабавальным, адчуваць сябе маральна чыстым. Цяпер жа, калі яна далёка, ты пачаў трывожыцца, ты не хочаш дараваць сабе тую паспешлівасць, з якою імкнуўся выправадзіць яе з атрада. Таму і роспытаў гусараўскіх баішся, прагна ўслухоўваешся ў пошум лазнякоў і з трывогай углядаешся ў перадранішні змрок, што завіс над разбухлым, крохкім і рудым ільдом на Дзвіне.

— А ў Лавягіна, між іншым, прыгожы голас,— сказаў Гусараў.— Учора ён, дарэчы, вельмі добра спяваў. Я нават падзівіўся...

— Песня гаспадыняю была ў лавягінскай хаце. Калі, было, завядуць з Кларaю — любата слухаць. Тут нават Ціхан мякчэў, а ён да Мірона, скажу шчыра, не надта ставіўся... Да Клары, праўда, адносіўся памяркоўна. А каго любіў, дык гэта — Рыму. Лічыў, што вялікія ў яе здольнасці да вучобы. Гэтак, праўда, яно і атрымалася: радыстка яна першакласная.

Гусараў кінуў з асуджэннем:

— І вяселле ты ёй грукнуў першакласнае.

— Яна мяне на слове злавіла,— прызнаўся ён Гусараву ўпершыню.— А слова — не верабейка. Ды і не ў маіх правілах назад вярнуць, не выканаць тое, што паабяцаў.

— Ву-унь яно што! Ты, значыцца, ім усё загадзя распланаваў і абяцаў нават! Калі ж ты гэта абяцаў?

— Летась. Калі яны з тоїі пасткі на хутары выбавіліся

і з Артурам сустрэліся — я ім вяселле паабяцаў: жартам, ведама, сказаў. А яны — на сур'ёз павярнулі.

— Гэта ж, цябе ў прыклад паставіўшы, Багдан таксама жартаваць узяўся!

— Багдан — гэта ўжо зусім іншая песня. Сумная.

— На вяселлі, значыцца, толькі вясёлыя спявалі?

— Ды не, розныя былі.

— Я вось пагляджу, з якою песняю ты пачнеш хлябтаць кашку, што заварыў. Жартачкі яму ўсё. А тут не жартаваць, а галавой на ўсе бакі трэба было пакруціць.

— Тады як думалася? Праз год вайне рогі скруцім. Хай, маўляў, гудзе вяселле. Сам, маўляў, вам вяселле арганізую. Пры людзях гаварылася, урачыста: праз год, значыцца, вяселле гонім. Вось і давялося...

Захару рабілася непамысна. Падобна, узяўся апраўдвацца. А сам жа даўно сказаў сабе: апраўдвацца ён не будзе. І галоўнае не ў тым, што ён абяцаў Рыме вяселле. Артур з Рымаю прыйшлі і сказалі: павіншуйце нас, дзядзька Захар, мы, маўляў, муж і жонка. Што было рабіць? Лаяцца? Тупаць нагамі? Забараняць?.. Гэткім радасным бляскам свяціліся іх твары, гэтулькі спадзявання было ў іх вачах — спадзявання на тое, што ён іх зразумее,— што Захар адступіў, утаймаваў свой гнеў, а потым шчыра, з бацькоўскай радасцю пацалаваў і Рыму і Артура. І яго, Захара, сумленне чыстае, у першую чаргу — перад Пахомам: ён, Захар, будзе Артуру за роднага бацьку. І калі нават гэта не браць пад увагу, ён ніколі не папракне сябе за тое, што не зразумеў Пахомавага сына, не працягнуў руку дапамогі, спачування, надзеі. Не, ніякай памылкі з вяселлем Захар не дапусціў! І зроблена ўсё правільна, законна! І хай Гусараў не разумее — а, мяркуючы па ўсім, гэта і адбываецца! — яго, Захара. Ціхан зразумее. Хаця слабая спадзяванка і тут таксама. Гусараў жа табе сказаў, намякнуў адразу ж, як толькі прыехаў, і намякнуў яшчэ і ўчора, што Ціхан незадаволены размахам «сямейнасці ў атрадзе» і дужа абураны нават. Але гэта «абураны» тычылася ўжо не вяселля, а Багданавай скаргі. Чытаў, нібыта, Ціхан тую скаргу Багдана і абурыўся. Але ж ты і сам абураўся, калі пабачыў тую скаргу. От жа чалавек, гэты Багдан! Усё з ім абмеркавалі, аб усім, здаецца, дамовіліся. І вось маеш: цішком — скаргу Ціхану. І змудрыўся ж перадаць, спрытнюга. А можа, ён з Гусаравым яе і перадаў Ціхану?.. А цяпер Гусараў робіць выгляд, што ён стаіць у баку ад гэтай гісторыі. Ды, зрэшты, не гэта важ-

па. Калі зірнуць на ўсё збоку, гаварыць па шчырасці, дык і сапраўды ж існуе гэтая «сямейнасць», як піша ў рэзалюцыі на Багданавай заяве Ціхан. Артуру з Рымай — вяселле. А яму, Багдану, што раяць? Нават у адной роце з законнай жонкаю не дазволілі знаходзіцца — па розных ротах раскідалі. Але ж у гэтай іх справе сам чорт рогі зломіць. У Багдана жонка да вайны была? Была. Шлюб той не скасаваны? Не скасаваны. Потым у яго другая жонка аб'явілася — Маўджуда, і яна прасіла, каб быць ім у адной роце. І Багдан на тым настойваў, як яна казала. Потым у хамут Багдан ударыў: з Маўджудой у іх нейкае непаразуменне — да Чаславы зноў хінецца. Што ж яму, камандзіру атрада, рабіць? Мірыць іх? Улагоджваць, пераконваць?.. Ёсць камандзіры рот — хай гэтым і займаюцца. Ды каб жа толькі гэтыя са сваімі праблемамі — у кожным узводзе дзесятак партызанаў знойдуцца, у якіх сем'і ў суседніх вёсках. Сямейныя ўзводы ствараць? Уночы — дома, удзень — у атрадзе. Смешна ж! Але гэтая «сямейнасць», як піша Ціхан, ёсць, і яе гэтак проста не закрэсліш.

— А як Лавягін паводзіў сябе на вяселлі? — спытаў Гусараў, і запытанне гэтае Захара здзівіла.

— Усё па плячы Артура ляпаў: не крыўдуеш, маўляў, цяперака на мяне, зяцёк? Ён яшчэ да вайны яго сваім зяцем лічыў, жартаваў часцяком, што пакуль Артур вышэйшай адукацыі не атрымае, ён яму Рыму не аддасць.

— Гэтак нават!

— Ён у любым выпадку пажартаваць любіць. Весялун.

Гусараў мякка запярэчыў:

— А я прыкмеціў: весялосць гэтая ягоная — маска. Па натуры ён чалавек сціплы, сарамлівы. І баіцца, каб гэтага не заўважылі. Травіца — гэта, мабыць, дакладнае вызначэнне...

Гусараў углядаўся ў супрацьлеглы бераг Дзвіны насцярожана, быццам прыкмеціў там нешта падазронае. Потым прамовіў падкрэслена сур'ёзна і строга:

— У тваіх дакладных — падумалася мне зараз гэта — мала пра тое напісана...

Захар перапытаў:

— Пра што мала напісана?

— Пра настрой, лічу, мала напісана. Адны баявыя справы: зброя, трафеі, дыверсіі... А які маральны настрой людзей? Што ў іхніх сэрцах — паспрабуй, даведайся з той дакладной. На гэта ж там, у Штабе, цяпер уважна глядзяць. Чым дыхае кожны — важна...

Захар, намагаючыся аднавіць у памяці змест дакладной запіскі, якую яны складалі з Юршам, на тым тыдні, нажартаваў:

— У аспоўным — павстрам. Павстрам вайны,— і па тым, як засоп Гусараў, зразумеў, што жарт яго не ўхвалены, і паспяшаўся паправіцца: — Баявыя справы нашы пра тое гавораць, хто і чым дыхае. І досыць перакапаўча гавораць!

— Ніхто не аспрэчвае вашы баявыя справы. Але ж роты цяпер раскіданы. Кожная — як атрад самастойны. Ты думаеш, што гэтая арганізацыйная пературбацыя не мае свайго ўплыву на людзей, на іх настрой?

— Мае. Сам бачу.

— Добра, калі бачыш. І таму раю выдзяляць у кожнай справаздачы спецыяльным раздзелам: настрой людзей, палітыка-маральны стан у ротах, ва ўзводах... Якраз у святле Пастановы яно і пойдзе. І пісаць аб тым шырока, грунтоўна...

Захар не хацеў пярэчыць. Сказаў, аднак, наўпярок волі, але дабрадушна, не сярдуючы:

— Занадта розпай пісаніны разводзім. Даведкі, справаздачы, цыркуляры... Мой штаб ужо стогне.

— Значыцца, узмацніць, як патрабуе Пастанова Пленума, палітыка-масавую работу не лішне і ў тваім штабе,— сказаў Гусараў з націскам на слове «тваім»,— і дужа сур'ёзна, амаль строга дадаў па-новаму цвёрдым голасам:— І дзейнасць партыйных арганізацый на тое нацэліць — палітычна-маральны стан людзей. Улічы, што цяпер, калі партарганізацыі ў ротах самастойныя, іх роля ўзвышаецца.

— У мяне па гэтай часці Важнік усё ўлічвае. Ён — сакратар. Ён і ўлічвае...

— Гаворыш, быццам пра Пастанову Пленума і не чуў.

Гусараў пацёр указальным пальцам верхнюю губу, што рабіў заўжды, калі пачынаў сердаваць, і Захар, прыкмеціўшы гэта, паспяшаўся ўдакладніць сваю думку:

— Пастанову Пленума мы вывучаем. І захады робім, каб выканаць належным чынам... З Важнікам мы ўсё абмеркавалі. Сходы, перакананы, пройдуць добра.

— А пасланцоў на камсамольскую канферэнцыю рыхтуеш? Ці на Важніка ўсю работку спіхнуў?

— Дэлегаты выбраны. Адправім у тэрмін.

— Ты ўлічы, Ціхан Елісеевіч, ведаю, гэтым пытаннем вельмі цікавіцца. Камсамол канферэнцыю праводзіць!

Уяўляеш сабе рэзананс? Адразу — у зводку Саўінфармбюро!

— Не зводка галоўнае.

— Безумоўна. Але я інакш не магу, каб не выканаць добрасумленна ўсё тое, што мне даручаюць. Таму і правяраю, і цікаўлюся. Хто з вашых на канферэнцыі выступае? Тэзісы іх выступленняў ты глядзеў?

— А як жа!

Захар не бачыў ніякіх тых тэзісаў выступленняў і не лічыў, што яны ўвогуле патрэбны. Але ўедлівая дапытлівасць Гусарава пачала яго раздражняць, і ён схлусіў, у думках, аднак, вырашыўшы, што Юрцу пра гэтую гаворку трэба будзе расказаць неадкладна і прасачыць, каб тоў прыняў адпаведныя захады: Гусараў, відаць, не адчэпіцца, пакуль не пабачыць тыя тэзісы.

— Едзем да лесу,— прапанаваў Гусараў і, павярнуўшыся ў бок узвалу, гукнуў: — Клубіч! Коней давай! — і тут жа сваю гэтую паспешлівасць патлумачыў: — Днее ўжо. Лепей пачакаем на ўзлеску.

— Зараз. Хай на дарогу выведзе...

— Клубіч! На дарогу кіруй. Мы ідзём...

Па крохкай пясчанай сцежцы яны выбіліся на травяністую дарогу, што вяла ў бок лесу. Клубіч з коньмі ўжо чакаў іх. У ручаі, сярод вязаў і чаромхі, панавала рэдкая шэрань, тут жа, на полі, амаль як удзень, усё было заліта белаватым і дрогкім святлом. Змучаны бессанню твар Гусарава выдаваў у гэтым святле зблеклым, нібыта старэчым, дужа зморанм, і Захару зрабілася няёмка за тое, што размаўляў няўдаўна, на беразе, незадаволеным і пакрыўджаным тонам. Дарэмна ён гэтак рабіў: хапае клопату Гусараву. На ім жа — у першую чаргу, безумоўна, на ім! — ляжыць уся адказнасць за пераправу калоны за Дзвіну і чыгунку. І на ім жа ляжыць галоўная адказнасць і за партыйныя сходы, і за поспех камсамольскай канферэнцыі, якая плануецца на ліпень. Захару што абыходзіць? Ён — баявы камандзір. Загад камандавання — закон. І ён, Захар, загад гэты атрымаўшы, выканаў яго добрасумленна: калону за Дзвіну пераправіў, і яна ўжо за чыгункаю, і Калечыц вяртаецца назад недзе. Здавалася б, што цяпер, калі загад выкананы, ён можа быць спакойны. Але ж дзе тоў спакой? Няма спакою, і ён увесь час думае пра лёс людзей, якія тэпаюць недзе па той бок Дзвіны, за чыгункаю. Няма сёння спакою, не будзе і заўтра. Заўтра, гэтак жа як і сёння, ён будзе непакоіцца за іх лёс — самая ж

вялікая калона пайшла, болей людзей у ёй, чым у першай і другой разам узятых! — бо ніхто не можа гарантаваць, што ўсё добра складзецца ў шляху! І Калечыц, як па тое ліха, недзе прапаў. Магчыма, ля чыгункі напаткала іх якая-небудзь бяда? Але ж ціха ў тым баку было ўвесь час — ні стрэлаў, ні ракет...

Захар азірнуўся. Да белай палосы пасярэдзіне Дзвіны набліжаліся чатыры цёмныя постаці, і ён не стрымаўся ад радаснага воклічу:

— Ідуць! Калечыц, дзякуй богу! Клубіч, давай ім насустрач!

Клубіч пабег пад узвал і знік. Зніклі, наблізіўшыся да берага, і чорныя постаці, і Захар занепакоіўся: як праваліліся некуды людзі. Занепакоіўся і Гусараў, усё часцей пазіраў на неба, якое праяснівалася ўвачавідкі; скрозь наўкола адкрывалася далеч. Гусараў прапанаваў быў рушыць пад узвал. Але пачуліся за лазнякамі галасы, і, крыху пагадзя, паказаліся разведчыкі. Наперадзе крочыў Калечыц.

— Куды вы праваліліся? — спытаў Захар.— Як калона?

— Жывая і здаровая. І тупае недзе ўжо, думаю, з песнямі.

— А чаго гэтак забавіліся?

— Цяжка ісці. Ледзь ногі валачэш — гэтулькі розпай брыды на боты чапляецца. А тут пакуль дошкі схавалі — не кідаць жа іх, каб ляжалі навідавоку. У лазнякі запраторылі — спатрэбяцца.

— Як у хрыста за пазухай жонка будзе за гэткім гаспадаром,— пажартаваў Санько.— Во ўжо некаму падваліць шчасце.

— Не ў хрыста, а ў мяне за пазухаю яна будзе.

— Не вельмі яна там і наседзіцца. Ніжэй сесці захоча.

— А ён і працівіцца не будзе!

Разведчыкі голасна засмяяліся, і Гусараў папярэдзіў незадаволена:

— Цішэй! Цішэй! Не на печы седзіцё!

Захар, адчуваючы, што зараз Санько ляпне нешта і Гусараву — злаваць Гусарава не хацелася,— паспяшаўся апярэдзіць яго:

— Вядзіце людзей на дарогу, Калечыц! На дарогу! Гэтулькі часу згубілі,— і, калі крокі разведчыкаў аціхлі за вербняком, сказаў Гусараву: — Вы таксама рухайцеся.

Я следам за вамі. Толькі зірну, дзе яны дошкі прыхавалі. Каб ведаць.

— Ты ва ўсім гэткі недаверлівы?

— Гаспадарлівы.

— Ну, ну. Дагапяй тады...

Захар абмінуў лазнякі, спусціўся пад узвал, прайшоў усцяж вады — дошак нідзе не было відаць. Потым прыкмеціў жмуты сухой леташняй травы і смецця, зачапіў іх ботам і ўбачыў тарцы дошак. Малайчына Калечыц! Калі ўжо што зробіць — можаш не хваляваццa: перарабляць патрэбы не будзе. Сапраўды, гаспадарлівая натура. А вось Гусараў яго не любіць, і непрыязнасць тая даўно.

Ён узняўся на ўзвал, спыніўся ў вербняку. Прыгадалася жартоўная размова разведчыкаў, і ён усміхнуўся. Вясёлыя людзі! Па вастрыю ж нажа, лічы, штодня ходзяць, а ледзьве надарыцца выпадак і час — жарты сыплюць. А можа, гэтымі жартамі яны і бароняцца, можа, на іх, жартах гэтых, і трымаецца душэўная раўнавага? Відаць, тут таксама дзейнічае той Архімедаў закон «стылісга». Між іншым, «стыліст» дасюль пядобразычліва ставіцца да вяселля, як і Гусараў, якое наладзілі ў атрадзе Рыме з Артурам. На яго думку, дык нельга было, маўляў, рабіць гэта шырока. Злюбіліся? Ну, хай сабе і любяцца цішком, не выстаўляючы гэта перад усімі. Гусараў чамусьці не цікавіўся пакуль што стаўленнем да вяселля Юршы і Яштокіна. А вось тое, як паводзіў сябе Лавягін на вяселлі, яго дужа зацікавіла. Чаму?.. Падобна на тое, што Гусараў ведае кожны твой крок, кожнае тваё слова. Але што магло зацікавіць яго ў паводзінах Лавягіна? Лавягін на вяселлі радаваўся, песні спяваў, польку выстукваў — падлога трэслася. Учора ён з дачкою доўга гутарыў, і з Артурам жартаваў, і потым усё прасіў Захара «паберагчы дзяцей». Захар нават быў ускіпеў: у кішэню, маўляў, ён іх павінен пакласці, ці што? Ускіпеў, бо ў гэтым «паберагчы дзяцей» пачуўся яму пэўны папрок: ён, Захар, паспяшаўся, маўляў, з гэтай сваёй згодаю на вяселле, і таму цяпер на ім, Захару, уся адказнасць за лёс маладых.

Думкі пра вяселле зноў выходзілі на знаёмае кола — Захар з ахвотаю прымаў іх, быццам бараніўся імі ад нечага непрыемнага,— дзівосна ўлагоджвалі, супакойвалі. Хораша ж, аднак, усё і ішло на тым вяселлі! І, галоўнае, яго камандзірскае слова аказалася цвёрдым. Сказаў — зрабіў! Не, самае галоўнае ў іншым. Людзей стамілі гэтыя доўгія і крывавыя гады, і вяселле як бы прыадчыніла дзверы ў

жыццё мірнае, без стрэлаў і смерці, нагадала, што ёсць, існуе свет прыгажосці і кахання, і людзі ўбачылі рэальнасць гэтага свету... Не, яго, Захара, тут нельга папракнуць, калі падыходзіць да вяселля з пункту гледжання шчырага чалавечага пачуцця. Але чаму ж з гэткага ж пункту гледжання ён не глядзіць на Багданавы справы, Маўджуды і Чаславы. Не-е, тут зусім іншае, тут зусім іншы пункт гледжання павінен быць. Значыцца, правільна Гусараў гаворыць, што ён, Захар, павінен сам расхлябтаць кашу, якую завзрыў,— павінен несці адказнасць па партыйнай лініі за тое «купецкае», па словах Ціхана, вяселле? А можа, Ціхан і не ўжываў гэтае вызначэнне, а нарадзілася яно ў галаве Гусарава? Хай сабе, гэта нічога не мяняе, і ён, Захар, гатовы несці самую строгую адказнасць. Гэта нават і добра, што будзе справа аб вяселлі разгледжана на бюро райкома. Можа, там, на бюро, у гаворцы шчырай і бязлітаснай, ён зразумее нешта такое, чаго не разумее зараз, не можа спасцігнуць сваім розумам вось у гэты міг?.. Няхай сабе... Але ўсё зроблена — і тут Захарава сумленне чыстае! — на законнай падставе: пасведчанне пра шлюб заверана самаробнай пячаткаю атрада, той самай пячаткаю, якою замацоўваюцца партызанскія пасведчанні і баявыя загады. Адно толькі ты не планаваў — салют, які падрыўнікі далі з аўтаматаў. Відаць, праз гэты салют Ціхан і ўзбунтаваўся. Безумоўна, кінуць на вецер два з палова́й — падлічылі ўжо дакладна! — дзесяткі патронаў — злачынства. Людзі рызыкавалі жыццём, везлі тыя патроны на самалёце праз лінію фронту зусім не на тое, каб іх тут у зорнае неба пусцілі. За тую сваю «самадзейнасць» падрыўнікі ўжо атрымалі спагнанне. Можна было б на тым і спыніцца. Не тэма гэта для гаворкі на бюро падпольнага райкома партыі. Але Гусараў намякнуў, што Ціхан настойвае, каб пытанне пра тое «купецкае» вяселле было камуністамі абмеркавана і асуджана і вінаватыя атрымалі па партыйнай лініі тое, што належыць! Няўжо толькі дзеля гэтага і прыслаў ён Гусарава ў атрад? Відаць, і дзеля гэтага таксама. Але навошта варажыць? Можаш папытаць і даведацца...

Двойчы, раз за разам, глуха вухнула ў рацэ, пад узваламі, і вуханне гэтае было не кароткае, як раней, а працяглае, і яно не знікла, не аддалілася, а папаўзло на ўзвал, пакацілася па лазняках, перарастаючы ў пагрозлівы, несупынны гул. Захару падалося, што лес на супрацьлеглым беразе гайдануўся, бераг як зрушыўся і некуды паплыў, і

напльілі макавінкі вербаў, што ўзвышаліся над густымі чырвонымі лазнякамі.

«Дзвіна! Гэта ж лёд зрушыўся!..»

Захар толькі цяпер, угледзеўшы ламаную цёмную стужку, якая пашчапала белую палосу пасярэдзіне ракі, зразумеў, што пачаўся крыгалом, што буры лёдавы панцыр ужо не стаіць на месцы, рухаецца з глухім гулам і шоргатам. Ён саскочыў з узвала, пабег насустрач гэтаму шоргату, стаў ля самай вады, што булькацела, віравала і пенілася ўнізе пад лазнякамі, і раптам адскочыў на крок назад, потым адбегся аж за лазнякі, стаяў, здзіўлены, трымаючыся рукамі за гнуткія галіны. Унізе, з жаўтлявай вады, перакулілася, потым тарчма ўзнялася крыга і напаўзла ўверх, навісаючы над лазнякамі бліпічастым тоўстым клінам; вастрыё гэтага кліна было з аднаго боку брудна-бурае, заляпленае шумавіннем і смеццем, а з другога аж свяцілася люстраным бляскам; вада сцякала па гэтай шліфаванай, залізанай паверхні, і колер яе змяншаўся, святлеў, свінцовыя адценні ў ім знікалі, саступаючы месца блакітным паўкружжам, у якіх трымцелі фіялетавыя плямы. І раптам, як падсечаны знізу, клін гэты нахіліўся, зваліўся на лазнякі, са звонам рассыпаўся на зіхатлівыя льдзінкі, і яны каціліся па лазняках, валіліся ў ваду, і вада віравала, цмокала, выкідвала з глыбі новыя крыгі; маленькія крыгі сутыкаліся з лёдавай тоўшчай, якую сунула, гнала несупынна магутная плынь, крыгі разломваліся, давалі нырца ўглыб, і толькі некаторыя з іх вынырвалі з клёкатам, паўзлі на лазнякі, і новыя крыгі піхалі іх усё далей і далей на ўзвал, і на нейкай мяжы рух гэты супыняўся, крыгі крышыліся, са звонам ляцелі па лазняках у ваду, узнімаючы пену і пырскі.

Новы дзень займаўся імкліва, нібыта нараджаўся з гэтага пагрозлівага гулу, звону падталага лёду, булькацення і цмокання вады і няспыннага руху плыні, якая несцішана і ўпарта перла з вярхоўя бурыя, у расколінах крыгі. Захар адчуў сябе няўтульна і адзінока на гэтым гліністым узвале, абдзьмутым вясновым ветрам, сярод шоргату, гулу і трэску. Яго раптам здзівіла, што пасярэдзіне ракі крыгі амаль цалюткія, падзеленыя на вялізныя квадраты і прамавугольнікі, і сунуцца яны павольна, упарта і спаважна, а ля берага рух ільду імклівы, нейкі мітуслівы, і крыгі ўсё дробныя.

Нечакана нарадзілася думка, якая напалохала: ён, Захар, як слушна сказаў Юрша, дурань! Побач з табою была

маладая істота, якая кахала цябе, не назаляючы сваім каханнем, нічога не патрабуючы. А ты што зрабіў? Чым аддзячыў ёй? Зрабіў усё, каб падалей адкінуць! І ў імя чаго? Чужых позіркаў спалохаўся! Як святым сябе зрабіў! Але ж ты не святы! Ты ніколі не быў ім і не будзеш!

«Гайдаш вернецца! І я нікуды яе не адпушчу з атрада!»

Яшчэ больш абвастрылася скруха, абвастрылася разуменне непапраўнасці страты, да якой ніхто яго не прымушаў, над якой цяпер ён аніякай улады ўжо не меў. Ён стаяў і глядзеў, як ад сярэдзіны ракі, пад вострым вуглом, сунецца на бераг вялізны лёдавы клін, як расціскае на бакі малыя крыгі, топіць іх, адціскае, паўзе, бы сталёвы лядарэз, сярод зыркага, бліскучага месіва. Вось клін успоўз на лазнякі, стаў дыба, пахіснуўся і разваліўся, пакаціўся па лазняках з тонкім шкляным бомканнем.

Захар патрос галавой, яму на міг падалося, што звініць не там, унізе пад лазнякамі, а ў скронях; ён пацёр далонёю галаву, павярнуўся і пайшоў ад ракі, пайшоў, аніводнага разу не азірнуўшыся.

Гусарава Захар дагнаў толькі на ўзлеску. Увесь шлях ад Дзвіны ён гнаў каня рыссю, чакаючы, што зараз ззаду загрукаціць кулямётная чарга. Яму падалося нават, што неба над ім гэткае ж, якое было летась, і ён да болю ў руках сціснуў повад, гатовы ў любы міг саскочыць з сядла на зямлю.

— Дзе ты быў? — гукнуў яму Гусараў незадаволена.— Збіраўся ўжо на пошукі пасылаць.

— Крыгалом! Дзвіна пайшла! Хочаш зірнуць на гэтае відовішча?

— Пасля вайны будзем любавацца. Едзем!

Гусараў тузануў повад, конь пераішоў адразу на рысь, і Захару нічога не заставалася, як зрабіць тое ж самае, і ён падварушыў свайго каня. Тупат коней глух у сыпкім пяску — яны ехалі ўжо лясной дарогаю, што роўна, як страла, лягла ў маладым сасонніку. На маладых светлазялёных, салатнага колеру, пупышках — узыходзіла, схаванае яшчэ лесам, сонца — густа ззяла расяная мярэжка; старыя сосны, воддаль ад дарогі, былі без гэтага зыркага россыпу і змрочна чарнелі. Гэтак жа змрочна і цяжка чарнела спіна Гусарава, які ехаў наперадзе. Ён сядзеў у сядле цвёрда, але непрыгожа. Трымаючы правай рукой повад, левай, закінутай за паясніцу назад, пад ствол аўтамата, падтрымліваў дыск, каб не біў паясніцу, час ад часу

ківаўся, быццам засынаў. У Захара без дай прычыны знікла жаданне, якое прыйшло на Дзвіне і намацнела было на ўзлеску, калі ён убачыў Гусарава,— жаданне шчыра пагаманіць, нават у нечым паспавядацца. Дакладней, прычына была, яна хавалася ў абыякавасці, з якой Гусараў паставіўся да прапановы Захара зірнуць на крыгалом, у яго адчужаным і непрыветным позірку і голасе нядобразычлівым, з пагардаю. Канцылярыст! Вось раптам і быццам пачынаецца нейкая шчырасць, а потым ад позірку, ад слова ўсё разлятаецца, і зусім няма ахвоты даверыць гэтаму чалавеку тое, што ёсць у душы. Ціхан яму, Захару, патрэбен! Толькі Ціхан! Неўзабаве адбудзецца бюро падпольнага райкома партыі, і на ім, паводле слоў Гусарава, Ціхан, магчыма, будзе прысутнічаць. Праўда, Гусараў казаў тое няпэўна,— збіраецца, маўляў, прысутнічаць. Але ж Ціхан яшчэ за фронтам, у партызанскім Штабе. Доўга, думаецца, яго там не затрымаюць. А з бюро можна будзе і нацягнуць крышку. Не гарыць жа!

Захар зноў, як гэта здаралася з ім, з тужлівым болем адчуў, што дужа хоча ўбачыць брата, пачуць яго спакойны і насмешлівы голас. Ёсць у Ціхана гэтая схільнасць гаварыць, часам з насмешлівай павучальнасцю нават аб справах важных, як бы нешта з таго важнага закрэсліваючы. Праўда, у часе апошняй сустрэчы напрадвесні насмешлівасці ў гаворцы Ціхана не было зусім, прыкмячалася нейкая ўстрывожанасць і заклапочанасць. Гэта асабліва кінулася ў вочы, калі яны ездзілі глядзець абарону другой роты. Ціхану акопы спадабаліся. Але была, здаецца, нейкая няпэўнасць у яго словах, нібыта чалавек і сам не верыў у тое, што гаварыў, і гаворачы, імкнуўся сам сябе пераканаць у правільнасці сваіх доказаў. Ціхан тады гаварыў, што рана ці позна вораг паспрабуе зноў узяць у свае рукі гэты важны стратэгічны рубеж — левы бераг Дзвіны. Але гэты рубеж ворагу аддаваць нельга, і аб гэтым сведчыць спецыяльная пастанова Цэнтральнага Камітэта аб далейшым разгортванні тут партызанскага руху. Ціхан тады нездарма казаў, што менавіта тут, на левым беразе Дзвіны, неўзабаве разгорнуцца вялікія падзеі. Меў ён, ведама ж, на ўвазе не толькі гэты трохкутнік, але і ўсё Паддзвінне. Чаго ж ён тады гэтак затрымліваецца, чаго рэдкі госць тут, у захараўскім атрадзе?

— Тпру-р-ру,— устрывожана выгукнуў Гусараў.— Нейкі дым за дрэвамі. Гарыць нешта, здаецца.

— Зараз выскачым на ўзлесак. Адтуль будзе добра відно!

Захар падварушыў каня і першым вылецеў на шырокую пожню, якая пачыналася адразу ж за маладым сасоннікам. Нізкія вольхі і кудлатыя вербалозы, што раслі паабапал ручая, збегліся ў канцы пожні ў шырокую падкову, і пасярэдзіне яе шырэла нізкая драўляная будыніна, з-пад даху якой грывастымі султанамі вывальваўся буры дым; тонкі і руды, як падфарбаваны вохраю, дымок поўз з адчыненага акна, застаўленага бляхай.

Клубіч выехаў з сасонніку ім насустрач, весела прысвіснуў, шумна пацягваючы носам:

— Шлыкава гаспадарка, таварыш камандзір, вас вітае,— і зноў шумна пацягнуў носам, як смакуючы паветра.— Во-одар! Адчуваеце?.. У мяне ажно сліна набегла,— і, павярнуўшыся да Гусарава, пад якім круціўся, не стаяў на месцы конь, патлумачыў: — Вянглярня дымок круціць. Кілбаску гаспадарчы ўзвод вэндзіць. І гэтак робяць — пальчыкі аблыжаш, як Файзуло кажа!

— Першая рота энзэ, як і было загадана, рыхтуе,— удакладніў Захар, незадаволены тым, што Клубіч чакаў іх тут і апярэдзіў яго сваімі тлумачэннямі. Ён не адразу пазнаў гэтую старую будыніну. Адсюль, з маладога сасонніку, ён глядзеў на яе ўпершыню, бо звычайна ездзіў дарогаю, што ішла па той бок ручая. Камандзір атрада! А што робіцца ў зоне — не ведае дакладна! — Шлык, між іншым, аказаўся камандзірам учэпістым,— дадаў Захар і тут жа сцяміў, што надарыўся дужа зручны выпадак паказаць Гусараву гаспадарчыя справы атрада ў выгадным для сябе святле.— Пажога ім не нахваліцца. Але Шлыка мы ў яго забіраем неўзабаве: думаю даручыць гаспадарку ў атрадным маштабе.

— Ён добры арганізатар, гэты Шлык. Я чуў ужо.

— З чысцюткага паветра мукі натрасе,— рагатнуў Клубіч.— І блінец спячэ на вятрыску...

Захар настроіўся быў пахваліцца тым новым, на яго думку, што яны надумалі зрабіць у атрадзе, каб вызваліць баявыя роты ад гаспадарчага клопату, і гэты нечаканы жарт Клубіча быў яму непрыемны.

— Заскочым на хвілінку? — спытаў у Гусарава і, тузануўшы повад, павярнуўся да Клубіча: — Адпраўляйся ў штаб. Далажыш камісару: мы вернемся праз гадзіну. І — адпачывай.

Клубіч казырнуў рукою, у якой быў зацісnуты повад,

па-вайсковаму чотка паўтарыў загад. Ніякай задаволенасці ў голасе Клубіча не было, і ўсё-ткі гэтая яго паспешлівасць пакарабаціла, падалася Захару нетактоўнай, і ён кінуў, як адсякаючы што:

— Выконвайце!

Клубіч адразу, з месца, пагнаў каня галопам, і твар Гусарава расплыўся ва ўсмешцы:

— Дысцыплі-іпка, аднак. Адразу адчуваецца. Не тое што летась было.

Захар, улешчаны, схаваў, аднак, сваю задаволенасць, прамовіў сур'ёзна, як усё роўна нечым дужа заклапочаны, быццам гаварыў не пра дасягнутае, а пра тое, што трэба было яшчэ зрабіць.

— Паваяваць за яе давялося. Важнік некаторых на партыйны сход выцягваў. Але анархію, на якую той-сёй хварэў, мы скасавалі і выкаранілі. Цяпер добра...

— Важнік чалавек прынцыповы.

— Часам, па маю думку, празмерна.

— Ты што маеш на ўвазе?

— Настаўнікаў. Зноў патрабуе вызваліць іх ва ўзводах ад караульнай службы і баявых заданняў. Настаўнік, маўляў, павінен мець час рыхтаваць вучняў да экзаменаў. Гэта, кажа, не школа, калі без экзаменаў.

— Разумна.

— Але ж ён і сам прызнае, што прывілеі не садзейнічаюць дысцыпліне.

— Колькі ёсць? — спытаў Гусараў рэзка і дадаў мякчэй, нібыта нешта адкрываючы для сябе дужа важнае.— Помніцца, ты казаў, што дзевяць настаўнікаў у атрадзе.

— Дакладна. У першай роце — чатыры. У другой — пяць. Заняткі з дзецьмі па вёсках праводзіць кожны з іх.

— Вось на кожнага неадкладна рыхтуй лісты на ўзнагароды.

— На ўсіх?

— На ўсіх! Вызваляй кожнага ад караульнай — хай займаюцца школьным клопатам. І кожнага — на ордэн абавязкова!

Захар прамовіў недаверліва:

— За ўсё сваё партызанства я не атрымліваў гэтулькі дырэктыў узнагароджваць людзей, колькі атрымаў іх сёння.

— Раней не да гэтага было. Сам ведаеш... І скажу табе па шчырасці: у іншых атрадах актыўнасць вялікая па ордэнскім напрамку.

— Гэта я ведаю,— Захар ганарліва трахнуў галавой.— А мы ў іншым напрамку актыўнічаем — у баявым!

Сказаў і з балючай прыкрасцю пашкадаваў, што не вытрымаў спакойны тон да канца. У яго, Захара, ужо аднойчы была падобная гаворка з Юршам, і цяпер яму падалося, што Гусараў пяе з таго, знаёмага Захару, голасу. Але тады Юрша, здаецца, зразумеў, чаму ён, Захар, гэтак строга ставіцца да кожнай узнагароды. Пачнеш раздорваць узнагароды налева і направа, дык і на Ціхана цень пакладзецца, у сваяцтве папракнуць: брат брату, маўляў, ордэнаў не шкадуе.

— Гаворыш ты ўсё слушна,— пагадзіўся Гусараў.— Але ж трэба — паўтараю, бачыш, чужыя думкі! — і на сваёй зямельцы знаходзіць і заўважаць прарокаў.

— Наш ордэн у некаторых, відаць, на два пацягнуў бы.

— На два ордэны баявыя справы людзей цягнуць? Два і давай! Сувораўскі, улічы, гэта запавет.

— Добра, улічым...

Захар паабяцаў гэта стрымана, злавіўшы ў гусараўскім тоне нейкую як бы адчужанасць і раздражнёнасць. І тут жа папракнуў сябе: не рабі ты гэткія паспешлівыя вывады пра чалавека, з якім размаўляеш. Але тут жа нагадаў, як Гусараў раіў яму ўзнагародзіць Лавягіна, як уедліва распытваў аб усім. Нагадалася і тое, як Гусараў бурна гаварыў пра нешта з Лавягіным на беразе Дзвіны, як бы спрачаўся, а, убачыўшы Захара, адразу змоўк. Ажыла крыўда, якую выклікала тая таемнасць, і думка пра раздражнёнасць Гусарава акрэслілася ў Захара зусім выразна: дарэмна ён папракае сябе. Сапраўды, Гусараў учора і сёння нейкі з'едлівы, як бы ўсё яго тут раздражняе. Гусараў, значыцца, раздражнёны, ты лічыш. А сам? Чаго ж ты чэпішся да кожнай заўвагі, да кожнага слова?.. Лепей прыгадай, як Гусараў клапаціўся аб табе ў той дзень, калі да цябе прыйшла бяда з горада, і як клапаціўся аб табе штодня, як па-сяброўску імкнуўся ўберагчы ад трывогі і роспачы! А ты — крыўдуеш! І крыўдаваць быў узяўся на Лавягіна за тое, што той не схацеў, каб ты чуў яго гаворку з Гусаравым. А Лавягін, як табе вядома, і не абавязаны гаварыць пра ўсе дэталі свайго задання, і сакрэты, напэўна ж, ёсць у яго: ён цяпер супрацоўнік Камітэта дзяржаўнай бяспекі. А Гусараў — работнік абкома партыі — могуць яны паміж сабою гаварыць пра нешта такое, што ведаць табе, магчыма, і не зусім абавязкова. І ўвогуле, на Гусарава ты дарэмна скоса пазіраеш: слуш-

па ён табе гаворыць і пра ўзнагароды. З боку калі зірнуць, дык сапраўды ствараецца ўражанне, што ён, Захар, не вельмі такі імкнецца людзей свайго атрада ўзнагароджваць. «Я па справядлівасці хачу рабіць, каб узнагарода сапраўды была заслужаная». Дык гэта ж ясна, як белы дзень! Але ж ці ўсе людзі ў атрадзе, якія ваююць сапраўды па-геройску, адзначаны ўрадавымі ўзнагародамі?.. Тыя ж падрыўнікі, скажам. Колькі яны толу з мін і снарадаў выплавілі! Колькі ўдалых дыверсій правялі! А хто ўзнагароджаны? Зімніцкі ды Санько, якія нядаўна злаўчыліся і ўдзень узарвалі эшалон. А хіба не заслугоўвае кожны ў групе ўзнагароды? І ў першую чаргу,— Артур! А ты яго быццам знарок у цень адсунуў — сваяк, маўляў, пляёмка ў першую чаргу ўзнагароджваць. Праўда, адважыўся, на тым тыдні і на яго надпісаў дакументы. Але, мабыць, Гусараву яны на вока не трапілі. Даведаецца — зноў вэрхал: за ўдалае, маўляў, вяселле яго на ордэн ставіш! Але ж вайна для ўсіх роўная, смерць да кожнага з аднэй меркаю падыходзіць, адным вокам глядзіць. А ў цябе атрымліваецца, што кожнаму — свая мерка. Багдан, прынамсі, на гэта і ціспе: адным, маўляў, выгоды, як вада ліюцца, а яму, гаротніку,— толькі адны строгасці. Ну, з Багданам усё прасцей. Хаця, дзе ж прасцей! Маўджуда ўсё скардзілася, каб у адной роце быць. Цяпер, калі Маўджуды няма ў атрадзе, ён Яштокіну спакою не дае: перавядзі ў другую роту, хоць трэсні. А Маўджуда вернецца — зноў назад, у першую папросіцца? Хаця, наўрад ці вернецца — як растала другая калона... А які лёс у гэтай, трэцяй, з якой пайшла Гайдаш? Гайдаш... Нешта сёння замнога, дужа замнога ты пра яе думаеш. Радавацца ж быў пачаў, што пайшла з атрада. А цяпер вось адно і робіш, што сэрца сабе кроіш...

— А сапраўды, смачны пах,— сказаў Гусараў, чмыхаючы носам.— Нават у жываце запыла.

— Зараз Шлык пачастуе нас вяндлінкаю.

За драўлянай будынінай вянглярні, ахутанай дымам, над старымі разгалістымі вязамі, што раслі між вербняку і маладых клёнаў, стаялі дзве шчыльна пастаўленыя фурманкі. На адной з іх ляжалі пярэстыя, налапленыя мяхі, а на другой, што была пад самымі вязамі, жаўцела навюткімі дошкамі прадаўгаватая скрыня, агорнутая саломай, і ля яе завіхаўся, нечага пэратрэсваў салому Шлык. Белая кабыла, што пасвілася непадалёк за клёнамі, затрэсла жаўтлявай грывою, заржала. Шлык ускінуў галаву, адступіў ад фурманкі, пазнаў, здаецца, хто едзе, але не пабег насу-

страч, і Захар не спяшаўся вітацца з ім. Саскочыўшы на зямлю, ён пачакаў, пакуль злез з каня Гусараў, і толькі тады парукаўся са Шлыкам.

— Гэткі водар гоніць твая дымарня, што чуваць і ля Дзвіны,— пажартаваў ён.— Мы шчэ ля ракі пачулі. На водарконей і гналі.

— Дзякую, што завярнулі, таварыш камандзір,— і Шлык, абцёршы рукі доўгай апучаю, абмахнуў сю і твар, увесь у гэткіх жа рудых тлустых плямах, што былі на тыльным баку далоні.— Мне — радасць...

— Будзе табе радасці, калі зараз з таварышам Гусаравым галодныя, як ваўкі, навалімся на вяндлінку!

— Вяндлінкі, на жаль, яшчэ не маем. А свежай кілбаскаю — пачастую.

— Якраз жа і едзем нашча,— сказаў Гусараў.

Шлык таропка абціраў рукі апучаю:

— Але адсюль вы нашча ўжо не рушыце. Выбірайце, якое колца вам па душы,— і ён павёў рукою ў бок каротніх драўляных вешалаў пад вязамі; на вешалах тлуста паблісквалі роўныя, адно ў адно, колцы кілбас.

— Во-о-о, адкуль гэты во-одар,— працягнуў Захар.— А ў дымарні што?

— Новая закладка. І два пуды — на вяндлінку.

— Вы хіба адзін і ўпраўляецеся? — спытаў Гусараў.

— Не-е, людзі мае там,— Шлык махнуў рукою ў бок лесу.— Сякуць ядловец. Ядлоўцавы дымок дамо перад канцом. Ад ядлоўцу — асноўны смак. І харч даўжэй не псуецца...

Са скрыні на фурманцы Шлык выцягнуў колца кілбасы, дастаў з-пад саломы бохан хлеба, адкроіў і паклаў упобачкі дзве вялікія і адну малую лусту. Потым перавярнуў нажом колца кілбасы, прымерваўся, як лацвей пакроіць, і рашуча пасек на пяць роўных частак.

— Гэткая ж, як і там? — спытаў Захар і кавалкам кілбасы, якую паклаў на лусту хлеба, торкнуў ў бок вешалаў пад вязамі.

— З той жа закладкі гэтая. Толькі блізка да агню вісела, трэснула ля завязкі. А на вешалах — першы гатунак: адно пад адно колцы.

— Першага гатунку нам, значыцца, не даюць,— і Захар кіўнуў галавою ў бок вешалаў.

— Гэтая мякчэйшая. Лепшая. Але можна і адтуль, як хочаце, калі ласка...

Захар ледзь паспеў прытрымаць Шлыка за рукаў, калі

тоїі памкнуўся быў да вязаў, з яўным намерам нічога не шкадаваць. Твар у Шлыка быў накрыўджаны.

— Ды гэта ж у жарт гаворыцца, дарагі мой! Ты малайчына, па-гаспадарску ўсё робіш... І кілбаска — найпершы гатунак...

— Трошачку, можа, саленаватая,— памяркоўна, быццам сам-насам, прамовіў Гусараў.

Шлык таропка, як не давячыся, дажаваў хлеб і, прыціскаючы да грудзей, адкроіў яшчэ дзве лусты і запярэчыў хутка, быццам наважыўся адразу і ва ўсім перакапаць Гусарава:

— Іначаї — няможна. Энэо ж гэта! А яму ў рэчмяшках давядзецца ляжаць ніхто ж не ведае колькі. Мы яе падвялім на вятрыску дзень-другі, каб толькі не дождж. А тады — хоць у кішэню кладзі: і лёгка, і надзейна, і смачна. Праўда, солі багата трацім. Але ж не па сваёй ахвоце даводзіцца ў вяроўку лезці...

Гусараў, марудна жуючы кілбасу з хлебам, з прытоенай усмешкаю прыглядаўся да Шлыка, потым спытаў лагодна:

— Ведаеце, што прыгадаў?.. Як вы перад вайною радыё сабе выбівалі.

— Няўжо памятаеце?

— Ага! Вэрхал на сто працэнтаў — увесь абком ведаў. Начальства мне тады пытлю дало — скаргу працоўнага чалавека замарынаваў! Мо цяпер якія скаргі ё? Праца, можа, гэтая чорная не па душы?

— Праца не бывае чорнаї. Праца чалавеку заўсёды светлая, калі ён разумее, навошта яна робіцца.

Гусараў прамовіў ухвальна, але з адценнем жартаўлівасці:

— Таму кілбаска ў вас і атрымліваецца — першы гатунак. Але, калі па шчырасці, у баявы ўзвод хочацца ж?

Шлык паглядзеў на Захара, быццам хацеў атрымаць у яго дазвол гаварыць шчыра. Відаць, выраз Захаравага твару яму нічога не сказаў, і ён, павагаўшыся, прамовіў з развагаю:

— Усе цяпер пнуцца страляць, узрываць, надпальваць — ніхто не гнецца да гэтай дымарні. І я іх разумею. Праўда, узрываць, надпальваць ды страляць — не лягчэй. Але ж — у героях затое. Ля гэтай жа дымарні стоячы ў вялікія героі не выскачыш!

— А ў мяне на гэты конт зусім іншая думка,— сказаў Гусараў і выразна зыркнуў на Захара.— Праца гаспадар-

чага ўзвода — роўная баявой. А, часам, і вышэй, калі хочаце ведаць.

— Не ўсе ж гэта разумеюць, таварыш Гусараў.

— Можа, не ўсе. Але камандаванне атрада — разумее!

Гусараў зноў выразна зірнуў на Захара, і Захар зразумеў, што ад яго чакаюць пэўнай і неадкладнай рэакцыі па Шлыкавы словы, і сказаў таропка, намякаючы Шлыку, каб ён паменей тут плакаўся:

— Без гаспадарчага ўзвода мы як без рук. На пусты жывот, як Райнека наш кажа, берлінскага гада не адолееш. І таму добрую працу нашых гаспадарнікаў мы высока ставім.

— Ставіць — адно. Трэба ўзнімаць на вышыню. І — узнагароджваць.

— Заўтра вам дакументы і ўручым,— з выклікам прамовіў Захар.

— Аберуч буду надпісваць!

Раніішнюю цішыню распаролі далёкія — недзе ў бок Дзвіны — глухаватыя, ледзь чутныя, аўтаматныя чэргі. Забухалі адзіночныя, рэдкія вінтовачныя стрэлы. Потым усё аціхла, і крыху пагадзя, упарта, быццам забіваючы непадатныя цвікі, задудукаў буйнакаліберны кулямёт: «ду-ду-ду-ду...»

З лесу, полем, два партызаны цягнулі кустоўе ядлоўцу. Пачуўшы страляніну, спыніліся і, не выпускаючы веццяз рук, знерухомелі, прыслухаліся. На даляглядзе вісела аблачынка, закрываў дымны шлейф ад дымарні. Захару падалося, што і гэтая аблачынка і шлейф рудога дыму ўздрыгваюць ад страляніны. Потым дым неяк раптоўна счарнеў, паваліў густа і затрымцеў, быццам, яшчэ больш. Захар разумеў, што гэта падман зроку, што гэта трымцяць яго вeі, але ніяк не мог саўладаць з унутраным холадам, які імгненна выстудзіў грудзі. Гэта ж, прыкладна, у тым баку, дзе стаяў ён нядаўна на беразе Дзвіны.

«А можа, калона? Не, калона ўжо далёка...»

Захар ажно напацеў ад унутранай патугі, з якой пачаў гнаць ад сябе гэтыя думкі. Ён слухаў глухое дудуканне буйнакаліберпага кулямёта, якое цяпер толькі і было чутно, і таропка, быццам позначыся некуды, жаваў хлеб з кілбасою, жаваў, як мякіну, адразу страціўшы смак.

«А што, калі калона? Павярнула і назад прабіваецца...»

Салёным камяком асеў пад нёбам недажаваны хлеб, ён пух, распіраў рот. Чорны дым, што адносіла ветрам ад дымарні, як бы павярнула назад, і Захару зрабілася цяжка

дыхаць, ён як захліпнуўся. Але тут жа і пасвятлела ўсё наўкола, і толькі трымцела перад вачыма рудая імгла.

Сціх на момант і зноў задудукаў буйнакаліберны кулямёт, але цяпер крыху лявей, у бок ручая, дзе вісеў над вольхамі грывасты чорны дым, што па-ранейшаму густа валіў з-пад страхі старой будыніны, і Захар зноў, як праз зыбкую тканку, убачыў трымценне тых султанаў дыму над пожняй, і яму здалося, што ён бачыць тое, чаго ніколі не бачыў на свае ўласныя вочы — спавітую барвова-чорнымі кудламі, знаёмую з маленства бацькаву хату, у якой гараць яго жонка і дзеці...

## 19

У кабіне грузавіка было горача ад матора, дымна, і Кандрат, змакрэлы ад кароткай бойкі з Трапашкам, усё яшчэ ашаломлены і разгублены, намацаўшы рукою гладкую жалезную ручку, пакруціў яе, апускаючы бакавое шкло; плячо ад Трапашкавага ўдару пачало балець мацней, але Кандрат перасіліў боль, дакруціў ручку да канца, употай лаючыся.

«Гэтак сadanуў, д'ябал, у плячо парабелумам! А каб вышэй пацэліў, у скіўіцу? Забіў бы, гад!..»

Ранішняе паветра ўварвалася халаднаватым струменем, стала адразу лёгка дыхаць; адпусціў крыху боль у плячы. І гэтак жа імкліва злосная споведзь і дзёрзкая прапанова Трапашкі збегліся ў Кандратавай галаве ў адно кароткае і жахлівае сваім зместам слова: пастка. Старанна прадуманая, хітра і лоўка падрыхтаваная пастка! І ён, Кандрат, уляцеў у яе надзейна, трывала, і выдрацца яму ўжо, відаць, не суджана. Трэба верыць у рэальнасць таго, што сказаў Трапашка. Ён, Кандрат, гэтулькі часу шукае здрадніка, які выдаў фашыстам Балаша... А шукаць, выяўляецца, не было патрэбы: здраднік, аказваецца, сядзеў у яго ўласнай хаце; ён, Кандрат, сам выгадаваў яго, любіў, лічыў апірышчам у жыцці, ганарыўся... Вось як, вось чым вянчаецца жыццё на гэтай зямлі: родны сын выдаў партызана фашыстам...

Разумеў, што пачуў праўду.

Разумеў, але не верыў.

Разумеў, што не мае права не верыць, і, разумеючы і гэта, і марнасць свае спробы выдрацца з пасткі, па-ранейшаму шукаў нейкага паратунку, нейкага збавення...

— Дык што ты мне прапаноўваеш? — спытаў Кандрат, ледзь павярнуўшы шархоткі і тоўсты, як з моцнага пахмелля, язык.

— Жыццё. І табе. І сабе. І Багдапку твайму, ведама. Канцы ў ваду — аніводны сабака не будзе ведаць. Партызанам вайну скончыць. Яшчэ, калі хочаш ведаць, і ордэн ухопіць. У яго галава шурупіць. Не тое што старая мазгаўня ў некаторых, імёны не называючы...

— Паўтары, што я павінен рабіць?

Трапашка пацёр шыю левай далонёю, смаргануў расшпілены фрэнч, па твары залупала ўсмешка:

— Гэдак, дзед, трэба было і пачынаць. А ты — за гарляк мяне... Калі рукі занятыя — кашы не зварыш! І калі мазгаўня пустая — пуста ў кацялку будзе. Фарштэен, майн лібэ?

— Не мянці языком. Што, канкрэтна?

Вочы Трапашкі звузіліся, ён зыркнуў па баках, быццам хто мог яго падслухаць, сказаў жорсткай скорагаворкаю:

— Едзем на станцыю. Грузім машыну. Ты сядзіш у кабіне — дакументы сапраўдныя, без падробкі. Потым — едзем. Але не на склад, а — з горада рвем кіпцюры. Прыедзем у атрад. І — усё. Захару скажаш: ва ўсім гэтым — мая ініцыятыва. Ды, зрэшты, ён мне і сам паверыць!

— А раптам?

— Раптам, дзед, можа ў пятку стрэліць. А тут ніякага раптам няма. Мы звесткі Захару прывязем, якія нідзе раптам не ўхопіш. Яны за золата даражэй!..

На няроўным бруку вуліцы грузавік патрэсвала, і заветравым шклом на рудаватым капоце ўвесь час дрогка трымцелі дзве лісцінкі, авальныя, сагнутыя пасярэдзіне, падобныя на звялыя зялёныя слівіны. Кандрат утаропіўся на іх, баяўся павярнуць галаву ўлева і зірнуць у вочы Трапашкі, які моўчкі сагнуўся, бы лёг, на чорны абарапак руля. Варта зноў убачыць гэтыя вёрткія, нахабныя вочы, і ён, Кандрат, не стрымае сябе, зноў кінецца на Трапашку, учэпіцца ў горла, пачне душыць, пачне патрабаваць, каб той адмовіўся ад сваіх ранейшых слоў, сказаў, што схлусіў, па-дурному пажартаваў... Пажартаваў? Не-е, Трапашка не жартуе. І не хлусіць. Ён ратуе сваё жыццё, ратуе лоўка, хітра, усё ўзважыўшы. І не тоіць гэтага. Гаворыць аб усім шчыра, адкрыта, і ў гэтай шчырасці яму, Кандрату, і ёсць прысуд. Трапашка ўсё дакладна разлічыў: ты, братачка, будзеш у яго за памагатага. І Багдан твой будзе памагатым у гэтага гіцаля. Багдан, сынок родны, бацькава

радасць і надзея... У якую пельку зноў цябе зацягнула! Няўжо сваёй ахвотаю пісаў, сваёй воляю складаў тую запіску на Мсціслава! А можа, пісаў?.. Мог напісаць! Напісаў праз Чэську тую, праз каханне сваё дурное, неразумнае і сляпое. А ты, Кандрат, хіба не быў сляпы? Быў жа сляпы, як кацяпё тое! Ты ж тады, як толькі даведаўся пра Мсціслава, не падказаў сыну, што рабіць трэба, не дапамог парадаю. А мог жа! Мог і Чэську тую турнуць падалей, і Багданку ад дурноты ўберагчы, і сабе мог зрабіць добра. Але што ж у старым смецці корпацца! Раней трэба было ўсё прадбачыць, пільна глядзець наўкола. Глядзець, праўда, ён глядзеў, ды, відаць, не ў той бок, куды трэба. Таму, стары дурань, памылак гэтулькі і парабіў. І галоўная з іх — крыўду сваю вышэй ад усяго паставіў. А трэба розумам кіравацца, трэба сваёй галоўкаю жыць, за сваю родную зямельку заўжды трымацца: яна, зямелька, не прадасць, не здрадзіць, хай сабе, часам, балюча сцебане. Але ж ад сваёй, роднай рукі і не гэтак баліць. І другая вялікая памылка — тваё абяцанне Захару знайсці чалавека, які прадаў Балаша. Вось ты знайшоў яго, ідзі, скажы Захару!.. Ён жа цябе на першай асіне павесіць... А каб тады, як Багдан лістоўку знайшоў, кінуў ты ўсё к чортавай матары, узяў бы зброю, сыну карабін прыхапіў, ды вось гэтак, за руль яго пасадзіўшы, зафугаваў машыну дабра ў лес Захару, ды стаў на калені, літасці папрасіў... Яно б тады ўсё па добрае выкіравалася.

— Ну, дзед, чаго прымоўк? — бадзёра папытаў Трапашка.— Прымерваешся, як зноў мяне за гарляк ухапіць? — і засмяяўся.— А ў цябе, дзед, сілы ё. Яшчэ б крышачку — капут Трапашку. Гэдак прыціснуў. Ну, чаго ж маўчыш?

— Разважаю.

— Як лацвей Трапашку на той свет сплавіць?

— Прыблізна.

— У дурной птушкі — дурная песня... Я ж табе сказаў-папярэдзіў: мяне зачэпіш — мой сябрук партызанскі Багдана твайго кокне. І табе — кулю ў спіну.

— Ла-аўка-ач, адпак!

— Усё не верыш, значыцца? Як хочаш. Толькі адно прашу: не лічы мяне, дзед, ёлупам. Паварушы, паварушы мазгаўнёю. Пайшоў, скажы, я на гэткую гаворку з табою, каб добрага тылу не меў?

— Адкуль мне ведаць!

— Ужо і добра. Ёлупам, значыцца, мяне не лічыш.

Цяпер разважаем далей. Чалавек, які хоць крышачку розуму мае, не адважыцца на гэткую гаворку да таго часу, пакуль не вывучыць цябе, як свае ўласныя пальцы.

— А ты ўжо гэтак мяне вывучыў?

— Шчэ лепей нават.

— Можа, раскажаш, што ты цікавага вывучыў-павывучыў?

— Раскажам,— памяркоўна паабяцаў Трапашка і, трымаючы левай рукою руль, правай выцягнуў з-пад планкі на даху кабіны пачак цыгарэт, а з кішэні — запальнічку. Курыў ён прагна, глыбока зацягваючыся, потым пускаў доўгі струмень дыму сабе на грудзі, і дым сцякаў уніз кабіны, звілістымі палосамі ўсплываў на ветравое шкло і зноў ападаў на дол.

Кандрата душылі і гэты дым, і злосць на самога сябе. Як жа гэта ён не стрымаўся, дазволіў сабе ўчынак наіўны і неразумны — кінуўся біцца. Дурань! Трэба было пасмяяцца, звесці ўсё на жарты, паглядзець, куды выкіравалася б Трапашкава споведзь.

— Я слухаю, слухаю,— нецярпліва прамовіў Кандрат, разумеючы, што робіць яшчэ адну памылку.

— Не церпіцца, дзед, даведацца?

— Карціць, ведама ж... Чаго ты, гэтакі лоўкі, узяўся за старога дзеда чапляцца? Стары конь далёка не звязе.

— Але ж і баразны не скрывіць. А мне галоўнае — баразна каб да мэты вяла,— і зацягнуўся двойчы, неяк адчайна, быццам спяшаўся захлынуцца дымам.— І паколькі часу ў нас гуляць у схованкі няма, дык я табе кажу на поўны давер: ты мой асноўны козыр, дзед! Казырны туз, можна сказаць.

— Гульню, значыцца, вядзеш?

— Усе яе вядуць, дзед. Выйграў — жывеш. Прайграеш — чарвякам на закусь. А мне выйграць карціць.

— А што, як не казырным тузом я акажуся? Ты ж сваю гульню прайграеш як ніць даць.

— Казырны ты туз, дзед, казырны. У першай раздачы казырнага туза ў мяне не аказалася — не я карты раздаваў. А цяпер у маіх руках калода. І тут ужо — сляпой казе відаць! — не будзе памылкі. Тузок казырны ў маіх руках. І з гульні маёй, нават каб яму і схацелася, ужо не выдрацца. І калоду ўжо ніхто не аберне. І карту благую ніхто не падсуне — сам раздаю. І ты, дзед, май на ўвазе, што ў гульні мы абодва: мне пашэнціць, дык і табе шчасце падваліць. Мы з табою — адна спрэжка.

— А як раптам ды не адна?

— Адна,— цвёрда прамовіў Трапашка і, выцягнуўшы руку над Кандратавай галавой, выкінуў недакурак. Вецер растрос па кабіне чырвоныя іскры, і яны хутка згаслі, але Трапашка пакруціў рукою, быццам адкідаў іх ад сябе, і паўтарыў з націскам: — Адна мы з табою спрэжка. Адна! І я, і ты, і Багдан твой — мы ж адной вяровачкаю звязаны. Аднолькавая аўчына на нас сядзіць. Прыглядзіся ўважней!

— Брэшаш! Розныя ў нас сцежачкі!

— Адно-олькавыя нашы сцежачкі! Толькі выбіліся мы на іх па-рознаму — кожны сваім шляхам ішоў. Ты чаго ад нашых крутнуў у бок? Крыўда цябе пякла, за брата адпомсціць карцела. Гэдак? Гэ-эдак. Багдан твой чым кіраваўся? Рэўнасць скруціла, асляплены ён, падмануты каханнем быў. Цяпер — я. Што мяне з тропу звяло? Дурнота мая ўласная. Ты ж павінен ведаць, яшчэ з даваеннага, калі я на заводзе рабіў: усялякі заціск, усялякі гэты рэгламент-пергамент, усялякая дысцыпліна — гэтага мая душа не прымала. А тут раптам — воля, новы парадак іхні!.. Вось душа мая і наперла да гэтае свабоды. А што прыдбаў? Прыгнёт, якога і ў сне не бачыў. Хочаш, каб табе ў морду не саданулі? Спіну сагні, азадак языком чысці нейкаму смярдзючаму пану. І віжуй на кожным кроку за сябрам, на таго, хто побач, даносы шмулюй, душою віляй... І я, прыхільнік волі, павінен гэта рабіць?

— Рабіў жа! І не апух.

— Рабіць я рабіў, але ж рабіў з розумам, хоць душа штодня ад крыўды пухла. Думаеш, Ванду я тады да цябе ў хату выпадкова прывёў? Загадалі. Яна — новы чалавек у горадзе. Яе адразу — на прыкол. Мне ж — загад: назіраць, сябе не выяўляючы, штодня дакладваць пра сувязі яе, пра тое, з кім страчаецца, што перадае, што атрымлівае...

У Кандрата пасвятлела на душы, ужо не гэтак, як напачатку, ныла сэрца. Аніякай памылкі ты, братачка, не зрабіў, калі кінуўся біцца да Трапашкі! Каб ты прыняў яго прапанову адразу, з ахвотаю, ва ўсім пачаў пагаджацца — гэта б толькі насцярожыла, ён бы адразу адчуў падробку і гэтак бы шчыра не адкрыўся, не ва ўсім бы даверыўся. А твая нядаўняя ярасць пераканала Трапашку: ён, маўляў, не памыліўся, усё разлічыў правільна. Цяпер глядзі, сам не памыліся, не спалохай яго, не адштурхні.

— І ты аб усім дакладваў,— тонам не запытання, а

сцверджапия прамовіў Кандрат, прамовіў з пагардаю, разумеючы, што толькі гэткія яго паводзіны прымусяць Трапашку казаць праўду.

— Ну!.. І не я адзін, як мне вядома, тое рабіў. Ты думаеш, што фашысты не ведаюць, дзе твой Багдан? Ведаюць. Думаеш, за вочы прыгожыя табе карабін зноў выдалі, паверыўшы, што ў паводку, маўляў, згубіў? Знайшоў дурняў! Яны, навер мне, хітрыя, як чэрці. І бязлітасныя. Гэта ж — забойцы вывучаныя! Яны — на мяне, і на цябе, і на кожнага з нас пастку паставілі, пераплялі нас, каб мы чубіліся, каб шпіёнілі. А ім — выгода: усё ведаюць, усё чуюць. Памятаеш Захараву жонку з дзецьмі? Яна ж у іх падсадкаю ў пастцы была. Сарвалася, праўда, не клюнуў Захар — нявестачка твая іх вакол пальца абкруціла. Табе хоць слоўца пра тое сказалі? Дулю ў нос. Яны цябе самога замест сала ў пастку запхнулі, і ты там, як той бычок — на вяровачцы. Здагадваюся, што і за мною нехта віжуе — бы па вострым лязу паўзу. Дугнуся не туды — пуза напалам. Але ж і я ад іх налаўчыўся: быццам і дугнуся, каб яны бачылі, быццам і пахіснуся, а сам — ціхенька на лязо тое бляшанку кладу, каб не рэзала, кашуляю закрыю. О-о, я налаўчыўся — вучань здатны. Думаеш, выпадкова я тады на Дзвіне ў паводку апынуўся? Я ж за вамі па пятах ішоў. Думаеш, Захара не пазнаў? Пазна-аў!

Брыдкія халодныя мурашы пачалі споўдацца па хрыбціне, як жывыя, скраблі скуру, і Кандрат прыціснуўся спіною да сядзення, намагаючыся прыдушыць іх, сцерці. На нейкі міг яму гэта ўдалося, але тут жа ў плячо гэтак балюча ўрэзалася нейкая гайка, што ён угнуў галаву, замычаў: падалося, што тая гайка прарэзала скуру і замест мурашоў коцяцца па хрыбціне кропелькі крыві.

— І адразу пабег і даläжыў?

— Далажыў,— прастадушна, як бы радуючыся таму, што калісь зрабіў, прызнаўся Трапашка.— Але — на свой макар. Пра тое, што ты чалавека за Дзвіну перапраўляў, я сказаў. Але хто той чалавек — утоіў. Навошта? Усё па тое ж: збіраў казыры. Калі Кандрата бачылі на Дзвіне ў тую ноч акрамя мяне, дык мне адразу — давер: не хлушу, дакладваю праўду. Сустрэнуся з Захарам — козыр: я ж аховаю ў вас быў. Бо ніхто ж не ведае, як бы яно павярнулася, каб не я па вашых слядах тады ішоў. Хіба ж не так?

— А што пра Ванду ты дакладваў? — запытаўся Канд-

рат, вырашыўшы, што адказваць на Трапашкава пытанне не варта.

— Толькі тое, што было: у тваю хату яна нікога не прыводзіла, аніякіх сувязных яна там не страчала, нічога туды ёй не прыносілі. Праўда гэта? Праўда. Сувязі? Відаць, праз краму ішлі, дзе яна робіць. А крама — не пад маім наглядам. І там, уласна кажучы, не дужа што згледзіш. Калі галодныя людзі па тоў жабрацкі харч да прылаўка лезуць, не прыкмеціш дакладна — запіску ці марку яна ўзяла. Але і Ванды, скажу табе шчыра, песенька спета: звесткі пра блакаду ёй падсунулі падманныя. А потым, як блакада бору пачнецца, яе — на цугундар. Як зробяць? А проста. Адразу ўсіх — і краму, і тых, хто побач, і хто на надыходзе,— у абцугі. А потым — на сітачка: вадзіцу — далоў, а рыбку — у мех! У іх — сістэма.

— А чаго ж ты гэты козыр не бярэш? Папярэдзіў бы і яе — шчэ адзін козыр у тваіх руках.

— За ўсімі казырамі пагонішся — гульню і праваронііш. Будзеш сядзець з казырамі на руках, а гульня ўжо і скончылася. Так што, бачыш, я не проста хачу — лахі пад пахі. А — з розумам. Каб рэ-аз, і банк — у кішэні!

— А з горада як вырвацца? На кантрольным жа спыняць — шлагбаум не пераскочыш!

Трапашка прыпаліў новую цыгарэціну, зноў хутка і прагна зацягнуўся, выпусціў дым тонкім струменем сабе на грудзі, сказаў задаволена:

— З табою, дзед, кашу можна варыць — верна мысліш. Чыгуначны завулак ведаеш? Дык вось, ад другой, Лявонавай хаты мы садочкам, садочкам, і там — поле. Кантрольны — улева ад нас.

— Заўважаць. З кулямётаў зрэжуць.

— Не паспеюць. Нізінка там вузкая, а за ёю — пагорачак. А за ім — хмызняк, лапінамі. А за імі — лес блізенька. Там я пешачкі прадыбаў, кожную ямінку вывучыў — без малога два дні швэндаўся. Лугавінкаю праішоўся — падсохла, машына праскочыць. І на кантрольным пастаяў. Яны ў той бок мала глядзяць, болей дарогу пільнуюць. Праскочым, дзед, павер мне!

Кандрат ухвальна пахітаў галавою.

— Як па нотах распісаў,— і нечакана вырашыў пазлаваць Трапашку.— Але ж адно не ўлічыў. А што, як стары Кандрат у атрадзе ды на гэткай споведзі, вось як ты зараз, Захару адкрыецца, пра сына раскажа, пра тое, як ты, адплаты спалохаўшыся, хочаш жыццё сабе выкупіць?..

— Выключапа!
— Чаму?
— Ты дзед, чалавек разумны. І памяняць сваё жыццё і жыццё роднага сына на жыццё нейкага Трапашкі?.. Не, дзед. Самае разумнае, што ты зробіш — замок на губу. Але, скажам, скіпуў замок. Споведзь тваю могуць зразумець. Але даравацъ? Не-еа, даравання не можа быць і не будзе. Але, скажам, цуд адбыўся: даравалі. Зноў жа, за маё жыццё трэба будзе і сваё жыццё аддаваць і Багданава — мой сябрук вас з-за ялінкі па чарзе: кок, кок... Лапцуг, як бачыш, надзейны: не скінеш, не парвеш...

Бязлітасная і няўмольная логіка Трапашкавых разважанняў абязбройвала. Але нейкая няўлоўная зачэпка, нейкая старанна прыхаваная шчылінка была ў іх, нейкая як бы недагаворанасць, як бы жаданне выцягнуць Кандрата на спрэчку, на нейкія пярэчанні, доказы, нязгоду. Яшчэ не разумеючы, навошта гэта спатрэбілася Трапашку, прыціснуты горыччу і бядою, адолець якую ў Кандрата не было ні сілы, ні рашучасці, ён спытаў з роспаччу, ненавідзячы сябе за сваю разгубленасць і слабасць:

— А потым? Потым ты што будзеш рабіць?

Набліжалася перакрыжаванне вуліц. Трапашка тармазнуў, пераключыў хуткасць, зноў дастаў цыгарэціну. Прыпаліўшы ад запальнічкі, ён не згасіў запальнічку, нейкі час трымаў у руцэ над баранкаю, быццам свечку, потым шумна выдыхнуў дым і дымам жа збіў полымя.

— Смерць фашысцкім захопнікам! Вось што будзе, дзед, потым.

— Гэдак табе адразу паверацъ. Гэдак адразу — зброю ў рукі!

— Табе ж вось паверылі.

— Мая зброя даўно павернутая.

— І я таксама яе павярнуў! Па сваёй волі і ахвоце,— хутка і ўпэўнена прамовіў Трапашка.— Я хачу крывёю сваю віну выкупіць. Хто мне гэта не дазволіць? Захар? Захар разумны — яму кожны чалавек, хто супраць чужынцаў хоча ваяваць, патрэбны. І яшчэ што важна? На маім сумленні грахоў вялікіх няма, людзей нашых я не забіваў, не катаваў. Баранку круціў...

— Дужа ж імпэтна, аднак, ты за розум узяўся!

Трапашка прыняў кпіну спакойна, сказаў даверліва:

— Паміраць мне, маладому, дужа не хочацца, дзед. Ніколі гэтак жыць не хацелася, як у гэтую вясну...

— З чаго ж гэта на цябе найшло?

— Відаць, пастарэў, паразумнеў я... І ўвогуле... Памятаю, як тую лугавіну, па якой нам сёння шпарыць, ножкамі абмацваў, на жаўрукова гняздзечка напароўся. Адступіў, а жаўручок — сядзіць. А другі — у небе ходзіць. І ўпершыню — стаю, галаву задраўшы, слухаю,— я песню яго зразумеў: жаўрук заўсёды пра жыццё спявае, у яго, ведаеш, сумнай песні няма... І табе ж, дзед, паміраць не вельмі карціць. Ну, скажы! Толькі не крыві душою!

Кандрат уздыхнуў:

— Можа, яно б і лепей было — памерці мне...

— Ведаеш, чаму ты гэтую песню завёў? Таму, што яна, кастлявая, далёка ад цябе. А калі яе кіпцюркі ля гарляка адчуеш — за жыццё чапляцца рукамі і нагамі пачнеш. Я нагледзеўся ўжо на гэткіх, што смерці прагнуць. Але — на словах тое. А як толькі яе ўбачаць, дык пыляць ад яе — на гэтым грузавіку не дагоніш... Ну, дзед, губу — на замок. Пакгауз ужо наш...

Пад'езд да нізкіх цагляных будынкаў чыгуначных складаў, размаляваных белымі і чорнымі плямамі маскіроўкі, быў густа, у два рады, аплецены калючым дротам. Трапашка прытармазіў ля брамы, прыадчыніў дзверцы грузавіка, махнуў рукою вартавому:

— Цайт, цайт, пан пачальнік! Адчыняйце. Мала ў нас гэтага цайту!

Стары прыгорблены вартавы, не выходзячы з-за агароджы, патрабаваў хрыпла:

— Аўсвайс!

— Дык правяраў жа, пан начальнік, нядаўна. Усю ж ночку гойсаю — ведаеш жа мой твар!

— Аўсвайс,— механічна, як і перад гэтым, патрабаваў вартавы.

Саскочыўшы з падножкі, Трапашка працягнуў вартавому шэры бланк пропуска, той зрабіў у ім адзнаку і толькі тады піхнуў нагою браму на тоўстых роліках-колцах; брама з віскатам пакацілася па тоўстай рэйцы, схаванай у драўляным насціле. Трапашка сеў у кабіну, бразнуў дзверцаю, газануў: машына з грукатам скацілася з насцілу і спынілася за цагляным будынкам, ля якога стаяў адкрыты вагон. Побач, ад другога вагона, пачаў ад'язджаць крыты грузавік, і Трапашка павесялеў:

— Я зараз развярнуся і задам падганю машыну. Бачыш, як нам шанцуе — чакаць пагрузкі не давядзецца. Але ты з кабіны не вытыкайся. Сядзі мёртва!

Машыну загружалі проста з вагона чатыры ваеннапа-

лонныя, за якімі наглядаў старэнькі, падобны на хворага дзядулю салдат. Ён сядзеў на высокай драўлянай скрыні, засунуўшы рукі ў рукавы шыняля і паклаўшы іх на карабін, што ляжаў у яго на каленях. У губах заціснута люлька, чорная, выгнутая ажно да самага падбародка. Час ад часу вартавы рабіў кароткую зацяжку, пыхкаў бялявым дымком.

У аднаго з палонных, доўгага, з учарнелым худым тварам, шынель быў прапалены на баках.

«Гэткі шынель быў у Багдана... Там, у бараку ваеннапалонных...»

Кандрат, адчуўшы непрыемную горыч у роце, заплюшчыў вочы, абшчаперыў карабін, які ляжаў на каленях, прыціснуўся спіною да сядзення; зноў вострая, як шыла, гайка рэзала скуру. Чуў голас Трапашкі — той нешта казаў вартавому і пакрыкваў на ваеннапалонных,— а перад вачыма стаяла даўняе жахлівае відовішча: людское лежава на пустынным пагорку, дзе выдрана і з'едзена не толькі трава, але і карэнне травы, рэдкая сетка калючага дроту па браме, земляная, без дошак, падлога барака, і на ёй Багдан, з чорнымі шчокамі, пакрэсленымі чорнымі рубцамі...

Кандрат гнаў ад сябе гэтае нечаканае відовішча. Але яно жыло, не знікала, усё ў ім было дужа выразнае, быццам нарадзілася не ва ўспамінах, а існавала рэальна, тут, побач, за цаглянымі будынкамі чыгуначных пакгаузаў. Кандрат заматаў галавой, замычаў ад болю, які цяпер быў і ў плячах і ў сэрцы. Багданка... Сыночак родны... Што ж ты нарабіў? Як жа ты ўзбіўся на тую бяду? Сваёй воляю? Не, брэша Трапашка! Не па сваёй волі зрабіў ты гэты крок. Не, не па сваёй! Нешта ж прымусіла... Нехта ж цябе падштурхнуў, падвёў да гібельнай пасткі... Відаць, піхнулі цябе ў яе, зацягнулі гэтак жа, як зацягнулі твайго старога бацьку. Заўважыў, можа, тую пастку, ды позна, калі паратунку не было... Хай сабе, не было іншага выйсця. Але ж чаму бацьку не адкрыўся? Чаму бацьку пра сваё горачка, пра бяду злую не расказаў, парады не папрасіў?.. Удвух можна ж было нешта змаргеліць, неяк вылузнуцца з той пасткі. Тады, спакойна разважыўшы, ён, Кандрат, нешта напэўна б змысліў... Не прыдумаў тады, дык цяпер прыдумай! Зараз вось прыдумай што-небудзь, каб уратаваць свайго сыночка, каб сябе не падставіць пад удар, каб гэтага Трапашку вакол пальца абкруціць!.. Але ж як тое зробіш? Якім чынам з пасткі выбавішся?.. Галоўнае, вы-

рваццa з горада разам з Трапашкам, убачыць сына, Захара ўбачыць... Трэба, каб Захар ведаў усё тое, што ён, Кандрат, ведае... Не, не ўсё Захар павінен ведаць! Пра блакаду — павінен ведаць і павінен ўратаваць атрад. Пра тую дурную цыдульку Багдану — ні слоўца. Трапашка тут мае рацыю: пра гэта — маўчаць. Але ж Трапашка, пакуль жывы, будзе і цябе, і Багдана ў жменьцы трымаць. Пакуль жывы? Але ж ён можа быць і не жывы — хто ведае, каго і дзе куля знойдзе!.. Галоўнае, Багдана ўбачыць, дурня гэтага папярэдзіць, ад бяды ўратаваць: разам яны ж нейкае выйсце знойдуць. Пакуль жывы — выйсце заўсёды знайсці можна. А можа, праз Ванду што-небудзь наказаць Багдану?.. А ты што, хіба не чуў, аб чым Трапашка казаў? Ёй жа таксама ратавацца трэба... Зараз яна, Ванда, недзе ўжо ля крамы... А што, каб заскочыць да яе, нешта шапарнуць?.. А раптам не ўдасца?.. Тады ў машыну яе, і далей ужо — разам. Але ж Трапашка можа адмовіцца? Э-э, няхай! Тады — кулю яму! Не-е, толькі не гэта! Калі і як пачнецца блакада, ён жа табе не сказаў. І не скажа! Сам хоча Захару пра тое сказаць. Хай гаворыць. Але прыхапіць яе, Ванду, Кандрат яго прымусіць!

Кандрат адкрыў вочы, і рашэнне, якое ён толькі што прыняў, не здалося яму дзіўным. Больш таго, гэтае, нечакана прынятае ім рашэнне скасавала развагу і слабасць, адкрыла зусім рэальную надзею на паратунак. За гэтым рашэннем — выйсце! Ведама ж, рызыка вялікая. Але ж хіба меней рызыкі ў тым, што робіць Трапашка? Не меней! А ён жа ідзе на гэтую рызыку смела, адчайна, нічога не баючыся.

«А можа, ён проста выпрабоўвае мяне?..»

Непрыемная горыч у роце высахла, і Кандрат адчуў, як кончык языка пачынае мярцвець, быццам прымярзае да ніжніх зубоў. А што, як і сапраўды, Трапашку загадана зацягнуць яго, старога дурня, у новую пастку, і Трапашка ідзе на рызыку толькі дзеля таго, каб ўратаваць сваё ўласнае жыццё?.. Не, Трапашка пра ўсё гаворыць шчыра: ён сапраўды хоча ў атрад. Прадаць цябе, старога ёлупа, ён мог ужо сто разоў. Але ж вось не прадаў, усяляк ахоўваў, і на цябе, братачка, на тваю галаву ён зрабіў галоўную стаўку, і разлічыў усё разумна, разлічыў усё дакладна... Разлічвай і ты! Разлічвай усё да дробязі, як гэта зрабіў Трапашка, рыхтуй сябе да нечаканасці і павароткі непрадбачанай... Цяжкі дзянёчак у цябе, братачка, пачынаецца. Самы цяжкі і, магчыма, апошні...

Кандрат павярнуў галаву, зірнуў праз адчыненае акно кабіны на чыстую, насвятлелую высь, згледзеў адну-адзіную маленькую хмарку, якая, бы астравок, пунсавела ў блакітным небе — сонца яшчэ зусім нядаўна выбілася з-за далягляду. Згледзеў гэтую хмарку і супакоіўся: усё абыдзецца, яны вырвуцца з горада, і ў пастку, якую Трапашка расставіў на старога Кандрата, трэба будзе загнаць яго самога.

Кандрат яшчэ дакладна не ведаў, як усё адбудзецца, але паверыў цвёрда, што сёння ён будзе жыць. Заўжды, калі ён ранкам бачыць вось гэткае неба, дзень у яго складваецца на ўдачу. І сёння — удача з ім! Толькі трэба не сядзець склаўшы рукі, не сядзець, губы развесіўшы. Трэба сабрацца, напружыцца, волю ўсю мабілізаваць, быць да ўсяго гатовым!

Кандрат нетаропка адцягнуў затвор, гэтак жа нетаропка ўвагнаў патрон у патроннік, павярнуў вечка засцерагальніка. Ад дотыку да халоднага металу, ад бляску жаўтлявага патрона, які лёгка слізгануў у патроннік, ён адчуў сябе ўпэўнена. Аніякая нечаканасць не захопіць яго, Кандрата, знянацку. Калі нявыкрутка якая, ці адкрыецца падман Трапашкаў, ці захоча як-небудзь вільнуць — нават карабіна ўзнімаць не трэба: Трапашка ўвесь час пад дулам сядзець будзе. Калі спатрэбіцца яму, Кандрату, толькі адно паспець — перакінуць пальцам вечка засцерагальніка ды націснуць на спуск. Так што ён, Кандрат, стрэліць заўсёды злаўчыцца — часу на тое пры любым выпадку хопіць.

## 20

*Блакнот Ромеля. Старонка чацвёртая.*

«Усё зменлівае на гэтай зямлі: радасць і бяда, удача і гора. Адно толькі на ёй нязменнае: нянавісць да нас. Мы — чужынцы. Мы — акупанты. Мы — заваёўнікі. І нехта прыдумаў яшчэ адно вызначэнне, якое пачуеш з вуснаў і старога і малога — фрыцы. Ненавідзяць нас, фрыцаў, нават калі нехта з нас ідзе з чыстымі рукамі, са шчырасцю ў сэрцы. І гэта можна лёгка патлумачыць. Попел, кроў, слёзы — вось што пакідалі мы за сабою на гэтай зямлі. Цяпер наша ўласная кроў змывае нашы сляды.

Ярасць, гнеў, нянавісць — гэта вочы старога, які кінуўся на мяне сёння з віламі. Вілы старыя, са зламаным край-

нім зубцом, закарэлы гной ля ржавага цвіка, увагнаны ў драўляны дзяржак і загнуты — я схапіўся рукамі ля гэтага цвіка. Рамантаваў жняярку — загадаў камандзір,— і дапамагаў мне стары з вёскі на беразе Дзвіны. Працавалі ў кузні. Я памяняў чатыры разакі — зрабіў зусім новыя, старыя, аднак адклаў, каб потым паправіць іх — хай, падумаў, будзе на запас. А стары пакідаў іх у калдобіну — шырокая калдобіна ля кузні. Я зазлаваў, узяўся выгаворваць: паганая, маўляў, у вас, рускіх, якасць — неашчадныя вы. А гэты нямоглы дзядок — за вілы. «Фрыц! Пракляты фрыц!»

Уратаваў Шлык — прыехаў па той час у кузню. Было жахліва і крыўдна: хіба ж я сабе рупіўся з тымі прыладамі? Мая ж праца — і старому, і яго дзецям, і ўсім вяскоўцам. Увечары даведаўся: сыны старога забіты былі вясной, летась, калі быў напад на наш лагер у лесе.

Дабро трэба рабіць жывым. Мёртвыя пра дабро не дбаюць. Які свет, якія людзі — ім усё роўна».

## 21

Ціха пазвоньваў правы атосак рысоркі, пад коламі шухцеў і парыпваў мокры пясок. Левае кола зачапіла камень, жалезны обад чыркануў па ім візгатліва, быццам прыглушаны погалас пачуўся ззаду, і Захар азірнуўся. Ноччу, амаль да рання, хвастаў дождж, дарога яшчэ падсохла слаба, і за рысоркаю выціснутыя вузкімі абадамі разматаліся дзве роўныя чорныя палоскі, паміж якімі на роўнай адлегласці адна ад другой чарнелі кругленькія ямінкі — след конскіх капытоў. Захар згледзеў і гэтыя палоскі, і гэтыя ямінкі, і пакрыўджаны выраз неабуральнага, замкнёнага Багданавага твару. Крыху пазней, калі Захар глядзеў ужо наперад, па загладжаную начной залёвай дарогу, Багдан пачаў моўчкі праз роўныя інтэрвалы рэзка тузаць лейцы. Захар здагадваўся, што Багдан робіць гэта знарок, злуючы і выказваючы нязгоду з рашэннем, якое ён, Захар, нядаўна прыняў.

Прынамсі, калі разабрацца, не дужа яно і разумнае, гэтае рашэнне — адаслаць разведчыкаў у штаб атрада, а самому вяртацца далёкай дарогаю, каля спаленага млына: добрых пяць кіламетраў кругаля даваць. Ён прыняў гэтае рашэнне, спаслаўшыся на тое, што тут дарога лепшая і ён хоча зірнуць на жыта, якое летась сеяў атрад. Але гэта

была толькі спасылка. У сапраўднасці ж, ён надумаў пагутарыць з Багданам у дарозе сам-насам. І не проста пагаманіць — гэта ж можна зрабіць у любы час у атрадзе,— а паспрабаваць зразумець чалавека, разабрацца, чым жа ён кіруецца ў сваім парывістым і няроўным жыцці: у дарозе гаманіць лягчэй, у дарозе кожны заўсёды робіцца больш шчыры.

І вось — едуць. Нішто не замінае пачаць шчырую размову, а яны зацята маўчаць. Па праўдзе кажучы, Захар і не ведаў, з чаго пачынаць гаворку, да якой рыхтаваўся, і якая сёння асабліва яго непакоіла,— гаворка тычылася адносін Багдана і Чэсі: дзе ўсё-ткі ў Багдана сапраўднае каханне і як гэта можна кідацца ад адной жанчыны да другой? Ён здагадваўся, што тое ж самае, мабыць, прыгнятае і Багдана. Не бухнеш жа адразу і напрамкі: чаго ты, маўляў, галовы жанчынам дурыш, як апошні нягоднік? На першы погляд усё ў гэтым абвінавачванні нібыта адпавядае сапраўднасці. Але, калі паразважаць, дык адразу бачыш, як усё тут заблытана, як усё накручана і перакручана. Таму Захар і хоча ва ўсім разабрацца, зрабіць выснову, якая б у далейшым давала магчымасць у першую чаргу самому сабе сказаць, што ён не патураў сваяцкім адносінам, не крыўдзіў каго-небудзь падазронасцю і беспадстаўнымі абвінавачваннямі, але і не быў у баку ад лёсу свае роднае сястры.

Злавіўшы адчужаны, скіраваны ў прастору Багданаў позірк, Захар сумеўся ад думкі, што нарадзілася раптоўна і неспадзявана, хоць і была ўжо Захару не ў навіну: а каму, дарагі ты мой, патрэбна яна, гэтая твая гаворка? Чаславе? Яна не любіць Багдана. Багдану? У Багдана свая галава на плячах, і калі ён не любіць Маўджуду і хоча вярнуцца да сваёй былой жонкі — ты яму тут не суддзя. Дык чаго ж ты блізка да сэрца бярэш усё гэта? Ты і Гусараў... Чакай, а можа, Гусараў гэты і муціць ваду? Нейкая ж дужа ярая катэгарычнасць заўважаецца ў яго апошнім часам, усё чохам-бохам вырашыў: аднолькава пакараць усіх — і Багдана, і Маўджуду, і Чаславу, якія, маўляў, «сталі на шлях маральна-бытавога разлажэння». Нават цытатку з Пастановы Пленума на памяць улупіў. І помніць жа! І ўсё націскае: мы, маўляў, не павінны «ліберальнічаць з гэтымі фактамі...».

Злева, аблогаю, ляжала поле, летась не ўзаранае на зябліва, і Захар, гледзячы на пустазелле, якое дралася з зямлі дружна і густа, сумна ўздыхнуў. Ёсць шмат іншых

праблем,— важных, жыццёвых, надзённых! — над якімі яму зараз трэба ламаць галаву. Скажам, пасяўная ў вёсках. Лепшыя тэрміны сяўбы мінулі. А колькі зямлі не засеяна! І застанецца незасеянай, бо мабілізацыя, якую атрад правёў зімою і напрадвесні, выбрала мужчынак з вёсак: адны — у атрадзе, другія — пайшлі за лінію фронту. А забеспячэнне насельніцтва медыкаментамі, соллю, мылам! Не заўважаліся гэтыя дробязі да вайны, а цяпер яны — на вагу золата. Прыгадай, як казалі пра гэта ўчора на сходзе ў Завячэллі. Ды хіба ж толькі ў Завячэллі! У кожнай жа вёсцы ўзнікае гаворка на сходзе пра соль. Праўда, аніводнага патрабавання не пачуеш: калі, маўляў, ёсць магчымасць памагчы, каб дзеці драбінку солі ўбачылі... А магчымасцям тым адкуль узяцца? Трэба дзяліць тое, што ёсць у атрадзе, адрываць, як гаворыцца, з крывёю. Але ж хто можа адмовіць гэтым людзям? Як? Яны з ахвотаю, з радасцю, аддаюць табе ўсё, што ў іх ёсць: каштоўнасці, грошы, аблігацыі, дзеляць з табою апошні акраец хлеба...

Захар паправіў рукою трафейны ранец, напакаваны грашыма і аблігацыямі — краёк яго вытыркаўся з-пад сена. Рысорку страсянула яшчэ раз, ранец пасунуўся, як жывы, пад самы край, і Захар зноў паправіў яго рукою. Жоўты скураны верх быў мяккі, цёплы, быццам толькі што зняты з пляча, і Захар зусім для сябе нечакана падумаў пра лёс ранца, што тросся пад сенам у рысорцы. Ці мог прадбачыць той, хто рабіў гэты ранец, якую паклажу — народныя грошы на танкавую калону! — будуць насіць у ім?.. Ці мог ён прадбачыць, які лёс напаткае яго гаспадара на чужой і далёкай старане?.. Дзівосы нейкія: нібыта ён, Захар, шкадуе нейкага фашыста, забітага напрадвесні на шашы пад Полацкам!

Захар піхнуў ранец глыбей пад сена. Багдан заўважыў гэты яго рух, з пафасам прамовіў:

— «Передайте партизанам и партизанкам, колхозникам и колхозницам вашей области, собравшим более двух с половиной миллионов рублей на строительство самолетов и бронепоезда «Советская Белоруссия», мой братский привет и благодарность Красной Армии».

Захар здзіўлена зыркнуў на Багдана.

— Ух ты! Вывучыў!

— Чатыры ж разы чыталі ўчора тэлеграму на вёсках. І пяты раз я ўжо ў газеце прачытаў, калі па руках пайшла ў вяскоўцаў,— і раптам памацаў рукою ранец, шчыра

пацікавіўся: — Няўжо будуць дакладваць Вярхоўнаму і пра гэтыя сродкі?

— А як жа!

— Няўжо ён прачытвае ўсё, што яму пішуць?

— Усё важнае, думаю, прачытвае.

— А Ціхан Крупня? Ён усё прачытвае, што яму ў абком пішуць? — і, павагаўшыся, дадаў: — І тое, што з абкома насылаецца,— прачытвае?..

Захар, прыхаваўшы здзіўленне ад нечаканай павароткі гаворкі, адказаў спакойна:

— Без разгляду не пакідаецца аніводны сігнал працоўных — гэта закон партыйнай работы і раней і цяпер,— і спытаў весела: — Чаму ты гэтак зацікавіўся работай абкома?

Багдан нешта невыразна хмыкнуў, потым, патузаўшы лейцы, выціснуў неахвотна:

— Сумненне ў мяне ёсць... Сумненне, што Ціхан Крупня не ўсё чытае, што на яго адрас насылаецца. Каб ён прачытаў маю скаргу — ці як камбрыг прачытаў, ці як сакратар абкома прачытаў,— дык гэткі мемарандум мне б не жарнулі.

— Упершыню чую пра нейкі там «мемарандум». Пакажы, калі давяраеш.

— Вам я давяраю. Таму і гаворку завёў.

Багдан папоркаўся ў кішэні старога, дужа заношанага фрэнча і працягнуў Захару два аркушы сіняй паперы, густа спісаныя фіялетавымі чарніламі.

— Але ж гэта не Ціханава рука! Почырк яго добра ведаю!

— Мне ў штабе ўручылі. «Стыліст» уручыў дый напярэдзіў шчэ, каб і сам я і жонка до-обра вывучылі.

Дарога была цяпер няроўная, і сінія аркушы, выдраныя з старой бухгалтарскай кнігі, увесь час уздрыгвалі ў руках, словы дугаліся перад вачыма. Але чытаць было лёгка — словы сядзелі паміж тоўстымі чорнымі лінейкамі не густа, кожная літара была выпісана чотка і добра.

«Таварышу Роўда Багдану Кандратавічу,
партызану атрада «Смерць фашызму».

На вашу скаргу-заяву аб разводзе вас з жонкай і пераводзе яе ў другі ўзвод і на іншую кватэру тлумачу: па-першае, ніхто вас з жонкаю развесці не можа і не збіраецца. Улічыце, па-другое, што зараз і вы самі, і ваша жонка знаходзіцеся ў вайсковай арганізацыі — партызан-

скім атрадзе, у якім, несумненна, існуе дысцыпліна, існуюць не асабістыя патрэбы, а толькі, і галоўнае, грамадскія, якія маюць свой напрамак мэтам агульнай сумеснай барацьбы ўсіх грамадзян Савецкай краіны супраць фашысцкіх захопнікаў. У гэтым змаганні і ў гэтых абставінах вы, як партызан і народны мсцівец, павінны падыходзіць па-бальшавіцку: што «личное в обществе — ничто». Тысячы мужоў з рознымі вайсковымі спецыяльнасцямі знаходзяцца зараз у Чырвонай Арміі альбо партызанскіх атрадах, пакінуўшы свае сямейcтвы — жонак і дзяцей — у імя барацьбы з ворагам, абароны Радзімы. Сотні жонак гэтых мужоў знаходзяцца таксама ў арміі, служаць Радзіме на розных армейскіх работах, як урачы, медсёстры, сувязісты, кулямётчыцы, лётчыцы. І яны не ставяць пытання, каб ім стваралі ўмовы разам знаходзіцца ў адным палку, нават у адной роце, узводзе, аддзяленні. Як вы лічыце, свядомыя людзі, што ўзняліся на абарону Радзімы, могуць гэтак ставіць пытанне? Як вы думаеце, ці магчыма ўвогуле рабіць гэтак, як хочацца некаторым асобам, збіраць у арміі з усіх вайсковых часцей і з усіх месц гэткіх жонак і пасылаць іх да сваіх мужоў ці збіраць мужоў і накіроўваць іх на месцу службы сваіх жонак? Напрыклад: муж — танкіст мотапяхотнай часці, жонка — сястра якога-небудзь санбата, альбо сувязіста якога-небудзь штаба. Дык што, загадаеце санбат альбо штаб размясціць у такім месцы, дзе знаходзіцца ваша танкавая часць? Хіба ж гэта дапушчальна? Хіба ж свядомыя нашы патрыёты ў гэткія суровыя дні для нашай Радзімы і народа, якія на жыццё і смерць змагаюцца з фашыстамі, могуць гэтак ставіць асабістыя пытанні? Не! У іх няма іншых пытанняў, акрамя агульнай барацьбы з ворагам. Вы памыляецеся. Памысліце сур'ёзна. Камандаванне атрада ставіць вас у адну роту, жонку ж — у другую, памятаючы і ўлічваючы вашы якасці, маючы на ўвазе, што вы найбольш карысны ў той роце, дзе знаходзіцеся, а ваша жонка прынясе больш карысці менавіта ў іншай. І што тут такога шкоднага? Хіба гэта прымус, каб разводзіліся? Ваша сямейна-бытавая сувязь, ваша любоўнае сяброўства ад гэтага не парушыцца. Гэта ж ясна і бясспрэчна. Наадварот, калі ў вас абодвух, маючы ў наяўнасці ідэйныя агульныя погляды, адны мэты і задачы ў сучасным жыцці, баявым жыцці, змагаючыся разам плячо ў плячо са смерцю за жыццё, якое адбірае вораг у нас з вамі, таварыш Роўда, нашу волю, нашу мову, наша правы, нашу самастойнасць і незалежнасць, нашу ра-

дасную будучыню, хоча парабаціць, зрабіць рабамі, забраць усе чалавечыя пачуцці і інстынкты,— ваша любоў і сяброўства зробяцца яшчэ мацнейшымі і непарыўнымі.

Думаецца, што памылковасць вашай заявы-скаргі вы зараз зразумелі. І гэтае разуменне, я перакананы, паслужыць таму, што адкіне ўсё непатрэбнае, дробязнае, узмацніць вашу нянавісць і злосць да фашысцкіх акупантаў і ўсіх ворагаў. Адначасова паведамляю вам, што камандаванню роты даецца ўказанне аб урэгуляванні вашага патрабавання, палепшання санітарна-бытавых умоў.

Начальнік штаба атрада Яштокін.
12 сакавіка 1943 года».

Дачытаўшы аркушы да канца, Захар моўчкі вярнуў іх Багдану. Было сорамна і крыўдна. Сапраўды, як Багдан кажа, мемарандум! Бездапаможны. І чаму Яштокін нічога не ўзгадніў з ім, Захарам? Не, ён жа казаў неяк, што трэба, як тое вынікае з рэзалюцыі Ціхана па Багданавай заяве, даць грунтоўны адказ. Пісьмовы. А ты, быццам смехам, і пагадзіўся: садзіся і пішы, калі не маеш іншага занятку. А Гусараў, здаецца,— быў жа тады ў штабе — ухваліў намер Яштокіна: пісьмовы адказ, маўляў, зробіцца фактам сур'ёзным, станоўчая пагудка пойдзе па ротах. А ты што зрабіў? Махнуў рукою: пішыце, маўляў, пішыце... А Багдан вось як да ўсяго паставіўся: «стыліст» уручыў, маўляў... Колькі пагарды і непавагі!

Гаманіць з Багданам аніякага жадання ўжо не было: тая гаворка, да якой Захар рыхтаваўся, губляла цяпер сэнс. У чым ён будзе пераконваць Багдана? Няма ў чым. Лаяць? Няма за што! Калі ён сапраўды кахае Чаславу, дык што тут паробіш нейкім вайсковым загадам? Лаяць, хутчэй за ўсё, і лаяць сур'ёзна, трэба, у першую чаргу, яго, Захара! Лаяць за тое, што своечасова не зразумеў Багдана, палічыў, што дасталкова яго, камандзірскага загада. Захарава прамалінейнасць спарадзіла гэтыя бездапаможныя тлумачэнні. А гэта ж — дакумент! А што, як Багдан пусціць у рукі жартаўнікоў гэты «мемарандум»?.. І слоўца ж знайшоў, дакладнае знайшоў вызначэнне! Цікава, ці даваў ён чытаць яшчэ каму-небудзь?..

Маўчанне прыгнятала, але першым не вытрываў Багдан, запытаўся глуха:

— Правільна, скажыце, штаб нам з жонкаю піша? Як вы лічыце?

«А сам ты як лічыш?»

Запытанне ўзнікла адразу, як толькі Багдан парушыў маўчанне. Але гэтае «нам з жонкаю» ўзварушыла ў Захаравай душы старую непрыязнасць, крыўду за сваю сястру, і ён прамовіў бязлітасна:

— Правільна! Можна было б больш доказна. Але, паўтараю, у галоўным — правільна ўсё растлумачана.

— Правільна, значыцца. А чаму ж тады маладыя нашы перад вяселлем гэткага мемарандума не атрымалі? Хаця...— Багдан засоп, на яго губы выплыла спачувальная, поўная пагарды ўсмешка.— Дзяк саграшыў — ціныня. Мужык з тропу збіўся — у званы лупяць... Гэта справядліва?

— А ты сам як лічыш? — пытанне, якое стрымліваў у сабе Захар, вырвалася наўпярок волі.

— Маё «я» лёс пад увагу не бярэ. Тут, скажам, у адзін бок хочаш. І душою і целам хочаш... Абставіны ж — у другі бок вернуць...

— Значыцца, не лёс усё-ткі — абставіны. Абставіны, май на ўвазе, ёсць катэгорыя рэальная, іх і ўлічваць неабходна. І прадбачыць.

Сцверджанне давала прастору для спрэчкі, і Захар знарок не ўдакладняў яго, спадзеючыся, што Багдан такую магчымасць не адкіне. Багдан жа нічога не запярэчыў, толькі ціха, праўда, не таячыся, уздыхнуў:

— Яно правільна, безумоўна... Аднак жа бачыце, што ад млына засталося? Прыгожы млынок, і людзям добра служыў. А што засталося ад той дабрыні?.. Попел ды вуголле!

Унізе за густымі, у жаўтлявай квецені лазнякамі чарнелі сцены спаленага млына. Сумеўшыся ад дзіўнага і незразумелага ўзрушэння, Захар папрасіў Багдана спыніць каня, саскочыў з рысоркі і нетаропка падыбаў да напаўразбуранай плаціны. У снежні мінулага года восем дэсантнікаў, якія ішлі з Асвейшчыны пад Лепель, вялі тут няроўны бой з гітлераўцамі. Дэсантнікі перайшлі ўночы чыгунку і Дзвіну, і Захар гутарыў з іх камандзірам, раіў застацца ў Завалынцы і адпачыць. Але яны рушылі далей, спыніліся адпачываць на млыне, і рана-ранепька да млына падкацілі на трох машынах гітлераўцы. Дэсантнікі біліся нават тады, калі млын гарэў, і ўсё ж не вырваліся, загінулі ўсе да адзінага. Гітлераўцы страцілі ў тым баі дзве машыны і дваццаць пяць чалавек. Застава, якая была непадалёк, паспрабавала ўвязацца ў бой, але па ёй ударылі з мінамётаў, і яна адышла. Захар па трывозе ўзняў

тады ўсю другую роту цалкам. Але яна спазнілася — гітлераўцы ўцяклі.

Убачыўшы цяпер рудыя, як гарачыя, касцякі машын, нагрувашчванне жалезнага ламачча ўнізе ля вадазліва, ён адчуў згрызоту, быццам толькі ён адзін і быў вінаваты ў смерці дэсантнікаў. Прынамсі, гэтак яно, у пэўным сэнсе, і ёсць: каб рота была на сваім звычайным месцы, а не на правы бок Дзвіны, ахоўваючы калону мабілізаваных, якая пераправлялася за раку, яна б магла паспець да млына раней, калі ён яшчэ не гарэў...

Захару падалося, што недзе блізка гудзе полымя, і ён азірнуўся, быццам спадзяваўся ўбачыць рэальны агонь. Дзівак! Той агонь даўно згас, толькі абвугленыя пікі паляў тырчаць з вады. І цені ад лазнякоў ля тых паляў змрочна трымцяць, загадкава мяняюць свае абрысы, як бы жывыя. Нібыта там, пад вадою, зусім не цені, а чоткія абрысы чалавечых твараў. І той, што пад самым вадазлівам, дужа ж нейкі знаёмы. Млынар! Сапраўды, яго гэта твар! Дзіўна, але ж Райнекі ў той дзень на млыне не было!

Ён ведаў, што Райнека за дзень да таго бою паехаў у Залюхава, дзе пахварэлі яго пляменнікі. Але цяпер тая акалічнасць — чаго ён адсутнічаў у дзень бою на млыне? — неяк дзіўна ўразіла.

— Млынара ты даўно бачыў? — спытаў Захар у Багдана, які стаяў ля рысоркі і разблытваў вузел на лейцах.

— На тым тыдні, як ехалі праз Залюхава. У Андрэя ён жыве.

— У сынавай хаце?

— Не, у братавай. У яго і сын Андрэй, і брат — Андрэй. Сын у арміі. А гэты, брат, настаўнічаў да вайны. Яго пад трыбунал упяклі — загад не выканаў. Жонка старога Андрэя з хлапчукамі і засталася — двайняткі. Млынар там як у прымах. А жонка даўно зямельку парыць. Дзіўны, часам, лёс людскі...

Багдан як бы папракаў Захара, сцвярджаў свой пункт гледжання. Перад вайною, у Полацку на мосце, конь млынара спалохаўся машыны і зваліўся ў рэчку. Млынар паспеў саскочыць, а яго жонка, разам з возам, звалілася. Ну, дык хіба ж гэта не лёс чалавеку — жыць?

— Чый жа гэта загад ён не выканаў? — спытаў Захар і моўчкі аблаяў сябе. Навошта ён пытаецца пра тое, што добра ведае? Як Багдана хоча праверыць!

— Загад камітэта па эвакуацыі,— сказаў Багдан і тут

жа, як спалохаўшыся таго, што ведае, патлумачыў, быццам размаўляючы сам-насам: — У вайну адны загады існуюць — вайсковыя... Н-н-но-а!

Багдан тузануў лейцы, хмурна засоп, нават крыху прыжмурыў вочы, нібыта адгароджваючыся ад далейшай гаворкі, і Захар ледзь стрымаў сябе ад новых запытанняў, якія, зноў жа наўпярок волі, узнiклі. Ведае ці не ведае Багдан, што старшынёю камітэта па эвакуацыі быў Ціхан? Калі ўжо ведае гэтыя, даваенныя, падрабязнасці таго выпадку на мосце ў горадзе, дык падрабязнасці пра брата млынара, напэўна ж, яму вядомы: і калі той загад быў аддадзены, і чый гэта быў загад, і што сталася з тым, хто яго не выканаў. Магчыма, гэтыя падрабязнасці не вельмі дакладныя. Але затое ў Багдана, відаць, ёсць зусім дакладныя і цвёрдыя меркаванні аб кожнай падрабязнасці і, несумненна ж, свая, асабістая, ацэнка ролі Ціхана ва ўсёй гэтай гісторыі.

— Вярні на Залюхава,— сказаў Захар, ведаючы, што рашэнне сваё не зменіць, і падлічваючы, што, відаць, болей за сем кіламетраў тут не набярэцца.— Пакоцім у госці да млынара!

— Да млынара дык да млынара,— спакойна пагадзіўся Багдан.

Ён перакінуў карабін з-за пляча на грудзі і сядзеў, націху пагойдваўся, абапіраючыся на прыклад локцямі. Крыху пасядзеў моўчкі, потым пачаў ледзь чутна спяваць. Словы немагчыма было разабраць, ды ці наўрад ці былі, існавала толькі мелодыя, мелодыя незнаёмая, ніколі раней не чутая Захарам. Але ў мелодыі чулася скруха, горкая развага, ад яе рабілася самотна на душы, і Захар нечакана падумаў пра тое, што гэтая скруха прыйшла таму, што асноўная гаворка з Багданам, дзеля якой ён ехаў да млына, не склалася так, як гэтага хацелася: нічога ён не высветліў, нічога Багдану не патлумачыў, ані ў чым, відаць, не пераканаў. Сабе толькі сэрца растрывожыў.

Дарога цяпер пайшла вузкая, з жоўтымі, добра падсохлымі пясчанымі ўзбочынамі, на якіх вострымі верацёнцамі зеляніўся дзікі лубін. Адразу ж за гэтай зялёнай вузкай лехай пачынаўся вольхавы хмыз, рассечаны роўным клінам празрыста-зялёнага сасонніку; на жаўтлява-белых свечачках маладых сасонак дзе-нідзе зіхатлівым россыпам ззялі кроплі начнога дажджу.

— Насморгаем зараз лекаў,— прапанаваў Багдан і націягнуў лейцы.— Паціху тупай, галубок,— і патлумачыў

Захару: — Пупышак зараз насморгаю. Мігам. Вы сядзіце...

Насморгаўшы поўныя прыгаршчы пупышак з маладых сасонак, Багдан зноў ускочыў на рысорку, накруціў галавой, услухоўваючыся.

— Як машына недзе загула.

— За Дзвіной, відаць. Надзейны сродак, гэтыя пупышкі, ад цынгі.

— Толькі імі людзі ад яе цяпер і ратуюцца,— пагадзіўся Багдан, жуючы сасновыя пупышкі.— Без солі ж людзі скрозь сядзяць па вёсках. І што дзіўна: як саслабее чалавек, дык на яго — бяда за бядою, хвароба за хваробаю. А кароста як пачала людзей есці! Мыла ж няма — вось і найшла гэтая пошасць,— ён усміхнуўся і паспяшаўся патлумачыць Захару прычыну: — Часлава, помніцца, як з палону выдраўся, ад яе мяне лячыла. Праўда, толу ў тлушч звыш меры натаўкла — скура на згон найшла, як дзёр хто.

— Скуры ў цябе нарасло. Чаго бядуеш?

— Ды я не бядую — прыгадалася... А пупышкі гэтыя, калі прызвычаішся, дык і салодкія. Праўда?

— Нічога...

Смолкая пахкая гаркавасць хвоі і сапраўды рабілася прыемная. Захар нечакана перастаў жаваць, уражаны здагадкаю: дык вось навошта Багдану спатрэбілася гаворка пра хваробу! Гэтай сваёю гаворкаю пра лекі, якія вынайшла Часлава, пра тое добрае, што зрабіла яна яму, ён быццам падкрэслівае чулае сваё стаўленне да былой жонкі: ён, маўляў, не трымае ў сэрцы злосці і непавісці, і яму, Захару, трэба прымаць усё так, як ёсць, як ужо склалася, і не імкнуцца нешта перарабляць.

— Вунь яна, сяліба,— заначыў Багдан, і Захару падалося дзіўным, што той, гледзячы зусім у іншы бок, убачыў хату наперадзе, за рэдкім голлем альхоўніку.— Як на хутары млынар жыве. Во ўжо да каго лёс паблажлівы...

Непрыхаваная зларадпасць гэтае заўвагі скасавала тую прыязнасць да Багдана, што была пасялілася ў Захаравым сэрцы, калі ён слухаў добрыя словы пра сваю сястру, і ён, гледзячы на шэрую сцяну будынiны наперадзе, спытаў сухавата:

— Усё на лёс спасылаешся?

— Каб жа я адзін! Вось Файзуло, калі дачуўся, што брат ваш, Ягор Елісеевіч, жывы, адно толькі і сказаў: лёс!

— Ягор — чалавек вайсковы, ён у сямі агнях пабыў.

— Хай сабе,— памяркоўна пагадзіўся Багдан.— А вось гэтае Залюхава! Фашыст у сорак першым паром маладзіў — уся вёсачка дымам пайшла. Андрэева ж хаціна — стаіць.

— Ручай убярог. Агонь жа да ручая дайшоў. А каб не ручай — згарэла б.

— Хата, скажам, ацалела. Затое ж гаспадар не ацалеў!

Злапомны, аднак, Багдан. І злосны. Усё з падкавыркаю ппецца гаварыць, як бы пасаліць хоча пеўпрыкмет. Паганая гэта рыса ў натуры чалавека, і Часлава, відаць, ранеї за ўсіх тое прыкмеціла. Вось і не склалася ў іх сумеснае жыццё.

«А ты хацеў, каб яно ў іх склалася?..»

Пытанне нічога не вымагала ад Захара. Але ён хацеў пэўнасці і яснасці, і гэтая яснасць да яго нечакана прыйшла. Не, ён не хоча, каб нешта зноў склалася ў Чаславы з Багданам. Не хоча і будзе ўсяляк садзейнічаць, каб лёс не звёў разам гэтых людзей.

— Туды кіруй, да сасны,— рэзка загадаў Захар.— Каня там пакінем, а самі — пешкі.

Багдан адразу пацягнуў лейцы:

— Тпру-у-у!.. А лепей ірвануць да самай хаты — тут спакойна цяпер. Да ракі яны не соваюцца. Толькі тым берагам, за лесам па шашы шпараць...

Захар не паўтарыў свой загад, моўчкі саскочыў на зямлю. Багдан таксама саскочыў з рысоркі, выцягнуў з-пад сена рапец і, узяўшыся за аброць, павёў каня ў сасоннік. Неўзабаве ён вярнуўся, стаў побач з Захарам, які, прыхінуўшыся да сасны, углядаўся ў бок ракі.

Сасна была тоўстая, але надта нізкая, у шырокіх рабрыстых гузах, круглых, падобных на скруткі мокрых вяровак, падзеленых светлымі палосамі, сонца прабівалася праз галіны. Светлая поўсць на скуранай бакавіне рапца быццам памалу варушылася і станавілася дыбкі.

— Добра каня прывязаў? — спытаў Захар.

— А навошта? Я нават раскілзаў яго — хай травіцы якой скубане. Там, на сасонніку, яна ёсць.

— Стралянс хто-небудзь з-за ракі, конь і збяжыць. А ты зноў па лёс наракаць пачнеш.

— Абстраляны. Не збяжыць,— і Багдан знарок вытыркнуўся з-за сасны. Прыхаваны Захараў смяшок, зусім не злосны, нават дабрадушны і шчыры, пакрыўдзіў, відаць, Багдана: упершыню за ўвесь час дарогі ад спаленага млына губы яго нядобра скрывіліся: — І лёс мой цяпер да мя-

не падабрэў. Горычы я нахлябтаўся на завязку, болей не ўлазіць. Цяпер — салодкае павінна ісці. Гэта ўжо закон.

— Ёсць хіба гэткі закон?.. Проста, думаю, чалавек разумнейшы робіцца. Раз падсмаляць, два падсмаляць — ён патыліцу і чухае.

— Пачухаць патыліцу ніколі не шкодзіць. Я таксама пераканаўся...

Багдан стаяў, шырока расставіўшы ногі, не тоячыся, нічога не баючыся. Знарок ён гэта робіць — дурная пыха, смешная і нікому непатрэбная фанабэрыя. Але адмовіцца ад яе ў яго ўжо не стае сілы. Загадай яму схавацца, паводзіць сябе больш асцярожліва — не паслухаецца. Багдан можа і пагадзіцца, прызнае правільнасць таго, што скажа Захар, але будзе рабіць усё толькі, каб паказаць, што ён і разумны, і асцярожны, і дальнабачны, і не горш за яго, Захара, разумее партызанскае жыццё.

Побач з непрыязнасцю да Багдана, якую Захар усяляк глушыў, выпіраў з грудзей дурны смех, і Захар, каб прыглушыць яго, адвярнуўся, смяяўся цяпер быццам над апошнім прызнаннем Багдана і, разам з тым, уважна аглядаў поле, што цягнулася да самага рачнога ўзвалу.

## 22

Рэзка крутнулася ручка, і дзверцы адчыніліся; Трапашка шумна плюхнуўся на сядзенне, павярнуў ключ у замку запальвання і націснуў на старцёр. Матор завёўся, Трапашка падмігнуў Кандрату:

— Тэхніка ў іх, паразітаў, як мае быць! Каб жа толькі нам свінні не падклала!

Ён закурыў, зноў падміргнуў Кандрату, сыпануў скорагаворкаю, нібыта баючыся, што яго перапыняць, не дадуць сказаць да канца тое, што яго дужа ж непакоіць:

— Не павінна падкласці. Астатняе, дзед, у нашых руках усё. А над нашымі рукамі — лёс. А сон мне быў — на ўдачу. Ведаеш, што снілася? Даваеннае жыццё, заводскае — як падзяку мне аб'явілі. І фота — бац! — на дошку Гонару. І ўсё, ведаеш, дужа ж яскрава снілася! І як мне руку паціскаюць, і як з павагаю віншуюць, і з якім даверам гавораць... А табе, дзед, даваеннае жыццё сніцца?

— Як калі...

— Значыцца, сніцца. Моцна яно сядзіць у нас, тое жыццё. Сэрца чалавечае благое хутка закрэсліць, благое

ў памяці доўга не затрымаецца, не асядае. А добрае — пакуль жывы чалавек, дык і помніць...

Машына кацілася па бруку, і зноў дугаліся, трымцелі падобныя на зялёныя слівы дзве лісцінкі на рудаватым капоце, і Кандрат, гледзячы на іх, сказаў, трымаючы палец на спускавым кручку:

— Зараз павернем на Савецкую.

— На Савецкую, дзед, нам патрэбы няма. Убаку яе пакінем.

— Ты чуў? На Савецкую вернем. І — у канец яе, да крамы. Ванду прыхопім з сабою.

— Навошта, дзед?

— Ты з казырамі едзеш? Дай жа і мне нешта ў рукі. Адтуль ужо — на чыгуначную.

— Фю-юць!.. А не баішся, што на патруль на Савецкай наскочым?

— Я сваё адбаяўся,— вялікім пальцам Кандрат перакінуў вечка засцерагальніка, бакавым зрокам згледзеўшы, што рука Трапашкі пацягнулася да кішэні.— Рукі на баранку. І май на ўвазе: я папярэджваць не буду.

— Стрэліш? — радасна спытаў Трапашка.

— І не толькі. Пацэлю дакладненька.

— Люблю цябе, дзед! Даўно люблю! — усё гэтак жа радасна выгукнуў Трапашка.— Ды не пістолю я выцягнуць намысліў — закурыць карціць. Хоць ты цыгарэціну з зубоў не выпускай. Закурыш, дык неяк спакой у руках тады. Акажы паслугу, дзед, выцягні закурку. У правым, у правым...

Кандрат запусціў руку да Трапашкі ў кішэню фрэнча, выцягнуў пачак цыгарэт і запальнічку. Прыкурыўшы з Кандратавых рук, Трапашка пыхнуў дымам і ўсё тым жа радасным голасам паўтарыў сваё прызнанне:

— Даўно цябе люблю, дзед. Даўно! Але — тоіўся, назіркам сунуўся за табою. Усё факцік да факціка складаў і памыліцца баяўся. І апошняя праверачка — Ванда...

— Збрахаў?

— Не, дзед. Але, думаю, калі ты савецкі чалавек — гэтак я намысліў сабе,— дык жа ж не кінеш сваю гаспадыньку ў бядзе. Сам гінуць будзеш, а яе — ратаваць памкнешся. І не памыліўся, як бачыш! І ты, дзед, стрэльбу ў другі бок павярні, на ўсялякі выпадак. Раптам якая праява — часу тады не будзе... Ды не бойся ты, дзед! Я — нашынскі,— і заспяваў:— «Бро-оня кре-епка...»

Кандрат зыркнуў на Трапашку з ранейшым недаверам:

— Рана пташачка запела!

Трапашка двойчы моцна зацягнуўся, наважыўся быў шпульнуць недакураную цыгарэціну ў акно, але стрымаўся, заціснуў недакурак у пальцах, сказаў зацята — злаваў, што яго не разумеюць:

— У самы акурат яна заспявала. Разумееш? І яшчэ: гадам Трапашка не быў. Анікалі — разумееш? — не быў і не будзе. Ну, памылкі рабіў, на дурноце маладой не ў той бок яго перла — гэта было. Дык што? З памылкаю калі, ужо і не жыць? Пляма на мне, ведаю... Але ў душы, дзед, я чысты. Я зямлі сваёй аддапы. Я пабрыдзь гэтую, захопнікаў гэтых праклятых непавіджу. Можа, болей за цябе нават... Я ж ім быў і паверыў. А яны хто? Брыда, пошасць, забойцы!..

Цыгарэціна трымцела ў Трапашкавых пальцах — дугаўся руль, і ад таго трэслася ўся рука,— і сіні дымок віўся над вузенькім слупком попелу няроўны, як састаўлены з кароткіх каленцаў. У душы Кандрата таксама ўсё трымцела, і ён перапыніў Трапашку, спытаў глухім ад хвалявання голасам:

— А з Багданам маім?.. Лухту па яго навярнуў, ці як?.. Толькі шчыра...

Выпусціўшы дым праз складзеныя трубачкай губы, Трапашка прамовіў са шкадаваннем:

— Запіска паступіла на Балаша — Багдан яе напісаў. Але што ў запісцы — не чытаў я. Той чалавек, што ў атрадзе, ведае. У яго і папытаем.

— Як прозвішча?

— Толькі твар ведаю — двойчы ўсяго бачыў.

— Як жа гэта? Імя нават не ведаеш?

— Гэдак жа як і мяне: Уладка і Уладка. А ці сапраўднае — праверым...

Машына мінула апошнюю паваротку вуліцы, якая ўпіралася ў цагляную сцяну былой нафтабазы. Крыху наводшыбе ад тратуара і спаленага двухпавярховага будынка былой школы шарэла драўляная крама, у якой два разы на тыдзень па талонах выдавалі спечаны напалам з нейкімі невядомымі дабаўкамі хлеб. Ля нізкага ганка віраваў, гэткі ж шэры, як і будынак, натоўп, падобны на куртаты клін, які не вастрыём, а тупым канцом упіраўся ў сцяну крамы. Ля дзвярэй бялеў знаёмы плашчык — стаяла Ванда.

— Ч-чорт... тваю маць,— вылаяўся Трапашка.— Здаецца, уліплі мы з табою, дзед! Зірні, што тут робіцца!

— Тое, што і заўсёды — чарга. І крама шчэ зачынена. Паспелі добра — Ванда ёсць!..

Трапашка націснуў на тармазы, машына падскочыла, дугнулася, лісцінкі, падобныя на слівіны, адарваліся ад капота, папаўзлі па ветравым шкле, пакідаючы звілістыя пісягі, і Кандрат, каб лепей бачыць, высунуўся з кабіны амаль па плечы.

— Добра, лічыш? Трэба назад! Развернемся — і кінцюры рвем!

— Навошта назад? — спытаў як у самога сябе Кандрат.— Пакуль што бяды вялікай не бачу. Таму мы гэтак робім: ты разверпеш машыну. І — стаіш. І матора не глушы. Чуеш? Каб адразу — на баявым...

Кандрат піхнуў дзверцу і выскачыў з кабіны. Ён надбег да натоўпу з карабінам напагатове, гукнуў уладарна:

— Чаго гармідар? У чаргу — станаві-іся! — і зноў, яшчэ больш загадна, закрычаў: — У чаргу-у! Шпэ-эль!

Натоўп развальваўся марудна, неахвотна, выкідваючы аднекуль з сярэдзіны глухія і злосныя воклічы:

— Гандлярка абкрадае нас!

— Праверце яе, пан паліцэйскі!

— Учора крупы прывезла. Сам бачыў. А сёння ўжо і няма, кажа!

— І хлеб прыхавала!

— Няхай адкрывае. Мы — праверым!

Па вузкім людскім калідоры Кандрат пратупаў да нізкага цаглянага ганка, на якім, трымаючыся аберуч за вялікі павясны замок, стаяла разгубленая Ванда. Прыкусіўшы ніжнюю губу, яна глядзела на Кандрата ўмольна, і яе вочы, спалоханыя, прыжмураныя, выразна прасілі яго аб адным, каб ён ішоў адсюль, уцякаў.

— Краму — адчыніць! Ключ сюды!

Кандрат упэўнена і ўладарна працягнуў руку наперад. Ён, мабыць, робіць адзіна правільнае з таго, што ўвогуле можна было прыдумаць: трэба адчыніць краму, неяк адцягнуць увагу ад Ванды, каб выйграць хоць крышку часу, каб папярэдзіць яе і паспець дабегчы да машыны. Трапашка казаў, што за крамай сочаць. Значыцца, той чалавек — а можа, і не адзін! — тут зараз, у гэтым натоўпе.

Ванда паслухмяна працягнула ключ, начэплены на зашмальцаваны жоўты матузок. Кандрат, узяўшы яго і азіраючыся, як зачапіўся позіркам за мужчыну, які стаяў бліжэй ад усіх і нічым, на першы погляд, не вызначаўся ад астатніх людзей у бедным, амаль жабрацкім адзенні:

моцна напошанае, з чужога пляча, сіняе паліто, латанае на рукавах і ля каўняра, гэткага ж колеру штаны і чорныя, невядома калі ваксаваныя чаравікі, з пашкрабанымі, загнутымі ўверх мыскамі. Да гэтага адзення дзіўна не пасаваў твар — сыты, укормлены, на якім ляжаў густы цень ад доўгага казырка карычневай, з бубачкаю пасярэдзіне кепкі; мужчына нахіліў галаву, паглядзеў управа, потым улева, і густы цень варухнуўся на твары, пасунуўся да вуха, і адразу ж сталі добра відаць яго вочы, чорныя, юрлівыя, і яны ўвесь час як бы некага шукалі ў натоўпе.

— Бяры! І адчыняй! — Кандрат кінуў матузок з ключом мужчыну ў сінім паліто.— Адчыніць. Усё, што яна схавала, адшукаць! Мы ёй накажам, як у людзей красці!— і груба схапіў Ванду за руку.— Адыходзь убок! Не замінай! Людзі цяпер без цябе абыдуцца!

Мужчына ў сінім паліто памкнуўся быў запярэчыць, перадаць ключ свайму суседу. Але натоўп прыціснуў яго да дзвярэй крамы, і шчыльная, вірлівая і гаманкая людская сцяна імгненна адкінула Кандрата і Ванду ад цаглянага ганка.

— Да машыны,— шапарнуў Кандрат і, быццам пад канвоем, не адпускаючы ад сябе ні на крок, павёў Ванду да машыны.— Яны высачылі цябе... Калі ўдасца — вырвемся ў лес,— і, зыркнуўшы на Трапашку, які ківаў,матаў галавою, патрабуючы спяшацца, дадаў таропкім пошапкам: — Гэтаму не давярай. Асцерагайся. У лесе высветлім...

Кандрат упіхнуў Ванду ў кабіну, уціснуўся сам, бразнуў дзверцаю. Кінуў позірк у бок натоўпу, які штурмаваў адчыненыя дзверы крамы, задыхана выціснуў толькі адно слова:

— Гані!..

Машына рванулася з месца і адразу набрала хуткасць. Кандрат выпадкова націснуў локцем ручку, дзверца адчынілася, ён ледзь не зваліўся на брук. Уратавала яго толькі тое, што наспеў уперціся нагою ў падножку. Трапашка быў тармазнуў. Але Кандрат зароў на яго:

— Не спыняйся! Гані-і!

— Куды вы мяне вязеце? Я хачу ведаць! — патрабавала Ванда, нахіляючыся да самага ветравога шкла, быццам збіралася скочыць праз яго на капот машыны.— Можаце толкам сказаць?

Трапашка зарагатаў:

— У сваты выбраліся! Там, пад сядзеннем, падарунач-

кі ляжаць. Цягні іх хутчэй, гаспадынька! О-о, марудна! Гэтак можна і вяселле праваroніць!

— Тут жалеззе...

— Злева, гаспадынька, шуруй! Злева! Грапаткі тамака — кожнаму па дзве. Памажы ёй, дзед! Ё?.. Ну вось! А казала ж — жалеззе,— трымаючы баранку руля левай рукою, Трапашка правай узяў у Ванды дзве грапаты на доўгіх драўляных ручках, паклаў ля сваіх ног і зноў рагатнуў: — Трэба, гаспадынька, пасаг і абараняць — твой жа вязём пасаг. І скажу табе, хвацкі — поўны кузаў напакаваны.

— А што там? — Ванда хітнула галавой на вузкае закратаванае акенца на задняй сценцы кабіны.

— Соль. Кансервы, пляшкі. Ін віно вэрытас. Гэтак сцвярджалі даўней мудрыя і разумныя людзі.

Ванда паціснула плячыма, сказала, падрабляючыся пад вясёлую Трапашкаву гаворку:

— Разумныя людзі ў кузаў бы паселі, каб лепей пасаг аберагчы.

— Ты, аднак, не толькі прыгожая, гаспадынька. Му-удрая! Чуеш, дзед, што нам гаспадынька кажа!

— Спыніся. Я ў кузаў ускочу. Тут, калі што якое, дык і стрэліць не паспееш.

— Чакай хвілю, у правулак зараз павернем. А ты, гаспадынька, бяры гэтую гармату ў рукі,— і Трапашка патыліцаю пастукаў у прыклад карабіна, які вісеў над закратаваным акном.

— Бельгійскі, — сказала Ванда. — Нязручная дужа зброя. Адно добра ў ім, у бельгійскім, што трапна б'е.

Машыну страсянула. Трапашка, не саромячыся Ванды, вылаяўся, прасачыў позіркам за тым, як яна абмацвае кароткі і цяжкі карабін, са смяшком заўважыў:

— Разбіраешся, аднак, гаспадынька. А можа, страляла з гэткага?

— Даводзілася.

— Ці не дзед мой гаспадыньку навучыў?

— Зашмат ведаць будзеш — хутка састарэеш.

— Мы не састарэем, гаспадынька, мы — маладыя памром. А не памром — застанецца дзед без гаспадынькі. Адаб'ю — чуеш, дзед? — я ў цябе гаспадыньку. І любіць, галубіць буду — неба плавіцца пачне. І штодня — песні ёй спяваць,— і Трапашка, пастукваючы правай даланёю па абаранцы руля, заспяваў: — «Вейся, вейся, чубчик кучерявый. Эх, да развевайся, чубчик, по ветру. Раньше, чуб-

чик, я тебя любила. А теперь — любить тебя я не могу...» — Трапашка пачаў насвістваць мелодыю, потым заспяваў зноў: — «Бывало, шапку оденешь на затылок, поїдешь гулять зеленым вечерком...» — змоўк, засмучаны, потым самотным голасам прамовіў: — Было, гаспадынька, было. І, між іншым, рана, сапраўды, птушачка, заспявала...

Трапашка ад таго дня, калі прывёў Ванду на Кандратаву сялібу, ніколі не называў яе імя, а толькі гэтак ласкава, крыху насмешліва-спачувальна «гаспадынька», і Кандрат з гэтым мірыўся. Але цяпер і безліч разоў паўторанае Трапашкам «гаспадынька», і бесклапотная песня, і яго фатыга ўзбунтавалі.

— Стой! — патрабаваў Кандрат.— Спыніся. Ці тармазні крышку.

— Гэта і робім,— і Трапашка, спыніўшы машыну, працягнуў Кандрату дзве гранаты.— Хай там, ля цябе, ляжаць: калі што якое — адтуль зручней шваркнуць. А нам і па адной хопіць. Ты гатовы, дзед?

— Гані! Гані!

Машына зноў ірванулася наперад. Скрыні з прасаванага кардону раз'ехаліся, і Кандрат засеў паміж імі, як у мяккім і ўтульным крэсле. Гранаты ён паклаў побач, прыстроіў на калені карабін і пачаў уважна ўглядацца наперад, гатовы да бою і небяспекі.

Брукаванка ўжо скончылася, пачаўся вузкі калдобісты завулак, застаўлены з абодвух бакоў драўлянымі, падобнымі адна на адну хатамі. Знаёмы завулак здаваўся Кандрату чужым. А некалі Кандрат прыходзіў сюды часта ў госці да свайго дружбака — заводскага каваля. Каваль той памёр за год да вайны, жонка яго паехала ў Ленінград да дачкі, збыўшы некаму хату. Пасля пахавання Кандрат тут болей і не быў. Вунь яна, тая хата. Нейкая малая дужа — тады, здаецца, большая была, прыгожа свяціла вокнамі. І ўвогуле, усе хаты па завулку нейкія счарнелыя, быццам не жывуць у іх. Не, вунь дым з коміна — паляць печ. І нейкі дым чорны, густы, як гуму паляць. І адразу да зямлі вецер гоніць дым — на непагадзь. А яна б няблага прыдалася зараз, непагадзь, каб дождж халодны ці туман — тады б з кантрольнага паста на дарозе машыну не адразу ўгледзелі. А тут, як на тое ліха, сонца смаліць пачынае, ажно мроіва над садамі трымціць. Дрэвы як у ружаватым сутонні плывуць. І неяк бязлюдна, ціхамірна наўкола. Магчыма, усё добра абыдзецца, і вырвуцца з горада яны без прыгод. Прынамсі, пакуль што ўсё да ўдачы

хінецца: Ванда — у кабіне, завулак — канчаецца, наперадзе зеляніцца пусты выган з адзіна-адзінай скрыўленай старой лазіною...

На выгане машыну пачало моцна падкідваць і трэсці. Кандрат зірнуў цераз борт і ўбачыў россып жоўтых маленькіх пагорачкаў. Гэта ж краты напрацавалі. Помніцца, на гэтым выгане каваль паказваў, як ён ставіць на кратоў пасткі. Усё нахваляўся, што жонцы кратовае футра зробіць... Так, сюды яны тады прыходзілі і вунь там, ля таго дрэва-крывулькі, сядзелі. А на выгане мроіва густое, лазіна тая быццам у тумане стаіць. І абрысы нізкіх бліндажоў ля кантрольнага пункта, і чорная піка шлагбаума, задранага, як гармата, над дарогаю злёгку трымцяць. Калі і пачнуць страляць адтуль — не пацэляць. Але пакуль што ціха, і нікога ля бліндажоў не відно — ляжыць, відаць, варта, угрэлася на сонейку. А можа, снедаць узяліся — гэта яны не прапусцяць, з каваю сваёй і на хвілю не спозняцца...

Машына, увесь час падскокваючы на пясчаных кратовых пагорках, адольвала выган. Кандрат з трывогай зыркаў то на дзве цёмныя каляіны, што разматваліся ззаду на траве, якая шчэ не прасохла пасля начнога дажджу, то на чорную піку шлагбаума над дарогай, і сэрца яго калацілася. Яшчэ б крышку! І тады — яны, лічы, выскачылі... Здаецца, гэтак яно і будзе. Наперадзе алешнік, за ім пачынаецца нізіна, а за ёю і лес ужо блізка, і бліндажы накрысе пачынае захінаць пагорак у канцы выгану. Сапраўды, усё дакладна разлічыў Трапашка, усё ўзважыў, усё прадугледзеў. І хто ж ён у сапраўднасці? Чалавек, які памыліўся жорстка, па дурноце трапіў у фашысцкае ярмо і цяпер хоча выдрацца на волю, выправіць сваю памылку? А мо хітра замаскіраваны здраднік?.. Памятаеш тую гаворку ў садзе, калі ён заявіўся з Вандаю?.. Ты не давяраў яму тады ані ў чым. Больш таго, ты палічыў, што ад яго ідзе пітачка да бяды, што напаткала Балаша. Пітачка! Якая тут у чорта пітачка! Цяпер жа ўсё ясна! Цяпер усё высветлілася! А ён, стары дурань, чым заняўся? Спрабуе дакапацца да праўды аб Трапашку! Што табе тая праўда? Ты ламай галаву над тым, як далей не пакаўзнуцца! Як Багдана ўратаваць! Як Захару ў вочы зірнуць!.. А можа, Захар даўно ўсё ведае і чакае цябе, каб разам з сыночкам да сценкі паставіць адразу ж? А можа, Трапашка таксама, як і Ванда, яго, Захараў, чалавек? Во дзе табе патэльня будзе! А нешта на тое і падобна. Гэтая нізіна, бы шаша —

гэтак, як і казаў Трапашка: кацiся і песні спявай. А ён і насвістває нешта, і рагоча, і жартуе з Вандаю... Нсяк падазрона гладка ўсё ў іх складася! Машыну ў момант загрузілі, Ванду ўзялі, з горада вырваліся — пад самымі ж бліндажамі праскочылі. І там, ля крамы, патрулёў аніякіх не было. Гэта блага, вельмі блага, калі ўсё ідзе гладка, як па масле коціцца... А што ж гэта там? Ці не людзі сярод хмызняку? Так, людзі! У чорным адзенні! Нейкія няўклюдныя, тоўстыя. Узброеныя! Але ж адкуль ім тут быць? На ноч, відаць, у засаду пад лес хадзілі. Цяпер вяртаюцца назад. Апошнім часам фашысты ўсё часцей робяць гэткія засады вакол горада, і паліцэйскіх туды не ўключаюць...

Кандрата кінула ў пот. Дрогкая смуга заслала вочы, і ён ліхаманкава цірнуў па іх рукавом, схапіўся за карабін і грукнуў кулаком па верху кабіны. Там гэты ўдар не пачулі, і тады ён сагнуўся пад бортам. Машыну страсянула, жалезная дужка зачэпкі барта балюча ўдарыла Кандрата ў грудзі.

— Засада! — стогнучы ад болю ў грудзях, гукнуў ён у кабіну.— Фашысты!

Трапашка рвануў дзверцу, левай нагою стаў на падножку, а правую па-ранейшаму трымаў на акселератары, і машына неслася.

— Дзе? — прасіпеў Трапашка, матляючыся разам з дзверцаю з аднаго боку ў другі.— Дзе ты іх бачыш?

— Вунь! У хмызняку!

— Тваю мацьʼ... Японскі бог! Што ты мне галаву дурыш? Нікога там няма!

Трапашка не ціснуў на газ, машына адразу пакацілася цішэй. Сінявае мроіва парадзела, чорныя постаці сярод купак хмызу як выпарыліся, цяпер там нерухома стаялі нізкія кудлатыя купкі ядлоўцу.

— Як па неба ўзляцелі,— Кандрат разгублена пачухаў патыліцу.— Памыліўся! Гэта ж ядловец чарнеў.

— Маліся богу, што памыліўся. Бо каб там была засада, мы б з табою, дзед, і сапраўды на неба ўзляцелі!

Лаючыся, Трапашка з усяе моцы бразнуў дзверцаю, даў газ, і машына зноў панеслася да блізкага зусім узлеску, які быццам рассякала надвая вузкая дарога. Машына працеслася па ёй, вылецела на лугавіну, сціснутую з усіх бакоў маладым гонкім бярэзнікам. За бярэзнікам пачаўся густы асіннік, потым па ім усё часцей пачалі пракідацца яліны. Неўзабаве лес пайшоў густы, змрочны. Пуцявін, па-

добных на дарогі, тут было шмат. Але Трапашка не спыняўся, вёў машыну ўпэўнена, як бы добра ведаў усё наўкола.

Нечакана наперадзе пасвятлела, адкрылася нейкае поле, і Трапашка, збавіўшы хуткасць, крутнуў з лясной дарогі на ўзлесак, загнаў машыну пад доўгае голле бярозы, што як бы адасобілася ад усіх дрэў і высунулася бліжэй да поля, выключыў матор.

— Чаго спыніўся? — Кандрат прыўзняўся ў кузаве, потым нахіліўся да Трапашкі, які вылазіў з кабіны з карабінам у руках.

— Рэ-ка-гна-сці-роў-ка,— па складах прамовіў Трапашка і сеў на траву, потым адкінуўся на спіну, ляжаў, быццам нежывы.

— Час губляем. Нельга. Чуеш?

— Чую, чую. Але ж і памаргеліць трэба. Перш-наперш робім фрыштык, як немцы кажуць,— Трапашка марудна ўзняўся, стаў на кола, перагнуўся цераз борт.— Пару бляшанак бяром. І пляшачку прыхопім. Ву-унь з той кардонкі цягні, дзед. Вось, вось — гэта і трэба.— Ён саскочыў на зямлю, паставіў у траву дзве бляшанкі кансерваў, пляскатую пляшку і сказаў Вандзе, якая выбіралася з кабіны марудна і неахвотна, як баючыся: — Рыхтуй сняданак, гаспадынька. Хлеб там, у багажнічку. І нож маеш,— і, выцягнуўшы з ножнаў цясак, удзюбнуў яго ў зямлю.— Цяпер дзед бярэ карты ў рукі. Я сваё зрабіў — з горада вас выкаціў з камфортам.

— А дзе мы зараз? — Ванда азіралася ўстрывожана.

— Чорт жа яго ведае. Недзе непадалёк ад Дзвіны. Трэба агледзецца. У які бок рушым, дзед?

Кандрат зірнуў на сонца, азірнуўся наўкола, потым рашуча хітнуў галавою ў правы бок:

— Туды, думаю. Дзвіна, здаецца, недзе там...

— Можна і туды. Цяпер нам баяцца няма чаго. Але вуха варта трымаць трубкаю...

Па краі ўзлеску яны не прайшлі і кіламетра, як наперадзе адкрылася далеч, перакрэсленая цёмнай стужкай далёкага лесу. Ніжэй яе жаўцеў высокі гліністы бераг. Кандрат пазнаў яго, ад радасці сеў на граніт пад бярозкаю, доўга глядзеў перад сабою, слухаў звонкі спеў жаўрука, што ляцеў з боку поля, і ўсё ў яго душы салодка замірала ад шчаслівага ўзрушэння і ад раданага адчування волі; жадання некуды ісці далей, нешта рабіць зусім не было.

— Пазнаеш мясціны? — нецярпліва спытаў Трапашка.

— Але... Дзіўна. У-унька яна там, унізе, за бярэзнікам. А лес — гэта ўжо па той бок.

— А вёскі тут якія? Нешта ж не відно селішчаў.

— Тут Залюхава не вельмі далёка. І Падкасцельцы насупраць тоі паваротні, дзе гэты жоўты бераг відзён. Вёсачка там ля вады, адсюль не відно. Адтуль лес на лесапілку возяць — дарога туды ёсць.

— А Ліцвінава ў нас, значыцца, за спіною?

— Прыблізна. Але туды далёка. І не прабіцца там — завалы партызанскія скрозь. Трэба тут, па-над Дзвіною Залюхава калі праскочым — застава партызанская нас стрэне. Каб жа толькі па нас не жарнула.

Да Трапашкі вярнуўся вясёлы настрой, і ён засмяяўся:

— Што, каленкі затрымцелі? Весялей галаву, дзед! Фартуна сёння з намі. Патупалі назад!

— Я тут застануся. А ты — гані машыну сюды.

Прапанова была разумная. Але яна нечым прыйшлася не па душы Трапашку, і ён, павагаўшыся, сказаў рашуча:

— Не пойдзе, дзед.

— Чаму? Гэта ж разумна я кажу.

— Хай сабе. Але здружыліся мы ўжо. Дык давай адзін за аднаго і трымацца скрозь. Пайшлі спачатку гаспадыньку нашу супакоім, удачу абмыем. Ніхто ж не ведае, што нас наперадзе чакае.

— А можа, яе, Ванду, на разведку пашлем? Адна яна ў атрад лягчэй дабярэцца. Болей шанцаў!

— Не пойдзе, дзед! Разам вырываліся? Разам і далей рушым. На міру, як гаворыцца, і смерць красна.

— А ты што, паміраць сабраўся?

— Не, дзед, паміраць ахвоты аніякай няма. Нам з табою шчэ пажыць ахвота. І гаспадынька наша тое ж самае скажа. Праўда ж?

Кандрат са згодаю кіўнуў галавою. На Трапашку ён не зірнуў, тупаў з ім побач, апусціўшы галаву, баючыся, каб той не заўважыў у яго вачах цеплыні і ўдзячнасці за гэтае жаданне не пакідаць яго, Кандрата, аднаго, не пасылаць у разведку Ванду, а трымацца ўсім разам. Ён адкрываў цяпер у Трапашку новыя рысы — свойскасць і шчырасць, пачынаў прыхільна думаць аб ім, але цалкам яму давяраць па-ранейшаму не мог адважыцца.

23

За стройнымі, як верацёнцы, вольхамі, з яркай і дужа дробнай лістотаю, добра была відаць сяліба, пустынная, маўклівая, нібыта даўно пакінутая чалавекам, ды кавалак дарогі за ракой, пад самым лесам. Узвалы былі жаўтлявыя, месцамі ружаватыя ад густой квецені па старых клёнах, што раслі ля самай вады; клёны і лазнякі гайдаліся ад ветру, і таму шэры кавалак дарогі ў лясным прагале і чорныя прамавугольнічкі машын, падобныя на вялікіх мурашоў, быццам паціху вагаліся; вагаліся і чорныя, бы кветкі з доўгімі і вострымі пялёсткамі, плямы, якімі быў густа пакраплены поплаў; часам, калі парывы ветру цішэлі, з-за ракі даносіўся слабы гул матораў і зноў знікаў, як адсечаны.

— Хутка ж яны масток адрамантавалі,— зазначыў Багдан, пахваляючыся ўдалай аперацыяй, у якой прымаў удзел на тым тыдні разам з падрыўнікамі.— Мы яму копаці далі! Спрабавалі спаліць, дык не ўзяўся. А мінамі ад палкавога добра: за стабілізатар да ўстояў прывяжам — і гайда. Толькі трэсачкі ад паляў. І пыл.

Багдан засмяяўся, рэзкім рухам паправіў рэмень ранца, і па скураным версе ранца гайдануліся светлыя сонечныя плямы; жоўты ворс зноў выгнуўся, бы стаў дыбкі, і Захара яшчэ раз уразіла тая ж думка, што завітала да яго дарогаю: відаць, і не сніў гаспадар, што гэты ранец будзе на спіне партызана, а сам ён, гаспадар, будзе забіты далёка ад роднага дома, на чужой яму зямлі...

— Нешта не відно млынара нашага,— нездаволена прамовіў Захар.

— Спіць недзе. Ці на сонейку пячэцца.

— А ты злосны да людзей, Багдан!

— Аналізую абставіны, як вы тое раіце.

Хуткай хадою яны перайшлі ўзмежак, што пачынаўся амаль ад самай сасны і вёў праз увесь гародчык да самай хаты; сцяна хаты ад лесу была глухая, без акон. У кутку падворка, пасярэдзіне чыста і дбайна падмеценага, у грудку свежых трэсак жаўцеў бярозавы кругляк, да якога быў прыхілены кавалак тоўстай дошкі, абсмаленай з аднаго боку, з вялікай карычневай меціпай ад сучка; сучок вываліўся, дошка здавалася як прабітая навылёт, і гэтая дзюрачка, прадаўгаватая, з карычневымі, як надпаленымі, краёчкамі нагадвала весела прыжмуранае вока; на дзвярах хаты ў вечку жалезнай клямкі тырчаў тоўсты цвік, прывя-

заны адным канцом да скручанага ў дзве стволкі раменьчыка; сіняе абшарпанае акно было адчынена.

З боку агародчыка пачулася блізкае бразганне металу, коратка заржаў конь, і Захар, паклаўшы рукі на тонкія бярозавыя жардзіны, зазірнуў за паркан. У канцы ўзаранага кліна, што пачынаўся адразу за агародчыкам, але быў адгароджаны ад яго гэткім жа, толькі ніжэйшым і вельмі рэдкім парканчыкам, горбіўся Райнека. Млынар, калі Багдан коратка свіснуў, павярнуў галаву, але не скрануўся з месца, прыгнуўся яшчэ больш.

— Гайда туды,— прапанаваў Багдан.— Паглядзімо, што ён там майструе. Барану, здаецца, рамантуе...

Райнека сапраўды прыбіваў да бараны новую планку, замацоўваючы старую і надламаную. Ён быў у пінжаку, чыстым, палапленым на спіне і рукавах. Побач стаялі абшарпаная сявёнка-лазовік, дапаўна насыпаная ячменем, і руды мех, напалавіну пусты. На мяху ляжалі абцугі і сякера з новым, дбайна abструганым тапарышчам.

Райнека адказаў на прывітанне ўзрадавана, нібыта даўно чакаў на сваім полі гасцей. Але твар яго, даўно няголены, з чорнымі ценямі ў вачніцах, быў змрочны, і Захару здалося, што ён бачыць гэты твар упершыню; вочы былі, аднак, знаёмыя, усё тыя ж — вёрткія, хітраватыя.

Захар, нагнуўшыся, падтрымаў барану, у якую Райнека забіваў абыржавелы зверху і адшараваны да бляску знізу кароткі жалезны зуб, пажартаваў:

— Зацягнулі вы пасяўную, таварыш Райнека. Упусцілі лепшыя тэрміны. Бярыце нас у памагатыя!

— Бяру,— адразу пагадзіўся Райнека, але ў голасе прагучала злосць.— Добра, калі памагатых маеш,— ён паставіў барану на рабро, пастукаў малатком пасярэдзіне новай планкі.— Прыстаўце сюды сякерку. І трымайце. Мацней толькі. А я — малаточкам... Вось, цяпер гатовая...

Райнека сунуў малаток і абцугі ў правую кішэню, кішэня абвісла, штрыфлі выцягнуліся ў розныя бакі, і пінжак выглядаў цяпер смешна, бы зроблены з розных палавінак па даўжыні; твар Райнекі па-ранейшаму змрочны, у густой шчэцці няголеных шчок — таксама бы падаўжэў ад гэтага, як бы перакасіўся правы бок. Райнека пачаў ладзіць пастронак да бараны, і Захар з цікавасцю разглядаў сякеру, якую ўсё яшчэ трымаў у руках; абух у сякеры быў сплясканы і з аднаго боку абламаны.

— Ёмкая,— ён пастукаў пальцам бліскучае, добра

натачапае лязо.— Тапарышча лоўкае. Само кладзецца ў руку. Кляновае, здаецца?

— Гэдак. Здаля яно сюды прыкаціла, з-пад Віцебска. Андрэй неяк, едучы адтуль, начаваў у дарожнага майстра. У Шлыка — вы ж яго ведаеце. Ён сырыя загатовачкі прывёз — у Шлыка тады на сядзібе клён навальніца звалі-ла,— ляжалі на гарышчы ў цыраце, сушыліся. Цяпер вось — ані расколінкі. Са звонам сякера атрымліваецца. Шлык, між іншым, на тым тыдні тут быў...

Апошнія словы Райнекі прагучалі як прапанова працягваць гаворку менавіта пра дарожнага майстра, пра той час, калі не было вайны. Але Захар рашуча ўхіліўся ад тае гаворкі.

— У кожнай справе — свая навука,— і дадаў жартоўна, як адсякаючы ўсю ранейшую гаворку: — Абавязкі як размяркуем?

У кудлатых бровах млынара заблыталіся завіткі стругавіння, белыя, дробныя, смаляныя; над правым брывом гэтыя завіткі былі ў куточку, ледзьве трымаліся, а над левым прыляпіліся якраз пасярэдзіне, бы разразаючы брыво напалам. Млынар змахнуў іх рукавом, і Захар заўважыў непрыкмечаную раней цеплыню ў вачах. Райнека не злуе, ён сапраўды ўзрадаваны іх прыходам — стругавінне гэтае надавала твару змрочнасць і зацятасць.

— Як загадаеце,— адказаў Райнека.

— Мы не загадваем. Мы ў ваша распараджэнне паступаем.

— Тады гэтак: мы з вамі — сяўбу гонім. Багдан — з бараною. Баранаваў калі-небудзь?

— Навука не хітрая. Адолеем. З карабінам, мабыць, нязручна,— Багдан пачаў здымаць карабін, але тут жа спыніўся, пачаў нечага ўглядацца за Дзвіну, у шэры прагал між лясамі.— Заўважаць з таго боку, што тут людзі са зброяй — жарнуць.

— Адтуль — не,— супакоіў яго Райнека.— А вось на пагорак за ручаём — паглядаць трэба.

— А там што? Там жа — лес!

— Вось туды і прыязджаюць з горада — на лесапілку бёрны бяруць. Праўда, на бераг не выходзяць. А ўчора ўночы за Дзвіной канцэрт быў. Вунь як лугавіну пакроілі! Гэта ж з мінамётаў па дзіках лупілі. Дзікоў за партызан прынялі ўночы.

Захар, зразумеўшы, што чорныя плямы на поплаве — сляды выбухаў мін, прысвіснуў:

— Фю-ю-ю... Гэта ж дзікі, відаць, да тых дубоў ішлі леташнімі жалудамі паласавацца!

— А засада ля моста сядзела — гадзіны дзве смалілі. Але, здаецца, не пацэлілі. Дзіна Піліпаўна паехала за раку. Вернецца — раскажа.

Захар здзівіўся:

— Што, толькі дзеля гэтага і паехала?

— Не, заданне мае ад Юршы. Прасіў ён, каб сход правяла ў Купліках. Гэткі ж, як і ў Завячэллі, каб сродкі сабраць.

— Сход? Што, яна яго ў гарнізоне, перад бункерамі будзе праводзіць?

— Не, па хатах пойдзе — да людзей надзейных. Калі ў каго што і засталося каштоўнае, дык захавана ад агню, ад чужога вока... Але на свае танкі, каб сваім памагчы, усё з ахвотаю аддадуць,— сказаў раптам зусім пра іншае: — Сеяць будзем гэтак: я — на левы бок. Вы — на правы...

Райнека паправіў сявёнку, якую ён пачапіў сабе на грудзі. Сявёнка была дужа старая, лазовыя пруткі на верхняй вязцы патрэскаліся, у адным месцы, з левага боку, зусім зламаліся і вострымі краямі ўпіраліся ў палатняны пінжак, быццам прапаролі тканіну.

— Сеялка, аднак, дужа ж старасвецкая,— заўважыў Захар.

— Я ўжо і гэткай радуюся. А то сядзеў, сядзеў... І сеялкі няма, і насення няма, і цягла няма...

— Як гэта? У нас строгая дырэктыва райкома: атрад у сваёй зоне нясе поўную адказнасць за веснавую сяўбу! Вы мне нешта новае гаворыце...

— А ў нас жа не зона,— Райнека павёў рукою ў бок Дзвіны.— Нейтралка!

— Усё роўна. Насенне кожнаму выдзелена. І цягло таксама. Вам што, насенне хіба не далі?

— Выдзелілі. Зерне ёсць, але ж каня не падзярэш па часткі — ён у нас па чарзе. Мне — сёння выпала, і назаўтра — тут, у Залюхаве, конь.

— Ды шчэ і памагатыя прыехалі. Пагналі?

— Ну... толькі вы жменю паўней бярыце... І рукою — вольна гэтак. Тады роўна зерне кладзецца...

Зерне ўсярэдзіне лазовіка здавалася цёплае, мяккае, нейкае, а ўнізе і ля сценак халаднаватае, як бы пругкае. Захар узяў адно зярнятка, паклаў у рот, раскусіў. Пасля

вязкай сасновай гаркавасці, якая ўсё яшчэ трымалася ў роце, смак сухога ячменю быў саладжавы.

Райнека ўзмахнуў рукою, зноў зачэрпнуў поўную жменю зярнят, зноў паўтарыў, быццам вучыў чалавека зусім недасведчанага:

— Рукою вольна гэтак робце. Тады рассяваецца раўней...

Ён урачыста, з засяроджанай увагаю абтрос руку і зрабіў крыху запаволены, але моцны ўзмах. Захар рабіў гэткія ж рухі, і зерне з яго жмені рассыпалася ў паветры таксама роўным жаўтлявым колам, падала на чорную раллю, надскаквала, скатвалася ў разоры і на блішчастых ад вільгаці скібках наблісквала кропелькамі яркага сонечнага металу.

Захар з Райнекам раз за разам праходзілі ўзараны кліп з канца ў канец, і кожны раз Багдан вітаў іх пры сустрэчы ўрачыстым узмахам рукі. Ён пакінуў ранец на ўзмежку, а карабін усё ж не зняў, толькі павесіў яго цераз плячо прыкладам уверх.

Ісці па раллі было цяжка. Сонца пякло ў патыліцу ўсё мацней, аўтаматны рэмень рэзаў, муляў шыю, дыск біў у паясніцу, і Захар, ужо ўвесь мокры ад поту, папраўляў яго рэзкім рухам пляча. Стома, аднак, не прыгнятала, яна прыемна ўзбуджала, і Захар неспадзеўкі прыгадаў поле ля Зуёў, дзе ён летась, абганяючы бульбу, спаборнічаў са Шлыкам, і адчуў, што праца на гэтай вузкай лапіне зямлі, якая ўперлася адным канцом у прырэчныя лазнякі, дзівосна ўзвысіла яго над усімі падзеямі сённяшняй раніцы: узвысіла над той гаворкаю з Багданам, якую ён збіраўся правесці і нечакана скасаваў, узвысіла над скрухай і развагаю, што прыціснулі ля спаленага млына, узвысіла над одумам, які выклікала размова з Райнекам пра свайго брата Андрэя, які прывёз сюды — з гэткай далечы! — кляновыя палепцы на тапарышчы. Праца не толькі ўладарна і моцна захапіла Захара, але і няўмольна іначыла, перарабляла ўвесь свет яго душы. Тут, ля ракі, навідавоку ў ворага — машына час ад часу прыглушана вуркатала ўдалечыні за Дзвіною,— тут, на вясновым полі, на гэтай вузкай, не дужа дбайна ўзаранай зямлі Захар неспадзявана зразумеў тое, пра што часцяком думаў апошнім часам, не робячы для сябе пэўнай высновы: людзі спачатку верачь сабе, а потым ужо некаму яшчэ, і гэтую веру нельга перасяліць чалавеку механічна, бо яна павінна выспець у ім, прарасці ў чалавеку, як прарастае добрае зерне ў цёплай і добрай

глебе. Пустым і нікчэмным здаўся цяпер Захару папрок, які ён нядаўна зрабіў Багдану, папрок, які ён, аднак жа, рабіў з адчуваннем не толькі свае перавагі над чалавекам, якому гэты папрок быў адрасаваны, але і з адчуваннем таго, што ён, Захар, усё ведае, прадбачыць і разумее — папрок у тым, што Багдан, маўляў, усё хоча спісаць на лёс, у сваіх бедах толькі на яго і наракае.

«А Гайдаш ніколі на лёс не наракала...»

Дзіўна, як яна, гэтая думка, парадзілася тут, калі, здавалася, аніякіх падстаў на тое і няма. Але яна як бы вылузнулася з тых папрокаў, якія Захар упэўнена і задаволена рабіў Багдану, і цяпер, як нейкі цяжкі бумеранг, зрабіўшы кола ў яго, Захаравых, развагах, ударыла самога Захара, ударыла балюча, у самае сэрца, і ён адчуў згрызоту, і гэтая згрызота балюча прыціснула. Як жа ты, дружа, блага ведаеш людзей, якія побач з табою, якія слухаюць і выконваюць твае загады, якія вераць табе і следам ідуць. Ты блага ведаеш і зямлю, на якой жывеш, і тую радасць, якую яна, зямля, можа даць і дае тым, хто галубіць яе і апрацоўвае. Ты бачыў шмат разоў — мноства разоў і ў розных месцах! — сяўбу вясною, бачыў, як кладзецца зерне ў свежую раллю... Чаму ж ты толькі сёння, зараз вось, і не на мірным полі, а на полі, што мяжуе з бядою, на гэтых вузкіх чорных лехах, над якімі вісіць нябачная і, магчыма, не прадбачаная табою небяспека, ты адчуваеш тое, што праходзіла раней паўз цябе?.. Чаму менавіта адсюль, з гэтай вузкай лапіны зямлі пачынае адкрывацца табе зусім па-новаму ўбачаная, сапраўдная мудрасць жыцця, здольнасць разумець людзей па-сапраўднаму, разумець глыбока, разумець у горы і радасці, у бядзе і марах?..

Колькі разоў Захарава рука сутыкалася з калянай і шархоткай рукой млынара, і зерне не падзяляла іх, хоць і цякло між пальцаў, а зблізкала, цягнула адно да аднаго.

«Рука хлебароба. Якая яна моцная...»

Думка гэтая дзіўна расчуліла Захара. Шмат разоў, у абставінах самых розных, але больш у дні радасці ад удала завершанай працы, ён паціскаў рукі людзям, якія сеялі збожжа, рабілі іншую працу на полі, і дзякавалі яму за яго працу, тую працу, якую ён рабіў у школе, і рабіў, часцяком здаралася, разам з хлебаробамі на калгасным полі. Чаго ж цяпер дотык да чужой працоўнай рукі гэтак устрывожыў, усхваляваў, занепакоіў?.. Чужой працоўнай рукі... Не! Ніколі не былі яны табе чужыя, гэтыя працоў-

ныя рукі. Сёння твая рука і рука млынарова разам з адной сявёнкі бралі зерне і сыпалі на раллю, сыпалі, каб даць жыццё і яму, зерню, і даць жыццё і радасць тым людзям, якія збяруць яго, памножанае ў тысячы разоў. Чалавек, як і зерне, дзеля гэтага і народжаны на зямлі: радасці, што ёсць у ім, ён павінен даць новае жыццё, памножыць яе ў тысячы разоў, узрасціць на тым полі, якое суджана яму ўзараць і апрацаваць, пакінуць радасць на тых дарогах, якія праднакапавана яму прайсці. І заўжды чалавек павінен дбаць і думаць менавіта пра гэта, а не пра тое, якой даўжыні дарога ляжыць перад ім...

— Усё! Па жменьцы сыпанем і будзем рапартаваць, што завяршылі сяўбу,— прамовіў Райнека, падтрэсваючы ў лазовіку рэштку зерня.— Роўненька атрымліваецца: мне жменька і вам жменька,— і зноў, усё з той жа ўрачыстасцю і святочнасцю, ён узмахнуў рукою.

Зерне, акрэсліўшы ў паветры жаўтлявую дугу, пасыпалася на дол, залацістымі крапачкамі пазначыла вільготныя і блішчастыя ад сонца скібы зямлі; там, дзе прайшлася барана, зерня не было ўжо відаць, і ралля роўна і тлуста чарнела.

— Яшчэ раз прагані, не лянуйся! — Райнека гукнуў Багдану, які, дайшоўшы да канца кліна, пачаў паварочваць каня на лугавіну.— Птушкі панадзіліся, выдзёўбваюць, што ні пасееш,— патлумачыў ён ужо Захару.— Крыж-накрыж трэба баранаваць,— і, апусціўшы лазовік у пусты мех, закінуў яго за плечы: — То, можа, да хаты зойдзем? Малаком пачастую,— і дадаў дужа шчыра: — Вельмі я ўдзячны, што прыехалі. Як камень з душы зваліўся.

— Зноў пачынаюцца загадкі. Які, адкуль камень?

— Усё адтуль, з млына. На мне ж як нейкая падазронасць. Быццам я ведаў, што дэсантнікі загінуць. З таго, маўляў, і на млыне не быў...

— Тут тваёй віны няма.

— Але ж прашуся ў роту — не бяруць. Пажога кажа: здаровых хлопцаў — навалам, маўляў. А зброі не хапае. Але ж я не з пустым прашуся. Сэвэтэ, дзесяцізарадачка ў мяне. І гранаты.

— Адкуль жа багацце?

— Ёсць.

Захар усміхнуўся, з добрым пачуццём падумаўшы пра запаслівую натуру млынара. Тое, што было ў яго на млыне, ён здаў у атрад. І зноў — са зброяй сядзіць!

Райнека зразумеў гэта па-свойму, пакрыўдзіўся:

— Вам — смешна. А я вылежаўся і выгрэўся тут па сонейку — колькі ж можна? А сэвэтэ я з-за Дзвіны прыпёр — як лёд шчэ не сагнала, у ручаі апароў. Тыдзень чысціў, пакуль іржу зняў. Цяпер добра страляе.

— Добра, значыцца?

— Праверыў. А што рабіць? Сеў на гэты вузкі клін і сяджу. Дзеля чаго? Ну, на млыне быў, дык пры дзеле ж...

— Тут шчэ трэба паважыць: што больш пацягне — дзесятак куль з вашага сэвэтэ ці гэты клін...

Райнека перакінуў мех з аднаго пляча на другі, сказаў пераконана:

— Можна ж спалучаць: спачатку — дзесятачак куль па ворагу, а потым — клін засеяць.

— Летась на млыне вы мудра казалі: у каго, маўляў, хлеба болей, у таго і перамога. Ціхан, між іншым, гэтыя словы часцяком паўтарае.

— Паўтарае, значыцца.

На губах яго з'явілася добрая ўсмешка, і ён, быццам засаромеўшыся таго, што ўзрадаваўся, прыкрыў рукою падбародак і губы, абветраныя і засмяглыя, як з белым накіпам па краёчках. Захару зрабілася ніякавата за тое, што, едучы сюды, ён трымаў у сэрцы недавер да гэтага чалавека, і гэтае пачуццё было як працяг той развагі, што завітала да яго нядаўна на ўзараным полі.

Увайшоўшы ў хату, Захар паставіў ранец на старое крэсла ля акна, і Райнека, быццам толькі цяпер заўважыўшы, доўга і ўважна вывучаў скураны верх. Потым ён прынёс паліваны гладыш, з сіняй аблямоўкаю ля донца і ўверсе, пад крыва загнутай ручкай, тонкі руды праснак і дзве конаўкі. Адна з іх была зялёная, эмаліраваная, а другая алюмініевая, без ручкі, і наліў малако спачатку ў зялёную, падсунуў яе бліжэй да Захара, а ў белую не наліваў, падсунуў яе да гладыша. Зняўшы ранец з крэсла, ён паважыўся быў прапанаваць яго Захару, але той сеў на лаўку, са смяшком папрасіў:

— З гэтым ранцам трэба далікатненька. Ведаеце, што ў ім? Амаль цэлая тапкавая калона!

Райнека паставіўся да гэтага заклапочана.

— Андрэева жонка хоча гадзіннік залаты здаць,— сказаў ён і сеў на крэсла, ад якога Захар адмовіўся, але на які павесіў аўтамат.— Прасіла, каб дастаў са схованкі. Я не даставаў, кажу, як вернешся, дык і дастану,— Райнекаў твар расплыўся ва ўсмешцы.— Не гэтак проста і

дастаць. Схованачку я надзейную зрабіў.

Захар прамовіў ухвальна, пастукаўшы рабрыной далоні па падаконні:

— Гэткую ж, як і на млыне была?

— Піце малачко. Халодненькае добра...

Захар заўважыў, што напамінак пра схованку на млыне быў не па душы Райнеку, і перамяніў гаворку:

— Смачнае малачко. Кароўка ж Андрэева?

— Не, з атрада. Далі ёй, калі кароў нямецкіх па вёсках размяркоўвалі. Гэта калі прыгарадную гаспадарку вы ліквідавалі...

— Нямецкіх? Беларуская, дарагі, рагуля твая!

— Ведама. Гэта гаворыцца так...

З падворку Багдан бадзёра і ўрачыста гукнуў у акно:

— Дакладваю, таварыш гаспадар: заданне выканаў. Баронка — ля хлява. Конь — у лазнячку пасвіцца. Прывязаны, не турбуйцеся. Дзе тут, аднак, памыцца. А-а, ля студні ражачка.

— На мыла выбачай.

— Абыдземся. Пясочкам абыдземся.

— І заходзь у хату. Малако чакае...

Ліўся белы струменьчык з гладыша; на падворку форскаў Багдан; шамацеў вецер у фіранках. Дзівоснае, даўно пязнанае, амаль забытае, адчуванне закалыхвала Захара. Як быццам вайны няма, і ён вярнуўся з цесцем з поля, і цяпер сядзіць у хаце, адпачывае, наталяе смагу халодным малаком...

Увайшоў Багдан, стаў ля стала, стоячы, адпіў з кубка, які падсунуў яму Райнека, спытаў:

— Твой жа кубак дзе? Не бачу.

— Малака не ўжываю. Увогуле.

Багдан пагразіў яму пальцам:

— Ад шалёнай кароўкі малачко ўжываеш. Мог і прапанаваць добрым людзям.

Райнека дабрадушна і шчыра прызнаўся:

— На млыне — што праўда, то праўда — было. А тут гладка ж звялося.

— Без ініцыятывы жыве гаспадар, таму. Дарога вунь — пад бокам. На ёй што хочаш фрыцы вязуць. Выбег, схапіў — і дамоў!

— Аднаму не з рукі. Узяў бы і дапамог чалавеку.

— Добра. У чатыры рукі ўхопім,— паабяцаў Багдан.

— Вы не дужа спяшаецеся? — Райнека павярнуўся да Захара, як бы адразу закрэсліўшы гаворку з Багданам.—

Каб дачакацца гаспадыні. Яна сама вам гадзіннік уручыць. Залаты — гэта ж ёй на вяселле падарунак быў... Пасядзіце, адпачніце. А я, тым часам, у схованку зазірну. А яна недзе ўжо і едзе. Павінна зараз і быць...

— Пачакаем. Час ёсць...

Райнека нетаропка і грузна, узрадаваны, пайшоў з хаты; двойчы рыпнула масніцына — адна слаба, паблізу стала, а другая глуха, пагрозліва, перад самымі дзвярыма; дзверы адчыніліся і зачыніліся ціха, амаль бязгучна; прашоргалі крокі за акном; забразджэла рыдлёўка — Райнека нейкі час, мабыць, цягнуў яе па зямлі; потым пачулася прыглушанае дзвынькание металу аб камяністую глебу — дзесь пад паветкаю Райнека, відаць, разварушваў схованку.

Багдан, салодка чмокаючы, запіў праснак малаком, заспяшаўся на падворак, пры хадзе патлумачыўшы:

— Пайду. Можа, што памагчы трэба.

— Ты на каня нашага зірні. Ці жывы ён тамака.

— Ёсць — зірнуць на каня...

Захар застаўся ў хаце адзін. Ён раскошваў, глядзеў праз акно на цёмна-сіні лес за Дзвіною і чуйным, абвостраным слыхам, апрача іншых гукаў, што, здавалася, яшчэ жылі ў хаце — парыпванне масніцын, шорганне крокаў, нуднае бразджэнне рыдлёўкі,— чуў шмат іншых, чуў зусім не так, як звычайна, і гэтыя гукі здзіўлялі яго сваёй чысцінёю: некага самотна кліча кнігаўка ў лазняках на рачным узвале, мякка плёхаюць на шыбе кончыкі фіранкі, весела лапоча бэз у палісадніку...

У прасценку паміж вокнамі, у рамачцы, вісеў фотаздымак. Відаць, вясельны — прыгожая маладая дзяўчына і хлопец у белай, з вышытым каўняром кашулі. Твар яго здаўся знаёмым, і Захар ажно прыўзняўся з-за стала, каб лепей бачыць. Кудлатая чупрына над высокім ілбом, тонкі, з гарбінкаю нос, дзёрзкія, упартыя вочы... Гэта ж Уладусь Шнітка! Але ж адкуль ён тут, гэты здымак, у хаце брата Райнекі?!.

Захар плюхнуўся на лаўку. Яму на міг падалося, што ён апынуўся ў Шнітkавай хаце, чакае яго жонку, каб паведаміць, што Шнітка забіты партызанамі. Здарылася такое, што забраў Шнітка ў жанчыны з Астроўшчыны мужавы боты. Боты тыя жанчына хавала, выцягнула прасушыць, і на тое ліха ўваліўся ў хату Шнітка. Боты яму акazаліся малыя, не палезлі на нагу, і ён прамяняў іх на гарэлку ў суседняй вёсцы. Захар упершыню падумаў пра

тое, што зрабіў вялікую памылку, аддаўшы загад арыштаваць Шнітку. Загад той ён аддаў у гарачцы, раззлаваны рызыкоўнымі дзеяннямі Жвірблі, у выніку якіх ледзь не ляснулася, не трапіла да фашыстаў іх партызанская гармата — гонар атрада. Ён збіраўся ўвечары пагаварыць са Шніткам і раптам вырашыў, што зробіць гэта, і загадаў, каб у штаб даставілі Шнітку, які сядзеў у лазні пад арыштам. Але ў лазні таго ўжо не было. Шнітка перахітрыў варту: разабраў дошкі франтона і збег. Вартавы потым далажыў, што ўвечары Шнітка прасіў-маліў адпусціць яго на гадзіну ў вёску, казаў, што ўпросіць тую жанчыну, каб даравала яму. Слухаючы вартавога, Захар шкадаваў, што ў той міг, калі ўбачыў дзёрзкі, упарты позірк, не стрымаў свой гнеў. Крыху пазней, апоўдні, шкадаваць давялося зусім аб іншым: Шнітка быў забіты партызанскай заставай другой роты ля Дзвіны. Яму загадвалі спыніцца, але ён бег, і па ім стрэлілі...

Увесь час потым Захар намагаўся не прыгадваць гэты выпадак, намагаўся не папракаць сябе за тое, што аддаў той загад арыштаваць Шнітку. Гусараў жа ўсё ўхваліў, нават напісаў на дапясенні ў штаб брыгады з гэтае нагоды рэзалюцыю, у якой лічыў дзеянні заставы правільнымі. Потым гэты выпадак удаўніўся, яго адсунулі новыя клопаты і турботы, новае гора — пахаванне людзей у першай роце, якія загінулі, наляцеўшы на фашысцкую засаду ля Фарынава.

Чаму ж цяпер ён гэтак яскрава прыгадаў усё тое?.. Ёсць жа, відаць, нейкая сувязь. Але адкуль тая сувязь? У чым? У Шніткавай хаце — Шнітка быў родам з-пад Дзісны — Захар ніколі не быў і, відаць, не будзе. Ды і не родная там хата Шніткі — прыстаў ён у прымы, калі ўцёк з палону. Сам жа Шнітка з Луцка. Дзе той Луцк? На Украіне недзе. Дзіўна: Шнітка і гаспадар гэтай хаты абліччам вельмі падобны! І лёс у іх падобны. Адзін свядома не выканаў суровы загад ваеннага часу — магчыма, не зусім прадуманы і патрэбны,— другі ж парушыў загад, невядома чым кіруючыся. Не, табе добра вядома, чым кіраваўся Шнітка! Ён жа крычаў, паказваў падраныя боты, апраўдваўся нахабна і злосна... Не, лёс у гэтых людзей не падобны... А можа, недзе там, ля той Дзісны, другі партызанскі камандзір сядзіць у хаце Шніткі і яго жонка аддае на танкавую калону свой шлюбны пярсцёнак ці гадзіннік?.. А што, як калі-небудзь табе давядзецца зайсці ў тую, зараз табе невядомую хату ля Дзісны? Зможаш ты сказаць той

жанчыне ўсю праўду?.. Зможаш патлумачыць, што ўсё тое, што адбылося ў тваім атрадзе, адбылося па тваім загадзе?

Грузна стукаючы ботамі, у хату ўваліўся Райнека, паставіў на краёк шкляны літровы слоік, накрыты зверху кавалкам цыраты, складзенай у дзве столкі і абкручанай медным дротам. Адкруціўшы дрот, ён зняў цырату і выцягнуў са слоіка маленечкі згортачак з чырвонага, у белы гарошак паркалю і асцярожна разгарнуў.

— У мяне што было, дык здаў зімою,— прамовіў Райнека, разглядаючы гадзіннік, але не дакранаючыся да яго рукою.— І яна тады аблігацыі здала. І грошы, якія былі. А гэта — берагла. А са сходу ў Завячэллі вярнулася і гаворыць: здам. Аднясі ў атрад, сказала. І пярсцёнак гэты таксама, сказала. На танкі...

Ніколі на сходах, што Захар праводзіў па вёсках, ён не адчуваў яшчэ гэткай шчымлівай горычы ў горле, як зараз, калі глядзеў на маленькі гадзіннічак. Некалі ў дзень нараджэння жонкі, на пачатку іх сумеснага жыцця, Захар падараваў ёй гадзіннік. Але не гэткі, прамавугольнічкам, і не залаты, просты, і пазней, калі быў ужо ў хаце дастатак, гэты просты гадзіннік быў Зінаідзе даражэй ад усіх рэчаў...

Успамін расхваляваў Захара, і ён, выцягнуўшы з ранца сшытак, пачаў старанна запісваць у ім прозвішча Андрэевай жонкі і апісанне таго, што яна здае ў фонд будаўніцтва танкавай калоны.

У адчыненае акно зазірнуў Багдан. Па рацэ, маўляў, плыве човен, вяслуе, здаецца, жанчына. Райнека, узрадаваны, падбег да акна, высунуўся траха не па пояс.

— Дзіна едзе! Абышлося, дзякуй богу, значыцца. Смелая, скажу вам, у Андрэя жонка — анічога не баіцца,— і ён сеў побач з Захарам, зазірнуў у спіс: — Пішаце, хто і што здаваў вам?

— Усё дакладна запісваем. Потым гэтыя звесткі спатрэбяцца. Справы народныя нашчадкі павінны ведаць. І свет хай ведае.

Суха хруснуўшы, зламаўся графіт алоўка, і Захар, дастаўшы з футарала фінку, што вісела на поясе, пачаў яго завостраваць. Лязо ціха шкрэбла графіт, і амаль з гэткім жа сухім шоргатам храбусцела папера ў Райнекавых пальцах — млынар згортваў цыгарку.

У гэтай цішыні трывожна і дужа грымліва затупалі боты ў сенцах; бразнуў слясак; дзверы адчыніліся на-

хлапч, як сарваныя віхураю, і ў хату, з карабінам напагатове, ускочыў Багдан. Кепка ў яго была павернута казырком назад, і ад гэтага твар выдаваўся пакруглелым, як бы раптам атлусцелым, і быў чырвоны і бліщчасты ад поту; дзіўна блішчалі ў яго і вочы, таксама пакруглелыя, шырока адкрытыя.

— Ф-фрыцы! Ідуць! — вісклівым шэптам, нібыта давячыся словамі, прасіпеў Багдан.

Захар ліхаманкава сунуў фінку ў скурапы футарал на рамяні, запхнуў сшытак у ранец, другой рукою смаргануў к сабе аўтамат, які вісеў па спінцы крэсла; крэсла з грукатам павалілася. Ён пераскочыў яго і, яшчэ не дабегшы да парога, у шырокім светлым прагале сенцаў убачыў за ўзараным клінам, бліжэй да ручая, кароценькі ланцужок людзей у чорным адзенні. Быццам слупкі нейкія. Багдан не памыліўся: салдаты! І кіруюць яны сюды, у бок хаты!

Ад хвалявання ў Захара адразу перасохла ў роце.

## 24

Схапіўшы за плечы Багдана, які наважыўся быў, прыгнуўшыся да самай падлогі, выскачыць з хаты, Захар адкінуў яго назад да сцяны:

— Да акна! Да акна станавіся!

Багдан ледзь утрымаўся на нагах. Ранец з яго пляча шмякнуўся па падлогу, і ён, адпіхнуўшы яго нагою, укленчыў ля акна, прамовіў тужлівым, асіплым голасам:

— Э-э, каб да ракі нам... У лазняку прабіцца...

— Па роўным полі? Ссякуць!

— А дзе не ссякуць? Пад ложкам? Усім там месца не хопіць!

Захар перасмыкнуўся ад гэтага злараднага голасу. Але Багданаў жарт нагадаў яму, што камандзір ён, Захар, што ён павінен прымаць рашэнні і загадваць. Заўважыўшы, як Багдан адпіхнуў ранец, Захар загадаў сурова і злосна:

— Ранец — на плечы! І не вытыркайся. Падпусцім на падворак, а тады — ударым...

Як і што будзе далей — Захар не ўяўляў. Аніякага пэўнага плана ў яго яшчэ не склалася, ён бачыў ворага наперадзе, разумеў, што можа змагацца з ім. Але ён не ведаў, што робіцца за спіною, і таму інстынктыўна загадваў Багдану пільнаваць акно, адкуль маглі ўдарыць у спіну.

У кутку з грукатам насыпалася цэгла, і Захар імкліва павярнууся. Гэта ж Райпека шворнам развярнуў вугал падпечка! Цягне з праломкі дзесяцізарадку, загорнутую па самы прыклад у шэрую, у цёмных масляных плямах апучу, і бляшанку з патронамі. Аж з каптуром патронаў у бляшанцы! І абоймы нават ёсць! І ў куточку бляшанкі дзве эфкі, падобныя на вялікія чорныя яйкі!

— У-у-у! Цяпер пад ложак не папаўзём. Цяпер — кум каралю і сват міністру,— кінуў Багдан павесялелым голасам.

Райпека быццам і не пачуў жарту, загадным, незнаёмым голасам натрабаваў:

— Выбівайцеся за студню — унька яна,— ён махнуў рукою ў бок адчыненых дзвярэй.— Там — нізінка. Па ёй да ракі прапаўзеце. А я — прыкрыю...

Студня была непадалёк, адразу за агародчыкам, але на роўным, як далонь, выганчыку, і за ім пачыналася і ішла да самага берага затравелая нізіна. Захар хуткім позіркам абсачыў студню, са старым вядром на краёчку высокага драўлянага зруба, і нізіну, што ўпіралася ў лазнякі, за якімі зіхацела палоса вады. Па гэтай палосе, пакідаючы за сабой слабы зіхатлівы след на тонкай плыні, марудна сунуўся човен. У карме стаяла жанчына і веславала. Лазнякі гойдаліся ад ветру, яго гнуткія і тонкія макавінкі, здавалася, то ўзнімаюць, то апускаюць човен, і хлапчукі, якія сядзелі ў цэнтры чоўна, на лавачцы, увесь час быццам спрабавалі, дурэючы, ухапіцца за тонкія лазовыя дубцы, а яны ўвесь час выслізгвалі з хлапчукоўскіх рук.

— Куды-ы-ы,— прастагнаў Багдан.— Куды яны прунца? Ну, куды-ы-ы!..

Працяглае, са стогнам «Куды-ы-ы» як бы завісла ў цішыні хаты. Пальцам левай рукі, якая сціскала аўтамат, зрабілася холадна, як у сцюжу, і Захар, бы грэючы іх, прыціснуў руку да падбародка. Халодная дрыготка пакацілася па скуры, асядаючы пад скіўцамі, і іх звяло, быццам ад кіслага яблыка. Захар праглынуў сліну, скіўцы адпусціла.

— Роўда, на бераг! — загадаў ён падкрэслена афіцыйна.— Ратуй ранец — адказваеш галавою за яго,— і, падлічваючы чорныя постаці, што марудна набліжаліся да ўзмежку, тым жа загадным тонам дадаў: — Спачатку — да студні. Потым — пад узвал, у лазнякі. Пярэймеш човен. І — прабівайся ў атрад. На кані. Чакай, бяры гэта,— Захар выцягнуў з кабуры пісталет, працягнуў Багдану.— А карабін пакінь — з ім хутка не папаўзеш...

— Усе — адсюль! Усе вымятайцеся адсюль,— умольна папрасіў Райнека і сарваўся на ярасны шэпт, як адразу асіп: — Мая гэта хата! — і зноў умольна, быццам прасіў прабачыць яму пагрозлівае патрабаванне: — Ну, прашу вас...

Павольным рухам Захар адцягнуў затвор аўтамата; затвор суха і звонка чакнуў.

— З хаты — па-пластунску! Выконваць, Роўда!

Захараў голас прагучаў звонка і суха, як чаканне аўтаматнага затвора. Багдан моўчкі, кідком тузануўшы мяшок на плечы, сунуў пісталет у кішэню, садраў з дзягі падсумкі; падсумкі глуха тукнулі па дошках падлогі; гэтак жа тукнулі і каблукі ботаў, калі Багдан выкуліўся за парог хаты.

Райнека, як знямеўшы, сачыў за Багданам, і толькі тады, калі той поўз па баразёнцы за парканчыкам агарода, прапанаваў цвёрдаю і ўпэўненай скорагаворкаю:

— Цяперка мы — у агародчык. У хаце — блага. Чыркнуць трасіркамі — патэльня нам. А ў агародзе — акопчык...

Захар не запярэчыў, пагадзіўся адразу ж, разумеючы, што ў хаце ім доўга не ўседзець, што трэба шукаць больш надзейнае месца для бою, без якога ўжо не абысціся. Ён не думаў пра тое, як будзе далей, ён бязлітасна дакараў сябе, лаяў і вінаваціў. Навошта пёрся сюды? Ён правёў сходы ў чатырох вёсках, сходы добрыя, дзе людзі, удзячныя яму за словы праўды і надзеі, аддавалі на танкавую калону ўсё, што маглі, не шкадуючы, аддавалі з радасцю і верай, што робяць справу вялікай важнасці, патрэбную, неабходную. А ён што зрабіў? Тыя надзеі людскія, іх радасць і веру паклаў пад абух!

Пачуццё ўласнае віны пякло, прыгнятала, і ад яго балела сэрца, балела мацней, чым ад разумення таго, што ім, відаць, не давядзецца выкараскацца адсюль жывымі. Кульнуўшыся следам за Райнекам у вузкую яміну акопчыка пад маладой слівай побач з плотам з бярозавых жэрдак, Захар, цяжка сапучы, пажартаваў:

— Быццам у раі тут: і ўтульна, і мухі не кусаюць.

— Там, у раі, мух няма,— са змрочнай усмешкаю ўдакладніў Райнека.

— А ты і гэта ведаеш! Ды і відаць: да любое нявыкруткі падрыхтаваны. І зброя, і рубеж абароны, і стратэгія...

— Каб жа ж! Чорта лысага я б па гэтую вудачку злавіўся!

— Я ва ўсім вінаваты!

Райнека пакруціў галавою:

— Не-е, выпадак. Гэтыя, думаю, па бёрны прыкацілі. Машына — у лесе. А яны — сюды. І пачынаюць: яйкі, млека, шпэк,— Райнека злосна сплюнуў.— Набрыдзь!

— Машыны ж не чуваць было.

— Яе ніколі не чуеш — дарога ж за пагоркам. Утрох пазаўчора прыходзілі. А тут — сямёра.

— Хай сабе і дваццаць. У нас — арсенал,— Захар паляпаў даланёю бляшанку з патронамі.— Тут на гадзіну бою хопіць. Галоўнае, каб Багдан праскочыў.

— Э-э-э... іх маць,— вылаяўся і ажно застагнаў ад роспачы Райнека.— Заўважылі! Непрыяцелі Багдану кладуцца. Ажно ўтрох!

— Усё! Аго-онь!..

Яны стрэлілі амаль адначасова. Захар перазарадзіў карабін, зноў стрэліў, і тады ад лесу, з поля і з лугавіны траскотна ўдарылі аўтаматы, забухалі стрэлы з вінтовак, і нечакана гулка зататакаў кулямёт аднекуль з пагорка. У жэрдках паркана і па сценах хаты залопалі разрыўныя кулі; зазвінела і пасыпалася з акон шкло. Стралялі больш па хаце: акопчык, мабыць, заставаўся пакуль што незаўважаны.

— Не дурні яны, аднак. Кулямёцік на пагорачку пакінулі: — Райнека адарваў галаву ад прыклада, паўглядаўся на ўзаранае поле, якое яны нядаўна засеялі, радасна, з асалодаю нават, вылаяўся: — Ляжы-ыць, маць яго... Паклалі-ткі гада! А гэтыя паўзуць. Бач ты!.. Але ж скулле ты ад мяне далёка ўпаўзеш!..

Райнека стрэліў двойчы, амаль без інтэрвалаў, і стрэліў яшчэ, і пасля кожнага стрэлу лаяўся ўголас, лаяўся то радасна, то змрочна і зацята. Потым выдраў магазін, узяўся наспешліва набіваць яго патронамі, патрабавальна раіў Захару:

— Страляйце! Страляйце! Каб не паўзлі бліжэй... Ч-чорт,— Райнека вылаяўся, выпусціўшы з пальцаў патрон; узняў яго, здзьмухнуў пясок, абцёр аб кашулю на грудзях, увагнаў у магазін.— Колькі шукаў запаснога магазінчыка — аніяк не ўзбіўся. Паўзуць?

— Заляглі.

— Гэта добра. Нам іх блізка падпускаць нельга. Бо тады яны гранатамі могуць,— Райнека глянуў з акопа на по-

ле, тухнуў Захара локцем у плячо.— Біце па тых, што на ўскрайку. Яны ў разору ціснуцца...

Чорная постаць у разоры амаль зліваласі з цёмным ворывам. Але Захар прыкмеціў чорны пагурачак, што раз-пораз ледзь прыўзнімаўся над разораю. Злавіўшы яго на мушку, чакаў. Чакаў доўга, але пагурачак быў нерухомы, і Захару падалося, што ён нераблытаў, прыняўшы за чалавечую спіну грэбень разоры. Наважыўся быў навесці карабінам управа, за разору, і гэты пагурачак узварухнуўся, прыўзняўся. Захар імгненна падвёў мушку пад самую яго сярэдзіну і націснуў на спуск. Пагурачак дзіўна тарганууся, выкаціўся на ворыва і ляжаў нерухома, вельмі прыкметны цяпер на полі, і Захар стрэліў у яго зноў і ўбачыў, што пацэліў добра.

Райнека, штуршком увагнаўшы зараджаны магазін у дзесяцізарадку, зыркнуў у бок Дзвіны, заляпаў далонёю сябе па грудзях.

— Споўз! Споўз Багданачка пад узвал! Хіба нам наспрабаваць, га? Па адным калі...

Ён прыўзняўся і тут жа асеў назад, быццам скінуты на дно акопчыка візгатлівым гудам куль, што залопалі па жэрдках і, як чмялі, пранесліся над лехамі, ссякаючы маладую салату.

— Угледзелі, гады, дзе сядзім,— сказаў Захар, выхопліваючы з бляшанкі новую абойму.— Цяперака ні па адным, ні ўдвух не выпусцяць...

Стрэлы аціхлі. Услухоўваючыся ў нязвыклую цішыню, Захар, моршчачыся, адставіў карабін і ўзяўся церці правае калена — Райнека, асядаючы ў акопчыку, саданүў яго прыкладам сваёй дзесяцізарадкі.

За хлеўчуком, што стаяў улева ад хаты, прагучала бадзёрае, выразнае і зусім блізкае:

— Ком, партызанэн! Нікс капут!

Захар даў доўгую чаргу па вуглу хлеўчука, адкуль гучаў гэты голас. Райнека штурхануў яго руку плячом:

— Навошта? Будзем берагчы набоі...— і дадаў заклапочана, са шкадаваннем: — Хата нам замінае. Сапраўды, як адтуль зоідуць — капут... Дурань я! Поўны дурань! Акопчык трэба было унька дзе — у канцы гародчыка ставіць!

— Другім разам выправіш памылку — там і выкапаеш.

— Другім разам не мы, а нам выкапаюць.

— Не каці слязу, млынар! — Захар сіліўся гаварыць

бадзёра і бесклапотна.— Жывыя будзем — сто год шчэ пражывем!

Жарт атрымаўся штучны — ім жа з Райнекам няма на што спадзявацца. Багдан хіба?.. Магчыма, дабяжыць да атрада... Але ж ці паспее сюды дапамога? Наўрад... Так што разлічваць можна толькі на свае ўласныя сілы. І — удачу. Наіўна, аднак, ён разважае. Акопчык абкружаць, кінуць пару гранат з-за хаты — на тым усё і скончыцца. Тады чаго яны тут сядзяць? Чаго чакаюць?

З-за хлеўчука прагучаў усё той жа бадзёры голас:

— Ком, партызанэн!

Пальцы левай рукі, якія ляжалі цяпер на зямлі, зноў зрабіліся халодныя, як у сцюжу. Захар стрымаў жаданне стрэліць і, стрымаўшыся, адразу ж адчуў няёмкасць: ён ужо нібыта падначалены ў Райнекі і выконвае яго распараджэнне берагчы патроны. А навошта іх берагчы? Патронаў поўна, патронаў для карабіна хопіць. Аўтаматных толькі мала — тое, што ў дыску, і гэта трэба наберагчы для блізкага бою. А цяпер — з карабіна: з яго можна біць прыцэльна.

Ён прыхінуў аўтамат да сценкі акопчыка і зноў узяў у рукі карабін. Справа ад хлеўчука мітнулася чорная постаць, і Захар стрэліў па ёй, і постаць знікла. Але ён не ведаў, ці пацэліў.

— Гарыць! Падпалілі ўсё-ткі,— з адчаем і нейкім як бы радасным захапленнем выгукнуў Райнека.— Во было б нам, каб у хаце заставаліся. І хлеў жа таксама бярэцца!

Белыя дымныя скруткі, што выбіваліся праз вокны хаты і ўвачавідкі шырэлі і таўсцелі, як бы звязваліся ў адно з чорнымі дымнымі грывамі, якія спаўзалі са страхі хлеўчука на падворак. У вушах гуло ад нядаўніх стрэлаў, і грывастыя языкі полымя на франтоне хаты і на страсе хлява і шырокія шлейфы дыму, што выматваліся з дзвярэй хаты, здаваліся несапраўднымі, быццам дужа далёкімі.

— Доўга нам тут не вытрываць,— сказаў Захар.— Зварымся ў акопчыку, як у кацялку. Трэба ўслед за Багданам, да лазнякоў прабівацца.

— Цяпер — позна. Цяпер — трэба чакаць. Ад хлеўчука іх зараз агонь прапрэ... Ды, можа, вецер павернецца. Калі ў бок лесу пагоніць — выскачым...

Вецер дзьмуў ад лесу, у бок ракі, і дым адносіла за хату. Марная, зусім марная спадзяванка на тое, пра што кажа Райнека. А раптам і сапраўды пакруціцца вецер, паго-

ніць дым на лес, зацягне дымнай каламуццю лугавіну? Паспрабуй пацэліць тады ў постаці, што мільгаюць у дымных шлейфах! Тады яны з Райнекам выскачаць з гэтае пасткі, дабягуць да лазнякоў. Там — Багдан. Ён жа іх прыкрые. Чым жа ён цябе прыкрые? Карабін жа ты забраў! І Багдан павінен бегчы, не затрымлівацца. А ён жа яшчэ, напэўна, не паспеў далёка адбегчыся. І таму яны з Райнекам павінны заставацца тут. Інакш фашысты кінуцца следам, выскачаць на ўзвал. Тады Багдан і Андрэева жонка з малымі дзецьмі будуць, бы на далоні — ніхто не ўратуецца.

«Ранец! Галоўнае — ранец!..»

На нейкі міг у яго перад вачыма ўзнікла хата, дзе сабраліся завячэльцы на сход. Як уважліва людзі слухалі, калі Захар казаў, што сродкі, якія яны даюць, пойдуць на танкавую калону «Дзвіна». Якія радасныя твары былі ў вяскоўцаў! А ён быццам падмануў усіх: сабраў грошы, аблігацыі, каштоўныя рэчы — і фашыстам павёз!..

Думка была балючая, вострая, і яна спарадзіла нейкае незразумелае жаданне апраўдацца перад усімі, перад Ранейкам. Але ў чым ён павінен апраўдвацца? Хоць супакоіць сваё сумленне?

— Як думаеш, далёка Багдан ужо? — спытаў Захар, змятаючы жоўты пясок з прыцэльнай планкі карабіна, спытаў наўпярок волі, разумеючы, што прасіць прабачэння ў Райнекі і вінаваціць сябе ва ўсім цяпер не будзе.— Э-эх, каб да каня ён дабраўся!

Райнека, як не пачуўшы яго, прамовіў са шкадаваннем:

— От жа, дурная! Не разумее — агонь жа! Яны ўжо дымам пайшлі... От жа, дурная!

— Ты што? — не зразумеў Захар.

— Упька, капапляначка на жэрдцы.

— Дык што? Крылцаў хочаш папрасіць?

— Ды не! Яна ж у мяне пад застрэшкам хлеўчука гнездавала. Птушаняткі ўжо вылупіліся — чацвёра...

Маленькая птушка з цёмным хвосцікам, рудаватым падбрушкам і чырвонай мецінкаю над кароткім, як у вераб'я, клювікам міталася па верхняй жэрдцы паркана; яна то перабягала жэрдку з канца ў канец, то скакала па вострым верх шула, то ўзлятала і, як адкінутая моцным штуршком, звальвалася на жэрдку, неслася подскакам па ёй, зноў узлятала і зноў бязгучна валілася ўніз. Толькі адпойчы, калі канаплянка падбегла да шула, што было насуп-

раць акопчыка, Захар пачуў тонкае, жаласлівае цілікаппе: «і-і-іў, і-і-іў, і-і-іў...»

— Капаплянка звычайна ў хмызняку хатку сабе ладзіць,— сказаў Райнека, і твар яго быў пакутліва зморшчаны — чалавек сіліўся памагчы жывой істоце.— А гэтая — хлеўчык выбрала. І вось жа неразумная...

Капаплянка ўскочыла па крайняе шула, адчайна рванулася ў паветра, як бы змысліўшы прарвацца да падстрэшка, ахопленага полымем. Але пасустрач ёй выгнуўся, плёхнуў чорны язык дыму, і птушка зпікла ў ім, як растала.

Райнека прыгнуўся, пацёрся пераноссем аб сціснуты кулак правай рукі, потым, прыўзняўшы галаву, зыркнуў з-пад ілба, упіраючыся носам у куртаты, пабіты даўняй іржой затвор дзесяцізарадкі.

— Усё. Згарэла,— і дадаў, нібыта апраўдваючыся: — Генечка гняздзечка апароў...

— Які Генечка?

— Андрэсў. Меншанькі. Ад іх, жэўжыкаў, нічога не схаваецца,— патлумачыў са шкадаваннем шчырым і непадробленым і раптам, з нейкім захапленнем, адзначыў: — А шкло, глядзіце, плавіцца!

Гучна трашчала ў агні бярвенне, гнуліся і ламаліся, быццам зробленыя з чырвонага вугалля, кроквы, і нешта ўвесь час усярэдзіне хаты лопалася. Дзве цэлыя яшчэ шыбіны ў правым акне — адна верхняя, другая ніжняя — дзіўна і прыгожа свяціліся, загадкавыя абрысы на іх — то блішчаста-сіпія, то агніста-барвовыя, то чорна-свінцовыя — узнікалі, раптоўна расплываліся і зноў нараджаліся з яшчэ большай выразнасцю і яркасцю, толькі цяпер зусім непадобныя на тыя, што былі дасюль, і здавалася, што з глыбіні хаты нехта страсае ўвесь час на шкло фарбу з пэндзля; раптоўна абедзве шыбыываліліся, але не кавалкамі, як разбітае шкло, а выгнуліся, пачалі асядаць сінімі блішчастымі трубкамі, і белыя скруткі дыму паўзлі па іх, быццам уціскалі ў раму.

Гуло полымя, трашчала бярвенне, у агні ўсё нешта лопалася і лопалася, бы ўзрывалася, але цяпер не ў хаце, а недзе ў сенцах, як пад сцяною. Ад гарачыні, як зваранае, звалілася на зямлю лісце маладога бульбоўніку, выставіўшы белыя, як абкораныя дубчыкі, сцяблінны, бліжэй да паркана — верхнія жардзіны яго ўжо курыліся дымам — гэтыя сцябліны густа ляжалі на зямлі, але як не зрэзаныя, а сагнутыя, быццам чымсьці прыціснутыя.

Ад гарачыні ўжо не было ратунку і ў глыбі акопчыка. Райнека задраў на спіне палатняны пінжак, нацягнуў яго на патыліцу, ратуючы галаву.

— І не страляюць жа. Ведаюць, што агонь нас выкурыць, проста да іх у лапы пагоніць,— і Райнека раптам засмяяўся.— А ён, агеньчык, нас і ратуе.

— Ратуе? Пагарым зараз к чортавай матары!

— Яшчэ не зараз. Яшчэ можна і патрываць. Затое тыл у нас — надзейны: праз гэткі агонь і сам д'ябал не праб'еццa. Э-эх, каб яшчэ лазнякі да нас бліжэй былі...

Захар крайком вока злавіў Райнекаў позірк, скіраваны на лазнякі над рачным касагорам, тужлівы, поўны адчаю: туга была і на губах, скрыўленых грымасай адчаю і шкадавання.

— Паўзі туды! Да Дзвіны паўзі! — загадаў Захар, і на душы палягчэла: прынятае рашэнне збаўляла ад пакут і згрызоты.

— Што-о? — Райнека як след не дачуў з-за рову і гулу полымя.

— Паўзі да Дзвіны. Як Багдан! Я — прыкрыю. Дапаўзеш — мяне прыкрыеш.

— Не-е-е! Паміраць, дык разам!

Райнека затрос галавой, вочы зыркнулі зларадна. Разам, маўляў, намром праз цябе, праз тваю неабачлівасць. І гэты, іншы сэнс слоў, які Райнека не выказаў услых і які хутчэй за ўсё ён увогуле не меў на ўвазе, Захар не толькі прыняў усур'ёз, але і знайшоў яму апраўданне: ён, Захар, ва ўсім вінаваты. І Райнека ведае гэта, але маўчыць, маўчыць з той жа нявыказанай перавагаю, з якою тады, у часе размовы з Ціханам, седзячы на мяхах са збожжам, абвінавачваў тых, хто даў Андрэю неразумны загад спаліць млын, калі набліжаўся фронт, маўчыць, быццам ведае і разумее нешта такое, што непадуладна чужому розуму.

Адчуванне чужой перавагі не гняло, кароткі ўспамін пра той час, калі ён сядзеў з Ціханам на млыне, як бы падштурхнуў Захара, і ён паўтарыў свой загад упарта і суха:

— Да Дзвіны! Паўзі! Паспрабуем прабіцца!

Райнека прамовіў, як бы размаўляючы сам-насам:

— Нам на поле лепей... Тым краем, ля ўзмежка, калі рызыкнуць...

— Там жа ворыва! Як на далоні будзем! Адзін шанц — лазнякі.

— Быў у нас шанц, ды мы яго і аддалі,— і Райпека кіўнуў галавою ў бок Дзвіны.— Дзеткам Андрэевым,— і раптам засмяяўся.— А мы, калі не дапаўзем, дык хоць на мяккім ворыве ляжаць будзем — пухам зямелька...

Райпека глядзеў на чорнае ворыва прыжмураным вокам, і ад пінжака, нацягнутага на патыліцу і лоб, твар выдаваў самотным, дужа старэчым, але спакойным, як нічым не заклапочаны. І гэткія ж самота і спакой былі і ў яго голасе, і Захар здагадаўся, што пядаўняя яго зларадпасць, гэтае як бы здзекліваe «памром разам» было простым жаданнем чалавека не паддацца жаху, устаяць перад бядою.

«Райпека, відаць, ад самага пачатку зразумеў, што выбавіцца з гэтае пасткі ўсім нам не ўдасца, што нехта абавязкова павінен памерці, каб ратаваць другіх. Памерці... Натуральна гэта — жыццё ў чалавека не можа быць вечнае. Але заканчвацца яно павінна так, каб за ім была не смерць, а нейчае жыццё, бо ў гэтым ёсць сэнс існавання ўсяго жывога на зямлі!»

Правільна, дружа, мыслііш! Але вось каб гэтая цвярозасць табе крыху раней, там, на ўзлеску, калі злязаў з рысоркі. Там ты не разважаў пра тое, што жыццё ў чалавека не можа быць вечнае.

Вецер круціў полымя. Хвастатыя яго языкі, спавітыя дымным шлейфам, упіраліся ў паркан, жэрлі слупкі і раптам абярнулі іх; нясцерпная гарачая віхура шухнула ў акопчык. Райпека затрос галавой, закашляўся, потым саўладаў з кашлем, паглядзеў ва ўпор на Захара:

— Ну, камандзір, рызыкнём? — Райпекавы вочы дзіўна і весела бліснулі; твар, чырвоны і блішчасты ад поту, быў радасны, без хмурынкі.— Вырвемся! Па чарзе прыкрывацца. Ну, я пайшоў...

Ён вужам выкаціўся з акопчыка і, распластаўшыся ў баразёнцы, адразу зрабіўся пляскаты, быццам уціснуты ў зямлю. Але з лугавіны яго заўважылі, і кулі густа заціўкалі над лехамі, залопалі. Захар прысеў у акопчыку, але прысеў не ад ціўкання куль над галавою. Раней яго затулялі Райпекавы плечы, а цяпер, калі ён застаўся адзін, у акопчыку зрабілася як на палку ў лазні, калі на каменку ліпулі западта; гарачыня апякала патыліцу нясцерпна, моцна запахла паленай шчэцццю, і яму здалося, што галава пачала ўжо дымець, і ён правёў рукою па гарачых і дзіўна мяккіх, бы намыленых валасах.

«Трэба ж прыкрываць Райпеку!»

Ён стрэліў па чорнай постаці на ўскрайку лугавіны, потым стрэліў зноў і стрэліў яшчэ, хутка прыцэльваючыся. Трэба было перазарадзіць карабін, і ён схапіў з бляшанкі цёплую абойму. Абойма, перакачаная ў пяску, не ішла ў магазін, і ён пачаў ставіць патроны па адным, прыціскаючыся носам да крохкай сценкі акопчыка — здавалася, што гэтак лягчэй дыхаць.

Разрыўныя кулі покалі па лехах мякка, як бы стукалі дзесь праніkам па мокрай бялізне, а ў жэрдках паркана лопаліся з сухім трэскам, бы ламалася сухое суччa: «Тр-рык, тр-рык, тр-рык...» Гукі гэтыя зліваліся ў адну суцэльную ноту, быццам нехта, схаваўшыся за парканам, стукаў па жэрдках металёвым прэнтам і гукаў: «Прык-рык, прык-рык, прык-рык...»

Райнека цяпер не поўз па зямлі, а, дзіўна падскокваючы, сігаў цераз лехі і, прыгінаючыся то на адно, то другое калена, страляў з дзесяцізарадкі. У канцы апошняй лехі, дзе густой шчоткаю зелянела цыбуля, якраз перад самым парканам, ён бразнуўся на зямлю, махнуў рукой Захару:

— Адыходзь, камандзір! Адыходзь!

Правая рука ў Райнекі раптам сагнулася, як падсечаная, і сам ён таргануўся наперад, быццам распорваў галавой маладую лапушыстую салату. Левая рука, у якой была заціснута дзесяцізарадка, лягла на суседнюю градку і схавалася адразу паміж попельна-шэрых радочкаў радысу.

Нешта рэзка ўдарыла па карабіну, асляпляльна-белая маланка пыхнула з прыцэльнай планкі — карабін выдрала з рукі і адкінула за бруствер. Востры боль саданyў левае плячо, і Захар паваліўся спіною на беражок акопчыка. Нейкае імгненне ляжаў нерухома, як уціснуты патыліцаю ў цёплую зямлю. «Куля... Куля ўдарыла ў прыцэльную планку, зрыкашэціла, і мяне параніла...»

Боль трымаўся ў адным месцы, як бы на паверхні пляча, і на нейкае імгненне ўсё некуды быццам адсунулася — і стрэлы, і гул полымя, і дымная гарачыня,— потым усё наблізілася, зрабілася па-ранейшаму выразным. З прыглушаным трэскам пачалі абвальвацца кроквы; грывастыя султаны агню і дыму выносілі ўверх чорнае ашмоцце згарэлай тканіны і паперы, і яно вёртка лётала ў віхуры, вырывалася і зноў западала ў самую сярэдзіну яе, быццам было прывязана да языкатага чырвона-белага полымя.

Боль у плячы хутка слабеў, быццам западаў углыб. І не адчувалася, каб пад кашуляй расплывалася кроў. За-

хар варухнуў рукою, і боль напоўз над скурай да шыі, абціскаючы яе, быццам абцугамі; ён паварушыў галавою, каб наслабіць іх ціск, і абцугі як зваліліся, але не зніклі, засслі ў плячы. Вочы сляпіў яркі, ажно сіні па краях агонь, які выбівала з вуглоў хаты; вуглы, як распілаваныя агнянай пілою, марудна рассоўваліся, і з пазоў, як з кавальскага горна, біла полымя; гэткія ж языкі полымя выбіваліся з-пад вокнаў, і тут яны былі не шырокія, а дужа тонкія, зусім без дыму.

«Сцены зараз разваляцца, бэлькі пакоцяцца. Тады ўжо адсюль не выпаўзеш...»

Захар распіхаў патроны па кішэнях, схапіў адной рукою аўтамат, а другой, працягнуўшы яе пад вузкім бруствсрам, абапёрся на карабін, упёрся нагамі ў сценку і выпхнуўся з акопчыка. Ён пакаціўся па зямлі пад жэрдкі паркана, бліжэй да Райнекі. Райнека ляжаў нерухома, парапейшаму зарыўшыся галавой па самыя плечы ў зялёныя лапушыстыя стрэлкі цыбулі. Забіты?!. Не, стрэліў... Халодная якая тут, пад жэрдкамі плота, зямля, мяккая, вільготная. Яна прыемна выстуджвае цела. І галоўнае — Райнека жывы!

Значыцца, яны вырвуцца. Прабіліся сюды, пад плот, дык праб'юцца і далей!

— Машына-а-а,— прастагнаў Райнека.— Машына ж дарогаю пыліць!..

Захаравы вочы слязіліся ад дыму і поту. Але ён добра бачыў у тым баку, куды торкнуў дзесяцізарадкаю Райнека, жаўтлявае воблака пылу. Машына вылецела з-за пагорка і раптам крутнула ўлева, у бок ручая, памчала ўсцяж узаранага поля, потым зноў крутнула, цяпер ужо ўправа, загінаючы свой шлях да лесу. Так, да лесу імчыць яна, гэтая машына. І з машыны страляюць. Але страляюць не па іх, не сюды, не ў бок хаты, якая ахоплена полымем! Страляюць па тых, што на лугавіне і за ўзмежкам! Ву-унь, усхапіліся там, замітусіліся.

— Да лазнякоў! — гукнуў Захар Райнеку.— Перабежкамі!

Вецер пагнаў дым у бок агародчыка, і постаць Райнекі, які ўскочыў і, прыгінаючыся ля плота, мітнуўся ў бок студні, здалася Захару аграмаднай. А постаці на лугавіне і ў канцы ўзмежка былі дрыготкія, расплывістыя, і Захар, узнімаючыся, з калена сыпануў па іх доўгую чаргу з аўтамата і яшчэ адну, гэткую ж доўгую — ад студні, калі дабег да яе і ўклепчыў ля зруба. Ён ужо разумеў, што кола

пасткі разарвана, што шлях да Дзвіны, да выратавальных лазнякоў над узвалам адкрыты, што паратунак мспавіта ў гэтых імгненнях разгубленасці сярод тых салдат, што, адстрэльваючыся, беглі да ўзгорка.

— Але ж хто гэта? Хто? — задыхана спытаў Райнека, калі яны, прыгінаючыся да зямлі, пластавалі нізінаю за студпяй.— Мне падалося: у машыне — у чорным. Бобікі.

— Я не заўважыў.

— Машына нас і ўратавала. Каб не яна...

— Ты паранены? Кроў жа на патыліцы. І на шыі!

— Нечым чыкнула. Драбяза!..

Апошнія метры да ўзвала Захар прабег, высільваючыся, шырока адкрыўшы рот.

Папізу лазнякоў была сцежка, якая вывела іх у неглыбокую вузкую нізіну, падобную на рэчышча перасохлага ручая, амаль без хмызу, але затравелую. Нізіна, звужаючыся, вяла ў бок лесу. Ля старой лазіны, якая быццам пазначыла ўваход у нізіну, Захар згледзеў маленькую крынічку, бухнуўся ля яе на вільготную, як бы зыбкую траву, прагна напіўся. Вады ў крыніцы было мала, ён хапянуў яе гэтак імкліва, што ў рот трапіў жвір.

Стрэлы яшчэ гучалі злева, у тым баку, дзе гойдаліся попельна-чорныя султаны дыму. Але тут, у нізіне, яны здаваліся дужа глухімі.

— Неба паслала нам гэтую машыну,— прамовіў Райнека і бразнуўся на дол побач з Захарам. Хапянуўшы вады з крыніцы, ён зноў прыпаў да яе, не дачакаўшыся, пакуль яна адстоіцца і пасвятлее ў маленькім травяным сподачку.— І жанчына, здаецца, у кузаве мільганула...

— Ну, млынар! Калі жанчына ўваччу мільгаціць — до-оўга жыць будзеш.

— Трывожуся... Куды Дзіна з малымі кінулася? Можа, Багдан ёй дапамог? Трэба чоўпа пашукаць.

— Знойдзецца — не бядуй! — човен. Да лесу цісием! Да лесу!

Нізіна, якая, аддаляючыся ад рачнога ўзвала, рабілася ўсё вузей і вузей, была цяпер спрэс зацягнута сінявым горкім дымам. Дыхаць было цяжка. Але ў маладым сасопніку, куды яны неўзабаве выбіліся, паветра было чыстае, і Захар, ацёршы рукавом спацелы твар і не спыняючы хады, уздыхнуў з палёгкаю.

— Выдраліся мы з табою з пасткі, дарагі таварыш млынар,— пажартаваў ён. Але, убачыўшы жанчыну, якая

выбегла ім насустрач з карабінам у руках, спалохапа змоўк, шуснуў за разгалістую сасонку.

Райнека схапіўся за затвор дзесяцізарадкі.

— Гэта я! — гукнула жанчына.— Не страляйце! Гэта я! Ванда!

— Ты? — толькі і мог спытаць Захар.

— Я, таварыш камандзір. Мы з горада вырваліся. Багдана толькі што стрэла. Ён ля машыны. Там і Кандрат...

— Я ж казаў, што была жанчына ў кузаве! — узрадаваўся Райнека і нібыта робячы дзівоснай важнасці адкрыццё.— Мая ж была праўда!

— Кандрат гнаў машыну?

— Не, Трапашка быў за рулём. Яго забіла... А Кандрат паранены. Цяжка дужа...

— Дзіна тут? — спахапіўся Райнека.— Жанчына з дзецьмі. Два хлопчыкі з ёю.

— Толькі Багдана бачыла.

— Вядзі туды...

Захар моўчкі бег следам за Вандаю, бег, нават не распытваючы яе пра тое, што здарылася ў горадзе. Яму патрэбен быў Багдан, патрэбен быў ранец, які ён загадаў яму зберагчы, патрэбен быў Кандрат, ад якога ён, Захар, зараз пачуе нешта вельмі важнае.

## 25

*Блакнот Ромеля. Старонка пятая.*

«Бачыў поле бою сорак першага года. Другі батальён нашага палка загінуў там цалкам. Цяпер я доўга стаяў, глядзеў і дзівіўся: нічога амаль не змянілася. Левы бераг Дзвіны, пясчаная вузкая дарога ля поля, якое прыгожа і паката апускаецца да ракі; рака з дарогі відаць.

Тады, у тое лета, кроў, забітыя нашы салдаты, маўклівасць, задуменная ціша наўкола. Цяпер — роўны кліп ячменю, месцамі амаль саспелага. Каласы важкія, вусатыя — рудыя хвалі ад ветру. І — дзіўны шолах, шапаценне, як далёкія, прыглушаныя галасы аднекуль з-пад зямлі.

З цяжкасцю пазнаў гэтую мясціну. Пазнаў толькі пасля таго, як пачуў гаворку камандзіра атрада з камісарам — ехалі з кузні і спыніліся ля поля.

«На гэтым папаравым полі наша артылерыя іх добра памалаціла. Рудая ад крыві свірэпка была. Памятаеш?»

«Вось яна, гісторыя. Была кроў. Цяпер — поле. Хаця

зусім іншы парадак падзей: спачатку поле было, потым — кроў, цяпер зноў — поле. Кроў чужынцаў, захопнікаў — гэта як нарост дурны, таму і сплыло ў нябыт».

«Пройдзе час — зусім сатрэцца з памяці людзей».

«А ячмень добры гоніць. Пудоў на сотню».

«Менеї. Тут, дзе снарады зямлю ўзбуцілі, гліну наверх вывернулі — гадоў праз пяць поле раны залечыць...»

«Бліжэй да Дзвіны ячмень лепшы. Густы. І колас буйны. Э-эх, каб не сапсавалі яны нам жніво!»

Стаіць перад вачыма тое поле. Нехта будзе есці зерне з яго, радавацца, смяяцца. І ніхто і ніколі не згадае, што плакаў тут ад болю чужы салдат, паміраў, захліпнуўшыся сваёй крывёю.

Горкі лёс салдата, які гіне на чужой зямлі.

Дзе, на якім полі зарыюць мяне? Не ведаю. Але шамаценне гэтага ячменю будзе ў душы да скону дзён...»

## 26

А восьмай гадзіне раніцы Важнік яшчэ на гадзіну адклаў пасяджэнне выязнога бюро райкома партыі — вырашылі ўсё ж дачакацца Гусарава, які паехаў учора ў Астроўшчыну і невядома дзе затрымаўся. Упаўнаважаныя адтуль, запрошаныя на пасяджэнне, таксама не прыехалі. Гэтая акалічнасць, як здалося Захару, зусім не ўстрывожыла Важніка: сядзіць вунь пад яблыняй з упаўнаважанымі з вёсак, жартуе. Зайздросная вытрымка ў чалавека!

Гэтай якасці Захар пазайздросціў яшчэ на тым тыдні, калі Важнік спрачаўся з Гусаравым. Вось гэтак жа спакойна, без крыку, з жартамі, як ён гаворыць зараз з упаўнаважаным, ён давёў Гусараву, што мэтазгодна правесці не адно пасяджэнне, а два, у розных канцах зоны, якую кантралюе атрад. Якая тут выгада? Па-першае, упаўнаважаным з вёсак не трэба гнаць копей гэткай спёкаю, адрывацца ад спраў і клопату, якіх у кожнага багата. Па-другое, сам факт правядзення пасяджэння бюро непасрэдна ў розных кутках зоны не толькі выкліча добрую пагудку сярод насельніцтва, але і — гэта, бадай, самае галоўнае — надасць выключную важнасць пытанням, якія абмяркоўваюцца.

А пытанні важныя. Гаворка ідзе пра падрыхтоўку да ўборкі ўраджаю, пра дапамогу, якую акажуць партызанскія ўзводы вёскам, і асабліва тым сем'ям, дзе толькі жан-

чыны і дзеці. Тут і само жніво непасрэдна, і абмалот, і выкапанне паставак атраду, і захаванне сабранага хлеба, і стварэнне насенных фондаў. Сяўба паказала, што разлічваць на спакойную працу на палях не даводзіцца: фашысты з самалётаў стралялі па людзях, якія працавалі на палях, таму працавалі ўвечары перад змярканнем і на досвітку. Удзень жа, учуўшы гул самалёта, аратыя гналі коней у лес і самі хаваліся. Убіраць ураджай будзе не лягчэй. І трэба зрабіць усё хутка, каб паспець і сабраць і схаваць хлеб. А як гэта зробіш, калі папярэдне не выявіш усе наяўныя мажлівасці? А яны ж, шчыра кажучы, мізэрныя: цягла не хапае, рабочых рук таксама, на ўсю зону ёсць адна спраўная конная малатарня. Знайшлася і яшчэ адна малатарня пазаўчора, але яна не адрамантаваная, і невядома, ці ўдасца давесці яе да ладу. Каб хутка правесці абмалот, вырашылі стварыць брыгаду малацільшчыкаў і пусціць малатарню па вёсках. Але што можа зрабіць адна конная малатарня! Давядзецца абмалочваць хлеб уручную, выкарыстоўваючы старасвецкія прылады.

Важнік, аднак, арганізатар. Ён — і калі толькі паспеў! — склаў ужо распарадак работы і маршрут гэтай малатарні. І прапановы яго слушныя. Сапраўды, навошта ж спачатку ехаць у Начу, каб потым, крыху папрацаваўшы, рабіць пусты перагон на Венцавое? Ці не лепей спачатку абмалаціць усё ў Венцавым, перакінуўшы сюды жней з Пятроўцаў, а потым, праз Завалынку, гнаць малатарню на Начу. Гэтак, маўляў, у калгасе рабілі, калі эмтээсаўскія малатарні ішлі па брыгадах. Выяўляецца, што ён нават ведае, колькі і якіх машын працавала ў гэтых мясцінах да вайны. І як аб усім гаворыць! Даверліва, па-сяброўску, быццам не гаворыць, а раіцца з людзьмі, шукае ў іх падтрымкі, просіць даць слушную параду, як лепей усё зрабіць. І гэта яго прапанова не ў хаце сядзець, а тут, у садку пад яблынямі! І задухі няма, і неяк даверу ў кожнага болей, і кожны смялей гаворыць, і думаецца аб усім дужа вольна, раскавана... Сапраўдны талент арганізатара! Ціхан, між іншым, гэта заўважыў яшчэ летась. З ім неяк надзейна заўжды: можна аб усім пагаварыць шчыра, душу адкрыць нараспашку. З Гусаравым гэта — цяжэй. Гусараў ранкам можа жартаваць, а ўвечары — на ўсе гузікі зашпілены, не падступіцца. А ўжо калі прычэпіцца да чаго-небудзь!.. Як з гэтай Багданавай скаргай! Прывязаўся, быццам сляпы да таго плота. Абмяркуем, маўляў, бытавое пытанне на бюро! І колькі ні даводзіў Захар, што абмер-

кавана гэтае пытанне ў ротных партыйных арганізацыях, на сходах партыйна-камсамольскіх груп ва ўзводах, што прыняты адпаведныя рашэнні, што ў чарговых нумарах «Баявых лісткоў» завастраецца ўвага... Дык не ж! Хай бюро абмяркуе! І вось пазіцыю Важніка тут цяжка зразумець: запярэчыць, дык ён запярэчыў, але быццам дзеля прыліку, і потым адразу і пагадзіўся. Ці, можа, хітруе Важнік, знарок гэтак хутка пагадзіўся, каб, як кажуць, не дражніць гусей? Магчыма. Але ж Багдан там сядзіць і пакутуе...

Захар, як толькі ступіў з саду на вуліцу, адразу ўгледзеў Багдана. Ён сядзеў на бервяне, што ляжала ў траве пад шчыльным, але пахілым парканам з тонкага жэрдзя. Дзіўная пастава ў яго: скрыжаваў рукі на каленях, звесіў на іх галаву і як бы матляе з боку на бок, бы курчыцца ад болю. Захар бадзёра папытаў: пра што, маўляў, казак зажурыўся, і Багдан страпянуўся, ускочыў.

— Зажурыўся тут, пра бацьку ўсё думаючы. І не магу сцяміць, чаго ж яны праз вёску пёрліся? Звярнулі б ля аселіцы ды пусцілі ўсцяж ручая — усе цалюткія былі б...

— Апрача нас з табою. Ды Райнекі... І Дзіны з дзецьмі. Так што твой бацька нас, лічы, і ўратаваў.

— Ён жа за рулём не сядзеў. Трапашка.

— І гэты таксама па-геройску загінуў. Крывёю сцякаў, а машыну гнаў... Я з Гусаравым гаварыў ужо — абодвух мы ўзнагародзім.

— Навошта ўзнагарода, калі чалавека няма.

— Ад гэтага «няма» і нам з табою не адкруціцца: мы не вечныя. І галоўнае не гэта, а тое, што пасля чалавека на зямлі застаецца...

Думкі былі не новыя, Захар іх паўтараў неаднойчы, і паўтарыў цяпер з адчуваннем, што менавіта гэта павінен сказаць Багдану. Але, убачыўшы на губах Багдана ледзь прыкметную грымасу, якая выразна казала пра тое, што яму, маўляў, ад такіх суцяшэнняў не лягчэй, дадаў тонам даверлівым і сяброўскім:

— Ты даруй, хачу цябе зноў папытаць: што табе бацька паспеў перадаць?.. Ты падрабязнасці прыгадай... Можа, што новае ў памяці ўсплыве...

Багдан сумеўся, плечы яго прыўзняліся, як бы затуляючы галаву, і ён выціснуў глуха:

— Сказаў жа ўжо. «Блакада будзе. Вандзе звесткі пра яе падманныя падсунулі...» Гэта — бацькавы словы.

— Шкада Трапашкі. Ён, значыцца, ведаў, калі яны

ўдумалі на наш бор насесці. А вось Кандрату не сказаў. Нейкая ж ёсць прычына. Як на тваю думку?

— Не чуў я іхнюю гаворку!

— Ну, ведама ж. Гэта я ўслых, сам-насам разважаю...

Размовы шчырай не атрымлівалася, і Захар зноў заўважыў, што гаворка пра бацьку нечым прыгнятае Багдана: адразу вось гэтак скаланецца, унурыцца, нават голас зменіцца, і ў вочы не глядзіць. А што, між іншым, ты хацеў у тых вачах убачыць? Кандрат сканаў у яго на руках... Але чаго стары перад смерцю прасіў Ванду адысці, з сынам сам-насам пакінуць? І зноў жа натуральна: няма патрэбы чужому вуху слухаць апошнія бацькавы словы, адрасаваныя толькі сыну. А ты вось усё з допытам да Багдана, як праверыць хочаш, як не давяраеш. Дзіну з дзецьмі ён жа кінуў па беразе, нават не дачакаўся, пакуль човен уснаўзе на бераг, папыліў да лесу адзін. Аднак, калі з другога боку зірнуць, то гэта, відаць, і разумна: пабег наперадзе, дарогу разведаў. Дзіна следам ужо бегла і ведала, што наперадзе небяспекі няма. Але чаму недавер у тваім сэрцы да Багдана ўсё не знікае? Як нешта чалавек утойвае ад цябе, і ты пра тое ведаеш дакладна. Ванда казала, што Кандрат прасіў, каб ён, Захар, дараваў яму, што не стрымаў абяцанне, не знайшоў чалавека, які прадаў Балаша... І сына, які слухаў і гэтыя словы, зразумець сёння можна. А ты яму на жывую рану соль сыпеш: прыгадай, маўляў, што яшчэ бацька казаў. Хай Багдан зараз ідзе з гэтага пасяджэння — абыдуцца на бюро і без яго. Гусараву можна будзе нешта і схлусіць: занядужаў, маўляў, чалавек...

З саду выходзілі ўпаўнаважаныя вёсак, і Захар спытаў Падрэза, які шнураваў наперадзе:

— Што, Хведар Паўлавіч, перапынак тамака ў вас?

— Ды не, скончылі. Усё абмеркавалі, дамовіліся аб усім. Загад цяпер баявы: па хатах!

— Добрай дарогі тады вам усім!

Захар паціснуў кожнаму з упаўнаважаных руку, накіраваў быў у сад. Але тут жа і павярнуўся, нахіліўся праз плот, сказаў Багдану, каб той ішоў да сябе ва ўзвод. Багдан, як бы ведаў, што гэткі загад зараз пачуе, таропка казырнуў і хутка пайшоў крайком вуліцы, уздымаючы ботамі пыл. Сеўшы пад яблыню, Захар спытаў Важніка:

— Паклаў рашэнні на паперу? Трэба будзе паказаць Гусараву.

З вуліцы пачуўся мяккі тупат капытоў — імчаў Гусараў. Ён саскочыў з каня, лоўкім узмахам рукі накінуў повад на скасабочаны слуп у канцы плота, хуткай хадою ўвайшоў, як уварваўся, у сад. Павітаўшыся з усімі адным агульным кіўком галавы, ён пацягнуўся па конаўку, што вісела на галінцы яблыні, зачэрпнуў з вядра вады, похапкам выпіў, сказаў, чапляючы конаўку на галінку.

— Спазніўся, прашу прабачыць. Сустрэў дарогаю групу капітана Маркава — уночы пераправіліся з-за Дзвіны. Ідуць з-за лініі фронту.

— А чаго наша застава маўчыць? — абурыўся Яштокін.— Загадана адразу ж паведамляць у штаб, калі хто пераправіцца адтуль.

— Значыцца, наша граніца не на замку!

Файзуло, які дагэтуль маўкліва сядзеў ля кусцістых парэчак, усыпаных ружаватымі гронкамі ягад, буркнуў:

— Падазронная колькасць груп пачала перапраўляцца.

Гусараў перапыніў яго грэблівым узмахам рукі:

— Беспадстаўная падазронасць! Маркава я ведаў і да вайны — прыязджаў да нас,— працягваў ужо з захапленнем, радуючыся нядаўняй стрэчы са старым знаёмым.— Ён быў лектарам Цэнтральнага Камітэта партыі. Міжнароднік. Выключная эрудыцыя. І цяпер ён параказаў шмат.

— Трэба было запрасіць, каб пачытаў якую лекцыю ў ротах. Затрымаць трэба было. І сюды даставіць!

— Спрабаваў. Але заўтра ён павінен быць ва Ушачах. Спяшаецца.

— Што кажа новага?

— Ён болей нас ведае нават пра тое, што тут, у Беларусі, робіцца. Баранавіцкія партызаны нядаўна разбілі буйны гарнізон у Налібоках. Чатыры сотні гітлераўцаў там лягла.

— Што ён кажа новага пра фронт? — нецярпліва перапытаў Яштокін.

Гусараў пачаў расказваць пра падзеі на поўдні, пра баі пад Новарасійскам, пра вызваленне важнай чыгуначнай станцыі Крымская, пра моцныя паветраныя баі на Кубані, пра тое, што наша авіяцыя, урэшце, пануе ў небе. Потым паведаміў, што скасаваны Камінтэрн.

— Як? — падхапіўся Важнік.— Кіруючы цэнтр міжнароднага рабочага руху скасаваць? Яго распусціць можа толькі Кангрэс! Як жа ён у вайну адбыўся?

Гусараў пачаў тлумачыць, праўда, не зусім упэўнена, што Кангрэс не збіраўся, што скасаваў Камінтэрн яго Прэзідыум, бо шмат у якіх краінах гэтага даўно патрабавалі.

— І правільна зрабілі,— падсумаваў Яштокін.

Гусараў аніяк не адгукнуўся, казаў з роздумам:

— Увогуле цікавыя навіны адкрыў Маркаў. Польскі ўрад у Лондане запатрабаваў, каб армія генерала Андэрса не ўдзельнічала на нашым фронце ў баях супраць фашыстаў. І яе цяпер эвакуіруюць праз Іран.

Яштокін прысвіснуў:

— Фю-ю-ю... Нічога сабе паночкі, прошу пана!

— Затое створана польская дывізія Тадэуша Касцюшкі — гэта патрабавалі польскія патрыёты. Дывізія будзе калашмаціць фашыста разам з намі.

— Гэта — плюс!

— А цяпер зноў — пра мінус. Рузвельт і Чэрчыль адклалі адкрыццё другога фронту на вясну.

— На будучы год? — не паверыў Яштокін.— Гэта ж ужо сорак чацвёрты будзе!

— Але... Вясною сорак чацвёртага хочуць адкрыць другі фронт нашы саюзнікі.

— Саюзнічкаў сабе прыдбалі. Яны ж чакаюць, каб з нас наболей крыві лілося. А самі золата грабуць за рознае там...

Яштокін падкалоў Файзуло:

— Палітычна правільна мысліш!..

Файзуло змаўчаў, толькі пачырванеў, верхняя губа выгнулася. Усе пазмрачнелі, сядзелі маўкліва. Гусараў выкарыстаў гэтую хвіліну маўчання, спытаў у Захара:

— Праверылі Кандратавы данясенні? Я чамусьці пачынаю ў іх сумнявацца.

— Я не сумняваюся. Але ўвечары будзем ведаць усё дакладна. Наш чалавек сёння вернецца.

— Абавязкова трэба ведаць. І абавязкова — сёння!..

Захар няпэўна паківаў галавою. Гусараўская катэгарычнасць апошнім часам ужо не здзіўляла яго: прызвычаіўшыся да яе, ён не мірыўся з ёю амаль ніколі, аднак навучыўся прымаць як пэўную рысу чалавека, якому па статуту павінен падпарадкоўвацца і аб якім меў ужо сваё ўласнае меркаванне. Гэтае меркаванне апошнім часам усё больш збягалася не на карысць Гусарава: Захару не падабалася, як у гаворцы, у рухах, ва ўсіх сваіх учынках тоїі ннсціца быць падобным на Ціхана; падабен-

ства атрымлівалася штучнае, і Гусараў, заўважаючы, што Захар гэта прыкмячае, рабіўся яшчэ больш зацяты ў сваім жаданні быць чалавекам цвёрдай волі і непахіснасці ва ўсім.

— Працягнем пасяджэнне, — прапанаваў Гусараў, быццам пачуўшы ад Захара адказ, які чакаў і з якім быў цалкам згодны.— Жыццё, як бачыце, паказвае, што разлічваць нам трэба толькі на свае сілы. Калі самі фашыста не вытурым са свае зямлі, дык ніякі добры дзядзька на гэта не зноўдзецца. І сёння галоўнае — вайсковая дысцыпліна, вайсковае майстэрства.

Зноў знаёмая катэгарычнасць. Як быццам ніхто, апрача Гусарава, не ведае, якое значэнне маюць вайсковае майстэрства і дысцыпліна. Гусараў, значыцца, стрэў групу капітана Маркава. Цікава, ці распытаў ён яго пра лёс апошняй калоны мабілізаваных, якую яны выправілі ў шлях у пачатку вясны? А калі і распытваў? Адкуль Маркаву ведаць усё пра лёс нейкай групы людзей? Чаго яны важаць, нейкія тры сотні чалавек у вялізным і неабдымным віры, які паглынае зараз тысячы чалавечых лёсаў? І што, скажам, значыць у ім, тым віры, лёс Гайдаш?.. Дзіўна, ён, значыцца, чакае, што яна вернецца? Дарэмна! Яна пайшла з калонаю не на тое, каб потым вярнуцца і ўзрадаваць пры сустрэчы! Гайдаш не паскардзіцца, што цяжка, яна лепей загіне, чым паведаміць табе, што саслабела, спалохалася, просіць дапамогі...

Мяккае шапаценне яблыневай лістоты крыху глушыла знаёмыя галасы, што паведамлялі факты знаёмыя і будзённыя. Добра, аднак, ён, Захар, зрабіў, што адаслаў Багдана: усё меней будзе гэтай непатрэбнай гаворкі, гаворкі аб справах другарадных. Відаць, мудра зрабіў і вырашыў Важнік, што не пярэчыў Гусараву — ён зараз выслухае справаздачы камандзіраў рот, паслухае некаторых камандзіраў узводаў і супакоіцца. Пры сустрэчы ж з Ціханам, напэўна ж, пахваліцца сваёй прынцыповасцю. І хай сабе! Але Ціхану, відаць, не варта будзе казаць пра «мемарандум» Яштокіна. Так, не варта. Ціхан, безумоўна ж, абурыцца, калі ўбачыць тую «паперу», дасць прачуханца Гусараву, а той знойдзе спосаб пасаліць і табе, і Юршу, і Яштокіну. Ха-ха! Ты, Захар, пачынаеш рабіцца хітругаю-дыпламатам! Чаму ж тады не выкарыстаеш дыпламатыю ў дачыненні да Багдана? Мог жа неяк ласкава да яго павярнуцца, спакойна пагаварыць... Тады, магчыма, нешта і дазнаўся б. Хэ! Ад Багдана ты

нічога больш не даведаешся! Гэты, бы рыбіна, можа маўчаць. І хай сабе маўчыць! Вернуцца сёння ўвечары людзі з горада, і ён, Захар, усё будзе ведаць дакладна. Калі плануецца блакада бору, дык употай гэта не зробіш!..

Знаёмыя галасы — Файзуло ўсё нешта пярэчыў, даводзіў Гусараву — пацішэлі, як бы аддаліліся. Захару на нейкі міг падалося, што ён не ў садзе, а ляжыць на ўзмежку, ля спелых жытоў, на тым узмежку, дзе ён у сне галубіў Гайдаш. Успамін не прынёс радасці — агарнула знаёмая горыч. Дзеля чаго ён варушыць гэтыя ўспаміны, не дае ім згаснуць? Хоча неяк апраўдаць сябе? Хоча, каб яна, Гайдаш, вярнулася? Не, не! Ён хоча аднаго: хай вернецца жонка, хай вернуцца дзеці, хай побач з ім будзе Зінаіда і дзеці...

«Мары дзівака. Кіндэр шпіль, як кажа Ромель. Дзіцячая гульня».

Шчымліва заныла сэрца, як нейкая струна загула ў ім, завінчваючыся болем пад рэбры. Нібыта і рэальна, недзе побач, прагучала гэтае бязлітаснае і суровае сцверджанне. Ён адарваў свае плечы ад каравага камля яблыні, сеў роўна і адчуў сябе гэтак, быццам вынырнуў з чорнай глыбі на сонечную паверхню зыркага і цёплага возера; мройнасць сплывала, як дым ад ветру, і ён нутром усім адчуваў гэтае ачышчэнне, гэтае вяртанне ў новы свет.

Чый жа голас, як падалося, ён толькі што пачуў? Голас Гайдаш? А якое дачыненне мае Гайдаш да яго, Захаравай, бяды? Ён кахаў толькі Зінаіду. Ён кахаў толькі яе і будзе кахаць толькі яе адну, хай яна ўжо ніколі не будзе з ім побач. З ёю ён быў шчаслівы, з ёю ён гадаваў дзяцей... Цяпер і яе няма, і дзяцей няма, і кахання няма... І ён, Захар, адзін-адзінюсенькі... І ніхто яму больш непатрэбны: аніякую жанчыну кахаць гэтак, як кахаў Зінаіду, ён не зможа... І адзінае, што ёсць у яго,— гэта помста. І адзінае, што яго можа неяк суцяшаць, дык тое, што не толькі ён адзін гэткі. Мільёны сем'яў разбурыліся. Мільёны жыццяў паглынула вада, зжэр агонь, пахавала зямля... Пахавала і маўчыць, нічога і нікому не гаворыць. Не, ёй таксама баліць, зямлі, яна стогне, пакутуе, як жывая істота...

Захар адшчыкнуў вузкае каліва суданкі, пакруціў яго ў пальцах, і думка, зусім не новая, раптам уразіла яго сваёй незвычайнай вастрынёю. Тваё ўласнае гора толькі малюсенькая кропачка ў моры гора людскога, вось як гэ-

тае каліўца суданкі ў невымерным зялёным разліве. І помсты прагнеш не толькі ты, помсты прагне ўся гэтая зямля, знявечаная, апаленая агнём і болем. І помста гэтая — не толькі жаданне забіць чужынца, што знявечыў тваю зямлю. Зямля павінна і будзе жыць далей, будзе гнаць да сонца траву, зяляніць дрэвы, шапацець хлебным коласам, і адпомсціць, значыцца, не толькі проста фізічна скрышыць таго, хто наважыўся вынішчыць і вынішчае на ёй, зямлі, жыццё. Гэта значна большае, гэта сцвярджанне самога жыцця, сцвярджанне шчасця і кахання... Кахання? Пра якое каханне ты разважаеш? Ты што ўбіваеш у дурную сваю галавешку? Гайдаш? Нейкае горкае дзяўчо... Горкае дзяўчо? Хай сабе. Але ж яна прайшла з табою побач ад першых дзён вайны, пабачыла гэтулькі ж крыві, колькі бачылі і твае ўласныя вочы. Яна не меней за цябе глядзела на смерць... Глядзела? Яна ж штодня змагаецца супраць смерці і неаднойчы перамагала... Ты падлічыў хоць калі-небудзь, колькі параненых Гайдаш уратавала? І можа, ты і сам сядзіш вось тут, пад яблынямі толькі таму, што яна колькі начэй прасядзела ля цябе ў шпітальнай зямлянцы і не пускала да цябе смерць. І можа, уратавала цябе не што іншае, а гэта менавіта — яе каханне. А можа, яна сваім сэрцам і адагрэла крыху тваю душу ад скрухі, адчаю, тугі?.. І ты, між іншым, добра аддзячыў ёй! Выпхнуў з атрада, паслаў у далёкі і небяспечны шлях, каб толькі не бачыць, не чуць штодня! Не, яна ж сама напрасілася на тое заданне! Сама? Дзе ж сама! Яна ж ведала тваё жаданне, разумела, што замінае... А замінаць яна не хацела. А ты што зрабіў? Ты нават дзеля прыліку не запярэчыў, употай зарадаваўся, што гэтак проста развязваецца нечаканы вузельчык у тваім сумленні! Вузельчык? Пра які гэта вузельчык ты разважаеш? Няма аніякага вузельчыка! Гайдаш вернецца! Магчыма, яна ўжо зусім недалёка. Зусім недалёка і хоча ўбачыць цябе...

У гэтых знаёмых — колькі ўжо разоў вярэдзілі яны Захарава сэрца! — сумненнях і развагах было нешта новае, і гэтае, новае, выводзіла Захара да радаснай высновы пра будучыя дні, тыя дні, у імя якіх ён жыве і змагаецца. Як бы вынырнуўшы з нейкага мроіва, глядзеў ён на Гусарава, які сядзеў ля стала на нізкім скасабочаным зэдліку. Адкуль тут стол і зэдлік з'явіліся?.. Во, ужо і не ў памяці! Перад пачаткам пасяджэння Валяўка выцягнуў з хаты і паставіў пад яблынямі. А чаму Файзуло

стаіць ля стала? А-а, ён жа справаздачу робіць... Але ж якая гэта справаздача? Ён жа нечага грыміць на Гусарава?..

Голас Файзуло ломкі, амаль раздражнёны:

— Фа-акты! Якія ж гэта факты?.. Ну, спяць... Спяць партызанкі другога ўзвода ў той жа хаце, дзе і партызаны, мужыкі, спяць. Бо як размесцішся, калі дзве хаты выдзелена? Але ж у хатах пераборкі стаяць!

— А мне баялі, што ў тых пераборках дошкі без цвікоў,— з прыхаваным смяшком прамовіў Юрша.

— Як гэта? А куды ж цвікі падзеліся?

— Матузамі пазаменьвалі: у які бок хочаш, у той і павернеш дошку!..

Стрыманы смех раззлаваў Файзуло.

— Пераборкі ўсіх зацікавілі,— і ён з дакорам паківаў галавою.— Але чаму ніхто не папытае, як тыя кабеты, што за пераборкамі спяць, патроны каліброўюць? Файзуло — возьме. Файзуло — арганізуе. Гэтак было? І саржавеў бы той станок каліброваччы, каб мы не ўзялі.

— Узялі! Вам далі яго, адказную справу даручылі,— мякка ўдакладніў Важнік.— Бо ў першай роце нямецкіх патронаў — завал.

— А ён што, той завал, з-пад пераборкі выкаціўся? Першая рота не цвікі ў пераборках лічыць — ваюе. Ёй няма часу цвікі на матузы заменьваць!

Пажога зыркаў на ўсіх фанабэрыста — яму па душы было, што яго камандзір узвода гэтак актыўна і разумна спрачаецца. Але гэта было не даспадобы Гусараву, і ён, гледзячы менавіта на камандзіра роты, уладарна заўважыў:

— Намеру зменшыць баявыя заслугі першай роты я не бачу. Рота перадавая, гэта несумненна. Аднак жа не пра тое гаворка! А пра факты маральна-бытавога загнівання, якое пачынаецца з недаацэнкі — гэта зусім слушна адзначана ў пастанове Пятага Пленума Цэнтральнага Камітэта! — ролі дзяўчат і жанчын у партызанскай барацьбе, з фактаў няправільнага стаўлення да іх, што прыводзіць да антымаральных паводзін асобных таварышаў...

Пажога не сцярпеў, кінуў заўвагу:

— Пастанову Пленума мы абмяркоўвалі. Няма ў нас гэткіх фактаў!

— Зусім і няма? Ці, можа, вы іх не прыкмячаеце?

— Калі плямы няма — яе не прыкмеціш.

— А хто ўзняў страляніну па тым тыдні ў Зуях?

— З крывога коміна і дым крывы...

— Што? — не дапяў Гусараў.

— Крывую інфармацыю вам далі,— патлумачыў Файзуло.— Роўда ў той страляніне не вінаваты. Вартавы заснуў — ён і пажартаваў.

— Добры жарт! Увесь узвод па трывозе імчаў!

— А каб не Роўда вартавога пабудзіў, а фрыцы? Што б той узвод рабіў?

Гусараў адчуваў, што тлумачэнні Файзуло выклікаюць у прысутных зусім не тую рэакцыю, на якую ён разлічваў, і спытаў стражэй:

— А камандзір падрыўной групы? Чаму ён штораніцы гоніць верха ў Начу?

— Калі вярблюду патрэбна калючка, ён выцягвае шыю. Калі малады хлопец кахае...

— Гаворка хіба пра маладога хлопца? Пра камсамольца гаворка. А камсамолец — прыклад для ўсіх астатніх павінен паказваць!

Захар кашлянуў, убачыўшы, як Пажога спахмурнеў і збліскаў вачыма. Трэба ўмяшацца. Трэба іх неяк улагоджваць.

— А ён і ёсць сапраўды прыклад,— таропка, апярэдзіўшы ўсіх, загаварыў Файзуло.— Яго група зрабіла болей за цэлы ўзвод. Колькі эшалонаў узарвана? Чатыры. А масты! А машыны! Калі вольны ад задання — хай верха, хай пеша да маладой жонкі імчыць,— і, перадыхнуўшы, сказаў з вясёлай развагаю.— Калі і вартавога ля ложка паставіш, дык гэты арлом прарвецца.

Зноў выбухнуў смех. Але цяпер ужо больш дружны і раскаваны. Гусараў не залюбіў гэтую весялосць, прамовіў незадаволена, тукаючы пальцам па стале:

— Тады няхай усе прарываюцца. Няхай да жонак — верха і пеша... Усе кабеты ў вёсках нам дзякуй скажуць.

— На жаль, не ўсе,— сказаў, уздыхнуўшы, Пажога.

— Гэта ж чаму?

— На ўсіх кабет першай роты не хопіць,— прызнаўся Пажога са шчырым шкадаваннем.

Грымнуў дружны рогат. Адзін толькі Файзуло не смяяўся, ён неяк імкліва павярнуўся, адступіў на крок ад стала, узіраўся ў канец саду і ўслухоўваўся, быццам згледзеў там нешта дзіўнае. І гэты яго парыў як бы астудзіў усіх; смех сціх. І тады Захар учуў глухія і далёкія стрэлы і выбухі. Не вельмі частыя, але несупынныя, яны

быццам выкатваліся з-пад доўгіх жэрдак плота ў канцы саду, паўзлі, разматваліся па траве пад яблынямі, і лістота на дрэвах як бы ціха трымцела.

Нібыта па камандзе, усе, хто сядзеў, ускочылі і знерухомелі, услухоўваючыся ў гукі бою.

— А мы — цвікі ў пераборках мацаць узяліся! Вуунь яны, цвікі! Паспявай, падлічвай,— з непрытоенай зларадпасцю выгукнуў Файзуло і кінуўся з саду.

— Назад! Вярніцеся назад, таварыш Файзуло! — з металічным звонам у голасе загадаў Важнік і касцякамі пальцаў правай рукі, сціснутай у кулак, пастукаў па сярэдзіне стала.— Калі ласка, на месца!

— А вы не чуеце? У Плігаўках мая застава зараз бой вядзе!

— А мы вядзем бюро!

На губах Важніка, моцна сціснутых, акрэслілася вузкая белая звілінка, быццам іх прашылі белай ніткаю. Файзуло зыркнуў на Важніка, адразу абвяў і моўчкі, высока ўзнімаючы ногі, быццам па вуголлі ішоў, паблізіўся да стала.

— Пытанне не абгаворана як след, і таму пастанову зробім на наступным пасяджэнні. Іншых думак няма?.. Няма... Будзем лічыць пасяджэнне бюро скончаным,— і, зірнуўшы на Захара, Важнік усё тым роўным голасам дадаў: — Цяпер слухаем камандзіра атрада — яго цяпер паўнамоцтвы...

У галінах яблыні, чыста, як далёкія самалёты, гулі пчолы; у кузні за аселіцай звінела кавадла; цвыркалі, пралятаючы над дрэвамі, ластаўкі; мычала недзе за садам у лузе карова. З гэтым харастром сонечнай раніцы аніяк не стасоўваліся трывожныя і адчужаныя гукі неблізкага бою. Услухоўваючыся і як бы ўзважваючы іх, Захар з прыязнасцю і захапленнем падумаў не пра вытрымку і ўраўнаважанасць Важніка, а пра чалавека, які быў далёка адсюль — пра Ціхана. Адкуль у яго, Ціхана, гэтая здольнасць бачыць чалавека ў момант і цалкам. Вопыт? Прыроджаны талент? І першае, мабыць, і другое. Вось сустрэўся Ціхан з Важнікам, пагаманіў, і той перад ім, быццам на далоні. А ў цябе, дружа, гэтак не атрымліваецца...

Думка не выклікала крыўды, наадварот, яна неяк узвысіла яго, надала спакою.

— Камандзірам — па сваіх ротах. Сувязных — у штаб,— і, павярнуўшыся да Гусарава, ціха прамовіў, як

бы запытваючыся і раячыся адпачасова: — Вы будзеце ў штабе?

— Не. Я абяцаў Маркаву апоўдні сустрэцца. І ўночы праводзіць да Ціхана.

— Дык вы за чыгунку пойдзеце! Каго з разведкі вам выдзеліць?

— А навошта? Я ж іду з маркаўцамі. Пяройдзем ля Глухога — дарога мне знаёмая. Дні праз тры — вярнуся...

Развітваючыся, Захар паціснуў Гусараву руку з ахвотаю, употаї зарадаваўся. Хаї едзе! Неяк спакайней і вальней адчуваеш сябе без яго: сам прымаеш рашэнні, ніхто не падспешвае, не павучае, не стаіць, як гаворыцца, над душою. Дзіўна толькі, чаму Гусараў не паведаміў аб сваім рашэнні раней, калі прыехаў і казаў пра сустрэчу з групай Маркава? А хіба не ўсё роўна табе? Ты ж заўжды прагнеш самастойнасці — вось і маеш яе!

Шнуруючы па садзе следам за Пажогам, Захар жыў ужо знаёмым адчуваннем бою. Няпэўнасць становішча, аднак, яго хвалявала, і ён гукнуў Файзуло, які, апярэдзіўшы ўсіх, бегма цісну́ў да плота:

— Думаеш, застава твая грыміць?

— Точна! Памылкі няма — па гуках бою чую. Гэдак жа і ў студзені пачалося.

— А ці не ўлева ад Плігаўкі?

— Не! Мая застава.

— Там аддзяленне стаіць,— удакладніў Пажога.— Завяжуць бой. І — на адыход, калі нявыкрутка.

Нізка прыгнуўшыся, Захар пралез пад абвіслай жэрдкай на той бок плота і выпрастаўся. Шумела кроў у скронях і крыху кружыла галаву. Але ж не чуваць ніякага бою! Урэшце дапяў: зусім аціхла кананада. Чэзлі шумлівыя такты ў скронях, неяк дзіўна лягчэла ў галаве, і пранізліва-звонкім рабілася кароткае, як посвіст куль, цвыркание ластавак, што выносіліся з-за яблынь і, бліснуўшы над зялёна-сіняй шчоткаю травы, знікалі ў канцы поплава.

Захар наважыўся памагчы Важніку выбрацца з саду і прыўзняў доўгую, правіслую пасярэдзіне жэрдку; жэрдка зламалася ля шулы, і трэск ссохлай, састарэлай дзеравіны супаў з моцным, але дужа далёкім, раскацістым выбухам, які рассек і зламаў цішыню. Выбух прагучаў зусім не ў тым баку, дзе толькі што аціхла кананада —

справа ад саду, за зялёным узгоркам, па якім гнулася, хадзіла хвалямі пад ветрам жыта, жаўтлявае і блішчастае, як залачонае.

## 27

Захар не шкадаваў каня. Хутчэй туды, пад Плігаўку! Трэба ўсё ўбачыць на свае вочы, убачыць тое, што Пажога ў сваім данясенні назваў «вялікай перамогаю». Добрая перамога! Пастраляў усе снарады — шэсць жа снарадаў засталося! — і трубіць пра нейкую перамогу. І гэта — за нейкія дзве гадзіны бою! А заўтра чым ваяваць? Заўтра дзе ты, герой, снарады возьмеш? Ды што заўтра! Яшчэ ж толькі полудзень, яшчэ і сёння, відаць, гэтыя снарады у-ух як спатрэбяцца! І казаў жа, загадваў неаднаразова: снарады — толькі па танках. А яны — па машынах смалілі, па кулямётах... Вось і даваяваліся! Хай цяпер галаруч б'юцца, калі браневікі на іх пасунуцца. Дык жа ж ён, Пажога, не хоча галаруч, падмогі просіць. Перакіньце, маўляў, узвод з другой роты, у іх там, маўляў, ціха, а тут, пад Плігаўкаю, горача! І Яштокін быў амаль на гэта і схіліўся. Але Захар яго пераканаў: другая рота — гэта як тыл у першай. Тыл паслабляць нельга. Калі яны вырашылі блакіраваць бор, дык павінны ўдарыць і ад Ліцвінава, ад Фарынава — па абароне другой роты. Між іншым, менавіта адтуль Захар і чакаў першага ўдару. А яны пачалі адсюль, як бы намыслілі адрэзаць іх ад Дзвіны. Але гэта — пралік: ад Дзвіны іх можна і не адразаць, бо за Дзвіну атрад не пойдзе. Там непадалёк адна ад другой — дзве гравійкі, чыгунка, лясы маленькія, вялікія бары за чыгункаю, ае ніяк удзень не пяройдзеш. Але бачыш, што яны робяць? Наважыліся адціснуць ад ракі, вашы стратэгічныя задумы, таварыш камандзір, не ўлічваюць...

Наўкола была цішыня — бой даўно аціх. Захар паняссе пачаў супакойвацца. Магчыма, гэта проста чарговая спроба фашыстаў уварвацца ў зону атрада, спроба, якіх было шмат і ў розных месцах і якія атрад адбіваў паспяхова. Падобна, што гэтак абыдзецца і сёння. Але не трэба варажыць. Ён прыедзе зараз на лінію абароны першай роты, убачыць вынікі бою.

Дарога — як і не было ўчора дажджу — добра падсохла ўжо. Выхоплівае вецер з-пад конскіх капытоў ру-

дававата-белы пыл, гоніць яго ўлева, па ўзбочыну, і быццам не цуглі венькаюць, а звініць-пазвоньвае гэты пыл, што цярусіцца праз маладзенькі бярэзнічак і рэдзенькім туманам асядае на траву. Аблокі на небе высокія, як пасаджаныя адна на адну снегавыя гурбы, белыя, з блакітнымі і сінімі палоскамі. Сінее малады сасоннік на ўзгорку, а ў нізіне, куды спаўзае пятлявай яшчаркаю, коціцца дарога, нерухома чарнеюць грушы-дзічкі, і за імі, жаўтлява-белымі, як і на небе аблокамі, грувасцяцца шаты лазнякоў.

«Як воблакі туды апусціліся. І звіняць...»

Захар быў напачатку не паверыў у гэта, зірнуў на неба, быццам спадзяваўся ўбачыць, як адтуль марудна апускаюцца на лазнякі аблокі, і зразумеў, адкуль прыйшлося гэтае падабенства. Гэта ж нібыта не маленькі ручай там, наперадзе, а ляжыць за высокімі ўзваламі Дзвіна: вясною, калі глядзіш з Дзвінскіх узвалаў удалячынь, дзе разліваецца па берагах жаўтлява-белы дым квецені, здаецца, што неба садзіцца на лазнякі, на чаромхавы заглуш, і аблокі апускаюцца з неба на галіны, і прыкіпаюць да іх, і паветра звініць ад цішыні. Але ж даўно адцвіла чарохма. І клёны адцвілі. Гэта вецер варушыць лісціны, і яны паварочваюцца попельным бокам і зіхацяць на сонцы, бы пышныя кучомкі квецені.

Ён нацягнуў повад і тады адразу пачуў, як стомлена хакае конь, і болей ужо не падспешваў яго, кінуў повад на ўзмыленую грыву і сядзеў у сядле, пагойдваючыся. Марудная і рытмічная гэтая гайданка закалыхвала, і Захар не супраціўляўся санлівасці, якая навалілася адразу і была прыемная. Цёплы вецер лашчыў твар, сонечны бляск сляпіў вочы, і Захару зноў вярзлося, што ён чуе вясновыя бомы ў лазняках, што шапацяць ад ветру на беразе Дзвіны, ля Чорнага ручая, куды ён прывёз жонку і сына — рыбаліць...

«А Ігарок дзе? Дзе ж ты яго кінуў, Захарка?»

«З вудамі».

«Каб у ваду шаснуў? Тут жа віры скрозь!»

«Якія віры? Няма тут вiроў. І вунь макаўка Ігаркова свеціцца».

«Ён жа без шапачкі! Галоўку сонца напячэ. О-ох, бацька з цябе!»

«Пасля зімы галаве на сонцы пагрэцца не шкодзіць...»

«Ідзі, скажы, каб шапачку надзеў!»

«Ты крыкам сваім усю рыбу распудзіш».

«Гэтая мне ваша рыба! І навошта толькі пацягнулася з вамі. Во, цяпер дубец гэты — у вочы!»

«Коцікі ж! А мя-якенькія. На вярбе дык белыя і шэрыя. А тут — жоўценькія. Як курапяткі».

«Тата! Татачка! Рыба!»

Ігарок стаяў ужо адной нагою ў вадзе. Але вуду з рук не выпускаў, і вуда гнулася дугою.

«Трымай мацней, сынок! Валачы на бераг!»

«Рыба! Я рыбу злавіў!»

«Гэта, сынок, акунь».

«Вялізны! Але ж я не паддаўся! Праўда, татка?»

«Не паддаўся, сынок. Ты — дужы!»

...Ля цяпельца сушацца сандалікі. Ігарок, басанож, сядзіць на бацькавым пінжаку, сёрбае юшку.

«Ой, смачна, татка! Мамка гэткай не варыла!»

«Не варыла, сынок, бо гэткай рыбы ў мяне не было. Каб не гэты акунь, што ты выцягнуў, дык і варыць не было б з чаго юшку».

«Ты, Ігарок, сапраўдны рыбак. Можа, нават і за мяне, за бацьку, сёння лепшы. Гэткага акуня можа толькі сапраўдны рыбак выцягнуць».

«А я шчэ большага злаўлю!»

«Зловіш, сынок, зловіш. А шкарпэткі ўжо сухія. І сандалікі. Надзявай!»

«І заўтра ты не будзеш сварыцца, калі звалюся ў ваду?»

«Не буду. Але ты падалей ад вады станавіся. Ля асакі станавіся. Акуні, ведаеш, любяць каля асакі плаваць».

«Я іх тамака і падпільную».

«Захарка! А чаго ты Кацю на юшку не паклічаш?»

«Кацю! Дзе ты бачыш Кацю?»

«Кацечка, ідзіце да нас. Гэта ж наш Ігарок сёння рыбы налавіў на юшку».

«Сядайце, таварыш Гайдаш. Калі ласка, сядайце...»

«Мне трэба ісці, калона пайшла ўжо. Чуеце, як шалахцяць крокі? Гэта таму, што па пяску ідуць людзі. Сыпкі пясок дужа ля ракі».

«Гэта лістота. Ад ветру лазнякі заўжды шапацяць».

...Захар гайдануўся ў сядле, і зыбнулася, як на хвалі, усё наўкола. Знаёмыя галасы, толькі што ўчутыя ім, яшчэ жылі, гучалі ў яго вушах. Толькі ж нейкі міг ён і прыдрамаў! Нават не прыдрамаў, проста змружыў вочы... Але ён не спаў! Зусім не спаў! Ён увесь час чуў, як пазвоньваюць цуглі, як покаюць капыты па пяску, ад-

чуваў нават гаідапку сядла. І, разам з тым, жыў зусім у іншым свеце, у свеце ўспамінаў, у свеце таго, што гэтак прыгожа і яскрава вярзлося, але было як сапраўднае; сапраўднымі былі горыч і хваляванне, што жылі цяпер у сэрцы, і ў гэтым сумнення не ўзнікала — знаёма ціснула сэрца і тукала кроў у скронях.

Ён тузануў повад, расправіў плечы, зганяючы змярцвеласць. Знаёмае дзіва: гэты кароткі міг мройнага забыцця асвяжыў яго, сагнаў стому — быццам ноч добрага сну ззаду. Не прайшло толькі хваляванне, на сэрцы засталася горыч і дзіўнае непаразуменне. У другі ўжо раз, паўстаўшы з нябыту, яго жонка была побач з Гайдаш, і ён іх гаворку чуў і сам прымаў у ёй удзел. Памроілася, ведама ж. Памроілася гэтак жа, як і летась на ўзмежку ля жытняга поля. Чаму ж тады ён зараз пачувае сябе гэтак ніякавата, нібыта падзеі мроі і сапраўды былі? Адкуль жа гэтая горыч, нейкая незразумелая раздражнёнасць? Адкуль?.. Знайшоў над чым ламаць галаву! Вунь, пачатак траншэй ужо відзён, а ён у сваім сэрцы нейкую бязглуздзіцу пераворвае!.. Мала цябе тут клопату чакае? Пра яго і думай! Пра тое, дзе снарады ўзяць. Пра тое, што рабіць будзеш, калі выпусцяць твае героі гэтыя апошнія шэсць снарадзікаў.

Справа, у бок лесу, але далёка, прагучалі ледзь чутныя выбухі. Гэткія ж выбухі Захар пачуў за гадзіну да гэтага, калі перапраўляўся з разведчыкамі праз ручай. Калечыца цяжка было ўтрымаць, і ён паслаў яго ў другую роту — падалося, што ў тым баку, дзе рота трымае абарону, пачаўся бой. Праўда, выбухі неўзабаве сціхлі, і Захар супакоіўся. Але цяпер выбухі гучаць часцей і ўсё ў тым жа напрамку — пад Фарынавам. Няўжо і на другую роту цісНуць? Тады, значыцца, папярэдзіў Кандрат своечасова. Не, зноў усё аціхла.

Прывязваючы каня на ўзлеску, пад бярозкаю, што прыціснулася да маладога скрыўленага дубка, Захар пачуў у маладой лістоце дружны, басавіты гуд пчол. Ён ішоў схілам пагорка, спрэс парослага нізкім, але густым кустоўем, і гэты пчаліны гуд увесь час не слабеў, як вісеў над ім, акрэсліваўся ў нейкую выразную мелодыю. Быццам хто на гармоніку грае...

Не прыпыняючыся, ён ішоў наперад і цяпер выразна чуў гукі губнога гармоніка і задзірлівы Санькаў голас — спявалі ў траншэі, што вяла да бліндажа, урэзанага ў схіл пагорка.

Захар не заўважыў камень, спатыкнуўся і ад болю ў назе вылаяўся ўголас. Хітрун, гэты Пажога! Наплёў, нагарадзіў у сваім данясенні пра цяжкае, амаль катастрафічнае становішча роты. А тут, выяўляецца, песні гарланяць.

— Спяваем? — спытаў ён у прыціхлага Санько; прыціхлі і ўсе побач з ім — шэсць чалавек, што размясціліся ля ўваходу ў бліндаж за высокім брустверам.

— Перамога, таварыш камандзір. І — трафейчыкі!

Санько фасоніста пакруціў у руцэ бліскучасты губны гармонік, і Захар зразумеў, што ён дарэмна злуе, што ён, перш чым шукаць камандзіра роты, павінен дазнацца аб выніках бою тут, у гэтых людзей, якія і вялі бой.

— Слабы, гляджу, трафейчык,— пажартаваў ён, і на сэрцы адразу адлягло; супяўся і боль у назе.

— Трафеі вунь, на ворага нацэлены,— Санько матнуў галавой у бок двух кулямётаў, што тырчалі над брустверамі адзіночных ячэек.— Вунь яны, трафейчыкі, мы іх адразу — к сабе на службу. І хочам фюрэру падзяку паслаць. Вельмі ж хораша яны, кулямёцікі, да нашых акопаў партызанскіх прыдаліся.

Загаманілі весела:

— Голуб крыўдуе на фюрэра. Памятаеш той ліст, што ад пераезда слалі? Дагэтуль не адказвае.

— А хто вінаваты? Сярожачка вінаваты. Я што тады казаў? Марку прышпандорым. А ён — пашкадаваў. Без маркі ліст. Фюрэру даплочваць давялося. А грошай не было...

— Не, хлопцы! Зусім тут іншая прычына, што не адказаў фюрэр. Ляжыць ён, фюрэр-мурэр, у сваім Берліне пузам дагары — квасу Давідавага перабраў.

— Хлопцы! Ад лесу верхам пехта імчыць. Няйначай, пісямцо ад фюрэра Голубу вязуць.

— Э! Гэта ж разведка!

На мокрым, бы з вады толькі што, кані прымчаў Калечыц. Саскочыў з каня, кінуўся да Захара.

— Дамарад просіць гармату. І ўзвод, калі можна,— Калечыц закашляўся натужна і глуха, быццам у горла набілася асцё.— У іх бой. Трэба ўдарыць па флангу!

— Дзе Пажога? — спытаў Захар у Санько.

— Ля дарогі. У тым бліндажы.

Пераскочыўшы бруствер, Захар хутка пайшоў усцяж траншэі, і Калечыц шпураваў следам, сваім сіпатым

кашлем быццам піхаў Захара ў спіну. Захар не размаўляў з ім, нічога не распытваў, ён свядома адводзіў Калечыца ад усіх, каб распытаць без сведак, з вока на вока.

— Што там? — хутка спытаў Захар, калі пагорак напалову захінуў бліндаж.— Бою ж вялікага не чуваць. І не трэба ніколі па людзей жаху нагапяць.

— Ніхто не нагапяе, таварыш камандзір. Там — кепска. Дамарад адыходзіць.

— А другая лінія? Кінулі?

— На ёй пакуль што і замацаваліся. Але, калі не ўдарыць па флангу, іх скрышаць.

— Танкі? Колькі?

— Бронетраспарцёры. Адзін падарваўся на міне. Гэта і супыніла. Я імчаў напрамкі. Без дарогі.

— Бяры артылерыю. Бяры аддзяленне ў Файзуло. І — туды. Поўным алюрам!

— Дамарад просіць узвод! Узвод Файзуло просіць!

— А тут хто будзе?.. Выконвай... І скажы, каб не адступалі! Каб не беглі, як зайцы! Хай з першай роты бяруць прыклад!..

Захар не хацеў болей гаварыць з Калечыцам, ён злаваў, быццам той адзін і быў вінаваты ў гэтых паганых вестках. Пераваліўшы за другі пагорак, Захар убачыў пачатак першай лініі абароны і сумеўся, і нейкі час стаяў нерухома, аглядаючы пакаты, голы і чысты, як адпрасаваны, схіл. Ён не адразу сцяміў, што чорныя меціны, якія густа размалявалі схіл, гэта варонкі ад мін. Схіл быў незнаёмы, зусім не той, які звычайна Захар бачыў, калі даводзілася прыязджаць сюды. Незнаёмай была і выгінастая жоўтая падкова дарогі, што ляжала папізу пагорка, ля яе былі густа і неахайна раскіданы ўчарнелыя снапы. З-за рэдкага кустоўя вытыркаліся брызентавыя фуры машын; брызент на правай машыне быў падраны, і кавалак шэрага брызенту ляна матляўся.

«Поле бою. І не снапы гэта там за дарогаю — забітыя ляжаць...»

Бабахнуў далёкі стрэл,— над вухам у Захара візгатнула куля. Захар бразнуўся на зямлю, крыху пракаціўся па схілу, потым ускочыў і, прыгнуўшыся, мітнуўся пад ахову нізкага, але густога хмызу, дзе пачыналіся акопы. З-за хмызу выбег Пажога, махнуў рукою:

— Сюды, перабежкамі, перабежкамі цяпер можна! Сюды, у акоп!

Захар кульнуўся ў траншэю, спытаў задыхана, сціраючы з твару пыл:

— Бачыў? Ледзь не падстрэліў мяне, гад. Адкуль біў, дык і не расшалопіў я.

— Ад бронетранспарцёра. У-унь, стаіць за хмызам. Мы яго падбілі.

— Спаліць трэба.

— Не падысці аніяк. У лазняках — кулямётчык засеў. І з таго боку Дзвіны прыкрываюць. Калі дачакаемся ночы, тады і паспрабуем яму агеньчыку сунуць.

— Баішся, што не дачакаешся ночы? Не разлічваеш да ночы тут пратрымацца?

— Хацелася б. Пакуль жа мы нават сваіх параненых не можам адсюль вывезці. У бліндажы ляжаць.

— Колькі ты страціў людзей?

— Шэсць. І сем параненых у нас. І Жвірбля са строю выбыў. Асколкам — абедзве нагі...

Знікла жаданне лаяць Пажогу за нейкія перабольшванні ў данясенні і паніку, за снарады, якія артылерысты расстралялі ранкам, і ён стрымана папрасіў:

— Вядзі ў бліндаж.

У круглай нішы на паваротку траншэі Захар убачыў Чэсю і, збянтэжаны, прыпыніўся. Што гэта з ёю? Прыхінулася бокам да сценкі траншэі, уваткнулася носам у санітарную сумку, што ляжыць у выемцы перад бруствeрам, неяк дзіўна дыхае, бы плачам давіцца. Ён узяў яе за плячо, лёгенька патрос. Яна рыўком вызваліла плячо, крутнулася, выпаліла, быццам перад ёю быў чалавек, які толькі што незаслужана пакрыўдзіў яе:

— Жвірбля не слухаецца мяне,— і, убачыўшы, што перад ёю Захар, сумелася, дадала, аднак, усё тым жа голасам, у якім была крыўда: — Я і прасіла, і маліла. А ён — прагнаў.

— А ты — румзаць узялася.

— А што ж рабіць, калі крыўдна?

— Вяртайся да яго! Ён дзе? У акопе? Вось і вяртайся да яго. Хай не геройствуе!

Разгублены твар Чэсі выклікаў спагаду, і чым болей ён глядзеў на гэты твар, тым мацней горкая спазма спачування перацiскала яму горла. За крыўдай, што была ў Чэсiным позірку — яна не выканала загад камандзіра роты і, відаць, атрымала добрую прачоску ад яго! — ён угледзеў знаёмы след даўняй глыбокай пакуты. Той след пакуты ішоў з глыбіні душы, ён сведчыў пра цяжкі

і пякучы боль у сэрцы, боль, які чалавек не пнецца ні схаваць, ні ўтаймаваць — след слёз па Мсціславу.

«А мы і за Мсціслава шчэ не адпомсцілі...»

Думка гэтая і ўразіла яго і як бы падкрэсліла гора, якое ён угледзеў у Чэсіных вачах. Захар нямала пабачыў людскога гора, і пазнаваў яго аблічча адразу, і ведаў, што сапраўднае гора, як яго ні хавай, пакідае на чалавечым твары свае выразныя мецігы. След гора на Чэсіным аблічы ён з выключнай выразнасцю ўбачыў толькі цяпер, і яму зрабілася няёмка і ад сваёй патаїнай думкі пра нязвершаную помсту, і яшчэ больш ад тае гарачнасці, з якой ён папракнуў сястру.

— Мой загад, скажаш,— папрасіў ён мякчэй.— Навою ён там, парапены...

Захар счакаў, пакуль Чэся схавалася за павароткаю траншэі, і сказаў, адчуваючы, што няёмкасць размовы з сястрой, сведкам чаго быў Пажога, чамусьці не праходзіць, яшчэ больш вярэдзіць душу:

— Калечыц прыляцеў ад Дамарада. Там — цяжка. Я загадаў гармату туды перакінуць. Ты не пярэчыш?

Пажога пеяк горка і спачувальна ўсміхнуўся:

— І я гэта загадаў. Толькі на гадзіну раней.

— Што, сувязны ад Дамарада быў?

— Не, не было. Я пачуў, што там грыміць. Таму і паслаў. Бо я перад ім вінаваты. Яго спарады я зрасходаваў,— і, заўважыўшы на Захаравым твары недаўменне, дадаў: — У нас з ім дамоўленасць даўно існуе: палова спарадаў — першай роце, палова — другой. Каб нікому не крыўдна, паколькі гармата ж у нас адна. А я сёння ў яго кішэню залез, як гаворыцца...

Захара аж перасмыкнула ўсяго.

— Дзіўная змова ў мяне за спіною!

— Ды не змова. Яно, калі паразважаць, і справядліва зусім!

— Калі загаварыў пра справядлівасць! Хай бы ты аб ёй падумаў, перш чым смаліць па гэтых фурах. Загад жа я даваў. Ці не даваў?

— Спарады — па танках толькі. Ведаю. Але ж — азарт. Як увайшлі ў азарт артылерысты — ледзь апамяталіся. Цяпер разумеюць. Таму Жвірбля і засеў там, у акопе...

Гул матораў слабы, растрэсены ветрам даляцеў злева, аціх і зноў пакаціўся кароткай хваляю. Пажога адразу напружыўся, прыўзняў галаву над брустверам, по-

тым павярнуўся да Захара, нешта сказаў, але Захар нічога не пачуў — за Дзвіной гакнуў гарматны стрэл, уверсе зашурхаў снарад, грымнуў на ўзлеску выбух і заглушыў Пажогаў голас. Сценка траншэі дугнулася, як жывая, бы пехта выдзіраў яе ў Захара з-пад локцяў. З бліндажа выбег Файзуло з копаўкай у руцэ, даніў нешта з яе, адставіў копаўку на бруствер, казырнуў Захару.

— Зноў пачынаецца,— выгукнуў ён, быццам выскачыў з бліндажа толькі для таго, каб паведаміць гэта Захару. Потым, зірнуўшы на камандзіра роты, зазначыў задаволена: — А нашы траншэйкі ім адтуль і не відаць.

— Схаваўся, значыцца? А хавацца і не выходзіць — ваяваць трэба!

— Гэта і робім. Але, каб мне адну бранябоечку ву-унь туды,— і ён паказаў аўтаматам на сярэдзіну бярозавага ўзлеску, управа ад якога ішоў сюды Захар.— Ды другую — унізе. Па дарозе адтуль ёмка б было гвазданучь.

— Добра ты плануеш!

— Бяда навучыла.

— Дык вось,— перапыніў яго Пажога,— пакуль зноў вучыць не ўзялася — шнуруй ва ўзвод. І гранаты звязвай, рыхтуй, каб ёмка было гвазданучь.

— Пайшлі разам,— сказаў Захар; яму не хацелася, каб Файзуло пакінуў іх адных.

Захар добра ведаў усе ўчасткі абароны свайго атрада. Але тут, на гэтых гліністых выспах, ён, здаецца, ведаў кожную звілінку траншэй і акопаў, ведаў кулямётныя кропкі і бліндажы. Ён ішоў хутка, час ад часу паварочваючыся бокам на паваротках траншэі, адказваў на вітанні партызан, засяроджана слухаў, як у яго за спіною Файзуло нешта даводзіць камандзіру роты. Пашэнціла табе, дружа: камандзіры рот у цябе людзі вайсковыя, з вопытам, абстраляныя, загартаваныя. Дамарад, праўда, гарачы занадта. А Пажога ніколі і нідзе не сарвецца, не будзе ні вагацца, ні сумнявацца і зноўдзе — і сёння, безумоўна, знайшоў! — самае разумнае рашэнне, прыме яго і будзе ўпарта выконваць, патрабуючы гэтага ад усіх сваіх падначаленых. Перабольшваеш ты, аднак, дружа. Ты бярэш пад увагу зараз толькі вынік, толькі прынятае рашэнне. А што папярэднічала яму? Якія развагі былі? Якія сумненні? Якая горыч гняла?.. Каб усё і заўжды гэтак было проста, дык не ссівеў бы гэтак Пажо-

га, не ляглі б глыбокія зморшчыны, што, як белым разцом, чыркапулі скуру на лбе. А сёння з гэтай гарматай? Хіба лёгка было яе туды адсылаць? І ты, Захар, і ніхто б другі не папракнуў бы яго, каб ён і не адаслаў гармату ў другую роту. А яны ж, выяўляецца, па-таварыску падзялілі снарады паміж сабою. І ты, дружа, аб гэтым падзеле нічога не ведаў...

Траншэя ўперлася ў вялізны граніт, разгаліналася: улева, пад прамым вуглом, і ўправа — падковаю, як бы агінаючы валун з аднаго боку. Пажога спыніўся ў цэнтры гэтай падковы, і Захар стаў побач з ім. На схіле пагорка — увесь схіл аж да самых акопаў быў у чорных ямінах нядаўніх выбухаў — рос рэдзенькі хмыз, пераходзіў за лугавінай у добры падлесак, і за ім, на ўскрайку поля, дужа рэльефна акрэсліваўся нізкі, як прыціснуты да зямлі, зялёны прамавугольнік падбітага бронетранспарцёра. Прашурхацела над галавою міна, траскотна грукнула на вяршыні пагорка. Лёгка дугнулася сценка акопа, і Захару падалося, што нешта гэтак жа траскотна грукнула і там, ля таго зялёнага прамавугольніка, дзе то знікалі, то зноў з'яўляліся чорныя хуткія постаці; у зыркіх промнях сонца бліскала то зброя, то каскі, быццам нехта на ўскрайку таго поля гуляў-забаўляўся з кавалкам люстэрка.

— Мінамёцікі паставілі. Мінамёцікі,— скорагаворкаю выпаліў Файзуло.

— Без маёй каманды не страляць. Чуеш, Файзуло?! — загадаў Пажога.— Буду на правым,— і, павярнуўшы заклапочаны твар да Захара, спытаў: — А ты? Табе лепей у штаб.

— Паспею, штаб не ўцячэ.

— Ну, глядзі!..

Роўны, далёкі гул матораў мацнеў. Захар адчуў, што ўсярэдзіне яго ўсё дрыжыць, і зненавідзеў сябе за гэты міг сполаху, і тут жа адолеў у сабе гэтае паганае пачуццё і сказаў Файзуло, як дакараючы самога сабе:

— Панікуем патрошку...

Шырокія зморшчыны на лбе Файзуло збялелі, нібыта па іх правялі крэйдаю; знерухомелі вейкі, тырчалі, нібыта чорныя драцінкі, і за гэтай, як нежывой агароджаю блішчастымі кроплямі спыніліся чорныя зрэнкі.

— Таварыш камандзір! Вам трэба ў штаб,— глуха прамовіў Файзуло.

— Мне загад камандзіра роты не закон,— сказаў За-

хар, здагадаўшыся, што Файзуло ўспрыняў як загад тое, што сказаў Пажога, і цяпер імкнецца прымусіць яго, Захара, пайсці адсюль.— Што ў цябе на правым фланзе?

— Там — другі ўзвод. У камандзіра роты там КП.

— Малайцы, першая рота. Ва ўсім — вайсковы парадак. Незразумела толькі, адкуль паніка.

З вачэй Файзуло не сыходзіла ўсё тая ж скамянеласць, толькі дзіўна хутка раздзімаліся ноздры і ўсё шчыльней сціскаліся вусны, і на ніжняй губе з'явіліся гэткія ж, як і на лбе, але вертыкальныя дзве шырокія меціны.

— Таварыш камандзір! Вам трэба ў штаб!

— А навошта?

— Адступаць мой узвод не будзе.

— З гэтае нагоды я сюды, мой дарагі, свой КП і нераношу...

Злева, недзе пад самы бераг Дзвіны, скорагаворкаю зайшліся два кулямёты. Доўгія чэргі як бы кладліся адна на адну, аціхалі, зноў разварочвалі свой грымлівы ланцуг, і водгулле стрэлаў сыпалася, нібыта грукацела каменне па блясе.

У маленькіх нішах, зробленых у сценках траншэі, роўненькім радочкам ляжалі на звялай траве чатыры трафейныя гранаты з доўгімі драўлянымі ручкамі і адна звязка з пяці гранат, звязаных чырвоным тэлефонным дротам. Захар пакратаў рукою роўныя чырвоныя скруткі дроту, халодныя, каляныя, і з добрай усмешкаю падумаў пра Файзуло. Спрабуе яго, Захара, у штаб адсюль сплавіць, каб падалей ад небяспекі. І гаспадарлівы мужык — пашукаць гэткага. Нават у нішах трава падсцелена — любіць, каб ва ўсім парадак быў.

Гаспадарлівасць узводнага дзівосным чынам паўплывала на Захара, і ён, зняўшы з пляча палявую сумку, асцярожна — а хацеў жа напачатку кінуць абы-як! — далікатна разраўнаваў месца ля звязкі гранат і паклаў сумку туды; з гэткаю ж асцярогаю ён уладкаваў аўтамат у вузкую амбразуру бруствера, таксама замаскіраваную звялым, падсохлым і амаль белым палыном.

Прыклаўшыся шчакою да аўтаматнага прыклада — хацеў проста праверыць, ці ёмка будзе страляць,— ён і застыў у гэтай паставе, змружыў вочы, сп'янелы ад моцнага паху звялага на сонцы палыну. Згадалася Зінаідзіна вёска, дзе ўсё, здаецца, прапахла палынамі і чаборам. Нават жончыны валасы ўночы — удзень, каб не пякло

галаву сонца, Зінаіда ўкрывала яе вянком з травы — пахлі палыном і чаборам, і ён, дзівячыся, казаў ёй пра тое. Яна гладзіла яго па шчацэ, і ад яе далоняў таксама ішоў даўкі палынны водар.

Захар адкрыў вочы, і гэты кароткі, як міг бліскавіцы, успамін растаў. Далёкія воблакі наблізіліся, быццам селі на дула аўтамата, і ён згледзеў над імі дзве чорныя рыскі, якія памалу рухаліся. Ці не самалёты?.. Гул матораў падобны. Не, гул накатваецца адтуль, ад Дзвіны, а кропкі чорныя ў небе, над воблакамі. Э! Каршуны гэта! Дзіва нейкае! Тут, на зямлі, калатнеча крывавая, а яны, у небе, раскошуюць, лётаюць...

Захар адчуваў локцямі дрыготку зямлі, і яму здавалася, што каршуны лётаюць не плаўна, па колу, а злёгку трымцяць, быццам падскокваюць па зубчыках белых, з блакітным адценнем па краёчках аблокаў.

## 28

Жвірбля ляжаў на спіне ў неглыбокім акопчыку, бруствер якога амаль зруйнаваў ранкам выбух снарада, мружыў вочы ад болю ў правай назе — яе якраз перавязвала Чэся — і сачыў за палётам двух каршуноў у рэзкай сінечы чыстага сонечнага неба. Абрысы іх чоткія, увесь час нязменныя, нібыта выразаныя з чорнай бляхі, і амаль нерухомыя. Дзіўна, калі ж заявіліся тут каршуны? Да пачатку бою? А мо толькі цяпер? Відаць, прыляцелі яны нядаўна. А можа, лёталі гэтак, калі грымеў бой? Магчыма, лёталі. Як гэта Чэся чытала пра каршуноў? Канцэрт жа тады, на жаночы дзень, быў у Пятроўцах, і яна чытала вершы. Дужа ж слаўна чытала! «Чертя за кругом плавный круг, над сонным лугом коршун кружит... В избушке мать над сыном тужит...» Не, тут нешта вылецела з памяці — нейкія яшчэ радкі былі. Гэтак плаўна ў яе ліліся словы тады, і яна была дужа звабная і прыгожая. І яшчэ потым, як гарманіст урэзаў польку, ён, Жвірбля, з ёю пайшоў па хаце — падлога ходырам хадзіла, стагналі масніцы, бы спявалі. Але цяпер ужо не загудзе падлога пад тваімі ботамі! Кляты гэты асколак! Гэтульні бінту наматала Чэся, а кроў прабівае.

Ён правёў рукою па калашыне, шархоткай ад прыстаўшага жвіру, адчуў, які ліпнуць пальцы ад крыві, і

абцёр іх аб другую калашыну, і гэты рух Чэся адразу заўважыла.

— Зараз, даражэнькі, зараз. Патрывай крышку... Баліць пожачка дужа?

— Баліць душа, Чэсечка,— пажартаваў Жвірбля. Цяпер, калі ён прыпяў рашэнне застацца ў акопчыку, яму адразу зрабілася лягчэй, і ўжо менеў прыціскалі думкі пра тое, што адбудзецца потым; непакоіў, вярэдзіў сэрца толькі адзіны клопат — не прагаварыцца. Ён павінен размаўляць з Чэсяй жартаўліва, хаваючы роспач і крыўду, хаваючы боль, што нясцерпна рэжа ногі, схаваць горкае разуменне таго, што заўтра яму, відаць, не давядзецца ўбачыць сонца — заўтрашняга дня ў яго можа і не быць.— І дзівуюся: такімі маленькімі нажніцамі парэзаць гэткія вялікія і моцныя боты! Э-эх, боты мае, боты! Адтэпалі вы сваё!

— Былі б ногі, а боты знойдуцца. Ножкі мы табе адрамантуем. А боты — яшчэ прасцей.

— Уга! Гэтак ты іх нажпямі пакрэмзала. Чах-бах!

— А як жа раны перавязаць. Ляжы, даражэнькі, ляжы. Мы з табой шчэ не раз польку пакружым!

— Ты праўду гаворыш?

— Якая мне карысць хлусіць!

— А хочаш, я табе праўду скажу? Не пакрыўдзішся?

— На праўду толькі апошні дурань крыўдуе.

— Значыцца, дурань ён і ёсць, як бот неваксаваны, гэты Багдан твой.

— Ты куды гнеш? Куды?

— Бачыш, ужо і крыўдуеш. Але я табе праўду кажу: гэткую прыгожую і сардэчную жанчыну можа кінуць толькі апошні дурань.

— А-а, вось што! Ніхто, каб ведаў, мяне і не кідаў.

— Сама, значыцца?

— Даўно было, не ў памяці ўжо... Ці не занадта моцна бінтую? Не баліць?

— Не, не баліць. У цябе рукі залатыя. І прыгожыя дужа. А вочы — бацькавы. Мудры ён, Елісей, чалавек быў. А вось мне, між іншым, не давяраў. Усё не мог дараваць, што ў першай з ім гаворцы — пра новы парадак добрае слоўца пусціў. Жартаваў я, а ён — не зразумеў.

— Не зразумеў жа і ты яго!

— Ну, гэта толькі папачатку. На развітанне мы і чарку ўзялі. Каб ведаў, што адразу і атрад знайду і што ўсё добра ў мяне будзе — аніколі б не пакінуў старога

там... Цяпер я ведаю, што яму сто разоў прапаноўвалі ісці ў атрад... А сабе вось не магу даравадь. Быццам кінуў сябра і ўцёк.

— Не трэба на сябе абы-што нагаворваць.

— Жахліва гэта, калі нешта робіш, а — не верыш. І яшчэ больш жахліва, калі табе не вераць...

— Пра нейкі недавер гаварыць табе, даражэнькі, сорамна. Нажога Жвірблі як самому сабе верыць. І камандзір атрада — таксама.

— Нават інтанацыя голасу — бацькава. Ты, Часлава, даруй, што я тады твайго старога не зразумеў... Дзякуй, што перавязала. Цяпер і не баліць зусім. І галаву перастала кружыць.

— Піць мо хочаш? Біклажка ж вось поўная.

— Гэта — кава. Пі, ты ж стамілася. На пачатку вайны ў іх кава была добрая. А цяпер — дрэнь.

— Ну, пакрысе рушым. Запаўзай на плашч-палатку. І рукамі напіхвай. Тады лягчэй цягнуць.

— Ты ідзі адна. Я — застаюся.

— Глупства. Камандзір атрада загадаў...

— У мяне ўжо ёсць загад. Трымаць абарону. І не прапусціць танкі.

— Мяне сам камандзір атрада паслаў. Хай не геройствуе, сказаў, паранены. Ты што, не верыш?

— Веру. Але ты не марудзь — твае рукі там патрэбны.

— Я прашу цябе. Прашу!.. Трэба ж рухацца...

Каб не бачыць яе жаллівыя вочы, ён адвярнуўся і суха прамовіў:

— Не губляй час. Ідзі!

— Я зараз далажу камандзіру. Ён з табою пагаворыць! Ён не будзе, як я, пяць разоў упрошваць...

Паспешна зашпіліўшы верх брызентавай санітарнай сумкі, Чэся, трымаючы яе ў левай руцэ, выкараскалася з акопчыка, прабегла крыху, прыгнуўшыся, і саскочыла ў траншэю, якая пад вострым вуглом ішла за схіл пагорка. У некаторых месцах траншэя была разбурана прамымі пападаннямі снарадаў, Чэся як бы выпырвала на кароткі міг з глыбі зямлі на паверхню, і потым Жвірбля зноў бачыў толькі галаву, павязаную, як пасам, зялёнай хусцінкаю. Хусцінка матлялася, нібыта заціснутая ў руцэ, якая ўзнята на развітанне, і сэрца Жвірблі кроіла злосць на самога сябе. Доўбня! Хіба ж гэтак яму размаўляць з Чэсяй? Навошта ж яе крыў-

дзіць? Трэба было шчыра расказаць, чаму ён тут застаецца. Блакада пачынаецца, а ён — з параненымі нагамі. Усім замінаць будзе, а канец, рана ці позна, адзін і той жа... Ды, уласна кажучы, і не гэта галоўнае: ён застаецца тут таму, што не выканаў загад, які ведаў дакладна і добра. Ён, бы той дурны паляўнічы, смаліў без перадыху на сініцах у небе! А ён павінен быў чакаць добрай дзічыны, чакаць і стрэліць дакладна і ашчадна. Вунь, гудзе ўжо яна, тая буйная дзічына! А яму і стрэліць няма чым! Ён расстраляў свае набоі. Усе свае набоі і яшчэ з таго, што сябрам належыць, прыхапіў. І таму рашэнне, якое ён прыняў, ёсць рашэнне мудрае і справядлівае. Няма снарадаў, затое ёсць гранаты. І фугасы ляжаць у нізіне — хай ідуць танкі. Не наляцяць на фугасы — ён стрэне іх гранатамі. Ён правільна зрабіў, што сухавата і строга сказаў Чэсі, каб яна ішла адсюль туды, дзе яе дапамога больш патрэбна. Раны яна перавязала, ногі цяпер не баляць, кроў супынілася, і ён гатовы да бою. Кароткую хвілiначку перадыхі ён павінен выкарыстаць разумна, ляжаць, набірацца сілы... Зручны акопчык. Спёка тут не вельмі мучыць. І неба добра відаць, і аблокі, і каршуноў. Ім адтуль, з той высі, усё відно: і партызанскія акопы на глiністым узгорку, перааранымі снарадамі, і нізенькі хмыз, абпалены выбухамі і закіданы жвірам і кудлатымі дзірванамі, і забітыя фашысты, падобныя на чорныя спапы. І цябе ж, мабыць, бачаць каршуны. А можа, нічога не бачаць яны і ўвогуле не глядзяць на гэты ўзгорак? А можа, глядзяць і дзівяцца з таго, што людзі забіваюць людзей, паляць хаты, руйнуюць зямлю, смяюцца з гэтае людскае дурноты і злачынства? Ці ўхваляюць, прадчуваючы добрую спажыву? Э-эх, каб табе, Жвірбля, крылы! Хіба ж ляжаў бы ты ў гэтым смярдзючым акопчыку, пакутуючы ад балючых ран і болю ў сэрцы? Ты б узляцеў у сто разоў вышэй за гэтых каршуноў, ты б зароў на ўвесь свет, абрынуў бы самыя страшэнныя праклёны на галовы чужынцаў.... Не, ты б спачатку адтуль, з вышыні, адшукаў тых, хто распачаў гэтую крывавую бойку, спапяліў бы іх, а потым спапяліў бы ўсіх, хто руйнуе тваю зямлю, хто скалечыў тваё жыццё, зламаў яго, паставіў крыж на ўсім, у што ты верыў, чым жыў... А чым, уласна кажучы, ты жыў? З чаго складалася яно, тваё жыццё?..

Ён спрабаваў перабраць у памяці тыя шляхі, якія давялося прайсці, спрабаваў агледзець шляхі цяжкія і шля-

хі светлыя, падлічыць дні горкія і дні радасныя, падвесці нейкі вынік таму, што было. Ён не шкадаваў, што гэта даводзіцца рабіць у акопчыку з абпаленай зямлёю і сатлелымі на агні палынамі; ён жыў яшчэ радасцю пядаўняга бою, у якім ён перамог, а вораг быў разбіты і адкінуты. І гэтая радасць замінала яму ўбачыць сваё жыццё ў лагічнай і строгай паслядоўнасці, звязаць усе падзеі ў адзін чоткі і ясны ланцуг. Пражытыя гады ўзнікалі цяпер перад ім не ў нейкіх канкрэтных малюнках і падзеях, а жылі ў адрывістых размовах і гаворках. Усе гэтыя галасы, не замінаючы адно аднаму, праплывалі суладным карагодам, лашчылі яго слых, і ён быў удзячны ім, і зусім не дзівіўся з тае яснасці, з якой яны ўзнікаюць, гучаць, і зусім не шкадаваў, калі яны, толькі што нарадзіўшыся, тут жа і раставалі, бы рэдзенькі дым ад моцнага ветру.

«Малайчына, сынок! Плаваеш, бы рыбіна тая! Заўважыў? Я ж зусім цябе не падтрымліваў! Сам плывеш!»

«Калі цяжка, герой, ты за таткаву шыю трымайся. І не сорамся. Галоўнае, каб не стамляцца».

«Ён ніколі не стоміцца! Ён арол у нас! Заўтра мы з ім двойчы раку пераплываць будзем. І туды і назад — без перадыху».

«Растуць хутка гэтыя дзеці. Як таполі! Бо на выгадзе растуць. І пяшчоты і сонца хапае!»

«Што, Пятро, сына ў рабочы вупраж ставіш?»

«Сам ён выбраў. У яго Ціцерская загартоўка: рабочую сабе дарогу выбірае».

«Па гэтай дарозе, камсамолія, толькі наперад можна. Убок нельга. Назад — не атрымаецца. Наперад толькі!»

Якая сінеча там, у высі! І як плаўна яны кружаць, гэтыя каршуны! Роўненька, быццам цыркулем кола вядуць. І не стамляюцца, усё кружаць, кружаць...

«Адслужыш — вернешся. І ўбачыш: гэткая ж, як зараз... Не, не гэткая! Я любіць цябе яшчэ мацней буду...»

«Красуню сабе малады Пятровіч ухапіў. А касішча ж! У руку, не раўнуючы!..»

«Калі ўжо ў гэткую ўблытаўся — хана!»

«Ублытацца — лёгка. Вось ты ўтрымай яе ў руках!»

«Гэны ўтрымае. Але ж мне яго і шкада: гэтулькі марнець маладзіца будзе. Ці ж дачакаецца?»

«Яго дзядулю Мікалашка на дзесяць гадочкаў упёк быў. А цыганачка — усё роўна чакала. І дачакалася ж!»

«Дзядуля быў хват. З цыганскага табара лепшую танцорку звёў!»

«Не лягчэй і гэтаму было. Добрая ж сотня ўхажораў увівалася. А яна — яму на шыю кінулася».

«Абы-каму Захар гармату не даручыць. Артылерыя — бог вайны. І — прыклад!»

«Жвірбля гэты проста спецыяліст паліць танкі. Як наварожаныя ў яго бутэлечкі».

«А ты хіба не ведаеш? Ён на самы гарляк палівае і замову шэпча: гары свечачкаю, крыж берлінскі, свечачкаю ясная, каб на попел ішло».

«Мяне сам камандзір атрада паслаў! Хай не геройствуе, сказаў, парапены. Што, не верыш?»

«Адступаць нам нельга. Калі пабяжым — спіну другой роты аголім. І нам і ім — хана тады!»

Кружылі ж каршуны ўвысі! І як плаўна кружылі, роўненька, быццам цыркулем кола вялі. А цяпер вось — няма! Куды ж яны зніклі? Проста, відаць, у гэтай невымернай сінечы знікнуць ці загубіцца! Ці, можа, іх увогуле не было? Можа, табе памроіліся і каршуны, і галасы гэтыя?

Ён абсачыў доўгім позіркам абсяг нябёсаў, павярнуўся нават на левы бок, каб бачыць увесь абшар неба, і боль працяў параненую нагу, а другі боль — радасны боль знаходкі! — ударыў у сэрца: ёсць каршуны! І як плаўна кружаць, кружаць... Толькі цяпер вунька якое кола ўзялі — утрая большае, чым перад гэтым. І каб табе крылом варухнулі!

Спіну мулялі вялікія цвёрдыя глыжы, і Жвірбля раскінуў рукі, каб, апіраючыся на іх, змяніць паставу. Правая далонь лягла на драўляныя ручкі трафейных гранат, звязаных тэлефонным дротам, і ён падсунуў к сабе важкую звязку, агледзеў канцы дроту, падкруціў іх і паклаў звязку на ранейшае месца. Потым падгроб да чорных падсумкаў гарачыя ад сонца бруські аўтаматных магазінаў, што ляжалі побач з карабінам, памацаў прывязаны да драўлянай тычкі сіні тэлефонны дрот. Крыху пацягнуў за канчык і ўбачыў, як нацягнулася сіняя нітка, што незаўважна вілася ў траве, як бы звязваючы акопчык з маленькімі, на паўметра вышынёю, маладымі бярозкамі — там была закапана нямецкая авіябомба. Жвірбля ўпрасіў Санько не выплаўляць з яе тол, выкарыстаць супраць танкаў: танкі, маўляў, калі напоруцца на міны на дарозе, абавязкова папруць сюды, пад узгорак.

Жвірбля зрабіў гэтую пастку, як толькі сагнала снег, і яна заўсёды была гатовая: працягні ды падчапі да ўзрываценя драціну. Санько паспеў зрабіць гэта сёння, але пакуль ніякай карысці: страціўшы адзін бронетранспарцёр — Жвірбля з першага снарада пацэліў! — фашысты адкаціліся. Фугас цяпер, акалеўшы, ляжыць там, дзе яго і закапалі. А ён, Жвірбля, ляжыць тут, у акопчыку, дзе ляжаў да яго Санько. Рота адышла на другую лінію абароны, гармата пакаціла на дапамогу Дамараду, і толькі ён, Жвірбля, застаўся. Ён загадаў гэта сабе сам, загадаў свядома, і нікога не папракне, што загад цяжкі, непрадуманы. Усё цяпер залежыць ад таго, як ён зможа выканаць свой загад. Толькі хапіла б волі і вытрымкі.

Бронетранспарцёры — гэта толькі разведка. Прыстраляюцца гарматы і мінамёты, што развярнуліся на той бок Дзвіны, і фашысты пойдуць уперад. Рота ўдарыць па іх з новага рубяжа, з новай лініі абароны, якую вораг не выявіў і якую не дратавалі снарады. Ударыць, і потым зможа адысці, зможа манеўраваць. Галоўнае — не пусціць фашыстаў у партызанскую зону: хоць на нейкі час не пусціць у трохкутнік. Вяскоўцы збяруць на палях ураджай, прыхаваюць хлеб, і роты ім у гэтым дапамогуць... А тады атрад пойдзе па лясах, балацінах, па цяжкіх дарогах, набіраючы сілы для новых удараў. А табе — няма дарогі. Цягаць цябе, з перабітымі нагамі, на сваім гарбе няма каму... Ты толькі будзеш замінаць свайму ўзводу, а ўзвод — атраду. І гэта — праўда.

«Я павінен па-салдацку глядзець у вочы праўдзе. І я гэтак і гляджу, і ніхто не папракне мяне, што я не выканаў свой салдацкі абавязак...»

У горле сохла, і Жвірбля ўзяў біклажку ў абтрапаным зялёным футарале, начэпленую на рамень з шырокай спражкай. Глытаючы халодную, зусім не прысалоджаную каву, услых прачытаў знаёмыя словы, выціснутыя на шэра-белым дзюралі. «Гот міт унс». З намі, маўляў, бог. Не, галубок, не з табою! Ён недзе далёка, твой бог, з каршунамі недзе разам кружыць. А ты — ляжыш мёртвы ля дарогі, пухнеш пад сонцам... Цікава, што ён, гэты фашысцкі салдат, думаў перад смерцю?.. Слаў праклёны багам, якія адвярнуліся ад яго? Ці кляў тых, хто начапіў яму, салдату, гэты чорны рамень з белай спражкаю, даў біклагу з каваю, навучыў страляць з карабіна, набіў падсумкі патронамі?..

Жвірбля зрабіў яшчэ глыток халоднай кавы, пачаў

завінчваць дзюралевы каўпачок. Зношаная, аднак, біклажка. Шмат, відаць, гаспадар напіў з яе кавы. А цяпер вось Жвірбля наталяе з яе смагу. І не выключана, што гэта яго, Жвірблева, куля наклала таго салдата там, пад узгоркам ля дарогі... Дзіўны паварот людскіх лёсаў! Гэтаму чужынцу і яму, Жвірблю, давядзецца ляжаць у адной і той жа зямлі, пад адным і тым узгоркам. І пра яго, Жвірблевы, гэтыя думкі аніколі і ніхто не даведаецца.

«Нават Вяруня мая не будзе ведаць. І добра, мабыць: няма і няма...»

Горыч і скруха сціснулі яму сэрца. Дарэмна ён падмануў яе, сваю Вяруню, жанчыну, якая ўратавала яго ад галоднай смерці ў палоне. Яна была яму ласкавай жонкай, пакорлівай і пяшчотнай. Але ён не кахаў яе. Ён быў удзячны ёй. Але не кахаў і падмануў. Ачуняўшы, набраўшыся сілы, ён пайшоў у атрад, паабяцаўшы, што вернецца, калі застанецца жывы. Ён хлусіў, ён цвёрда вырашыў аніколі не вяртацца ў той дамок, дзе яго галубілі і кахалі. Ён зненавідзеў і сябе і яе, сваю Вяруню, за тое, што здрадзіў той, якую кахаў да вайны і якая — ён верыў у гэта! — кахае і чакае яго і будзе чакаць заўжды.

Думка пра тое, што ён падмануў жанчыну добрую, ласкавую, якой быў абавязаны сваім жыццём, была цяпер нясцерпнай. Доўбня! Трэба ж было папрасіць Чэсю, каб пасля вайны яна знайшла Вяруню, сказала ёй, што Жвірбля загінуў і што чакаць яго не трэба. Яму стала балюча ад думкі, што чалавек, які гэтулькі добрага зрабіў яму, падумае цяпер аб ім блага, будзе пакутаваць. Гэтага не павінна быць! Трэба ж нейкі знак пакінуць, не проста адысці ў нябыт!..

Жвірбля ліхаманкава абмацаў кішэні фрэнча. Дзівак! Што ж ты шукаеш тое, чаго там няма,— ніколі ж не цягаў у кішэнях ні алоўкаў, ні ручкі! А паперчына вось ёсць... Дзе ж папера! Гэта газета нямецкая, складзеная ў столкі — абяцаў старому Загурскаму на цыгаркі. У іх ужо даўно гэтая мена ідзе: папера — на самасад. І не сабе Жвірбля вымеоьвае, сябрам. Стары не пакрыўдзіцца, што газета падраная будзе! Цяпер, дарагі баця, хто табе паперы прыцягне? Трэба адарваць ад яе кавалак ды накрэмзаць хоць што, хоць адзінае, апошняе слоўца...

Позірк затрымаўся на бінтах. Асабліва сачылася кроў на правай назе, амаль не запякалася на краёчках

звілістай пітачкі, цёмна-чырвонай і бліпчастай. Цяпер — выцягнуць з падсумка патроп — куляю і напісаць...

Ён нейкі час разглядаў кулю, жаўтлявую, з чорным носікам — разрыўная. Якая маленечкая, а якая сіла ў ёй! І кроў на кулі здаецца не чырвоная, а нейкая цёмная, як рудая. І на паперы яна не чырвоная, а гэткая ж рудая, як падпаленая на агні скарынка. Папера мяккая, не дужа цвёрдая — добрыя б цыгаркі круціў з яе Загурскі. Але нейкая нялюдская яна, газетка гэтая. Палоска чыстай паперы вузенькая, друкаваныя літары як на самenькіх закрайках сядзяць. Ашчадныя, чэрці. Нават і тут свая ў іх, жмэндаўская, акурацістасць.

Пісаць было на столцы няёмка, і ён адлупіў вузкую стужачку, падклаў пад яе біклажку. Востры посік кулі пакідаў на паперы толькі кароценькую рысачку, але расплывістую, і яна імгненна надсыхала, і літары атрымліваліся нязграбныя, як разбухлыя. І як марудна яны вымалёўваюцца. Хай Вяруня даруе, ён напіша толькі адно гэтае — бывай. Так, бывайце ўсе, каго ён ведаў. А подпіс свой трэба паставіць. Каб потым ведалі, хто гэта развітаўся з імі!..

Ён лёгка выпяў кулю, высыпаў порах, паклаў у гільзу згорнутую цыгарэцінкай паперку, на якой рудзелі толькі два словы — «Бывайце». «Жвірбля»,— зубамі абціснуў мяккі, падатны метал і запляскаў яго патронным бруском па прыкладзе аўтамата. Бруском жа ён выграб ямінку, схаваў у ёй гільзу і старанна трамбаваў, загладжваў гэтую мясціну далонямі.

Праца стаміла Жвірблю. Ссохла, як закарэла паднябенне, і ён зноў выпіў колькі глыткоў кавы з біклажкі, адкінуўся на спіну і гэтак ляжаў, раскінуўшы рукі, мружачы вочы ад зіхацення далёкай і чыстай сінечы. Лётаюць, кружаць каршуны! Ён зноў сачыў за імі, дзівячыся з радаснага ўзрушэння, якое ўладарна бярэ верх над развагаю, над горкім разуменнем непапраўнай павароткі яго лёсу. Ён адчуваў сябе смела, упэўнена, як чалавек, які зрабіў нешта добрае і патрэбнае людзям і ведае, што людзі будуць гапарыцца яго працаю, захапляцца, і ў той працы яму нічога не трэба дарабляць, бо ўсё зроблена як след, з сапраўдным майстэрствам і надзейна.

Ён змружыў вочы, і зноў загучалі галасы. Яны былі і знаёмыя і выразныя, і ён услухоўваўся ў іх са спачувальнай усмешкаю, бо чуў і свой голас.

«Бачылі вы яго? Каршуноў ён цікуе!»

«Але ж хораша яны лётаюць. Э-эх, каб мне вось гэтак!»

«На неба захацелася? А загад мой табе Чэся перадала? Чаму не выканаў? Я табе зараз такіх каршуноў пакажу — вышэй неба падскочыш!»

«Жвірбля вядзе свой апошні бой — гэткі ў мяне загад. Я сам яго падпісаў!»

«Адбяру гармату. Ведай!»

«Гармату цяпер трэба ў вір. Прыхаваць. Прыдбаем снарады — выцягнем».

«Думаеш, мы цябе тут пакінем? Уночы — за чыгунку, у брыгаду, да Ціхана. А там — на самалёт».

«Я — кадравы артылерыст, камандзір. І ведаю, туды, да самалёта, нам не прабіцца. І цягаць мяне, параненага, няма каму — людзі патрэбны ў страі. І я яшчэ не зусім саслабеў — я ў страі. І гэта мой апошні бой. Дай жа, камандзір, перамагчы ў ім мне!»

Ён пачуў далёкі гул матораў, адкрыў вочы і не адразу дапяў, што камандзіра атрада побач няма. Але ж як выразна ўсё памроілася яму! Няўжо і гул матораў памроіўся? Не, гэта не памроілася! Вунь, паўзуць бронетранспарцёры. Колькі іх там? Два ўсяго?.. Не, трэці з-за падбітага сунецца. Значыцца, усё правільна ён, Жвірбля, прадбачыў. І мінамёты ўзяліся малаціць. Калі снарад ляціць — вуркоча, а міна — шархаціць. І выбухі зусім розныя: снарад гакае глуха, зямля тады аж стогне, а выбух міны траскотны, быццам дзяруць паветра.

Міны густа ўзрываліся цяпер за схілам пагорка, і па дымных султанах, што ўзляталі ў паветра, Жвірбля вызначыў, што выкрыта і другая лінія акопаў — па ёй цяпер і лупяць мінамёты. І бронетранспарцёры рыхтуюцца да атакі. Зіхацяць гусеніцы на сонцы — вышараваліся па пяску, вычысціліся. І па дарозе бронетранспарцёры не пайшлі: два павярнулі ў нізіну, а трэці перапоўз дарогу і рэжа па ўзбочыне. Ву-унь на што яны разлічваюць: гэтыя два лупянуць па цэнтру абароны, а той — з тылу гвазданe. Хай той, трэці, імчыць — яго там сустрэнуць. Яму ж, Жвірблю, трэба не пусціць гэтыя. Здаецца, ён правільна разлічыў — на фугас яны пруць! І салдаты пайшлі наперад, ланцужкамі коцяцца. Трэба па іх часануць!..

Жвірбля схапіў аўтамат, ціснуў на спуск, пакуль не спыніўся затвор, потым хутка паставіў новы магазін і

гэткай жа доўгай чаргою апаражпіў і яго. Потым ён адкінуў пусты аўтамат, узяў карабін і, таропка прыцэльваючыся, выпусціў па чорных ланцужках усю абойму. Яму здалося, што менавіта ад яго стрэлаў ланцужкі разваліліся, а затым і залеглі. А бронетранспарцёры зноў паўзуць наперад. Як блізка яны ўжо... Ну, галубок, давай цісні наперад! Наперад давай, бліжэй да бярозавых парасткаў гэтых!.. Правільна, правільна робіш! І не спыняйся, не спыняйся!..

Жвірбля зняў з калка драціну, заматаў яе на руку і чакаў. Паганы пот! Цячэ па скронях, рэжа вочы... І не хочацца ж варушыцца, каб паднесці руку да твару ды абцерціся — яшчэ заўважаць, што тут нехта рухаецца. Яго, здаецца, не бачаць — буйнакаліберныя кулямёты лупяць па левым схіле пагорка, дзе відаць краёк бліндажа. І адтуль строчаць. Ці гэта лопаюцца разрыўныя буйнакаліібернага. І чамусьці гнуцца і хістаюцца пізенькія тыя бярозкі за дарогаю, як перад навальніцаю. Пыл не адносіць ад гусеніц, гоніць яго наперадзе, і бронетранспарцёры быццам плывуць у кудлатым воблаку. А гэта якраз і добра — драціну ніхто не заўважыць. Каб жа толькі не парвалася драціна...

Цяпер — толькі чакаць! Унь як роўненька шнуруе, гад. Неяк дзіўна паблісквають гусеніцы. Ці не павярнуць ён хоча, заўважыўшы фугас?..

«Усё! Не павернеш ужо!»

Жвірбля з сілаю смаргануў драціну, і рука адразу адчула супраціўленне, як за нешта зачапілася драціна. А мо парвалася? Ён зноў смаргануў драціну к сабе, і драціна лёгка падалася, і з канца яе выдралася ў неба чорнае, грукатлівае дымнае полымя. Бронетранспарцёр, падкінуты ў паветра, перакуліўся і нейкі пяроўны, як скамечаны, шухнуў уніз усярэдзіну таго кудлатага пыльнага воблака. Жвірблю прыціснула да зямлі сухой, як з каменкі, гарачынёю, абсыпала жвірам. Ён затрос галавой, намагаючыся стрэсці з сябе пыл і земляны друз, і звонкае бомканне, што распірала вушы. Бомканне ў вушах не націшэла, націшэў толькі гул матораў, ён як бы аддаліўся, і Жвірблю падалося, што бронетранспарцёры адскочылі назад і гудуць цяпер недзе далёка.

Але бронетранспарцёр быў блізка і поўз, расціскаючы і як бы піхаючы перад сабою бурае воблака дыму і пылу. Жвірбля глядзеў на яго збянтэжана, раскрыўшы высушаны смагаю рот. Як жа гэта? Зноў паўзе наперад?..

Не-е, той ляжыць перакулены, нейкі як сплясканы, уціснуты ў зямлю, без гусеніц... Гэта — другі! І шнуруе сюды, на акопчык меціць! Яго, Жвірблю, мабыць, заўважылі! І гэта добра! Хай не праскочыць злева ці справа ад акопчыка! Паўзці, каб пераняць яго, Жвірблю не паспець... Кінуць гранаты далёка — цяжка!.. Так што, паўзі сюды, галубок! Паўзі гэтак, як і паўзеш! Зялёныя і жоўтыя плямы маскіроўкі на бартавінах, быццам кветкі ад ветру, матляюцца... І як дробна калоціцца пад локцямі, пад грудзінаю і пад каленкамі зямля... І як віляюць гусеніцы! Кінеш недакладна, дык і не патрапіш. Не, кідаць нельга. Адна-адзіная ў яго звязка!..

Жвірбля адвінціў каўпачкі з дзвюх трафейных гранат, што былі ўсярэдзіне звязкі, моцна сціснуў драўляныя, падобныя на колцы ад лічыльнікаў бубачкі, пачэпленыя на белыя шнуркі. Прыжмурыўшы вока, ён быццам прыцэліўся, як лацвей пакласці звязку, і яму мроілася, што ён не тут, на гэтым пакатым пагорку ля Дзвіны, а там, на беразе маленькай рачулкі, назва якой даўно выветрылася з памяці, там, у тым другім дні вайны. Жвірбля бег там па лузе апантаны, уцякаў з пустымі рукамі, задаўлены жахам, а ззаду, амаль на пятах, паўзлі і паўзлі вось гэткія ж зялёна-жоўтыя страшыдлы, і роў іх матораў быў падобны на жалезны рогат, і жоўта-зялёныя пісягі маскіроўкі, як гліністыя вужакі, хвасталі яго па вачах штораз, калі ён спрабаваў азірнуцца. Цяпер ён не бяжыць! Цяпер яно, гэтае страшыдла, баіцца яго, яно не рагоча, а як бы давіцца жалезным грукатам матора.

Жвірбля глядзеў цяпер толькі ў адну кропку — на левую гусеніцу, якая наматвалася на траву, быццам жэрла яе шырокімі сталёвымі пласцінамі тракаў; ён бачыў нават глыбокія драпіны на гэтых пласцінах. Бакавым зрокам ён бачыў і другую гусеніцу, правую, бачыў, як згінаецца пад ёй закіданы жвірам палын.

Гусеніца расцёрла, скрышыла беражок акопчыка, на міг навісла над ім, і Жвірбля, быццам спрабуючы стрымаць дрыгатлівы рух сыпкага цёплага жвіру, смаргануў жаўтлявыя бубачкі на белых шнурках і, абхапіўшы абедзвюм, піхнуў цяжкую звязку яе пад шырокія бліскучыя тракі. Звязка падалася, пасунулася, і тады з драўляных ручак ударылі яму ў далоні і вочы бела-белыя карнцуны агню; болю ён не адчуў, яму толькі падалося, што карнцуны ўзнялі яго сабе на крылы — мяккія і цёплыя крылы — і некуды павольна панеслі...

## 29

Буйное і дробнае каменне было рассыпана ў рэдзенькім сіўцу паўкругам, як бы падпіраючы старую чаромху, што цягнулася з ручая на прастор вузкага жытнёвага поля, якое пачыналася адсюль, ад гэтай чаромхі, і заканчвалася ля жаўтлявай дарогі над бярозавым узлескам. Камяні, відаць, ад вайны звозілі з поля і скідалі сюды, у ручай, і яны паўрасталі ўжо ў зямлю. Вялікі пляскаты граніт, што ляжаў пад навіссю чаромхавага голля, нават паспеў замшэць з аднаго боку, павернутага ў бок Дзвіны; голле гайдалася ад ветру, сонца то прабівалася праз лістоту, то прападала, і колер моху быў няроўны — то зусім зялёны, як твань дрыгвы, то карычневы, як пасыпаны цаглянын друзам, то зусім сівы, як падбелены вапнаю; час ад часу вухкалі далёкія выбухі.

Захар прыўзняў рукою чаромхавую галіну, абсачыў дарогу, якая, быццам адпіхнуўшыся ад бярозавага ўзлесся, знікала за ўзгоркам, і зноў пасунуўся назад, у засень галля, прыхінуўся плячом да граніту і зноў адчуў цеплыню каменю, прагрэтага ўдзень сонцам. І адразу, як толькі ён дакрануўся плячом да граніту, вухканне выбухаў аціхла, і тады адразу стала чуваць, што ў бары за ракой кукуе зязюля. Захар напружыў слых і, як у далёкія гады дзяцінства, пачаў лічыць, колькі гадоў суджана яму яшчэ жыць. Зязюля была шчодрай, кукавала няхтомна, як бы ведаючы, што яе голас гэтак патрэбен чалавеку.

— Камандзір,— ціха паклікаў Юрша.— Не заснуў часам тут?

Сонца было злева, як зачапілася за галіны чаромхі і завісла на іх. За плячыма Юршы дрогка трымцела над ручаём мройная перадвечаровая сінеча; постаць Юршы выдавала расплывістай, быццам лупала над ёй, адарваўшыся ад зямлі.

— Лічыў вось,— зязюля ў бары за ракой. Пятнаццаць год нам з табою яна ўжо адпусціла. І, чуеш, далей вядзе.

Юрша ўсміхнуўся.

— Гэтай зязюлі мы можам і сто гадоў заказаць — пракукуе. Гэта ж Санько з Голубам у лазнях забаўляюцца!

— Ха! На якую вудачку папаўся,— выпаліў Захар незадаволена, злуючыся, што быў захоплены наіўным

заняткам: — Падурнелі яны там? Фрыцаў сюды выклікаць?

— Можа, яно і добра. Хай і фрыцы думаюць, што зязюлька тут завялася. Няма нас, значыцца, тут — зязюля побач з чалавекам не абзавецца,— дадаў тонам заклапочаным: — Я загадаў, каб вячэралі. І папярэдзіў: расходваць энзэ ашчадна. Ніхто ж не ведае, колькі тут праседзімо.

— Нядоўга,— прамовіў Захар і зразумеў, што рашэнне, якое ён хацеў прыняць і ўсё не адважваўся, ужо паспела, і ён яго прыняў і ўжо не зменіць.— Як ацямнее добра — рушым.

— А калі Багдан да ночы не вернецца?

— Болей чакаць нельга. Дзень тут праседзелі, другі... Тройчы лёс нельга выпрабоўваць. Пакліч Яштокіна, і ўсё-як след абгаворым...

Юрша ўгледзеў ля камення каліва шчаўя, сарваў шчопаць, марудна жаваў і крывіўся ад кісліны. Захару падалося, што Юрша не ўхваліў яго рашэнне і крывіцца мепавіта з гэтае нагоды, стрымлівае сябе, не хоча спрачацца. Але думка гэтая была кароткая, яе адкінула трывога. Зноў пачалася страляніна. Падобна, што недзе ля Глінішча. І справа за дарогай грыміць, толькі радзей крыху — гэта ўжо ў бок Падкасцельцаў. Як бой там. Але ж няма каму там той бой весці — рэшткі і першай і другой роты тут, у гэтым ручаі, што выводзіць да Дзвіны. Увесь атрад, дакладней тое, што засталося ад атрада, схавана ў заглушы чаромхі і лазнякоў.

— А можа, адседзімся тут? — папытаў Юрша, і ў гэтым запытанні прарвалася яго нязгода з Захаравым рашэннем.— Харч ёсць. Вады — хоць заліся...

Захар нецярпліва паглядзеў на ручны гадзіннік, потым павярнуў галаву ў бок старой чаромхі, за якой садзілася сонца, паківаў галавой:

— Дробязі толькі не хапае — патронаў,— і, гледзячы ў счарнелыя ад бессані Юршавы вачніцы, загадаў: — Давай і камандзіраў рот кліч. Можа, у каго-небудзь якая думка добрая выспела.— Пачуў у лазняках прытоены смех Санько, нейкі час услухоўваўся, як бы баючыся памыліцца, потым секануў жорстка: — Гэты рагатун усё гігікі строіць? Папярэдзь яго! У апошні раз я дарую яму парушэнне загаду! Над вадой жа галасы далёка чуваць. Ён што, не разумее?

— Ты даруй, гэта я папрасіў, каб крыху падвесяліў народ. Але ж ён меру перабірае. Зараз скажу яму.

— І папрасі Яштокіна, хай праверыць, колькі ў ротах засталося патронаў. Каб толькі дакладна. Не так, як учора.

Юрша даў нырца пад навісь голля і знік нячутна. Захар чуў цяпер толькі водгулле далёкай страляніны, якая накатвалася парывамі, і самотнае лапатанне лістоты. Зрэдку вецер даносіў гул матораў, як бы недзе ляцеў, то набліжаючыся, то аддаляючыся, самалёт. На вочы трапіла каліва шчаўя, вышэй ад каменю, на самым перавале схілу, і Захар пацягнуўся да яго.

Кіслы востры смак асвяжыў рот, знікла сухасць, якая сёння змучыла Захара. Ён прагна жаваў мяккія сакавітыя лісцінкі, давячыся, глытаў іх і з кожным глытком адчуваў, як мацнее ў ім упартасць, жаданне выканаць рашэнне, якое прынята. Уласна кажучы, рашэнне гэтае было прынята чатыры дні да гэтага, у лесе пад Марозамі — туды быў змушаны адыходзіць атрад, бо ўвечары абараняць акопы ўжо не было чым. Дзень бою — калі гаварыць дакладна, дык усяго толькі пяць гадзін бою — паставіў абедзве роты на мяжу поўнай бяды. Гармата выпусціла свае апошнія шэсць снарадаў, і яе давялося кінуць у вір. Туды ж пайшлі батальённы і ротныя мінамёты і два «максімы» — боепрыпасы да іх скончыліся. Там, у лесе пад Марозамі, Захар прыняў рашэнне, якое, прынамсі, было загадзя ім абгаворана яшчэ з Ціханам: у выпадку крытычнага становішча выводзіць атрад за чыгунку да асноўных сіл брыгады. У першую ноч да чыгункі яны не прабіліся, і ў начным баі атрад панёс новыя страты: шэсць чалавек было забіта, чацвёра паранена, і ў дадатак да ўсяго страчаны абоз. Другія суткі яны правялі ў бярозавым гаі, які выходзіў да балаціны, і апоўдні іх там выявілі. Пасля кароткага бою яны адарваліся ад карнікаў. Уночы, пакінуўшы параненых у патайной зямлянцы, зробленай не ў лесе, а ля спаленай Дуброўкі, у сухім пясчаным месцы ля бульбяных ям, Захар вывеў атрад сюды, на бераг Дзвіны, у заглуш чаромхі і лазнякоў — у маленькі, але глыбокі ручай. Карнікі прачэсвалі лясы, спрабуючы прыціснуць атрад да чыгункі. Атрад жа стаіўся ў непасрэднай блізасці ад горада, і гэты дзёрзкі разлік быў правільны: карнікі згубілі след атрада. Два дні перадыху. Але трэцяга дня можа і не быць: карнікі, напэўна ж, вернуцца да таго, з чаго і пачалі — да Дзвіны, і зноў

павядуць свае ланцугі па лясах. Дзе гарантыя, што яны не зачэпяць гэты ручаі? Ды, зрэшты, простая выпадковасць можа пабурыць усё. Таму трэба апярэдзіць карнікаў зноў: яны рухаюцца цяпер сюды, да Дзвіны, і атрад павінен зноў апынуцца ў іх за спіною. Магчыма, гэта трэба было зрабіць мінулай ноччу. Але як было пайсці, не папоўніўшы харчовыя запасы і запасы вады ў патайной зямлянцы, дзе ляжаць параненыя і з якімі засталася Чэся?

Чэся, між іншым, казала, каб ён, Захар, не турбаваўся, каб не спяшаўся вяртацца — параненым, маўляў, лепей адляжацца ў зямлянцы, якую адшукаць не проста. Але вочы ў яе былі сумныя, яна глядзела на яго, быццам развітвалася назаўжды, і прапанову пайсці разам з атрадам адвергла рашуча...

У небе за лесам выразна акрэсліваліся чорныя грувастыя султаны дыму — гарэлі вёскі. Неяк дзіўна роўна ўзнімаліся гэтыя дымныя слупы і расцякаліся ўвысі, быццам не змаглі прабіцца далей, упёрліся ў сінечу неба і зламаліся. Колькі ты ўжо бачыў, Захар, гэткіх дымных султанаў, што ўзнімаюцца цяпер у неба з месца былых людскіх селішчаў? Колькі разоў ад гэткіх відовішчаў гневам і болем сціскалася сэрца? Колькі пякельных рубцоў пакінулі яны ў тваёй душы? І чамусьці заўсёды аднолькава, нейкай жахлівай падковаю расплываецца ўверсе дым ад спаленага людскога селішча. І дзіўна, чамусьці ярчэй ад усіх урэзаўся ў памяць густы дымны шлейф у небе над горадам, які давялося ўбачыць пазалетась. Толькі тады ўзыходзіла сонца, а цяпер садзіцца. Тады, з таго шырознага поля, адкуль ён глядзеў на горад, гнулася пад ранішнім ветрам амаль саспелая збажына, і паранены Балаш гладзіў саслабелай рукою жытнёвыя каласы і спавядаўся перад табою. Цяпер жа перад табою вузенькае поле, і жыты на ім нізкарослыя, зялёныя, і ніхто не спавядаецца перад табою. Ты сам перад сабою спавядаешся. Тады адзін паранены Балаш вывеў цябе з раўнавагі. Сёння ж у цябе адзінаццаць параненых. Гэта — у зямлянцы. А колькі іх будзе ўвечары, калі ты рушыш у свой нялёгкі шлях і дзе-небудзь давядзецца весці бой? Куды ты іх тады схаваеш?.. Дзіўны чалавечы лёс! Хацеў жа чалавек памерці там, на жытнёвым полі. А ты — перашкодзіў, загадаў жыць, і ён выжыў, выжыў, каб потым, праз нейкі час, боўтацца на шыбеніцы... Можа, лепей было б, каб Гайдаш не заўважыла, як ён

паздзіраў біпты з параненай пагі? Можа, увогуле лепей, чым туляцца ў гэтай чаромхавай заглушы, памерці, як Жвірбля, памерці і ратаваць сваёй смерцю другіх?.. Дык хай жа хто-небудзь скажа яму зараз, як трэба памерці, каб жылі Чэся, Юрша, Яштокін, Голуб... Хай жа хто-небудзь скажа яму, як трэба памерці, каб жыў увесь атрад!.. Хай жа хто-небудзь скажа яму, як трэба памерці, каб жылі старыя, жанчыны і дзеці ў вёсках, над якімі ўзнімаюцца гэтыя чорныя хмары дыму! Але ніхто яму гэтага не скажа і не можа сказаць. Затое кожны з тых, хто зараз тут, у лазняках і чаромхавай заглушы, і кожны з тых, хто ляжыць паранены ў зямлянцы, спадзяюцца, што іх камандзір нешта змаргеліць, нешта прыдумае, наявдзе іх сцяжынаю жыцця і перамогі. А ён, гэты камандзір, што робіць? Ляжыць другі дзень у цяньку пад чаромхаю. І адзінае, што ён зрабіў, дык гэта тое, што паслаў Калечыца, каб пахавалі ўночы забітых партызан на месцы бою ля Марозаў, ды загадаў Багдану прабрацца да зямлянкі, дзе ляжаць параненыя... Уласна кажучы, не ён нават і паслаў — Багдан сам напрасіўся, сам патрабаваў, каб паслалі менавіта яго... Багдан павінен быў вярнуцца ранкам. Але сонца унь дзе, на спачын ідзе, а яго дагэтуль няма. Відаць, нешта здарылася. А можа, ён і ўвогуле не дайшоў?.. Не, павінен дайсці: ён і дарогу добра ведае, і гэтак ірваўся туды, да Чэсі. І ты яго не асуджай за гэта — кахае. Хай самі яны разбяруцца. І разбяруцца, не сумнявайся.

І дзіўны ж збег абставін напярэдадні блакады: групу сувязі з радысткай адклікалі ў брыгаду, Гусараў сустрэў групу Маркава і пайшоў з ёю... А можа, гэтак яно і лепей, што Гусараў пайшоў — поўная табе самастойнасць! Ты ж заўсёды прагнуў гэтай самастойнасці — вось, калі ласка, маеш яе з каптуром. Рабі што хочаш, прымай любыя рашэнні, якія табе па душы. І ён, пакуль што, прымаў неблагія рашэнні. Страты, праўда, ёсць, і страты немалыя. Але ж гэта — бай, без страт яны не маглі абысціся. Затое ёсць чым і ганарыцца: першая рота знішчыла чатыры бронетранспарцёры, пяць машын і адзін танк спаліла другая рота. І карнікаў яны паклалі як мае быць! І цяпер адарваліся ад ворага, стаіліся для новага бою. Не, цяпер не пра бой трэба думаць — атрад і гадзіну не пратрымаецца. Галоўнае, каб прабіцца за чыгунку, уберагчы атрад ад знішчальнага ўдару, вывесці з гэтага ручая. Зноў дзіўны збег акалічнасцей: гэта ж той ручай,

адкуль вясною выбіралася за Дзвіну калона дэмабілізаваных. Тады ён, Захар, стаяў на той бок ручая — там ён і развітаўся з Гайдаш... Дзіўна наваг! Ён, быццам злачынец, зноў вярнуўся на тое месца, дзе нешта зрабіў благое, і ўспамін яго мучыць. А можа, рызыкнуць, павесці атрад тым жа шляхам, па якім ішлі калоны?.. Адзінае ў цябе выйсце — прабівацца да брыгады! Гэта раіў табе Ціхан. Дзе ж раіў! Гэта — загад! І ён, Захар, гэты загад павінен выканаць!

Захар як бы бараніўся сваімі думкамі ад успамінаў пра іншае — успамінаў пра Гайдаш. У той ранак, калі яна пайшла, па Дзвіне пачаўся крыгалом. Тады Дзвіна і ручай жылі сваім жыццём, і цяпер жывуць сваім жыццём, і ўсё наўкола буяе ў новых фарбах абнаўлення. А ў яго на душы ўсё тая ж, ранейшая скруха і туга. Лёс ці неўсвядомленае парыванне, неўсвядомленая мройная надзея на сустрэчу прывялі яго, Захара, сюды, у гэты ручай? А мо ўвесь час, які мінуў пасля таго ранку, ён і жыў гэтай марнай спадзяванкаю, што Гайдаш вернецца менавіта сюды, што менавіта тут, а не дзе-небудзь яшчэ яны і стрэнуцца?..

Унізе, за голлем чаромхі, пачуліся крокі, зашурхала лістота. Падышлі Юрша і Яштокін. За імі паказаліся Дамарад і Пажога.

— Давайце параімся,— папрасіў Захар, калі Юрша і Яштокін селі побач.— А вы што стаіцё? Прысаджвайцеся,— ён паляпаў даланёю ля граніту, запрашаючы Дамарада і Пажогу садзіцца.— Прарываемся за чыгунку сёння. Ноччу. Хто што думае на гэты конт?

Напружаную хвіліну чакання парушыў Яштокін. Ён, абмацваючы мысок свайго правага бота, сказаў, быццам з гэтым ботам і размаўляў:

— Думаць тут няма чаго. Дачакацца б толькі начанькі. А тады — наперад.

— А дзе пяройдзем? Мо ў тым жа месцы, дзе тады не выйшла? Думаю, што там нас не чакаюць.

— А можа, наадварот, яшчэ лепей да сустрэчы падрыхтаваліся,— сказаў Яштокін.— Калечыц баяў, што берагам, ля вадзіцы, можна пад самы горад выбіцца. А там жа і чыгунка блізка. Праўда, да яе полем давядзецца ісці. Але ж яно — узгоркавае. Я там хадзіў некалі...

Захар пацягнуўся па планшэтку, якая ляжала на зямлі, пачэпленая раменьчыкам за корань чаромхі, выцяг-

пуў карту, правёў пальцам па чорнай лініі чыгункі, якая ля горада падыходзіла блізка да Дзвіны. Дзіўна: Яштокіну Калечыц пра гэта падрабязна расказаў! А вось яму, Захару, калі ўчора дакладваў аб выніках разведкі, нават і не заікнуўся. Ты проста яго пра гэта і не распытваў, цябе цікавіла ў першую чаргу размяшчэнне карнікаў па вёсках. А Яштокін, відаць, ужо шукаў таксама шлях да чыгункі, раіўся з Калечыцам. І табе ж вось не прыйшла гэтая ідэя — берагам пайсці пад самы горад і там пераскочыць чыгунку. Карнікі, напэўна ж, чакаюць іх зноў недзе ў лесе... Але ж, калі пайсці берагам — як не ўдвая даўжэйшы шлях! Болей жа за дваццаць кіламетраў трэба прабегчы. Літаральна прабегчы, а не прайсці, бо ноч — летняя.

— Рызыкоўна,— ціха прамовіў Захар.

— Цяпер скрозь — адна рызыка,— усміхнуўся Юрша.— Ідэя ж спакуслівая. Санько там пераходы добра ведае — яны летась шмат разоў там пераходзілі. Мін, праўда, там мы ніколі і не ставілі — насыпу ж там амаль і няма.

— Добра. Пойдзем там. Цяпер — патроны. Што ў другой роце? — Захар паглядзеў на Дамарада, які сядзеў да яго бліжэй.

— На аўтамат: адзін дыск поўны, другі — напалову. На карабін і вінтоўку — па тры абоймы. У «дзегцяроў» — па два дыскі. Поўныя. Гранат — семнаццаць.

— Як? Не ў кожнага і граната?

— На звязкі шмат расходвалі.

— А што ў першай? — Захар павярнуўся да Пажогі.

— Тое ж самае. За выключэннем першага ўзвода. У іх на кожнага — па дзве гранаты. Дыскі ўсе — поўныя. І яшчэ запасец маюць.

— Адкуль, цікава?

— Файзуло стварыў энзэ. І не хоча дзяліцца.

— Што за анархія? Як гэта не хоча? Патроны падзяліць пароўну.

— Ён у хамут лупіць — не падступіцца. Той, хто ўлегцы ішоў, хай і далей улегцы тэпае. Гэтак ён усім-усім гаворыць.

— Пашлеш яго да мяне,— папрасіў Захар Пажогу.— Мы з ім пагаворым.

— Маторы! Здаецца, па дарозе!

— Ву-упь, пыл ужо віхурыць. Бачыце?

— Трывога! І ўсім — па ротах,— Захар торкнуў кар-

ту ў планшэтку.— І каб аніводнага стрэлу! Калі ўжо на горла стануць — толькі тады.

— Магчыма, праскочаць?

— Не, вернуць да Дзвіны. Проста як на нас і пруць.

Захар зыркнуў па Юршу, які не пабег услед за Яштокіным і, стуліўшыся пад галінамі чаромхі, сачыў за полем, сказаў таропка:

— Дагані Пажогу! Хай узвод сюды перакіне. Падобна, што выкрылі яны нас. Як думаеш?

— І гэтак бы адкрыта пёрлі? Не-е, тут іншае. Бачыш, правей вернуць. На бераг Дзвіны ціснуць... Зараз скажу, каб узвод Файзуло сюды...

Захар зняў з рэменя брызентавы чахол з запасным дыскам. Дыск засеў у чахле, не паддаваўся і выкуліўся з яго толькі тады, калі Захар з усяе сілы расцягнуў брызентавыя бакавіны. Уздоўж выбліскчанага канта на дыску рудзелі крапачкі іржы; Захар націёр іх пальцамі, і яны лёгка сцерліся; ён паклаў дыск побач з аўтаматам.

Зашамацела голле, Захар азірнуўся. Файзуло! Хутка ён ручай перабег.

— А-а,— працягнуў Захар.— Багацей прыпыліў. Што, патроны мне нясеш? Чаго ты там запасы робіш?

За чаромхавым голлем мядзяным пажарам разлівалася сонечнае святло, лістота зменьвала яго, і схіленая галава Файзуло выдавала як нежывой, адлітай з рудога металу; вочы толькі жвава і злосна зыркалі.

— Сабраўся ў дарогу на адзін дзень — бяры харчу на тыдзень,— прамовіў ён павучальна і з выклікам.— Гэтак у нас гаворыцца.

— Ну, у вас жа тамака адны мудрацы. Дык вось ты мне зараз скажы, куды гэтыя пруць.

— Думаю, што не да нас на госці,— Файзуло, прыжмурыўшы вочы, глядзеў на машыны, і голас яго гучаў без трывогі.

— Добра, калі гэтак. Будзем назіраць і чакаць...

Захар выразна цяпер бачыў чатыры машыны, што роўным ланцужком шчыльна адна да адной спыніліся ля жытнёвага кліна па ўзмежку. Не, едуць далей! Рухаюцца па жытах, наўпрост да прырэчных лазнякоў. У кожным кузаве як бервяно нейкае тырчыць. Мінамёты гэта. Нават колцы ўпорныя відаць. Твары салдат таксама добра відаць. Нешта дужа яны ўсе вясёлыя. Без касак, гамоняць, жартуюць. Некаторыя нават у майках.

Вось машыны спыніліся, і салдаты пачынаюць распра-

паца... Э! Гэта ж яны купацца да Дзвіны прыкацілі. Але не ўсе да вады сыпанулі. У бок дарогі, на лес кулямёт нацэлены...

— А што, як ударыць нам, таварыш камандзір? — ціха спытаў Файзуло з непрыхаваным азартам.— Скосім усіх — ачомацца не паспеюць!

— А далей што?

— Ноч блізка! І мы — панесліся. На машынах панесліся.

Удалечыні, злева да павароткі дарогі, над бярозавымі прысадамі размотвалася бурае воблака пылу — ішла, мабыць, нейкая калона машын,— і Захар хітнуў у той бок галавой:

— А тых чым скосім? Зачэпім гэтых — нам тады крышка,— і папрасіў стражэй: — Давай ва ўзвод, папярэдзь зноў кожнага: каб не зварухнуліся! Замерлі!

— Яны ведаюць. А мне адсюль назіраць лепей...

Захар больш не настойваў, здагадаўшыся, што Юрша, мабыць, загадаў, каб Файзуло быў побач з ім, камандзірам атрада. І, магчыма, гэта і на лепшае: неяк спакайней, ведама ж, зманліва дужа тое, што прапаноўвае Файзуло. Змалаціць бы гэтых салдат, што мыюцца зараз у рацэ, бескланотна рагочуць і галёкаюць, скасіць адразу і варту ў кузавах, і кулямётчыкаў, і машыны захапіць... Але далей што? Выявіш сябе, і праз якія дзве гадзіны цябе самога загоняць у раку. Не! Адзіны разумны паратунак — чакаць. Фашысты памыюцца і паедуць у вёску — начаваць жа яны тут не застануцца. Каб жа толькі хто-небудзь з салдат сюды не павярнуў... Там, дзе зараз машыны, рачны бераг чысты, мурожны, без лазнякоў — лазнякі толькі па ўзвалу рэдзенька стаяць — таму машыны туды і павярнулі. А маглі ж яны і сюды павярнуць. Не, тут да вады цяжка і нязручна прабіцца. А раптам каму-небудзь залезе што ў галаву — сюды патэпае?.. Простая выпадковасць, якая не выключэнне на вайне... Так, самае вялікае на вайне — пражыты дзень. І самае нечаканае на вайне — дзень, які яшчэ трэба пражыць. І самае дзівоснае адчуванне на вайне,— гэта адчуванне таго, што ёсць у цябе дзень, якога магло і не быць. Гэтак жа магло не быць, як няма яго, гэтага дня, у хлопцаў, якіх уночы пахавалі ў акопах. На вайне гэтак, мабыць, заўжды: той, хто памірае, аддае свае дні жывым. І калі ты будзеш паміраць, ты таксама аддасі некаму свае дні.

Захар нечакана адчуў штуршок у правае плячо, па-

вярнуўся і ўбачыў, што Файзуло вачыма ўмольна просіць яго зірнуць улева. Захар адарваў позірк ад машын, зірнуў улева, і гарачыня шухнула яму ў патыліцу. Вось яна, выпадковасць! Адкуль жа выпаўзлі гэтыя два салдаты? Ідуць жа сюды, у бок ручая, краёчкам узвала. Без зброі, у руках нейкія шэрыя анучы, а на баках цялёпкаецца нешта бліскучае. Цяпер сагнуліся, кветкі збіраюць — бела там ад рамонкаў. Адзін — немалады, гладзенькі пузан, з лысінкаю. Другі — хударлявы, на грудзях нейкая ладанка на шнурку боўтаецца, падстрыжаны вожыкам, валасы рудаватыя. Гергечуць нешта. Гэ, спяваюць сабе!

Захар паклаў руку на рукаятку затвора, павольна пагладжваў яго пальцамі; затвор нібыта лёгка трымцеў у руках і быў халодны, як з лёду. А Файзуло выцягнуў з пожнаў цясак, увесь сцяўся, як гатовы скочыць наперад. Трэба яго неяк супакоіць, каб сапраўды не рвануў на ўзвал!..

Захар моўчкі пагразіў Файзуло пальцам, загадваючы ляжаць нерухома, і ў гэты міг ад грузавіка прагучаў загадны покліч. Салдат, што стаяў ля мінамёта ў кузаве першай машыны, круціў у паветры рукой — клікаў гэтых, якія ўсё лупілі рамонкі. Хударлявы нешта сказаў незадаволена маладому, і яны марудна патэпалі да машын. Час ад часу салдаты спыняліся, нахіляліся да зямлі, выдзіралі з карэннем рамонкі.

Файзуло ацёр спацелы лоб.

— Здаецца, выплылі...

Захар няпэўна паціснуў плячыма, баючыся сказаць нешта канкрэтнае і спалохаць удачу. Так, пакуль што выплылі ад бяды. Вунь вяртаюцца ўсе ад ракі. Грузяць у кузавы кулямёты...

Ён тыцнуўся лбом у зямлю і гэтак ляжаў, дыхаў зморапа, быццам доўга, без перадыхі бег па цяжкой дарозе. Вочы ў яго былі закрыты, але ён бачыў грузавікі, якія рухаюцца па жытах, бачыў тонкае калоссе, што калацілася і сцёбала па чорных колах машын, бачыў тоўстыя пукі рамонкаў, выдраных з зямлі разам з каранямі. Трывогі ў сэрцы не было, не было і радасці, існавала, запаланіла ўсю істоту, гняло толькі адно прагнае жаданне надыхацца паветра, прапахлага палынамі і чаромхаю, і ён усё падспешваў сябе, дыхаў часта і прагна, па-сапраўднаму баючыся, што нешта зараз здарыцца і ён не паспее надыхацца як след.

Чэся пачала трызніць, і Багдан разумеў, што жыць ёй, відаць, засталося мала. Але ён не хацеў верыць у гэта і зноў, ведаючы, што за апошнія хвіліны ўжо шмат хлусіў ёй, паўтарыў без згрызоты, з цвёрдым перакананнем, што гаворыць праўду, што нічога іншага сказаць у яго права няма:

— Не звяртай увагі... Здараецца, што і чарга секане. А чалавек — жыве. А па тым, што цябе цюкнула, будзеш ты жыць до-оўга. Дзевяноста сем гадоў!

— Піць... Вада ці ёсць у нас?

— Ёсць. Пі, калі ласка. І твар намыў — тады палягчае...

Яна глытнула вады з біклажкі, не працівілася, калі ён наліў на далонь вады і абмыў ёй твар. Гэта адразу Чэсю супакоіла, яна абвяла, сцішылася, і яе галава на Багданавых каленях ляжала нерухома. Адчуўшы пад сваімі пальцамі роўнае пульсаванне крыві пад скурай ля вуха, зарадаваўся. Магчыма, абыдзецца ўсё. Магчыма, і на гэты раз лёс усміхнецца яму, і яны вырвуцца з гэтага пекла, вернуцца ў атрад, і Чэся будзе жыць. Ён зараз крыху аддыхаецца, дачакаецца, пакуль сядзе сонца, потым зноў возьме Чэсю на рукі і панясе далей. Ім бы толькі да Дзвіны дацягнуць. А там ён човен знойдзе ці плыт які-небудзь збудуе, і яны паплывуць, і без усялякай турботы дабяруцца да ручая, дзе атабарыўся атрад... Каб жа толькі хутчэй сканаў гэты кляты дзень. Тады, ў прыцемках, ён лёгка і незаўважліва адолее поле, адолее дарогу, што ляжыць за ім у нізіне, а там ужо і выратавальная Дзвіна. Удзень жа, пры святле, ім тут не прайсці. Дасюль дык можна было: дзе нізінкаю, дзе ручаём, дзе хмызнячком. А тут — бы бубен, гола ўсё наўкола. Па дарозе гойсаюць машыны. Вунь і зараз чуваць, як вуркочуць. Гэта проста добра, што ім трапіла старая варонка ад бомбы — у ёй можна адляжацца. І тут, на гэтым полі, іх шукаць ніхто не будзе. Дзіўна, між іншым, усё ў прыродзе. Бомба — у сорак першым фашысты бамбілі нашу калону на дарозе — апаліла зямлю агнём, а вось ужо і чабор зеляпее, і палынок, і малады, амаль на паўметра, бярэзнічак дзярэцца на беражках варонкі. А бярозку нават і не пашкрабала зусім, з'ехала на схіле варонкі, учапілася карэнямі ў зямлю і жыве, буяе. Шчаслівы, відаць, лёс у дрэўца. А хіба твой лёс і лёс Чэсі не гэткі? І ты

і яна маглі ж быць сярод параненых у зямлянцы, калі ляцелі туды фашысцкія гранаты. А Чэся ж і была, і гэта зноў жа шчаслівы лёс паслаў яе з біклажкамі за вадой да крыніцы. Выбралася праз патайны лаз — параненыя прасілі піць — і пайшла да той крыніцы...

Крыніца кіламетры са два ад зямлянкі, і да яе можна прайсці незаўважна, каля алешнічка, што атуляў ручаінку ў нізіне. У тым алешніку, ля балаціны, з якой і пачынаецца ручаінка, Багдан пакінуў свайго каня, паважыўся быў рушыць да зямлянкі, як убачыў Чэсю. Мо з паўгадзіны якія яны, узрадаваныя сустрэчай, гаманілі ля ручая, потым набралі вады ў біклажкі, і ён узяўся дапамагаць ёй састаўляць біклажкі ў санітарную сумку. Раптоўныя, зусім недалёкія — у бок зямлянкі — стрэлы ашаламілі іх абодвух. Ён цягнуў Чэсю да лесу, а яна рвалася назад, да зямлянкі, і ён змушаны быў падпарадкавацца ёй. Ён быў змушаны падпарадкавацца ёй і крышку пагадзя, калі яны ўбачылі фашыстаў, якія арудавалі ля патайнога лаза ў зямлянку і дзе заходзіліся ад брэху сабакі. Трэба было адыходзіць, пакуль іх не заўважылі, ён гэта прапаноўваў ёй, тузаў за руку, цягнуў уніз з пагорка. Яна ж са свайго трафейнага аўтамата пачала страчыць па фашыстах, і ён змушаны быў рабіць тое ж самае. Потым яны беглі, і ён паспеў пасадзіць яе на каня, а сам бег побач, трымаючыся за стрэмя. Калі былі на ўзлеску, ім наўздагон прагучала кулямётная чарга: рухнуў, забіты напавал, конь, і павалілася на зямлю Чэся — куля прабіла ёй руку і ўвайшла ў плячо...

Багдан, згадаўшы цяпер усё, змружыў вочы.

— Багдан? — спытала яна як не сваім, хрыпатым пошапкам, як моцна прастуджаная. Але яна ўжо не трызніла, і ў голасе прагучаў папрок, шчырае і непадробнае здзіўленне: — Гэта ты, Багдан? — і як уздых палёгкі і падзякі: — Ты мяне не кінуў.

— Не кінуў. І ніколі не кіну,— сказаў ён.

— Ты даруй... Я часцяком — з недаверам да цябе. Ноччу прахопішся, было, і як цвік у галаве: хто ён, Багдан?

Багдан скалануўся, быццам яго схапілі за плечы і моцна страсянулі; нясцерпна зашчымела ў грудзях.

— Хто ён? — Багдан паўтарыў яе словы, паўтарыў нечакана для самога сябе, паўтарыў без запытання, ціха, з развагаю, быццам з горкай усмешкаю, бядуючы: — Гаротнік ён!

— Гаротнік,— пацвердзіла яна ўсё тым жа голасам.— Бацьку нядаўна пахаваў... Цяпер вось са мною табе бяда...

— Мы — жывыя! Якая ж тут бяда? Тут бяды няма!

Ён не тоіў радаснага ўзрушэння, якое было нечаканым і якое было ў ім, як выбух. Яна пра бацьку шчыра гаворыць, бядуе па старым без падробкі: Кандрат з ёю аніколі не сварыўся, ставіўся з павагаю, заўсёды, калі выходзілі якія неллады ў Багдана з жонкаю, абараняў нявестку, ёй ва ўсім падтакваў. І, паміраючы, яму, Багдану, загадаў: яе, Чэсі, трымацца і Толічка не кідаць... Сіліўся і яшчэ нешта сказаць — сілы ўжо не было, не паспеў. Але яшчэ адно з яго губ зляцела выразна: «Шніткі асцерагайцеся, ён — во...» А што гэта — «во...». Вораг? Дык Шніткі няма патрэбы асцерагацца — у зямельцы ляжыць. Здавалася б — усё, крыж на мінулым. Дык вось жа! Пакуты адны...

Ён глядзеў на Чэсін твар, і дзіўная гарачыня ціснула грудзіну, быццам было там шчыльнае агнянае кола. Як дзіўна змянілася яе аблічча за гэты кароткі час, што яны разам! Там, ля крынічкі, ад халоднай вады, якой яна памылася, у яе ружавелі шчокі. Нават у вачах знік той халодны бляск, які і раней, у атрадзе, часцяком ажываў пад схмуранамі бровамі. А цяпер шчокі зліпліся, як склеіліся ў няроўна раскіданыя стрэлкі.

Тады, пасля пахавання, ён застаўся на могілках адзін і доўга стаяў ля магілы. Свяціла сонца. Дрэвы былі мокрыя ад нядаўняга дажджу, з галін зрываліся буйныя кроплі, гулка стукалі па зялёных лісцінах бэзу, і адна буйная халодная кропля звалілася яму за каўнер, быццам прабіла яго навылёт; ён сцяўся, упершыню за ўвесь свой партызанскі час падумаў пра тое, што, магчыма, і яго неўзабаве вось гэтак закапаюць у зямлю, і ў дол пакладуцца ўпобачкі і дні, калі ён рабіў памылкі, і дні, калі ён усё рабіў так, як трэба было, і ніхто ўжо там іх не будзе падзяляць, тыя дні. І ад гэтай думкі ўзяла вытокі зусім іншая, новая думка, якая здзівіла і ўразіла яго: яму не хочацца, каб разам з ім адышлі ў нябыт яго паганыя дні, ён іх павінен сам закрэсліць, каб людзі на яго пахаванні, як і на пахаванні яго бацькі, сказалі толькі добрае, падлічылі толькі яго добрыя справы, сказалі, што Багдан пакідае на зямлі сваё чыстае і добрае імя. І таму ён павінен неадкладна зрабіць тое, што патрабаваў бацька перад смерцю: павініцца ва ўсім перад Чэсяй...

У тую часіну горкай адзіноты на могілках думка гэтая выкрышталізавалася з усёй выразнасцю, Багдан нават

знайшоў у ёй лагічнае апраўданне сваім пакутам: ён хоча жыць і ваяваць з чыстым сумленнем. Ён ужо адпакутаваў сваё. Ён не будзе болей ашукваць сябе тым, што ўсё, маўляў, сплыве, заглохне, не будзе вярэдзіць сэрца: нічога не сплыве ў нябыт, не заглухне і праз гады, і сэрца не загоіцца ажно да таго часу, пакуль ён трымае ў ім няпраўду. Сэрца, у якім ёсць фальш, заўсёды баліць, яно ніколі не супакоіцца само і не дазволіць чалавеку быць спакойным. Ён, Багдан, заслугоўвае пакарання? Так, заслугоўвае. Тады, ідучы на хутар пакараць хутараніна, якога ён лічыў вінаватым ва ўсіх сваіх уласных нягодах, ён памылкова лічыў, што пачне новы шлях, шлях шчыры і мужны, адразу ж і назаўжды адкіне сваё мінулае. Іншоў і не ведаў свае памылкі: адкінуць мінулае чалавек можа толькі тады, калі ўсё гэтае мінулае ён выдраў са свайго сэрца, як пустазелле, да апошняга карэньчыка. А што зрабіў ён, Багдан? Ён ссек пустазелле, а карэньчыкі не зачапіў, і пустазелле гоніць усё тыя ж парасткі, ранейшыя. Таму трэба драць усё адразу, да апошняга каліва. Таму няхай пакаранне адбудзецца, ён прыме яго як належнае, як зусім заслужанае. Ён выкупіць сваю віну і будзе шчыра і адкрыта глядзець людзям у вочы. І хіба ж мала ён ужо зрабіў, каб гэтую віну выкупіць? Хіба ж мала разоў, нічога не баючыся, ён лез у самае пекла? Хіба ж мала разоў, рызыкуючы сваім жыццём, ён выратоўваў жыццё сваіх баявых сяброў?

Але ж ніхто не ведаў галоўнага — што было ў яго ўласным сэрцы. Баявыя ўдачы прыносілі яму радасць кароткую, яна хутка сплывала ад тугі і одуму, горкага, неадчэпнага. Не было, бадай, аніводнага дня, аніводнай ночы, каб заспакоілася сэрца, каб не вярэдзіў душу цяжкі ўспамін пра тыя два радкі на разадранай напалам старонцы з вучнёўскага сшытка. Не было спакою, не было ціхамірнасці на душы і тады, калі побач была Маўджуда, калі ён засынаў у яе абдымках. Ён палохаў яе часцяком, прахопліваючыся ад жудасных сноў, ад горкага шкадавання, што паддаўся аднойчы сваёй слабасці, кляў гэтую слабасць, кляў тую гадзіну, калі ўзяўся за аловак, асеплены рэўнасцю, кляў нават каханне Маўджуды, якое яшчэ больш перакруціла яго душэўнае бязладдзе...

Калі ён кляўся бацьку на лясной дарозе, і пазней, ля бацькавай магілы, ён быў перакананы, што скажа аб усім гэтым Чэсі — адкрые свой боль і тугу, прыме з яе рук пакаранне. Потым жа, калі Чэся была побач, сілы для горкай споведзі не ставала, язык быццам прыклейваўся да пад-

нябення. Цяпер жа, гледзячы па выпстраны болем Чэсін твар, ён пачынаў разумець, чаго дасюль не адважыўся на гэтую сваю споведзь, прычына была не ў ім, прычына ад яго не залежала, і выглядзела наўдзіў проста: патрэбы ў гэтай споведзі няма. Яна, гэтая яго споведзь, Чэсі непатрэбна. Чэся даўно пахавала чалавека, які быў ёй і блізкі і дарагі. Яна адпакутавала, адгаравала. Навошта ж ёй новы боль? У імя чаго?

Ён прыўзняў рукамі Чэсіну галаву са сваіх калепяў, каб уладкаваць як-небудзь лацвей, і Чэся застагнала, потым захрыпела, і голас яе ўзвіўся рэзка:

— Дзе Толічак? Дзе мой Толічак?

— Ён у брыгадзе. Яму добра там. Супакойся.

— Гэта ты, Багдан? Тлум нейкі ў галаве быў.

— Усё пройдзе, усё загаіцца.

— Не трымай маю галаву, пакладзі на зямлю. Добра, калі галава на халодным ляжыць...

Ён зрабіў тое, пра што яна прасіла, і сам асунуўся на зямлю ўпобачкі, каб не вытыркацца з варонкі. Нешта муляла Чэсі патыліцу, і яна павярнулася, прыціснулася шчакою да яго пляча, а рукою як бы піхнула ў шыю, але дужа ласкава, неяк нясмела, нібыта баялася, што ён адкіне яе руку.

Багдан ажно сцяўся ад жаласлівасці. Гэтая жанчына некалі была яму жонкаю, і ён спачатку апантана кахаў яе, а потым гэтак жа апантана, люта зненавідзеў, і вось цяпер прынёс самую жахлівую бяду — сваімі рукамі падставіў сёння ранкам пад гэтую клятую кулю. Можа, каб ён не пасадзіў яе на каня — а яна ж не хацела садзіцца, амаль сілаю ён ўвапхнуў яе на сядло, а сам бег побач, трымаючыся за стрэмя! — а проста ішла побач з ім, яе б і не зачапіла куля.

Багдану падалося, што Чэся ціха засмяялася. Але ён не ведаў, ці так гэта, бо Чэсін твар быў схаваны ад яго: яна ўсё прыціскалася шчакою да яго пляча, дыхала як не ў самае вуха, і пальцы яе знямелі ля яго шыі. Ён нечакана прыгадаў, як даўным-даўно нёс Чэсю на руках з чоўна на пясчаны ўзвал Дзвіны, і яна вось гэтак жа, прыціснуўшыся шчакою да яго пляча, трымалася рукою за шыю і ціха смяялася ад радасці... Шчаслівейшы — тады ён лічыў гэтак! — дзень яго жыцця. А яно ж і сапраўды: лепшых дзён у яго жыцці і не было. Тады быў гэткі ж цёплы сонечны адвячорак, і зіхацела Дзвіна, і Чэся была лёгенькая, як пушыначка. А цяпер вось ён крыху пранёс яе на

руках і захакаўся, выбіўся з сілы, і яна здалася яму дужа цяжкай. Хаця, дзе ж крыху! Яны ж ужо блізка да мэты — Дзвіна вунька, зусім непадалёк! А можа, таму Чэся і смяецца, што ён гэткі слабак зрабіўся? Ці, можа, памалу вар'яцее ад болю? Не, падалося ўсё гэта! Не смяецца яна. Хрыпіць нешта ў яе ў горле, як пнецца нешта вымавіць і не можа, ніяк не здужае слабасць.

— Мо вадзіцы табе, Чэся?

— Не хачу. Кроў у мяне ў горле,— яна закашлялася, сплюнула кроў, сказала, як засынаючы:— Мне не жыць ужо. Загінем...

Багдана ўразіла, збянтэжыла не гэтая жахлівая праўда, якую выказала Чэся, а зусім іншае, знаёмае пачуццё, якое раптоўна і моцна паддіснула, як скруціла яго волю. Гэтая жанчына, якой застаецца, магчыма, і сапраўды мала жыць, па-ранейшаму і па-сапраўднаму блізкая яго сэрцу, блізкая гэтак жа, як была некалі там, на беразе Дзвіны, у тым далёкім часе, калі ён нёс яе па сыпкім пяску дзвінскага ўзвала, і будзе гэткай блізкай заўжды, і яго ўласнае жыццё без яе, гэтай жанчыны, ужо нічога не варта.

Само адкрыццё не здавалася яму неверагодным; неверагодным было тое, што гэтая выснова жыла ўвесь час разам з ім — каб не жыла, каб не існавала, адкуль бы ёй нарадзіцца тут?! — і ён не ведаў нічога пра яе існаванне. Не ведаў? Брэшаш! Ведаў! Ты таму і сумаваў, і хваляваўся, і неспакой на сэрцы быў толькі з аднае згадкі пра тое, што гэтага кахання табе з душы не вытравіць, што, каб жыць побач з ім, гэтым каханнем, табе некалі ўсё роўна давядзецца зрабіць тое, чаго патрабаваў перад смерцю бацька. Бацькава сэрца маўчыць, маўчыць навечна. І маўчыць Трапашка, і маўчыць Шнітка — апошні сведка, які нешта ведаў. Можна жыць, пахаваўшы тую думку пра старонкі з вучнёўскага сшытка. Не, не пражывеш: рана ці позна Чэся ўсё роўна будзе ведаць праўду. Нават не гэта жахліва, можа гэтак стацца, што ніколі яна нічога не даведаецца. Ён абяцаў бацьку, што зробіць тое, што ён загадаў. Апошняе бацькава слова, яго не парушыш — праклён будзе вісець над табою тады ўсё жыццё...

Знаёмы жах падкраўся да сэрца. Багдан прыўзняў галаву, убачыў сонца, якое зачапілася за лес, пачуў цішыню, якая яго ўразіла: ні стрэлаў далёкіх, ні стрэлаў блізкіх, ні гулу матораў. Можа, не варта чакаць? Трэба рызыкнуць, пераскочыць дарогу: шэпціла сёння ўвесь дзень — пашэпціць і зараз!..

— Ты не загінеш,— прамовіў ён, хаваючы жах, намагаючыся падбадзёрыць не Чэсю, а сябе.— Замову ад смерці ведаю. І цябе навучу.

— Ты хоць цяпер не мані. Кідай мяне тут. А сам — ідзі.

— Разам пойдзем. Я цябе зноў на руках панясу,— ён узняўся сам і ўзняў Чэсю.— Трымай мяне за шыю. Чуеш?

Багдан, хістаючыся, выбраўся з варонкі, прыгнуўся, баючыся ісці ў поўны рост.

Ён праставаў праз узгоркавае поле напрамкі, кіруючыся на старую бярэзіну, якая, ведаў, расце пры дарозе. Перадвечаровая сінеча ўжо груваcцілася вакол лапінак хмызу і асабліва гусцела ў нізіне, нібыта выпаўзала з далёкага лесу і слалася на полі.

— Апусці мяне, Багданка. Паспрабую ісці сама.

— За шыю, Часлаўка, трымайся. Мне тады, рыбачка, лягчэй ісці. Нам ужо недалёка.

Пот заліваў яму вочы, усё наперадзе хісталася, бы засланяла зялёным туманам, бліпчастым і дрогкім. Ад Чэсінага дыхання — перарывістага, хрыпатага — каўнер Багданавай кашулі ўграваўся, і гэтая гарачыня ўсё расла, расплывалася пад кашуляй, пякла плечы і грудзі. Ён пахіліў галаву, абцёр свой узмакрэлы твар аб Чэсіны валасы, і зялёны туман перад яго вачыма растаў. Блізка бяроза! Зусім блізка ўжо гэтая старая бяроза, што расце на ўзбочыне. А там, за дарогаю,— хмызнячок. За ім і лазнякі непадалёк. Відно ўжо, як гайдаюцца яны ад ветру. У тых нетрах іх не ўхопіш. Там — вольны шлях. Там — дарога ў атрад. Каб жа толькі дабрысці да тае дарогі! А сілы ўжо не стае... Можа, ён спыніцца на хвілінку і перадыхне, каб не бразнуцца на дол... Не! Яшчэ крышку! Дзесяць крокаў! Адзін... Другі... Лепей ён дваццаць крокаў зробіць яшчэ. Ці хопіць толькі ў яго сілы на гэтыя дваццаць крокаў...

Кожны крок, які ён рабіў, гулкімі бомамі аддаваў у галаў, і бомы не аціхалі, мацнелі, груваcціліся, выраcталі ў грымлівую лесвіцу, якая вострымі канцамі ўпіралася ў плечы. Дваццаць крокаў! Ён усё ж зрабіў гэтыя дваццаць крокаў! А бяроза як і не паблізілася. Не, паблізілася. Вось яна, родная! Голле матляецца і шуміць ад ветру. Ён — дасягнуў мэты, якую паставіў перад сабою: дарога вось яна, перад ім!

Багдан ступіў на сыпкі, як мліва, пясок дарогі, якую размалацілі ўшчэнт гусеніцы бронетранспарцёраў і колы

грузавікоў. Смурод газолі яшчэ віссў над дарогаю, яго, здавалася, струменілі глыбокія няроўныя каляіны і пясок, сагнаны ў пакатыя гурбы, і Багдан пераступіў каляіны, высільваючыся. Яшчэ крышку, і ён бразнецца тут, насярод гэтага пяску, задыхнецца паганым смуродам. Не, ён не ляснецца, ён дацягне шчэ ву-унь да той грыўкі хмызняку!.. Тут жа крокаў дзесяць — не больш! А што, ён ужо крокаў дзесяць гэтых не зробіць? Зробіць, здужае, адолее!..

Раптоўна смурод газолі знік, у твар тхнула рачной прахалодай, чыстай, прапахлай чаборам і палынамі, і Багдан як нанава нарадзіўся. Стомы як не было, дыхалася лёгка, ногі нібыта самі пёрлі яго наперад, як бы новыя, зусім без стомы. Вось яна, грыўка гэтага хмызу. Рэдзенькая, нізенькая — благая гэта схованка, ад дарогі праглядваецца наскрозь. Вунь і ўзвал ужо. Лазнякі і чаромхавы гушчар відаць добра. Там — Дзвіна. Унь, яна ўжо звініць!

Гарачы тлум чухнуў у вочы, і ўсё наўкола зыбнулася. Горла ў яго перасохла, язык быў шархоткі, і Багдан дыхаў ротам, хакаў, сіпеў. Ён бачыў цяпер толькі адзінае — лазнякі пад рачным узвалам. Ён пёр да іх, зноў высільваючыся, аддаючы ўсе сілы на тое, каб не спыніцца, бегчы і бегчы. І ён бяжыць! Ён хутка бяжыць. І лазнякі ўсё бліжэй! Вось яны, родныя!..

Ён шуснуў у лазнякі з узвала, зачапіўся нагою за нешта і, выпусціўшы Чэсю з рук, пакаціўся па лазняках, абдзіраючы твар і рукі колкай ажынаю. Метры тры ён гэтак ляцеў, куляючыся, і бразнуўся ў пясчаную вымоіну. Следам за ім неяк плаўна скацілася туды і Чэся, скурчылася побач, ля яго правай рукі.

Нейкі час Багдан ляжаў нерухома, чуючы слабы стогн Чэсі і сваё хрыпатае дыханне. Але слых яго прагна лавіў не гэтыя гукі, а тыя, што даносіліся з-за ўзвала. Падобна, што цішэў гул матораў. Так, аддаляецца, робіцца невыразны. А цяпер і зусім не чутно, знік гэты гул.

Багдан абцёр твар рукавом і, не мяняючы паставы, агледзеўся. У часе паводкі рака моцна падмыла пясчаны ўзвал, і сюды, у гэтую вымоіну, яны з Чэсяй і зваліліся. Як яшчэ галавы не звярнуў. Добра, што ён, калі паляцеў потырч, выпусціў Чэсю — яна па лазняках сюды і з'ехала, а ён сваім целам шлях працярэбліваў. Клятая гэтая ажына! У рукі сцябло і не ўхопіш — скрозь у шыпах. Але на ажыне гэтай жыць можна. Галоўнае — уратаваліся.

— Чэся! Чуеш? — ён паклікаў яе і заўважыў, што Чэся глядзіць на яго, шырока адкрыўшы вочы, і гэты спа-

койны позірк абудзіў у ім добрую надзею на тое, што цяпер у іх і сапраўды ўсё павярнулася на лепшае.— Цяпер мы, лічы, у хаце на печы.

— Канец гэта... Паміраю я, Багданка...

Мокрай ад расы рукою Багдан намацаў Чэсін лоб — халодны лоб, як нежывы. І не трызніць яна, голас чысты, напружаны толькі, хоць і кволы дужа,— і да яго толькі цяпер дайшло, што ёй вельмі блага і што Чэсі, відаць, ніхто не дапаможа нічым. Гэтае яе ласкавае «Багданка», гэты зварот з даўняга іх сумеснага жыцця прыгаломшыў яго. Ён на каленках падпоўз да яе, нахіліўся, прыўзняў Чэсіну галаву, прасіпеў у роспачы і адчаі:

— Ты будзеш жыць! Будзеш, Чэсечка!

Адразу і цалкам закрэслівалася ўсё, што было ў яго жыцці да Чэсі і без Чэсі. Ён да болю выразна, да нейкага вострага, са звонам замарачэння разумеў цяпер — толькі зараз, тут, у гэтай пясчанай вымоіне, прыйшла да яго, здзіўляючы сваёй вастрынёю, яспасць пражытага жыцця, пражытага, часам, бязглуздна, без розуму, у чаканні нейкіх дзівосаў,— што толькі яе адну, Чэсю, кахаў усё жыццё; кахаў, калі нёс на руках на рачны ўзвал, калі канаў у палоне, кахаў нават тады, калі быў разам з Маўджудой; ён разумеў цяпер, што падманваў сваё сэрца, калі пераконваў сябе, што кахаў другую жанчыну,— не, ён кахаў і Маўджуду таксама, але гэта было ўжо другое пачуццё, зусім іншае каханне, якое прыйшло да яго з абпаленага бядой розуму, а не з сэрца! — і яшчэ больш падманваў,— сто разоў жа цвердзіў ён сабе гэта! — калі пераконваў, што тое, другое, каханне зглрадзіць, выраўняе яго жыццё, дасць новыя мары і падзеі; усе дзівосы, спраўджаныя і няспраўджаныя дзівосы яго жыцця, былі тут, у ёй, гэтай жанчыне, жылі разам з ёю і разам з ёю знікнуць з зямлі, аніколі ані ў чым не паўторацца і ніколі не вернуцца.

Усе гэтыя думкі прыходзілі да яго і раней, так ці інакш спынялі яго ўвагу, і ад іх ніколі не было спакою. Але ён бараніўся ад іх адчуваннем сваёй віны перад Чэсяю, немагчымасцю ўсё і адразу выправіць, цалкам давяраў усё часу, на яго спадзяваўся, на яго разлічваў, і жыў з верою ў тое, што ў патрэбную хвіліну ён паверне ўсё ў той бок, які яму патрэбны, скіруе ў рэчышча, дзе ўсё будзе яму падуладна. Цяпер, разам, адразу абрывалася ўсё, гінула беззваротна тое, чым ён жыў употай, што трымала яго на гэтым свеце.

— Скажы Захару, каб узяў Толічка пасля вайны ў свой дом. Не хачу, каб ён у вас з Маўджудой быў...

— Яе няма. У мяне толькі ты! Адна ты!
— Твой твар быццам плыве. Нібыта кіно гляджу.
— Даруй, Чэся... Паслухай...
— Ты толькі гавары ці-іхенька...

Яна змоўкла, ляжала нерухома, паклаўшы левую руку на грудзі, і гэтая дзіўная яе сцішанасць падахвочвала яго расказваць пра ўсё тое, што мучыла даўно, вярэдзіла сэрца. Ён нібыта нанава пражываў тыя дні, калі стрэў Чэсю і пакахаў, расказваў аб іх з адчаем, нічога не ўтойваючы, і гэтая шчырая споведзь ішла цяжка, і ён адчуваў яе ашаламляльную сілу, і ён быў удзячны Чэсі за тое, што яна пагадзілася слухаць, і яшчэ больш кахаў яе за тое, што яна не пярэчыць, не крыўдуе, слухае, як шчыры, умудроны жыццём чалавек, які і спасціг і падзяляе чужы боль, разумеючы яго вытокі. Некалі Багдана палохала сама думка пра споведзь,— як расказаць пра жахлівую памылку, што прывяла да смерці чалавека, якога кахала Чэся? — але цяпер яшчэ больш палохала невядомасць таго, што адбудзецца, калі ён пра тую памылку раскажа. Жах узрастаў з кожным словам, і Багдан неспадзеўкі, з адчаем, зразумеў, што не можа давесці сваю споведзь да канца, і са здзіўленнем, з палёгкай нейкай адчуў, што нераскочыў у сваім апавяданні праз той вечар у бацькавай хаце, што гаворыць пра апошнія бацькавы словы, пра яго патрабаванне не кідаць Чэсю, не кідаць Толічка. Ён кляў сябе, кляў сваю слабасць і зноў, са здзіўленнем і нейкай палёгкаю, заўважыў, што ўсё ў яго душы іначыцца, імкліва мяняецца, быццам ён і сапраўды і ва ўсім адкрыўся Чэсі, і гэтыя змены прыводзяць да высновы, якая робіць яго заняцтым і жорсткім. Доўбня! Ды хай ён выверне, як на спадак, усю сваю душу — Чэся не толькі не зможа зразумець яго парыванне, але і не зможа ніколі дараваць. Нават калі ён раскажа аб усім падрабязна, не ўтойваючы аніводнай драбніцы, не парушаючы паслядоўнасці падзей, не хаваючы свае тугі, якую давялося перажыць, не закрэсліваючы згрызоты і болю, што ўвесь час, як шашаль, точыць яму сэрца,— усё роўна не зразумее, не даруе. Нават больш! Ён нават не паспее расказаць усё да канца — ва ўпор улупіць з парабелума. З таго парабелума, які ты ёй і падараваў летась! І разляціцца на кавалачкі твая дурная мазгаўня!..

Нешта зашурхацела за спіной, і Багдан уціснуў галаву ў плечы. Падалося: Чэся цягне з кабуры парабелум, зараз грымне стрэл... Шурхаценне не спынялася, яно то прапа-

дала, то ўзмацнялася, і ён марудна павярнуў галаву. Не згледзеў, а здагадаўся: шурхаціць, асыпаючыся па сухой леташняй лістоце, патрывожаны жвір на сценках вымоіны. І Чэсіна постаць нейк выразна акрэслілася, быццам пясок ля яе раптоўна пасвятлеў, рот жа, нос і вочы як бы зліліся ў адну пляму, падобную на вялікую лісціну, абарваную з аднаго боку няроўна і неахайна.

— Падцягні мяне туды. Бліжэй да вады.

— Добра, рыбачка. Толькі, каб з лазнякоў не вытырканца...

Ён ледзьве ўзняў Чэсю на рукі — як удвая пацяжэла яна за гэты час, што яны правялі ў пясчанай вымоіне,— прабіўся на краёк лазнякоў, амаль да самай вады, і апусціў ля кароткага квадратнага бруса, што ляжаў у асацэ.

— Ве-етрык,— працягнула Чэся.— Лёгка тут дыхаецца. Там, роўна ў мяху, было...

Багдан мітнуўся на бераг, сунуў руку з біклажкаю па самы локаць у ваду і, калі булькацела, выбіваючыся з вузкага гарляка, паветра, ліхаманкава думаў пра тое, што рабіць далей. На нейкі міг Багдан паслабіў пальцы, біклажка, як корак, выскачыла з глыбіні на паверхню, і ён ледзь паспеў ухапіць яе. Да гэтай мізэрнай радасці — не ўпусціў, паспеў, паспеў схапіць у цемры біклажку! — дадалася новая, вялікая і выратавальная. Ёсць жа човен! У ручаі, ля Падкасцельцаў, ляжыць — ён, Багдан прыкмеціў яго ў маі, калі ішоў там з хлопцамі з першага ўзвода. На беразе ручая, непадалёк ад Дзвіны, ляжала ў лазняках тая старая пасудзіна, і яны шчэ сядзелі на ёй, курылі. Толькі ж ці знойдзеш цяпер тую мясціну. І невядома, ці ёсць там той човен!

Багдан патраціў шмат часу на пошукі і знайшоў човен выпадкова, калі ўжо зусім страціў надзею яго знайсці. Магчыма, ён бы яго і не знайшоў, каб выпадкова не зачапіўся нагою за нейкі корань. Але зачапіўся, паляцеў потырч і аж войкнуў ад нечаканасці — рука намацала жалезны ланцуг, закіданы ссохлым веццем: гаспадар чоўна, значыцца, быў.

У радасным шале Багдан у момант выпхнуў старую пасудзіну — адкуль толькі і сіла ўзялася! — з лазнякоў, учапіўся ў ланцуг, патраляваў да Дзвіны. Праўда, потым давялося часта спыняцца, перакульваць човен на беразе, выліваючы ваду — пасудзіна дружна працякала.

Ён прыгнаў човен да лапіны асакі, дзе пакінуў Чэсю, выскачыў на бераг і спыніўся ашаломлены. Няма Чэсі! Першае, што цюкнула ў галаў — у лазняку запаўзла, пачуўшы што-небудзь падазронае. Схапіў карабін, пастаяў, азіраючыся, потым набег у лазнякі. Не, няма і ў лазняках. Гукнуў асцярожна двойчы — ціпыня ў адказ.

Багдан выбег з лазнякоў, стаяў, прыгнуўшыся, марудна і ўважліва абсачыў усё наўкола. Няўжо зблудзіў ён? Прычаліў не ў тое месца, адкуль пайшоў і дзе пакінуў Чэсю? Ды не, не зблудзіў ён! Вось жа тая лапіна асакі! Вось жа граніт ля вады, ля якога ён набіраў ваду ў біклажку...

«Брус! Бруса няма! Жалезныя ніты на адным канцы былі, і ля іх ён і паклаў біклажку!..»

Ён бухнуўся на калені, папоўз, абмацваючы ўсё вакол рукою, быццам брус быў як тая іголка, што згубілася ў траве. Пальцы натыкнуліся на халодную біклажку, вельмі лёгкую, потым на дзюралевы каўпачок, і ён узняў яго, накруціў на гарляк. Не, не зблудзіў ён, тут Чэся была. І ваду піла, усю біклажку апаражніла. Значыцца, нешта напалохала, адпаўзла яна з асакі!..

Багдан ускочыў, падбег да чоўна, потым вярнуўся да асакі, пастаяў, услухоўваючыся. Шамаценне лазнякоў і асакі наганяла жах. Ён ціха наклікаў — сказаўшы, што робіць гэта ў апошні раз — Чэсю, счакаў і потым адчайна, як не ўголас гукнуў:

— Чэся! Ты дзе? Адгукніся!..

У адказ з правага боку, ад лазнякоў, прагучаў Захараў голас:

— Роўда! Сюды! Роўда!

Колкія бомы ўдарылі ў скроні, знаёмае агнянае кола спавіла грудзіну, і сэрца быццам ускочыла ў яго сярэдзіну. Багдан хацеў бегчы, уся істота прагла толькі аднаго — уцякаць. Але ён стаяў, і зрушыцца, скрануцца з месца быў не ў стане: ногі скруціла паганая млявасць, і яны былі як прыкутыя да зямлі. Ён утрапёна глядзеў на Захара, які, з аўтаматам напагатове, марудна, быццам абмацваючы дарогу, высоўваўся з лазнякоў.

## 31

Халадэча пругкімі камякамі асядала і ў грудзях, і ў плячы — толькі адным, левым, чамусьці,— і над горлам, і Захар адчуваў, што яны ўвесь час рухаюцца, ма-

рудна спаўзаюць у адну кропку, нібыта факусіруюцца магутнай лінзаю. Ён разумеў, што халадэчу струменіць цьмяны, шкляны бляск Багданавых вачэй, і глядзеў у іх упарта, нібыта знарок падстаўляў сябе над бляск чужога, надобнага на скразняковы вецер позірку. Вось зараз, літаральна зараз Захар пачуе нешта яшчэ, нейкія іншыя добрыя весткі, і тыя весткі чакаў упарта, і ў тыя весткі ўсё яшчэ верыў.

Багдан маўчаў. Да Захара паступова, але ўпарта і пагрозліва, пачало даходзіць, што ніякіх добрых вестак няма і не будзе, і тое, што ён пачуў пра Чэсю — праўда, і яе трэба прыняць мужна, суняць крык душы. Камандзіры ўзводаў адзін за адным далажылі: пошукі ніякіх вынікаў не далі. Не было яшчэ толькі Файзуло, які павёў узвод вышэй па ўзвалу, у бок дарогі. Не, вяртаецца і ён. І зноў тое ж паведамленне: Чэсі нідзе няма. Знікла. Як выпарылася!

— Начштаб,— ціха паклікаў Захар.— Рухаемся далей. Не мяняць нічога...

Трэба было не губляць час. Але Захар, аддаўшы загад ротам заняць ранейшыя месцы ў калоне, усё яшчэ на нешта спадзяваўся, насцярожана сачыў за Багданам, які сядзеў побач на борце чоўна.

— Ты, значыцца, зямлянку не бачыў,— паўтарыў Захар тое, што ўжо ведаў, паўтарыў з развагаю, як бы раячыся з сабою.— Сустрэліся ля крыніцы. Ты яе першы заўважыў?

Плынь Дзвіны струменіла слабы водсвет ліловага на захадзе неба. Берагі былі цёмныя, а тут, ля чоўна, вада была высветлена, і Багдан, які таропка паўтараў тое, што ўжо казаў Захару, як бы зыбаўся, то рабіўся выразны ад водсветаў, што прабягалі за кармой чоўна, то як бы зліваўся з чарнатою лазнякоў.

«Ненавісны ён мне, гэты Багдан. І нешта ён тоіць. Як увесь час баіцца...»

Захар спрабаваў бараніцца ад нянавісці да Багдана, але яна была яму непадуладна, учэпіста трымалася, укаранілася ўжо моцна, і ён нічога не мог зрабіць з сабою. Ён глядзеў на Багдана, быццам бачыў яго ўпершыню: зблытаная грыва валасоў закрыла ўвесь лоб да самых броваў, як бы зраслася з імі; разадраная кашуля ў нейкіх плямах; трафейныя боты з шырокімі халявамі-раструбамі, да якіх напрыліпала твань, здаюцца зробленымі з нейкіх кавалкаў рознай па колеры скуры. І рукі ней-

кія мітуслівыя, бы трасуцца ўвесь час. Круціць усё, круціць гэты каўпачок ад біклажкі, быццам месца пальцам не знойдзе. І ўсё ў бок галаву верне, як баіцца нечага адтуль, з кармы чоўна. І неяк пагана ж смярдзіць ад яго. Часнок ён жэр, ці што?

Не стрымаўся, спытаў:

— Дзе ў часнок убіўся?

— Чаго, чаго? — Багдан не адразу сцяміў, пра што яго папытаў Захар.— А-а... На ўзвале, як човен шукаў, нейкую граду апароў,— Багдан змяніў паставу, і голас яго крыху павесялеў.— Часнок нехта там пасадзіў. І цыбульку...

Човен гайдануўся, і Багдан гайдануўся разам з ім, і Захара абдало застойным смуродам даўняга перагару; учора, відаць, Багдан недзе ўбіўся шчэ і ў гарэліцу.

Варухнулася ў душы горкая крыўда за лёс сястры. І з гэткім паганцам Чэсю звязала каханне! Сам жа вось ўратаваўся, жывым застаўся!

Думка пра тое, што Чэся некалі была Багданавай жонкаю, цяпер пакрыўдзіла і абразіла, нібыта Чэся па-ранейшаму кахала гэтага чалавека, і гэта было яму, Захару, у навіну, і ўчынак сястры ён асуджаў. Але ж якая тут навіна! Ён, Захар, адразу заўважыў, яшчэ наперадзе іх вяселля заўважыў, што Чэся памыляецца, што не кахае яна Багдана, паспрабаваў нават умяшацца, пагаманіць, папрабаваў давесці, што яна робіць памылку. Хіба ж яна паслухала? Пасмяялася толькі. А потым, як сваім розумам дайшла, дык сэрца ў камень загнала, нікому не паскардзілася, нікому нічога не сказала, усё сама перарабіла, на адзіноце выплакала бяду, употай кахала другога. А ён, Захар, тады гэтага не ведаў, у яго нават нейкая зларадласць была: вось, маўляў, як голасу старэйшых не слухацца. Але што ж гэта ён лухту нейкую прасейвае? Няма ж, мажліва, Чэсі ў жывых!

«Багдану я ніколі не змагу давяраць...»

Захар зазлаваў, зазлаваў на самога сябе, і гэта вырвалася міжвольна, скіравалася супраць чалавека, які прынёс яму нядобрую вестку.

— Навошта ж ты пакінуў яе адну, параненую? — запытаўся ён на высокай тужлівай ноце.— Навошта?

— А што было рабіць? — Багдан, урэшце, завінціў каўпачок біклажкі, пачаў церці далонь аб далонь, нібыта падстаўляў іх пад струмень вады, і па-ранейшаму сядзеў упурыўшыся, разглядаючы свае рукі.— На чоўне мы б

хутка і лёгка паплылі. У мяне і сілы ўжо не было яе несці. А на чоўне — паплылі б...

— Куды? Куды плысці, ты падумаў? Вы з намі ўсё роўна размінуліся б.

Папрокі былі беспадстаўныя, і адкуль Багдану было ведаць, што сёння ўвечары атрад рушыў з таго месца, куды яму, Багдану, трэба было вярнуцца яшчэ ўчора? Захар разумеў, што не мае на іх права, што адзінае рашэнне — моўчкі слухаць Багдана, паспрабаваць адшукаць у яго словах нешта такое, што чалавек хоча ўтоіць. А Багдан жа нешта ўтойвае. Нейкія падрабязнасці свае вандроўкі з Чэсяй ён хавае, не хоча, каб хто-небудзь другі ведаў пра іх. А можа, ён увогуле не быў з ёю? А што, як і не сустракаўся ён з Чэсяй ля крынічкі? А што, як увогуле не быў ля патайной зямлянкі? А што, як гэты човен ён зрыхтаваў на тое, каб шухнуць на той бок Дзвіны, мітнуцца куды-небудзь, затаіцца і перасядзець гэтую навалу? Ціхан жа некалі раіў яму, што, як пявыкрутка якая, можна і паўзводна выводзіць атрад, імкнуцца да таго, каб захаваць сілы. А ён, Багдан, на свой лад павярнуў гэта — вырашыў сам ратавацца...

— Пра тое, што размінемся, у нас і думкі не ўзнікала чамусьці,— прамовіў Багдан, і голас яго прагучаў глуха.— Я ёй толькі адно і даводзіў: у атрад дабрацца каб... А там — за чыгунку. Ціхан Круппя мігам самалёт прыгоніць. Загадае — і прыляціць...

У Багданавых словах не адчувалася шчырасці, нейкая як бы зласлівасць, зларадпасць прагучала, і гэтая зларадпасць, падмацаваная прытоеным усмехам, сабрала ў адзін пук усё нядобрае, што некалі адчуваў Захар да Багдана.

— Чаславу — знайсці! — Захар рыўком ускочыў з чоўна; човен моцна гайдануўся, і Багдан зваліўся ў карму; карабін яго гулка загрукаў па дошках.— Зразумеў? — крыху памарудзіў, змагаючыся з шалам, што дзёр грудзі, і скончыў пагрозліва, ясна, але без ярасці: — Расстраляю, калі не знойдзеш!

Захар крута павярнуўся. Нечага забалела паясніца, і ён, увахадзячы ў лазняк, паставіў рукі на пояс, азірнуўся. Постаць Багдана і абрысы чоўна амаль расплыліся ў цемры, і ён прыняў рашэнне, якое яго самога здзівіла.

— Маршрут зменім,— і ўдакладніў тонам загадным і безапеляцыйным: — Пойдзем ля шпітальнай зямлянкі.

Адтуль жа да чыгункі кіламетраў сем,— і запытаўся ў Пажогі, нібыта той і павінен быў паставіць апошнюю кропку.— Ці болей? Ты ж там хадзіў часта.

— Сем — гэта вярняк. Роўда там усе сцежкі ведае.

— Ты як не згодны з маім загадам. А-а, правільна, кажаш! Тады падцягні роту. Бакавую ахову ўзмацні...

Захар ускараскаўся на ўзвал. Крыху прайшоўшы, ён азірнуўся, каб паглядзець, як рухаецца атрад. Добра ідзе калона. І быццам туман за ёю, і ў ім, у тумане, нібыта пакрысе зыбаецца святлейшая за ўсё наўкола стужка Дзвіны. Калі цяпер давядзецца ўбачыць яе, Дзвіну?.. Магчыма, вось гэтак жа, як сёння Чэся, знікнеш, растаеш ўпочы і ты сам, і шукаць цябе ніхто не будзе, ніхто нікога не пашле на пошукі, і тваё знікненне застанецца нікім не заўважанае. Так што правільна ён паслаў Багдана на пошукі. Гэта ж трэба дадумацца — кінуць параненую! Хай цяпер шукае. Добра, калі знойдзе — Чэся ведае яшчэ адну патайную зямлянку, якую рабілі вясною, перад Першамаем. Калі яна жывая — там схаваюцца, яна пакажа дарогу. А потым Захар падашле сюды разведку ці сам вернецца. Але гэта — потым. Спачатку трэба захаваць атрад. І гэта добра, што пры Багдану ён не сказаў аб зменах у маршруце.

«Няма ў мяне веры гэтаму чалавеку. Няма!»

Падазронасць ажыла ў яго сэрцы, падазронасць, якая была вынікам няўдач атрада, вынікам таго, што фашысты як бы ўвесь час наступалі яму, Захару, на пяткі. Калі ў атрадзе з'явіўся Багдан, Захар быў падумаў, што гэта ён наводзіць ворага на партызанскі след. Потым падазронасць гэтая развеялася. А цяпер вось зноў яна, тая падазронасць, буяе ў сэрцы, гняце. Трэба спыніць рух калоны, паслухаць, агледзецца. Не, ціха наўкола...

— Ціха,— пацвердзіў Санько, які ні на крок не адставаў ад Захара, ішоў, быццам у звязцы.— Можна рухацца...

Захар чамусьці падумаў, што Юрша, мабыць, прыставіў Санько да яго, камандзіра атрада, сказаў з папрокам:

— А чаго ты ля мяне круцішся? Сваё месца ведаеш?

— А яно — тут. Ля вас. Я на сувязі — камісар з начштабам загадалі.

— Тады добра. Падбяжы да камандзіраў рот. Шырэй крок — гэта скажы...

Наступным разам Захар спыніў калону ля крынічкі, непадалёк ад патайной зямлянкі, у якой фашысты закі-

далі параненых партызан гранатамі. Схіліўшыся да крынічкі, ён прагна напіўся. Вада была наўдзіў халодная, ажно заламіла ў правым кутку сківіцы — заўшоўся болем хворы, з дуплінкаю, зуб. Боль не сціхаў, і Захар, ідучы затравелай нізінаю, часцяком націраў пальцамі, абмацваў, ціскаў сківіцу, спрабуючы яго суняць.

Боль прайшоў раптоўна, як адваліўся, калі наперадзе зачарнелі на пясчаным пагарбу разварушаныя копусы над бульбянымі ямамі. Уваход у патайную зямлянку быў ля той, што чарнела справа, самая блізкая да нізіны, і Захар набліжаўся да яе, трымаючы аўтамат напагатове. Ён не адразу зразумеў, што зямлянкі няма. Ад выбуху гранат накат рассыпаўся, зямля шуснула ўніз і, відаць, усіх, хто быў там, пахавала. Пахавала быццам у брацкай магіле. А гэта ж ён, Захар, настояў на тым, каб параненых прыхаваць тут, у патайной зямлянцы, якая была зроблена надзейна і добра. Ён абяцаў ім, параненым, што вернецца. І вось ён вярнуўся — да мёртвых.

Захар правёў рукою па твары, потым сціснуў ёю падбародак і ніжнюю сківіцу, нібыта спрабуючы ўтаймаваць зубны боль, які зноў выбівала, гнала пад скуру. Боль прыгас у сківіцы, але жыў у далоні, нібыта прайшоў са сківіцы ў пальцы. Але гэты боль быў толькі слабым адгалоскам іншага, вялікага болю, што жыў глыбей, у самым сэрцы, і які Захар адчуваў цяпер абвострана. Боль непапраўнай страты, боль, які ніхто ніколі не злічыць, не ўзважыць, не здолее прыгасіць...

На накаты пагарб поўз з нізіны дрогкі, рэдкі туман. Але Захару падалося, што гэта з зямлі, з-пад тарцоў жэрдак і бэлек паўзе слабае мроіва, падобнае на пару, быццам там, у зямлі, людзі былі жывыя, дыхалі, і гэта іх дыханне імглістай тканкаю распаўзаецца ў халаднаватым паветры. Ён павярнуўся, ледзь не зачапіў аўтаматам Юршу, які наблізіўся пячутна і стаяў па правы бок, кінуў коратка:

— Хадзем.

Юрша паспяшаўся патлумачыць, чаго апынуўся побач:

— Групу прарыву, думаю, узмацнім падрыўнікамі.

— Група прарыву — увесь атрад. Загадай узводам, каб не расцягваліся...

На нейкі час з поля зроку знік Санько, і гэтая акалічнасць выклікала непакой у Захара. Але тут жа знаёмая постаць зноў зачарнела злева, узнікла нейк шумна, з тархаценнем.

— Ты чаго грыміш? — напусціўся на яго Юрша.

— Зачапіўся. Ледзь нюхаўку сабе не залупіў,— Санько апраўдваўся пошапкам, але радасна і ўзбуджана.— А без нюхаўкі, таварыш камісар, не пражывець Санько, цяжка будзе без нюхаўкі яму дужа. Наліюць, скажам, яму стограмоўку ўночы, а ён і не ўчуе, каля роту пранясе...

Жарт непрыемна ўразіў Захара. Дзіўная нейкая натура гэты Санько! Крочыць амаль побач з магілаю сваіх сяброў — і жартуе!

Захар ішоў, паглыбіўшыся ў сябе, ішоў моўчкі, амаль не заўважаючы нічога наўкола. І, чым больш ён разважаў над тым, што гэтак яго ўразіла ў бесклапотных жартах Санько, тым усё больш і больш ён прыходзіў да высновы, што гаротныя крывавыя дні ніколі не сплывуць з памяці. Усё жыццё чалавека, відаць, падзелена на час, калі ён нешта набывае, і на час, калі нешта выкрэсліваецца з яго дзён назаўжды, і з гэтага часу і складаюцца дні беззваротных страт. Прынамсі, у яго, Захаравым жыцці, гэтак было.

«Я заўсёды думаю пра дні светлыя...» Гэта Гайдаш любіла казаць. Дзе яна зараз? Пра якія дні марыць? А што, як у гэтую ноч іх група вяртаецца з далёкага шляху, залегла на беразе Дзвіны, шукае спосабу пераправіцца?.. А ты вядзеш атрад за чыгунку. А ты, магчыма, робіш самую жахлівую памылку, прыняўшы гэтае сваё рашэнне... Не! Адзінае гэта выйсце! І атрад вернецца сюды! Ён, Захар, і вядзі атрад за чыгунку, каб потым зноў вярнуцца сюды.

— Што здарылася? — ён здзівіўся, ледзь не наляцеўшы на Юршу, які спыніўся.

— Чыгунка. Метраў чатырыста. Калечыц ужо там, дакладваў, што ціха. Кепска, што расцягнулася калона.

— Пачакаем. Хай падцягнуцца.

— Няма калі чакаць. Днець пачынае...

Сапраўды, пачынала днець. А ён і не прыкмеціў, як пачала радзець цемра, як зашарэла ўсё наўкола. Ішоў, абцяжараны сваімі думкамі, як адключаны ад усяго іншага. Здаецца, толькі што стаяў на беразе Дзвіны, а ўжо і чыгунка перад ім. Прыблізна шэсць жа кіламетраў ад тых старых бульбяных капцоў на пясчаным пагорку. Як у сне праляцеў гэты шлях. І ноч праляцела. Ды, зрэшты, якая ноч у чэрвені. Толькі зайшло сонца, а ўжо неба на ўсходзе бярэцца на ліловасць.

Ціха зашоргалі крокі. Пачулася прыглушанае частае хаканне, і з шэрані выплыла постаць Калечыца.

— Хутчэй, чаго марудзіце! — Калечыц пачаў абурана,

але, пазнаўшы Захара, дадаў спакайней: — Шырокім фронтам ісці нельга — міны. Мы ледзь не паляцелі — дрот тонкі, не заўважыш. Я расставіў сваіх людзей праз кожныя сто метраў. На іх трымайцеся. І за чыгункаю — таксама.

— Ціха скрозь?

— Лепей і не прыдумаеш.

— Пайшлі. Санько, не адставаць,— і павярнуўся да Юрпы.— Ты, камісар, замкнеш калону. Калі што якое — бою не прымаем. Адно хай кожны ведае — наперад...

Нейкі час Захар назіраў за тым, як ідзе Калечыц — лёгка, нячутна, крыху прыгнуўшыся, трымаючы аўтамат за шыйку прыклада. Ён паспрабаваў несці гэтак жа і свой аўтамат, але рука хутка стамілася, і ён узяў яго абедзвюма: гэтак усё ж зручней.

Вунь, здаецца, і насып ужо...

Тое, што Захар спачатку палічыў за насып, было ў сапраўднасці паласою хмызу, які ледзь акрэсліўся наперадзе. Насып аказаўся значна бліжэй, і Захар апынуўся на ім, як толькі пераскочыў вузкую, залітую вадой канаву. Жвір пакрышыўся пад нагамі мякка, зарыпеў. На насыпе было значна святлей, чым на падыходзе да чыгункі, сярод павысяканага і складзенага ў груды хмызняку. Выразна акрэсліваўся злева светлы закраек неба, і рэйкі быццам упіраліся ў гэтую блякла-ліловую палосу новага дня.

Знаёмае пачуццё пагарды да небяспекі, як бы выклік невядомасці, якая стаілася там, дзе хаваліся ў шэрай смузе рэйкі, уладарна спыніла Захара на насыпе. Загадаўшы Санько ісці наперад, ён вырашыў, што пойдзе з насыпу апошнім, пойдзе тады, як адолее чыгунку ўвесь атрад. Патрэбы ў гэтым не было, і ён гэта ведаў, і ўсё роўна не змяніў сваіму намеру. Потым ён прыгнуўся крыху — гэтак лепей праглядвалася цемра над рэйкамі,— сачыў за тым, як рухаюцца першы і другі ўзводы першай роты, пазнаваў знаёмыя постаці, пазнаваў нават адметную хаду людзей, якіх добра ведаў, і гэта як бы ўзвышала яго. Таропка, але ўпэўнена, зладжана, не расцягваючыся, адным кідком адолела насып другая рота.

Паспешлівы рух баявых узводаў, якія ў цемры выдавалі маленькімі, кволымі ланцужкамі, выклікаў крыўду і скруху. Які, выяўляецца, мізэрны цяпер захараўскі атрад! Няма той унушальнасці, якой дыхала калона, калі ішоў з атрадам абоз, рухаліся фурманкі, на якіх стаялі

мінамёты, рухалася гармата, як бы дапаўняючы грозны і ўпушальны малюнак. А зараз палахліва, туляючыся, перабеглі чыгунку кароткія цёмныя ланцужкі.

Спыніўся Юрша, шапарнуў узрадаванай скорагаворкаю:

— Добра, што без бою абышлося,— і крануў Захара за плячо.— Няма чаго стаяць! Дзякуй ночцы, што выручыла...

Ценінькі-ценінькі, ледзь улоўны гук узнік доле, як бы не пад самымі падэшвамі. Цягнік?.. Так, гул далёкага яшчэ цягніка. Захар стаў на калена, прыхінуўся вухам да рэйкі; рэйка, бы жывая істота, ціха гула і пазвоньвала, але здавалася, што гудкі ідуць не з яе, а выбіваюцца з-пад шпалаў, дужа шырокіх у цемры.

— Цягнічок коціць. Шкада, няма чым калупнуць!

— Ну-у, ты ўжо замнога хочаш сёння,— гэткім жа стоеным пошапкам абурыўся Юрша.— Скажы дзякуй, што па шпалах бы па масле пракаціліся. Чым ты яго калупнеш? Пальцам, хіба...

Яны разам саскочылі з насыпу, пайшлі таропка, даганяючы калону, якая амаль схавалася ўжо; постаці людзей расплываліся ў цемры, як зліваліся з зямлёй. Крыўда, паганае адчуванне палахлівых уцёкаў не праходзіла, прыгнятала, перарастаючы ў зацятую злосць, ад якой не было паратунку. Папраўляючы аўтамат на плячы, Захар зачапіў рукою гранату — вісела на рэмені.

— Гранатамі можна калупнуць, камісар,— ад нечаканага рашэння Захар ажно папацеў, спыніўся сам і спыніў Юршу.— Збяром гранаты ва ўсіх. І — чухнем! Ды яшчэ з усіх ствалоў — цяпер няма чаго набоі шкадаваць! Урэжам па вагонах!

Юрша неадабральна матнуў галавой:

— На голай раўніне? Справа — бункеры. Злева — горад. Ды яны гэтак урэжуць, што і кішкі вон з нас.

Захар зазлаваў. Але, разам з тым, ён разумеў, што яго парыванне грунтуецца перш-наперш на тым адчуванні крыўды, якая прыціснула на насыпе. Уцякаюць, бы зайцы! Нічога, калі разабрацца, тут ганебнага няма — манеўр! Загад Ціхана выводзіць атрад з трохкутніка, калі складзецца крытычная сітуацыя. Але ж трохкутнік застаўся ззаду. Сітуацыя тая крытычная — ззаду. Дык чаму ж не рызыкнуць? Не, не рызыка тут. Яны рызыкавалі, калі сядзелі ў чаромхавай заглушшы ручая, рызыкавалі, калі рушылі сюды, пад горадам, каб перайсці чыгунку... А ця-

пер? Наперадзе — партызанская зона. Захар збярог набоі на выпадак бою, каб прарвацца за чыгунку. І цішком адыходзіць? Не-е! Цяпер зноў — бой!

З цемры выплыў Яштокін, высунуўся нечакана, і гэтак жа нечакана загучаў яго таропкі, поўны абурэння шэпт:

— Чаго бавіцёся? Я спыніў рух. Вас чакаем.

— Чуеш, камісар. Штаб спыніў рух. Значыцца, лёс нам,— і як бы чакаючы, што зараз будуць пярэчанні, паспешліва патлумачыў: — Рашэнне тут выспела: атрад — у ланцуг ля чыгункі. Урэжам...— заўважыў незадаволены рух Яштокіна.— Урэжам, начштаб, урэжам па эшалону з усяе зброі,— і ўжо тонам загадным, як пра рашэнне абгаворанае і прынятае даўно: — Агонь — адну хвілінку. Толькі адну! З усіх ствалоў. Агонь адну хвілінку — і лахі над пахі. Ветрам!

Яштокін зацята маўчаў, не выказваючы ні захаплення, ні нязгоды, ні ўхвалы, і Захар сказаў, чамусьці радуючыся з гэтага маўчання:

— Збяры па ўзводах трафейныя гранаты. І — сюды,— і папрасіў са смяшком: — Скажы Файзуло — хай тут не скупіцца, што мае, тое і аддае,— і дадаў, як бы ставячы на ўсім кропку: — Буду з падрыўнікамі.

— Пайду ў першую роту,— сказаў Юрша памяркоўна, быццам з самага пачатку і ва ўсім быў згодзен з Захарам.

Яштокін, калі Юрша пайшоў, спытаў:

— Трэба ж дрот... Гэта ж метраў паўсотні...

— На вудачку нам і дваццаць метраў хопіць. Скажы, каб кашулі падралі. І ў Санько дрот ёсць. Не ведаю колькі...

Захар правёў позіркам Яштокіна, які хутка растаў у цемры, апусціўся на зямлю, упёрся лбом у халодны дыск аўтамата. Заўсёды яны з Юршам і Яштокіным пагаджаліся, знаходзілі рашэнне, якое кожнаму здавалася разумным і добрым, і з гэтай еднасці прыходзіла ўпэўненасць, што ўсё робіцца правільна і абяцае поспех. Цяпер жа гэтага адчування не было. Цяпер усё настойлівей пракрадвалася да сэрца нейкая развага, у якой таілася сумненне. Ці правільна ты, дружа, робіш? Ды праз паўгадзіны— поўны світанак! І твой атрад будзе ляжаць над кулямётамі бункераў, на чыстым полі, быццам на далоні. Адыходзіць метраў дзвесце давядзецца па роўным. Далей, праўда, пагорак, за яго скаціўся — куля ўжо не зачэпіць. Але ж ад міны не схаваешся. І не адразу туды і даскочыш. І лясок

далёка. У лес бегчы нельга ў любым выпадку — па ім, па гэтым узлеску, яны адразу пачнуць мясіць. А цягнік жа грукоча! І адтуль, з Захаду, паражнячок не гоняць...

Захар пачуў блізкае шархаценне за спіною, азірнуўся. Пазнаў Голуба і Санько толькі тады, калі яны побач селі на траву. Санько быў голы па пояс, Голуб у майцы.

— У лазню сабраліся? — падкалупнуў Захар.— Папарыцца?

— Уся група раздзелася— кашулькі пайшлі на вяровачку. Прыгожая, падзейная,— Голуб пацягнуў у руках вяроўку, тоўстую, кудлатую, у гузаках.— Слыш, Санько? Ці не гэткай вяровачкай Лідка цябе прыкруціла?

— Укараціць табе язычок?

— Ціха,— перапыніў іх Захар.— У цябе ж драціна ў кішэні была.

— Метраў пяць усяго засталося. Дрот — да гранат. Далей — вяроўчына...

Захар сумеўся. Ён сказаў пра кашулі жартам, спадзеючыся, што Санько прыхапіў з сабою драціну, якую, помніцца, наматваў на руку ў ручаі ля Дзвіны. Яго ж загад, выяўляецца, выканалі слова ў слова.

— Надзень,— Захар пачаў здымаць з плеч скуранку.— Надзень пакуль... Ён дык хоць у майцы.

— Галяком — добра,— Санько ад скуранкі адмовіўся.— Калі куля — слізгане па маім тлушчы.

— Пайшлі...

Захар узышоў на палатно, прыгнуўся, стаўшы каленам на шпалу. Рэйкі цяпер чамусьці былі бліщчастыя, як змазаныя цёмным маслам. Ён паглядзеў направа, потым налева, зачапіўся позіркам за нейкі цьмяны грудок ля канавы, залітай вадой, нахіліўся яшчэ ніжэй, прагна ўглядаючыся.

— Усё,— голас Санько прагучаў пад самым вухам.— Гатова, таварыш камандзір. Адзінаццаць гранат заклаў. Адыходзім.

— Як? Ужо?

— Не першы год замужам, як гаворыцца. Пясочак тут мя-яканькі. Цесачком р-раз — гатова.

Яны ішлі ад насыпу, і Санько ўвесь час перабіраў у руках тоўстую гузаватую вяроўку, як бы правяраючы, ці не парвалася яна ў якім-небудзь месцы. Захар паспрабаваў узяць вяроўку з яго рук. Санько павярнуўся плячом, як бы адціскаючы Захара ад сябе.

— Вы ж не прыкмецілі, пасупраць якога слупа пакладзена. І не камандзірскі гэта занятак, Захар Елісеевіч.

І гэты зварот, які Захар пачуў ад Санько ўпершыню, збянтэжыў. Захар лёг на зямлю побач з Санько...

Аднастайны цяжкі гул цяпер як бы падзяляўся на татаканне колаў, звон рэек і чмыханне пары дымагарнага коміна. І ўсе гэтыя гукі, што раслі, мацнелі і набліжаліся, быццам увачавідкі растрэсвалі перадсвітальную цемру, і яна як бы адступала, адсоўвалася ад поля, на якім залёг атрад. Выразна шарэла палоска насыпу, чарнелі зубчыкі лесу справа і злева, і вострыя пікі пяроўна ссечанага хмызу за чыгункаю былі падобны на зрэзаны ля берага трыснёг.

З шэрага змроку, які быццам адсунуўся і прыўзняўся над насыпам, вылузнуўся цягнік. Выразны белы дым звілістай паласою спаўзаў па бакавіне чорнага паравоза і быццам драбіўся на чырвоныя іскры, што падалі на зямлю і адскоквалі, згасалі ў канаве з вадой. Светлая пляма ў сярэдзіне паравоза была падобная на агеньчык у акенцы стуленай уночы хаціны. І гэткія ж агеньчыкі, толькі большыя і гусцейшыя, былі ў чатырох пасажырскіх вагонах, якія як бы адарваліся ад паравоза і каціліся самастойна. Захар не адразу згледзеў, што пасажырскія вагоны аддзелены ад паравоза платформамі, нізкімі, нечым рэдка заcтаўленыя. За пасажырскімі вагонамі ішлі таварныя, як бы злітыя ў адну цёмную доўгую палосу.

— Пасажыр,— ціха войкнуў Голуб.— Пасажыр жа гэта імчыць! Цёмненькі.

Санько прыўзняўся на калена, як спрынтэр, гатовы да рашаючага рыўка.

— Да-авай, вяровачка родная!

Ён, ірвучы к сабе вяроўку, адскочыў на два крокі, потым адкінуў вяроўку і сам бразнуўся на зямлю, закрываючы патыліцу сагнутай у локці левай рукой і прыкладам аўтамата. У чаканні выбуху Захар зрабіў тое ж самае, затуліў галаву і ляжаў, уціснуўшыся посам у траву, скубануў яе. Хруснулі на зубах мяккія халодныя сцяблiны, і нібыта з-пад іх пыхнула густое аранжавае полымя, высвяціла перад Захарам усе травінкі, і яны бліснулі дзіўнымі тоўстымі гранямі, і бліснула шырокай бакавінаю чорная, выгнутая вялізнай дугою, яшчарка на насыпе. Грукатлівая цемра калянымі візкатлівымі подыхамі абрынулася на Захара, прыціснула да зямлі, прайшлася па хрыбціне, як бы здзіраючы скуру, і ён ашалеў ад радасці.

«Гранаты!»

Захар ускочыў і, стаўшы на калена, ірвануў затвор аў-

тамата, ірвануў з радасным помслівым пачуццём і з усяе сілы націснуў на спуск. Ад гулкага бомкання ў вушах чэргі з свайго аўтамата здаліся яму слабымі, як бязгучнымі. Але аўтамат працаваў, ён калаціўся ў руках, аддаючы ў плячо. Нейкі калянны боб тукаў Захара па галаве, і ён не адразу сцяміў, што гэта ляцяць стрэляныя гільзы з аўтамата Санько. Санько строчыць гэтак жа, з калена, а Голуб стаіць ва ўвесь рост, не прыгінаючыся. Аголеныя Голубавы плечы ад успышак стрэлаў выдавалі белымі і раптам успыхвалі зіхатлівымі бліскаўкамі, нібыта ад пляча да пляча прабягалі па скуры звілістыя маланкі. Ён бачыў яшчэ, як злева, нібыта з-пад зямлі, вырываюцца каляровыя ленты трасераў, упіраюцца ў вагоны, пырскаюць буйнымі іскрамі, высякаючы з цемры жаўтлявыя колцы агню.

Аўтамат аціх раптоўна, і Захар, яшчэ не верачы, што ў нейкае імгненне — дзве ж чаргі ўсяго і зрабіў! — паспеў апаражніць дыск, стукнуў рукою па дыску, адчуў пад далонёю пустэчу жалезнага кола. Радасна-помслівае пачуццё распірала грудзі, але розум ужо браў верх бязлітасна і жорстка.

— За мной! — гукнуў ён у цемру.— Адыход! За мною!

Захар бачыў, як мільгаюць уперадзе сагнутыя пастаці — адыходзілі роты,— і з жахам падумаў пра тое, што можа здарыцца, калі ў гэты густы натоўп людзей, якія бязладна бягуць полем, ударыць міна. Але ж нешта доўга маўчаць бункеры. І хоць бы яшчэ памаўчалі яны хвілінку! Яшчэ хвілінку, і роты скоцяцца з поля за пагорак.

Імкліва, бы знічка, ляціць ракета.

Ракета яшчэ не паспела выбухнуць увысі зыркім парасонам, як справа, зусім блізка, загрукацелі кулямёты, і нізка, як не над самай галавой Захара, панесліся тугія і шчыльныя каляровыя ленты трасіраў; яны нараджаліся ў дзвюх кропках, як бы перакрыжоўваліся ў Захара над галавой, і знікалі, лопаліся недзе наперадзе. Раптам, быццам адсякаючы іх, бляклае жаўтлявае полымя плёхнулася ззаду, бліснула на цёмнай траве і тут жа згасла, быццам адкінутае звонкім траскотным выбухам. Следам ударыла яшчэ міна ў тым жа месцы, і зноў плёхнулася на траву бляклае жаўтлявае полымя, і гэтае полымя быццам выдрала з высі белае святло, і ад яго голыя плечы Голуба быццам самі засвяціліся зыбкім аранжавым агнём.

«Міны адрэжуць нам шлях! Праз іх тады не прабіцца!.. А вось і ён, выратавальны пагорак!..»

Захар, высільваючыся, прамчаў яшчэ колькі крокаў, пакаціўся па зямлі; шырока адкрыты рот, бы сухой колкай ватай, забівала паганая горыч. Зямля і ярка высветленае кола ўвысі круціліся, мяняліся месцамі, і Захару на міг падалося, што ён ляціць у гэтым коле, куляецца, то ўзлятаючы ўверх, то прыціскаючыся да зямлі. Ён раптам упёрся ў нешта мяккае, і гэтае мяккае абазвалася Пажогавым голасам:

— Цішэй, камандзір! Зломіш хрыбціну!

— Дзе роты?

— І роты залеглі. Ву-унь, усцяж хмызнячку. Здаецца, што фрыцы дагэтуль не сцямілі, хто ім патэльню пагрэў. Стандарт нямецкай стратэгіі: ін вальд — партызанэн. А яны, партызаны, на травіцы. Бачыш, як па ўзлеску чэшуць?

Увысі, як не над самай галавой, шурхацелі міны, трасскотна бухалі на ўзлеску, плёхалі на зямлю жаўтлявае полымя, высвятляючы на міг нізкія кудлатыя сосны. Каляровыя ніткі трасераў цягнуліся таксама ў той бок, але ўжо не скрыжоўваліся, а ішлі ў двух напрамках. Цяпер і полымя выбухаў і колер трасірак былі бляклымі. Чырвонае кола агню, які выбіваўся з таварных вагонаў, фарбавала усё наваколле дрогкімі і мітуслівымі водсветамі, і яны ўсё шырэлі, набіралі сілу, і ад іх на зямлі, на траве, на дрэвах узлеску і рэдкіх палосах хмызняку выспявала, як налівалася гушчынёю злавесная барвовасць.

— Што ж там гарыць, у гэтых вагонах? — спытаў Юрша, нібыта Захар ведаў гэта.— Хоць ты бяжы ды зірні зблізку. Нейкі аранжавы колер...

Захар адчуў, што яго губы ўпершыню за апошні тыдзень расцягвае ўсмешка:

— Гэта колер удачы, камісар.

Аранжавае кола трымцела, выцягвалася вострым лязом, і здавалася, што гэтай агнянай стралой вагоны спрабуюць спіхнуць са свайго шляху абернуты чорны паравоз, што ляжаў бокам упоперак чыгункі. Водсветы аранжавага святла трымцелі і ў хмызняку, і постаці людзей — людзі ляжалі ў нейкіх дзіўных паставах: то бокам, то на грудзях, то тварам дагары, раскінуўшы рукі на бакі, ляжалі то па адным, то некалькі чалавек разам, галава да галавы,— не выдавалі нерухомымі, яны жылі, як бы ўвесь час соўгаліся і ўздрыгвалі ад стракатых агнявых бліскавак.

Захара раптоўна скавала страшэнная стома. Ён паклаў аўтамат ствалом сабе на грудзі, раскінуў рукі, павярнуў-

шы галаву ў бок чыгункі; шчаку галубіла ласкавая і мяккая прахалода роснай травы, і гэтая мяккасць асядала на далонях, паўзла па скуры, і ён, баючыся супыніць гаючую расяную плынь, ляжаў нерухома, спыніўшы позірк на аранжавых скрутках полымя, пярэстага, з чорнымі стужкамі, якое як бы паўзло з вагона ў вагон і ўсё далей высвятляла наваколле.

Намаганнем волі Захар загадаў сабе ўзняцца і пайсці. Следам за ім узнімаліся і рухаліся, выстрайваючыся рэдкім ланцужком, роты. Мільганула сагнутая постаць Юркі, але яе тут жа захінулі бліішчастыя, як бы медзяныя ў водсветах аранжавага святла шырокія Голубавы плечы, і Захар адчуў, што яго вусны зноў расцягвае міжвольная ўсмешка.

Траскотныя выбухі мін і густое сакатанне кулямётаў як бы адкаціліся ўправа, бліжэй да мітуслівага, пярэстага, з чорнымі стужкамі полымя, што раптам амаль атухала, то зноў, як падкінутае моцным парывам ветру, узлятала ўгору, кідаючы дрыготкія водсветы на цёмныя сосны старога бору, які быў ужо зусім блізка. Злева ад яго, над вострымі кучомкамі маладых вольхаў, малінавай падковаю разліваліся, яснелі барвы новага дня — святло яго было чыстае, роўнае, і цемра, амаль увачавідкі, палахліва адступала, паўзла па зямлі, бы шылася ў спляценне густой роснай травы.

**Савіцкі А.**

С 13 Літасці не чакай: Раман.— Мн.: Маст. літ., 1982.— 398 с., іл.

У пер.: 1 р. 80 к.

Новы твор вядомага беларускага пісьменніка з'яўляецца другой кнігай раней выдадзенага рамана «Верай і праўдай». Аўтар малюе шырокае палатно партызанскага руху рэспублікі ў гады Айчыннай вайны, паказвае мужнасць савецкіх людзей у барацьбе за незалежнасць сацыялістычнай бацькаўшчыны.

Пра тых, хто аддаў жыццё за шчасце і свабоду Радзімы, пра тых, хто змагаўся і перамог, і напісана гэтая кніга.

$С\frac{4702120200-058}{М302(05)-82}20-82$

ББК84 Бел 7

Бел 2

*Александр Ануфриевич Савицкий*

**ПОЩАДЫ НЕ ЖДИ**

Роман

Минск, издательство «Мастацкая літаратура»
На белорусском языке

Рэдактар М. М. Ваданосаў
Мастак М. М. Селяшчук
Мастацкі рэдактар А. І. Труханава
Тэхнічны рэдактар А. Б. Барадзіна
Карэктар Я. А. Бебель

ІБ № 1255
Здадзена ў набор 01.07.81. Падп. да друку 26.02.82. АТ 05048. Фармат $84 \times 108^{1}/_{32}$. Папера друк. № 1. Гарнітура звычайная новая. Высокі друк. Ум. друк. арк. 21,00. Ум. фарб.-адб. 21,00. Ул.-выд.арк. 23,66. Тыраж 12 000 экз. Зак. 1767. Цана 1 р. 80 к.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінскае вытворчае паліграфічнае аб'яднанне імя Я. Коласа. 220005. Мінск, Чырвоная, 23.